ARCHE Зьмест № 2’04

1. Зьмест / Уводзіны
2. Гістарычны выбар Лукашэнкі. Віталь Сіліцкі. ARCHE 2 (31) 2004.
3. Цэнтры цяжару ідэалягічнай працы. Юры Чавусаў. ARCHE 2 (31) 2004.
4. Даведнікі - не паэзія. Аляксандар Надсан. ARCHE 2 (31) 2004.
5. Тэрапія альтэрнатывай, або Беларусь, уяўленая інакш. Нэлі Бекус. ARCHE 2 (31) 2004.
6. Кароткі курс посткамунізму. Юрась Ліхтаровіч. ARCHE 2 (31) 2004.
7. Чаму мы прагнем у Эўропу. Андрэй Дынько. ARCHE 2 (31) 2004.
8. Беларусь заўтра. Сакрат Яновіч. ARCHE 2 (31) 2004.
9. Нацыянальная ідэнтычнасць як метафізічны выбар. Пётра Садоўскі. ARCHE 2 (31) 2004.
10. Даруйце, але ваша душа сканала. Том Вулф. ARCHE 2 (31) 2004.
11. ...но странною любовью. Юры Андруховіч. ARCHE 2 (31) 2004.
12. Паміж спортам і палітыкай. Кастусь Лашкевіч. ARCHE 2 (31) 2004.
13. Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941-1944. Аляксандар Фрыдман. ARCHE 2 (31) 2004.
14. Пятнаццаць лішніх хвілін. Сяргей Балахонаў. ARCHE 2 (31) 2004.
15. Эдуард і Бог. Мілан Кундэра. ARCHE 2 (31) 2004.
16. Смаўжы, калюжыны, дождж. In Dublin's fair sity. Павал Гюле. ARCHE 2 (31) 2004.
17. Беларуская прыгода. Ані Жаліф. ARCHE 2 (31) 2004.
18. Французскія акуляры, расейскія вуткі і беларускае дзіва. Алесь Лагвінец. ARCHE 2 (31) 2004.
19. Нямецкая вучонасьць і беларуская мінуўшчына. Андрэй Катлярчук. ARCHE 2 (31) 2004.
20. Разбурэнне куміра. Андрэй Мельнікаў. ARCHE 2 (31)

2004.

[redacted]ізм

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (31) - 2004**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

2[image]-[image]2004

"аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]
[image]

З ь м е с т

КРЫТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Гістарычны выбар Лукашэнкі
ЮРЫ ЧАВУСАЎ Цэнтры цяжару ідэалягічнай працы
АЛЯКСАНДАР НАДСАН Даведнікі - не паэзія
НЭЛІ БЕКУС Тэрапія альтэрнатывай, або Беларусь, уяўленая інакш
ЮРАСЬ ЛІХТАРОВІЧ Кароткі курс посткамунізму

АНАЛІТЫКА

АНДРЭЙ ДЫНЬКО Чаму мы прагнем у Эўропу
САКРАТ ЯНОВІЧ Беларусь заўтра
ПЁТРА САДОЎСКІ Нацыянальная ідэнтычнасьць як мэтафізычны выбар

ЭСЭІСТЫКА

ТОМ ВУЛФ Даруйце, але ваша душа сканала
ЮРЫ АНДРУХОВІЧ ...но странною любовью
КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ Паміж спортам і палітыкай
АЛЯКСАНДАР ФРЫДМАН Невядомы генацыд: зьнішчэньне беларускіх цыганоў у 1941-1944

ЛІТАРАТУРА

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ Пятнаццаць лішніх хвілін
МІЛАН КУНДЭРА Эдуард і Бог
ПАВАЛ ГЮЛЕ Смаўжы, калюжыны, дождж
АНІ ЖАЛІФ Беларуская прыгода

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

АЛЕСЬ ЛАГВІНЕЦ Французскія акуляры, расейскія вуткі і беларускае дзіва
АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК Нямецкая вучонасьць і беларуская мінуўшчына
АНДРЭЙ МЕЛЬНІКАЎ Разбурэньне куміра

[image]
[image]

№ 2 (31) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ
палітэканом, доктар паліталёгіі Ратгерскага ўнівэрсытэту (ЗША).
Сталы аўтар «ARCHE».

Віталь Сіліцкі
Гістарычны выбар Лукашэнкі

Александр Григорьевич Лукашенко. Исторический выбор Беларуси. Лекции, прочитанные в высших учебных заведениях г. Минска. Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2003.

Рэцэнзаваная кніга мае незвычайны лёс. Зборнік «Гістарычны выбар Беларусі» складзены зь лекцыяў прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі, прачытаных перад студэнтамі менскіх ВНУ (Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту, Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі ды радыёэлектронікі і Беларускай акадэміі мастацтваў) у 2002-2003 гадох. Самі па сабе выступы шырока асьвятляліся ў сродках масавай інфармацыі, як дзяржаўных, так і незалежных, у беларускіх і замежных, а значыць, сталі матэрыялам даволі публічным. Крытыкі прэзыдэнта расцанілі гэтыя выступы як яшчэ адзін эпізод дзяржаўнай індактрынацыі ў ВНУ, а аналітыкі ламалі галовы, ці гэта не пачатак кампаніі Лукашэнкі па перавыбраньні на трэці тэрмін. Да таго ж кніга ўжо шырока анансавалася, але яе канчатковы варыянт, здаецца, дагэтуль ня вызначаны, ці, хутчэй, нявычышчаны. У гэтым можна пераканацца, прачытаўшы адну зь яе вэрсіяў, дзе ў якасьці выдаўцоў фігуруюць Акадэмія кіраваньня і Адміністрацыя

прэзыдэнта. У любым выпадку можна лічыць, што рэцэнзуюцца чатыры асобныя выступы.

Цікавасьць, нават нечаканасьць кнігі ў тым, што яна прэзэнтуе незвычайную, нават выключную ў апошняе дзесяцігодзьдзе зьяву ў грамадзкім жыцьці Беларусі - даволі свабодную публічную дыскусію кіраўніка дзяржавы з аўдыторыяй, якая не зусім (а часьцяком - зусім не) падзяляе яго погляды і дзе ўдзельнікі-візаві не адсейваліся, як гэта было з дэбатамі на расейскіх тэлеканалах, з тым, каб пакінуць толькі некалькі чалавек, не заўжды здольных нават да таго, каб задаць пытаньне, не пачынаючы заікацца перад камэрамі. Дарэчы, якасьць аўдыторыі Лукашэнкі найлепш вызначаюць займеньнікі, якімі ён найчасьцей карыстаецца ў гутарцы. За дзесяць гадоў мы прызвычаіліся да чатырох зь іх - «я» (наогул, самае папулярнае слова ў лексыцы прэзыдэнта, асабліва калі ён кажа пра дасягненьні краіны), «мы» (выкарыстоўваецца замест «я», калі гутарка ідзе пра контравэрсійныя рашэньні ўлады; так, дождж Берасьцейскай вобласьці даў «я», а цэны падвысілі «мы»), «ты» (зварот амаль да ўсіх суразмоўцаў, уключаючы людзей, гадоў на дваццаць старэйшых), нарэшце, «яны» (як правіла, апанэнты і ворагі). У студэнцкіх аўдыторыях Лукашэнка надзвычай зашмат казаў «вы», прычым зь нейкім асаблівым падтэкстам: зьвяртаючыся да аўдыторыі, ён увесь час сьцьвярджаў - «вы рыначнікі», «вы хочаце ў Эўропу», «вы за незалежнасьць». БРСМ як быццам бы і не ствараўся - Лукашэнка нават і не рабіў спробы адпрэчыць той факт, што ён выступае далёка не перад сваімі прыхільнікамі, прычым, што цікава, сам раз за разам заводзіў на гэтую тэму гутарку. Так было, напрыклад, падчас сустрэчы ў БДУ, калі адкрыта абмяркоўваўся яго правал на прэзыдэнцкіх выбарах сярод студэнтаў гэтай ВНУ, нягледзячы на тое што пратаколы выбарчых камісіяў, здавалася б, сьведчылі пра адваротны вынік. У іншым выпадку Лукашэнка прызнаўся, што яго падтрымлівае толькі трэцяя частка студэнтаў, услых задаўшыся пытаньнем, «а каго падтрымліваюць астатнія?» (Дарэчы, паводле дадзеных сацыёлягаў, у гэтай узроставай групе падтрымка прэзыдэнта насамрэч удвая меншая.) Яшчэ нават больш бянтэжаць пытаньні студэнтаў, якія «не прабіліся» ў справаздачы электронных СМІ. Тут было пра ўсё: і чаму

беларусы ня могуць вольна езьдзіць па Эўропе, і чаму душыцца прыватны бізнэс, і чаму дзяржава падтрымлівае спорт больш, чым мастацтва, і нават чаму на дзяржаўным сьцягу зьмешчаны пахавальны арнамэнт. Разважаньні на гэтыя ды іншыя пытаньні былі часьцяком вельмі нечаканымі, значна адрозьніваючыся ад таго, што можна пачуць у адказ на іх на беларускім тэлебачаньні. Чаго вартае, напрыклад, прызнаньне ў тым, што «бел-чырвона-белы сьцяг ні ў чым не вінаваты».

Акрамя таго, выступы Лукашэнкі перад студэнтамі шмат у чым адлюстроўваюць тую самую «дзяржаўную ідэалёгію», аб увядзеньні якой было абвешчана акурат паміж яго візытамі ў ВНУ. Лукашэнка зрабіў спробу сфармуляваць тое, што зь вялікай доляй слушнасьці можна назваць афіцыйным палітычным дыскурсам, стаўленьнем рэжыму да ключавых аспэктаў існаваньня дзяржавы і беларускай нацыі, яго інтэрпрэтацыяй выклікаў і праблемаў іх разьвіцьця. Гэтае фармуляваньне, зь іншага боку, адбылося ў той час, калі сам беларускі прэзыдэнт, яго палітычныя намеры і пляны ў адносінах да краіны пачалі абрастаць мітамі, напрыклад аб «новым нацыяналізьме» ўлады, сталі чуваць заклікі да супрацоўніцтва з Лукашэнкам у справе барацьбы за незалежнасьць і г. д. Разважаньні самаго беларускага лідэра, магчыма, пазбавяць залішняга аптымізму аўтараў такіх канцэпцыяў ды падыходаў.

З усіх гэтых прычынаў, мабыць, кніга дагэтуль не пайшла ў тыраж. Галоўная пагроза для догмы ўсё ж не ератыкі, а само баство, якое пачынае несьці адсябеціну.

ГІСТАРЫЧНЫ ВЫБАР - ПОШУК АД АДВАРОТНАГА

Гістарычны выбар - гэта заяўка як мінімум на дзьве рэчы. Па-першае, гэта права на акрэсьленьне стратэгічнага шляху разьвіцьця краіны. Па-другое - на легітымізацыю ўласнага выбару нацыянальнай гісторыяй (у тым кантэксьце, вядома, у якім яго разумее ўлада ды асабіста Лукашэнка). Пра ролю ды інтэрпрэтацыю гісторыі ў лукашэнкаўскай ідэалёгіі будзе

сказана пазьней. Пакуль што засяродзім сваю ўвагу на стратэгіі нацыянальнага разьвіцьця.

Тут асабліва яскрава кідаецца ў вочы тая акалічнасьць, што дзяржаўнай ідэалёгіі бракуе ідэяў. У ёй няма простага, ёмістага, зразумелага і ў той жа час афіцыйнага азначэньня «беларускага шляху». Цяжка таксама суаднесьці «гістарычны выбар» лукашэнкаўскай дзяржавы зь нейкімі вызначэньнямі тыпаў магчымых шляхоў, якія існуюць у традыцыйных палітычных ідэалёгіях. Тое, што пададзена грамадзтву, і у прыватнасьці студэнтам, даволі расплывістае і нявызначанае. Відавочна, што Лукашэнка сам ад гэтага пакутуе:

Мы определили цель: построить сильную, процветающую страну. Это что, недостойная цель? Достойная. И дай бог, чтобы мы ее осуществили. И при вашем поколении. Это долгосрочная перспектива, но это не коммунистические «звезды, что зажигают на горизонте». Сильное государство и в военном отношении, и в экономическом. Процветающее, чтобы люди достойно могли жить. Нам еще далеко до этого, но это цель. И разве она неправильно определена? Вроде нормально. Ну как критиковать такую цель? Не потому, что это я ее определил, нет. Что тут можно критиковать? Можно хихикать по этому поводу: ну да, «сильное», «процветающее» - когда это будет? (С. 146).

Пад лёзунгамі «моцная, квітнеючая дзяржава» можа падпісацца бадай што кожны. Бяда ў тым, што ў беларускім грамадзтве і, што важна, паміж Лукашэнкам і яго аўдыторыяй часьцяком існуюць дыямэтральна супрацьлеглыя меркаваньні з нагоды таго, у чым моц дзяржавы і які гістарычны шлях прывядзе да яе росквіту.

Таму Лукашэнка часта спрабаваў абгрунтаваць свой выбар мэтадам, які шырока выкарыстоўваецца ў дакладных навуках, - ад адваротнага. Сэнс яго - ня столькі рэклямаваць уласныя погляды, колькі давесьці, што іншыя яшчэ горшыя. Гэтай мэце былі прысьвечаныя шматлікія «страшылкі» пра пагрозы, якія нясуць Беларусі іншы ўклад жыцьця, іншыя ўплывы, іншыя

погляды. Калі лічыць з памераў, страшылкам магло быць прысьвечана да чвэрці ўсяго яго асобнага выступу. Эканамістаў Лукашэнка пужаў замежнымі інвэстыцыямі ды капіталізмам наагул, радыёінжынэраў - беспрацоўем, студэнтаў БДУ - беларускім нацыяналізмам, а будучых мастакоў ды актораў - галодным жыцьцём і негарантаваным дабрабытам прадстаўніка вольнае прафэсіі на Захадзе. Вось некаторыя з найбольш тыповых лукашэнкаўскіх «страшылак».

Пра Эўропу

Мы думаем: если мы добры, то и к нам кто-то придет и поможет. «Вось, калі мы ў Еўропу гэтую ўскочым, усе мы будзем жыць багата». Родные мои, если и примут нас в эту Европу, мы будем там сидеть на третьей ступеньке. А то и на 10-й сверху (с. 98).

Пра інвэстыцыі

Что нам - и россиянам, и другим государствам - предлагают? Отдайте за бесценок предприятия! Мы «модернизируем» предприятие (это в лучшем случае), выкинем половину людей, которые там работают, они нам не нужны, сбросим всю социальную базу, которая на предприятии висит... Это все нам не нужно! Хватит одного цеха. Получим продукт. Продадим, заплатим вашим людям мизерную зарплату... То есть в бюджете - ничего, страна ничего не получает, только мизерную зарплату для трудового коллектива. Прибыль получают и полностью ее вывозят. Мы ее не реинвестируем (с. 26).

Пра чужое жыцьцё

Моя бы воля, я бы все сделал для того, чтобы сознательная часть нашего общества, 7 млн человек, побыла в Украине, в Россиц, в Узбекистане, Казахстане, Туркменистане, в Прибалтике, в Польше и сравнила нашу «плохую жизнь» с тамошней. «Кто хочет, оставайтесь!» Я уверен, что возвратились бы не 7 млн, которых мы отправили, а 7,5

миллиона... Да не беременными, ну шутники! (Смех у залі.) (с. 155).

Пра экалёгію

Даже поляки (часть пущи находится на их территории) к нам приезжают и нам завидуют. За время «перестройки и либерализации», «реструктуризации и приватизации» они свою пущу загубили. Мы еще сохранили. Съездите и посмотрите, кто не был. К сожалению, я редко там бываю, один-два раза в году (с. 206).

Пра рынкавую інфраструктуру

Адказваючы на пытаньне студэнта, чаму ў Беларусі не ствараецца сыстэма гіпатэчнага крэдытаваньня, якая магла б рэальна дапамагчы шматлікім маладым сем'ям у пабудове жытла, Лукашэнка адказаў: *«Нам все кажется, что существует волшебная палочка. Но все решается ответственной мыслью, твердой волей и тяжелой работой»* (с. 262).

І яшчэ адна, бадай што самая галоўная страшылка

Так случилось, сегодня в Беларуси избрали Президентом Лукашенко. Его наделили властью и требуют высочайшей ответственности буквально за все. Но это когда-либо кончится, понимаете? И «настанет рай» в Беларуси и «благоденствие». Так вы работайте на страну, на будущее, иначе снова провалитесь. И еще неизвестно, сколько Лукашенко будет у власти. Не переживайте! (с. 160).

Зазначым, што ў «страшылках», выказаных Лукашэнкам студэнцтву, няма аніякай новай інфармацыі. Гэта дастаткова стандартны набор для ўсёй яго палітычнай рыторыкі папярэдняга дзесяцігодзьдзя. Некаторыя з страшылак былі прызначаны прадухіляць магчымыя папрокі ў бок самаго кіраўніка дзяржавы. Напрыклад, узгадваньне сумнага лёсу польскай часткі Белавескай пушчы мусіць неяк адцягнуць увагу

ад яе лёсу на беларускай тэрыторыі. У адносінах да іншых заўважная супярэчлівасьць. Напрыклад, разважаючы пра інвэстыцыі, беларускі прэзыдэнт пры гэтым узгадвае досьвед Ірляндыі як краіны, што змагла пабудаваць свой дабрабыт на высокіх тэхналёгіях. Аднак ён апускае тую акалічнасьць, што менавіта звышлібэральны інвэстыцыйны клімат і прыход у краіну буйных карпарацыяў прывёў да стварэньня ў Ірляндыі высокатэхналягічнага сэктару. Цікава, што ў студэнцкім асяродзьдзі яго высновы і меркаваньні далёка не заўжды знаходзілі спачуваньне. Гэта было асабліва яскрава відаць з пытаньняў студэнтаў, асноўным клопатам якіх, як высьветлілася, было не як супрацьстаяць інвэстарам, а, напрыклад, як маладому спэцыялісту пражыць на заробак у 130 тысячаў рублёў ці калі студэнт на стыпэндыю зможа звадзіць сваю дзяўчыну ў рэстаран. На першае пытаньне Лукашэнка слушна адказаў, што гэта яшчэ ня самае горшае ў жыцьці, што заробак прыбіральшчыцы можа складаць і 80 тысячаў. Адказ на другое пытаньне заслугоўвае цытаты. *«Если у вас нет денег на ресторан, поговорите с девушкой в студенческом общежитии. Купите кефир и булочку»* (с. 249). Там жа: *«Мои девушки меня в ресторан за руку не тянули. Найдите другую девушку!»* На пытаньне іншага студэнта, «что лучше для народа - неприватизированная, не приносящая никому прибыль «Криница» или олигархи, получающие на предприятии прибыль и вывозящие деньги из страны, но уплачивающие налоги в бюджет страны, которые, в конце концов, получает народ», Лукашэнка адказаў даволі млява: *«Вопрос искусственный, политически заостренный, практикой не подтвержденный»* (с. 261). Сам аўтар рэцэнзіі зусім не спачувае алігархам, але, калі замяніць слова «алігарх» на «інвэстар», то ўсё будзе выглядаць інакш. Зрэшты, адказ на пытаньне мы ўжо ведаем. Лепш за ўсё - зачынены мытнымі падаткамі рынак, на якім і непрыватызаваная «Крыніца» будзе прыносіць прыбытак. Застаецца пацікавіцца, ці тая ж самая палітыка ёсьць рэцэптам посьпеху для тысячаў іншых беларускіх прадпрыемстваў, што не прыносяць прыбытку.

Пры гэтым наплыў пытаньняў наконт таго, калі ў Беларусі будуць створаныя ўмовы для годнага жыцьця і працы, зусім ігнараваць Лукашэнка ня мог. Назваўшы спачатку такі падыход

«неканструктыўным», ён адразу ж пачаў раздаваць авансы кшталту:

Я уже сказал: хотите получить поддержку, бизнес-план - на стол, не только мне - в Правительство, ректору, кому угодно, это немедленно станет предметом моего внимания, если это действительно что-то великое. Мы дадим вам бесплатно в аренду площади, дадим кредиты, если будем видеть, что вы сделаете что-то великое. Мы снимем налоги, творите, зарабатывайте! (с. 240).

Цяжка сказаць, ці задаволіць студэнтаў БДУ, БДЭУ ці БДУІР пэрспэктыва займець годнае жыцьцё толькі тады, калі дзяржава ўбачыць у іх працы нешта вялікае. Шмат хто зь іх рызыкуе проста не дажыць да гэтага сьветлага моманту.

У цэлым аналіз дыялёгаў Лукашэнкі са студэнтамі і ягонага выкарыстаньня страшылак прыводзіць да высновы, што беларускі лідэр мае даволі фіксаваны рэпэртуар ідэяў, пры гэтым ён не заўжды вылучаецца гнуткасьцю ў нечаканых для яго сытуацыях, калі публіка не рэагуе на яго думкі адэкватна яго чаканьням. Лукашэнка ня здолеў адчуць, што аўдыторыя збольшага не баялася таго, чым ён яе мусіў напужаць, і ня быў гатовы адказаць на яе сапраўдныя страхі. Відаць, сказваецца тая акалічнасьць, што большую частку сваей прэзыдэнцкай кар'еры ён спэцыялізаваўся амаль выключна на маналёгах і быў вызвалены ад неабходнасьці ўдзелу ў палітычных дэбатах унутры краіны.

АБЭЦЭДАРШЧЫНА АФІЦЫЙНАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

За апошнія некалькі год у пэўных колах беларускага грамадзтва ўмацавалася выснова, што Лукашэнка зьяўляецца ледзь не адзіным гарантам беларускай незалежнасьці. На сустрэчах са студэнтамі Лукашэнка проста расьпінаўся, усяляк падкрэсьліваючы сваю прыхільнасьць да незалежнасьці і самастойнасьці Беларусі. У кожным яго выступе можна

знайсьці цытаты кшталту: *«Беларусь - суверенная, независимая европейская страна. Когда-то территории, заселенные нашим народом, были в составе других государств... Но сегодня этого нет. Надеюсь, не будет и в будущем».* Аднак палітычна-гістарычны складнік афіцыйнага дыскурсу ня проста дагэтуль базуецца на абэцэдаршчыне, але, у стылі нядаўняга падручніка гісторыі Якава Трашчанка, яшчэ больш узмацняе яе. «Гістарычная» частка пасланьня Лукашэнкі беларускім студэнтам складаецца зь пяці асноўных тэзаў.

Па-першае, гэта тэза аб неіснаваньні беларусаў як адзінай нацыі па-за «ўсходнеславянскім трохкутнікам»:

Скажите, есть ли разница между русскими-москвичами и русскими-волжанами, сибиряками? Конечно, есть. Я к тому, что Полоцкое и Киевское княжества тоже были разными. Конечно, разными. Есть ли сегодня разница между белорусами-могилевчанами и гродненцами-белорусами или брестчанами? Ну конечно же, есть (с. 115).

Па-другое, гэта тэза аб неіснаваньні традыцыяў беларускай дзяржаўнасьці да абвяшчэньня БССР:

Исторический период Великого княжества Литовского нельзя идеализировать, как это делают некоторые литераторы. Это было не собственно белорусское государство, а Литва в симбиозе с подвластными ей русскими землями (с. 118).

Па-трэцяе, гэта тэза аб дадатным уплыве анэксіі Расеяй Беларусі:

Вхождение белорусских земель в состав России способствовало развитию зарождавшейся промышленности, их втягиванию во всероссийский рынок, что содействовало хозяйственной специализации Беларуси, подъему сельского хозяйства и промышленности

(с. 119).

Па-чацьвертае, гэта адмаўленьне поліканфэсійнага характару беларускага грамадзтва і наданьне праваслаўю ролі кансалідоўнай канфэсіі і нават ідэалёгіі:

Православие сыграло особую роль в консолидации народа. Сохранилось и укрепилось на протяжении более десятков веков. Это один из примеров исторического выбора народа (с. 118).

Па-пятае, гэта тэза аб незалежніцкім руху і нацыянальна-дэмакратычным палітычна-гістарычным дыскурсе як аб гульні паланізаванай інтэлігенцыі і элітаў:

Сегодня надо четко понимать: прошлые феодальные распри и усобицы не должны служить поводом, тем более «идеологическим обоснованием», для современных политических спекуляций!

І далей:

Включение восточнославянских земель в состав Российской империи имело для белорусского этноса тогда спасительный характер. Прогрессивное значение заключалось в том, что была ликвидирована шляхетская анархия, кровавые разборки между шляхтой, от которых страдал в первую очередь простой народ. Однако нельзя забывать и, как говорят, «дурную наследственность» высших слоев того общества. От этого мы тоже отходить не должны (с. 119).

Фактычна лукашэнкаўскія гістарычныя погляды супадаюць зь меркаваньнямі найбольш радыкальных імпэрскіх колаў сёньняшняй Расеі, якія імкнуцца да анэксіі Беларусі. Прывядзём, напрыклад, цытату са знакамітага артыкулу Мікалая Сяргеева і Аляксандра Фадзеева «Анатомія Саюзу Расеі і Беларусі», што зьявіўся некалькі гадоў таму ў «Независимой

газете»:

Пачынаючы з канца чатырнаццатага стагодзьдзя ўся гісторыя Белай (Заходняй) Русі ёсьць сапраўды гераічным змаганьнем народу за яго рускасьць. Гэтае змаганьне вялося ня толькі супраць замежнага панаваньня польскай Рэчы Паспалітай, але таксама супраць яго ўласнай «нацыянальнай эліты», якая ня толькі служыла польскаму дваранству, адраклася ад расейскага імя і праваслаўнай рэлігіі, але таксама спрабавала апраўдаць сваю здраду прыналежнасьцю беларусаў да «эўрапейскае цывілізацыі».

Больш за тое, Лукашэнкам адзначаецца, што ўваходжаньне беларускіх земляў у склад Расеі мела дадатны ўплыў на разьвіцьцё ўласна беларускай культуры:

Беларусь никогда не была «отсталой аграрной окраиной самодержавной России». Не буду из-за недостатка времени приводить конкретные факты, напоминать о нашем возрождении, культурном, национальном возрождении, зазвучавшем в творчестве Франтишка Богушевича, Адама Гуриновича, позднее - Янки Купалы, Якуба Коласа, Максима Богдановича, других представителей белорусской интеллигенции

(с. 119).

Мабыць, і лукашэнкаўскую эпоху празь некалькі дзесяцігодзьдзяў можна будзе назваць эпохай Васіля Быкава, Алеся Пушкіна ды Славаміра Адамовіча...

Нарэшце, гэта тэза аб расейскай мове як роднай для беларусаў:

Однажды я сказал Борису Николаевичу Ельцину всерьез и в шутку, когда он поблагодарил белорусов за то, что и русский язык у нас государственный: «А за что Вы благодарите? Вы хотите сказать, что русский язык - это только ваш, российский? Нет, это и наш язык, потому что мы за годы, когда

жили вместе, вложили в этот язык много своей души. Поэтому Вы, пожалуйста, лишнее себе не присваивайте (sic!). *Ваш язык - это больше там, где «окают» и «акают»* (с. 113).

І далей:

Наше «двуязычие» имеет древние корни и древние традиции. Русский язык на белорусских землях воспринимался не как чужой, насильственно привнесенный, а как «книжный» язык образованных людей, язык общения с соседними княжествами, который не мешал развитию и параллельному использованию и формированию белорусского языка (с. 109).

Трэба меркаваць, калі расейская мова - «кніжная мова адукаваных людзей», то беларуская - «сялянская», на якой «нічога разумнага не скажаш».

Пра стаўленьне Лукашэнкі да беларускай мовы пагутарым крышачку пазьней. Пакуль што зазначым: на фоне палітычных кампаніяў, якія разгортваюцца афіцыёзам і ўжо атрымоўваюць мянушкі кшталту «газавай вайны за незалежнасьць», раздачы тэнісістам ордэнаў «за перамогу над Расеяй», Лукашэнка пасьлядоўна прытрымліваецца палітыкі русіфікацыі гістарычнай сьвядомасьці і сьветапогляду беларусаў (пра моўную русіфікацыю мы тут нават і ня згадваем). Калі расейскі націск на Беларусь узмацняецца, калі незалежніцкая рыторыка, здавалася б, усё больш апаноўвае афіцыйную прапаганду, улада сьвядома мацуе ідэалягічную пляцоўку, што можа стаць падставай для страты дзяржаўнасьці і незалежнасьці. Як растлумачыць такі парадокс? Адна з самых распаўсюджаных вэрсіяў - Лукашэнка дагэтуль пакідае сабе магчымасьць для новага паходу ўва ўнутраную расейскую палітыку. Ня будзем цяпер абмяркоўваць гэтай высновы, зазначым толькі, што несумяшчальнасьць паміж аб'ектыўнай патрэбай уладнай эліты і найперш Лукашэнкі ў дзяржаве, з аднаго боку, і суб'ектыўным нежаданьнем надаць ёй пэўную гістарычна-культурную легітымнасьць з прычыны варожасьці да нацыянальнага палітычна-культурнага дыскурсу (і немагчымасьці

легітымізаваць ім тую форму дзяржаўнасьці, што складваецца ў Беларусі) - з другога, уяўляе адну з галоўных супярэчнасьцяў лукашэнкаўскай Беларусі, без вырашэньня якой лёс краіны будзе й надалей знаходзіцца ў падвешаным стане і збольшага залежаць ад адной пэрсоны.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ДАГЭТУЛЬ МОВА ВОРАГАЎ

Стаўленьне сёньняшніх уладаў да беларускай мовы становіцца больш зразумелым, калі ўважліва прасачыць стыль яе выкарыстаньня імі. Было б вельмі недарэчна меркаваць, што ўлада, і асабліва Лукашэнка, ёй зусім не карыстаюцца. Асабіста Лукашэнка раз-пораз прыбягае да свайго старога прыёму: беларускія словы кропкава ўстаўляюцца ў яго расейскую гутарку, каб падкрэсьліць, адцяніць сваіх палітычных апанэнтаў і нядобразычліўцаў. Гэты прыём, сапраўды, даўно вядомы: устаўкі кшталту «пісьменьнікі» і «дзеячы» дзеля азначэньня апазыцыйна настроенай інтэлігенцыі, «назіральнікі» для ўласна апазыцыянэраў ці «мітусьня» для азначэньня кампрамату выконваюць у лукашэнкаўскай мове тую ж самую ролю, што і сыстэма «свой-чужы» ў ракетна-зэнітных комплексах тыпу «Стынгеру» ці расейскай «Іголкі». У прамовах перад студэнтамі Лукашэнка выкарыстоўваў той жа самы прыём, гаворачы па-беларуску:

- Пра палітычных апанэнтаў:

У нас это уже было в начале 90-х, когда у власти были определенные люди. Они попытались заставить всю страну размаўляць на той мове, на якой яны хацелі (с. 163).

…Вот это была еще одна причина дикого наката на Лукашенко. Более того, начали обвинять даже не в том, что торгует, а что Лукашенко « мае за мяжой мільярды альбо трыльёны даляраў» *от торговли оружием* (с. 22).

- Пра Захад:

Лукашенко не жалуют, особенно ў Еўропе і ў Амерыцы, не таму, што ён не з той гліны злеплены, чым яны, а таму, што дзяржаву не аддаў (с. 150).

- Пра інтэлігенцыю:

Каким должен быть творческий человек? Прежде всего, это патриот по сути, а не игрок на патриотических чувствах. Тот, кто не спекулирует этими высокими чувствами, как это делают некоторые наши «свядомыя інтэлігенты». *Дескать, «Президент плохой», народ* - «быдла», *страна* - «задворкі Еўропы». *И только они день и ночь живут «думой про Беларусь»* (с. 158).

Яшчэ адзін эпізод - узгадваньне пра паэта Ўладзімера Някляева, які эмігравaў за мяжу:

Вы читали его стихи? Читали. Назовите, что вы читали. (Невнятные ответы из зала.) *И я, извините,* не памятаю тых вершаў, за якія вы яму прапанавалі даць дзяржаўную прэмію (с. 159).

Нельга без іроніі заўважыць, што менавіта верш Някляева «Мы першы бакал уздымем па праву за Белую Русь - за нашу дзяржаву» нейкі час быў неафіцыйным гімнам лукашэнкаўскай ідэалёгіі.

ХТО НЯ З НАМІ, ТОЙ СУПРАЦЬ НАС

Нарэшце, у кантэксьце разважаньняў пра дыялёг ды супрацоўніцтва з Лукашэнкам заслугоўваюць кароткага агляду яго развагі аб ролі інтэлігенцыі (якая, паводле лёгікі ў той ці

іншай форме і мусіць весьці такі дыялёг) і стаўленьні да творчай асобы ды незалежнага мысьленьня. Магчымыя ілюзіі наконт магчымасьці такога дыялёгу Лукашэнка разьбівае адразу ж, калі пачынае распавядаць пра ўзровень дабрабыту інтэлігенцыі: *«Все говорят: «Ты должен нам дать деньги!». Я никому ничего не должен. Это вы должны государству и мне как представителю этого государства»* (с. 136).

Наагул, атаясамліваньне дзяржавы і ўсяго астатняга ў ёй зь першай асобай праходзіць праз большасьць яго выступаў. Найбольш тыповая выснова: *«Все же понимают: если Президента предал, то продаст всех прочих, с потрохами притом»* (с. 148).

Акрамя таго, творчую інтэлігенцыю чакае яшчэ адзін непрыемны сюрпрыз: пасіўная згода з афіцыйнай лініяй больш не вітаецца, для заваёвы прыхільнасьці дзяржавы цяпер патрабуецца нешта большае. Такое стаўленьне цалкам зразумелае, зыходзячы з пасылкі, што менавіта творчыя людзі «абавязаны» прэзыдэнту. У Акадэміі мастацтваў, дарэчы, гэта ледзь не спрычыніла сур'ёзныя праблемы для кіраўніцтва ВНУ:

У вас якобы тут заключили «договор»: «Мы в оппозицию не пойдем, в оппозиционных тусовках участвовать не будем, но вы, ректоры и преподаватели, не привлекайте нас и к государственным массовым и другим мероприятиям». Не правда?.. Значит, кого-то придется наказать. Того, кто это доложил. И я попрошу к концу дня прояснить мне эту ситуацию. Но если это есть, а вы меня обманываете, труба! (с. 146).

Любы адыход ад праўладнае пазыцыі Лукашэнка інтэрпрэтуе як пагарду да сябе. Вяртаючыся да «разбораў палётаў» на прэзыдэнцкіх выбарах у БДУ, ён прызнаўся ў гэтым адкрыта:

Но когда большинство на избирательном участке были студенты, преподаватели БГУ, проявленное непонимание, честно говоря, конечно, было мне неприятно. Я человек эмоционально восприимчивый, это был для меня какой-то удар.

Хотя с точки зрения электоральной, политической - что такое тысяча-другая голосов из 7,5 миллиона голосов? Но радости это не доставляет. Думаю: вот тебе и Козулин! (с. 237).

І на заканчэньне тэмы - прынцыповасьць свайго стаўленьня да інтэлігенцыі Лукашэнка падкрэсьліў такім выказваньнем:

Подкупа в моей политике не будет никогда, только принципиальные и честные отношения: ты даешь государству - мы поддерживаем тебя. Кто не согласен - до свидания! (с. 276)

Пакінем гэты радок без камэнтароў.

* * *

У цэлым можна зрабіць выснову, што шматлікія меркаваньні аб тым, што Лукашэнка, яго палітыка альбо яго стаўленьне да якой-небудзь сур'ёзнай палітычнай праблемы ці працэсу апошнім часам мяняецца, вельмі недарэчныя. Кіраўнік дзяржавы паўстаў такім, якім мы яго заўжды бачылі і да якога ўжо пасьпелі прызвычаіцца. «Гістарычны выбар» застаецца такім жа, якім ён і быў дзесяцігодзьдзе таму. Памяняўся хутчэй навакольны сьвет, але гэтыя зьмены далёка не заўжды адбываюцца дзякуючы цяперашняму кіраўніку нашай дзяржавы.

ПАСТСКРЫПТУМ:
АЧАПЯТКІ ЛУКАШЭНКАЎСКАЙ МОВЫ

Лукашэнкаўская мова зноў не абышлася бяз выразаў, якім наканавана ператварыцца ў афарызмы. У нейкай ступені гэта лёс неардынарнай, харызматычнай асобы, якая прыцягвае ўвагу і валодае розумам як паплечнікаў, так і апанэнтаў. Тут, як кажуць, без камэнтароў, альбо кожны разумее ў мяжах уласнай

разбэшчанасьці.

Зь лекцыі на тэму «Будучыню краіны вызначаць высокія тэхналёгіі»: *«Знаете, сколько миллиардов рублей мы затрачиваем на учебники? И сколько мы затратили и сколько вреда этим самым нанесли нашему обществу!»* (с. 74).

Пра жанчынаў... *«Я зашел - аэробика. Мне показали там, потому что я ни разу аэробики не видел. Я сразу сказал: «Этих бы красавиц - на лыжи!»* (с. 178).

Адказ на пытаньне, чаму не відаць першай лэдзі: *«Потому что уже насмотрелись. Вот они, в зале* (студэнткі, выкладчыцы. - **Аўт.**), - *это все мои «леди»* (с. 194).

Пра карупцыю ў сыстэме ВНУ: *«Есть деятели, что сами в тюрьму идут. Говорят потом, что Лукашенко посадил в тюрьму. Да я никого не сажаю! Я оберегаю, чтобы в тюрьму не сел. А он руки вытягивает: цепляй ему наручники»* (с. 206).

Пра сябе: *«Народ белорусский рискнул и избрал меня Президентом. Это бывает чрезвычайно редко в истории и больше, возможно, не будет»* (с. 233).

Пра моладзь: *«Конечно, задрав штаны, вы не бегали за комсомолом, как он* (Ясенін. - **Аўт.**) *писал. А мы-то бегали. И не только за комсомолом»* (Сьмех у залі.) (с. 246).

Нарэшце, амаль паводле Фройда:

А недавно Владимир Владимирович Путин принял меня в Волынском. Там Сталин прожил последние 19 лет. Я благодарен Президенту России, что он настоял, чтобы я осмотрел дом, где жил Сталин, помещение, где он умер. Рассказали, где лежал, как лежал. Он просто валялся там, и ему не оказывали никакой помощи. Это прежде всего Берия и те «помощнички», которые крутились под ногами и повторяли: «Ты вождь, ты самый великий!» Я, кстати, не терплю льстецов возле себя. Они все, пока здоров и у власти, тут как тут. А не дай бог что случится - труба. Где нет чести, нет и порядочности (с. 194).

Юры Чавусаў
Цэнтры цяжару ідэалягічнай працы

ЮРЫ ЧАВУСАЎ (нар. у 1978 г. у Менску) - палітолаг, юрыст. Сябра рэдакцыйнай рады часопісу «Палітычная сфера».

Выданьні, што аглядаюцца ў артыкуле:
О состоянии идеологической работы и мерах по ее совершенствованию. Материалы постоянно действующего семинара руководящих работников республиканских и местных государственных органов. - Минск: Академия управления при президенте РБ, 2003.

Национальная безопасность Республики Беларусь. Современное состояние и перспективы / Мясникович М. В., Никитенко П. Г., Пузиков В. В. и др. - Минск: Право и экономика, 2003.

Ядвига Яскевич. Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты. Учебно-методическое пособие для высших учебных заведений. - Минск: РИВШ БГУ, 2003.
Вось і мінуў год з моманту правядзеньня вядомай нарады па пытаньнях ідэалёгіі - так званай сэсіі стала дзейнага сэмінару кіраўнічых работнікаў дзяржапарату, што адбылася 27 і 28 сакавіка 2003 году. Прайшоў першы год агульнанацыянальнай ідэалягічнай кампаніі, абвешчанай асабіста Лукашэнкам. На

яго прыпала ўвядзеньне шмат якіх элемэнтаў «ідэалягічнай працы». Выдадзена некалькі падручнікаў і дапаможнікаў па асновах дзяржаўнай ідэалёгіі, распрацавана мэтодыка выкладаньня гэтай дысцыпліны, на спэцыяльных курсах набылі патрэбную кваліфікацыю выкладчыкі, палітінфарматары і ідэалягічныя «камісары» на прадпрыемствах. Ідэалягічная вэртыкаль цяпер ня просты гук, не даніна настальгіі па савецкіх часах, а стройная калёна прафэсійных прапагандыстаў. Створана і пастаянна разьвіваецца сыстэма абароны дзяржавы ад інфармацыйнай агрэсіі. Адключэньне расейскага газу паказала яе эфэктыўнасьць, а ўтаймаваньне непакорных сусьветных інфармацыйных сетак стала рэальнай пэрспэктывай. На месцы «нячэсных» сродкаў масавай інфармацыі і няўрадавых арганізацыяў разьвіваецца падкантрольная дзяржаўнай уладзе сетка электронных мэдыяў ды прыдзяржаўных грамадзкіх аб'яднаньняў. Выдадзены нарматыўна-прававыя акты, што рэглямэнтуюць парадак ажыцьцяўленьня ідэалягічнай працы.

Каб падвесьці вынікі «ідэалягічнага году», трэба даць ацэнку сукупнасьці ўсіх згаданых працэсаў. Сам дзяржаўны апарат яе ўнікае: у адкрытыя крыніцы трапляюць збольшага выразна палітызаваныя ацэнкі - ці то пераможныя рэляцыі з ідэалягічных франтоў, ці то разгромная крытыка на адрас неразумных чыноўнікаў, якія ў чарговы раз недзе «на месцах» перастараліся і падмянілі рэалізацыю віртуознай задумы вульгарным брэйнвошынгам. Аналіз ідэалягічнай кампаніі незалежнымі экспэртамі таксама часьцей за ўсё праводзіцца з пазыцыяў палітычнага процістаяньня.

Вынікі ідэалягічнай працы, праведзенай дзяржаўным апаратам за гэты год, будуць відаць толькі тады, калі Лукашэнка адкрыта абвесьціць пра сваё жаданьне пераабрацца на трэці тэрмін і зробіць рэальныя крокі па дасягненьні гэтай мэты. Аднак папярэднія высновы аб ёй можна зрабіць ужо цяпер. Гэтыя высновы будуць датычыць мэтадаў яе ажыцьцяўленьня і будуць грунтавацца на матэрыяле найбольш характэрных у гэтым пляне публікацыяў, а таксама на ўласных назіраньнях. Не ўступаючы ў дыскусію аб сутнасьці ідэалёгіі (альбо ідэалёгіяў), што навязваецца беларускаму грамадзтву, мы будзем

аналізаваць тыя захады і мэтады, якімі пашыраецца гэтая ідэалёгія. Таксама ў нашу задачу не ўваходзіць ацэнка пасьпяховасьці зробленага за мінулы год дзяржаўнымі ідэолягамі і прапагандыстамі.

Мы зыходзім з таго, што цяпер у краіне сфармаваная і дзейнічае сыстэма дзяржаўнай ідэалягічнай працы - сыстэма захаваньня і ўстойлівага пашырэньня, па магчымасьці да межаў усяго грамадзтва, сукупнасьці ідэяў, поглядаў, уяўленьняў, пачуцьцяў і вераваньняў аб мэтах разьвіцьця беларускага грамадзтва і шляхоў дасягненьня гэтых мэтаў, што выпрацоўваецца кіруючай палітычнай элітай. Для такога падыходу прынцыповае значэньне мае інтэрпрэтацыя адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі як аднаго з мэтадаў палітычнага ўзьдзеяньня на грамадзтва з боку ўладаў, як своеасаблівай зброі ў палітычнай барацьбе. Адпаведна, ідэалягічная праца ўва ўсіх яе праявах (у агітацыйна-прапагандысцкім і інфармацыйным полі ўнутры краіны альбо ў стасунках зь міжнароднай супольнасьцю, у філязофска-навуковым і акадэмічным, кадравым, выхаваўчым і адукацыйным аспэктах) ёсьць працэсам выкарыстаньня гэтага мэтаду палітычнай барацьбы. Паколькі кіруючая эліта неаднародная (яна падзеленая і паводле набліжанасьці да першай асобы дзяржавы, і паводле тэрытарыяльных кланаў, і г. д.), ідэалягемы, што ёю трансьлююцца, могуць быць супярэчлівымі.

Нарэшце, неабходна зрабіць яшчэ адну папярэднюю заўвагу. Большасьць аналізаў, натхнёных абуральным фактам абвяшчэньня адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі, яе спрэчным зьместам і сумнеўнымі мэтадамі яе пашырэньня, пакідаюць у баку юрыдычны аспэкт праблемы. Аднак само навязваньне адзінай ідэалёгіі і мэтады, якімі яно ажыцьцяўляецца, сьведчаць пра парушэньне Канстытуцыі Беларусі. Яе артыкул 4 недвухсэнсоўна сьцьвярджае, што дэмакратыя ажыцьцяўляецца на падставе разнастайнасьці палітычных інстытутаў, ідэалёгіяў, меркаваньняў, а ідэалёгія палітычных партыяў, рэлігійных ці грамадзкіх арганізацыяў, сацыяльных групаў ня можа ўсталёўвацца ў якасьці абавязковай для грамадзянаў. Паколькі мы лічым эліту, якая кіруе ў дадзены момант краінай, сацыяльнай групай, яе ідэі, палітычныя інтарэсы, вартасьці і

сьветапогляд, згодна з згаданай нормай Канстытуцыі, ня могуць навязвацца грамадзянам у выглядзе адзінай (пры ўсёй яе ўнутранай супярэчлівасьці) «дзяржаўнай» ідэалёгіі. Таму любыя захады дзяржавы для ўвядзеньня адзінага абавязковага стандарту думак па сутнасьці ёсьць антыканстытуцыйнай дзейнасьцю.

Існуе некалькі вэктараў ідэалягічнай працы, а таксама цэнтраў, адказных за яе ажыцьцяўленьне. Іх актыўнасьць адрозьніваецца ня толькі формай, мэтадамі дзейнасьці і мэтавымі групамі - адрозьніваюцца таксама зьместы сьветапоглядаў, носьбітамі і трансьлятарамі якіх выступаюць прадстаўнікі гэтых вэктараў узьдзеяньня.

КРЭАТЫЎНЫ ВЭКТАР, ПРАДУКЦЫЙНЫ ЦЭНТАР

Першакрыніцай беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі зьяўляюцца палітычныя рашэньні, прамовы і выступы сёньняшняга кіраўніка нашай дзяржавы. Акурат яму належыцца гонар ініцыяваньня ідэалягічнай працы і адказнасьць за яе наступствы. Хоць зьмест розных аўтарскіх дапаможнікаў па асновах дзяржаўнай ідэалёгіі значна адрозьніваецца, а самадзейнасьць асобных прапагандыстаў на прадпрыемствах і ў органах дзяржаўнага кіраваньня часам мяжуе з ідэалягічнай дывэрсіяй, хоць часам выкладнікі дзяржаўнай ідэалёгіі выкладаюць студэнтам ідэі, запазычаныя зь лексыкону апазыцыйных палітычных партыяў, аналізаваць дзяржаўную ідэалягічную працу бяз выхаду на асобу прэзыдэнта - гэта тое самае, што аналізаваць творчасьць філёзафа, не зьвяртаючы ўвагі на гісторыю ягонага жыцьця.

Гэты найбольш публічны па сваіх прапагандысцкіх праявах сэктар ідэалягічнай працы адначасова найменш вывучаны з пункту гледжаньня свайго функцыянаваньня. Гэта тая кухня, дзе спараджаюцца ідэі - складнікі дзяржаўнай ідэалёгіі. Ідэі навідавоку, яны агучваюцца і, з падачы кіраўніка дзяржавы, настойліва навязваюцца нашым суграмадзянам - але мэханізм іх фармаваньня атулены таямніцай. Тут мы маем клясычную

«чорную скрыню»: на ўваходзе - зьявы рэчаіснасьці, унутры - невядома што, на выхадзе - першасны ідэйны прадукт, які пасьля адпаведнай апрацоўкі робіцца дзяржаўнай ідэалёгіяй, прызначанай для спажываньня грамадзянамі.

Менавіта імкненьне зразумець, як у нашым грамадзтве ўзьнікаюць пэўныя ідэі і перакананьні, чаму нам навязваюцца пэўныя стандарты мысьленьня, падштурхоўвае аналітыкаў да псыхалягічнага, а часам і псыхааналітычнага падыходу да праблемы. Заключэньне доктара Шчыгельскага сталася, напэўна, яго першым шырока вядомым прыкладам. З падобных пазыцыяў у аналізе мэханізму прадукаваньня дзяржаўнай ідэалёгіі зыходзяць і аўтары нашумелых кніг пра беларускую палітыку - «Нашэсьця», «Работы над памылкамі» або «Выпадковага прэзыдэнта». На жаль, высьветліць праўдзівасьць высноваў аб мэханізмах мысьленьня беларускага прэзыдэнта, што робяцца ў гэтых выданьнях, вельмі складана. Тым ня менш, цікаўнасьць абывацеля да іх сьведчыць пра ягоную відавочную патрэбу растлумачыць, адкуль, на падставе якіх прынцыпаў і законаў ствараецца фэномэн прэзыдэнцкай палітыкі, той палітыкі, якая цяпер набыла выразна ідэалягізаваную афарбоўку.

Менавіта сьвядомасьць беларускага лідэра ёсьць крыніцай ідэалягемаў, якія потым трапляюць у перадавыя артыкулы газэтаў, у падручнікі і масы. У гэтым сэнсе назіральнікі выступаў Лукашэнкі ў этэры альбо ўдзельнікі асабістых сустрэчаў зь ім маюць каштоўную магчымасьць назіраць за непрадказальным і парадаксальным працэсам нараджэньня ідэалёгіі, калі, напрыклад, зь нічога ніякага Расея робіцца параўнальнай па крывадушнасьці і вераломстве з нацысцкай Нямеччынай, парушальніцай сьвятога пакту Молатава-Рыбэнтропа.

Вестуны афіцыйнай ідэалягічнай дактрыны саромеюцца наўпрост сказаць, хто яе сапраўдны аўтар, - і гэта пакідае ў яе спажыўцоў пачуцьцё недагаворанасьці, выклікае раздражненьне разыходжаньнем словаў прэзыдэнта і дзеяньняў ягоных прапагандыстаў. Толькі слухаючы прамову правадыра, можна атрымаць дакладнае, хоць і супярэчлівае ўяўленьне пра

тое, якая ідэалягічная пазыцыя цяпер афіцыйная і адзіна правільная. У іншым выпадку спажывец атрымлівае папсаваны пасярэднікам сурагат альбо, што яшчэ горш, сьвядомую падробку. Выслоўі прэзыдэнта могуць нават быць сродкам змаганьня са скажэньнямі, якія ягоная думка можа перажыць падчас апрацоўкі штатнымі ідэолягамі.

Чаму ж тады ня выдаць цытатніка Лукашэнкі ў зручным фармаце і трывалым пераплёце? Чаму актывісты БРСМу ня маюць у кішэні чароўнай кніжачкі, якая б давала адказ на ўсе пытаньні, што паўстаюць падчас арганізацыйных нарадаў і ў прыватным жыцьці? Чаму рэдагуюцца выступы прэзыдэнта на дзяржаўным тэлебачаньні і ў прэсе? Напэўна таму, што чыноўнікі несьвядома страшацца культурнай рэвалюцыі і адчуваюць: калі да гэтага дойдзе, то яны ўсе разам, зь бюджэтамі, праграмамі, палітінфармацыямі ў дзяржаўных установах і прыватных банках, паездкамі па райцэнтрах і сэмінарамі на вытворчасьці, стануць непатрэбнымі.

У гэтым сэнсе кніжка «О состоянии идеологической работы...» яскрава паказвае той разрыў, які існуе паміж ідэалягічнай дактрынай прэзыдэнта і яе інтэрпрэтацыямі работнікамі ўладнай вэртыкалі. Яна каштоўная якраз тым, што зьмяшчае стэнаграму пасяджэньня па пытаньні ідэалёгіі зь мінімальнымі купюрамі, таму ў выступе прэзыдэнта таксама выразна відаць розьніца паміж падрыхтаванай сьпічрайтэрамі «рыбай» і яго ўласнымі імправізацыямі.

Параўнаўшы праграмны выступ прэзыдэнта з выступамі Станіслава Князева, Міхаіла Арды, Ягора Рыбакова і іншых, нягледзячы на іх пастаянныя спасылкі на правадыра, нельга пазбавіцца ад адчуваньня прынцыповага адрозьненьня паміж першым і другімі. Гэтая кніжка - своеасаблівы зборнік «крывых люстэрак», дзе пазыцыя Лукашэнкі скажаецца альбо ў вайскова-ўтылітарным стаўленьні да жыцьця Леаніда Мальцава, альбо ў апантанай вернасьці правадыру Міхаіла Арды, альбо ў арыентацыі на чароўныя магчымасьці сваёй «палітычнай калыханкі» Ягора Рыбакова. У сваім шчырым (хто б сумняваўся!) імкненьні да разуменьня правільнай ідэалягічнай лініі ўдзельнікі сэмінару дэманструюць вельмі розныя, часам

нават палярныя падыходы да зьместу дзяржаўнай ідэалёгіі. Экстрэмізм і нецярпімасьць маладога і гарачага Арды кантрастуюць з навуковасьцю і дэмакратычнасьцю памяркоўнага і разважлівага Бабосава. Памыляюцца ўсе, правадыра не разумее ніхто.

У такім пэрсаніфікаваным характары нашай ідэалягічнай працы - ейнае адрозьненьне ад савецкага першаўзору. Неаднароднасьць і рознабаковасьць тэкстаў, на якія абапіраліся савецкія ідэолягі, абумоўлівалі магчымасьці для ваганьня генэральнай ідэалягічнай лініі. Цяпер, абапіраючыся толькі на думкі прэзыдэнта, ідэолягі фармуюць плюралістычнае ідэалягічнае поле менавіта праз прынцыповую немагчымасьць адпавядаць адзінаму ідэалягічнаму стандарту, які мяняецца ў залежнасьці ад настрояў і думак адной асобы.

Ідэалягічнаму люстэрку ўсё роўна, які аб'ект паўстане перад ім, - усё адно яго адбітак будзе скажоным.

АХОЎНЫ ВЭКТАР, АБАРОНЧЫ ЦЭНТАР

У нашай ідэалягічнай сыстэмы ёсьць інстынкт самазахаваньня - і гэтым яна нагадвае любы жывы арганізм. У рэальным палітычным жыцьці немагчыма абапірацца толькі на адны ідэалягічныя прынцыпы, сфармуляваныя асабіста Лукашэнкам. Ягоныя дэманстратыўна сяброўскія стасункі з Садамам Хусэйнам і Слабаданам Мілошавічам і ягоная адпаведная рыторыка прынесьлі краіне не дывідэнды, а страты. Як паказвае гістарычны досьвед, замежнапалітычная дактрына, сфармаваная на ідэалягічных прынцыпах, - гэта шлях дзяржавы да самагубства. Гэтая тэза справядлівая і для іншых кірункаў дзяржаўнай палітыкі. Кіраваньне дзяржавай патрабуе рознабаковага бачаньня праблемаў, ацэнкі рэальных палітычных фактараў і цьвярозай выпрацоўкі рашэньняў. Таму розьніца ў падыходах да дзяржаўнай ідэалёгіі з боку розных прадстаўнікоў кіруючай эліты дае магчымасьці для прэзэнтацыі рацыянальных палітычных рэакцыяў - розных пазыцыяў у дачыненьні да дзяржаўнай палітыкі. Аднак, дапускаючы такія

вонкава рацыянальныя рэакцыі, ідэалёгія мае цяжкасьці ў аб'ектыўнай ацэнцы навакольля - і гэта стварае праблему.

Сама ідэалёгія па сваёй сутнасьці заўжды ірацыянальная ў ацэнцы навакольнай рэчаіснасьці, паколькі яна арыентуецца на сьвет ідэяў і сымбаляў, на прастору ўяўнага. Нават набываючы навуковую форму і выкарыстоўваючы навуковую тэрміналёгію, яна ня можа быць навукай - што б ні даводзілі нашы навасьпечаныя ідэолягі. Вочы ідэалёгіі заўжды заплюшчаныя, яны ня бачаць рэчаіснасьці ці, дакладней, бачаць уяўную альбо скажоную рэчаіснасьць. У пэўным сэнсе носьбіту ідэалёгіі прасьцей жыць з заплюшчанымі вачыма, чым глядзець на сьвет праз ідэалягічную прызму. Таму, калі яго жыцьцёвы досьвед супярэчыць ягоным ідэалягічным перакананьням, ён хутчэй ірацыянальна перастане верыць сваім вачам, чым паставіць пад сумнеў свае ідэалягічныя прынцыпы. Апанаваны ідэалёгіяй чалавек можа адначасна даводзіць непазьбежнасьць надыходу камунізму, іграць на фондавай біржы і валодаць прыватным капіталам у выглядзе нерухомасьці і сродкаў вытворчасьці. Сьвет ідэяў і сьвет рэальных дзеяньняў ды рэчаў у ягонай сьвядомасьці не сутыкаюцца - яны ўтвараюць розныя вымярэньні яго асобы. Гнуткае чалавечае мысьленьне можа падпарадкавацца любым, самым адчайным выбрыкам дзяржаўнай ідэалягічнай машыны. Зьмяніць прасацыялістычны калектывізм з арыентацыяй на аднаўленьне Савецкага Саюзу на дзяржаўна-капіталістычны памяркоўны нацыяналізм з пастаяннымі нападкамі на былога «старэйшага брата» - гэта, як дэманструе беларускі досьвед, вельмі проста.

На ўзроўні сацыяльнай групы (партыі, страту і г. д.) гэтая супярэчнасьць ідэалягічнага сьветапогляду звычайна здымаецца шляхам рэвізіі ідэалёгіі, яе прыстасаваньня да рэаліяў жыцьця і палітычнай барацьбы альбо празь зьмену кіруючай групоўкі. Аднак калі створаная на загад кіраўніка дзяржавы ідэалёгія навязваецца ўсяму грамадзтву, справа выглядае інакш. Нягледзячы на яе бясспрэчны ірацыяналізм, дзяржаўны апарат мусіць рацыянальна вырашаць звычайныя задачы бягучага дзяржаўнага кіраваньня. Абаперціся на адны ідэалягічныя шаблёны цяжка, цалкам заплюшчыць на іх вочы немагчыма, паколькі яны спушчаны зьверху. Інстынкт

самазахаваньня прымушае стварыць сыстэму ідэалягічнай бясьпекі, што падаецца як бясьпека нацыянальная альбо дзяржаўная. Ейная задача - прыстасаваць ідэалягічныя прынцыпы пад рэальныя патрэбы дзяржаўнага кіраваньня. На гэтым узроўні ідэалягічная праца афармляецца як дзейнасьць для захаваньня нацыянальнай бясьпекі. Уся дзяржаўная сыстэма ператвараецца ў суцэльную сыстэму нацыянальнай бясьпекі. На добры лад, мы мусім мець не Міністэрства інфармацыі, а Міністэрства інфармацыйнай бясьпекі, не Міністэрства сельскай гаспадаркі, а Міністэрства харчовай бясьпекі. І выканаўчую ўладу ў краіне мусіць узначальваць ня ўрад, які нічога не вырашае, а Рада Бясьпекі. Гэты вэктар ідэалягічнай працы заслугоўвае павагі хаця б за тое, што бачыць рэчаіснасьць - і жахаецца яе.

Тэхналягічныя элемэнты гэтай сыстэмы - перш-наперш спэцслужбы і іншыя групы, часта зьвязаныя зь «сілавікамі» і іх кліентэлай, у тым ліку прыватна-дзяржаўным бізнэсам на стратэгічна важных для дзяржаўнай эліты кірунках, - ня могуць у сваёй дзейнасьці арыентавацца на голыя ідэалягічныя пастуляты. У гэтым выпадку іх чакае параза ў эканамічнай, інфармацыйнай, энэргетычнай і іншай палітыцы. Нельга, напрыклад, кіравацца ідэалягічнымі пастулятамі ў паліўна-энэргетычнай сфэры: пры гандлі аб цэнах на газ спасылкі на аналітычныя выкладкі работнікаў Беларускага тэлебачаньня і выслоўі прэзыдэнта не працуюць. Тут няма месца ідэалягічным ілюзіям, што распаўсюджваюцца з высокіх дзяржаўных трыбунаў, з экранаў дзяржаўнай тэлевізіі, а цяпер ужо і з акадэмічных катэдраў.

На гэтым узроўні дыскусіяў выкарыстоўваюцца паняцьці, неўласьцівыя афіцыйнаму ідэалягічнаму дыскурсу. «Міжнародная ізаляцыя» тут ужо не прыдумка ідэалягічных ворагаў, а рэальны стан рэчаў, які трэба выпраўляць для дасягненьня жыцьцёва важных для гаспадаркі краіны мэтаў. І таму Міністэрства замежных справаў ува ўнутранай ацэнцы сваёй працы ня можа апэраваць толькі тэрмінамі кшталту «посьпехі замежнай палітыкі», бо інакш сапраўдная дзейнасьць гэтага міністэрства цалкам перанясецца ў сфэру ідэальнага. МЗС мусіць прарываць міжнародную ізаляцыю, а таму факт яе

наяўнасьці трэба прызнаваць, нягледзячы на ўсе ідэалягічныя пастуляты. Калі першая асоба краіны (а за ёй і агітпроп) кажа пра «наш супэркампутар» і посьпехі ў пераходзе да постіндустрыйнага грамадзтва, Міністэрству інфармацыі даводзіцца канстатаваць няздольнасьць хаця б захаваць сёньняшняе адставаньне краіны ў сфэры інфармацыйных тэхналёгіяў. Такія парадоксы - непазьбежнае наступства існаваньня дзяржаўнага апарату ўва ўмовах ідэалягічнага прэсынгу.

Так фармуецца асобная падсыстэма ідэалягічнай машыны, арыентаваная на рэальны, не скажоны ідэалягічнай прызмай сьвет. Будучы ў цені, яна дасьледуе і рэагуе на рэальны сьвет, а не на сьвет ідэяў. Але ад гэтага яна не перастае быць часткай ідэалягічнай машыны - яе неідэалягізаваным элемэнтам, яе рэцэптарам і адначасова інстынктам самазахаваньня.

Ня варта думаць, што яе складаюць адно спэцслужбы. Аналітычныя аддзелы міністэрстваў і ведамстваў ня толькі даюць лічбы для пераможных рапартаў пра павелічэньне ВУП. Удзельнічаюць у гэтай падсыстэме і навуковыя колы. Сёе-тое з створаных імі матэрыялаў трапляе да шырокага чытача. Адным з такіх падарункаў ёсьць сумеснае выданьне Акадэміі навук, Інстытуту эканомікі і Інстытуту нацыянальнай бясьпекі, прысьвечанае праблемам нацыянальнай бясьпекі Беларусі ў палітычнай, эканамічнай, паліўна-энэргетычнай, харчовай, экалягічнай, інфармацыйнай, гуманітарнай і вайсковай сфэрах, а таксама тэарэтычным падставам і мэтадалёгіі забесьпячэньня нацыянальнай бясьпекі. Кніга прапануе мадэль забесьпячэньня нацыянальнай бясьпекі, зьмяшчае канцэпцыю аховы існага грамадзка-палітычнага ладу, а таксама выпрацоўвае пазыцыю ў дачыненьні да пагрозаў кіруючай у Беларусі эліце. Цікавая яна таксама аналізам атачэньня, што існуе па-за межамі пабудаванай у краіне ідэалягічнай канструкцыі.

У гэтай кнізе нас цікавіць перш за ўсё апісаньне самога мэханізму прыняцьця дзяржаўных рашэньняў ува ўмовах, калі кожнае такое рашэньне мусіць быць ідэалягічна апраўданым. Фактычны матэрыял, на якім яна грунтуецца, ня можа не выклікаць зьдзіўленьня. Вынікі сацыялягічных апытаньняў ад

НІСЭПД і іншыя эмпірычныя зьвесткі, якімі звычайна карыстаюцца дэмакратычныя сілы, тут пераважаюць над дадзенымі з афіцыйных крыніц. Чаму аўтары не спасылаюцца на лічбы, што агучваюцца «Советской Белоруссией», а збольшага арыентуюцца на публікацыі нядобранадзейнай «Белорусской деловой газеты»?

Калі мы правільна зразумелі функцыі апарату ідэалягічнай бясьпекі, то ён ня можа абапірацца на заклінаньні штатных прапагандыстаў і ідэолягаў: шмат якія зьвесткі з «Советской Белоруссии» маюць мала супольнага з рэчаіснасьцю і належаць да сьвету фантазіяў. На іх падставе нацыянальнай бясьпекі не захаваеш. А наагул, аўтары гэтай манаграфіі абапіраліся на незалежныя крыніцы таму, што іншых праўдзівых дадзеных у іх папросту не было. У дзяржаўнага апарату няма магчымасьці сабраць аб'ектыўныя зьвесткі па шматлікіх праблемах. Ніхто ня ведае дакладных вынікаў выбарчых кампаніяў пачынаючы з 1996 году: масавыя фальсыфікацыі робяць такія веды немагчымымі. Самі фальсыфікатары не адсочваюць нескажоных вынікаў народнага волевыяўленьня, а незалежнае назіраньне за выбарамі дазваляе толькі вызначыць прыблізны памер фальсыфікацыяў. Такім чынам, у дзяржаўных органаў сапраўднай інфармацыі наконт гэтага няма, а паводле незалежных крыніцаў прынамсі можна ацаніць скажэньні зьвестак, што падаюцца як афіцыйныя, - і тым самым прыблізна вылічыць праўдзівыя лічбы.

Таксама дзяржаўныя структуры сур'ёзна не адсочваюць электаральных настрояў - быць аб'ектыўным для «дзяржаўных» сацыёлягаў недаравальна. Дзяржаўная сацыялёгія выдае наверх завышаныя лічбы індэксу даверу «правільным» сацыяльным інстытутам і мізэрны рэйтынг апазыцыйных партыяў і апазыцыйных палітычных лідэраў. Дзяржаўная статыстыка не дае нават прыблізнага ўяўленьня пра бягучыя дэмаграфічныя і эканамічныя працэсы ў краіне. Колькасьць грамадзкіх арганізацыяў кампэтэнтны дзяржаўны орган - Міністэрства юстыцыі - не назаве ніколі, паколькі значная частка зь іх працуе ў незарэгістраваным статусе, частка ўжо ліквідаваная, а некаторыя існуюць толькі на паперы. Практыка прымусовай падпіскі, шалёныя сьпісаньні нераспрададзеных накладаў

робяць немагчымай нават прыблізную ацэнку колькасьці чытачоў дзяржаўнай прэсы. Ні Міністэрства эканомікі, ні падатковыя органы нічога ня ведаюць пра сапраўдны памер ВУП, дзяржаўнага бюджэту і даходаў насельніцтва. Праблема нястачы праўдзівых дадзеных набыла ў Беларусі памеры, параўнальныя з савецкімі часамі. Стварыць аб'ектыўную сыстэму збору зьвестак у сьвятых мэтах нацыянальнай бясьпекі вельмі складана - для гэтага трэба сфармаваць «паралельны» дзяржаўны апарат.

Калі ўвесь дзяржапарат перажывае ідэалягічныя галюцынацыі, любым дзяржаўным справаздачам і лічбам верыць нельга. Таму ў спэцслужбаў бракуе матэрыялаў пра фактычны стан рэчаў у краіне: іх альбо катастрафічна мала, альбо яны бяруцца зь незалежных крыніц - зь «Белорусского рынка» і г. д. І дзяржаўным, і недзяржаўным аналітыкам даводзіцца больш давяраць зьвесткам зь незалежных крыніцаў: перавага дзяржаўных аналітыкаў у доступе да таемнай дзяржаўнай справаздачнасьці і статыстыкі на самай справе даволі нязначная. Яна мае хутчэй значэньне для статусу канчатковага аналітычнага прадукту і даверу да яго, але не ўплывае прынцыпова на яго якасьць.

І таму будзе памылкай лічыць, што спэцслужбы зьбіраюць і патаемна аналізуюць зьвесткі пра ўвесь спэктар разьвіцьця беларускага грамадзтва. Наша драконаўскае заканадаўства пра дзяржаўную таямніцу, якое дазваляе практычна любому дзяржаўнаму органу аднесьці да таямніцы практычна любую інфармацыю, не хавае нічога, дакладней, захоўвае таямніцу пустаты.

РЭПРАДУКЦЫЙНЫ ВЭКТАР, ЦЭНТАР ПАШЫРЭНЬНЯ ІДЭАЛЁГІІ

У адрозьненьне ад першага, крэатыўнага кірунку ідэалягічнай працы, на ўзроўні пашырэньня ідэалёгіі ня мусіць быць творцаў - тут яна мусіць толькі ўбівацца ў галовы. Але на практыцы, дзеля супярэчлівасьці ідэалягічнай дактрыны, усё адбываецца зусім ня так. На гэтым узроўні існуе шмат магчымасьцяў пад

выглядам тлумачэньня афіцыйнай ідэалягічнай дактрыны фармуляваць альтэрнатыўныя погляды на яе зьмест.

Досьвед выкладнікаў прадмету «Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы» паказвае, што гэты прадмет ёсьць суцэльная tabula rasa, матрыца, на якую выкладнік можа нанесьці ўласныя пераканаьні, якімі б яны ні былі. У гэтай дысцыпліне ёсьць толькі голая форма, у якую выкладнік можа ўкласьці хоць нацыяналістычны, хоць камуністычны зьмест.

Гэткае становішча ўзмацняецца яшчэ і таму, што ўжо цяпер існуе вялікая колькасьць дапаможнікаў і мэтадычак па прадмеце, кожны (кожная) зь якіх дадае да яго нешта новае. Пазыцыя Міністэрства адукацыі, згодна зь якой выхаваўча-ідэалягічная праца мусіць «ісьці ад жыцьця», што ў кожнай галіне і ў кожнай ВНУ, разам з агульнадзяржаўным падручнікам, мусіць быць свой дапаможнік па ідэалёгіі, прывяла да парадаксальнага стану: агульнадзяржаўнага і фундамэнтальнага падручніку яшчэ няма (конкурс на яго напісаньне працягваецца), а ўнутраныя дапаможнікі ўжо існуюць і па іх ужо вядзецца выкладаньне. Некаторыя з гэтых аўтарскіх матэрыялаў ужо атрымалі асаблівы статус.

Напрыклад, дапаможнік Ядвігі Яскевіч займае асобнае месца сярод мэтадычных матэрыялаў па прадмеце, паколькі валодае статусам агульнага дапаможніка для навучальных установаў. Гэтае выданьне, пабудаванае за прынцыпам «пытаньні і адказы», бярэ за аснову гістарычны аналіз беларускай дзяржаўнасьці ды нацыянальнай ідэі і дапаўняе яго ацэнкай уладных мэханізмаў і палітычнай рызыкі. Аўтары іншых падручнікаў грунтуюцца на іншых тэарэтычных падыходах, бо праграма гэтага курсу не дае магчымасьці абаперціся на адзіна мэтадалягічна правільную дактрыну «лукашызму».

Распрацаваны курс ператварыўся ў кампэндыюм гуманітарных ведаў, у якім мала чаго засталося ад задумы галоўнага ідэоляга. Пад яго маркай, па сутнасьці, чытаецца агульнае грамадазнаўства, якому нададзены статус абавязковай дысцыпліны. Пазбавіўшы гэтую «дысцыпліну» ідэалягізаванай тэрміналёгіі (якой, зрэшты, звычайна няшмат), мы атрымаем звычайны курс агульных ведаў пра ідэалёгіі, дзяржаву,

грамадзтва і асобу, не пазбаўлены навуковага плюралізму і магчымасьці навуковых спрэчак. Цяпер ува ўнівэрсытэцкіх аўдыторыях выкладаньне ідэалёгіі зводзіцца да навязваньня пэўнага стандарту мысьленьня дакладна так, як гэта робіцца падчас навучаньня паводле сыстэмы «настаўнік-вучань». Толькі ў гэтым выпадку выкладнік заўжды можа выйсьці па-за межы гэткай гульні, спаслаўшыся на тое, што ягоная выкладчыцкая пазыцыя ёсьць пазыцыяй дзяржаўнай.

Паўстае пытаньне: адсутнасьць фактычнага ідэалягічнага зьместу ў прадмеце «Ідэалёгія беларускай дзяржавы» - гэта памылка ідэолягаў-выканаўцаў альбо віртуозны крок ідэолягаў-стратэгаў? Цяпер студэнт разумее ідэалёгію ў залежнасьці ад сьветапогляду выкладніка: у лібэральнага выкладніка выкладаецца ідэалёгія лібэральная, у нацыяналіста - ідэалёгія нацыяналістычная, палітоляг чытае курс параўнальнага дасьледаваньня ідэалягічных і палітычных працэсаў у сучасным сьвеце і Беларусі. Немагчымасьць зьвесьці лукашэнкаўскую ідэалёгію да клясычных ідэалёгіяў (кансэрватызму, лібэралізму, сацыялізму) - гэта рыса ня толькі прадмету ў ВНУ, гэта рыса самога ідэалягічнага канструкту. Эклектыка, адсутнасьць цэласнасьці, заплюшчваньне вачэй на супярэчнасьці набліжае яго да пабудоваў фашыстоўскіх прапагандыстаў. Зьмест ідэалёгіі робіцца неістотным - сэнс ідэалягічнай працы ў самой ідэалягічнай працы, у насаджэньні ляяльнасьці і падпарадкаваньня любой бязглузьдзіцы, што падаецца пад выглядам ідэалёгіі беларускай дзяржавы.

Але калі людзі вызначаюць сытуацыю аднамернага і скаардынаванага ідэалягічнага прымусу як рэальную, яна робіцца рэальнай. Як кажуць кіраўнікі БРСМ, асноўнай мэтай аб'яднаўчых працэсаў у асяродзьдзі моладзевых арганізацыяў, што адбываюцца ў выглядзе пераходу ўсіх зарэгістраваных моладзевых структураў пад крыло БРСМ, зьяўляецца ідэалягічнае фармаваньне моладзі. Незалежныя аналітыкі сьцьвярджаюць нэгатыўныя наступствы пашырэньня адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі, якой, як мы даводзілі раней, на самай справе не існуе. Пры гэтым, апрача прамоваў прэзыдэнта, як такога адзінага ідэалягічнага прадукту ня знойдзеш ані на палітінфармацыі, ані ў дапаможніках па ідэалягічнай працы:

няўлоўнасьць ідэалягічнага стандарту фармуе рэальны «плюралізм адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі». Аднак калі грамадзтва ўпэўненае, што ў ім пануе адзін стандарт думак, неўзабаве гэты стандарт сапраўды будзе сфармаваны. Людзі папросту пачнуць кіравацца той думкай, што такі стандарт ёсьць!

Гэта самы цікавы і нечаканы аспэкт ідэалягічнай працы. Пры ўсёй марнасьці навязаць грамадзтву лукашэнкаўскі сьветапогляд, пры ўсёй яго супярэчлівасьці, пры ўсіх кпінах, якія чуюць у свой адрас распаўсюднікі ідэалёгіі, - ня выключана, што іх супольнымі намаганьнямі грамадзтва ўсё ж такі падпарадкуецца ідэалягічнаму прэсынгу і пачне верыць, быццам бы сапраўды мы ўсе мысьлім аднолькава. На гэта працуе і прэзыдэнт, і службы бясьпекі, і выкладнікі, якія шчыра спрабуюць данесьці да студэнтаў базавыя гуманітарныя веды ў межах курсу ідэалёгіі, і яе незалежныя крытыкі і аналітыкі. На гэта працуе і студэнт на занятках па дзяржаўнай ідэалёгіі, і сябар «Зубра», што агітуе сукурсьнікаў выйсьці з БРСМ, і лідэр апазыцыйнай палітычнай партыі, і кіраўнік праваабарончай арганізацыі: усе, хто прызнае наяўнасьць у краіне ідэалягічнага прыгнёту, робяць яго рэальным. Прасторы рэальнага, сымбалічнага і ўяўнага зьмешваюцца, людзі ня ведаюць, што яны робяць.

На шляху пасьпяховага пашырэньня дзяржаўнай ідэалёгіі стаяць пагрозы і небясьпекі. Ці здолее створаны нашымі ідэолягамі прадукт канкураваць зь іншымі, традыцыйнымі ідэалёгіямі ўва ўмовах плюралістычнага грамадзтва? Ці ня будзе, напрыклад, сапраўдная свабода слова сьмяротным прысудам голему дзяржаўнай ідэалягічнай працы? Яе праціўнікі не імкнуцца выдумляць нейкія новыя сродкі ідэалягічнага супраціву. На іх думку, трэба адстойваць ідэалягічны плюралізм, разнастайнасьць поглядаў на шляхі разьвіцьця беларускага грамадзтва. Гэта зброя нават ня супраць «адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі» (якая ёсьць толькі шэрагам ідэалягічных пераўвасабленьняў), а супраць ідэалягічнай працы. Няма нічога страшнага ў тым, што кіраўнік дзяржавы зьяўляецца носьбітам пэўнай ідэалёгіі, актыўна прапагандуе яе, пераконвае ў яе праўдзівасьці. Ува ўмовах ідэалягічнага

плюралізму гэта звычайная зьява. У плюралістычным грамадзтве няма адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі, але ёсьць адзіны ідэалягічны арыенцір - нацыянальны інтэрас, які разумеецца па-рознаму, але сам па сабе не аспрэчваецца. І калі перад палітыкам паўстае выбар - альбо ідэалягічны прынцып, альбо нацыянальны інтэрас - паводле натуральных законаў палітыкі ён зробіць выбар на карысьць апошняга.

Ёсьць думка, што разгортваньне ідэалягічнай кампаніі ўва ўмовах ваганьня рэйтынгу прэзыдэнта сьведчыць пра крызыс рэжыму. Асабістай харызмы Лукашэнкі ўжо нядосыць - для легітымізацыі ягонай палітыкі патрэбныя дадатковыя падпоркі ў выглядзе апарату прапагандыстаў на вытворчасьці і адмысловых адукацыйных праграмаў. Хаця яшчэ нядаўна ўсенародна абраны правадыр сьмела экспэрымэнтаваў з законамі эканомікі, прыроды і права, цяпер створанаму ім рэжыму патрэбныя ідэалягічныя мыліцы, каб раптоўнае адключэньне газу Расеяй не адключыла кісларод для кіруючай адміністрацыі. Ідэалёгія - тая іголка, якая трымае рэжым у жыцьцяздольным стане, працягваючы пакуты хворага. Адключы яе - і ён ціха сканае ў выніку дзеяньня натуральных законаў прыроды, а не бамбаваньняў «экспартэраў дэмакратыі», «ружовай рэвалюцыі» ці змовы контрэліты.

Пакуль гэтага не адбудзецца, хворы будзе патрабаваць усё большай і большай дозы гэтага наркотыку. Як у апошнія гады Беларусь спажывала ўсё болей і болей газу, так і надалей ідэалягічны прэсынг будзе павялічвацца і павялічвацца. Старой дозы ідэалягічнага дурману будзе недастаткова, каб захаваць «стабільнасьць» у грамадзтве. Ідэалёгія ўжо цяпер замяняе беларускаму грамадзтву танны расейскі газ - як мэтадон замяняе гераінаваму наркаману ягоны стары аб'ект захапленьня.

Калі гэтая сыстэма ідэалягічнай працы лясьнецца, прадказаць немагчыма, бо гэта ня проста цемрашальства, гэта свайго кшталту масавы сацыяльны псыхоз, дзякуючы якому мы жывём як у грамадзтве спэктаклю. Ясна адно: у магілу яе зьвядуць не палітычныя акцыі яе праціўнікаў, а натуральныя законы прыроды.

Аляксандар Надсан Даведнікі - не паэзія

АЛЯКСАНДАР НАДСАН беларускі рэлігійны і нацыянальны дзяяч, апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў. Нарадзіўся ў Нясьвіжы.

Выданьні, якія абмяркоўваюцца ў артыкуле:
Гарбінскі Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагодзьдзя. Жыцьцяпісы, мартыралогія, успаміны. Менск-Мюнхен: Нацыянальны навукова-асьветны цэнтр імя Францішка Скарыны, 1999. 722 с. іл.

Garbiński J., Turonek J. Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny. Warszawa: Polska Akademia Nauk, Instytut Slawistyki, 2003. LXXX, 519 s. II.
Янка Купала дае такую раду тым, хто жадае, паводле словаў аўтара вядомай паэмы пра палясоўшчыка Тараса, «лезьці на Парнас»:

Праўду зь няпраўдай,
Цноту з гарэзіяй
Вымешай спрытам -
Будзе паэзія.

Цяжка спрачацца з майстрам паэтычнага слова. Складанасьці ўзьнікаюць, калі нехта захоча карыстацца ягонай радай у іншых жанрах пісьмовай дзейнасьці, напрыклад пры складаньні даведнікаў.

Апошнім часам сярод беларусаў і іхніх суседзяў узрасло зацікаўленьне рэлігіяй і рэлігійным становішчам у Беларусі. Як доказ гэтага могуць служыць два даведнікі, што зьявіліся на працягу чатырох апошніх гадоў. Першы зь іх, «Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагодзьдзя», выйшаў у Менску ў 1999 годзе. Ягоным аўтарам і складальнікам ёсьць Юры Гарбінскі. Кніга складаецца з трох частак. Першая частка - гэта біяграфічны даведнік, які зьмяшчае біяграмы, або кароткія артыкулы пра жыцьцё і дзейнасьць 180 беларускіх хрысьціянскіх - каталіцкіх, праваслаўных і пратэстанцкіх - дзеячоў XX стагодзьдзя. У другой частцы складальнік сабраў успаміны, артыкулы і іншыя матэрыялы пра некаторых дзеячоў, што ў свой час зьявіліся ў беларускай прэсе. Трэцяя частка складаецца з рэпрадукцыяў архіўных матэрыялаў і фатаздымкаў, непасрэдна зьвязаных з асобамі, пра якіх ідзе гутарка ў даведніку.

Другая кніга, «Białoruski ruch chrześcijański XX wieku» («Беларускі хрысьціянскі рух XX стагодзьдзя»), на польскай мове, - гэта біябібліяграфічны даведнік, у якім, апрача зьмястоўнага ўступу, напісанага Гарбінскім, зьмешчаныя біяграмы 230 рэлігійных дзеячоў разам зь бібліяграфіяй іхніх твораў і працаў пра іх. Гарбінскі зьяўляецца аўтарам 185 біяграмаў і іхніх бібліяграфіяў і суаўтарам бібліяграфіяў да апошніх 45 біяграмаў, напісаных вядомым гісторыкам Юр'ем Туронкам.

Даведнік 1999 году выклікаў у свой час даволі шмат водгукаў. На жаль, не было зьвернута дастаткова ўвагі на тое, ад чаго залежыць у першую чаргу вартасьць даведніка, а менавіта на праўдзівасьць і дакладнасьць зьвестак у ім. Таму варта глянуць на яго яшчэ раз, не асобна, але разам з даведнікам 2003 году. Дзеля сьцісласьці даведнікі будуць у далейшым азначацца скаротамі БР1 і БР2.

Для пачатку разгледзім артыкулы пра біскупа Часлава Сіповіча. Паводле самога Сіповіча, ён нарадзіўся 8 сьнежня 1914 году. Гэтую дату знаходзім у ягоным пашпарце, унівэрсытэцкіх і царкоўных дакумэнтах, а таксама ў такіх аўтарытэтных афіцыйных выданьнях, як ватыканскі «Annuario Pontificio» за

1961-1981 гады, г. зн. за час, калі ён быў біскупам. Тым часам Гарбінскі ў абодвух даведніках дае дату нараджэньня Сіповіча як 25 лістапада 1914 году. (БР1, с. 178; БР2, с. 379). Разьбежнасьць узьнікае таму, што Гарбінскі, не паясьніўшы, дае дату паводле Юліянскага, а не Грыгарыянскага календара. Усе іншыя даты падаюцца паводле Грыгарыянскага календара, і таму паўстае замяшаньне. Іншы прыклад: паводле БР1, Сіповіч быў высьвечаны на сьвятара 16.6.1942 г., хоць у дужках аўтар дадае - «паводле іншых зьвестак - у 1940». Чатырма гадамі пазьней, у БР2, Гарбінскі згадвае толькі 16.6.1942. А шкада, бо якраз «іншыя зьвесткі» былі праўдзівыя: Сіповіч стаў сьвятаром 16 чэрвеня 1940 году. Сярод выкарыстаных крыніцаў Гарбінскі згадвае Галоўны архіў марыянаў у Рыме, у прыватнасьці пэрсанальныя акты Сіповіча. Вышэйсказанае дазваляе сумнявацца, ці ён сапраўды бачыў іх. Дый ня трэба архіваў, досыць было заглянуць у які-небудзь гадавік «Annuario Pontificio».

У БР1 Гарбінскі піша, што Сіповіч «вучыўся ў папскім Усходнім інстытуце, дзе падрыхтаваў і абараніў (19.12.1942) доктарскую дысэртацыю». Насамрэч Сіповіч абараніў доктарскую працу чатырма гадамі пазьней, 19.12.1946. Нарэшце, Таварыства Яна Залатавуснага ў Лёндане было створанае ня ў 1965, як піша Гарбінскі ў БР1, а ў 1926 годзе. Айцец Сіповіч быў адным з тых, хто ў 1959 годзе аднавіў гэтую арганізацыю, якая доўгі час была бязьдзейнай. Невядома таксама, што гэта за «Каардынацыйны камітэт у справах здольнай беларускай моладзі» («Komitet koordynacyjny na rzecz uzdolnionej młodzieży białoruskiej»), у якім, паводле Гарбінскага ў БР2, Сіповіч працаваў у 1949-1960 гадох. Мусіць, аўтар меў наўвеце «Цэнтральны Каардынацыйны Камітэт дабрачынных арганізацыяў уцекачоў» («Central Coordinating Committee of Refugee Welfare Organisations»), дзе Сіповіч прадстаўляў Згуртаваньне Беларусаў у Вялікай Брытаніі. У БР1 Гарбінскі піша: «У складзе ініцыятыўнай групы духоўных і сьвецкіх дзеячоў (П. Татарыновіч, Л. Гарошка, Л. Рыдлеўскі) хадайнічаў перад папам Піем XII аб адкрыцьці беларускай сэкцыі ватыканскага радыё». Прыблізна тое самае ён паўтарае ў БР2. Насамрэч 8 лістапада 1946 году айцец Сіповіч разам зь Лявонам Рыдлеўскім і айцамі Пётрам Татарыновічам і

Францішкам Чарняўскім (айца Гарошкі зь імі не было) мелі прыватную аўдыенцыю ў папы Пія XII, на якой закраналіся пытаньні духоўнай апекі над беларусамі і магчымасьці навукі для беларускіх кандыдатаў да сьвятарскага стану. Пра радыё ў той час ня згадвалася. Першая беларускамоўная праграма на Ватыканскім радыё выйшла ў этэр праз тры гады, на Каляды 1949 году, дзякуючы намаганьням айца Татарыновіча.

Высьвячэньне айца Часлава Сіповіча на біскупа 4 жніўня 1960 году ў часе Міжнароднага эўхарыстычнага кангрэсу ў Мюнхене было немалаважнай падзеяй у беларускім рэлігійным жыцьці. Таму дзіўна, што ў абодвух даведніках няма пра гэта ніякай згадкі. Тым часам у выпадку Янкі Садоўскага (БР2, с. 370), які, пасьля 12 гадоў навукі пасланы на самастойную працу, ня вытрываў нават паўгоду (11 сьнежня 1961 году ён пакінуў сьвятарства і Царкву і ўзяў шлюб з ангелькай у пратэстанцкай царкве, пра што ў артыкуле няма ўспаміну), Гарбінскі падае даты ня толькі сьвятарскіх, але таксама дыяканскіх і субдыяканскіх сьвячаньняў (між іншым, у лацінскім, а не ўва ўсходнім абрадзе).

Праца бібліёграфа ніколі не бывае лёгкай: яна вымагае вялікай увагі і дакладнасьці, бо часта адна памылка робіць усю бібліяграфію бязвартаснай. Цяжкасьці могуць узьнікнуць пры вызначэньні аўтарства нейкага твору, падпісанага псэўданімам ці крыптанімам. У Беларусі ў XX стагодзьдзі ўжываньне псэўданімаў было вельмі пашыранае. Ёсьць выпадкі, калі два аўтары незалежна адзін ад аднаго ўжывалі тыя самыя або падобныя псэўданімы. Таму пры вызначэньні аўтарства часта даводзіцца браць пад увагу пабочныя меркаваньні: час напісаньня, век аўтара, абставіны, а таксама зьмест і стыль.

Наколькі вядома аўтару гэтай рэцэнзіі, першым друкаваным творам Часлава Сіповіча быў верш «Звон», падпісаны псэўданімам «Васіль Крывічанін», у часопісе «Хрысьціянская думка» ад 20.2.1937. Гэтым псэўданімам Сіповіч карыстаўся ў наступныя дзесяць гадоў. Толькі недзе ў 1948 годзе ў Лёндане ён пачаў падпісваць свае артыкулы псэўданімамі «А. Дзедзінка» і «Васіль Друя», а таксама крыптанімамі «А. Дз-ка», «Д-ка» або проста «Д» і іншымі.

У 1933-1939 гады ў «Хрысьціянскай думцы» даволі часта зьяўляліся артыкулы, падпісаныя крыптанімам W. D-a (або V. D-a). Гарбінскі вырашыў, што гэта быў ня хто іншы, як Часлаў Сіповіч. Калі б ён прачытаў артыкулы і глянуў на абставіны, калі яны пісаліся, то ўбачыў бы, што гэта немагчыма. Ад 1.8.1933 па 15.8.1934 Сіповіч, перарваўшы навуку ў гімназіі, адбываў год навіцыяту, а 65-ы пункт марыянскіх канстытуцыяў катэгарычна забараняе навіцыям «аддавацца навуцы, пісьменству і мастацтву» (*Канстытуцыя Конгрэгацыі айцоў Марыянаў*. Пераклаў з лацінскай мовы айцец Язэп Германовіч. Вільня, 1934. С. 21). Артыкул «Аўтобусам у Ялоўку», падпісаны крыптанімам В. Д-а, зьявіўся ў «Хрысьціянскай думцы» № 23 за 1938, а не 1937 год, як піша Гарбінскі. Сіповіч, якога 9 ліпеня 1938 году польскія ўлады выселілі з Друі, быў тады ў Варшаве і рыхтаваўся да выезду ў Рым. Яму было не да аўтобусных экскурсіяў па Беласточчыне, нават калі б ён меў на гэта дазвол ад сваіх старэйшых, што вельмі сумнеўна. Артыкул «Аб беларускай рэлігійнай песьні» ў № 20 «Хрысьціянскай думкі» ад 1 ліпеня 1939 году быў напісаны ўдзельнікам беларускай пілігрымкі на Віленскую Кальварыю, што адбылася 4 чэрвеня. У той час Сіповіч пацеў у Рыме, рыхтуючыся да іспытаў на бакаляўрэат з багаслоўя ў Грыгарыянскім унівэрсытэце. А ўжо зусім незразумела, як можна было прыпісаць Сіповічу зацемку (бяз подпісу) «Сталін - прыслужнік фашызму» ў № 9 «Хрысьціянскай думкі» ад 30 сакавіка 1938 году і ня ўгледзець надрукаванага побач цікавага, напісанага з гумарам артыкулу Васіля Крывічаніна «Бадзяюцца кніжкі». Наагул у бібліяграфіі Сіповіча ўдалося выявіць 19 памылковых пазыцыяў. Усіх іх можна было лёгка пазьбегнуць, калі б аўтар бібліяграфіі задаў сабе клопат прачытаць артыкулы... Бібліяграфія працаў Сіповіча таксама няпоўная: з агульнага ліку 186 назваў у ёй адсутнічае больш як 40.

Падрабязны аналіз артыкулаў пра Сіповіча прымушае ставіцца асьцярожна да зьвестак у абодвух даведніках. Артыкулы пра іншых асобаў толькі пацьвярджаюць гэта. Вось хоць бы артыкул у БР1 пра Ўладзімера Тарасевіча. Гарбінскі з усёй сур'ёзнасьцю сьцьвярджае, што Ўладзімер Тарасевіч - «адзін з ініцыятараў і заснавальнікаў уніяцкага пэрыядычнага часопісу «Церковный голос», на старонках якога шырока асьвятляў і беларускія

нацыянальна-рэлігійныя праблемы». Расейска-ангельскі часопіс «Церковный голос - Voice of the Church» быў заснаваны ў 1936 годзе ў бэнэдыктынскім кляштары Лайль каля Чыкага. У тым часе 14-гадовы Ўладзік Тарасевіч, нічога не падазраючы, жыў у сваіх Клешнякох на Гарадзеншчыне. У студзені 1938 году, 16-гадовым юнаком, ён прыехаў у Амэрыку, ня ведаючы ні слова па-ангельску. Юры Туронак, аўтар артыкулу пра Ўладзімера Тарасевіча ў БР2 (с. 443), не паўтарыў лухты свайго папярэдніка. Аднак было ўжо запозна: пра Тарасевіча і «Церковный голос» сьледам за Гарбінскім напісалі аўтары артыкулаў у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (Менск, 2001. Т. 6. Кн. 1. С. 504) і даведніка «Рэлігія і царква на Беларусі» (Менск, 2001. С. 323). Між іншым, і Туронку не ўдалося пазьбегнуць «лыжкі дзёгцю»: паводле яго, Тарасевіч карыстаўся псэўданімам «В. Карасевіч» і супрацоўнічаў з часопісам «Беларуская царква». Насамрэч гэта быў псэўданім В. Папуцэвіча (Пануцэвіча). Такім чынам, у параўнальна кароткай, складзенай супольна з Гарбінскім бібліяграфіі працаў (усяго 22 назвы) Уладзімера Тарасэвіча больш як палова не належыць яму. Затое ў бібліяграфіі працаў Вацлава Папуцэвіча (БР2, с. 303) няма згадкі пра ніводзін зь ягоных шматлікіх артыкулаў (каля 50) у часопісе «Беларуская царква», рэдактарам якога ён быў.

Бібліяграфія твораў айца Канстанціна Стаповіча (паэта Казімера Сваяка; БР2, с. 404-405) зусім адсутнічае: Гарбінскі адсылае чытача да шасьцітомнага біябібліяграфічнага даведніка «Беларускія пісьменьнікі» (Т. 5. Менск, 1995. С. 271-273). Такім чынам чытач пазбаўлены сутнай інфармацыі пра гэтага выдатнага сьвятара і паэта, бо ня кожны з чытачоў яго кнігі мае доступ да вышэйзгаданага даведніка. Гарбінскі мог зрабіць так, як зрабіў зь іншым сьвятаром і паэтам, Аляксандрам Астрамовічам (Андрэем Зязюлем; БР2, с. 15-17), і даць бібліяграфію калі не артыкулаў, то прынамсі сямі асобных кніжных выданьняў Сваяка, у тым ліку зборніка вершаў «Мая ліра» (Вільня, 1924), пра які ўпамінаецца ў самым артыкуле, але не ў бібліяграфіі; малітаўніка «Голас душы» (Вільня, 1926), пра які Гарбінскі згадвае, але не дае ягонага тытулу; і пасьмяротнага выданьня ўнікальнага духоўнага дзёньніка «Дзея мае мысьлі, сэрца і волі» (Вільня, 1932). Дый ня ўсе

артыкулы ўвайшлі ў бібліяграфію вышэйзгаданага даведніка: сярод тых, якія туды ня трапілі, ёсьць дзьве важныя публікацыі Ірыны Багдановіч з рукапіснай спадчыны аўтара: «Адроджаньне Беларусі і Унія» («Унія». Менск, 1991. № 1 (3).) і «Унія на Беларусі» («Унія». Менск, 1995. № 4.). У пераліку друкаваных крыніцаў пра Сталовіча няма кнігі Адама Станкевіча «Казімер Сваяк. Нарысы ягонай ідэалёгіі» (Вільня, 1931) і ягонага артыкулу «З жыцьця і дзейнасьці Казімера Сваяка» («Калосьсе». Вільня, 1936. № 4 (8).). Абедзьве гэтыя працы ўпамінаюцца ў бібліяграфіі Станкевіча (БР2, с. 399), але ў артыкуле пра Сваяка няма ніякай спасылкі на гэта.

Нехта сказаў, што гісторыя вучыць нас пазьбягаць старых памылак, каб мы маглі рабіць новыя... У артыкуле пра айца Льва Гарошку ў БР2 (с. 138-139) Гарбінскі піша, што Гарошка быў «адным з ініцыятараў і аўтараў мэмарыялу, адрасаванага генэралу Андэрсу ў справе арганізацыі беларускіх адзінак і беларускага школьніцтва ў польскім войску». Айцы Гарошка і Сіповіч сапраўды напісалі 26 красавіка 1946 году ад імя ад заснаванага імі «Беларускага камітэту самапомачы» да галоўнага камандаваньня Польскага другога корпусу ліст з просьбай дазволіць беларускім жаўнерам свабодна належаць да гэтага камітэту, а таксама чытаць і распаўсюджваць газэту «Беларускія навіны», што выходзіла ў Парыжы. Прыхільны адказ прыйшоў праз паўгоду, 4 кастрычніка 1946 году, калі польскіх вайсковых адзінак амаль не засталося ў Італіі. Дамагацца нейкіх беларускіх вайсковых адзінак і школаў ня мела ніякага сэнсу, бо польскае войска ў той час было ў стадыі дэмабілізацыі. У тым самым артыкуле Гарбінскі піша, што ў 1946 годзе Гарошка выехаў у Францыю, «дзе жыў да 1958 году». Некалькімі радкамі ніжэй ён працягвае: «У 1954 годзе (Гарошка) выехаў у Рым, уступіў там у навіцыят закону айцоў марыянаў... 16.01.1960 быў назначаны біскупам Чаславам Сіповічам рэктарам Беларускай Каталіцкай Місіі ў Вялікай Брытаніі». Узьнікае некалькі пытаньняў: дзе жыў айцец Гарошка між 1954 і 1958 годам? Як доўга трываў ягоны навіцыят? Як біскуп Сіповіч мог назначыць айца Гарошку рэктарам Місіі ў Вялікай Брытаніі 16.1.1960, сам ня будучы тады яшчэ біскупам?

Калі верыць Гарбінскаму, айцец Язэп Германовіч быў рэдактарам «Божым шляхам» у 1975-77 гадох (БР2, с. 130). Тым часам у 1975 годзе з прычыны веку ён адмовіўся ад гэтай пасады, якую займаў ад 1964 году. Дадзеныя Гарбінскага паўтарылі ў кароткай біяграфічнай зацемцы на вокладцы «першага на Беларусі выданьня» (выдавецтва «Неўскі прасьцяг», Санкт-Пецярбург, 2003; друкарня «Паліграфіст», горад Волагда!) выдаўцы кнігі айца Германовіча «Кітай, Сібір, Масква». Відаць, такая «дробязь» іх ня вельмі турбавала, як не турбаваў іх этычны аспэкт моўных зьменаў у арыгінальным тэксьце аўтара (напрыклад, замена слова «Дзева» на «Панна») - маўляў, мёртвым не баліць...

Апошні прыклад - з артыкулу пра айца Фэлікса Журню (БР2, с. 508-509). Гарбінскі піша, што Журня «ў складзе беларускай дэлегацыі айцоў марыянаў 29.11 - 05.12.1982 быў у Рыме. Узяў удзел у сустрэчы з папам Янам Паўлам II...» Насамрэч дэлегацыя складалася з наступных сьвятароў: Уладзімер Тарасэвіч, бэнэдыктынец; Аляксандар Надсан, Рабэрт Тамушанскі і Кастусь Маскалік, якія не належалі ні да якага закону; Фэлікс Журня, адзін марыянін ува ўсёй групе.

Прыклады памылак і недакладнасьцяў можна было б працягваць доўга, але яны нічога новага не прынясуць. Лепш зьвярнуць увагу на іншыя аспэкты даведнікаў. Хоць бы справа абраду. Абрад у першую чаргу мае дачыненьне да формаў богаслужэньняў. У Беларусі сярод каталікоў існуюць два абрады: «рымскі», папулярна званы «лацінскім» (а не «заходнім», як у БР1), да якога належыць абсалютная большасьць каталікоў, і бізантыйскі (грэцкі), які звычайна называюць «усходнім» і якім карыстаюцца грэка-каталікі, або ўніяты. Праваслаўныя таксама належаць да ўсходняга (бізантыйскага) абраду. Звычайна вернік належыць да абраду, у якім быў ахрышчаны, або, у выпадку сьвятара, у якім атрымаў сьвятарскія сьвячаньні. Зьмена абраду дазваляецца толькі з дазволу Сьвятога Пасаду. Затое многім сьвятарам у выпадку патрэбы даецца дазвол, не мяняючы свайго абраду, служыць у іншым абрадзе на нейкі час або нават на ўсё жыцьцё. Часта такіх сьвятароў называюць «бірытуалістамі». Айцец Абрантовіч, калі яго назначылі ў Харбін для расейцаў, паставіў умову, што

ён ня будзе мяняць свайго рымскага абраду, а толькі будзе служыць ува ўсходнім абрадзе на час выкананьня сваіх абавязкаў. Таму ніякім чынам яго нельга назваць «сьвятаром усходняга абраду» (БР1, с. 3; БР2, с. 6), асабліва таму, што гэтым абрадам у Беларусі ён ніколі не карыстаўся. Тое самае трэба сказаць і пра Цікоту (БР1, с. 210; БР2, с. 70), а таксама пра некаторых іншых сьвятароў. Гаворачы пра Цікоту, трэба дадаць, што ён ня быў пладавітым пісьменьнікам. Бібліяграфія ягоных друкаваных працаў у БР2 (с. 72) мае толькі адну пазыцыю, менавіта - ягоны даклад на расейскай мове ў Харбіне пра Эўхарыстычны кангрэс у Манілі ў 1937 годзе. Дзеля прыліку Гарбінскі мог бы згадаць пра беларускамоўны артыкул «Аб Эўхарыстычным Кангрэсе ў Манілі (зь лекцыі айца Андрэя Цікоты ў Харбіне)» («Хрысьціянская думка». Вільня, 1937. № 9. С. 4-5.).

У даведніках ёсьць зьвесткі пра рэлігійных дзеячоў, якія, ня будучы беларусамі, былі тым ці іншым чынам зьвязаныя зь беларускім рэлігійным жыцьцём. Сярод іх на першы плян вылучаецца магутная постаць мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага, арцыбіскупа Львоўскага, гэтага сапраўднага ўкраінскага патрыярха ўва ўсім, апрача тытулу. Справа Уніі ў Беларусі была вельмі блізкая сэрцу Шаптыцкага, і ён рабіў для яе ўзнаўленьня ўсё, што дазвалялі складаныя вонкавыя абставіны. Ён ведаў многіх беларускіх сьвятароў і дзеячоў, «лаціньнікаў» і «ўсходнікаў»; прымаў беларускіх кандыдатаў да сьвятарства і дапамагаў ім здабыць належную асьвету; даваў дазвол на выдаваньне беларускіх рэлігійных кніг, калі Віленскі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі чыніў цяжкасьці. Увосень 1939 году, пасьля развалу Польшчы, Шаптыцкі стварыў (а не «паспрыяў стварэньню», як піша Гарбінскі) чатыры ўсходнія экзархаты, у тым ліку беларускі на чале з айцом Антонам Неманцэвічам. У 1943 годзе ён выслаў у Рым вялікі мэмарыял «Exarchat de la Russie Blanche», у якім ён праявіў глыбокае разуменьне і веданьне рэлігійнага становішча ў Беларусі. На жаль, пра ўсё гэта ў даведніках або вельмі мала, або зусім нічога няма. Між іншым, Шаптыцкі ніколі ня браў удзелу ў Пінскіх унійных канфэрэнцыях.

Біскуп Баляслаў Слоскан, апостальскі адміністратар Менскі і

Магілёўскі, вязень савецкіх лагераў у 1920-1930-я гады, належаў да Беларускай каталіцкай царквы. Сам латыш, ён добра ведаў беларускую мову. Пасьля вайны, на эміграцыі, у 1952-1960 гадох (а не 1952-1953, як піша Гарбінскі) ён быў апостальскім візытатарам для беларусаў. Многія беларусы памятаюць яго на тыднях студыяў Акадэмічнага аб'яднаньня «Рунь» і іншых рэлігійных і культурных мерапрыемствах, ягоныя простыя, але глыбокія казані на рэкалекцыях. Як апостальскі візытатар, Слоскан на прыватнай папскай аўдыенцыі 5 сакавіка 1959 году прасіў у новаабранага папы Яна XXIII «для беларускіх сьвятароў на бацькаўшчыне і на выгнаньні, а таксама для ўсяго беларускага народу» блаславенства, якое было Папам «ахвотна дадзенае» (Benedictio apostolica... libenter concessa est). Выказваньне, што Слоскан «прысутнічаў на I зьезьдзе беларускага каталіцкага духавенства ў Рыме (01 - 06.02. 1960)», неадэкватнае: безь ягонай згоды і прысутнасьці зьезд ня мог адбыцца і беларусы ня мелі б біскупа ў асобе Часлава Сіповіча. Банальна гучыць сказ у БР2 пра тое, што Слоскан «утрымліваў сувязь і супрацоўнічаў зь беларускімі рэлігійнымі дзеячамі»: становішча апостальскага візытатара накладала на яго абавязак утрымліваць такую сувязь. Наагул няма нічога дзіўнага, што беларускія сьвятары - а іх не было ўжо так многа - ведалі адзін аднаго і перапісваліся між сабою. Іншая справа, калі яны рабілі нешта супольна, як, напрыклад, айцы Германовіч і Стаповіч, якія ў 1919 годзе пачалі ўводзіць беларускія казані і засноўваць школы для дзяцей незалежна ад веравызнаньня. Іхняя дзейнасьць выклікала супраціў з боку польскіх і апалячаных мясцовых сьвятароў і забарону Віленскага біскупа, блаславёнага Юр'я Матулевіча. Праўда, Стаповіч піша, што біскуп зрабіў гэта «з прыкрасьцю». На жаль, пра ўсё гэта дарэмна шукаць у даведніках. Затое ёсьць зьвестка, што Матулевіч у 1904-1907 гадох у Варшаве быў рэдактарам польскага часопісу «Towarzysz pracy». Якое гэта мае дачыненьне да гісторыі беларускага хрысьціянскага руху, ведае толькі Гарбінскі.

З артыкулу пра бэльгійца айца Рабэрта ван Каўэлярта (БР2, с. 169) складаецца ўражаньне, што ягонай галоўнай заслугай была прапаганда беларускай музыкі ў Бэльгіі. Насамрэч гэты незвычайны чалавек, бэнэдыктынскі манах, пасьля знаёмства зь

беларускімі студэнтамі ў 1948 годзе глыбока праняўся іхнім лёсам і патрэбамі. На працягу больш чым дзесяці гадоў ён быў афіцыйным апекуном, а ў сапраўднасьці - айцом для дзясяткаў беларускіх студэнтаў Каталіцкага ўнівэрсытэту ў Лювэне. Сярод ягоных «гадунцоў» можна назваць такіх вядомых беларускіх дзеячоў, як Янка Жучка, Янка Запруднік, Вітаўт і Зора Кіпелі, Алесь Марговіч, Барыс Рагуля, Вітаўт Рамук, Юры Сянькоўскі, Павал Урбан і шмат іншых. Вялікі доўг удзячнасьці належыцца яму ад беларусаў, і ня толькі за прапаганду музыкі...

Біскуп Зыгмунт Лазінскі быў палякам з Наваградчыны. Ён меў рэпутацыю пабожнага і ідэйнага сьвятара, з глыбокім разуменьнем унівэрсальнага характару Царквы як супольнасьці ўсіх вернікаў незалежна ад расы, нацыянальнасьці ці сацыяльнага стану. Тым ня менш ягоныя адносіны да беларусаў - а іх была большасьць у дыяцэзіях Менскай, а пасьля Пінскай, дзе ён быў біскупам, - былі вельмі няроўныя. У Менску ён схіляўся да ўвядзеньня беларускай мовы ў царкоўным ужытку. Стаўшы біскупам Пінскім у незалежнай Польскай дзяржаве, ён зьмяніў, відаць, свае погляды. У Пінскай сэмінарыі, дзе сярод студэнтаў было шмат беларусаў, беларуская мова ніколі не вывучалася, у адрозьненьне ад расейскай. Беларускія рэлігійныя часопісы не дапускаліся. Айцец Абрантовіч (які сам быў у Пінскай дыяцэзіі перад уступленьнем да марыянаў) пісаў 16 траўня 1928 году айцу Цікоту:

*Піша мне СК (Скірмунт Канстанцыя - **Аўт.**), што езуіты тамтэйшыя бяруць ад яе «Хрысьціянскую думку» для сваіх клерыкаў... а б(іску)п Зыгмунт (Лазінскі. - **Аўт.**) сваім не пазваляе. Казаў мне Ясь Васілеўскі (рэктар Пінскай духоўнай сэмінарыі. - **Аўт.**), што «прысылаюць 3 экзэмпляры, але яны ў яго астаюцца».*

Наагул сьвятарам-«лаціньнікам» было забаронена ўжываць беларускую мову ў казанях і дадатковых набажэнствах. На грэка-каталіцкіх сьвятароў гэтая забарона не распаўсюджвалася, але й там не было ўсё так проста. Айцец Ян

Панько з Далятычаў хацеў заснаваць пры царкве ў 1930 годзе «брацтва беларускай моладзі». Ён звярнуўся да біскупа Лазінскага праз айца Казімера Кулака (які быў адказны за грэка-каталіцкія парафіі ў Пінскай дыяцэзіі) з просьбай даць яму на гэта дазвол. Адказ прыйшоў адмоўны: біскуп яму прапанаваў замест «беларускага брацтва» заснаваць «Związek młodzieży Polskiej» («Саюз польскай моладзі»). Айцец Панько напісаў горкі ліст айцу Кулаку, копію якога той пераслаў 7 лютага 1931 году біскупу Бучысу ў Рым. Сярод іншага ён піша:

Усяго я чакаў, але ніколі, каб біскуп быў супраць стварэньня царкоўнага брацтва для беларускай моладзі. Дзе мне ўзяць польскую моладзь, калі яе ў мяне няма, а можа, зрабіць зь беларусаў гурток польскай моладзі?.. Няўжо, каб браць удзел у каталіцкай акцыі, беларус павінен адмовіцца ад свайго нацыянальнага імя і роднай мовы? Я зьбіты з толку. Калі я прыйшоў на лона Каталіцкай Царквы, я разумеў яе як адну сусьветную сям'ю ў Хрысьце, дзе «няма ні грэка, ні юдэя, ні нявольніка, ні свабоднага, але ўсё і ўва ўсім Хрыстос»... Я ніколі ня думаў, каб такі ідэйны чалавек, як біскуп Лазінскі, з такімі шырокімі поглядамі, з такой суцэльнай адданасьцю справе Божай, каб ён меў таксама ўдзел у польскім шавінізьме...

Цяжка сказаць, ці ў адносінах да беларусаў Лазінскі кіраваўся сваімі ўласнымі меркаваньнямі, ці быў змушаны вонкавымі абставінамі. У любым выпадку яго нельга ацэньваць адназначна. Найбольшае, што пра яго можна сказаць, - ён быў лепшым за іншых польскіх біскупаў. А гэта было ня так цяжка...

Біскуп Францішак Карэвіч (летувіс) і арцыбіскуп Эдвард Ропп (зь сям'і балцкіх немцаў) зрабілі ў сваім часе добрую паслугу беларускім каталікам, калі тыя змагаліся за сваё месца ў Царкве Хрыстовай, і наагул адносіліся да беларусаў з прыхільнасьцю. Гэта прыносіць гонар ім як людзям і хрысьціянам, але яшчэ ня робіць іх беларускімі рэлігійнымі дзеячамі.

Прыхільнасьць можа быць розная: і воўк прыхільны да авечак... Гарбінскі залічыў да дзеячоў беларускага хрысьціянскага руху біскупа Францішка-Пятра Бучыса (БР2, с. 49), летувіса, які

ніколі не працаваў у Беларусі або сярод беларусаў. У 1927 годзе, пасьля сьмерці блаславёнага Юр'я Матулевіча, ён быў абраны генэралам марыянскага закону і пад ягонай уладай апынуліся беларускія айцы ў Друі. Вучоны багаслоў і лінгвіст, прафэсар, а пасьля інспэктар (віцэ-рэктар) Імпэратарскай рыма-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу ў 1902-1916 гадох, кавалер ордэнаў Станіслава і Ганны, Бучыс быў адным з найбліжэйшых памочнікаў Матулевіча ў аднаўленьні закону марыянаў. У Пецярбургу ён захапіўся ідэяй «навяртаньня» Расеі. Стаўшы генэралам марыянаў, ён быў галоўным віноўнікам высылкі Абрантовіча, Германовіча і іншых у Харбін «навяртаць» расейцаў. Толькі вайна перашкодзіла Сіповічу апынуцца там, а тады ці мелі б беларусы свайго біскупа? Бучыс любіў параўноўваць сябе са сьвятым Ігнатам Ляёлі, які паслаў сьвятога Францішка Ксавэра ў Індыю. Яго не турбавала, што ў Беларусі была вялікая патрэба сваіх сьвятароў. У 1942 годзе Бучыс пісаў: «У наш дзень няма лепшага мосту між каталіцызмам і Расеяй, як Беларусь...». Ён лічыў Беларусь «натуральнай часткаю Расеі». Бачачы рост беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, ён раіў «быць асьцярожным у публічным прызнаньні нацыянальнай незалежнасьці Беларусі ў Вялікай Расеі, каб гэта не прывяло да варожасьці між Беларусьсю і Расеяй і не пашкодзіла будучай працы па навяртаньні апошняй» (гл. ягоны мэмарыял у Кангрэгацыю для Ўсходніх Цэркваў ад 12 студзеня 1942 году «De missione orientali inter alborussos»). На жаль, у артыкуле Гарбінскага пра ўсё гэта ня згадваецца. Затое там можна даведацца, што Бучыс пераклаў на летувіскую мову кнігу пра Люрдзкую Божую Маці і ў 1916-1921 гадох у Чыкага быў рэдактарам летувіскага часопісу «Draugas»...

Невядома, якое дачыненьне да Беларусі наагул і да беларускага хрысьціянскага руху ў асаблівасьці мае складзеная Гарбінскім бібліяграфія ковенскіх кніжных выданьняў Бучыса на летувіскай мове. Здаровы розум кажа, што з трох асноўных элемэнтаў - аўтар, мова, тэма - якія кажуць пра цікавасьць дадзенай працы для беларускага бібліёграфа, прынамсі адзін павінен быць беларускім. У выпадку Бучыса ўсе тры адсутнічаюць. Робіцца сумна, калі прыгадаеш, што для бібліяграфіі твораў Казімера Сваяка ў Гарбінскага не

знайшлося месца...

У даведніках, як і належыцца, падаюцца зьвесткі пра беларускіх рэлігійных дзеячоў усіх хрысьціянскіх канфэсіяў, у тым ліку пра такіх ідэйных хрысьціянаў і беларусаў, як праваслаўныя мітрапаліт Мелхісадэк (Паеўскі), Уладыка Васіль Тамашчык і айцец Аляксандар Коўш, а таксама пратэстантаў Лукаша Дзекуць-Малея, Данілу Яська і іншых. У гэтай рэцэнзіі я засяродзіўся на каталіцкіх дзеячах, бо лічу сябе некампэтэнтным гаварыць пра іншых і баюся празь няведаньне зрабіць памылку. Магу толькі зьвярнуць увагу на некаторыя хібы. Гарбінскі перадчасна пахаваў айца архімандрыта Карпа Стара (БР2, с. 401), якога Госпад хай захавае яшчэ на доўгія гады і які 30 жніўня 2003 году выступаў на Саборы БАПЦ у Гайлэнд-Парку (гл. «Беларус» № 488, Нью-Ёрк верасень 2003). Ягоныя «далейшыя лёсы» застаюцца невядомымі толькі для аўтара даведніка. Айцец Васіль Кендыш (БР2, с. 173), які памёр 1 кастрычніка 2003 году, нарадзіўся ў 1908, а не ў 1922 годзе, як піша Гарбінскі.

Рэлігія часта прыцягвае да сябе розных авантурнікаў і шарлятанаў. Адзін з такіх - «ксёндз доктар, тутылярны пастар Слуцкага кальвінскага касьцёлу, апостальскі візытатар Беларускай Артадаксальна-Каталіцкай Субожні, апостальскі адміністратар і заснавальнік амэрыканскіх сусьветных патрыярхатаў (у тым ліку беларускага), арцыбіскуп Нью-Гампшыр і Нью-Энглянд, канцлер беларускай капітулы сувэрэннага імпэрыяльнага ордэну Канстантына Вялікага, пажыцьцёвы канцлер капітулы ордэну Ўладзімера і Вольгі, Ар' Тата Беларусі, Мар Уладыслаў Рыжы Рыскі». Хай прабачаць чытачы, калі я прапусьціў нейкі важны тытул...

Уладыслаў Рыжы-Рыскі ў 1945-1946 гадох вучыўся ў польскай каталіцкай духоўнай сэмінарыі ў Парыжы, пасьля адзін сэмэстар (лістапад 1948 - сакавік 1949 году) - у Расейскай калегіі ў Рыме (г. зв. «Русікум»), куды быў прыняты па рэкамэндацыі біскупа Слоскана. Ня здаўшы нідзе іспытаў і займаючыся справамі, якія ня мелі нічога супольнага з падрыхтоўкай да сьвятарскага стану, ён быў змушаны пакінуць гэтыя ўстановы. Гарбінскі піша (БР2, с. 367-368), што ў Рыме

Рыжы «пачаў гуртаваць вакол сябе некалькіх студэнтаў з «Русікуму», для якіх намерваўся весьці заняткі зь беларускай літаратуры і мовы. На гэта, аднак, ён не атрымаў рэктарскага дазволу». На час прыезду Рыжага ў «Русікуме» ўжо былі два беларускія студэнты. У тым самым будынку знаходзілася калегія «Damascenum» для студэнтаў-сьвятароў, што вучыліся ў Папскім Усходнім Інстытуце. Адным зь іх быў айцец Пётра Татарыновіч, вядомы беларускі сьвятар і пісьменьнік, які працаваў над сваёй доктарскай дысэртацыяй пра духоўнае вучэньне сьвятога Кірылы Тураўскага. Рэктар «Русікуму», айцец Густаў Вэтэр, прасіў айца Татарыновіча заняцца беларускімі студэнтамі. Але было б непаважна даручаць такую справу новаму студэнту, які прыехаў вучыцца, а не вучыць, і адзінай акадэмічнай кваліфікацыяй якога быў няскончаны агранамічны тэхнікум. У 1950 годзе Рыжы-Рыскі, дзякуючы айцу Льву Гарошку, атрымаў стыпэндыю ад гішпанскага каталіцкага камітэту дапамогі студэнтам і запісаўся на палітычна-эканамічны факультэт Мадрыдзкага ўнівэрсытэту. І тут паўтарылася старая гісторыя. Пасьля шматразовых правалаў на іспытах 1 лістапада 1952 году яму ўстрымалі стыпэндыю. Праз два дні, 3 лістапада, ён напісаў у Жэнэву ў Сусьветную раду цэркваў ліст, у якім выстаўляў сябе ахвярай перасьледу за сваю беларускую нацыянальнасьць і рэлігійныя перакананьні. Так пачаўся прэзьбітэрыянскі (кальвінскі) пэрыяд ягонага жыцьця. У канцы 1959 году ён выехаў у ЗША, дзе ўжо ў траўні 1960 году ў горадзе Прынстан атрымаў тытул магістра багаслоўя ў прэзьбітэрыянскай багаслоўскай сэмінарыі, якая ня мела нічога супольнага з Прынстанскім унівэрсытэтам, як гэта піша Гарбінскі. Прыблізна ў тым самым часе з дапамогаю нейкіх Вацлава Мацейчыка з «Польскага нацыянальнага касьцёлу» (БР2, с. 236) і Пятра Журавецкага (БР2, с. 507) ён заснаваў «Беларускую артадаксальна-каталіцкую субожню», а пры ёй - «Беларускую акадэмію багаведы, насьледніцу Слуцкай кальвінскай калегіі», куды заклікаў беларускую моладзь запісвацца на «карэспандэнцыйныя біскупскія, ксяндзоўскія і дэканскія курсы». У 1970 годзе Рыжы заснаваў свой «Унівэрсытэт народаў Амэрыкаў» (Peoples University of Americas), установу «духоўную, але не канфэсіянальную», у якую прымаліся «пабожныя і бязбожныя вернікі (theist and atheist believers)». Калі верыць Рыжаму, за першыя чатыры гады

500 студэнтаў атрымалі ў ягоным універсытэце дыплёмы. Зьвесткі пра гэты ўнівэрсытэт дарэмна шукаць у афіцыйных даведніках пра вышэйшыя навучальныя ўстановы Амэрыкі. Пры канцы жыцьця (памёр у 1978 годзе) Рыжы, відаць, адышоў ад кальвінізму, а нават і ад хрысьціянства ў традыцыйным яго разуменьні. Ён пісаў у 1974 годзе:

Таму гэта слова да вас усіх, што забыліся ральлю патрыярхату нашага ды з аратых сталі пастухамі... Вярніцеся да веры прародзічаў вашых, у цішыню сьвятынь нерукатворных дубоў і ёлак нашых, і наш Бог Сварог пашлець вам яву Ісуса Спаса, Дажбога нашага, а Сьвяты Дух Сварожыца вас зробіць вольнымі ад плуту і ўсякай небыліцы.

Гарбінскі дапусьціў непавагу, ня спраўдзіўшы фактаў перад тым, як пісаць пра Рыжага-Рыскага і яму падобных.

Шкада, што ў абодвух даведніках не знайшлося месца для сьветлай памяці айца Язэпа Барадзюлі, гэтага «грамадзяніна савецкіх лягераў», цэльнага сьвятара і беларуса. Таксама няма нічога пра жанчын-багасловак Ірыну Дубянецкую і Караліну Мацкевіч і іхнюю ролю ў адраджэньні Беларускай грэка-каталіцкай царквы ў 1980-1990-я гады. Артыкулы І. Дубянецкай у часопісе «Унія» «Жыцьцяпіс сьвятое пакутніцы Уніі» (№ 1, 1990, падпісаны псэўданімам «Міхаліна») і «...І перамяніўся перад імі...» (№ 4, 1995), а таксама К. Мацкевіч «Прамовіць Божае імя» (там жа) - гэта нешта новае, чаго не было раней у беларускай духоўнай літаратуры.

Як было ўжо сказана, вартасьць даведніка залежыць ад таго, наколькі праўдзівыя і аўтарытэтныя ў ім зьвесткі. Памылкі і недакладнасьці, раз знойдзеныя, выклікаюць у чытача недавер да ўсяго, што ў даведніку: як крыніца інфармацыі, ён стаецца падазроным і нават бязвартасным. На жаль, такімі ёсьць даведнікі БР1 і БР2. Першы зь іх застаецца больш даступным для беларускага чытача. Другі даведнік, які выйшаў чатырма гадамі пазьней, мае на мэце інфармаваць польскамоўнага чытача пра рэлігійны стан ягонага ўсходняга суседа. Здавалася б, чатыры гады - досыць часу, каб выправіць старыя хібы. На

жаль, гэтага ня сталася. У абодвух даведніках аж кішыць ад памылак, недакладнасьцяў і таго, пра што кажа прыказка «Чуў звон, але ня ведае, дзе ён». Многія артыкулы (біяграмы) перагружаныя матэрыяламі, якія ня маюць ніякага дачыненьня да беларускага рэлігійнага жыцьця і толькі перашкаджаюць лепшаму разуменьню сутнага. Справядлівасьць вымагае сказаць, што артыкулы Туронка ў БР2 больш сур'ёзныя і дакладныя, але іх меншасьць і яны церпяць ад невыгоднага суседзтва, якое надае тон усёй працы. Крыху як у сьвятога Паўла, які кажа сьледам за Мэандрам: «Дрэнныя гутаркі псуюць добрыя звычаі» (1 Кар 15:33). Калі ідзе пра бібліяграфію, дык яе можна акрэсьліць па-ангельску як «total disaster area» (суцэльная аварыйная зона): неабазнанаму чытачу варта трымацца ад яе далёка.

Калі б прысьвяціць больш часу і ўвагі, каб належна апрацаваць сабраны багаты фактычны матэрыял, спраўдзіць крыніцы і аддзяліць зерне ад мякіны, даведнікі маглі б стацца значным укладам у вывучэньне стану рэлігіі ў Беларусі (або, хутчэй, сярод беларусаў) у мінулым стагодзьдзі. З сумам трэба сьцьвердзіць, што, нягледзячы на сумесь «праўды зь няпраўдай і цноты з гарэзіяй», паэзіі таксама не атрымалася...

Лёндан, 14 лютага 2004 г. Сьвятога Кірылы, апостала славянаў

НЭЛІ БЕКУС
філёзаф. Выкладае ў варшаўскай «Школе грамадзкіх навук».

Нэлі Бекус
Тэрапія альтэрнатывай, або Беларусь, уяўленая інакш

Беларусь. Сцэнары рэформаў. Эўрапейскі выбар для Беларусі. - Варшава: Фонд імя Сьцяпана Батуры, 2003.

Пэрцэптыўная альтэрнатыва робіць магчымай практычную альтэрнатыву, выступаючы, так бы мовіць, у якасьці пэрцэптыўнай гіпотэзы...

М. Вартофскі

Напрыканцы 2003 году першы канал нацыянальнай тэлевізіі Польшчы паказаў спэктакль Юліюша Махульскага пад назвай «19-ы градус даўгаты» («19 południk»). Жанр гэтай тэатральнай пастаноўкі сёньня дастаткова рэдкі - political fiction, палітычная фантастыка, да таго ж зробленая на матэрыяле сучаснага палітычнага жыцьця Польшчы. Спэктакль паказвае гледачу трохі гратэскную рэканструкцыю рэальнасьці - рэальнасьці няіснай (дакладней, неажыцьцёўленай), але па-ранейшаму наяўнай у гіпатэтычным вымярэньні, сьвеце пэўнай «усё-яшчэ-магчымасьці». У гэтай фікцыйнай рэальнасьці спэктаклю

пасьля рэфэрэндуму ў чэрвені 2003 году жыццё палякаў пайшло паводле іншага сцэнару. Прыкладна так, як, на думку аўтараў спэктаклю-палітгіпотэзы, яно магло б скласьціся, калі б яны дэмакратычным шляхам адмовіліся ад Эўрапейскага зьвязу і да таго ж абралі сабе іншага, «бліжэйшага да народу і ягоных спадзяваньняў» прэзыдэнта. Ягоны прататып лёгка згадаць - гэта рэальна дзейны на польскай сцэне палітык, які да таго ж зьяўляецца своеасаблівым alter ego беларускага прэзыдэнта. Таму й праводжаная ім у спэктаклі палітыка ўтрымлівае ўчынкі, якія беларускаму гледачу здаюцца яўнымі «цытатамі» зь дзейнасьці беларускае ўлады. (Тут і прысабечваньне ўласнасьці інвэстараў, якія паверылі ў права і ўклалі грошы ў польскую эканоміку, і сваркі з замежнымі дыпляматычнымі місіямі, і поўная адмова зразумець, у чым палягае паняцьце «правоў чалавека», і шмат чаго іншага.) Усё гэта выглядала надзіва недарэчна ў кантэксьце сучаснае Польшчы, хоць гэта, як ні дзіўна, ня толькі рэальна, але нават і рэалізавана ў суседняй з Польшчай Беларусі.

Аднак гэтая тэатральная пастаноўка прыпамінаецца тут зусім не дзеля падабенства польскае «альтэрнатывы», своеасаблівага ўмоўнага ладу яе палітычнага жыцьця, і найбольш рэальнай з магчымых беларускай рэчаіснасьцяў. У рэшце рэшт, беларуская ўлада не зьяўляецца чымсьці выключным ці арыгінальным сярод розных палітычных рэжымаў, хутчэй наадварот, яна прадказальная і дзейнічае паводле схемы нармальнае ўлады свайго, таталітарнага тыпу. Спэктакль жа цікавы нам перадусім як своеасаблівы публічны «жэст» - жэст, які мае на мэце візуалізацыю вобразу *альтэрнатывы рэальнаму* і яе прэзэнтацыю публіцы з дапамогай аднаго з найбольш масавых і эфэктыўных mass media. Сукрытую лёгіку такога дзеяньня лёгка згадаць: сапраўды, ёсьць мноства недахопаў і заганаў у існай сытуацыі, але досыць невялікае порцыі адстароненасьці, зьмены шкалы, паводле якой нашае крытычнае ўспрыманьне вылічвае ступень праблематычнасьці навакольнага жыцьця, каб ацэнка зазнала зьмены. Лёгіка, якая кіруе такой стратэгіяй «зьмены фокусу», не зьяўляецца новай - яна спараджаецца з фармальна-лягічнага «доказу ад супрацьлеглага», вядомага з часоў Арыстотэля. Замест таго каб у спрэчцы бясконца прыводзіць доказы правільнасьці ўласнае пазыцыі, можна

прасьцей і больш плённа паказаць ілжывасьць адваротнага сьцьверджаньня. Акурат гэтак жа, замест таго каб бясконца даводзіць абсурд рэальнасьці, дастаткова «перавярнуць пэрспэктыву» і паказаць правамоцнасьць, унутраную асэнсаванасьць яе альтэрнатывы...

Пры гэтым варта заўважыць, што сама па сабе наяўнасьць у сымбалічным полі кожнай краіны вобразаў яе «іншае», альтэрнатыўнае рэальнасьці (дакладней, іншых альтэрнатыўных «рэальнасьцяў») зьяўляецца своеасаблівым «балястам», крыніцай дадатнае (часьцей за ўсё) рэлятыўнасьці ў ацэнцы бягучага стану рэчаў. Польскі спэктакль - гэта прыклад таго, як падобная поліварыянтнасьць рэпрэзэнтацыі рэальнага робіцца спосабам ажыцьцяўленьня дэмакратычнага прынцыпу палітычнае свабоды. Больш за тое, у ідэальнай схеме ажыцьцяўленьне гэтага прынцыпу патрабуе ня толькі разнастайнасьці спосабаў думаньня пра рэчаіснасьць, але й іх раўнапраўя, то бок, як пісаў Майкл Новак, «прынцыповае адсутнасьці так званага «сьвятарнага полагу» ў вызначэньні межаў магчымага ... што лічыць рэальным, існым...»

Асаблівасьцю беларускага палітычнага жыцьця зьяўляецца забарона на альтэрнатыву палітычнай штодзённасьцю. У дадзеным выпадку тут маюцца на ўвазе ня крокі для выкараненьня апазыцыі як палітычнае сілы. Ствараецца ўражаньне, што яна для такой улады, як беларуская, на дадзеным этапе ня вельмі небясьпечная, таму і крокі гэтыя млявыя. Тое, што практыкуецца ў Беларусі, - гэта хутчэй палітычнае «вэта» на ўяўленьне жыцьця «тут і цяпер» па-іншаму. І калі ўмоўны лад («што магло б здарыцца, каб...») паступова зьнік з граматыкі афіцыйнага палітычнага жыцьця, краіна канчаткова вярнулася да таго аднастайнага, адзіна магчымага бачаньня рэальнасьці, укараненьне якога, як вядома, было неад'емным атрыбутам савецкае ідэалёгіі. У выніку тут ізноў запанаваў прынцып гегемоніі рэпрэзэнтацыі цяпер ужо беларускага (а не савецкага) жыцьця.

Рэальнасьць, якая дзень пры дні ўзнаўляецца ў афіцыйных сродках масавае інфармацыі, амаль да рэшты падпарадкаваная, дакладней кажучы, прыгнечаная дамінантным пра яе

меркаваньнем, адлюстраваным у рыторыцы ўлады. Больш за тое, па дасягненьні пэўнае ступені гамагеннасьці публічнае прасторы, якая калі і парушаецца незалежнымі СМІ, то, на жаль, у нязначнай ступені, улада пачала апэляваць да безальтэрнатыўнасьці абранага ёю шляху разьвіцьця як да аднаго з галоўных аргумэнтаў свае палітычнае легітымізацыі. У тых, хто падпаў пад гіпноз афіцыйнае рыторыкі, узьнікла поўная ілюзія немагчымасьці існаваньня *Беларусі, што жыве іначай.* Тым самым узурпацыя ўлады на тэрыторыі сучаснасьці ператварылася ў манаполію на ўяўленьне будучыні. Невыпадкова шмат хто сярод тых, хто галасаваў за сёньняшняга прэзыдэнта, прызнаваўся, што робіць гэта не дзеля сымпатыяў да яго асобы, але нібы дзеля «адсутнасьці альтэрнатывы». Па сутнасьці, сёньняшні афіцыйны дыскурс толькі й робіць, што «сьцьвярджае» створаную ім рэальнасьць як інварыянт, правамоцны ўжо таму, што ён пазбаўлены якога-колечы *іншага* спосабу быцьця.

У гэтым кантэксьце цяжка недаацаніць зьяўленьне кнігі «Беларусь. Сцэнары рэформаў...». Яе, па сутнасьці, можна разглядаць як сымбалічнае вяртаньне сёньняшняй Беларусі яе гіпатэтычнага аблічча, яе альтэрнатывы самой сабе. Таму ўжо сама вокладка кнігі з такой назвай робіцца фактычным пачаткам аднаўленьня наўмысна зламанае ўладамі прылады рэлятывізацыі рэальнасьці, якая ў пэрспэктыве можа вярнуць краіне неабходны баляст розных, у тым ліку супрацьлеглых і аднолькава легітымных, пунктаў гледжаньня на Беларусь. Для гэтага, зрэшты, кніга «Сцэнароў» павінна была б зьявіцца на паліцах беларускіх кнігарняў і з інтэлектуальнага прадпрыемства перарасьці ў падзею публічнага жыцьця.

«Сцэнары рэформаў» напісаныя цэлай групай адмыслоўцаў - прафэсійных эканамістаў, юрыстаў, палітолягаў, псыхолягаў, сацыёлягаў. Вынікам калектыўнае працы сталася шматгаліновая рэпрэзэнтацыя беларускае будучыні, якая зьяўляецца альтэрнатывай афіцыйна абвешчанай. Але перадусім гэта - «бачаньне будучыні краіны як дэмакратычнае дзяржавы, інтэграванае ў эўрапейскую палітычную, прававую і культурную прастору». Пры гэтым на тле часьцяком яўнае дэклярацыйнасьці шляху, які яшчэ толькі мае быць

артыкуляваны, а затым хутка «прышчэплены» народу ідэолягамі беларускага рэжыму, «Сцэнары рэформаў» уражваюць сваёй добра прапрацаванай «тэхнічнасьцю». Гэта не зьдзіўляе: у той час як афіцыёз пракладае нетараваны шлях сваіх эканамічных цудаў, пакладаючыся на ўласную арыгінальнасьць, аўтары «Сцэнароў рэформаў» маюць у сваім арсэнале досьвед сацыяльна-палітычных трансфармацыяў больш як дзесяці краінаў Усходняе Эўропы. Балазе і Эўропа - маецца на ўвазе «стары» Эўрапейскі Зьвяз - часткова бярэ на сябе клопат перакладу сваіх палітычных і эканамічных прынцыпаў на мовы пераходных эканамічных сыстэмаў. Адным з зыходных пунктаў «Сцэнароў» ёсьць тэза, што такой эканомікай магла б - то бок, у прынцыпе, усё яшчэ можа - стаць і эканоміка Беларусі. На старонках кнігі прыведзены фактычны аналіз беларускае рэальнасьці ў дачыненьні да яе патэнцыйнае рэлевантнасьці чаканьням Эўропы, што дазволіла б усур'ёз думаць пра эўрапейскую інтэграцыю краіны ў будучым.

Ідэя ўключэньня Беларусі ў агульную канструкцыю эўрапейскае будучыні выступае своеасаблівым рэфрэнам кнігі, у якім, уласна кажучы, сыходзіцца матывацыя апісаных рэформаў зь іх мэтай. Праўда, нельга сказаць, што гэтая ідэя новая. У краіне яна зьявілася адначасова з прыходам незалежнасьці. Больш за тое, да магчымасьці эўрапеізацыі краіны тыя, хто наагул неяк думае пра будучыню Беларусі, у прынцыпе, прызвычаіліся: «...каля 60 адсоткаў беларусаў падтрымалі б уступленьне краіны ў ЭЗ...» (Віталь Сіліцкі, «Пэрспэктывы эўрапейскае інтэграцыі Беларусі»). Блага, аднак, што адбылося прызвычайваньне да статусу гэтае ідэі як адцягненае гіпотэзы. Сакрэт нагэтулькі высокага рэйтынгу Эўрапейскага Зьвязу, тлумачыць В. Сіліцкі, хаваецца ўва ўяўнай адсутнасьці рэальных пэрспэктываў падобнага збліжэньня і яшчэ больш - у адсутнасьці досьведу пераадоленьня практычных складанасьцяў, з гэтым зьвязаных. Калі меркаваць зь беларускай рэальнасьці, цалкам відавочна, што за мінулае дзесяцігодзьдзе адлегласьць, якая аддзяляе гэтую ідэю ад яе ўвасабленьня, ні на каліва не скараціласа. «Сцэнары рэформаў» - гэта спроба паменшыць гэтую адлегласьць з дапамогай ідэі «будучых трансфармацыяў» - канструкту ўяўленай рэальнасьці. Галоўная каштоўнасьць кнігі менавіта ў тым, што яна

ўтрымлівае ў сабе ўцямную артыкуляцыю ўяўленьня пра тое, якім чынам і ў якой ступені магчымыя такія трансфармацыі.

З гэтага пункту гледжаньня досьвед іншых краінаў быў тут і карысны, і не. З аднаго боку, лёгка заўважыць, што Беларусь вылучаецца на тле іншых краінаў былога сацлягеру, у якіх «эўрапеізацыя» як такая адпачатку не была прадметам дыскусіяў, а праблематызаваліся толькі разнастайныя тэхнічныя аспэкты, працэдурныя бакі працэсу. Лёзунг «вяртаньне ў Эўропу», які так удала адлюстраваў квінтэсэнцыю рэформаў у гэтых краінах, у Беларусі не спрацаваў. Тут прыхільнікам эўрапейскае інтэграцыі сваю аргумэнтацыю даводзілася пачынаць з нашмат больш першасных матэрыяў, даводзячы саму па сабе легітымнасьць вобразу эўрапейскае Беларусі. Моцныя моманты ў высоўваньні праекту Беларусі ў Эўропе «паводле аналёгіі» - гэта апэляваньне да аб'ектыўнага падабенства, зыходнай тоеснасьці мноства сацыяльных і эканамічных парамэтраў Беларусі зь іншымі краінамі Ўсходняе Эўропы. Насамрэч, хіба не відавочна, што параўнальна кампактная Беларусь з разьвітай прамысловай інфраструктурай нашмат бліжэйшая паводле свайго эканамічнага й сацыяльнага аблічча да Славаччыны, Вугоршчыны, Славеніі ці кагосьці яшчэ ў Эўропе, чымся да неабдымнай Расеі, якая жыве з уласных сыравінных рэсурсаў. Выходзіць, не відавочна, пра што сьведчыць факт пасьпяховага супрацьпастаўленьня ідэі эўрапеізацыі Беларусі і пэрспэктывы *расеізацыі* краіны. (Гэтая перавага псыха-сацыяльнага над эканамічным у беларускім базысна-надбудоўным ансамблі - яшчэ адзін факт на карысьць прыхільнікаў культурнага дэтэрмінізму.) У дадатак Эўропа дакладна і нават катэгарычна фармулюе свае патрабаваньні наконт рэструктурызаваньня й рэфармаваньня палітычнага і эканамічнага жыцьця, а гэта адпужвае беларусаў. У той жа час Расея, сама знаходзячыся на стадыі станаўленьня новае дзяржавы, падобныя прэтэнзіі выстаўляе бессыстэмна і паступова. У беларускіх уладаў гэта стварае ілюзію іх своеасаблівае неабавязковасьці.

У гэтым кантэксьце тэза пра ўнутраную неабходнасьць эўрапеізацыі Беларусі патрабуе сур'ёзных намаганьняў дзеля ейнае легітымізацыі ў межах уяўленьняў беларусаў пра сябе.

Сам па сабе дадатны досьвед Эўропы ў большыні беларускіх грамадзянаў, як высьветлілася, не зьяўляецца дастатковай прычынай для аўтаматычнага атаясамліваньня сябе зь ёю. Такое становішча ў беларускай рэальнасьці шмат у чым перадвызначае сэнс распрацаваных «Сцэнароў» - менавіта як інтэлектуальных намаганьняў на карысьць інтэрыярызацыі ідэі эўрапейскае Беларусі. Прапанаваныя па разьдзелах кнігі канкрэтныя рэформы - палітычнае і прававое сыстэмы, эканомікі, адукацыі й сацыяльнае сфэры - па сутнасьці сваёй утрымліваюць апісаньне працэдураў «укараненьня» эўрапейскасьці ў розных галінах беларускага жыцьця. Пры гэтым захаваны больш-менш аднастайны альгарытм працы з рознымі сфэрамі. У кожным з разьдзелаў падаецца аналіз сёньняшняе сытуацыі ў кожнай з названых галінаў зь невялікім экскурсам у нядаўняе мінулае - фактычна гэта дае нам структураваную эвалюцыю беларускага цяперашняга моманту. Гэты складнік кнігі сам па сабе мае каштоўнасьць як своеасаблівы каталягізаваны пакрокавы архіў падзеяў, якія ў выніку й акумуляваліся ў сёньняшнюю Беларусь. Ад гэтае генэзыснае ацэнкі рэальнасьці аўтары пераходзяць да фармулёвак канкрэтных прапановаў яе рэфармаваньня. У выніку гэтая кніга - ня проста асаблівым чынам аранжаваная рыторыка на тэму «эўрапеізацыі Беларусі», а тэхналягічная вэрсія альтэрнатыўнага руху краіны, руху, які ўсё яшчэ можа пачацца зь яе сёньняшняга, які б ён там ні быў, стану ў кірунку да *іншае* будучыні. Прычым, як паказвае статыстыка, у грамадзкай сьвядомасьці беларусаў такая альтэрнатыва прысутнічае, а значыць, патрабавалася яе прафэсійна і сыстэматычна арганізаваная артыкуляцыя. Пры гэтым нельга ня ўлічваць, што прапанаваныя «Сцэнары» - гэта не дырэктыўныя дакумэнты, якія маюць на мэце неадкладнае ажыцьцяўленьне, а толькі своеасаблівы адказ на сацыяльны «запыт» на пэўную мадэль будучыні. З гэтага пункту гледжаньня на першы плян выходзіць ня столькі непасрэдна практычная, як пэўная эпістамалягічная каштоўнасьць «Сцэнароў».

Вядомы амэрыканскі філёзаф Макс Вартофскі ў сваёй кнізе «Мадэлі», прысьвечанай аналізу сэнсу і значэньня рэпрэзэнтацыі ўва ўзорах ведаў, пісаў: «Мадэль - гэта прататып

арыентаванага ў будучыню дзеяньня, у якім будучыня ўяўляецца нечым большым за сьляпую непазьбежнасьць працэсу працяканьня часу і ўключае ў сябе некаторыя папярэднія мэты ў якасьці зьместу гэтага прататыпу».

Іншымі словамі, за ўзор ён уважае «ня проста некаторую сутнасьць, а *спосаб дзеяньня* ». І ў гэтым сэнсе мадэлі - гэта ня толькі ўвасабленьне мэтаў, але адначасова і прылады іх ажыцьцяўленьня. Гэтае цьверджаньне цалкам дастасавальнае і да сцэнароў беларускіх рэформаў. Аднак дзеля таго што ў рэальнасьці, у якой яны напісаныя, па-ранейшаму застаецца шмат «невядомых», апісаньне рэформаў балянсуе на мяжы жанраў - недзе паміж стратэгічным мадэляваньнем будучыні й рэпрэзэнтаваньнем яе ідэальнае канструкцыі. Вартофскі называе такія станы мадэляў *моцным* і *слабым* : «Нават калі з дапамогай мадэляў мы атрымліваем ня больш чым інтэлектуальнае ўсьведамленьне ці дакладнае разуменьне тых ці іншых сытуацыяў або аб'ектаў, то і ў гэтым выпадку выйгрыш аказваецца немалым... Аднак гэта - слабы аспэкт сутнасьці «мадэлі»... У больш моцным аспэкце ... мадэль ёсьць дасягненьнем нечага ў будучым». Іншымі словамі, у тым ці іншым выпадку сама па сабе наяўнасьць сканструяванае мадэлі здатная аказваць пэўнае ўзьдзеяньне на рэальнасьць практыкі, бо «калі мы ў стане пэрцэптыўна апынуцца ў дадзенай розумасяжнай карціне, гэтая карціна можа набыць фарбы і зьмяніць наша ўспрыманьне «рэальнага» сьвету, адкрываючы ў ім тыя магчымасьці, якіх мы ня бачылі раней...» - пераконвае М. Вартофскі. У гэтым сэнсе можна сьцьвярджаць, што ўжо адбытая эпістамалягічная каштоўнасьць «Сцэнароў рэформаў» у тым, што яны дазваляюць ажыцьцявіць гэтае своеасаблівае пэрцэптыўнае асваеньне эўрапейскага выбару для Беларусі. І цяпер ужо не ад аўтараў кнігі залежыць, стане прапанаваная імі мадэль беларускае будучыні ўзорам у моцным ці слабым разуменьні гэтага тэрміну Максам Вартофскім. Каштоўнасьць зробленай працы альбо застанецца на ступені інтэлектуальнага асэнсаваньня і больш дакладнага ўяўленьня існае сытуацыі, альбо спрычыніцца да дасягненьня новага стану мадэляванае рэальнасьці - беларускае будучыні.

Менск, 2003

Пераклад з расейскае Андруся Клікунова

ЮРАСЬ ЛІХТАРОВІЧ
палітоляг, дактарант Школы прыкладных гуманітарных навук пры Інстытуце сацыялёгіі і філязофіі АН Польшчы. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» - аналіз «Іракі. Каталізатар» (3/2003).

Юрась Ліхтаровіч
Кароткі курс посткамунізму

Jadwiga Staniszkis. *Postkomunizm. Próba opisu.* Gdańsk, Słowo/obraz terytoria, 2001.

1

Палітычная рэчаіснасьць апошніх гадоў у краінах Сярэдняй Эўропы (адмова ад камуністычнай ідэалёгіі, манаполіі адзінай партыі на палітычную ўладу і курсу на пабудову сацыялізму) ня зводзіцца да простага пераходу да дэмакратыі і рынкавай эканомікі. Праблема палягае ня толькі ў частковай або поўнай адсутнасьці прыватнай уласнасьці, вольных выбараў ды незалежных СМІ. Увядзеньне палітычных інстытутаў і працэдураў, уласьцівых заходнім дэмакратыям, толькі дазволіла вырашыць частку праблемаў, як нечакана паўсталі іншыя. Новыя дэмакратычныя мэханізмы часта адыгрываюць фармальную ролю, напрыклад спрыяюць ратацыі кіраўнічых элітаў, тады як асноўнымі мэханізмамі дзяржаўнага кіраваньня і прыняцьця рашэньняў застаюцца закулісныя дамоўленасьці паміж прадстаўнікамі найбольш уплывовых уладных груповак, бізнэс-колаў і міжнародных карпарацыяў. Адзінай кіраўнічай партыі і ідэалёгіі больш няма, але гіерархія былога рэжыму засталася, зьмяніліся толькі мэханізмы яе рэпрадукцыі. Да таго

ж вынік праведзеных рэформаў празь іх неадпаведнасьць агульнай сытуацыі нярэдка быў супрацьлеглы спадзяванаму. Вонкавы ціск, які штурхаў эліты да хутчэйшай дэмакратызацыі і пабудовы рынкавай гаспадаркі, не пакідаў часу на асэнсаваньне памылак і выпраўленьне структурных дыспрапорцыяў. Крах камунізму стварыў найлепшыя магчымасьці да посткамуністычнай адаптацыі перадусім яго функцыянэрам[1]. Ад дэкамунізацыі найбольш выйгралі былыя камуністы.

Камунізм, як бы палка яго ні асуджалі, застаецца адным з найважнейшых дасьведчаньняў чалавецтва ў XX стагодзьдзі. Гэтая першапачаткова філязофская дактрына грамадзкага разьвіцьця, альтэрнатыўнага прынятай у Эўропе XIX стагодзьдзя мадэлі, зь цягам часу стала кіраўніцтвам да практычнай пабудовы своеасаблівага грамадзка-палітычнага ладу, а таксама апранутай у форму навукі ідэалёгіяй, што вызначала жыцьцё асобнага чалавека і цэлых грамадзтваў. Абяцаючы пабудаваць «грамадзтва ўсеагульнай роўнасьці і вечнага шчасьця», камуністычная ідэалёгія нагадвала веру (хай сабе ў лепшую будучыню) і магла, згодна зь вядомым выразам Чэслава Мілаша, скоўваць розум. І дагэтуль сярод беларусаў адчуваецца жаль па вялікай дзяржаве СССР - першай камуністычнай дзяржаве ў сьвеце. Гэты жаль падсілкоўваецца дзяржаўнай прапагандай як адзін з сымбалічных падмуркаў сёньняшняга палітычнага курсу. Як выказаўся А. Лукашэнка, «давайце шчыра скажам, што гэтыя гады, якія былі пражытыя ў складзе Савецкага Саюзу, вялікая каштоўнасьць для нас. Яны нам далі столькі, колькі ня мог даць дагэтуль ніводзін перыяд існаваньня беларускіх земляў у складзе той ці іншай дзяржавы».

1. Згодна з даследаваньнямі палітычных эліт Польшчы, прыведзенымі ў агляданай кнізе, прыкладна палова прадстаўнікоў цяперашніх польскіх палітычных і

Падобныя заявы цяжка разглядаць інакш як ідэалягічнае афармленьне сучаснага палітычнагакурсу[2], у прыватнасьці арыентацыі беларускага рэжыму на палітычны *modus agendi* савецкіх часоў[3].

2

У аналізах дэмакратычных пераўтварэньняў у былым сацыялістычным блёку заўсёды гаворыцца пра эскаляцыю нацыяналізму і слабасьць дэмакратычных інстытутаў. З такога гледзішча Беларусь часта трактуецца як прыклад непасьпяховай дэмакратызацыі і слабой нацыянальнай ідэнтычнасьці. Між іншым, падобныя ацэнкі не тлумачаць спэцыфікі палітычнага разьвіцьця Беларусі і тым больш не дазваляюць прагназаваць яго магчымыя шляхі. Сваё тлумачэньне зьменаў, што перажылі былыя камуністычныя краіны за апошнія 10-15 гадоў, дае Ядвіга Станішкіс[4]. У сваёй кнізе яна спрабуе паказаць, што адбывалася за кулісамі «аксамітных рэвалюцыяў» - гэтых на першы погляд нечаканых і радыкальных зьменаў, якія перажылі народы Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы 15 гадоў таму. На яе думку, гэты працэс ня быў «неспадзяваным» і «раптоўным», прынамсі для партыйнай

гаспадарчых элітаў займала ў камуністычныя часы кіраўнічыя пасады, адна трэцяя - выконвала функцыі спэцыялістаў, і толькі 11 % паходзяць зь ніжэйшых прыступак сацыяльнай лесьвіцы.

[2] У сваёй працы «Формирование идеологии белорусской государственности» Мікалай Сташкевіч паказвае тры падыходы да шляхоў разьвіцьця Беларусі: першы - «паляпшэньне існай сувэрэннай беларускай дзяржаўнасьці ў межах саюзнага дзяржаўнага

намэнклатуры і спэцслужбаў. «Раптоўнасьць зьменаў» была толькі адмыслова створаным для насельніцтва вобразам, пэўнай новай палітычнай рэчаіснасьцю, неабходнай партыйнаму апарату для пасьпяховай зьмены свайго ідэалягічнага аблічча бяз страты ўлады і кантролю над дзяржавай. Так, у Маскве падчас жнівеньскага путчу «путч у путчы», мэтай якога было стварыць уяўленьне пра Ельцына як абаронца дэмакратыі[5]. Пачынаючы яшчэ з 1984-га ў колах польскай намэнклатуры пашыраліся чуткі, што дзяржаўны адмовяцца ад вайсковай прысутнасьці ў Сярэдняй Эўропе. Нескампрамэтаваныя працай у апараце партыі польскія моладзевыя лідэры, маладыя партыйныя эканамісты, пэрспэктыўныя афіцэры спэцыяльных службаў выяжджалі на Захад, дзе іх рыхтавалі кіраваць дзяржавай пасьля таго, як партыя падзеліцца ўладай (і адказнасьцю) з апазыцыяй. У тым жа год было створанае першае намэнклатурнае акцыянэрнае таварыства «Агратэхніка»[6].

Перадумовы такога «рэвалюцыйнага падыходу» зьявіліся ня ў 1984-м і нават ня ў 1980-м. Усьведамленьне неабходнасьці зьменаў прыйшло раней. Яно не было выклікана жаданьнем правесьці дэмакратычныя пераўтварэньні ў краіне: яго прычыны ляжаць у сфэры палітычных уяўленьняў камуністычнага кіраўніцтва, зьвязаных з паняткамі «бясьпека». У нейкі момант яно зразумела, што рэальная здольнасьць дзяржавы кантраляваць памяншаецца ўва ўмовах неабмежаванай улады, замкнутай ува ўнутраных стандартах рацыянальнасьці, правільнасьць якіх нельга праверыць вонкавымі крытэрамі. Умовай рэальнага кантролю ёсьць існаваньне пэўнай сфэры, незалежнай ад уладаў. Аднак гэтага усьведамленьне таго, што тэхналягічны разрыў паміж Захадам павялічваецца і савецкая сыстэма ня ў стане забясьпечыць мадэрнізацыю войска, прывяло да падзелаў у апараце ўлады паміж вайсковымі і палітычнымі элітамі. Спаўзаньне сыстэмы да анархіі, узмацненьне эканамічнай залежнасьці і вайсковага адставаньня СССР ад разьвітых краінаў прымусіла Крэмль таксама зразумець, што без радыкальных палітычных зьменаў немагчыма гарантаваць бясьпеку СССР.

ўзьнікнення, пазьней адраджаецца ў новай форме», другі - «пераўтварыць Беларусь у складовы кампанэнт заходняй Эўропы, а менавіта ўзяць за прыклад дзяржаўнасьці якую-небудзь заходнееўрапейскую краіну і стварыць уласныя ейныя дзяржаўныя структуры ў Беларусі». Такую інтэрпрэтацыю аўтар

Асноўныя праблемы кіраваньня ў СССР вынікалі з супярэчнасьцяў, якія ўтрымліваў камуністычны лад. Ён тлумачэньне палітычных і сацыяльных працэсаў праз абавязковай ідэалёгіі, якая не адпавядала рэчаіснасьці, і стварала свае штучныя ўяўленьні пра грамадзтва і дзяржаву. Адсутнасьць аднаго цэнтру ўлады, падзеленай паміж партыйнымі і дзяржаўнымі органамі, спрыяла карупцыі і непрафэсійнасьці апарату. У сыстэме без акрэсьленага ўласнасьці, інакш кажучы ў сыстэме калектыўнай уласнасьці, няма ні рынку, які б забясьпечваў сталую актуалізацыю попыту, ні асноўных эканамічных інтарэсаў, якія б спрыялі росту капіталу і асноўных сродкаў вытворчасьці. Эканамічнае дзейнасьць у такой сыстэме зводзіцца толькі да максымізацыі вытворчасьці, што не абавязкова дае пазытыўны эканамічны эфэкт.

Галоўным мэханізмам кіраваньня стала адміністрацыйнае перазьмеркаваньне, што ўва ўмовах манапартыйнасьці вяло да абрастаньня кіраўнічага апарату рознымі нефармальнымі сувязямі. Узьнікла патавая сытуацыя: сыстэма павольна ішла да анархіі, якая стрымлівалася за кошт павелічэньня ціньвай сфэры эканомікі, аўтаркіі прадпрыемстваў і аўтаноміі грамадзтва (гэта рабіла магчымым далейшае існаваньне сыстэмы, таму што зьмяншала імкненьне да зьменаў).

Манапартыйнасьць і татальны кантроль з боку партыйных органаў за ўсімі сфэрамі жыцьцядзейнасьці азначалі на самай справе непадкантрольнасьць рэальных працэсаў цэнтральнай уладзе. Пра гэта нагадваюць гісторыі з карпамі, якіх разводзілі ў супрацьпажарных рэзэрвуарах, і сьвіньнямі, якіх галавалі ў складох заводзкіх сталовак, альбо формула «маўклівага страйку» (частковага невыкананьня спушчаных зьверху плянаў), якую аблюбаваў дырэктарскі корпус. Расьлі памеры безграшовых абменаў, адбывалася зрастаньне дырэктарату дзяржаўных прадпрыемстваў і мясцовых партыйных дзеячоў з «чорным рынкам». На думку Станішкіс, адзіным лягічным вынікам быў распад усяе камуністычнай сыстэмы.

Каб прадухіліць гэта, партыйныя эліты пачалі шукаць выйсьце. Пры канцы 1980-х камуністычная намэнклятура ў краінах

называе «Пэтэральтрадыцыйнай». Усіх іх дазволім назваць нэтрадыцыйнымі. Ёнабыў высунуты з падачы намэнклятурных колаў на пачатку 1990-х гадоў, а ціпер кіраўнічымі колямі абвяшчаецца дамінантным.

Гл.: Сташкевич Николай. Формирование идеологии белорусской государственности // Беларуская думка. 2001. № 1. С. 144-145.

Цэнтральнай Эўропы не пабаялася падзяліцца ўладай (і адказнасьцю) з прадстаўнікамі канструктыўнай апазыцыі, бо формула «круглых сталоў» дазваляла ёй захаваць свае прывілеі і хутка знайсьці месца ў новым посткамуністычным палітычным парадку. Працэс падзелу ўласнасьці і перадачы ў прыватныя рукі (намэнклятурных работнікаў і супрацоўнікаў спэцслужбаў) пачаўся за некалькі гадоў да 1989 году. Пэрспэктыва ж вываду савецкіх войскаў зьнішчыла вудзіна савецкай вайсковай інтэрвэнцыі і толькі паскорыла працэс кантраляваных зьменаў.

У выпадку СССР быў яшчэ адзін чыньнік, які паўплываў на рашэньне распачаць пераўтварэньні. Частка савецкага апарату адкінула «арыентацыю на камунізм» пад уплывам дынамікі «вайсковай рэвалюцыі» (гэты тэрмін азначае сувязь паміж мадэрнізацыяй вайсковай тэхнікі, дактрын і арганізацыі ўзброеных сілаў ды палітычнымі і эканамічнымі рэформамі ў імя гэтай мадэрнізацыі). У другой палове 1970-х гадоў для яе стала відавочна, што эканамічнае і тэхналягічнае адставаньне краіны ад Захаду павялічваецца, і гэта прывядзе да паразы ў выпадку ўзброенага канфлікту. Савецкі генэральны штаб прызнаў, што ЗША ў стане выканаць «абмежаваны атамны ўдар», і вырашыў, што Захад рыхтуецца да вайны. У адказ была распрацавана арыентаваная на атаку дактрына маршала Агаркова, якая рабіла стаўку на абмежаваную прэвэнтыўную вайну - нечаканы напад войскаў варшаўскага пакту на Заходнюю Эўропу, які б падарваў здольнасьць ЗША да ядравай атакі (разьлік быў такі, што амэрыканцы ня будуць гатовыя да пераносу канфлікту на падапечную сабе тэрыторыю і таму ня выкарыстаюць ядравай зброі) і забясьпечыў бы Маскве стратэгічную ініцыятыву.

Гэты плян выклікаў пярэпалах у Крамлі і сярод партыйных эліт краінаў савецкага блёку (яны баяліся амэрыканскага ядравага ўдару па сваёй тэрыторыі ў выпадку вайны). У адказ Палітбюро ЦК КПСС паспрабавала ўзмацніць кантроль над войскам. Станішкіс дапускае, што яно сьвядома прыняло рашэньне ўвесьці войскі ў Аўганістан, каб не дапусьціць вайсковай інтэрвэнцыі ў Сярэднюю Эўропу. Іншым крокам, які гарантаваў бы стабільнасьць, была дэнансацыя Варшаўскай дамовы.

ад (і заснаваны на прывілеі камуністычным мэсіянізме, працоўнікаў пачатку вудзіна хорошым дзяржаўным цэнтралізмам, рэпрэсіямі супраць сваіх апанэнтаў - як сапраўдных, так і ўяўных, інструмэнтальным трактаваньнем права, пастаяннай мабілізацыяй масаў у палітычных мэтах, стварэньнем клясы намэнклятуры, велізарным войскам і паліцыйным апаратам, сталай арыентацыяй на агрэсію супраць іншых дзяржаўных ладоў.

(Маскоўскія стратэгі спадзяваліся, атрымаўшы заходнія крэдыты і тэхналёгіі, узмацніць «унутраную імпэрыю» за кошт ахвяраваньня яе «вонкавым колам» - Сярэдняй Эўропай.) Не выпадкова ў 1985 годзе Грамыка, выступаючы ў Венерафэсарка прапанаваў мадэль нэўтралітэту для сярэднеэўрапейскіх краінаў, пазьней Гарбачоў насіўся з ідэяй «супольнага эўрапейскага дому», спрабуючы за вывад войскаў зь Сярэдняй Эўропы і сваю згоду на аб'яднаньне Нямеччыны атрымаць фінансавую дапамогу. Аднак савецкія «рэфарматары» памыліліся ў сваіх прагнозах, бо не зразумелі да канца прыроды пераўтварэньняў, якія яны самі распачалі. Яны адбылася не мадэрнізацыя СССР, як плянавалася, а яна пачатак новай фазы - посткамунізму.

Першай катэгорыяй памылак, на думку Станішкіс, была надзвычай аптымістычная інтэрпрэтацыя Гарбачовым і ягоным атачэньнем сыгналаў, што зыходзілі з Захаду. Заявы заходніх палітыкаў у падтрымку ідэі «супольнага эўрапейскага дому» інтэрпрэтаваліся як падтрымка палітыкі перабудовы і адкрытасьці. Савецкае кіраўніцтва не ўзяло пад увагу, што заходнія палітыкі маюць іншы спосаб мысьленьня. Яны не ўспрымалі гэтых лёзунгаў літаральна, да таго ж яны не разумелі іх канкрэтнага зьместу. Заявы аб падтрымцы засталіся толькі заявамі. Спадзяваньні на паўтарэньне югаслаўскага ці кітайскага сцэнару ня спраўдзіліся. Гэтым краінам Захад стаў дапамагаць толькі пасьля таго, як яны пасварыліся з Масквой, а не дзеля таго, што яны распачалі рэфармаваньне сацыялістычнай сыстэмы.

Другая катэгорыя памылак - гэта неразуменьне камандай Гарбачова інстытуцыйных, культурных ды геапалітычных падставаў посьпеху кітайскіх рэформаў і вера ў тое, што СССР у стане пайсьці кітайскім шляхам. У Крамлі спадзяваліся, што рэвалюцыя зьверху прывядзе да таго самага выніку, як у Кітаі, і таму сьлепа пераймалі інстытуцыйныя рашэньні, узятыя зь іншага культурнага кантэксту, што толькі паскарала сыстэмны крызыс.

Трэцяя катэгорыя памылак вынікае з погляду атачэньня Гарбачова на падзеі 1989 году ў Сярэдняй Эўропе праз прызму

4 Яна ка-
Станішкіс -
е,
ейскія
Варшаўскага
ў Сярэдняй
Асноўныя
працы:
«Польшча:
самаабмежаваная
рэвалюцыя»
(1985)
выдадзена
па-
ангельску,
«Анталёгія
сацыялізму»
(1988)
выйшла ў
самвыдаце,
«Дынаміка
пераўтварэньняў
ува
Усходняй
Эўропе»
(1992)
выдадзена
па-
ангельску,
«Посткамунізм:
нараджэньне
загадкі»
(2000)
таксама
зьявілася ў
англамоўным
варыянце.
Удзельнічала
ў польскім

Праскай вясны. У ім не разумелі, што ў 1989 годзе ахвяраю падзеяў было не жаданьне вырвацца з-пад савецкай рукі, у 1968 дамінацыі і рэфармаваць структуры камуністычнага апарату ўлады, а імкненьне адмовіцца ад камунізму наагул, якое віталася ўнутры самога апарату ўлады. Савецкае кіраўніцтва імкнулася зьдзейсьніць скачок ад камунізму да сацыял-дэмакратыі альбо посткапіталістычнай сыстэмы, ідучы на саступкі ў палітычнай і эканамічнай сфэры: павелічэньне ролі мясцовага самакіраваньня і прадстаўнічых інстытуцыяў, дапушчэньне да ўлады «канструктыўнай» часткі апазыцыі, частковую прыватызацыю і ўвядзеньне мяшанай формы ўласнасьці. У некаторых краінах - у Польшчы[7] і Вугоршчыне - эліты пайшлі значна далей, у астатніх жа назіраўся супраціў нязгода з рэформамі. Гэтая пазыцыя была ўспрынята як пагроза новай лініі СССР, і Крэмль змушаў сваіх сатэлітаў да рэформаў, што вяло да дэстабілізацыі сытуацыі.

ахвяраю рухаю камуністычны рукі, у 1968 годзе была апарату, якое, у 1980 годзе была ідучы на «Сьнідарнасьці» цяжкас пазыцыяў з умовамі.

[5] «Арацію і абарона Бетэфа Доаў, перад атакай, якой не было… ці не таму, што гэты будынак відаць з вокнаў Амбасады ЗША і ён знаходзіцца ў сфэры дзеяньня камэраў CNN, якія ствараюць факты і палітычныя сымбалі - умовы пасьпяховасьці *simulacrum»* .

была створана на базе «Саюзу сельскай моладзі» і Вайскова-тэхнічнай акадэміі, атрымала крэдыт Сусьветнага банку на разьвіцьцё малочнай прамысловасьці, які быў выкарыстаны на пастаўкі і продаж кампутарнай тэхнікі ў СССР.[7]

Чацьвертая, самая істотная катэгорыя памылак - гэта няздольнасьць Гарбачова зразумець сутнасьць і сілу нацыяналізму ў рэспубліках СССР. Гарбачоў быў так званым «дзяржаўнікам», то бок прызнаваў пачуцьцё ідэнтыфікацыі зь дзяржавай і не прызнаваў пачуцьця этнічнай прыналежнасьці. Ён не аддзяляў «расейскасьці» ад «савецкасьці» і чакаў падобных настрояў ад камуністычных элітаў у рэспубліках. Іхнюю пераарыентацыю на этнічны нацыяналізм ён ўспрыняў запозна і перажыў сапраўдны шок[8]. Ён аказаўся ня ў стане нешта супрацьпаставіць супольным нацыяналістычным плятформам рэспубліканскіх элітаў і грамадзтваў, зь спадзяваўся на адваротнае - што перабудова і дэмакратызацыя прывядуць да ізаляцыі рэспубліканскай намэнклятуры, якая будзе шчыльней гарнуцца да Масквы. Аднак насамрэч нацыяналізм стаў стратэгіяй, якая дапамагла мясцовым забясьпечыць пераемнасьць улады, падзел дзяржаўнай маёмасьці і захаваньне сацыяльнай гіерархіі камуністычных часоў. Рэспубліканская намэнклятура проста падмяніла

Тут выйсьця за кінаныя мясцы і зь камуністычнага шарату, зьвязаная з спадзяваньнямі служкамі, якая дэфакта элітам вайшла на рынак міжнародных

палітычныя асновы свайго прывілеяванага статусу эканамічнымі.

Пятая катэгорыя памылак тлумачыцца няправільным разуменьнем партыйным кіраўніцтвам раскладаў глябальнай палітыкі. Распад савецкага блёку на асобныя часткі з розным узроўнем разьвіцьця быў выгадны індустрыйна разьвітым краінам, бо мадэрнізацыя і паступовае далучэньне паасобных краінаў да сусьветнай капіталістычнай сыстэмы каштавала менш, чым мадэрнізацыя ўсяго блёку адначасна.

Пры дасьледаваньні пераходу да посткамунізму аўтарка ўводзіць яшчэ адзін элемэнт - уплыў культурнай спэцыфікі і цывілізацыйных асаблівасьцяў розных рэгіёнаў на ходу трансфармацыі. На думку Станішкіс, «падчас правядзеньня рэформаў культурны кантэкст у вялікай ступені акрэсьлівае *focus* - цэнтар увагі элітаў, то бок прыярытэты і заданы, а таксама падзелы ўнутры камуністычнага апарату». Яна вызначае тры культурныя зоны: *культуру парадоксу* (Кітай), *культуру антыномій* (Расея) і заснаваную на *лёгіцы бінарных вартасьцяў* (logika dwuwartościowa) *культуру Сярэдняй Эўропы*, дзе панятак «ідэнтычнасьць» шчыльна спалучаны з панятка «адрозьненьне» (różnica).

У азіяцкай культуры разуменьне элемэнту (інстытуту) залежыць ад характару яго сувязяў з асяродзьдзем, пад зьменай у гэтай культуры разумеюць перадусім зьмену сувязяў. Менавіта гэтая культурная традыцыя абумоўлівала прыярытэты кітайскіх рэформаў: значэньне інстытуту залежыць перадусім ад структуры і арганізацыйных прынцыпаў асяродзьдзя, а не ад яго канкрэтнай формы. Вынікам такога падыходу стала захаваньне шматлікіх традыцыйных эканамічных інстытутаў, напрыклад структуры кіраваньня гаспадаркай пры зьмене прынцыпаў яе арганізацыі. Так, пры калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў Кітаі традыцыйныя лякальныя рынкі збыту яе прадукцыі зьнішчаныя не былі.

У расейскай культурнай традыцыі значэньне пэўнага элемэнту вызначаецца адначасова і яго супрацьпастаўленьнем, і яго дапаўненьнем «сукупнасьцю» элемэнтаў і сувязяў пры дапамозе выпрацоўкі «звышідэі». У раньняй савецкай ідэалёгіі гэта

фінансавых апэрацый яшчэ ў 1970-я.

40 гэтым сьведчыць рэакцыя на падзеі ў Літве. Гл.: Постановление ЦК КПСС «О срочных мерах по противодействию выхода Литвы из состава СССР». 6 марта 1990 (секретно). Исторический Архив. 1991. № 1. С. 3-5.

выразілася ў імкненьні трансфармаваць міжнародны парадак праз прызму ідэі «сусьветнай рэвалюцыі», потым - у жорсткім супрацьпастаўленьні камунізму і капіталізму. Аслабленьне магутнасьці СССР і яго залежнасьць ад індустрыйна разьвітых краінаў прывялі да таго, што камуністычная ідэя пачала ўспрымацца як «фальшывая звышідэя». Не выпадкова перабудова пачалася з пошукаў новай звышідэі - гарбачоўскага «супольнага дому».

Такое мысьленьне ў антынамічных катэгорыях прыводзіць да таго, што прастора для «сучаснасьці» заўсёды паўстае пры дапамозе радыкальнага адмаўленьня традыцыі. У выніку рэфарматары не адчуваюць грамадзкіх і палітычных абмежаваньняў для свайго валюнтарызму, а іхнія экспэрымэнты даводзяць да абсурду запазычаныя з Захаду праекты рэформаў. У іх ходзе разбураюцца традыцыйныя інстытуты, якія маглі б забясьпечыць эвалюцыйнасьць трансфармацыі і значна паменшыць яе кошт. Гэта адбываецца дзякуючы адсутнасьці ў палітычнай культуры сыстэмы стрымак і супрацьвагаў, а сярод палітыкаў - пачуцьця самаіроніі, скептыцызму і памяркоўнасьці. Менавіта гэтага не зразумеў Захад, які ня верыў у непацьверджаныя інстытуцыйнымі зьменамі дэкларацыі, тады як у расейскай традыцыі сьпярша адбываецца вызначэньне цэльнага бачаньня і толькі пасьля - канкрэтызацыя.

Сярэднеэўрапейская культура выпрацавала ідэнтычнасьць, заснаваную на катэгорыях «адрозьненьня» і «ўзаемнага выключэньня». У гэтай культуры камуністычная ідэалёгія трактавалася як «бачнасьць» (pozór), нармальна ўспрымалася тое, што «рэальны» камунізм не адпавядае ідэалягічным канструкцыям. Тут хутчэй адбыўся крызыс ідэалёгіі, якая ўсё больш разыходзілася з рэчаіснасьцю, лягчэй пайшла эвалюцыя камуністычнай сыстэмы і найраней былі ўведзеныя элемэнты капіталізму. У такім культурным кантэксьце сымбалічны капітал нацыянальнай традыцыі выкарыстоўваўся ў палітычных мэтах, што выклікала зьяўленьне масавага руху пратэсту. Зьмены ў такой культуры азначаюць акрэсьленьне новага статусу (тоеснасьці) элемэнту, што прыводзіць да новага характару стасункаў. Таму выхад з камунізму тут адбыўся

шляхам сымбалічнага і праўнага прызнаньня палітычных і эканамічных працэсаў, якія раней нефармальна вызначылі новыя сыстэмаўтваральныя арыентацыі ўсяго грамадзтва (формула «круглых сталоў»), пры дэманстратыўным вылучэньні самога моманту пераходу.

Такім чынам, аўтарка паспрабавала рэканструяваць характар мысьленьня камуністычных элітаў, аналізуючы яго асноўныя дылемы (зьмена разуменьня паняткаў «кантроль» і «бясьпека»), памылкі і асаблівасьці, у прыватнасьці, рэакцыі на выклікі і шанцы глябалізацыі. Каб высьветліць перадумовы распаду камуністычнай сыстэмы, яна разгледзела таксама культурныя кантэксты і спэцыфіку рэгіянальнага разьвіцьця. Усё гэта дазволіла ёй вытлумачыць, чаму розныя грамадзтвы па-рознаму выйшлі з камунізму і па-рознаму разьвіваліся ў фазе посткамунізму.

3

Посткамунізм, згодна зь Я. Станішкіс, - гэта фармаваньне капіталу ўва ўмовах глябалізацыі, перадачы дзяржаўнай маёмасьці ў прыватныя рукі і намэнклятурнага, а ня рынкавага тыпу стварэньня камэрцыйных структураў. Гэтая сыстэма характарызуецца ўнутранай супярэчнасьцю: яна спалучае высокаарганізаваны капіталізм, заснаваны на сеткавым варыянце адносінаў з посткапіталістычнымі краінамі і рэнце ўлады, з традыцыйным прыватным сэктарам, які існуе на мяжы шэрай сфэры эканомікі, ня мае магчымасьці да акумуляцыі капіталу і далейшага разьвіцьця, што пазбаўляе дзяржаву стабільнасьці.

Аўтарка вылучае чатыры фазы посткамунізму (асновай для дадзенай тыпалёгіі стаў досьвед Польшчы). Іх зьмена адбывалася разам зь зьменамі макраэканамічных умоваў, пераходам «адаптаванай намэклятуры» (nomenklatura uwłaszczeniowa) да новых гарызонтаў экспансіі, вычарпаньнем адных рэсурсаў і спробамі знайсьці новыя.

Першая фаза - пераразмеркаваньне, г. зн. перавод сродкаў і капіталу зь дзяржаўнага сэктару ў прыватныя рукі (1984-1989). Характарызуецца стварэньнем камэрцыйных фірмаў пры дзяржпрадпрыемствах, прыватызацыяй маёмасьці грамадзкіх арганізацый, падрыхтоўкай да стварэньня прыватных фінансавых інстытутаў.

Другая фаза прыпадае на 1990-1993 гады. Вызначаецца ўзмацненьнем ролі фінансавага капіталу (банкаў) дзякуючы павелічэньню даўгоў дзяржаўных прадпрыемстваў і нарастаньню іх банкруцтваў, выкарыстаньнем фінансавых інстытутаў з мэтай «мяккага фінансаваньня» намэнклятурных фірмаў (танныя крэдыты, завышаны курс пры куплі валюты ў фірмаў-эспартэраў), зьяўленьнем «арганізаваных рынкаў» (уваход на якія адміністрацыйна абмяжоўваецца і дзе навязваюцца «свае» правілы канкурэнцыі).

Трэцяя фаза (1993-1999) вылучаецца высокім узроўнем арганізацыі і канцэнтрацыі капіталу (ствараюцца фінансава-гандлёвыя і фінансава-прамысловыя групы, адбываецца зрастаньне дзяржаўнай адміністрацыі з прафсаюзнымі лідэрамі і бізнэс-элітамі[9]), разрывам паміж арганізаваным буйным капіталам і дробным ды сярэднім капіталам (узьнікненьне алігархіі). У гэтай фазе адбываецца першы крызыс посткамуністычнай эканомікі[10] - банкрутуюць намэнклятурныя акцыянэрныя таварыствы, пасьля чаго паглыбляецца камэрцыялізацыя «дзяржаўнага сэктару».

Чацьвертая фаза - «капіталізм дзяржаўнага сэктару», характарызуецца адміраньнем дзяржавы і дэпалітызацыяй працэсаў прыняцьця рашэньняў, аслабленьнем і зьнікненьнем алігархіі пад цяжарам унутраных канфліктаў і канкурэнцыі з замежным капіталам, а таксама ўсёабсяжнай камэрцыялізацыяй дзяржаўнага сэктару. Рэзка ўзрастае важнасьць палітычных чыньнікаў: да дзяржаўных грошай кіроўная партыя дапускае толькі сваіх прыхільнікаў.

Посткамуністычную дзяржаву Станішкіс вызначае як «палітыку без рэальнай улады», паводле аналёгіі з камуністычнай дзяржавай, у якой «улада існуе без палітыкі». Гэта азначае, што хоць пры прыняцьці рашэньняў адбываецца гульня розных

9. У найбольшым ступені дзяржаўнага капіталізму ўзнікае тое, што пасярэдніка намэнклятурныя адміністратара, які забясьпечвае льготныя ўмовы для разьвіцьця, стварае арганізаваныя рынкі і фінансуе рызыкі дзейнасьці камэрцыйных фірмаў (формула

палітычных сілаў, але дзяржаўныя інстытуты ня маюць досыць улады, каб кантраляваць выкананьне прынятых рашэнняў. Аслабленьне клясычнай мадэлі «дзяржавы аўтарытэту» акрэсьленым і адасобленым цэнтрам кіраваньня адбываецца з аднаго боку, пад уплывам працэсаў глябалізацыі, калі памяншаецца сфэра сувэрэннай «улады» (rządzenia) і плян выходзіць здольнасьць дамаўляцца і кіраваць (zarządzanie) у рамках міжнародных нормаў. Так, роля ўрадаў і прэзыдэнтаў у краінах, якія прэтэндуюць на далучэньне да эўрапейскай эўраатлянтычнай сыстэмы супрацоўніцтва (НАТО, ЭЗ), зводзіцца да прыняцьця і гарманізацыі стандартаў і правілаў, распрацаваных наддзяржаўнымі органамі. На патрабаваньні такіх органаў урады гэтых краінаў часта вымушаныя праводзіць рэформы хуткімі тэмпамі і без уліку рэгіянальных асаблівасьцяў разьвіцьця.

Зь іншага боку, посткамуністычная дзяржава сама пазбаўляе сябе легітымнасьці, камэрцыялізуючы дзяржаўны сэктар без стварэньня адпаведных мэханізмаў кантролю. Тым самым трыюмфуе камэрцыйная лёгіка, у межах якой няма месца грамадзкаму супрацоўніцтву і грамадзкай салідарнасьці. Зьвядзеньне дэмакратычных інстытутаў (выбараў) да інструмэнту легітымізацыі кіраўнічых колаў, зрастаньне дзяржаўнага апарату з намэнклятурнымі бізнэс-коламі і адлучэньне масаў ад удзелу ў дзяржаўным кіраваньні вядзе да стагнацыі. Неадпаведнасьць ужываных палітычных сёзунгаў (лібэральных - больш рынку, левых - больш дзяржавы і парадку) сутнасьці сучасных палітычных зьяваў і працэсаў стварае пераканаьне ў адсутнасьці альтэрнатыўных магчымасьцяў разьвіцьця, што ў сваю чаргу стабілізуе і рэпрадукуе сыстэму. У той жа час ня можа паўстаць і моцная аўтарытарная ўлада. Глябалізацыя, што падточвае дэмакратыю, нішчыць эканамічны падмурак алігархій і аўтарытарных папулізмаў.

Дадатковы выклік для эліт Сярэдняй Эўропы ўяўляе неабходнасьць пераасэнсаваць уласнае становішча «на памежжы». Памежжа ўспрымаецца ня толькі як геапалітычная рэальнасьць, але і як характарыстыка мысьленьня: паміж камунізмам і дэмакратычным капіталізмам, паміж сучаснасьцю

кіраваньня (управленія) і

Дзяржаўны бізнэс-сэктар

капіталу,

з замежным капіталам. У найгоршым варыянце - страчвае магчымасьці кантролю над капіталам пасьля зрастаньня мясцовага бізнэсу зь міжнароднымі карпарацыямі.

У Першы крызыс посткамунізму здарыўся ў Расеі ў жніўні 1998 году.

Спалучэньне рынкаў з рознай рацыянальнасьцю

і «новай традыцыйнасьцю». Існаваньне «на памежжы» ня можа не некалькі сур'ёзных пагрозаў. Па-першае, памежжа азначае сьцьвярджэньне пэрыфэрыйнасьці, дзе суіснуюць элементы шматлікіх традыцыяў і розных гістарычных эпохаў. Каб забясьпечыць такое суіснаваньне, трэба ствараць кустарныя інстытуцыйныя гібрыды, што, у сваю чаргу, прадукуе неакрэсьленую ідэнтычнасьць і страх яе страты. Зьмешваньне культурных межаў прыводзіць альбо да гістэрычнай агрэсіўнай прывязанасьці да ўласнай этнічнасьці цімяжу рэлігійнасьці, альбо да зручнай формулы «лякальнасьці», «тутэйшасьці», якая насамрэч зьяўляецца натуральным абгрунтаваньнем прыстасаванства. На думку Станішкіса, посьпех пераменаў немагчымы без адмовы ад камуністычнай спадчыны і ад пачуцьця пэрыфэрыйнасьці. У сучасным сьвеце няма месца пэрыфэрыйнасьці: толькі якасьць інстытуцый мэнэджмэнту, здольнасьць да інавацыйнасьці даюць шанцы ў глябальнай канкурэнцыі.

Шырыня абмеркаваных пытаньняў і сьмеласьць у высновах робяць гэтую кніжку крыніцай новых і цікавых поглядаў на падзеі апошніх дваццаці гадоў у нашай частцы Эўропы. Балышыня высунутых тэзаў і высноваў можа падацца дзесьці радыкальнымі і спрэчнымі, але ўсьлед за Г. Башлярам трэба сказаць, што «толькі спрэчныя факты зьяўляюцца патэнцыйна праўдзівымі». Назапашаны ў кнізе тэарэтычны матэрыял дазваляе распачаць дыскусію і наконт характару посткамунізму ў Беларусі. Беларуская мадэль разьвіцьця сьведчыць пакуль пра няздольнасьць намэнклятуры адказаць на сучасныя выклікі. Зварот да традыцыйных мэханізмаў кіраваньня, памятных з камуністычных часоў, - канцэнтрацыі ўлады за прынцыпам вэртыкалі, тэхналёгіі стварэньня штучных нэгатыўнасьцяў (вакол пытаньня мовы, культуры, апазыцыі) дзеля захаваньня ўлады і яе пераемнасьці, абмежаваньня зонаў палітычнай канкурэнцыі і публічнай дыскусіі пры прыняцьці рашэньняў («улады без палітыкі»), аднаўленьня ідэалёгіі як сродку кантролю за апаратам і грамадзтвам, арыентацыі на Маскву - дазволілі захаваць стабільнасьць у краіне. Але коштам гэтай стабільнасьці зьяўляецца стагнацыя, укараненьне пачуцьця беларускай пэрыфэрыйнасьці і «лякальнасьці». І ўсё ж Беларусь мае някепскія шанцы на разьвіцьцё ў глябальным сьвеце. У нас

экспансіі капіталізму. Каб спыніць крызысу, неабходна дзяржаву на фінансавага банкруцтва. Пасьля, рэальнай крызісе стварыць і ў краіне аслабленьня алігархаў, стварыць умовы для правядзеньня рэформаў і ўзмацненьня цэнтральнай улады.

ёсьць магчымасьць уважліва прааналізаваць досьвед суседніх краінаў у выхадзе з посткамунізму (на думку Станішкіс, мэханічны перанос «заходняй мадэлі» прыводзіць да «ірэлевантнай дэмакратыі»), а адносную міжнародную ізаляцыю пры пасьлядоўнай палітыцы можна параўнальна лёгка замяніць на міжнароднае прызнаньне і супрацоўніцтва. Галоўнае, каб нашы эліты зьмянілі сваё мысьленьне, зразумелі, што мэты і спосабы кіраваньня дзяржавай павінны адпавядаць выклікам глябальнага сьвету.

крытыка
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Андрэй Дынько
Чаму мы прагнем у Эўропу

АНДРЭЙ ДЫНЬКО
рэдактар газэты «Наша Ніва». Палітычны й культурны публіцыст. Гэты тэкст быў створаны для кнігі «Невядомая Беларусь», якая павінна выйсьці сёлета пры падтрымцы фонду «За новую Беларусь».

Сацыялягічныя дасьледаваньні замежнапалітычных прыхільнасьцяў беларусаў у 2003 годзе выявілі: дзьве траціны людзей хацелі б далучэньня краіны да Эўразьвязу, але толькі адна траціна гатовая плаціць за эўраінтэграцыю адмовай ад адзінае эканамічнае прасторы з Расеяй. Пры гэтым таксама дзьве трэція беларусаў хочуць захаваньня саюзных сувязяў з Расеяй, а яшчэ чатыры пятыя - перакананыя прыхільнікі незалежнасьці. Гэтыя лічбы найперш успрымаюцца як знак цяжкое хваробы. Як толькі інтэлектуалы-маралісты ні крытыкавалі такое шызафрэніі сьвядомасьці, такога неразборлівага грамадзянскага пачуцьця. Беларусы хочуць неспалучальнага - і ўваходжаньня ў Эўразьвяз, і поўнае незалежнасьці, і саюзу з Расеяй адначасова. Беларусы ня маюць палітычнага мысьленьня, яны гатовыя жыць міражамі і галасаваць за палітыкаў, што найлепш ствараюць міражы, наракаюць палітолягі. Між тым спалучэньне незалежнасьці і саюзу з Расеяй успрымаецца беларусамі як зьдзейсьнены факт, і падазрэньні наконт яго рэальнасьці ўзьнікаюць толькі тады, калі хаўрусьнік час ад часу перакрывае хаўрусьніку газ. З Расеяй і незалежнасьцю ўсё больш-менш ясна. Нібы героі «Леапарда» Тамаза ды Лямпэдузы, беларусы хацелі б усё зьмяніць такім чынам, каб усё засталося па-старому. Можна

зразумець, чаму мае суайчыньнікі «хочуць, каб было як раней», як гэта сфармуляваў Чэкман. Але чаму беларусы прагнуць далучыцца да Эўропы, увайсьці ў Эўразьвяз? Ад Эўразьвязу нас дагэтуль аддзяляе тысяча кілямэтраў калючага дроту: між вёскай Камароўкай, радзімай першага беларускага касманаўта Пятра Клімука, на поўдні, і возерам з швэдзкім водгульлем у назьве, Асьвеяй, на поўначы - усяго пара дзясяткаў пунктаў пропуску. І гэтая ўцялесьненая ў дроце супярэчнасьць усеагульнага (дзьве траціны народу) жаданьня ды рэчаіснасьці, дадзенай нам у адчуваньні (мяжа на замку), спараджае пытаньні - што ж прыцягвае беларусаў да Эўропы, што выклікае эўрасымпатыі ў неспрыяльных таму палітычных умовах? Каб адказаць на гэтыя пытаньні, трэба зразумець, што ёсьць супольнага ў насельнікаў Беларусі і жыхароў заможнае «Вялікае Эўропы». Адказаўшы на гэтыя пытаньні, мы таксама зразумеем, што мэнтальна адрозьнівае Беларусь ад Расеі.

1

Гмахі позьнесавецкага часу ўражваюць сваімі памерамі і нефункцыянальнасьцю. Як жа адрозьніваюцца ад іх яшчэ нешматлікія грамадзкія будынкі, задуманыя і рэалізаваныя ў постсавецкі час, часта адштукаваныя ў стылі «эўрадызайну» - зь перайманьнем эўрапейскіх архітэктурных прыёмаў даступнымі тутака сродкамі. Часам іх дойлідаў падводзіць густ, затое выгадна вылучаюць іх функцыянальнасьць і эканамізм.

Эўрапейскае ў Беларусі перажывае пэрыяд надзвычайнае папулярнасьці. Народ ня толькі робіць «эўрарамонты» і ставіць «эўравокны», але й купляе «эўраасьпірын» у «эўрааптэках». У Магілёве, вотчыне прэзыдэнта, фірма з характэрнай назвай «Апошні шлях» абвясьціла: якасьць яе дубовых трунаў «адпавядае эўрастандартам».

Кожны ў Беларусі ведае, што ягоная краіна знаходзіцца ў цэнтры Эўропы. Калі верыць газэтам і географам, цэнтар Старога Сьвету спачывае ў водах невялікага возера зь ляпідарнай назвай Шо.

Таксама і кожны ў Літве знае, што цэнтар Эўропы зьмяшчаецца каля Алітусу, а ўкраінцы беспахібна лякалізуюць гэты цэнтар у галавакружна харошых краявідах Рахава, у Закарпацьці. Незвычайная прыгажосьць усіх гэтых цэнтраў з вантробамі прадае геаграфію як навуку ў вышэйшай ступені гуманітарную. Зьмяшчэньне сваёй краіны ў цэнтар Эўропы - адзін з нацыятворчых мітаў, які сустракаецца ўва ўсіх краінах Усходняй Эўропы. Ступень гэтага настойлівага «цэнтрызму» прама прапарцыйная меры няўпэўненасьці нацыянальнага пачуцьця і раздвоенасьці памкненьняў маладых нацый. У Беларусі міт пра цэнтар Эўропы асабліва распаўсюджаны. Нібы сам факт знаходжаньня гэтага пункту С на нашай тэрыторыі здольны магічным чынам зьменшыць смурод у самай публічнай выгодзе аўтавакзалу ў Глыбокім, якога не міне ніводзін безмашынны шукальнік ледавіковага келіха возера Шо, гэтага Граалю беларускіх эўрафілаў.

Зьмяшчэньне сваёй краіны ў цэнтры Эўропы - яшчэ адна праява моды на эўрапейскае. Гэта таксама адбітак зьменаў у нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў. Пры Савецкім Саюзе нікому ў галаву не прыходзіла лякалізаваць цэнтар Эўропы ў Беларускім Паазер'і. А калі каму і прыходзіла, гэта канчалася для яго настолькі кепска, што адбівала ўсякую ахвоту паўтараць. Параўноўваць плошчу краіны з плошчай Бэльгіі ці Даніі было модна, бо ўрэшце гэта прыводзіла чытача да асэнсаваньня велічы «адной шостай часткі сушы», на якой прасьціраўся Савецкі Саюз. Эўрапейская ж прыналежнасьць Беларусі была табу. Толькі па 1991 годзе, выпушчаная ў тыраж нацыянальна-вызвольным рухам, яна імгненна стала стэрэатыпам.

2

Першае тлумачэньне эўрасымпатый - жаданьне беларусаў падзяліць матэрыяльны дабрабыт, якім цешацца сёньня ўсе краіны аб'яднанае Эўропы. Эўропа сёньня - гэта ўвасоблены цуд, які выклікае захапленьне і на ўсход ад Бугу, і за Атлянтыкай, і за Басфорам. Каб у Эўразьвяз увайсьці магла

любая краіна, як, да прыкладу, у ААН, на наступны ж дзень у Эўропу ўступілі б усе краіны Афрыкі з Дэмакратычнай і Народнай Рэспублікамі Конга ўключна. На шчасьце, мудрыя эўрапейцы самі выбіраюць для сябе саюзьнікаў.

Аднак складнікамі эўрапейскага цуду зьяўляюцца ня толькі матэрыяльны дабрабыт, але і новае палітычнае мысьленьне, атмасфэра добрасуседзтва і талерантнасьці. У сёньняшняй Эўропе ўвасобілася даўняя мроя пра спыненьне этнічных канфліктаў і войнаў, вайсковага суперніцтва і гонкі ўзбраеньняў, пра адмову ад вырашэньня канфліктаў ваеннымі сродкамі. Вайна паміж эўрапейскімі супэрдзяржавамі немагчымая. Аточаная зонамі пэрманэнтных канфліктаў новая Эўропа выглядае сапраўдным раем.

Эўропа выглядае дзівам ня толькі ў параўнаньні з канфліктнымі зонамі, якія яе атачаюць, але і ў праекцыі на стагодзьдзі кровапраліцьцяў, якія папярэднічалі нашаму часу. Тое, што эўрапейцам цяпер здаецца непарушнымі прынцыпамі, насамрэч зусім новая зьява. Старая сілавая палітыка была канчаткова зжытая толькі пасьля другой сусьветнай вайны. А да таго вякамі ў Эўропе дзеялася тое самае, што цяпер назіраем між Эрытрэяй і Этыёпіяй або ў Інданэзіі. Карані сёньняшняга сьветапогляду можна адшукаць у часах Асьветніцтва, але прыйшла Эўропа да яго перадусім у выніку асэнсаваньня трагедыі другой сусьветнай вайны. Культура міру - новая зьява ў Эўропе.

Квітнеючая Эўропа доўгі час выклікала ўсё ж вялікі сумнеў у беларуса. Для сярэдняга беларуса да апошняга часу mission civilisatrice Эўропы асацыявалася перадусім з плякатамі «Гітлер-асвабадзіцель». Чалавеку, на якім у Асьвенцыме ставілі досьледы па ампутацыі органаў без анэстэзіі, цяжка пагадзіцца, што эўрапейскасьць - гэта цывілізацыя.

Другая сусьветная вайна была для Беларусі - ад Налібоцкай пушчы да крычаўскіх лясоў - апакаліпсысам, выпаленьнем сьвету. У сьвядомасьці многіх, калі ня большасьці беларусаў не адна Нямеччына, але ўся Эўропа несла адказнасьць за тую вайну. Па-першае, празь мюнхенскае згодніцтва, па-другое, праз капітулянцтва 1939-га, па-трэцяе, праз саўдзел у гвалце.

Нямецкіх эсэсманаў у лютасьці пераўзыходзілі вугорцы, літоўцы і латышы, а ўкраінцы спалілі Хатынь. Як для многіх жыдоў Эўропа застаецца вучаніцай д'ябла, антысэміцкай па сваёй натуры, так і многія старэйшыя беларусы праз доўгі час несьлі ў сваёй душы крыўду на ўсю Эўропу.

Беларусы лічаць мір найвышэйшай каштоўнасьцю. Знакамітае «абы вайны не было» зьяўляецца асновай іхных палітычных паводзінаў. У 1950-1980-я беларуская культура стварыла багатую пацыфісцкую традыцыю, якая ўключала творы літаратурныя, дэкаратыўнага мастацтва, музычныя ды інш. Гуманістычнае пасланьне несьлі шэдэўры жывапісу, як «Партызанская Мадонна» Міхася Савіцкага. Нават масавая культура ня ўнікла антываеннае тэматыкі: было створана нямала песень, зьмест якіх можна вызначыць як адкрыта ці сукрыта пацыфісцкі («Было ў салдата два полі»). «Мы хочам, каб мірнае неба ня знала пажараў вайны... Мы дружбы народам жадаем і шчырай братэрскай любві», - гэта радкі зь нефармальнага гімну «Радзіма мая дарагая», мэлёдыя якога служыць пазыўнымі Беларускага радыё, а цяпер яшчэ й маршам для ўрачыстае варты падчас дзяржаўных цырымоній. Вядома, цэнтральную ролю ў тварэньні пацыфісцкага дыскурсу адыгрывала літаратура, роля якой у грамадзтве была надзвычай важнай у тыя часы. Вызначаліся эсэістыка Алеся Адамовіча і Янкі Брыля, раманы Васіля Быкава ды Івана Шамякіна зь іх дэрамантызацыяй вайны. Пацыфізм і талерантнасьць не аспрэчваліся ніводным з больш-менш значных аўтараў тае эпохі, прысутнасьць гэтае тэматыкі ў творах была нават навязьлівай. Улада талеравала гэты пацыфізм, у беларускай савецкай культуры ён быў адною з праяваў канфармізму, сурагатам адкрытага дысыдэнцтва, на якое зь першарадных дзеячоў беларускай культуры ніхто не наважыўся, і гэты пацыфізм быў настолькі масавы і пасьлядоўны, што стаў часткаю культурнага ды палітычнага канону і ператварыўся ў сьвядомасьцеўтваральную зьяву. Падаецца, што гэтае пранікненьне адбылося таму, што ён натуральным чынам клаўся на гістарычную памяць людзей і вынікаў з ранейшае культурнае традыцыі. (Дарэчы, уплыў масавае культуры і, у прыватнасьці, літаратуры на фармаваньне сьвядомасьці беларусаў у савецкі пэрыяд часта

недаацэньваецца, перш за ўсё праз тое, што ў спосабах масавае камунікацыі цяпер адбыліся зьмены і даўней важныя яе формы заступіла тэлебачаньне.) У любым разе, пацыфізм і пропаведзь цярпімасьці ў беларускай культуры савецкага пэрыяду заслугоўваюць пільнае ўвагі. Зьмена першых радкоў дзяржаўнага гімну, ажыцьцёўленая Аляксандрам Лукашэнкам, з «Мы, беларусы, з братняю Русьсю» на «Мы, беларусы, мірныя людзі», на першы погляд здавалася пошукам варыянту, які б нікога не пакрыўдзіў. На самай справе ў гэтым выбары тоящца інтуіцыя і апартунізм, характэрныя для палітычнага стылю Аляксандра Лукашэнкі ўвогуле.

Беларускі пацыфізм сфармаваўся ў выніку эвалюцыі сьвядомасьці, вельмі падобнай да тае, што адбылася ў паваеннай Эўропе. Там яна таксама распачалася ў часы халоднай вайны, калі быў створаны пацыфісцкі канон, які меў на мэце не дапусьціць паўтарэньня жахаў другой сусьветнай. «Сучасная эўрапейская культура, - піша Робэрт Каган, - гэта сьвядомае адпрэчваньне мінулага, адпрэчваньне зла былое эўрапейскае Machtpolitik». Сам Эўрапейскі зьвяз - гэта плод страшнага стагодзьдзя войнаў у Эўропе. «Эўразьвяз мог бы ператварыцца ў глябальную супэрдзяржаву, супрацьвагу Злучаным Штатам, але Эўропа ня хоча быць дужаю, - робіць выснову Каган, - Эўропа «з Вэнэры». А ЗША, супэрсучасная вайсковая сіла, - «з Марсу».

У антываеннай культуры эўрапейцаў, якую яны вынесьлі «з вогненнай вёскі», з Галакосту й разбомбленага Дрэздэну, мне бачыцца тое супольнае, што закладае трывалы грунт адзінае эўрапейскае прасторы. Яе канчатковае афармленьне адбылося пасьля зьнікненьня вонкавай пагрозы, якой быў СССР. А ў Беларусі каталізатарам такога разьвіцьця паслужыў кантраст эўрапейскага дабрабыту з расейскімі войнамі 90-х.

Нават маё пакаленьне, ня кажучы пра старэйшых, сьведкаў сталінскае і гітлерскае акупацый, жыло ў 90-х з адчуваньнем таго, што падзеі могуць прыняць дрэнны паварот. Павярніся гісторыя чуць-чуць ня так, выйдзі на менскія маніфэстацыі ў 1996 годзе на пару тысячаў меней народу ці пару тысячаў болей народу, перабяры Ельцын норму на дваццаць грамаў - і

я, як той хлопец з «Крамбамбулі», быў бы цяпер на Каўказе, пад Бамутам, дзе цяпер мой стрыечны брат Антон, расейскі грамадзянін, выконвае свой сьвяты абавязак у спэцназе ўнутраных войскаў. Або іншы варыянт: у Дом ураду ўвайшоў бы Пазьняк, незразумелы Ўсходу й Захаду, і Расея рабіла б зь Беларусяй тое, што яна робіць з Чачэніяй. Няясна, які з гэтых двух варыянтаў горшы для тваёй уласнай скуры. Абодва яны былі рэальныя! І, перафразоўваючы Габсбаўма, гісторыя не заплакала б па разьлітым малацэ.

3

Беларусы - гэта адназначна пацьвярджаюць сацыялягічныя дасьледаваньні - не прымаюць вайны ні ў якім выглядзе. Адпраўка беларускіх вайскоўцаў у гарачыя пункты Расеі, найперш Чачэнію, здавалася мільёнам людзей непрымальнаю, кашмарнаю магчымасьцю ўвесь час, пакуль доўжылася беларуска-расейская інтэграцыя.

Ельцынская раньнекапіталістычная Расея была вялікім полем цудаў, дзе ішла гульня ў капіталізм бяз правілаў. Пуцінская Расея дасягнула эканамічнай стабільнасьці і спрабуе адрадзіцца ў якасьці вялікае дзяржавы з усімі непазьбежнымі, як ёй здаецца, для таго выдаткамі - кіраванай дэмакратыяй і вяртаньнем да савецкіх сымбаляў. Дзьве гэтыя такія непадобныя Расеі паяднаў кашмар дзьвюх чачэнскіх войнаў і тэрарызму, які іх суправаджае. Расея ня мае такой сучаснай арміі, як ЗША, а стан яе эканомікі выклікае жаль, але па сваёй сьвядомасьці Расея, як і Амэрыка, - з Марсу. Як паказалі дзьве чачэнскія вайны, вайна для Расеі застаецца працягам палітыкі іншымі сродкамі. «Культура міру», адмова да гвалту неўласьцівыя расейскаму палітычнаму мысьленьню.

Такое адрозьненьне між сьветапоглядамі беларусаў і расейцаў можа быць абумоўлена толькі рознасьцю гістарычных досьведаў. Не заглыбляючыся ў даўнюю гісторыю, хачу толькі адзначыць розьніцу гістарычнае памяці пра другую сусьветную вайну. Для Расеі вайна 1941-1945-га стала чарговай Айчыннай

вайной, другой пасьля кутузаўскай. Другая сусьветная запатрабавала ад Расеі мабілізацыі ўсіх унутраных рэзэрваў, вялізнага напружаньня сілаў і мільённых ахвяраў, але яна скончылася і запомнілася перадусім як вайна пераможная, як найбольшы трыюмф расейскае зброі. Яна кранула тысячы квадратных кілямэтраў, але хіба што дзясятую частку нацыянальнае тэрыторыі Расеі.

Для Беларусі вайна 1939-1945-га азначала нашмат большую трагедыю, бо яна зачапіла практычна кожную сям'ю, раскалола грамадзтва на савецкіх патрыётаў і пранямецкіх калябарантаў, на фоне галоўнага процістаяньня суправаджалася лякальнымі міні-войнамі, як польска-беларуская, радыкальна зьмяніла этнічны склад насельніцтва. Для беларусаў памяць пра вайну - гэта Хатынь, успамін не пра геройствы, а пра пакуты. Сымбалічны адпаведнік Хатыні - Асьвенцым. Тады як для расейцаў Мамаеў курган - гэта чарговае Барадзіно, успамін пра стойкасьць і выключнасьць расейскага характару. Сымбалічны адпаведнік Магілы невядомага салдата ў Маскве - такая ж магіла пад Трыюмфальнай аркай у Парыжы. Не выключаю, што знойдуцца палітычныя дзеячы, якім захочацца, каб іх краіна выйграла яшчэ парачку бітваў маштабу Сталінградзкай, але сумняюся, каб нейкі народ мог вынесьці на вяршыню ўлады чалавека, які б зычыў сваім суайчыньнікам паўтарэньня Хатыні ці Асьвенцыму. Наважуся сьцьвярджаць, што менавіта розная гістарычная памяць пра другую сусьветную вайну ёсьць адною з прычынаў таго, чаму, нягледзячы на значную ступень моўнае і культурнае русіфікацыі беларусаў, мэнтальнасьць двух народаў розьніцца. Тое, што ў схемах савецкіх ідэолягаў мусіла стаць цэмэнтам, які навечна зьяднае новую гістарычную супольнасьць - савецкі народ, насамрэч сёньня падзяляе беларусаў і расейцаў.

Праз наяўнасьць адзінае інфармацыйнае прасторы чачэнскую вайну можна назіраць амаль ужывую. Дакладней, можна было назіраць, пакуль у Расеі было адносна свабоднае ці безадказнае - as you like it, - тэлебачаньне. Падзеі ў Чачэніі для ўсходнеэўрапейцаў - беларусаў, украінцаў ці літоўцаў - тым больш вусьцішныя, што адбываюцца на знаёмай, пазнавальнай тэрыторыі, да якой назіральнікі нядаўна належалі самі, часта ў

месцах, дзе назіральнікі асабіста бывалі. Беларусы жывуць у адной культурнай прасторы з 65-гадовай пэнсіянэркай з Хабараўску, якую згвалціў і забіў 22-гадовы інвалід чачэнскае вайны. З тым самым азьвярэньнем сутыкаліся беларусы ў часе другой сусьветнай, калі брат даносіў на брата і сусед забіваў суседа.

Апошнія гады два грозненскіх руінаў на расейскіх экранах я ня бачыў. Але гэта ня значыць, што страх аказацца на месцы чачэнцаў або на месцы расейскіх салдатаў у Чачэніі - і адно, і другое для беларусаў яшчэ рэальна ці, прынамсі, «вообразимо» - паменшаў. Ён захоўваецца ў падсьвядомасьці, накладаючыся на пераказы, трансьляваныя ў публічным дыскурсе, і на прыватную, сямейную памяць пра апошнюю вайну, празь якую, як па краі сьвету, прайшла Беларусь.

Расеі цяжка разьлічваць на рост сымпатый ува Ўсходняй Эўропе, пакуль працягваецца чачэнская вайна і ня спынены тэрарызм. Ня ведаю, ці разаўецца ўрэшце ў Расеі стойкае непрыманьне любых войнаў, як гэта адбылося пасьля другой сусьветнай у Эўропе. Пакуль гэтага не назіраецца - магчыма, вірус у малой канцэнтрацыі толькі ўзмацняе імунітэт. Нават мой родны дзядзька, бацька згаданага Антона, ухваляе гэтую вайну. Мне тут няма чаго дадаць.

4

Беларусы больш шукаюць у Эўропе прытулку і пратэкцыі, чым бачаць у ёй сваю натуральную айчыну і мэту. Чаго мы хочам ад Эўропы? Каб там не было Расеі. «Беларусь - у Эўропу» азначае для многіх адэптаў гэтага лёзунгу перадусім «Прэч ад Расеі». Эўропа in se - не вялікая мэта для іх. Тым ня менш, беларусы - я, ты, мы, яны - падзяляюць з эўрапейцамі адну «культуру міру». Вайна, дыктат, гонка ўзбраеньняў, сілавое вырашэньне міждзяржаўных канфліктаў для людзей гэтай культуры непрымальныя. І гэта зусім ня вынік таго, што мы, карыстаючыся тэрмінам квазінавуковае тэорыі Гумілёва, страцілі пасіянарнасьць. Мы з Вэнэры, а ня з Марсу, бо мы

прайшлі праз супольныя для ўсіх эўрапейцаў выпрабаваньні і асэнсаваньні: праз нарманскае рабаваньне, праз хрышчэньне агнём і мячом, ганзейскі гандаль, габрэйскую канкурэнцыю, бунты галоты, рэнэсансавае пераадкрыцьцё чалавека і адначасова каранёў сваёй культуры, рэфармацыйнае ўзрушэньне, праз барочную надмернасьць, асьветніцкі рацыяналізм і загартоўку капіталізмам, каб молат другой сусьветнай выкаваў нарэшце цяперашнюю культуру міру і цярпімасьці.

У цэнтральнаэўрапейскай любові да Эўропы сапраўды шмат страху перад Расеяй, памяці пра крыўды мінулага і боязі будучыні. Нельга папракаць беларусаў, што яны шукаюць у Эўропе паратунку ад пагрозы, якая многім назіральнікам здаецца надуманаю. Нельга тлумачыць гэтае пачуцьцё толькі ўнутрана ўласьцівай беларусам русафобіяй. Я тут проста паўтараю думкі Юр'я Андруховіча пра ўкраінска-расейскія адносіны: памылкова зводзіць нашы пачуцьці да гэтага стэрэатыпу, да нашага *комплексу малодшых братоў*.

Не, мы ня хочам, каб Эўропа вырвала з нас частку нас, якой зьяўляецца расейская культура. Урэшце, яна й не змагла б гэтага зрабіць, бо гэта залежыць ад нашага выбару, а не ад Эўропы. Беларусы, як і іншыя ўсходнеэўрапейцы, бягуць упрочкі не ад Расеі як такой, не ад культуры Салтыкова-Шчадрына і Чайкоўскага, яны бягуць ад эўразійскага бязладзьдзя, культу сілы, права моцнага, ад усяго таго, што разьвілося і замацавалася пры асваеньні бясконцых прастораў Азіі і Сібіру і што не зацугляна дагэтуль.

Памкненьнем да інтэграцыі ў Эўропу кіруе ня толькі страх. Яго дыктуе і цывілізацыйная повязь, памяць пра былое адзінства - ад нарманскіх часоў да Напалеона. Да інтэграцыі схіляе і эканамічны прагматызм. Хоць беларускія рэаліі і застаюцца далёкімі ад эўрапейскіх.

Паветраныя вароты краіны, аэрапорт «Менск-2». Яго неабагрэтыя, слаба асьветленыя калідоры з шматлікімі вузкімі лесьвіцамі-пераходамі ня ведаюць эскалятараў; яго парэпаныя дзьверы адчыняюцца толькі адной палавінкай; яго нясьпешныя аўтакары возяць чамаданы ў адзінаццаць разоў марудней, чым тое самае робяць іх франкфурцкія браты; яго візавыя работнікі ня могуць прыняць ад гасьцей з іншаземных абласьцей грошы ў эўра: паложана ў далярах. Неаглядныя пустэльныя холы аэрапорту, разьлічаныя на прыём дзясяткаў тысячаў пасажыраў у дзень, сустракаюць усяго дзясяткі; на яго аўтобусным прыпынку цябе чакае невылечна чырвоны дзядуля-«Ікарус» - падзяка вызваліцелям ад нашчадкаў 1956 году. Во ты і папаў у цэнтар Эўропы.

«Ікарус» ад'яжджае, пакідаючы аэрапортаўскі двор з сугестыўна-самотным рэклямным шчытом «МАЗу», і за акном лашчаць вока шырокія пералескі, дагледжаныя, нібы газон, палі, коціцца роўненькая шаша - і так усе паўгадзіны язды да самае зялёнае сталіцы эўрапейскага кантынэнту. Ня бойся, гэтая краіна акажацца лепшая, чым першае ўражаньне ад яе.

6

Берасьце, чыгуначныя вароты краіны. Цягнікі з Варшавы й Бэрліна на Менск мінаюць Буг уначы - каб уранку пасажыр ужо мог акунуцца ў вірлівае жыцьцё сталічнага мэгаполісу. Пасьля кароткага прыпынку на Варшаўскім баку берасьцейскага вакзалу састаў адпраўляецца назад, у бок мяжы, і затуманенай няспаньнем сьвядомасьці (пасьля двух мытных і двух памежных кантроляў) здаецца, што распачынаецца містычны абрад ініцыяцыі. Цягнік паволі заяжджае ў даўжэзны ангар, магутныя дамкраты ўзьнімаюць вагоны, і нябачныя работнікі недзе пад табой, ва ўладаньнях Гефэста, з грукатам высаджваюць адну за адной шматтонныя колавыя пары і начапляюць другія. Падарожны-навічок яшчэ можа палічыць выпадковасьцю мятыя твары і ўніформы памежнікаў ды мытнікаў, што абшукваюць кожнага інтэлігентнага пасажыра ня толькі на наяўнасьць зброі і валюты, але і ў пошуках друкаваных выданьняў і рукапісаў.

(Таму актывісты беларускай дэмакратычнай апазыцыі назюзюкваюцца да белых конікаў, што гарантавана выбаўляе ад зьняважлівай працэдуры асабістага надгляду: п'яных тут не чапаюць, ім спачуваюць.) Тут пачынаецца іншая Эўропа. Пасьля рытуалу зьмены колаў кожнаму неабыякаваму глабтротэру робіцца ясна: ён папаў у іншы сьвет, тут жывуць паводле асаблівых законаў. Нешта падобнае мусілі адчуваць рускія князі, пад скавытаньне шаманаў праходзячы між агнёў у Ардзе. Указальнік «канец Эўропы» ў Берасьці нідзе не вісіць. Ды ў ім і патрэбы няма. І так усё ясна.

Чыгункі з шырокай, неэўрапейскай каляінай зьявіліся ў Беларусі ў XIX стагодзьдзі, калі краіна была часткаю Расейскай імпэрыі. Гэта рабілася перадусім у абаронных мэтах, каб сталёвыя пуці нельга было выкарыстаць для наступу на Расею. Дый пракладалі першыя шляхі не праз самыя важныя гарады, а перадусім гэтак, каб можна было апэратыўна перакідаць войскі з цэнтру да межаў Імпэрыі. Гэтак раньні капіталізм зьявіўся ў Беларусі перайначаным. Недакончаная, палавіністая мадэрнізацыя ішла ў Беларусь з Эўропы, але праз Расею. Амаль адначасова з пабудовай чыгунак было скасавана заходняе права (Літоўскі статут), заходняя царква (уніяцтва); беларуская ды польская мовы і культуры пазбаўлены правоў. Гэта тады Беларусь на паўтара стагодзьдзя стала «іншай Эўропай». З тае пары беларускі цягнік коціцца па шырокай каляіне, а пытаньне цывілізацыйнае прыналежнасьці нашай краіны стала прадметам спрэчак.

7

Часткаю якой цывілізацыі ёсьць Беларусь? Паколькі беларускі нацыяналізм - натуральны равесьнік капіталістычнае мадэрнізацыі і расейскае культурнае экспансіі на землях былога Вялікага Княства, спрэчкі ў гэтым пытаньні ідуць, колькі ён існуе. Лукашэнка выслучыў новую тэорыю - мы цэнтар усходняй цывілізацыі, чацьверты Рым ці трэці Кіеў, хто як хоча. (А пятым, у такім разе, мае быць Астана.)

Адназначнага адказу няма. Беларусь на чвэрць складаецца з каталіцка-пратэстанцкага насельніцтва і мае шматгадовую традыцыю Уніі, філязофія якой засталася.

Цывілізацыйная дваістасьць у Беларусі сапраўды мае месца, але, як мне падаецца, яна выяўляецца ня столькі ў прысутнасьці дзьвюх канфэсійных традыцый ці моваў, колькі ў суіснаваньні процілеглых палітычных культураў, дзьвюх філязофіяў улады. Постсавецкія канфлікты, па-над канфэсійнымі ці ідэалягічнымі падзеламі, выразна сутыкнулі прыхільнікаў дэспатычнай і дэмакратычнай канцэпцый улады. Лукашэнка, лідэр дэспатычнае партыі, нарадзіўся на самым усходзе Беларусі, у Копысі, у зямлі, слаўнай унікальнай папуляцыяй чорных зайцоў, і ягоны кар'ерны ўзьлёт зьвязаны з усходам краіны, землямі, за якія Брачыслаў і Ўсяслаў Полацкія доўга змагаліся з кіеўскімі Яраславічамі. Тады як яркія лідэры празаходняе партыі (Пазьняк, Домаш) паходзілі з заходніх раёнаў, і нават майстар кампрамісу Ганчарык нарадзіўся на Лагойшчыне, на той мяжы, дзе Ягайла пабудаваў першыя касьцёлы.

8

Практычную задачу дасягненьня краінаю стандартаў acquis communautaire будзе выконваць наступнае за лукашэнкаўскім пакаленьне палітыкаў, не абцяжаранае культурнымі комплексамі сваіх папярэднікаў. Перадумовы для таго сьпеюць. Ня толькі Беларусь усё лепш пераймае эўрапейскі досьвед, але і Беларусь усё лепш спазнаюць на Захадзе. Гэта сталася не адразу. Для Захаду (не для славянскага сьвету, дзе Беларусь добра ведалі і раней) яна была яшчэ ў большай ступені «нацыяй зьніадкуль», чым Украіна. Тым ня менш, з рознай ступеньню цяжкасьці эўрапейцы ў простым і пераносным сэнсах засвоілі назву новае краіны. (На гэтую нагоду анэкдот. У 1992 годзе французы вырашалі, якога роду будзе новае слова «Belarus» у адпаведнасьці з законамі французскае мовы. Пасольства Францыі ў Менску даслала запыт у Французскую акадэмію. Праз паўгоду прыйшоў афіцыйны адказ:

мужчынскага.) На пачатку 90-х шмат хто лічыў Беларусь геапалітычным кур'ёзам, акадэмік Французскай акадэміі Элен Карэр д'Анкос заклікала да яе выдаленьня з палітычнай мапы сьвету. Цяпер такога больш не пачуеш, гэта перастала гучаць палітычна карэктна. Нягледзячы на асобныя прыкрасьці - гнятлівае ўражаньне, напрыклад, зрабіў візыт Лукашэнкі да Шырака ў 1996 годзе, пасьля першага з ганебных рэфэрэндумаў і перад другім, - Эўропа заслужыла вялікую пашану беларускага дэмакратычнага руху дзякуючы свайму паважліваму стаўленьню да беларускае незалежнасьці і далікатнаму жаданьню не зрабіць нічога, што магло б узмацніць пагрозу зьнікненьня Беларусі з палітычнай мапы сьвету. Карацей, дзякуючы адвольным і міжвольным намаганьням абодвух бакоў, далучэньне Беларусі да Эўразьвязу больш не здаецца толькі гучным лёзунгам («Беларусь - в Европу, Лукашенко - в ж...»), а пакрысе становіцца рэалістычным заўтрашнім днём практычнае палітыкі.

Калі ж Беларусь «пяройдзе на вузкую каляіну»? У транспартным сэнсе, можа, не раней, чым чыгуначныя шляхі адамруць. Праўда, Літва праклала спэцыяльную ветку-вузкакалейку ад польскай мяжы да Вільні - там замены колаў няма. А вось у сэнсе далучэньня да эўраструктураў можна сьмела прагназаваць, што гэта адбудзецца толькі пасьля пераходу Беларусі ад аўтарытарызму да дэмакратыі. Супольная культура міру і цярпімасьці - толькі перадумова для паўнавартаснага ўключэньня Беларусі ў кантынэнтальную палітычную і гаспадарчую прастору. Акрамя міру і ненасільля, Эўразьвяз грунтуецца на другой фундамэнтальнай каштоўнасьці - павазе да ўласнасьці і вынікаючай зь яе павазе да палітычнае свабоды чалавека й супольнасьці. Гэтая каштоўнасьць яшчэ не ўмацавалася ў Беларусі. Нацыянальная і палітычная свабоды, у адрозьненьне ад рэлігійнай, у нас дагэтуль аспрэчваюцца. Сярод беларусаў пакуль не замацавалася разуменьне таго, што кіраўнік краіны мусіць быць падсправаздачны свайму народу, гэтаксама як народ падсправаздачны свайму кіраўніку. Гэтае наступства таталітарызму, які, як казаў Уінстан Чэрчыль, забараняў усё, а ўсё дазволенае рабіў абавязковым, бадай, наймацней адрозьнівае краіну ад «стопрацэнтова эўрапейскіх».

Тым ня менш, і каштоўнасьць свабоды палітычнай пранікае ў Беларусь праз калючы дрот мяжы, дзякуючы нікім больш не аспрэчванай свабодзе перамяшчэньня. У адрозьненьне ад прэзыдэнта, які перад выбарамі 2001 году, што прадвызначылі ягоны другі тэрмін, заявіў: «Это моя страна! Я здесь родился, вырос и я здесь умру, чего бы мне это ни стоило!» - тысячы маладых беларусаў так ня думаюць. Яны зьбіраюць парэчкі ў Нарвэгіі, тынкуюць дамы ў Польшчы, пішуць кампутарныя праграмы для нямецкай чыгункі, ганяюць машыны зь Нідэрляндаў у Расею і нават, як ні шкада, пранікаюць на амэрыканскі рынак парнаграфіі. Свабода перамяшчэньня зьбліжае культуры. (Праўда, рух пакуль пераважна аднабаковы. Нават ня верыцца, што некалі людзі будуць міграваць ня толькі зь Беларусі ў Нямеччыну, але і зь Нямеччыны ў Беларусь, як гэта было 500 гадоў таму.) Зь міграцый людзі выносяць таксама павагу да такой каштоўнасьці, як палітычная свабода.

Дэмакратыя, як паказвае досьвед Гішпаніі і Партугаліі, прыжываецца за некалькі гадоў.

9

У працэсе эўраінтэграцыі беларускай супольнасьці асаблівую ролю маглі б адыграць беларусы Беласточчыны і Віленшчыны, якія ўжо сёньня бачаць сябе беларускім П'емонтам і хочуць адыграць галоўную ролю ў перамене беларускай ідэнтычнасьці. У далучэньні Беларусі да Эўразьвязу яны бачаць у тым ліку магчымасьць узьяднаньня з радзімай безь зьмяненьня межаў. Таксама іхныя рэгіёны моцна пакутуюць ад бар'ераў для перамяшчэньня тавараў і людзей. Усё гэта робіць іх натуральнымі лякаматывамі эўрапейскай інтэграцыі. Прывілеі нацменшасьцям, гарантаваныя эўразьвязаўскім заканадаўствам, натхняюць тамтэйшыя таварыствы на дзейнасьць незвычайную і даўней для нацыянальных асяродкаў нехарактэрную. Яны даюць прытулак эмігрантам зь Беларусі, арганізоўваюць навучаньне выбарчым тэхналёгіям, ствараюць сродкі масавай інфармацыі, прызначаныя найперш для аўдыторыі ў Рэспубліцы Беларусі.

З улікам таго, што беларуская нацыя ў сваім разьвіцьці адставала ад цэнтральнаэўрапейскіх, уліцьцё яе ў складаны эўрапейскі мэханізм ня будзе бязбольным і запатрабуе выпрацоўкі асаблівых мэханізмаў абароны культурнае ідэнтычнасьці. Дыпляматыя, цярплівыя перамовы, структурная перабудова эканомікі, будзённая праца інтэлектуалаў па стварэньні эўрапейскае ідэнтычнасьці беларусаў - усё гэта ня так проста ажыцьцяўляць, улічваючы паўтара стагодзьдзя разьдзеленасьці.

10

У 90-х гадах мінулага стагодзьдзя беларусы перанесьлі шэраг удараў, якія па сваёй сіле ня так ужо й розьніліся ад таго, што адбылося зь немцамі пасьля першай сусьветнай вайны. Перафразуючы Мэйлераў генэзыс гітлерызму, можна сказаць, што інфляцыя, якой суправаджаўся постсавецкі эканамічны крызыс, зьнішчыла базавую беларускую ідэю асобы, якая палягала ў тым, што, калі чалавек цяжка працуе і ашчаджае грошы, дык яму гарантаваная забясьпечаная старасьць. Мабыць, Лукашэнка так і не прыйшоў бы да ўлады дзесяць гадоў таму, каб не нястрымная інфляцыя і не Чарнобыль. Аднак раны 90-х паціху забываюцца. Хай цяпер ты жывеш у сьвеце безь вялікага наратыву сацыяльнага прагрэсу, без палітычна значэннага праекту сацыяльнай справядлівасьці, бо гэтыя ідэі і гэтыя праекты надоўга дыскрэдытаваў камуністычны экспэрымэнт, але, як і эўрапейскія інтэлектуалы-рацыяналісты часоў Асьветніцтва, ты верыш, што калі дасканалы сьвет пакуль немагчымы на ўсёй плянэце, дык магчымы прынамсі ў межах адзінае Эўропы, кантынэнту бяз войнаў, без насільля, без дыскрымінацыі, дзе ёсьць месца і тваёй нацыі, і табе.

[image]
[image]

№ 2 (31) - 2004

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

САКРАТ ЯНОВІЧ вядучы беларускі пісьменнік Польшчы. Сёлета мае выдаць чарговы выпуск гадавіка «Annus Albaruthenicus».

Сакрат Яновіч Беларусь заўтра

Банальна вядома, што прагнозы, асабліва дэталёвыя, не спраўджваюцца, але гэта зусім не значыць, што яны не маюць сэнсу. Прагназаваць трэба, як трэба думаць, замест таго каб чакаць цудаў. У выпадку будучыні Беларусі ўяўляецца яна даволі адназначна. З падабенства сённяшняга дня, які выцякаў з учарашняга.

Будучыню Беларусі абумоўлівае найперш яе каланіяльны лёс. Ён не мог быць суверэнным у сітуацыі арэха ў абцугах канкурэнтных між сабою імперыяў - польскай і расійскай. Гэта ідэальна паказвае моўнасць беларусаў, так сказаць, ад плоту да плоту - ад паланізацыі да русіфікацыі. Нараджэнне беларускай нацыянальнай культурнасці, хоць і мела месца ў тое ж «дзевятнаццатае стагоддзе нацыяў», засталося ў акварыумным становішчы. У беларускіх этнічных водах віравалі не тыя рыбы.

Этнічнасць кожнае нацыі ў пачатковай стадыі трымаецца на сялянстве і яго кансерватыўных структурах, надта постсярэднявечных. Але нацыястваральны працэс немагчымы без удзелу гораду, мяшчанства. Вёска - гэта індывідуалісты, якія маюць усенька сваё: хату, поле, жывёлу, калодзеж - словам, гаспадарку. Атам этнасу. Горад жа таксама гаспадарка, але адна на ўсіх у ім, праўда, у рознай ступені

ўзаемазалежнасці. Пажар гораду - зусім не тое, што пажар хутару або сяла. У гараджан інстынкт арганізаванасці і ўсякія рэвалюцыі бяруцца з парыжаў, пецярбургаў - ніколі з Гуляй-Поля, якому чужая дысцыпліна, урэшце, не той патэнцыял, інтэлект. Сялянскія войны нязменна варварскія і нязменна прайграныя. Нацыі, якая ў сваім фармаванні не выйшла з вёскі, у найлепшым выпадку наканаваны лёс малых народаў Захаду (фрызы ў Нідэрландах, правансальцы ў Францыі, серба-лужычане ў Саксоніі і інш.).

Беларусы ўвайшлі ў горад не з разгорнутымі сцягамі, а цішком, пагорбленымі ад нянавісці да свайго лёсу, самаедамі, што ўцякалі з вясковага свету. Нельга гаварыць аб тым, што ў пасляваенныя гады сяляне запаланілі горад. Уцекачы нікога не запаланяюць: дзеля гэтага патрэбна самаадчуванне ўласнай каштоўнасці, роўнасці. Яшчэ ў дадзяржаўны перыяд польскімі гарадамі завалодалі літоўцы, нямецкімі - латышы і эстонцы.

Пра шпаркасць развіцця эканомікі беларускіх гарадоў у тыя часы цяжка гаварыць, калі ведаць, што ніводзін з іх - нават Менск - не быў бы ў стане раўняцца з прамысловай дынамікай павятовага тады Беластоку, што прысмактаўся да польскіх фабрычных дынастыяў. А горад, які не развіваецца, не патрабуе дадатковых, сялянскіх, рук. У Беларусі горад гістарычна стаўся чужародным і цяпер столькі тае розніцы, што чужароднасць засвоілі беларусы. Беларусь без беларускай культуры і беларускай мовы з посткаланіяльнай адміністрацыяй роднай гадоўлі змушае гаварыць пра афрыканізацыю краіны. Са штучным гербам, штучным сцягам, штучным гімнам. Ніводнаму з гэтых знакаў няма хоць аднаго стагоддзя нейкай традыцыі. Ну, паўстагоддзя. Беларусь не можа квітнець, застаючыся перыферыяй (усё роўна чаго). Трэба думаць, што з гэтага яна няхутка выйдзе. Справа ў тым, што ў моц тэхналагічных рэвалюцыяў ужо нікому не акупляецца мець каланіяльныя тэрыторыі, якія давалі метраполіям сыравіну ды працоўную сілу. Калоніі перасталі даваць даход, што першымі зразумелі ангельцы, апошнімі - партугальцы. Сённяшнім часам, каб падвоіць вытворчасць, не трэба падвойваць лічбу работнікаў і караблямі ці эшалонамі вазіць сыравіну. Савецкі Саюз прапаў не з фанабэрыі Ельцына, а заваліўся пад цяжарам

шматлікіх унутраных калоніяў; адчапіўшыся ад іх, Расія ў будучыні рушыць шпаркімі тэмпамі да сусветнага лідэрства. Беларусь пакінута жыць на ўласны рахунак. Не будзе яна бзыкаць каля расійскай «катлеткі». А кыш!

Беларусь будзе выходзіць з перыферыйнасці вельмі доўга. Прычынаў таго складзецца некалькі, і кожная блізкая галоўнасці. Найперш, каланіяльная метраполія заўсёды ў лепшай сітуацыі ад некалі залежнай ад яе тэрыторыі. Расія з Масквою, аднак, сама паўкалонія - жыве з продажы нафты ды газу, замест гатовых тавараў. Традыцыйна завозіць заходнія тэхналогіі, якія дорага каштуюць і вымагаюць высокакваліфікаваных кадраў замест Ванькі-п'яніцы. Акрамя выдаткаў на новыя тэхналогіі, трэба яшчэ часу на іх засваенне, а затым умець канкураваць з іншымі за рынкі збыту. Пакаленні прамінуць, пакуль тое збудзецца. Таму арыентацыя Беларусі на расійскія рынкі ўяўляецца просьбаю ўнука аб кавалку пірага ад бабулі. Расейцы калісь перастануць купляць беларускія тавары, як тую бульбу, якая пецярбуржцам падалася паршывай і менш смачнай за чысценькую ды гладкую нямецкую з Брандэнбургіі. І, што галоўнае, не даражэйшую. Капіталізм тым адрозніваецца ад камунізму, што ваюе змяншэннем цэнаў, каб выперці канкурэнта за дзверы. У камунізме ж ніхто не дурыў сабе галавы барацьбою за ласку кліента. Было: пошел вон!

Выходжанне Беларусі з перыферыйнасці абумовіць і нястача сродкаў на мадэрнізацыю вытворчага патэнцыялу, які немінуча апускаецца ў стагнацыйную архаічнасць. Не можа быць іначай ва ўмовах ізаляванасці ад эканамічных цэнтраў Еўропы, а сама арыентацыя выключна на Расію надта каратканогая з той простай прычыны, што тая ж Расія прэзентуе сабою тэхналагічны Трэці Свет, яе тавары тапорныя на цывільныя патрэбы. Яна, праўда, мае чым плаціць - газам і нафтаю - за прывоз сучасных тэхналогіяў, што зусім не значыць, што пачне дзяліцца імі з Беларусяй. Няма такое дзяржавы ў свеце, што працуе на іншую, на суседку. Усё падлічана, і нічога бясплатна. Небагатага асартыменту беларускім таварам блізкія характарыстыкі «дорага і кепска». Машыны без гарантыі шматгадовай безаварыйнасці - скажам, васьмігадовай, як у японцаў.

Беручы пад увагу той факт, што ўдзел Расіі ў глабальным таварazвароце складае каля двух працэнтаў, а з Захадам - тры чвэрці аднаго працэнта, быццам курам на смех, не даводзіцца ўсур'ёз разважаць наконт беларускага следу ў сусветнай эканоміцы. Выйсце з маргінальнасці адно: прыцягненне замежных інвестараў, найлепей заходніх або амерыканскіх. Аднак не відаць добрых дзядзькоў з мяшком долараў на спажыву бандытаватым фінансавым службам, здольным каўкнуць які хочаш капітал, уключна з бюджэтам ЗША. Адзін прэзідэнт Пуцін шчыра прызнаўся ў мізэрнасці расійскага дзяржаўнага бюджэту - роўнага бюджэту мікраскапічных Нідэрландаў або лонданскага мегаполісу. Колькі капіталу ў менскіх сховах, не варта даходзіць. Што можа мець калонія з комплексам сірочасці, якая не мае адвагі і жадання стаць самастойнай? Усё роўна што жарт гучаць дэкларацыі палітычнага Менску пра выпрацоўку заходняй палітыкі. Няўжо Захад такі наіўны, каб паверыць савецкаму слову? Няма там такіх дурняў, што адразу рынуцца ў Беларусь пад сталінскім, чырвона-зялёным сцягам, бы па легендарнае залатое руно. Нават суседняя Польшча наракае, што багатая Еўропа ўсё баіцца яе. Яе калдобістых дарогаў, недысцыплінаванасці, хабарніцтва аднізу даверху, сацыялістычнага рабочага класа, што надалей вызнае прынцып «мала працаваць, многа браць». Беларусь не ў стане ператварыцца прынамсі ў трамплін дзеля пераскоку на гіганцкі расійскі рынак; лукашэнкаўцы падаткамі задушаць, бы таго аўстрыяка, што ледзь з духам выбраўся адсюль дамоў і столькі тае карысці дабіўся пасля, што сваё «хождение по мукам» апісаў у тоўстай кнізе, даходна прадаючы яе ў кнігарнях.

Маецца ўражанне, што Беларусь сапраўды не жадае пайсці за цывілізаваным светам; ёй дастаткова «шкваркі і чаркі», шчасця калгасніка.

Сур'ёзным ментальным бар'ерам бачыцца і псіхалогія асады ў беларусаў, шпіёнаманія, быццам шпіёнам цікава шпіёніць у замурзанай Задрыпоніі. А яшчэ тая закаханасць у прасцяцтве ды галотнасці. Памятаюцца кінакарціны «Мосфильма» пра бальшавікоў і «белых». Не знаходзілася такога ў нашай вучнёўскай сябрыне, хто марыў прыпадобніцца пад камісара

або Чапаева; гідзілі нас сваімі трантамі ды безразумнасцю. Кожнаму хацелася быць белагвардзейскім паручнікам - чыстым, добра апранутым, лагічным, фігурна прыгожым. Як разумею савецкі менталітэт, акуратнасць павінна была кампраметаваць Белую Армію. Скутак быў жа адваротны тут, на Беласточчыне, што мала зазнала чырванасцяжнай басоты ды амаральнасці. Саветаў мы сардэчна не любілі за іх непашану да чалавека, алкагалізм, зладзейскія рукі, ашуканства. Пісаў некалі Шаляпін: «Они всё лгут, когда надо и когда не надо». Такая прырода іхняга характару: не могуць дня пражыць, не абдурыўшы каго. Улада Вялікага Хама. Камічна мець жаль да ваўка, што ён воўк.

Шлях Беларусі да нармальнасці мусім мераць не гадамі, а пакаленнямі. Пэўна біблейскай меркаю, чакаючы народзінаў дзяцей, не пакалечаных псіхічна рабскімі атавізмамі бацькоў. Паміж канцом паншчыны і пачаткам саветчыны прамінула ўсё ж няшмат гадоў; ад панскага бізуна адбегліся - куды? Беларусы любяць служыць камусьці, няпроста ім будзе пазбыцца таго парабкоўства. У гэткіх абставінах Лукашэнка выконвае трагічна-камічную ролю, сам аб тым не ведаючы: што ні кажы, а першы ён у навейшыя часы ўласнік Беларусі, хоць аж дрыжыць дастацца на службу ў Крамлі. Вось іронія лёсу: не бяруць, хоць ты крычы! Нічога, што васал, але ўласнік дзяржавы, не прысланы губернатар ці колішні першы сакратар рэспубліканскага ЦК. Усё часцей чуем пра «страну», не «республику». Хто калі за савецкімі часамі назваў Беларусь «страною»? Сімптаматычна? Безумоўна! Сімптомы, як бактэрыі: спачатку не кідаюцца ў вочы.

Польскі пралетарскі Валенса казаў: «Не хачу быць прэзідэнтам краіны, але мушу...» Пра Крэмль не марыў.

Думаючы пра заўтрашнюю Беларусь, прыгледзімся да прыроды самое ўлады сённяшняй Рэспублікі Беларусь. Незалежнасць прыйшла сюды ў камедыйным стылі. Распаўся Савецкі Саюз, усе наўкола парабіліся незалежнымі, палітычны Менск заліўся слязьмі сіраты. Беларуская незалежнасць - гэта сірочая незалежнасць. Не хочам, але мусім. Кленчым перад Масквою, але яна - Божа мой! - шпарыць ботам між вачэй ды сыпле

ябукамі ў наш бок. Таго ніхто ў нас не спадзяваўся, узвычаіўшыся ўсё пад кагосьці лягаць. Такою была наша доля і гісторыя.

За першапачатковую незалежнасць Рэспублікі Беларусь каб хоць адзін хто наклаў галавою або, як мінімум, пасядзеў у вязніцы і дастаў па зубах на КДБоўскіх допытах. Існавала літаральна жменька «шептунов», якіх ужо цяжка было зразумець, бо размаўлялі яны «нечеловеческим языком», г. зн. па-беларуску. Іх на ўсю Беларусь кадэбоўцы налічылі сем чалавек, надта заядлых, нават кахаліся яны з жанчынамі на беларускай мове. «Тихий ужас!»

Не змянілася тое і цяпер. Трохі да лепшага хінулася псіха-грамадскае становішча беларушчыны ў тым значэнні, што беларускае слова як быццам сакралізаванае, зрабілася яно літургічным, святочным, бы ў папоў царкоўна-славянская ў маскоўскай рэдакцыі, не кірыла-мяфодзеўскай. У беларусаў сённячы дзве мовы: «общепонятный язык» і «национальный», шыльдавы. Цацка дарослым дзецям. Я доўга не мог сцяміць, чаму гарачыя беларускія патрыёты вельмі неахвоча запрашаюць на вечар у свой дом пагутарыць. Здагадваўся, што не маюць чым пачаставаць, хоць да бедных непадобныя... Урэшце зразумеў: у іх сем'ях гудзе «великий и могучий». Я не супроць яго, а супроць выкідвання беларускай мовы на сметнік. Супроць махлярства я, супроць двухаблічнасці, цванства. Я ім усё роўна што дурань. Хочаш, дурню, беларускай мовы, то я табе ствару гэткую прыемнасць; дома, з жонкаю і дзяцьмі, я «вполне нормальный человек».

Апошні шанс дэрусіфікаваць беларусаў прамінуў адначасна з упадкам Шушкевіча. Яшчэ жыло пакаленне, якому беларускае слова не ўяўлялася дзівацтвам, чымсьці лішнім, інтэлігенцкай фанабэрыяй. Аднаўлялася школьніцтва і кнігадрукаванне. Меліся кадры, здольныя жыць па-беларуску. Я тады часта ездзіў у Менск, мяне шмат хто ненавідзеў, але «понимал». А цяпер - у Менску няма нянавісці да мовы, яе проста перастаюць разумець. Крыху так, як я не злуюся на цыгана, бо я яго - звычайна - не разумею, ягонай рускай мовы, быццам у чачэнца...

Беларускі нацыяналізм - гэта выдумка маскоўскіх «господ» і варшаўскіх яснавяльможных паноў. Ці магчымы нацыяналізм нацыі, якой не існуе? Бо беларускай нацыі практычна няма; яна ўсё фармавалася, накшталт неграў Конга, і гэты працэс быў перапынены ў другой палове дзевяностых гадоў. Прысутнасць эліты - толькі ўсяго перадумова ўзнікнення нацыі. Акрамя нацыянальнага нацыяналізму, навука ведае і эканамічны. Ён, другі, праўда, ёсць у Беларусі, аднак слабенькі (даволі было б аднаго батальёна дэсантнікаў, каб на працягу летняе ночы ліквідаваць яго яшчэ да ўсходу сонца). Паўжартам кажучы: самі тыя нацыяналісты гатовы былі б падняць рукі ўгору і пакрыць кошт такога дэсанту, слёзна дзякуючы за вызваленне ад пакут незалежнасці...

Уладныя кадры і не кампрадорскія. Яны безнадзейна савецкія, задаволеныя, што аб'явіўся пан над імі. Мужыкі, якія не так, як нам цяпер здаецца, пакутавалі ад прыгону, бо па ліквідацыі паншчыны плакалі: «А як жыцьмем без пана?!» Прыгон навучыў нас бесталковасці і гультайству; рабілі тое, да чаго цівун пагнаў, і нічога з сваёй ініцыятывы. Паны трактавалі мужыкоў як вялікіх дзяцей. Тадышнія даследаванні паказвалі, што сярэдні ўзровень інтэлекту «дзецюка» (слоўца Каліноўскага) не перавышаў узроўню чатырнаццацігадовага хлопчыка; дзяўчынкі затрымліваліся ў сваім псіхічным развіцці на дванаццатым годзе жыцця.

У менскіх развагах пра сутнасць характару цяперашніх беларусаў шчырасць і не начавала - татальная ілюзія. Кажуць - ёсць праблема з беларускамоўем. Катастрофу яго знікнення называюць праблемаю. Адзін Акудовіч не баіцца праўды. Беларускамоўе спляжылі разам працоўны люд і родная ўлада; уцалеў дробны архіпелаг жывое нацыянальнае мовы. Ян Максімюк з Прагі кажа, што беларускае слова выратуецца як эстэтычная катэгорыя, галоўным чынам у літаратуры. Здалёку лепей відаць. Дакладна спраўджваецца гэта Максімюковае адкрыццё менавіта ў літаратуры, у якой усё вартаснае ствараецца па-беларуску, не па-расійску. Дзіва дзіўнае: у расійскамоўнай нацыі мастацкае слова беларускамоўнага радаводу. Прычына таго нават дэбілу павінна быць зразумелая: геній літаратуры беларусаў рэалізаваўся ў іх этнічным моўі.

Нельга шукаць аналогіі ў ірландцаў, шатландцаў - ім ангельшчына даўным-даўно родная.

Як доўга пратрымаецца беларускамоўная літаратура небеларускамоўнага народу? Які самаліквідоўвае апошнія школы; бо ні вышэйшых, ні сярэдніх ужо няма, усяго знікаючы адсотак вясковых, калгасных. Адсутнічае русіфікацыя, буяе самарусіфікацыя. Анклаў шчырых беларусаў у беластоцкім краі пагоды не зменіць, пераўтворыцца ў новую беларускую нацыю Еўропы, Еўразвязу. Так будзе. Якіх чорных сноў трэба, каб прыснілася, што палякі не намагаюцца размаўляць па-польску, а літоўцы па-літоўску. А вось беларусы намагліся - са стопрацэнтным вынікам (ну, хай 98). Тыя, што ў перапісе падалі роднай мовай беларускую - нешта каля 40 працэнтаў - мелі на ўвазе, відаць, сваё моўнае паходжанне, не будзённую практыку. Прэзідэнт Лукашэнка можа спакойна рэалізаваць будаўніцтва расейскамоўнае Рэспублікі. Па-беларуску ён не загаворыць, бо да каго (?). Выйдзі на вуліцу і паслухай, «какая народная молва плещется на тротуарах и бульварах».

Чаму мы трактуем лукашэнкаўцаў як дурняў?! Яны ж савецкія людзі, ім Беларусь уяўляецца фрагментам вялікае зямлі ад Берасця да Сахаліна, а не святой Бацькаўшчынай. Іхныя ўнукі адчуюць тут айчыну сабе, не раней. Рэспубліку Беларусь абараняюць не таму, што патрыёты, але таму, што расіяне нічога ім не гарантуюць. Гэта патрыёты са страху, з боязі за кавалак хлеба. І не больш. Калі б былі яны патрыётамі з беларускай культурай у душы, тады і не падумалася б ім, каб душыць беларушчыну, рваць на шматкі нацыянальны сцяг.

Дурманімся перакананасцю, што зніштожаную мову магчыма аднавіць, быццам зруйнаваны будынак адбудаваць. Гэта - або дурнота, або самаашуканства. Мовы, пахаваныя ў магілу, не ўваскрасаюць, няма такога прыкладу ў свеце (акрамя ізраільскага). Шмат якія былі ў занядбанні, скажам чэшская, але не затаптаныя так, як беларуская сёння, што нават вёска ўжо не гаворыць на ёй; ажно смешна слухаць пра яе дыялекты, след ад іх прастыне праз гадоў дзесяць. Будзем гартаць атласы былых дыялектаў былое мовы.

Ужо падрастаюць аўтары расійскамоўнай літаратуры

расійскамоўнай Беларусі. Будзе гэта даволі нерасійская расійская мова пісьма і гутаркі. Трохі па аналогіі ангельскіх моваў (англа-амерыканскай, англа-аўстралійскай, англа-ірландскай, і да т. п.). Будзе расійска-беларуская; яна ёсць пакуль зародкава.

Пытанне мовы і будаванай на яе фундаментах культуры бачыцца вырашальным у прагназаванні будучыні. Русіфікацыя раўназначная перыферыйнасці, яна раўняецца страце этнічнага эпіцэнтру, прасоўванню на далёкія кругі іншага, не свайго. Кожны акупант імкнецца асіміляваць акупаванага, што трывала замацоўвае акупацыю, якая з часам - дзякуючы той жа асіміляцыі - засвойваецца ды «адчужыньваецца».

Недэрусіфікаваная Беларусь застанецца на векі вечныя кавалкам большае цэласці. А ўсякі кавалак - гэта толькі кавалак, без унутранае энергіі, - на падабенства ампутаванае рукі. Істоту нацыянальнай ідэі можна коратка дэфініяваць імкненнем да лепшага жыцця. Апазіцыя да чужароднае эсплуатацыі. Нежаданне працаваць на этнічнага суседа. Такое рэагаванне немагчымае ў класічнай калоніі. Яна заўсёды шчаслівая таму, што каланізатар паляпшае яе быт, ствараючы сабе такім чынам зручнейшыя ўмовы эксплуатацыі. Калоніі, далучаныя да цывілізацыі, не вызваляюцца, іх пакідаюць, нярэдка ў выніку барацьбы паміж канкурэнтнымі метраполіямі (не ўзніклі б ЗША без зацікаўленасці ў тым антыангельскае Францыі, яе мілітарнай дапамогі). Славутая дэкаланізацыя адбылася зусім не таму, што за савецкія грошы дзейнічала хаатычная ды паўбандыцкая партызанка. Куды мацнейшую арабска-алжырскую калонію французы разнеслі на шматкі і затым прызналі Алжыру незалежнасць. У чым справа? Калі чаго не цямім, дык уся справа ў грошах. Калоніі, замест прыносіць даход, сталіся дэфіцытнымі. Змянілася сусветная эканоміка, тэхналагічныя рэвалюцыі выразна паменшылі попыт на сыравіну і разам з тым - на новыя арміі працоўных рук. Характэрна, што калоніяў пазбыліся найперш развітыя імперыялізмы Захаду - Англія, Францыя. Заўзята не выпускала са сваіх кіпцюроў афрыканскія калоніі адсталая Партугалія, гэтак жа Іспанія ў прыатлантычным берагоўі Чорнага Кантыненту. Развал Савецкага Саюзу, як ужо ведаем, не быў

выкліканы нейкімі варожымі падкопамі, звaліўся расійскі каланіялізм, якога сама Расія ўжо не вытрымлівала. Цяпер расійскія палітыкі кажуць, што Расія ў СССР уяўляла сабою «дойную карову». Няхай, але хто прасіў Расію падстаўляць вымя?! Займаць кантынент?! Бо Расія не развівалася, яна жыла заваёвамі, анексіямі, дзяржымордствам. Безупыннымі войнамі, быццам чалавецтва заелася спляжыць Расійскую Старану... Усё тое - байкі старым дзецям. Расія за савецкімі часамі пачала перажываць мілітарысцкі «бум», усякія «магнітагорскі», і сама, як тая мацёра, прысмактала да сваіх цыцак розных «черножопых».

Беларусь расійцы кінулі, бы п'яніцы надакучную бабу. Памятаюцца дзевяностыя гады, Расія Ельцына, дрыжачыя дзень і ноч беларускія патрыёты, што па сваёй марнай адукаванасці баяліся крамлёўскага анексіянізму. Яны думалі на ўзроўні мінулых часоў - «брать и не пущать». Гэта праўда, што расійцы не лічаць нас нацыяй, беларуская мова ім - заходні дыялект («трасянка» фактычна нешта такое нагадвае). Шумела-гудзела інтэгратарская лапатня, хоць ужо тады было вядома, што інкарпарацыя беларускай эканомікі каштавала б Расіі не менш чым сто мільярдаў даляраў. Тых мільярдаў Расія не мела і не будзе мець у рэальным даляглядзе. Узваліўшы на плечы Беларусь, расійскія ўлады былі б прымушаныя спыніць усё - каўказскія войны, капіталізацыю, а народ карміць травою. Нагадайма: фінансавы патэнцыял усёй Федэрацыі роўны нідэрландскаму; павятовы Сінгапур у параўнанні з Расіяй - гэта сапраўдная імперыя ў першай дзесятцы краінаў зямное кулі.

Ці Аляксандр Рыгоравіч не ведае аб тым? Ведае не горш за Ўладзіміра Ўладзіміравіча. Той і той, аднак, разлічваюць на непісьменнасць электаратаў, хоць гэты палкоўнік КДБ і нядаўні шпіён у Еўропе несумненна лепей інфармаваны, чымся гэтак жа нядаўні дырэктар саўгасу. Усё ж не тыя кабінеты і не тая інтэлігентнасць. Мужык да смерці мужык.

Аглядныя будучыні англафонскіх рэспублік Афрыкі і русафонскай Беларусі цалкам непараўнальныя. Англафоны азіраюцца на глабальных багатыроў, перш за ўсё на ЗША, а на каго азіраюцца русафоны? На расійскамоўны Трэці Свет. На

Расію, прэзідэнт якой клянецца ў 2004 годзе пачаць змаганне з голадам і холадам грамадзянаў, дзяржава якіх захоўвае ў сваіх нетрах цэлую табліцу Мендзялеева, пачынаючы ад жалеза і вугалю. З кім гэта Лукашэнка намерваецца разбагацець? Хлеба не пабольшае ад арышту алігархаў. Не народныя масы разгортваюць гаспадарку: яны не думаюць катэгорыямі дзяржавы, думаюць жыватом, катэгорыямі стала і пасцелі. У слаўленай Амерыцы ўсяго дзесяць працэнтаў насельніцтва марыць аб уласным бізнэсе. Дзевяноста - жадае васьмігадзіннага працоўнага дня, хатняга зацішку, прыгожай жонкі і разумных дзяцей, водпускаў на карыбскіх астравах. Бізнэс - гэта не жарты, несціханы роздум аб тым, што і як рабіць, неспакойныя сны і ранні інфаркт, ракавы гуз у мазгах. Лепей наняцца за добрыя грошы, чым самому сушыць галаву. Вялікія грошы - гэта і вялізныя выдаткаванні. Заходнія дзяржавы не займаюцца ашчасліўленнем народу, не лезуць у гаспадарку, дзяруць падаткі на эфектыўную паліцыю, лагічнае заканадаўства, не бандытаваную адміністрацыю. У іх настаўнік пачатковае школы зарабляе больш, чым паліцыянт. Ленін пісаў: паліцэйская дзяржава - гэта такая дзяржава, у якой паліцыянт дастае больш грошай, чымся настаўнік. Ну як тут не пагадзіцца з Уладзімірам Ільічом!

Без нацыянальнай культуры дзяржаву чакае выраджэнне. Без нацыянальных настаўнікаў няма нацыі. Калі няма гэтых дзвюх рэчаў, дык няма аб чым гаварыць. Пустэча! Рэспубліку Беларусь празываюць у Маскве «случайным государством». На жаль, у гэткай зласлівасці знаходзіцца зерне ісціны. Падобнае на Сізіфаву працу штурханне Беларусі на гару расійшчыны; яна з тае гары пакоціцца ў протхлань. Нізавы пажар - паводле Янкі Брыля, - што выпальвае да галавешак беларускасць школаў, наогул асветы, некалі загасне ды апустыніць Беларускую Зямлю. Што на ёй застанецца? Цень расійскага суседа, але сам ён не захоча прыйсці сюды жыць; пажарышча смярдзіць, на ім швэндаюцца чалавечыя недабойкі, недарэкі. Чаго нармальнаму народу хадзіць у ненармальны? Не кожны цікавіцца мутантамі.

Кажуць - нігілізм. Напэўна. Нігілізм ёсць ідэяй гультаёў. Спадзяваннем на гатовае. На чужы стол. Калі табе кепска ў Беларусі, дык з'язджай у Расію. Ага, не прымаюць. Ніхто цябе

там не чакае. Нікому ты не патрэбны даўжэй за гасцяванне. Нашто каму ты, калі сваіх поўна!? У гэтым увесь абсурд т. зв. інтэграцыі - лезці на чужое. Не абсурд, махлярства!

Рэспубліка Беларусь ёсць не нацыянальнай дзяржавай, а сацыяльнай. Дастаткова паслухаць яе прэзідэнта ды ягоных губернатараў. Яны жывуць у мінулым свеце Савецкага Саюзу. Гэта парэшткі былога савецкага народу. Часамі Лукашэнка карыстаецца словам «нацыя», але не зусім вядома, як ён яго разумее. Ні трохі не турбуецца высыханнем беларушчыны. Не ўздрыганулася яму рука разагнаць адзіную ў Беларусі сяроднюю школу, у якой вучняў навучалі на беларускай мове. Не дапушчана да стварэння беларускамоўнага ўніверсітэту. У сацыяльнай дзяржаве нацыянальнага аспекту не існуе. У ёй няма гуманнага чалавека-грамадзяніна, дамінуе эканамічны чалавек. Чалавек-жывот, страўны тракт замест сэрца, якое не болей чым помпа, што ганяе кроў па арганізме.

Сацыяльныя дзяржавы вядомыя ў гісторыі. Узначаленыя зверападобнымі, часта непісьменнымі тыранамі, яны занепадалі, не пакідаючы пасля сябе нічога, вартага ўвагі наступных пакаленняў. Калі ў XIX стагоддзі паўстала Італія як аб'яднаная дзяржава, адзін з яе айцоў сказаў: «Мы ўжо стварылі Італію, цяпер трэба стварыць італьянцаў». Аналагічнымі думкамі не дураць сабе галавы лукашэнкаўцы. Беларусь як хворы чалавек Еўропы павінна выклікаць інтарэс псіхіятрычнай навукі. Пішуцца, пэўна, дактараты на гэтую тэму... Унікальную, з перспектывай на эпахальнае адкрыццё новае хваробы, быццам азіяцкага «птушынага грыпу».

Несціхана баліць мне трактоўка нацыянальнай мовы, гэтага адзення душы беларускай. Калгасны хамут з універсітэцкім дыпломам у кішэні плюецца на яе. Салжаніцын увёў у расійскую мову паняцце «образованщина» ў супрацьлегласць да «интеллигенция». Што і казаць, цэльнае разрозненне на людзей інтэлігентных і на людзей толькі адукаваных, адпаведна падрыхтаваных вінцікаў у дзяржаўна-грамадскай машыне. Інтэлігентам быць - неабавязкова быць дыпламантам. У інтэлігента ёсць пачуццё місіі, чаго не наглядаецца ў «образованного», прафесійнага абмежаванца.

Бліжэйшая будучыня Беларусі - гэта тэрытарыяльнае ўтварэнне з няяснай дзяржаўнай атрыбутыкай. Надакучліва падкрэсліваецца не «беларускі народ», але «народы Беларусі». Акцэнтуецца тэрытарыяльнасць кшталту «народы Сібіры». Беларусь - шматнацыянальны рэгіён Расіі, у якім усе 123 нацыянальнасці накрылі каўпаком русіфікацыі? А дзе ж тытульная нацыя!? Яна самазніштажаецца ў прыклад тым 123-м. Чорная старагрэцкая трагедыя.

Акварызацыя культур. Вось акварыум, у якім плаваюць беларускія рыбкі. А там вось - польскія, татарскія, украінскія і г. д. Няма акварыуму з расійскімі рыбкамі, бо расійскамоўным наведнікам гэта аказалася б нецікавым і нават незразумелым: авечкагадоўцу не патрэбен музей авечкі. А была ж даваенная БССР з чатырма дзяржаўнымі мовамі: беларускай, расійскай, польскай, жыдоўскай. Як у Швейцарыі, таксама з чатырма, але ад вякоў (зірніце ў энцыклапедыю, у расійскую, не вельмі нахабна змахляваную).

Чаму мы пазбягаем аб'ектыўнай інфармацыі? Савецкі гэта навык - успрымаць жаданае за рэальнае. «Мировоззрение лгуна». Махляр на махляры і махляром паганяе! Анклаў пустадомкаў; еўрапейскі ўнікаліум. Хоць ты экскурсіі вадзі. Найлепей немцаў, бо добра плацяць.

Наймацнейшае падазрэнне выклікае заядлае пляжанне беларушчыны, спіхванне яе ў фальклорнасць. Музеефікацыя! Няслушна, аднак, бачыць у гэтым «руку Москвы». Тым часам прычына такое нянавісці да нацыянальнае культуры ляжыць на паверхні: расійскамоўнаму народу, загледжанаму ў маскоўскае азіяцтва, беларуская нацыянальная культура проста па сваёй натуры чужая, бо ўся яна менавіта еўрапейская. Успомнім элементарную яе гісторыю, хаця б таго Францішка Скарыну - заходнееўрапейскага доктара навук. Або Сімяона Полацкага, што даў маскоўцам уяву культурнасці, смак вершу, літаратуры, навучыў дапятроўскіх Раманавых лаціне ды польскай мове (Пётр I, рэфарматар Расіі, свабодна ёю паслугоўваўся, а яго сястра нават пісала польскія вершыкі).

Чаму якраз мова смяротна прыдушаная, не этнаграфія?! Граматыка кожнай нацыянальнай мовы - гэта асобая філасофія

чалавечага сусвету. Ліквідацыя беларускай мовы раўназначная ліквідацыі беларускага светаўспрымання на карысць расійскага светаўспрымання. Расійскамоўны беларус - гэта ўжо падгатунак расійскай нацыі, расійскіх адносінаў да суседзяў, да Еўропы, да ўсяе зямное кулі. Гэта як афранцужаная маці Пушкіна, што секла сына розгамі за гаварэнне па-расійску (набраўся Саша тае заразы ад нянькі, якую любіў да смерці, словам паэзіі не згадаўшы пра родную маці). Беларусь мела родную мову, выраклася яе існа ў Багдановічаўскім стылі геніяльнай «Пагоні», пакінуўшы на кпіну архіпелагі беларускамоўя, экзотыку інцыдэнтальнага беларускамоўя на праспектах Менска. Гэта ўжо мова інцыдэнту, сенсацыі сярод прадаўшчыц ды таксістаў, быццам ты азваўся да іх па-французску, па-ангельску. Сенсацыйнасць беларускамоўя засмучае, ва ўнівермагу прадаўшчыца вылупліваецца на цябе, быццам угледзела нейкую дзівосу перад сабою, нават паспачувае, што не даеш рады загаварыць да яе «человеческим языком». Такая аўра, грамадская аўра, вакол канстытуцыйна першай дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь.

Пімен Панчанка не жартаваў, называючы беларусаў адрачэнцамі.

Якія ж перспектывы ў адрачэнцаў з псіхалогіяй калекаў? Адрачэнец - гэта чалавек, які ганьбуе самім сабою са спадзевам, што камусьці тое даспадобы. Натура парабка ў панскім двары або курвы заможнага каханка. Нявера ў сваю дастойнасць, сваю волю. Яны не грамадзяне, а насельніцтва. Каб быць «грамадзянамі Беларусі», да гэтага трэба дарасці. Грамадзянінам, як і героем, ніхто не нараджаецца. Ім стаюцца. Дзяржава, якая не зацікаўлена ў выхаванні людзей на грамадзянаў, - гэта не дзяржава. Гэта ўсяго толькі адміністрацыя ды паліцэйскі ўчастак. Яна сама пад сабою капае яму. Неўкаранелую, змяце яе стыхія падзей.

Ну што зможа краіна такіх людзей? У іх сэрцах пуста, жывуць яны з інерцыі, «абы ціха». У стаячай вадзе хіба што жабы водзяцца... З апалонікамі. Сонны двор. Людзі-кастраты. Няхай і чорны прагноз ім таксама без сэнсу. Падзеі ў мужыцкай рэспубліцы захопліваюць не болей, чым рэха падзей наўкола

яе. Інтэграцыя з Расіяй нудзіць Расію. Ба, палохае. Славянскае адзінства недадумкаў, якія не падазраюць, што кожны трэці грамадзянін Расіі не ёсць славянінам або хаця б праваслаўнае веры. Славянскае адзінства - смяротны ўдар па Расіі! І мы з чымсьці такім лезем у інтэлігентны Крэмль, да патрыярха, самі маючы мільёны католікаў і пратэстантаў. Гэта ж трэба з глузду з'ехаць!

Дурная палітыка бесперспектыўная, хоць можа праводзіцца доўга. Сталін дзесяткамі мільёнаў забіваў - і нічога, дажыў да старасці. Гітлер з падобным генацыдам немцаў не пратрымаўся б і аднаго году. Што магчымае ў Азіі, абсалютна немагчымае ў Еўропе. Фашыста Мусаліні скінулі самі фашысты. Сталіна давялося атруціць, а самога атрутніка на ўсякі выпадак расстралялі без суду і следства. У стылі Чынгіз-хана, з той розніцай, што цяпер не садзяць на кол.

Запынімся пры пагардзе расійскамоўных да беларускамоўных. Яна ўжо часцей ціхая, не такая адкрытая, як пару гадоў назад. Давайце ўдумаемся, што значыць «говорить человеческим языком». Гэта значыць, што беларуская мова ёсць моваю першабытных дзікуноў. Тэрмін «человеческий язык» сустракаецца выключна ў Беларусі і нідзе больш у сучасным свеце. Ён займальны тым, што характарызуе бездань проста гідлівасці да чалавека нерасійскай мовы. Па-ленінску кажучы, нерасіянін, які стаў расійцам, страшнейшы за расійскага шавініста! У такога заалагічная нянавісць да нерасійцаў. Расіянін ён на дзвесце працэнтаў! Папраўдзе, у яго нянавісць да самога сябе, да ўласнага радаводу. Неафітызм спалучаны з новафанатызмам. Не дай Бог, каб халоп царом стаў!

Чым закончыцца вайна супроць беларускай культуры, «борьба за обрусение края»? Вядома, бліскучай перамогай; яна ўжо відаць. Як і пытанне - а што будзе далей? Зруйнаванне нацыі, расійскае гуляй-поле, касацыя беларускай прысутнасці ў чалавецтве. Беларуская эканоміка як частка расійскай, інтэгральная частка без свядомасці карэнных інтарэсаў; нават не калонія. Незаўважная тэрыторыя на прасцягу ад Бугу да Ціхага акіяну. Смешна прагназаваць будучыню гэтае тэрыторыі, пра якую будуць ведаць толькі географы. Думаеце,

расійскамоўныя выедуць у Расію на багацейшы хлеб? Нікуды яны не павыязджаюць, нікому не будуць патрэбнымі, будуць галадаць і плакаць па бяздумна страчанай бацькаўшчыне; па-за сваёй дзяржаваю чалавек усюды лішні. Пойдуць следам за англамоўнымі ірландцамі, што зненавідзілі ангельцаў і паднялі антыангельскія паўстанні, размаўляючы трохі горш за ангельцаў па-ангельску (бо на сваёй мове ім язык не варочаўся). Дабіўшыся незалежнасці, аднак жа, не зажылі лепей: адзін ангелец, выбраўшыся наведаць Рэспубліку Ірландыю, вывучыў ірландскую мову, чым прыкра здзівіў потым ірландцаў. Аналагічна - калі паляк з Варшавы гаворыць у Менску па-беларуску, то гэта ненармальны асобень або мінулавечны дыверсант і шпіён. Так ці сяк ідыёт!

Што ні кажучы пра Беларусь, непазбежна загаворым пра яе безамбітнасць, неганаровасць. Драма ў тым, што гэта датычыць не аднаго простанароддзя, але ўсіх і ўсяго; выключэнні тут без грамадскага значэння, адзінкі. Разумею, чаму так. Але як жа цяжка бачыць будучыню краіне, якая баіцца будучыні. Бо тое, што мае яна, цалкам задавальняе яе. Гістарычна Беларусь разгортвалася, дастаючы поўху ад суседзяў. Славутае «абы ціха» ўзялося адтуль, а яшчэ і ад генацыду ў семнаццатым стагоддзі, у васемнаццатым, у дзевятнаццатым, і ў дваццатым з яго мільённымі ахвярамі. Першымі гінуць зусім не дурні.

Расійскамоўе - гэта катастрофа Беларусі. Невыпадкова беларускамоўнымі - самыя энергічныя, самыя інтэлігентныя індывіды. Мала за тое: стацца беларускамоўным патрабуе адчайнасці, а каму хочацца тае адчайнасці?! Выгадней плыць з плынню, нават рукамі памагаць не мус. У знакамітай кнізе Ільфа і Пятрова згадваецца транспарант: «Спасение утопающих - это дело рук самих утопающих». Хочаце пагібелі? Калі ласка!

Будучыня нацыі - ва ўласнай эканоміцы найперш. Калі нам і сёння жадаецца ў першую чаргу «людзьмі звацца» - корань самарусіфікацыі! - дык прычына таго культурнага абарыгенства - у галадушнай эканоміцы. Ірландцы, як і тадышнія беларусы, жылі па-быдлячаму, але вось падлічылі, што іх удвая больш эмігравала ў ЗША, чым засталося на радзіме (па-беларуску бульбаноснай). Хто падлічыць, колькі ўцякло беларусаў з

Беларусі? Для прыкладу, у цяперашняй Польшчы нават яе прэзідэнт ды плойма міністраў - заходнебеларускага родавага паходжання: віленскага, лідскага, наваградскага, гарадзенскага, паляшуцкага. Чаго дзіваваць - апошні польскі кароль Станіслаў Панятоўскі меў бацькоў, якія падпісваліся з беларускай акцэнтацыяй на «ў». Ужо не кажучы пра найслаўутага нацыянальнага героя Польшчы Касцюшку, які спяваў беларускія паўстанскія песні і насцярожваў палякаў сваім няпольскім акцэнтам (з Берасцейшчыны). Міцкевіч, паднебная веліч іх літаратуры, пісаў таксама па-беларуску (захаваліся тэксты). Савет скажа, што гэта праява дружбы народаў, хоць савецкая дружба гэта ўсяго саманазва агрэсіі, захопніцтва. Дружба, у якой дружбак канае, задыхаецца ў абдымках дружбанта. Пятля на шыю!

Уласная эканоміка павінна мець - і мае! - уласную гісторыю. Пачынаецца яна з эканамічнай геаграфіі. Капітал дакастрычніцкай Беларусі быў аж у трыццаць восем разоў меншы ад капіталу расійскага Царства Польскага, тэрытарыяльна параўнальнага, а лікам насельніцтва большага троху вышэй як удвая. Царская ўлада ні капейкі не давала на падтрыманне польскай культуры, палякі і не прасілі яе. У расійскамоўным тады губернскім горадзе Варшаве фабрыканты-патрыёты фінансавалі польскія газеты, польскія тэатры, польскія кніжныя выдавецтвы, у іх ліку энцыклапедычныя, салоны мастацтва, патайныя школы, Лятучы Ўніверсітэт (падпольны, бо варшаўскі быў расійскім). Мелі за што ў той час, калі віленская «Наша Ніва» ледзь ліпела, а за кніжкі не плацілі ганарараў, паэты паміралі ад сухотаў або вешаліся. Вось табе і шкала сітуацыі!

Расійскі капіталізм пераскочыў польскі, гудучы ў паласе ад Петраграду на Маскву і Ўрал, з адгалінаваннем на ўсходнюю, данецкую, Маларасію, пакідаючы па-за сваёй увагаю «Северо-западный Край» лапцюжнікаў, шляхецкіх ваколіцаў, жыдоўскіх мястэчак, худых і недавучаных паэтаў з іх марамі «людзьмі звацца» - такі заклік у палякаў ці латышоў быў бы ўспрыняты як пропаведзь адарванага ад жыцця ксяндза-мараліста. У беларусаў гэта азначала наесціся. Культура ім-яму - гэта панская выдумка. І меў рацыю наш галотнік, бо сапраўды - ад

недахопу культуры яшчэ ніхто не памёр. Дэфініцыя культуры: неабавязковая актыўнасць чалавека. Галодныя і запрацаваныя - без шанцаў на культурнасць, ёй патрэбны вольны час на чытанне і думанне, без праблемы хлеба. Таму няма бедных і культурных, ім бурчыць у жываце, кішкі марш граюць... Таму рэвалюцыя ўяўляе сабою ўсенародны рабунак, адкіданне эканомікі на цэлыя пакаленні назад. Чуваць віскат паршукоў, валочаных на сала. Мараль Пецькі-гвалтаўніка, ідэолага супольных жонак. Дабівае нас калектывізм, злосць на выдатнікаў. Усе роўныя, некаторыя раўнейшыя (сакратары партыі). У такіх роўных і раўнейшых эканоміка стагназуе з той элементарнай прычыны, што свет крочыць дапераду крокамі зусім не мільёнаў, але адзінак. Эдысан вынайшаў электрычную лямпачку, а раней Лукасевіч нафтавую лямпу; імі пакарысталіся затым мільёны, сотні мільёнаў, мільярды чалавецтва. Як у літаратуры - у ёй лес талентаў і дзе-нідзе высозныя сосны.

Мы, здаецца, растлумачылі самі сабе, што людзей фармуе ў нацыю асобны лёс. Гэтую тэзу букварна ілюструе гісторыя. Усяму пачатак дае ўлада. Нашы заходнія суседзі, палякі, узніклі на зломе стагоддзяў дванаццатага і трынаццатага - за часамі караля Лакетка. Чэхі моцна хісталі прапольскай дзяржаваю палякаў, валодаючы Шлёнскам і далінаю Віслы з Мазовіяй. Калі б перамаглі, сёння за Бугам і гарадзенскай Свіслаччу мелі б мы дачыненне з чэшскім народам, ад Беластоку да прыгарадаў Вены. Краевугольны камень пад беларускі асобны лёс паклалі не варагі на чале з Рагвалодам, але Вітаўт Вялікі, ствараючы моц, па-партнёрску супрацьстаўную Кракаву, Маскве, Рызе, Мальбарку, Крыму. У меру таго як Вільня муршэла - сыпалася і само ліцвінства, што - і натуральна, і лагічна. Заваліся Польшча ўжо ў 1569 годзе (Люблінская унія!), сённяшнія палякі пакутавалі б ад ідэнтычных з нашымі праблемаў. Выпаласкаўся б ім польскі лёс менавіта. Хаця захавалася б мова польская ды ўся, важная ў нацыястваральным працэсе, этнаграфія. Перамога Тухачэўскага з Дзяржынскім пад Варшаваю ў 1920 годзе працягнула б польскае бездзяржаўе (з канца васемнаццатага стагоддзя), нягледзячы на ўтварэнне Польскай ССР ад Шлёнску да Бярэзіны, з Беларускай АССР на прасцягу Менскай губерні. Быў

такі план, выраблены ў Беластоку. Палякам Ленін аддаваў пасля і Менск, але яны не захацелі, расшыфраваўшы бальшавіцкую задуму накарміць «польскага гусака» меншасцямі да такое ступені, што скончыўся б з абжорства, бы тая цётка Алюта ад велікодных кілбасаў пасля посту... Чытай - бездзяржаўя ў імперскай некалі нацыі. Варшаве ўсё ж хапіла розуму не кідацца на менскую дармаўшчыну. Палітыкаў мела першага гатунку; у беларусаў былі сялянска-шляхецкія самавучкі, якіх абдурваў кожны, хто не лянівы. Учынілі нашы змагары міністрам замежных справаў БНР якогасьці чарнасоценнага манархіста толькі таму, што няблага валодаў ён французскай мовай, абавязковай на палітычных паркетах Еўропы. Божа, з кім раўня?!

Дзеля перамогі нацыянальна-вызвольнага руху трэба мінімум дзве ўмовы: унутранай яго мацаты, немаргінальнай у краіне, і палітычна-матэрыяльнага заплечча ў выглядзе істотнай дзяржавы звонку. Іначай рух сточыць рак сірочасці, адрынутасці. Уявіцца мышкаю кату. Пройгрыш узмоцніць уціск. На саму нацыянальную свядомасць уздзейнічае гэта парадаксальна пазітыўна, адчыняючы перспектыву на змаганне наступным пакаленням. Такое здарылася з польскімі паўстаннямі, нязменна прайгранымі, у чым былі зацікаўлены менавіта ўсе тры еўрапейскія імперыі.

Гісторыкі чамусьці не запыняюцца над фактам ізаляванасці навачаснай беларускай дзяржаўнасці. Беларускай Народнай Рэспублікі не прызнаў Берлін з прычыны яе эфемернасці, што абумовіла еўрапейскі байкот ёй. Кароткачасова, да моманту фармальнага абвяшчэння Саюзу ССР, праіснавала нямецкая амбасада ў Беларускай ССР. Прыблізна тое ж упаткала і Рэспубліку Беларусь. У чым бяда? Думаю, у дысгармоніі беларускага лёсу, у тым, што Беларусь усё валачэцца за светам, замест крочыць з ім поплеч і ў нагу. Гэтая з'ява вечнай спозненасці на цягнік гісторыі вынікае з яе прыроднага сацыялізму. Як быццам мала таго, што ў стварэнні бальшавіцкае партыі пераважалі заснавальнікі з беларускага лёсу, з Крэсаў, і не знайшлося хаця б аднаго расійца, то яшчэ ад калыскі беларус класава свядомы, а нацыянальна - нуль. Характэрна, што камунізм перамагаў у адсталых краінах і ні

разу - у развітай, заможнай. Рэвалюцыі супраціўныя гаспадарчаму росквіту, яны прытрымліваюцца прынцыпу аднае бяды на ўсіх. Зніштажаецца імі грамадскі слой людзей дзейных, арганізатараў прагрэсу вытворчасці; сутнасць эканамічнага наступу жа ў канкурэнцыі, якое не дапускае бюракратычная планавая гаспадарка. Гэта адназначна даказала эканамічная гісторыя Расіі. Яе капіталістычная дынаміка ў пачатку XX стагоддзя паказвала на тое, што вырасце яна ў найпершы патэнцыял свету, прыкладна ў маштабах ЗША. Бальшавіцкі пераварот адсунуў Расію на задні план нават далей, чым Францыю пасля якабінскага шаленства (1789-га).

Чаму русіфікацыя Беларусі вырашальная для яе будучыні? Чаму яна - гэта катастрофа з запозненым дзеяннем на гады? Справа тут нават не ў маргіналізацыі нацыянальнай культуры, выраслай жа на нацыянальнай мове, на карэннай этнаграфічнасці. Вернемся яшчэ да сутнасці нацыянальнай мовы як арыгінальнай, непаўторнай, філасофскай сістэмы, народнага светабачання, асаблівага сэнсу жыцця, што папулярна завём душою або нацыянальным духам. Гэта не ў моц Божае фанабэрыі - асіміляцыя ліквідуе нацыі, а затым і дзяржавы. Асіміляцыя, перш за ўсё моўная, значыцьме ліквідацыю іншае душы. І паслядоўна за тым - прыняцце іншага свету быту, духоўнасці. Абазначае гетызацыю нацыянальнага, кастрацыю.

Русіфікацыя Беларусі саштурхоўвае яе ў правінцыйнасць, у завал этнічнага эпіцэнтру. Рэспубліка Беларусь як духоўная, а затым і гаспадарчая расійская правінцыя. Вобласць. Менталітэт правінцыяла заўсёды прыніжаны, ён стаіць на каленях. Чытабельна тлумачыць нам той механізм пашырэнне моды - ад сталіцы ў глыбінку, ніколі наадварот. Апынуцца ў арэале расійскай мовы раўназначна з загледжанасцю на яе нармалізоўчы цэнтр. Не на Менск, а на Маскву, на Пецярбург. Менск ператвараецца ў славутую «глубинку»; не ён вызначае культуру расійскамоўя. Толькі на выгляд гэта як бы без вялікага значэння. От, беларусы дэмакратычна палічылі за лепшае адкінуць сваю родную гутарку; іх воля, іх выбар. Але яны застаюцца беларусамі. Чаго тут плакаць!?

Беларусы з расійскай душою? Як кажа прэзідэнт: «Мы те же русские». Ну, калі «те же», дык аб чым можа быць гаворка? Рэспубліка Беларусь як другая дзяржава расіянаў. Пуцін дзівіцца: на халеру яна, гэтая другая!? Дыверсійная яму структура?!

Дык вось, дакранаемся да грамадскай псіхалогіі, да пачуцця ўсенароднага сэнсу існавання Рэспублікі. Калі імкнёмся ўсе да расійскага лёсу, то адзінай грамадска прымальнай перспектывай Беларусі можа быць яе самаліквідацыя, найлепей у рэферэндуме. Голас народу - голас Бога.

У сучаснай Беларусі падкрэсліваецца эканамічны патрыятызм (не аддамо расійцам нашых кампаній, фабрык). Ужо сам гэты віскат гучыць як прызнанне ўласнае слабасці. Добра было б да эканамічнага патрыятызму далучыць і нацыянальны, але дзе ён у краіне, выпаленай пажарам русіфікацыі?! Беларускасць зрабілася сімвалам апазіцыі, марненькай у сялянскім народзе. Хоць і з касмічнай векавечнасцю. Які даўгавечны можа быць эканамічны патрыятызм? Не даўжэй, пакуль агрэсар не запэўніць вышэйшага дабрабыту. Расія - тэарэтычна - здольная на тое, а вось беларускай культуры яна ніколі для Беларусі не запэўніць. Праўда, расійская ўлада, як болей культурная, не завозмецца кусаць беларушчыну; робяць гэта нашы родныя хамы. Не стануць расіякі шпарыць міліцэйскімі гумамі за беларускае слова на вуліцы. Рэжыму і міліцыянтам беларуская мова сталася антыўрадавай, ненавіснай. Толькі для прыліку чапляюць афіцыйнікі беларускія шыльды, друкуюць трохі па-беларуску, але народ дасканала ведае, што гэта мыльныя бурбалкі. Замазаць вочы цывілізаванай Еўропе, але ж нават дзіця ведае, што Рэспубліка Беларусь не пойдзе за ёю. Беларусь плюецца на Еўропу, ванітуе на яе ад агіды. Пытанне - як доўга? Дзесяцімільённая сацыялістычная Рэспубліка Беларусь у капіталістычным атачэнні. Куба на ўсходзе славяншчыны. Думаць трэба! Саюз жабы з кароваю.

Не мы, беларусы, будзем рухаць мазгамі. Шчаслівыя не намагаюцца на роздумы, таму яны дурнейшыя за нешчаслівых. Якая можа быць будучыня ў шчаслівых? Нашто яна ім!? З дасягненнем камуністычнага раю чалавецтва застыла б у

бяздзейнасці. Як у раі. Канец гісторыі. Гісторыя, аднак, усё коціцца, неабавязкова дапераду. У Беларусі лягла валуном. Бо і чаго ёй каціцца, калі ўсюды наўкола горай. А ў нас вось рэгулярна выплачваюць пенсіі, заробкі. У Расіі - не, ва Ўкраіне галадуха, у Літве разбой, у Латвіі блядства, у Польшчы вуліцы заваленыя трупамі памерлых ад бясхлебіцы. А ў Амерыцы б'юць неграў!

У Рэспубліцы Беларусь жыць а жыць, не памірaць! Толькі каго мы потым дагонім? Паўночную Карэю?

Прагназаваць для Беларусі будучыню - гэта дзіцячая гульня, простая з простых. Беларусы ў сваей масе, як тыя Майсеевы жыды, рушацца жыць па-чалавечаму толькі з адміраннем апошняга пакалення, якое памятае сацыялістычны рай (інакш: самарабства). Памятайма пры нагодзе: сацыялізм для гаспадаркі значыць стагнацыю, безрух, нірвану галоты.

Ці патрэбна буйная фантазія, каб угледзець Беларусь праз гадоў дзесяць? Ні трохі. Гэта будзе краіна з комплексам правінцыі і тэхнікай на музейным узроўні. Варта датлумачыць наконт тэхнікі: без інвестыцый у замежныя высокія тэхналогіі беларусы будуць кусаць свой хвост. Сур'ёзных інвестараў у беларускай эканоміцы не відаць. Яна праядае пакінуты ёй савецкі патэнцыял. Састарэлы, бо ў тэхнічным свеце кожнае дзесяцігоддзе адбываецца навукова-тэхнічны пераварот. Было так некалі ў сацыялістычнай Польшчы: аднойчы газеты распісаліся аб тым, што Захад купляе польскія такарныя станкі. Аказалася, што адзін станок набыў швейцарскі музей тэхнікі... Але наконт таго прапаганда змаўчала.

Аляксандр Рыгоравіч (на прамілы Бог!), як можа разгортваць сваю мацату краіна, абгароджаная плотам ізаляцыі?! Яна неўзабаве апусціцца ў стан такое беднасці, што з ёю ніхто не захоча гешэфтаў. Бо што з яе ўзяць, калі бульба і тая горшая ды даражэйшая за нямецкую. Неданяньчаная, як у баўэра. Бабы яе капаюць і п'яныя механізатары. Сярод багатых мала алкаголікаў, а сярод бедных гарэлка - нацыянальны напой. Па-пушкінску кажучы - «выпьем с горя, где же кружка, сердцу будет веселей». З той істотнай розніцай, што ў Беларусі «шкварка і чарка» лічыцца праяваю добрага лёсу, канчальнага

раю. Мы маем сала, а вось расіяне зайздросцяць нам на гэтае сала... Дапусцім. На гэтым трымаецца беларускі патрыятызм, амаль нацыянальны.

Паеў - і ў хлеў, казала маці.

Як бядак нараджае бедака, так савет савета. Усё ж генетыка бярэ сваё. Нашы продкі не былі саветамі, хоць бедакамі. У іх бурліла амерыканская цяга разбагацець (ЗША стварыла еўрапейская эміграцкая басота, а Аўстралію - лонданскія прастытуткі ды бандыты). Вывадак нашых дзяцей ужо не вельмі савецкі, а дзеці дзяцей павырастаюць на больш-менш падобных да еўрапейцаў. Галоўным чынам рацыянальных, не лірыкаў рэчаіснасці, што жывуць не для «великой страны», якой грамадзянін быў нічым, нулём, а салдат галодны і абадраны, а афіцэры - зладзеямі, а генералы - кантрабандыстамі, а спецназаўцы - эсэсаўцамі.

Ілюзіяй ёсць чакаць у Беларусі нацыянальнага адраджэння, хоць сама нацыянальная культура будзе нязгасна тлець, каб успалымнець у насталую свабоду. У Беларусі няма таталітарызму, не той народ, у якім мог бы ён укараніцца. Дух улады - адбітак народнага. Рэспубліка Беларусь не прападзе, занадта доўга яна існуе, выгадавала процьму ўласнае эліты, якую інтэграцыя з Расіяй выкасіла б да астатняга кусціка; акупанты прысылаюць сваіх ураднікаў у падпарадкаваны край. Эканамічны заняпад немінучы, Еўропе напляваць на сацыялізм беларускага прыходу (ёй важны гіганцкі расійскі рынак). Неістотны кантыненту паралюшны рэгіён можа сабе інфантыльна нагуляцца сваімі цацкамі, а калі што - адключым яму, тупалобцу, газ і нафту, на каленях тады прыпаўзе да Крамля, па-паншчыннаму, слёзна цалуючы боты «барина». Анексіі яму рабіць не будуць, бо нашто? Садзіць за стол неперспектыўнага нахлебніка, з якога ні ўзяць ні ўцяць? Хай сам сябе корміць, бы нейкае перыферыйнае племя, пра якое хаця б шведы не чулі, а ў Парыжы мяркуюць, што гэта цудам адноўлены анклаў Белай Расіі з казацкім гетманам украінскай пароды. Беларусь, ментальна набрынялая эйфарыяй калгаснага шчасця замест згрызотаў пошукаў шляхоў развіцця, «не желает» аніякіх партнёраў, а магчымыя (патрэбныя) партнёры і

чуць не чувалі пра яе.

На найбліжэйшае дзесяцігоддзе прарочу ёй, на жаль, сітуацыю бантустану. Потым дай Бог каб не дайшло да сацыяльнага выбуху, калі пачнуць адыходзіць з жыцця масы шчаслівых.

P. S. Дзесяцігоддзе Лукашэнкі - гэта прамарнаванае дзесяцігоддзе. Таму наступнае дзесяцігоддзе будзе дзесяцігоддзем апамятання. І толькі ў трэцім - заварушыцца Беларусь. Раней гэта немагчыма: не тыя людзі, не тая ўлада, не тыя сродкі.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/11/1**
[image]

Пётра Садоўскі Нацыянальная ідэнтычнасць як метафізічны выбар (нататкі рэтраграда)

ПЁТРА САДОЎСКІ
філёляг. Скончыў Менскі лінгвістычны ўнівэрсытэт (1964). Кандыдат філялягічных навук. Першы амбасадар Беларусі ў Нямеччыне (1992-1994). Член рэдкалегіі часопісу «Wostok» (Бэрлін).

Дасціпны чытач-матэрыяліст, пэўна, адразу адчуе лагічны дыскамфорт ад такой назвы: якая можа тут быць метафізіка ды містыка, калі этналогія і гісторыя ўжо даўно пагадзіліся, што нацыянальная ідэнтыфікацыя ёсць дастаткова рэальная і прагматычная катэгорыя. Нацыя як яе сумарны прадукт характарызуецца, акрамя фармальнай акрэсленасці тэрыторыі, такімі прыметамі, як развітасць нацыянальнага рынку з нацыянальна арыентаванымі вытворцамі, урбанізацыя, развітая грамадзянская супольнасць, сістэма адукацыі на базе кадыфікаванай нацыянальнай мовы, фактычны суверэнітэт у межах міждзяржаўных дамоваў і г. д.

Аднак гэтыя складнікі не пакрываюць таго кампаненту традыцыйнага азначэння нацыі, які называюць «нацыянальным характарам», што сфармаваўся падчас завяршэння дзяржаватворчага працэсу адносна этнасаў сваёй рэгіянальнай прыналежнасці (у нашым выпадку гэта Сярэдняя і Ўсходняя Еўропа).

Тут, безумоўна, у першую чаргу трэба гаварыць пра наяўнасць або адсутнасць «вялікага» патрыятычнага міфу эпохі рэгіянальнага дзяржаваўтварэння і ў якой ступені ён падзяляецца сёння прадстаўнікамі так званай нацыянальнай эліты (інтэлектуалаў і ўлады). Пры гэтым трэба ўлічваць, што ў эпоху ўтварэння вялікіх дзяржаўных кангламератаў і глабалізацыі гуманістычнай навукі і культуры такія паняткі, як нацыянальны характар і нацыянальная самаідэнтыфікацыя, зведваюць велізарныя змены. Гэтая «рэфармацыя», як таго і належала чакаць у эпоху глабалізацыі, мае часам розныя мадэрныя адценні, з якімі не заўсёды можна бясспрэчна пагаджацца з прычыны іх, мякка кажучы, шматзначнасці.

На мой погляд, сёння і ў Беларусі, калі назіраецца змена генерацыяў (палітыкаў, даследнікаў, актораў грамадзянскай супольнасці), прыметы такога працэсу надзвычай заўважныя. Інфармаванасць маладзейшых, памножаная на ўзроставы тэмперамент і пэўнае культуралагічнае неафіцтва, знаёмства з пачаткамі антычнай думкі, абазнанасць у тэрміналагічным апараце еўрапейскіх «постнацыянальных» праектаў, валоданне замежнымі мовамі, большая ментальная разняволенасць, незадаволенасць «кансерватызмам» і «канфармізмам» папярэднікаў, які, маўляў, перашкаджаў сапраўднаму поступу грамадства, і г. д., часам прыводзяць пры ацэнках айчыннай думкі, гісторыі і культуры да своеасаблівай мадэрнізацыі, культуралагічнага аб'ектывізму і таму могуць несці на сабе адценне дэсакралізацыі, падмены або віртуалізацыі пэўных устойлівых канцэпцый і аб'ектаў культуры і гісторыі.

Якія мы? Ці маем мы нейкае калектыўна-нацыянальнае ўяўленне пра дабро і зло? Ці не страцім мы тую метафізічную беларускасць канчаткова, калі пачнём прагматычна, гомеапатычнымі дозамі і оптам ствараць як бы нацыянальны разумова-мастацкі прадукт, арыентаваны на рынак і тактычны поспех. Здаецца, тут праблема пераходзіць у этычную плоскасць, пра што цяпер не вельмі модна разважаць.

ПАСТКІ МАДЭРНІЗАВАНАЙ ЭТЫКІ

Тут рэч не толькі ў традыцыйным канфлікце пакаленняў, калі маладзейшыя папракаюць старэйшых у адсутнасці кругагляду, браку адукацыі ці адсутнасці сучаснага пачуцця гумару. Тут прычына ў розным характары набыцця каштоўнасцяў і розным разуменні, так бы мовіць, мадэрнай прагматычнасці, схільнасці да абсалютнай праўды, адсутнасці думкі (не кажу: *страху*) зрабіць балюча блізкаму, выбраць прадметам мастацкасці не-мастацкае, не-паэтычнае (у антычна-гегелеўскім разуменні), не спыняцца перад эпатажам. Мы, старэйшыя, маем свой грунт каштоўнасцяў, няхай сабе часам скалечаны, бо набыты ў таталітарны час. Але ён замяшаны на пачуццях, і мы (я таксама напалову належу да савецкай генерацыі) падсвядома шукаем гармонію — нешта накшталт спробы сумясціць хрысціянскае адчуванне душы з лейбніцаўскай манадай рэальнага свету.

У эпоху глабалізацыі ды Інтэрнету традыцыйная этыка зведвае моцны ціск шоў-бізнесу, неад'емнай часткай якога з'яўляецца кіч як прынада для прыцягнення новых спажыўцоў. Нават добры душою і таленавіты творца вымушаны «прадаваць» спрадвечна высокія катэгорыі людскасці як тавар. Дзяржава, царква (нават моцная) разам з вузкім колам інтэлектуалаў не ў стане зрабіць высокаэтычныя катэгорыі жыццёва неабходным прадуктам сярэдняга спажыўца. Калі ж творца сам бярэцца прадаваць свой прадукт паводле звычак сучаснай глабалізаванай камерцыйнай этыкі (звярнуць увагу, захапіць любым коштам, прывучыць, дыктаваць свае правілы, стварыць якасны твор, пашыраць (вы)творчасць, прыдумляць новы прадукт і г. д.), ён рызыкуе застацца на палове шляху і, упіўшыся поспехам, не заўважыць, што ён ужо такі невялічкі мефістофельчык, такі сучасны раблезіянскі шэльмачка Panurge, які «можа ўсё».

Пачну з прыкладаў. Як шмат хто з нас, я крытычна стаўлюся да фальшывага савецка-беларускага патрыятызму, але, слухаючы іранічна-паскараную гарэзлівую аранжыроўку песні «Радзіма мая дарагая» ў варыянце «мадэрнага адраджэнскага праекту», не магу вырвацца з воблака дыскамфорту. Так і хочацца сказаць «блюзнерскі» замест «гарэзлівы». Змест музыкі як жанру, што будзіць бясконцы клубок розных асацыяцый, як вядома, не ў словах. (Узгадайце вядомую гісторыю з 3-й,

«гераічнай» сімфоніяй Бетховена, якая ўзнікла як вынік захаплення кампазітара асобай «першага Консула Французскай рэспублікі» Банапарта. Як толькі стала вядома, што Напалеон каранаваўся на імператара, Бетховен перарабіў прысвячэнне з персанальнага на агульнае: «Sinfonia eroica, composta per festiggiare il sovvenire di un grand' Uomo» — «Гераічная сімфонія, напісаная для ўшанавання памяці вялікага Чалавека». Ад таго, што музыка нараджалася ад захаплення Напалеонам, які, як высветлілася пазней, стаў «дрэнным», яна не перастае глыбока хваляваць нас і сёння. Праз мелодыю «Радзіма мая дарагая» мы па-свойму, як і расійскі паэт Расію, хоць і «странною любовью», у свой час любілі Беларусь. Метафізічнае пачуццё, зведанае калісьці — у мінулым, у дзяцінстве («усё яшчэ будзе і будзе добра!») — перамагае розум. Рэцыпіент пачуццёвага — як глядач шэкспіраўскай п'есы ў параўнанні з «разумным» гледачом гётэўскага «Фаўста» ці брэхтаўскіх пастановак з эфектамі адчужэння — менш падуладны спакусам прыемнага балансавання на мяжы д'ябальскага і боскага.

Калі гаварыць толькі пра вербальны жанр творчасці, то можна было б заўважыць, што не ў апошнюю чаргу тут, магчыма, адыгрывае пэўную ролю тое, што слова ў беларускай мове старэйшага пакалення чэрпаецца з яшчэ жывой мовы і непасрэдна асвечана пачуццём. Яна — не канструкт паўсвядомай рэфлексіі, таму мяжа сакральнага, балючага, «прыстойнага» — больш акрэсленая і адчувальная. (Простае назіранне: лаянка на штучнай ці на замежнай мове не ўспрымаецца так востра, як на сваёй). З гэтай прычыны мы часта прымаем свае пачуцці за каштоўнасці, а імкненне да гарманічнай этыкі перашкаджае быць «сучасным прагматыкам». Думаю, што так разважаюць сапраўдныя вернікі, якія знайшлі для сябе сваю гармонію. Таленавітыя сучасныя дэмістыфікатары і дэсакралізатары тыпу Мілана Кундэры называюць гэта адсутнасцю пачуцця гумару, няўстойлівай верай, вечным песімізмам.

Але ці так гэта? Ці бяскрыўдны, напрыклад, сам факт выбару аб'екту смехавой культуры? Мы можам быць атэістамі і матэрыялістамі, не прызнаваць метафізікі, але чалавечае

жыццё, чужы боль, патрыятызм, сямейны абавязак, пачуццё ўдзячнасці і г. д. — для чалавека з хрысціянскім светаўспрыманнем паняцці, якія не падлягаюць дэсакралізацыі, калі яны не грунтуюцца на бясспрэчным цынізме і карыслівасці. Я асабіста не магу прымусіць свае вушы чуць толькі дасціпную займальную форму (за выключэннем хіба анекдотаў ды жартаў), пабудаваную на каламбурах, алюзіях і да т. п. Мяне абступаюць шырэйшыя асацыяцыі.

Магчыма, гэта вынік цяжкага дзяцінства, прэсу таталітарнага часу, на які прыпала найлепшая частка майго жыцця, недастатковага знаёмства з «сучаснай» культурай увогуле. Гэта, можа быць, так. Але ж кожны раз аўтар павінен адчуваць нейкую этычна дапушчальную мяжу, уласцівую жанру, і не захапляцца толькі смешным супадзеннем асацыяцыяў ці смешным суседствам эстэтычна высокага і нізкага. «Сучасныя» крытыкі кажуць: пішыце (малюйце, ляпіце, кампануйце, перфармуйце і да т. п.) разняволена, крочце ў Залюстроўе, выяўляйце паводле першага імпульсу, не хварэйце на рэфлексіі.

Часам флёр мадэрнасці канстатуецца як нешта сучасна непазбежнае, без чаго ўжо мастак не мастак. Вось як, напрыклад, адзін вельмі паважаны крытык, жадаючы ўзнесці на п'едэстал мадэрнізму вельмі добрага беларускага мастака — на жаль, ужо нябожчыка, — заварожана-замілавана пачынае свой артыкул (чытайце «Дзеяслоў» № 8): «Залюстроўе, як і мінулае, не адчыніш. У яго, калі пашанцуе, можна толькі ўвайсці. ... Для Заходняй Еўропы такі ключ даў сюррэаліст Далі...» Далей аўтарка даводзіць, што гэты мастак — першы беларускі постмадэрніст, што ён своечасова адчуў павевы часу і г. д. Пералічваючы ягоных паплечнікаў ды аднадумцаў і даючы пэўную ацэнку-характарыстыку іхнай творчасці, крытык ранжыруе персаналіі паводле набліжэння ўсё да таго ж Залюстроўя: «І здольны па-брэйгелеўску запаволіць час традыцыяналіст Ф. Я., і рамантычна-артыстычны В. А., і тонкі лірык У. Т., і сюррэалістычны казачнік У. В., і дзівосны трагік А. К. ... — усе яны, а яшчэ У. В., Ю. Х., У. З. набліжаюцца да С. у сваім імкненні пераступіць мяжу Залюстроўя». Усё вельмі прыгожа, але стылёва і этычна — правінцыйна і пошла, амаль

як «наш советский Робертино Лоретти». Я не закранаю зместу — хто якія ключы прынёс і якія рысы постмадэрнізму ёсць у таго ці іншага мастака. Мне толькі здаецца, што такое замілаванне прыніжае падразглядных творцаў.

Жаданне быць сучасным любым коштам, нават цаною пошласці, — смешнае, але амаль бяскрыўднае. Але калі кажуць, што сучасная мастацкая дэсакралізацыя — усяго толькі прымета разняволення асобы, спроба прышчапіць атруту, каб перахварэць ад мікробаў таталітарызму і пазбавіцца назаўсёды ад сапраўдных і ўяўных комплексаў, што гэта лепш, чым будаваць агароджу забаронаў, якая ператворыцца ў новы канцлагер, то з гэтым цяжка пагадзіцца. Ці нармальна для творцы ўгнюшваць святыні тых, сярод каго ён жыве?

Паспрабую патлумачыць на штучным прыкладзе. Уявім сабе, што N — пісьменнік, мае талент. Выкарыстоўваючы запісы з уласнага прыватнага дзённіка, піша празаічны мастацкі твор. У гэтым прыватным дзённіку, не разлічаным на чытанне ўслых для шырокай аўдыторыі, ёсць успаміны пра тое, як у дзяцінстве, жывучы ў беларускай вёсцы, гадоў да пяці ён хадзіў у лазню «разам з бабамі». Так было прынята: спачатку ідуць мыцца мужчыны на «першы дух» з большымі сынамі, а потым «бабы» з дачушкамі ды малымі сыночкамі. Уявім сабе, што аўтар сродкамі мастацкага слова, як Радэн у мармуры («былая прыгажуня Аміер у старасці»), бязлітасна-натуралістычна намалюе, як выглядалі пасляваенныя беларускія яшчэ не вельмі старыя маладзіцы, якія, упрогшыся ў хамуты ці проста ўпіраючыся ў жэрдку, цягалі замест коней плугі на калгасных палёх. *Ва ўсіх — грудзі да пояса, двухбаковая грыжа і віслыя маткі, як кукурузіны, на замытых кужэльных падвязніках паміж нагамі*. Хлопчыкі, малыя й дурныя, так і пасмейваюцца адзін аднаму на вуха: *«Гы-гы-гы, глядзі, якая ў тваёй маці кукурузіна!»* (Ці нармальна гэта, не будучы доктарам, бачыць дзетародны орган жанчыны?)

Аўтар мог бы потым па-фрэйдысцку закруціць сюжэт раману ці навелы, амаль метадам магічнага рэалізму кляйміць камуністычную эпоху, калгасы, пачварнасць гітлераўскіх фашыстаў, што рэквізавалі і пастралялі коней, тлумачыць свае

далейшыя сексуальныя паводзіны дарослага мужчыны, справакаваныя дзіцячымі відзежамі: фантазаваць пра гомасексуальныя імпульсы, фрыгіднасць, інцэст, пісаць эпатажныя вершы, кароткія апавяданні-парабалы, як ён стаў сексуальным гігантам, садыстам ці імпатэнтам, забойцам старых кабет ці маладых дзяўчат і г. д. Чаму б і не запачаткаваць такі праект у Беларусі? Знайшліся б і спонсары. І гэта чыталася б «па-сучаснаму». Але ці можна гэта рабіць прадметам мастацтва?

Ад такога мастацтва можна захварэць душой, стаць злым, утравець дзёрнам комплексаў. Тады хвароба будзе кіраваць не толькі ўчынкамі, але і мастацкім бачаннем свету. Яно можа з светлага стаць цёмным, дысгарманічным, энтрапійна-плямавым.

Для здаровага дарослага чалавека ёсць, напэўна, рэчы, пра якія нельга гаварыць услых, тым больш вочы ў вочы перад вялікай аўдыторыяй. Можна на самоце па-эклезіясцку ўспрымаць «гнілы кадавер» Бадлера, думаючы пра вечнасць мастацтва і марнасць жыцця, а можна — буйным планам, публічна, пад музыку, удаючы радасць пры паглынанні салодкага парахна ад гнілога мяса. Канечне, можна, калі табе толькі васемнаццаць. Гэта вядома: gaudeamus igitur, juvenes dum sumus...

Я згодны з Г. Кісліцынай (аўтаркай зборніка «Blonde attack»), што ў Эклезіяста трэба чытаць і верш 9 з 11-га раздзелу: *«Весяліся, хлопча, у юнацтве тваім, і хай сэрца тваё вясёлае будзе ва ўсе дні маладосці тваёй...»* Гэта добра адпавядае дэсакральнай бязмежнасці буршыкознага постмадэрнізму. Але ж трэба чытаць і канец гэтага ж вершу: *«Толькі ведай, што за ўсё гэта Бог пакліча на суд»* . Можна было б дадаць: *«Але весяліся так, каб нікому не рабіць балюча»* . Ёсць сакральная мяжа. Павінна быць.

Мне падабаецца, напрыклад, — я б назваў гэта кабарэтным паэтычным дуэтам, — як працуюць нашы гарэзлівыя паэты Жыбуль і Бурлак. Нацыянальна арыентаваная моладзь іх любіць за разняволенасць, сучаснасць, беларускасць. Але робіцца ніякавата, калі чуеш пад гітару нешта накшталт: «...Рвуцца кулі ў галаве, Марат Казей заўжды жыве». А потым

яшчэ і на пацешнай ангельскай: «Мэрат Кэйзі мэйд мі крэйзі». Магчыма, у постаці піянера-героя Марата Казея савецкая прапаганда і перабрала норму. Але ж няможна разбураць Карфаген любым коштам. Калі б у зале дома літаратара падчас «Вавілонскага праекту» сядзела яшчэ сёння жывая сястра Марата Казея Арыядна Іванаўна Казей, інвалід на пратэзах (ступні ног адмарозіла ў час партызанскай аперацыі ў 1943 годзе), — як бы яна пачувала сябе?

Я захапляюся і паэтычным талентам Андрэя Хадановіча, які радасна, як дзіця, валодае словам, прыцягвае да сябе моладзь, робіць беларускі верш захапляльным для маладых, творыць «новы Вавілон», пераступае правінцыйныя межы сялянскасці. Калі крылатыя асацыяцыі з выдатных еўрапейскіх паэтаў стаяць побач з вядомымі радкамі беларускіх, то — у шырокім сэнсе — нараджаецца магія бахціноўскай «цеснаты рытмічнага раду» і *ўяўная* айчынная Папялушка (якая існуе пад ціскам беларускага комплексу) ператвараецца ў еўрапейскую сястру-інфанту. Але ўсё ж я шкадую аб маральных стратах выдатнага вершатворцы перад чытачом пры алюзіях тыпу словазлучэння «Лісты з-пад коўдры», бо *я інфармацыйна і эмацыйна* суадношу гэта з «Лістамі з-пад шыбеніцы» Каліноўскага... Або вазьміце ягоныя ж — «Хлопчык і копчык» ці алюзію (для мяне ва ўсякім разе), калі месца напісання вершу абазначаецца як «Пляўкі». Калі нават не гаварыць пра густ, то пры самых крытычных адносінах да купалаўскіх вершаў пра сацыялістычнае будаўніцтва (у гэты час напісаны «Хлопчык і лётчык») я адчуваю сябе ніякавата, чытаючы такое. Мне здаецца, што я гагачу разам з маладзёнам, які паказвае пальцам на п'янага бацьку, што ў сне агаліў ніжнюю частку свайго цела.

Так, Купалу «не пашанцавала» памерці да савецкага часу, ён ездзіў на падараваным савецкай уладаю «Шэўрале», пісаў ліст таварышу Сталіну («Хай смутак вачэй тваіх ясных не росіць...»), але ж ён рэзаўся заточанай лыжкай у турэмнай камеры і жыццё сваё закончыў трагічна. Пра кошт вымушанага канфармізму добра напісаў Чэслаў Мілаш у «Скутым розуме». Можа, шчаслівы і сучасны той, хто не ведае нават таго, што ведаю я? Хадановіч жа выдатна ўсё гэта ведае. Дык навошта тады *копчык*, няхай сабе і ў абліччы *«хвасцец»* ? Для эпатажу,

скандалу, таннай папулярнасці? Але ж Хадановічу гэтага не трэба. У яго ёсць талент. Пэўна, рэч — у мадэрнай этыцы.

Нягледзячы на ўсё сказанае, я люблю чытаць Хадановіча. За радасным светлым канструктывізмам гульні ў словы я бачу сапраўдныя пакуты на шляху да паэтычнага — прабачце за высокі стыль — прароцтва. Асабліва гэта відаць там, дзе аўтар не звязаны рыфмай (не бяжыць у мяшку) і знаходзіцца ў стане метафізічнай узбуджанасці, ягоныя словы, як фройдаўскія агаворкі, абсалютна аголеныя, як чыстая энергія. Такія рэчы, мне здаецца, пішуцца ноччу, калі творца адрываецца ад лунання паміж грэцкімі музамі і шматлікімі багамі і пакутліва шукае свой монатэізм.

Для сябе я знайшоў самую галоўную на сённяшні дзень «паэтычную агаворку» Хадановіча, у якой ён сам гаворыць пра сваю актуальную творчасць як прэлюдыю да ненапісанага Вялікага Твору: *«Раз непазбежна, што тэкст — // адно рыхтаванне да смерці, — // ў лялечны Тартар ідзі, нібы праўдзівы Арфей!..* Нешта падобнае я чытаў у «Санетах да Арфея» ў Рыльке. (У выпадку з Хадановічам феномен плагіяту іманентна адпадае.) Германеўтычна як рэцыпіент (аўтар ужо страціў патэнт на адзінае разуменне свайго «тэксту») я прачытваю для сябе аўтарскае іранічна-тужлівае прызнанне: «Я пакуль непазбежна даў ныра ў лялечны Тартар, я пакуль — нібы праўдзівы Арфэй, я пакуль рыхтуюся да смерці, сапраўднае паэтычнае прароцтва-аргазм (а значыць, і смерць!) — яшчэ наперадзе». Дай Бог, каб гэта адбылося.

Таленавітае раблезіянства аўтара, здаецца мне, падмацоўваецца падсвядомым уплывам французскай традыцыі, у якой ён жыве. Чытачы ягоных твораў, перакладаў, інтэрв'ю ведаюць гэта. Там пануе пэўная рэлігія літаратурнага стылю, якая надзвычай высока нясе гульню словаў як адзін з галоўных мастацкіх крытэраў.

Працягваючы тэму без алюзіяў на персоны, можна, натуральна, гаварыць пра беларускія комплексы непаўнавартасці, з якіх вынікае шмат забаронаў ды ўяўных святыняў. Але заўсёды лепш іранізаваць ды кпіць з чалавека без фізічных недахопаў, чым з кульгавага, які рухаецца з лясачкай. Наша Беларусь

пакуль ходзіць на мыліцах, бо сусед ногі перабіў, калі яшчэ зусім малая была. Для мяне *кпіць ды іранізаваць з сябе слабога*, тварыць эпатажы ды перформансы, думаючы, што ад гэтага ты станеш моцным, — спрэс глухаваты мадэрнізм. Гэта можа быць хіба што пачаткам, прынадай для прыспанай з дзяцінства маладой душы, месцам сустрэчы сяброў для далейшага больш сур'ёзнага сумоўя, але ніяк не шляхам для спасціжэння сапраўдных вартасцяў, і ўжо абсалютна ніяк — самімі вартасцямі. Беларускамоўны рок для моладзі — выдатная брама да ўваходу ў свой дом, але Лявон Вольскі пакуль, на жаль, — гэта яшчэ не Васіль Быкаў. Каб толькі аматар беларускага року ды дасціпных вершаваных каламбураў не падумаў, што гэта ўжо і ёсць усё сучаснае мастацтва і ўся разняволеная сучасная Беларусь! Такі досвед, на жаль, ёсць.

Каламбуры, алюзіі, радаснае валоданне словам, пародыі, «асацыятыўная энтрапія», іронія з густам ад гарэзлівасці да лёгкага блюзнерства — гэта вясёлае гарцаванне буланчыка па лугавой квецені, збіранне разнатраўя (часам з чужога поля), практыкаванні для пальцаў піяніста, распеўка для прафесійнага спевака. Можна было б знайсці для гэтага і пэўнае мадэрновае параўнанне накшталт «петынгу» ці ананізму перад палавым актам, у выніку якога павінна нарадзіцца дзіця. А паэтычнае адкрыццё, прарыў у сапраўднае Залюстроўе, — гэта аргазм. Адкрыццяў ды праройцкіх азарэнняў не можа быць, на жаль, шмат. Трэба быць паэтычным ільвом, каб зведаць такое шматкроць. А яшчэ трэба перажыць свой пецярбургска-нашаніўскі перыяд ці сваё Болдзіна. Нават у прызнаных класікаў лёгка адрозніць «канструктывізм» ад праройцкага збегу словаў. Пра тое, як паэту калі-небудзь «удается оказаться там, где до него никто не бывал, и дальше, может быть, чем он сам бы желал», гаварыў Іосіф Бродзкі ў сваёй нобелеўскай прамове.

Як *чытач-слухач-глядач* я заўсёды тайна чакаю: з *прылазнікаў-фае-ўступаў-уверцюраў-эцюдаў-бурлескаў-арабескаў* узнесціся хоць на момант разам з Творцам (як, мусіць, у клінічнай смерці?) у шчаслівы кантрапункт *удалага збегу пачуццяў, высока-этычных каштоўнасцяў і мастацкай тэхнікі*.

Малюнак, скульптура (прыгадайце радэнаўскую Аміер),

музыка, танец — усе невербальныя жанры — не хаваюць столькі небяспекі праваліцца ў этычнае блюзнерства пры мадэрных эксперыментах, бо маюць вялікае поле для індывідуальнага «прачытання» сапраўднай задумы творцы. Слова ж і абагульняе, і найбольш, чым іншыя выяўленчыя сродкі, канкрэтызуе сэнсы, узвышаючы ці прыніжаючы чуйную душу.

Увогуле ў «новай глабалізаванай этыцы» распаўсюджана канцэпцыя «шокінгу духоўнага яднання» праз разняволенасць і не-арганічнасць выяўленчых сродкаў (словаў, рухаў, фарбаў, сцэнічных учынкаў, музычных сінтагмаў і г. д.) — няхай сабе і вульгарных. У таго ж найвялікшага еўрапейскага дэсакралізатара і дэмістыфікатара Мілана Кундэры ў рамане, назву якога можна перакласці як «Непаразуменне» ці «Няведанне» (фрагменты з яго я чытаў, на жаль, па-нямецку), у эратычнай сцэне інтымная блізкасць чэскіх эмігрантаў Ірэны і Ёзафа прыходзіць толькі пасля «сублімацыі непрыстойнасці» на роднай мове. Я чуў нешта падобнае ад аднаго ўжо немаладога беларускага літаратара, які лічыць, што найлепшым шляхам для набліжэння да чытача (слухача) з'яўляецца «разумова-пачуццёвая гульня» на мяжы прыстойнасці.

САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ - БЕСПЕРАПЫННЫ САМАПЛЕБІСЦЫТ

Новая глабалізаваная этыка праяўляецца не толькі ў сучаснай мастацкай творчасці, але і ў спробах пераасэнсавання нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Для мяне нацыянальная ідэнтычнасць як гуманістычны панятак пры ўсёй яе складанасці — перш за ўсё катэгорыя этычная, катэгорыя інтэлігенцкасці (не інтэлігентнасці), якая ідзе ад мяне самога, а не з боку нейкага высокаадукаванага «адчужанага і ачужанага пазітывіста», што валодае па-майстэрску ўсім наборам сучасных метадаў аналізу. Мая ідэнтычнасць — мой штодзённы самаплебісцыт. Калі я выходжу за межы сваёй унутранай этыкі і эстэтыкі, я сутыкаюся з каштоўнасцямі маіх магчымых натуральных апанентаў і павінен з імі лічыцца. У гэтым сэнсе я паважаю патрыятычную этыку майго «імперыялістычнага»

расійскага апанента тыпу Праханава, якую ён выпраменьвае з свайго «Я», кіруючыся сваім расійска-«рускім» пачуццём «МЫ», што сфармавалася цягам гістарычна працяглага «рускага» праекту. Яму па-свойму баліць начамі сэрца «аб радзімай старонцы». Я разумею і паляка з ягонай тугой па ўсходніх крэсах.

Нам нельга дэманізаваць Расію ці Польшчу як злы фатум, выпрабаванне Кону ці нешта накшталт гэтага. Гэта пазбаўляе пачуцця гістарычнага аптымізму. Кожны *вялікі этнас* мае сваю культурную і тэхнакратычную «імперыялістычную» этыку ў адносінах да меншага суседняга незалежна ад часовых геапалітычных абставінаў. Тут слабейшы мае нюансы выбару. Першы ўзбагачае чалавецтва і, пэўна, самы боскі: супраціўляйся ментальна, перамажы розумам заваёўніка — рабіся вялікім і адметным праз культурную творчасць. Рабі сваю нацыю адметнай і паважанай. Або дай сябе захлынуць у моцным патоку, загінь трагічна, прыгожа, як Ян Палах. Іншы варыянт: палюбі шчыра імперскае, стань вялікім і сваім у гэтай плыні (усе імперыі шматнацыянальныя). Або без залішніх ахвяраў прыстасуйся і май свой невялікі жыццёвы кайф (варыянт: пакідаючы магчымасць адпомсты, рэваншу).

Пачуцце сучаснай патрыятычнай расійскай інтэлігенцыі пакрыўджана стратаю вялікапятроўскіх ды іншых «приобретений». Я бачыў, як немцы старэйшага пакалення (1900—1920 гадоў нараджэння) плакалі, пачуўшы фінал «Прэлюдаў« Ліста, велічныя акорды якога ў пачатку 1940-х гадоў суправаджалі пераможныя зводкі вермахту з Усходняга фронту. І гэтых немцаў таксама можна зразумець. Гэта была іхная «Радзіма дарагая», як у Праханава. Наша ж «Радзіма мая дарагая» была ў іншай плыні — фальшыва шчаслівая, але звязаная з вечным чаканнем шчасця, маладосцю, майскай вясной, «што ўсё яшчэ будзе».

Імпульсам для такіх развагаў для мяне стаў шэраг падзей у нашым культурным жыцці апошняга часу: выхад зборніку «Анталогія сучаснага беларускага мыслення», з'яўленне беларускага перакладу манаграфіі нямецкага гісторыка Р. Лінднера *«Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная*

палітыка ў Беларусі XIX—XX ст.» , канферэнцыя *«Беларуская нацыянальная ідэнтычнасць»* (праект Фонду Ф. Эберта), іншыя публікацыі па гэтай тэматыцы ў перыядычным друку.

Напачатку ўсяго два словы пра добрасумленнае «аб'ектывісцкае» даследаванне Р. Ліндэнера, які з абшараў «постнацыянальнай» Еўропы і з завершаным хельсінкскім працэсам і фукуямаўскім «канцом гісторыі» ў галаве па-прафесарску нагадвае «запозненым» беларусам:

Спадары беларускія гісторыкі і культуролагі, у вас дагэтуль дамінуюць рамантычныя міфы пра ўзнікненне дзяржаўнасці, публіцыстычная гісторыя пераважае над рэфлексійным метадам і крыніцазнаўствам, перабольшваецца роля нацыянальна арыентаваных «дыскурсных групаў», занадта фундаментальна выбудаваны міф пра залаты век ды вынішчэнне і пакуты, вам бракуе гістарычнага аптымізму і г.д. («Скампрэсаваная цытата» — штучная, сканструяваная мною. — **Аўт.**)

Тут увогуле ўсё больш-менш ясна. У саміх заходнееўрапейцаў, якія гістарычна «своечасова» прайшлі шлях ад этнасу да нацыі і дзяржаўнасці (nation = state) і ўжо паспелі забыцца на свой «своечасовы» пострамантычны нацыяналізм XIX стагоддзя, стаўленне да сучасных постсавецкіх «нацыяналістаў» тыпу беларускіх ды ўкраінскіх насцярожанае. Тым больш у немцаў, якія добра памятаюць пасіянарнага фюрэра. Старэйшае пакаленне немцаў яшчэ сёння злякаецца, пачуўшы ўзгаданы фінал «Прэлюдаў» Ліста, «Лаэнгрына» Вагнэра (любімы твор фюрэра) ці шлягер пра Лілі Марлен (акопны хіт).

Уражанне ад вышэй прыгаданай канферэнцыі, дзе беларуская нацыянальная ідэнтычнасць гіпатэтычна вымяралася бінарнай апазіцыяй «хімера ці ключ для будучыні?», даволі змрочнае. З нямецкага боку — нічога новага, прыблізна тое ж, што ў Ліндэнера. Новае ад беларускіх удзельнікаў — на авансцэну выходзіць ідэя «беларускага крэольства», прыярытэт дзяржаўніцкай свядомасці над нацыянальна-культурным пачаткам як магчымы тактычны прынцып паспяховага фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці і паўнавартаснай

дзяржаўнасці. Калі давесці гэтую ідэю да абсурду, то можна ўявіць сабе крэалізаваную 10-мільённую Беларусь, пазбаўленую нацыянальнага пачатку, так: 2 мільёны нацыянальна свядомых этнічных беларусаў прэзентуюць сабою ўзор талерантных супольнікаў, а 8 мільёнаў расійскамоўных ліберальных патрыётаў беларускай дзяржаўнасці тыпу кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Клімава бароняць Беларусь ад пасіянарных суседзяў. Можна дачакацца і расійскага праваабаронцы Сіманава, заступніка беларусаў, які стане на бок беларускіх крэолаў з суверэнітэтам у галаве. Не раўнуючы польскамоўны Чэслаў Мілаш, што нарадзіўся пад Вільняй і бараніў літоўцаў ад польскага нацыяналізму падчас свайго віленскага перыяду інтэлектуальных пошукаў.

ЦІ НЯБОЖЧЫКАЎ МЫ ХАВАЕМ?

Больш падрабязна хацелася б спыніцца на ідэях, сфармуляваных у «Анталогіі сучаснага беларускага мыслення». Увогуле гэта выдатны праект. Аўтары імкнуцца асэнсаваць беларускую нацыянальную ідэнтычнасць па-сучаснаму (паводле выразу аднаго аўтара, «думаюць Беларусь»), шукаючы і па магчымасці ўлучаючы нацыянальны кантэкст ва ўсясветны «праект рацыяналізацыі свету». Змест нарысаў розны. Большасць тэкставага масіву — неабходныя імітацыі, экстрапаляцыі і паралелі з канцэпцыямі антычных і заходніх мысляроў, што лагічна ўводзяць «кансерватыўнага» беларускага чытача ў свет сучаснага мыслення, якое імкнецца коратка і дакладна, а таму часам і занадта складана сказаць пра глыбокае.

Ёсць і даволі цікавыя арыгінальныя нарысы без простага ўціскання беларускага матэрыялу ў традыцыйныя схемы. Пры гэтым большасць аўтараў даволі ашчадна твораць свае тэксты і пазбягаюць у сваіх прыпушчэннях надмернай мадэрнізацыі, хаця часам нязвыклыя для традыцыйнага вуха мадэрныя слоўцы плаваюць на паверхні наратыву.

У публіцыстычна-філасофскім эсэ гэта непазбежныя выдаткі:

аўтары пішуць як бы для свайго кола і адначасна для шараговага чытача, маюць сказаць шмат у межах яшчэ мала засвоенага намі жанру і абмежаваныя памерамі рэферату. Але некаторых аўтараў з «Анталогіі сучаснага беларускага мыслення», якія пішуць пра нацыянальную ідэнтычнасць, не заўсёды ўдаецца адэкватна зразумець.

Вось С. Дубавец у нарысе «Падставы рацыянальнага нацыяналізму», адкінуўшы традыцыйную схему прачытання гістарычнага заняпаду беларускага этнасу, амаль у эзатэрычным дыскурсе даводзіць, што патэнцыяльныя беларусы ў Сярэднявеччы кіраваліся рацыянальнай логікай («Не было ў нас сваіх Хамейні, Гітлераў ці іншых аб'ектаў масавага нацыянальна-рэлігійнага псіхозу») і гэта, «магчыма, стала прычынай нашага заняпаду». І гэта тлустым шрыфтам. Пры далейшых разважаннях С. Дубавец паслядоўна адрынае «ірацыянальнае шаманства» тыпу расійскага і польскага ды заклікае будаваць новую сапраўдную Беларусь, у якой хацелі б прачнуцца і некаторыя іншыя аўтары, праз... аптымальна-рацыянальны падыход да жыцця. Тут аўтар дарэчы ўзгадвае Дастаеўскага, які бачыў «выратаванне расійскага народу праз веру ў Хрыста», а беларусаў — «праз веру ў сябе».

Тут — аж тры супярэчнасці. Адзначу толькі галоўную: дэкларараваная магчымая прычына заняпаду ў Сярэднявеччы (рацыянальнасць) ужо як прынцып мадэрнай рэканструкцыі пераносіцца ў будучыню. «Савецкага і нацыянальна-рэлігійнага фундаменталізму» аўтар не прымае, бо баіцца, што так мы страцім «уласную традыцыю нацыянальнага рацыяналізму». Беларускі нацыянальны даробак савецкага часу ў падразглядным эсэ, як і ў сваіх іншых публіцыстычных тэкстах, ён непасрэдна ці кантэкстуальна ўскосна характарызуе як неарыгінальны, як пэўную імітацыю.

Блізка да канцэпцыі рацыяналізму і сучасных прагматычных праектаў стаіць аўтар дасціпных нататкаў «Культура смецця і смецце культуры», які заклікае *«хаваць уласных нябожчыкаў»* , каб вырвацца з інкубатару маргіналаў, бо *«старыя багі не маюць нам сказаць што сёння»* . Ставячы высокія патрабаванні перад прагматычнымі нацыянальнымі праектамі, спадар

Жбанкоў кваліфікуе нават адроджаную «Нашу Ніву» ўсяго толькі як «кола аўтараў» побач з малавядомай групай «Соты», забываючыся на галоўнага актора «НН-праекту» — шматлікіх шараговых чытачоў, а таксама з іх ліку — ідэйных прыхільнікаў і апанентаў (апошняе не менш важна!). Сярод незалежных творчых аб'яднанняў, куды аднесена і «Наша Ніва», найбольш вядомым ён лічыць «Бум-Бам-Літ» як «адзін з дыскурсаў постмадэрновае прасторы». Не адмаўляючы аўтару ў праве на ўласныя прыхільнасці і густы, усё ж такі з гэтай іерархіяй цяжка пагадзіцца. На шчасце, «Наша Ніва», нягледзячы на пэўны флёр мадэрнасці, пакуль не парывае сувязі з глыбінным добрым традыцыяналізмам сваёй папярэдніцы. (Не ведаю, ці падзяляюць маю кансерватыўную радасць самі стваральнікі гэтага праекту.)

Вельмі своеасаблівы адыход ад традыцыяналізму дэманструе аўтар нарысу «Трансфармацыі беларускай нацыянальнай ідэі» Алесь Чобат. З аналітыкам, які мае даволі празаічнае прозвішча «Чобат», я асабіста не знаёмы, але, як сталы чытач «Нашай Нівы», памятаю яго яшчэ як бескампраміснага крытыка беларускай апазіцыі, правінцыйнасці думкі пэўных публічных асобаў і г. д., якіх ён лёгка перамагае ў завочных пісьмовых спрэчках, так бы мовіць, «славіць пераможаных». З нарысу мы даведваемся, напрыклад, што беларусы павінны быць удзячныя русафілу прафесару Каяловічу за тое, што расійскі цар Аляксандр II, а таксама Мураўёў-вешальнік упершыню на афіцыйным узроўні пачалі разглядаць Беларусь як не чыста расійскую і не чыста польскую правінцыю, вывучаючы «асобны беларускі аспект дзейнасці правінцыйнага дыктатара К. Каліноўскага». (Каяловіч, паводле аўтара, чытаў лекцыі цару.) Чобат называе гэта *піянернымі даследамі пяці беларускіх губерань* — без двукосся. Тых беларускіх даследчыкаў, якія не хваляць Каяловіча, аўтар іранічна пазначае як «удзячных нашчадкаў» (двукоссе ад Чобата). Своеасаблівы мадэрнізм: усё пастаўлена з ног на галаву. Экстрапалярная мадэрная логіка тады ўжо павінна сцвярджаць, што беларусам трэба сёння быць удзячнымі Лукашэнку за тое, што ад яго «піянерскай» інтэграцыйнай дзейнасці ўжо больш за 60 % беларусаў захацелі ў Еўропу. Але ж якім коштам! Страцілі час, людзей, нацыянальныя таленты... Зусім як у Ніцшэ: самая хуткая

жывёліна, якая прывязе да дасканаласці, — гэта пакуты.

Далей даследчык засцерагае «патрыётаў» (у іх, «маўляў, чым глыбейшыя карані, тым большая пыха») ад залішняга замілавання старажытнай гісторыяй і збеларушвання гістарычных постацяў, крытыкуе членаў Рады БНР за дыпламатычную недасведчанасць («раскірдашы-нязграбы з той Рады»), пагардліва-іранічна, не раўнуючы генерал КДБ Ерын, гаворыць пра нашых сучаснікаў («Пра акт незалежнасці 25 сакавіка 1918 году, нарэшце, ведаюць «свядомыя» і «несвядомыя»). Паміж іншым думаю: цікава, ад каго Чобат пачуў упершыню пра БНР? Пэўна ж, не ад «обожателей» Каяловіча. Хутчэй за ўсё — ад прыспаных радыкалаў. Выходзіць нешта вельмі непрыгожае накшталт варожага «ўгнюшвання мясцовых святыняў» і «дэсакралізацыі аўтахтоннай культуры», пра што цікава піша іншы аўтар.

Не траціць аўтар сваёй мадэрнай ліберальнай арыгінальнасці, калі аб'яўляе паняцці «супольнасць», «патрыятычны абавязак», «грамада», «народ» аскепкамі *нашай цёмнай кланавай свядомасці* . У раздзеле «Праблема культуры» спадар Чобат афарыстычна, не раўнуючы Эклезіяст, разбурае міф пра патрыятычных творцаў:

Служэнне народу (Айчыне, ідэі і г. д.) непазбежна вядзе да жабрацтва, а жабрацтва — да агрэсіі супраць цэлага свету… Прыярытэт мае мець не «патрыятызм» і не «свядомасць», а лаяльнасць да беларускай дзяржавы… (Гэта ў кантэксце суверэнітэту як сучаснай каштоўнасці. — **Аўт.**)

Магчыма, тут трэба ўсё разглядаць толькі на ўзроўні, так бы мовіць, стылістыкі дыскурсу, дзе нецярпліваму аўтару з прычыны ягонага псіхалагічнага складу ці нешчаслівага лёсу не хапае звычайных «элегічна-наратыўных» словаў. Бо такая «бязлітасная крытычная экспертыза» (пра патрэбу яе для нацыянальнага дыскурсу гаворыць У. Абушэнка) нішчыць не толькі «кволыя тэарэтычныя ўніверсаліі нацыяналістаў», але і здзімае з паверхні нядаўняй гісторыі нават бясспрэчныя факты. Абвяшчэнне нацыянальнай незалежнасці ў 1991 годзе

кваліфікуецца як «метэаралагічная анамалія»: «Ніхто не меў ані думкі пра будучыню, у тым ліку і лагер радыкалаў на чале з Пазняком». (Пакуль толькі пабежна заўважу: ну а як жа быць з «паддашкамі», «майстроўнямі», выключэннямі, звальненнямі, шальмаваннямі ў 80-я, барацьбой парламенцкай апазіцыі ў Вярхоўным Савеце 12-га склікання, з напісаннем Канстытуцыі 1994 году, зборамі подпісаў за роспуск ВС 12-га склікання, з праектамі дыверсіфікацыі энергетычных крыніцаў і г. д.? Хто ж гэта рабіў, калі не тыя памяркоўныя ды будучыя радыкалы?)

Хаця Чобат аб'яўляе Францішка Багушэвіча беларускім Адамам («Геній Багушэвіча сканцэнтраваны ў адной фразе «Не пакідайце ж мовы нашай — каб не ўмёрлі!»), аднак у далейшым канцэпцыя аўтара мадэрнізуецца да своеасаблівага крэольства, калі культурна-моўны фактар разглядаецца толькі як часовы пры пачатковым выдзяленні беларускага этнасу («прырост беларускамоўнай папуляцыі»), а для сённяшняга дня пакідаецца толькі «суверэнітэт» і «рост папуляцыі са свядомасцю грамадзянскай адказнасці за дзяржаву». (Нешта накшталт канцэпцыі кандыдата ў прэзідэнты А. Клімава.) Тут спадар Чобат зместава ды ідэйна часткова пераклікаецца з аўтарам Абушэнкам, які прысвяціў крэольству спецыяльны артыкул.

Як германіста і культуролага-аматара мяне вельмі ўражвае таксама Чобатаў інфармацыйны і культуралагічны лібералізм, калі ён даводзіць, што «патрыёты» шкодзяць сваімі апеляцыямі да свядомасці ды абавязку, што культура не патрабуе дзяржаўных інстытутаў і павінна расці, як лес. Ён нават спасылаецца на багатых Германію ды ЗША і сцвярджае, што там няма міністэрстваў культуры. Я не знаёмы са структурай амерыканскіх дэпартаментаў, а вось пра Нямеччыну дакладна ведаю, што там ёсць Kultusministerium, якое апякуецца культурай і адукацыяй. У канцы мінулага году былы канцлер ФРГ Г. Шміт у артыкуле «Закон джунгляў» («Die Zeit», 4.12.2003), прысвечаным крытыцы сучаснага дзяржаўнага лібералізму, пісаў:

Рынак і канкурэнцыя не спараджаюць маралі. Культура і мараль патрабуюць фармавання, узораў, правілаў ды спецыяльных

інстытутаў выхавання і кіравання.

У пошуках саюзнікаў з мінулага даволі спрэчна выглядае «прыступкавая мадэрнізацыя» аўтарам гістарычных постацяў М. Лютэра (1483—1546) і Дж. Боска (1815—1888), якія, паводле аўтарскага выкладу, акрамя ўсяго іншага яшчэ змагаліся за «шанаванне права меншасці».

Прыклады спрэчных спробаў мадэрнізацыі можна было б доўжыць. Як віртуальныя лабараторныя тэксты, яны, натуральна, правамоцныя, і добра, што яны ёсць. Аднак варта, відаць, звярнуць увагу на тое, як яны могуць адклікнуцца сярод тых, хто чытае гэтыя тэксты. Мультыплікацыя думак, магчыма, пойдзе ў больш шырокае кола, напрыклад у студэнцкую аўдыторыю. І вось беларускі студэнт-гісторык пачуе, што Беларусь — гэта толькі віртуальны прадукт мысляроў, што ёсць аб'ектыўна толькі нейкае «памежжа», так бы мовіць, прадукт маргінесаў ды маргіналаў, дзе былі толькі мацеі бурачкі (напісанне з малой літары маё), а сёння ёсць толькі *«чужы свой Лукашэнка» ды «свой чужы Адам Міцкевіч»* , а Купала са сваімі «Тутэйшымі» — толькі геніяльнае выключэнне (пра гэта можна прачытаць у Ігара Бабкова).

ПРА МАДЭРНУЮ ЭКСПЕРТЫЗУ АДНАГО РЭЦЭНЗЕНТА «АНТАЛОГІІ»

Такія разважанні знаходзяць адпаведны водгук у сэрцах аднадумцаў. Вось колькі тыдняў таму трапіў мне ў рукі 6-ы нумар часопісу «ARCHE» за 2003 год. Увагу прыцягнуў артыкул Андрэя Екадумава з бравай назвай «Разбор палётаў беларускай думкі», дзе аўтар аналізуе «Анталогію сучаснага беларускага мыслення». Адразу ўявіліся начальнік эскадрыллі з палявой сумкай і партупеяй, зязюліна гняздо і беларуская думка пад белымі крыламі... Са звестак пра аўтара дазнаўся, што ён сацыёлаг, філосаф, аўтар аналітычных працаў пра беларускія мясцовыя выбары і пра сцэнары рэформаў для Беларусі. Актуаліст, так бы мовіць. Гляджу артыкул па дыяганалі: а ён

малайчына — і сівой даўніны ВКЛ не цураецца, дарма што і пра сучаснасць дбае.

«Разбіраючы» палёты беларускай думкі, Екадумаў сярод трох праграмных артыкулаў, якія могуць «задаць кантэкст для прачытання-тлумачэння ўсёй анталогіі», першым згадвае твор Алеся Чобата з раздзелу «Эйдас» (у анталогіі ёсць яшчэ раздзелы «Логас» і «Топас»). Ён называецца «Трансфармацыя беларускай нацыянальнай ідэі».

Аглядальнік акцэнтавана-задаволена паведамляе прыцішанаму беларускаму чытачу «ARCHE»:

У артыкуле Алеся Чобата — разгромная крытыка нацыяналістычнага міту пра вялікую беларускую культуру. Артыкул гэты карысны. Вымушае сур'ёзна задумацца над «прапіснымі ісцінамі» нацыяналістычнага міту. Сур'ёзна аспрэчваецца тэза пра Вялікае Княства Літоўскае як духоўную радзіму беларускай нацыі...

У заключнай частцы сваіх абагульненняў аглядальнік не шкадуе і нас, сучаснікаў — патрыётаў ды дзяржаўнікаў, — тых, хто дачыніўся да «Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР»:

Падборка тэкстаў у «Анталогіі» акурат дае магчывасць супастаўлення ідэяў і дыскурсаў міжсобку. Ад чаго і да чаго прыйшла беларуская думка за тузін гадоў, пачынаючы ад Дэкларацыі аб суверэнітэце? З «Анталогіі» відаць — не была тая Дэкларацыя забяспечаная ні эйдасамі, ні логасамі. Філасофскае асэнсаванне беларускіх праблемаў, якое павінна было б апярэджваць набыццё незалежнасці, ішло следам за яе набыццём...

Вось такі айчынны «крытычны пазітывізм». Думаючы, што рэцэнзент усё ж такі «думае Беларусь», я міжволі ўзгадаў шукшыноўскага «праведніка», які «в приступе дурного правдолюбия сказал своему соседу, что его жена спит с

агрономом»...

Няёмка мне стала: я ж таксама пэўным чынам руку да «той Дэкларацыі» прыклаў, галасаваў за яе, быў пазней нават членам Канстытуцыйнай камісіі як член Прэзідыума ВС БССР. І ўсё гэта — без логасу, эйдасу і топасу... Трэба было пачакаць, пакуль Чобат з Екадумавым падрастуць. Каюся...

ПРА КУЛЬТУРНЫЯ МЕЖЫ ЕЎРОПЫ, ВКЛ І БЕЛАРУСКАСЦЬ

У сучаснай еўрапейскай тэорыі нацыятворчых працэсаў «бінарныя апазіцыі нацыяналістычнага дыскурсу» (выраз Екадумава) не ёсць апошнім павевам моды. Гістарычна ўзніклыя культурныя межы не разглядаюцца паводле лагарытмічнай лінейкі начальніка эскадрыллі з палявой сумкай. Асабліва гэта заўважаецца цяпер, калі Еўропа шукае шляхі збліжэння. Здаецца, што пачынае пераважаць так званы шматперспектыўны падыход.

Так, калі раней на ўроках астраноміі ці гісторыі настаўнік спасылаўся на імя Каперніка (Капернікуса), робячы акцэнт на тым, што ён быў палякам або немцам (у залежнасці ад таго, хто быў настаўнік), то цяпер шматперспектыўная дыдактыка раіць перш за ўсё падкрэсліваць еўрапейскасць вучонага, які сілкаваўся агульнай сістэмай навуковых дасягненняў, што назапасіла Еўропа яго часу.

Сувора падзяляючы «данацыянальную» зыходную еўрапейскую культуру на нацыянальна акрэсленыя складнікі, аўтар сам сабе пярэчыць. Ці не лепш, аналізуючы беларускасць або небеларускасць артэфактаў на абшарах ВКЛ і яго суседзяў, мець на ўвазе, што, па сутнасці, межы тагачаснай Еўропы як культурнай з'явы былі такімі, якімі былі рэлігія, цывілізацыя, навука, культура не толькі ў ядры этнасу (калі яго можна было вызначыць), але і на памежжы? Інтэграванасць ці адасобленанасць этнасаў вызначалася не толькі тым, на якой мове — лацінскай, польскай, беларускай, нямецкай ці якой іншай — пісаў або гаварыў у працэсе сваёй дзейнасці той ці

іншы актор гісторыі. Пратэстанты і каталікі з розных рэгіёнаў і ў розныя перыяды дэманстравалі сваю «краёвасць» сваім стаўленнем да суверэнаў па-рознаму і на розных мовах. Нават ацэнка ўніятаў у гэтым сэнсе не можа быць безумоўна «патрыятычна-нацыянальнай».

Так што ў шмат якіх выпадках можна прапанаваць такую кампрамісную фармулёўку: «Паводле шматлікіх культурна-цывілізацыйных паказчыкаў, Еўропа «прысутнічала» на Беларусі часоў ВКЛ, а тагачасная культура Княства тварылася падчас інтэграванага працэсу ўзаемадзеяння прысутных этнасаў». Так што культура ВКЛ месцамі і часам гэткая ж беларуская, як і польская. Так, як мы сёння, гаворачы «еўрапеец», укладаем у гэты панятак пэўны інтэграваны культурны сэнс. Кім лічыць сёння еўрапейскага драматурга, які жыве ў Францыі, піша па-англійску, а свае перакладзеныя на нямецкую мову творы ставіць у Германіі?

Культурныя межы Еўропы (не памежна-паштовыя пасты!) былі адкрытыя і пазней. Падсвядомы перанос сённяшняга культурна-межавага падзелу, нават з элементамі глабалізацыі, на сярэднявечную Еўропу будзе яшчэ доўга прысутнічаць у нашых культуралагічных тэкстах. Так, нават у нядаўна выдадзенай выдатнай кнізе Захара Шыбекі «Нарыс гісторыі Беларусі 1795—2002» у раздзеле 14.4 «Культурныя асяродкі« назіраецца ў гэтым сэнсе пэўная мадэрнізацыя. Прынцып «культурнага кантыніуму» са шлейфам ВКЛ-аўскага рэгіянальнага патрыятызму, які не мог абсалютна знікнуць нават пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, на жаль, не атрымаў хаця б канцэптуальнага разгляду.

Мы ўсё яшчэ блытаемся, па-пазітывісцку мадэрнізуючы аддаленую гісторыю, праводзячы межы там, дзе іх не было і не магло быць. Пра самую глыбокую даўніну мы яшчэ не дамовіліся, што гаварыць. Часам выглядае, што ў нас яе або зусім няма, або мы аб'яўляем Адама і Еву прабеларусамі. Яшчэ не з'явіўся наш разважлівы і адважны «апошні летапісец» кшталту расійскага Карамзіна, які б стварыў па-мастацку пераканаўчы вялікі нацыянальны міф, якім захапіліся б нават тыя, хто гісторыяй не цікавіцца.

Галоўныя нашыя спрэчкі — пра Сярэднявечча і пра наш радавод. Хто і якія мы? Мы часта блытаем народную і хрысціянскую культуру, забываючыся, што «просты народ» — сялянства, рамеснікі, воіны-наёмнікі — не былі ў Сярэднявеччы, так бы мовіць, афіцыйнымі носьбітамі нацыянальнай ідэі. Яе носьбіты — суверэны, царква, вучоныя, маёмасны вайсковы стан — не былі так выразна, як сёння, прывязаныя да пэўнай геапалітычнай і культурнай традыцыі. Рэлігійныя, персанальныя ды вайсковыя уніі таго часу сёння часта цяжка зразумець. Прыгадайце хаця б прынцып «cujus regio ejus religio». З пункту гледжання, напрыклад, расійскага акадэміка Дз. Ліхачова («аселасць — гэта сапраўдная маральнасць»), сярэднявечная Еўропа была такая ж амаральная, як і сённяшні Еўрапейскі Звяз.

Сярэднявечча, ВКЛ — гэта наш Вавілон, як, дарэчы, і астатняй тагачаснай Еўропы. Галоўныя міфы пра Сярэднявечча былі створаныя ў XVIII і пачатку XIX стагоддзя, калі «нацыянальнае» прачыналася, а гістарычныя факты яшчэ не назапасіліся. (Дастаткова прыгадаць чэха Ганку з ягоным «Кралядворскім рукапісам».) Карыстаючыся ткацкімі тэрмінамі, можна сказаць, што з гэтага Вавілону кожны этнас цягнуў і па сёння цягне сваю *аснову* і свой *уток* для плашчыны свайго вялікага нацыянальнага міфу. Міф і матэрыяльныя поспехі нацыі ўзаемазалежныя. Заўважныя поспехі мацуюць міф. Праўдзівасць зместу вялікага міфу адыгрывае другарадную ролю. Задача міфу — служыць для падтрымання гістарычнага аптымізму нацыі, матэрыялізаваць досвед мінулага, тлумачыць сучаснае, разгортваць перспектыву на будучыню.

Суседнія нацыі не могуць падзяліць такі міф. Рэальная плашчына-аснова міфалагічнага сувою з суседам — адна, толькі з кожнага краю яна блішчыць па-рознаму. Мы ніколі не падзелім сваіх міфаў і нацыянальных постацяў з літоўцамі, палякамі, расійцамі ды ўкраінцамі. Гэтага цяпер і не трэба рабіць. Трэба моўчкі будаваць свой дом, свой міф, сваё жыццё для сваіх дзяцей, *гледзячы з свайго боку* . Час для пазітывісцкага разбору айчынных культурна-гістарычных міфаў для нас яшчэ не настаў. Падросшы і прачытаўшы сваю ды чужую інтэрпрэтацыю, нашы дзеці як-небудзь разбяруцца.

Літоўскія школьнікі не надта ведаюць, што там пішуць цяпер пра славянскую ды балцкую Літву сучасныя польскія ці беларускія гісторыкі. Яны добра засвоілі свой прыгожы нацыянальны міф пра Літву. Яны патрыёты без хістанняў. Яны ўжо пад парасонам Еўразвязу сярод шматлікіх роўных — дробных і сярэдніх, па-за межамі небяспечнага «расійскага» праекту. *Палітычная Еўропа, не вельмі разбіраючыся ў польска-беларуска-літоўскіх гістарычных разыходжаннях, прыняла літоўскі дзяржаўны міф і назву, якія грунтуюцца на сярэднявечным палітоніме «Літва», таму што літоўская ўлада і інтэлігенцыя разумеюць патрыятызм і вялікі нацыянальны міф аднолькава.*

Сумесныя міжнацыянальныя камісіі ў спрэчных гістарычных пытаннях рэдка даюць плён. Прыйдзе час, і шмат з таго, што некалі было ці здавалася архіважным, страціць свой сэнс. Паглядзіце на Еўропу. Няхай сабе тэза пра «постнацыянальную» эпоху, глабалізацыю і «канец гісторыі» злёгку перабольшаная, усё ж такі Еўропа паціху развітваецца са сваімі старымі нацыянальнымі легендамі. Яны становяцца аб'ектам увагі хіба што этымолагаў, мастакоў, экскурсаводаў ды вузкіх спецыялістаў.

Ствараюцца міфы новага часу і гальванізуюцца старыя, але ўжо на больш мастацкім узроўні, ці, як кажуць дыдактыкі, на ўзроўні «формы пераносу інтарэсаў», якую нельга інтэрпрэтаваць як нацыянальны пафас: *наша Радзіма, наша краіна, нашы продкі* . Для сучаснага немца легенда пра Германа — зусім не тое, што яна значыла для яго дзядоў у канцы XIX стагоддзя.

Тут, праўда, ёсць адзін нюанс: для «запозненых» нацыяў тыпу беларускай ці ўкраінскай, над якімі яшчэ навісае небяспека паглынання суседняй «пасіянарнай» плынню, значэнне вялікага нацыянальнага міфу не траціць сваёй актуальнасці і да сёння. Таму, хто працуе ў полі нацыянальнай культуры, гісторыі, мастацтва, не варта лічыць патрыятызм толькі індульгенцыяй для малаталенавітых (хаця і такое бывае) або «последним прибежищем подлецов». Апошняе было сказана не намі ды з іншай нагоды.

ГІСТАРЫЧНЫ АПТЫМІЗМ І ЎВАГА ДА МІНУЎШЧЫНЫ

Адметнымі для гісторыі паспяховых нацый з'яўляюцца, паміж іншым, увага і павага да сваёй перадгісторыі і ранняй гісторыі. Пры гэтым у дадзеным пытанні назіраецца адзінства паміж уладнай і інтэлектуальнай элітай. Вельмі паказальнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца, напрыклад, эстонцы. Перажыўшы ў новы час перыяд «тутэйшасці», «сялянскасці», «не-нямецкасці», калі нават адукаваны эстонскі селянін называўся «сакс» паводле аналогіі з элітай грамадства — нямецкімі асаднікамі, эстонцы змаглі дзякуючы шэрагу гістарычных абставінаў к пачатку XX стагоддзя стварыць грунт нацыі і дзяржаўнасці.

Нават цяпер, калі Эстонія становіцца часткай палітычнай Еўропы, вучоныя-гісторыкі і спецыялісты па школьных падручніках з краін ЕЗ усё яшчэ крытыкуюць эстонскіх гісторыкаў за нацыяналістычную міфатворчасць. Так, у зборніку «Нацыянальныя рухі і ўтварэнне дзяржаваў. Балтыйскі рэгіён у школьных падручніках» (Франкфурт-на-Майне, 1995) прафесар Гамбургскага ўніверсітэту К. Гасельблат крытыкаваў эстонскага гісторыка, пісьменніка і... адначасова прэзідэнта краіны Ленарта Мэры за тое, што ён «інструменталізуе» перадгісторыю і старажытную гісторыю, сцвярджаючы, што

эсты як угра-фіны, якіх у адрозненне ад індаеўрапейцаў не закранула вялікае перасяленне народаў, ужо пятнаццаць стагоддзяў таму назад мелі сваё эстонскае пачуцце адзінства («Wir-Gefühl»)...

Мы ж афіцыйна пачаткуем сваю дзяржаўнасць з ліпеня 1944 году... І жывём у краіне, дзе так званая ўладная эліта паводле разумення нацыянальнай ідэнтычнасці і нацыянальнай ідэі застаецца непаяднанай са значнай — а магчыма, і пераважнай — часткай нацыянальнай інтэлігенцыі, асабліва з яе гуманітарным сегментам. Інтэлектуалы, якія актыўна прапагандуюць ідэі ўлады, — з пункту гледжання сваіх апанентаў або прагматыкі-цынікі, або аблудныя авечкі. У сваю

чаргу «інтэлігенцка-дысідэнцкая фронда» трактуецца «калабарантамі» як кучка небаракаў з нацыяналістычным комплексам, якая шукае сабе іншага (багацейшага, іншаземнага, варожага і да т. п.) патрона. Кожны з бакоў пераканаць (або робіць выгляд), што менавіта ён з'яўляецца патрыётам.

Некаторыя з нас схільныя бачыць у гэтым злы фатум. Але сітуацыя абсалютна тыповая і абсалютна не выключная. Тут няма праклятцця Кону. Небяспечна толькі тое, што такое становішча зацягнулася, выпала, так бы мовіць, з гістарычнага графіку. Аднак усё ж гістарычны аптымізм трэба чэрпаць у гістарычных аналогіях.

У гісторыі народаў і этнасаў кожны некага падпарадкоўваў ды на некага ўплываў — так бы мовіць, рэалізоўваў свой «гістарычны праект». Узгадайце магутныя ваяўнічыя плыні філістымлянаў, рымлянаў, брытанцаў, напалеонаўскай часткі Еўропы, Русі, Германіі... Адпаведна былі слабейшыя на шляху гэтых плыняў, дзе былі «неразумныя патрыёты» і прагматычныя або слабыя духам «калабаранты». Амаль у кожнага этнасу на шляху да нацыянальна-дзяржаўнага сталення (акрамя хіба невялікіх «пасіянарных» этнасаў тыпу армянскага ці габрэйскага) такая з'ява мела месца. У больш-менш «своечасовых» моцных этнасаў (немцы, шведы, англасаксы, велікаросы, французы, туркі і г. д.) гэта было даўно, і сёння трагічнасць і вастрыня тых падзей ужо забыліся.

Пачытайце нямецкія хронікі і легенды пра Армінія-Германа з племені херускаў, які праз двайную здраду — спачатку сваім, а потым рымлянам — з варвара-германца ператварыўся ў нямецкага нацыянальнага героя. Узгадайце велікарускіх князёў эпохі феадальнай раздробленасці, якія рабілі гістарычны выбар паміж «рускім» і татара-мангольскім геапалітычнымі «праектамі»: хаўрусаваліся з татарамі, білі сваіх, потым здраджвалі хаўруснікам... Паглядзіце на закалоты паміж Радзівіламі і Сапегамі ці спрэчкі паміж нашымі пратэстанцкімі і каталіцкімі асветнікамі XVII—XVIII стагоддзяў падчас сутыкнення шведскага і «расійскага» геапалітычных праектаў. Падобная сітуацыя раздвоенасці эліты мела месца амаль ва

ўсёй Эўропе часоў Напалеона, які ўвядзеннем «Кодэксу» наводзіў «новы парадак», за што яму, дарэчы, шмат якія лапікавыя этнасы павінны быць удзячныя. Напалеон зрабіў іх нацыямі.

МЫ Ў ПЛЫНІ «РУСКАГА» ГІСТАРЫЧНАГА ПРАЕКТУ

«Рускі праект» пачаўся з тысячу гадоў таму і працягваецца па сёння. Мы — на шляху плыні гэтага гістарычнага праекту: то захлынаемся, то вылузваемся. Кожны з нас знаходзіцца ў пэўным пункце паводле развіцця падзеяў і ўласнага стаўлення да дзейных асобаў гісторыі. Па-інтэлігенцку кажучы, тут трэба прызнаць права двух падыходаў: вялікадзяржаўніцкага са сваёй геапалітычнай праўдай лепшай гістарычнай перспектывы і маральна-этычных пошукаў ды памкненняў слабейшых гістарычных актораў. Яны не супадаюць. Тут кожны мае сваю праўду, гледзячы пра што гаворыць.

Прывяду цытату з «Истории государства Российского» Мікалая Карамзіна, які 31 кастрычніка 1803 году быў афіцыйна прызначаны ўказам Аляксандра I дзяржаўным гістарыёграфам «с жалованием в год по две тысячи рублей ассигнациями». Так, разважаючы пра так званае татара-мангольскае ярмо, аўтар робіць амаль немагчымае: у адным пасажы па-мастацку «знімае» гістарычна-этычны трагізм прыніжэння рускіх дробных суверэнаў перад манголамі і страты «древних свобод», каб лагічна і эстэтычна (!) пераканаць чытача, што адзінае выратаванне Русі — паслухмянасць адной волі. Адчуваецца майстар, які змяніў стыло літаратара на пяро гісторыка:

Совершилось при монголах легко и тихо, чего не сделал ни Ярослав Великий, ни Андрей Боголюбский, ни Всеволод III: во Владимире и везде, кроме Новгорода і Пскова, умолк вечевой колокол, глас вышнего народного законодательства, столь часто мятежный, но любезный потомству славянороссов… Князья, смиренно пресмыкаясь в Орде, возвращались оттуда грозными повелителями: ибо повелевали именем царя

верховного.

У гэтым сэнсе ў пазнейшай гісторыі «рускімі» былі і эстонец генерал Міхельсон, які ганяўся за Пугачовым па ўральскіх стэпах, і Брулоў, і Герцэн, і Барклай, і Фанвізін, і «каўказскі чалавек» генералісімус Сталін, і Пастарнак, і чэчэнец палкоўнік Масхадаў, які разам з беларусам генералам Усхопчыкам уціхамірваў літоўцаў у разгар перабудовы, і нават генерал ад авіяцыі Джахар Дудаеў, калі прымаў удзел у афганскай кампаніі. Спіс можна доўжыць пералікам беларускіх прозвішчаў — даўнейшых і цяперашніх. Інакш і быць не магло, бо — паводле Р. Пайпса — «прырастаючы» ў XVI—XVII стагоддзях на працягу 150 гадоў штогод на 35 000 квадратных кіламетраў (на тэрыторыю сучаснай Галандыі штогод), Расія не магла развівацца без вялікай колькасці іншародцаў.

Усе гэтыя варагі, венгры, печанегі, немцы, французы, грэкі, фіны, полаўцы, хазары, славяне і г. д. — у рознай якасці (князі, вайскаводы, купцы, воі, будаўнікі фартэцыяў, збіральнікі даніны, суддзі і г. д.) — з розных прычынаў у пэўны час былі праваднікамі «рускага гістарычнага праекту». Па-інтэлігенцку дадамо: яны мелі на гэта права. Кожны паводле сваіх абставінаў.

Таму сённяшняе супрацьстаянне — абсалютна нармальная з'ява. Мы — недавараны прадукт «рускага праекту». Калі б бальшавікі не пакарысталіся так званым правам нацыяў на самавызначэнне для сваіх рэвалюцыйных мэтаў, калі б збудавалі стабільную палітычную ды эканамічную сістэму або калі б губернская сістэма імперыі праіснавала яшчэ гадоў сто, усё магло б быць зусім інакш. Узгадайце апублікаваны ў часы перабудовы сакрэтны ліст Сталіна да Леніна ад 22.9.1922 (ён называецца, здаецца, «Письмо единомышленнику»), дзе адказны за нацыянальнае пытанне таварыш крытыкуе «лібералізм Масквы ў нацыянальным пытанні» ды раіць заняцца «маладым пакаленнем на ўскраінах», якое «адмаўляецца разумець гульню ў незалежнасць як гульню».

У гэтым сэнсе развагі нашых гісторыкаў і культуролагаў пра старую гісторыю (Сярэднявечча, ВКЛ) носяць адносны

характар, і гістарычных праўдаў сёння можа быць столькі, колькі ёсць зацікаўленых бакоў.

Каб этнас стаў нацыяй, эліты ствараюць свой *вялікі нацыянальны міф* праз гісторыю, гуманістычную навуку, легенды, мастацкія вобразы. Так узнікаюць стэрэатыпы пра кожную нацыю. Справы гавораць самі за сябе. Міфы — прапагандуюцца. Калі паслядоўна раскручваць «сувой» вялікага нацыянальнага міфу любога этнасу, які нават стаў самай паспяховай сучаснай нацыяй, то можна ў кожным без выключэння выпадку знайсці «патрыятычныя» фантазіі, якія становяцца стрыжнем, на які намотваецца астатняя «лінейная» гісторыя. Першазмест міфу прымаецца як аксіёма, так бы мовіць, без каментароў унізе старонкі.

Даволі цяжка адрозніць этнічнае ад канфесійна-дзяржаўнага. Еўропа гэта ўжо даўно зрабіла. На гэтых абшарах, кажуць мандыялісты, наступіла постнацыянальная эпоха. Тут, як гаварылася раней, *ethnos* стаў «своечасова» *nation*, з выразным этнічным ядром або без яго (поліэтнічнае ўтварэнне з супольнымі інтарэсамі). На хрысціянскім еўрапейскім абшары з узмацненнем дзяржаўнага складніка рэлігійны слабее. Знікае папацэзарызм і цэзарапапізм. «Боскі пачатак» у царкве паступова падмяняецца прагматычным адміністраваннем у межах дзяржаўнай этыкі. Уплыў царквы традыцыйна перабольшваецца палітыкамі, якія для сваёй публічнай рэкламы ахвотна бяруць напракат даўно сфармуляваныя ўніверсальныя хрысціянскія максімы.

Дарэчы, назіраючы за працэсам фармулёўкі сучасных маральных каштоўнасцяў у тэксце будучай Канстытуцыі ЕЗ (спрэчка вакол т. зв. «хрысціянскіх каштоўнасцяў»), што мае быць прынятай на пачатку чэрвеня 2004 году, можна безумоўна канстатаваць, што інстытут царквы палітызаваўся і сацыялагізаваўся, адышоў ад асобы, хаця хрысціянства ў сваіх кананічных тэкстах — у адрозненне, напрыклад, ад ісламу — не ведае сацыяльнага вучэння, а ўсё мае скіроўваць на выратаванне грэшнай душы.

Мы мала ведаем пра сучасныя пошукі еўрапейскіх інтэлектуалаў, якія можна было б назваць новым

антымонатэізмам, што супрацьпастаўляецца далёкаму чужому старазапаветна-евангельскаму хрысціянскаму міфу, які па-свойму ўсмерціў думку антычнай Грэцыі, «дзе ўжо было сказана ўсё пра чалавека».

ПРА КАРЫСЦЬ НЯМЕЦКАГА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ДОСВЕДУ

Вучыцца можна не толькі ад блізкіх суседзяў. Прывяду для ілюстрацыі дзве нямецкія патрыятычныя легенды. Чаму нямецкія? Па-першае, з Нямеччынай мы не маем супольных спрэчных этналагічных праблемаў. Па-другое — і гэта ў дадзеным выпадку важней — немцы з'яўляюцца «своечасовай» еўрапейскай нацыяй з бездакорнымі атрыбутамі сучаснай дзяржаўнасці і ім як бы няма патрэбы мець прыдуманыя дзяржаўнатворчыя легенды. Але сённяшнія нямецкія гісторыкі ды публіцысты гэтыя легенды не нішчаць, разумеючы, што ў свой час яны былі своечасовыя.

Гэтаксама немцы не выкідаюць з сваёй Канстытуцыі артыкулу, дзе канстатуецца, што «нямецкасць» вызначаецца паводле нараджэння і крэўнасці, не выкідаюць са слоўнікаў і лексіконаў «нацыяахоўнага» слова *«Unterwanderung»*, якое на розных мовах тлумачыцца толькі апісальна, бо, падобна, не мае аналагаў : *«Паступовае пранікненне чужога насельніцтва ў іншае і разбурэнне яго адзінства».* Для верадайнасці падаю арыгінальнае тлумачэнне з аднамоўнага слоўніка: *«Das langsame Einströmen einer fremden Bevölkerung in eine andere und das Zerstören deren Einheitlichkeit»* (Gerhard Wahrig. Deutsches Wörterbuch. Gütersloh, 1968. С. 3747). У нас штогод паміраюць каля 50 тысячаў жыхароў Беларусі. За гэты ж час да нас прыязджаюць больш за 20 тысяч расійскамоўных мігрантаў. Сярод іх нямала ўцекачоў, авантурыстаў, няўдачнікаў, уласнікаў крымінальнага капіталу. Мы на дзяржаўным узроўні ганарымся гэтым як паказчыкам стабільнасці і сучаснай талерантнасці.

Дык вось пра нямецкі патрыятызм. Імя Германа я ўпершыню сустрэў у «Разбойніках» Ф. Шылера, калі ў самадзейным

нямецкамоўным тэатры Менскага інстытуту замежных моваў як актор агучваў роспачны маналог рамантычнага Карла Мора. Нешта накшталт «О, калі б дух непераможнага Германа напоўніў мае грудзі і сэрца!». З часам я даведаўся значна больш пра гэтую легендарную постаць. З пункту гледжання гістарычнай праўды і «прагрэсіўнага развіцця» Герман аказаўся зусім несімпатычнай, хаця і трагічнай фігурай.

Міф пра Германа сімвалізуе барацьбу за адзінства Нямеччыны. Паводле легенды ён (у сапраўднасці ў пісьмовых крыніцах засведчаны толькі лацінскі варыянт Arminius) быў ваяводам племені херускаў, якое ў 9-м годзе пасля Н. Х. знішчыла тры рымскія легіёны пад кіраўніцтвам Публія Квінктылія Вара (Varus) у Тэўтабурскім лесе. Цяпер гэта сучасная федэральная зямля Паўночны Рэйн-Вестфалія.

Гэтая тэма знайшла сваё багатае адлюстраванне ў XVIII і на пачатку XIX стагоддзя ў нямецкім мастацтве. Нямецкі гісторык Ганс-Юрген Пандэль (далей будуць выкарыстаныя некаторыя падрабязнасці з ягоных расповедаў) дае такую лічбу: з 1750 да 1850-га з'явілася больш за 200 гераічна-патрыятычных паэмаў ды операў, прысвечаных асобе Германа (!). Ясна, што міф тварыўся для актуальнага моманту: Нямеччына ішла насустрач вайне з Францыяй, якую яна выйграла ў 1871 годзе. У 1875 годзе пасля перамогі немцаў у меркаваным месцы бітвы ў горадзе Дэтмольд Герману паставілі 57-метровы помнік. Яго меч узняты ўверх, але візуальнае ўражанне такое, што ён паказвае не на поўдзень, на Рым, а на Захад, у бок Францыі. Помнік вельмі нагадвае выяву на савецкім плакаце пачатку вялікай айчыннай вайны «Родина-мать зовет».

Чаму тут трэба гаварыць пра чыстую міфатворчасць у вузкім сэнсе слова? Па-першае, з гістарычнага пункту гледжання атаясамліваць германцаў і немцаў — абсурдна. Зборным паняткам «Германія» рымскія гісторыкі называлі ўсяго толькі ўсе заходнія народнасці як геаграфічную, а не этнічную рэальнасць, якой на пачатку нашай эры проста не магло быць. Тым не менш, імператар Вільгельм I пры адкрыцці помніка ўжываў выраз «Герман-немец». Для сённяшніх гісторыкаў зразумела, што панятак «нямецкі« (у набліжэнні да этнічнага)

дарэчна ўжываць толькі, можа быць, пачынаючы з X стагоддзя. З такім жа поспехам Армініуса-Германа маглі б «захапіць» іншыя суседзі Германіі. Напрыклад, французскі папулярны энцыклапедычны даведнік «Larousse» у артыкуле *Hermann* адсылае чытача да артыкулу «Arminius», дзе даецца нейтральнае тлумачэнне: *Chef des Cherusques, demeure populaire en Allemagne sous le nom de Hermann (Кіраўнік херускаў, вядомы ў Нямеччыне пад іменем Германа)*.

Па-другое, ці можа лічыцца вялікім дасягненнем перамога варвараў над цывілізаванымі рымлянамі з пункту гледжання гістарычнай перспектывы, каб яго запісваць у аналы патрыятычнай гісторыі?

Па-трэцяе, калі быць дакладным, Армініус-Герман не быў «патрыятычным» правадыром сваіх супляменнікаў, а наёмнікам-здраднікам. Ён быў хлопчыкам захоплены ў палон рымлянамі ў час нападаў на германскія плямёны, разам са сваім братам Флавусам выхоўваўся і вучыўся на салдата ў Рыме, пасля чаго прымаў удзел у нападах на сваіх былых супляменнікаў (варыянт германскага манкурта!). За свае «баявыя заслугі» ён атрымаў нават рымскае грамадзянства. Потым за перспектыву стаць «правадыром» перайшоў на бок супляменнікаў. Праўда, падчас уладных закалотаў быў, як бы цяпер сказалі, «заказаны» супернікамі і па-здрадніцку забіты, меўшы ад нараджэння 37 гадоў. Звычайны лёс наёмніка. Аднак — чаго толькі ні можа гістарычны міф!

Міф пра Барбаросу яшчэ больш уражвае сваёй заблытанасцю. У сваім імкненні стварыць прапагандысцкі грунт для ўслаўлення нацыянальнай баёвай гісторыі ў XVI стагоддзі немцы «пераблыталі» Фрыдрыха II (1194—1250), які паводле падання спачывае на гары Кіфгойзер (Kyffhäuser) — хаця ён памёр у сваім замку ў Апулеі, — з ягоным дзедам Фрыдрыхам I (1122—1190) па мянушцы Барбароса (рудая барада). Рэч у тым, што Фрыдрых I (Барбароса) загінуў падчас трэцяга крыжовага паходу ў Малой Азіі (утапіўся ў рацэ Салеф). Але ў пастамент манументу першаму нямецкаму імператару Вільгельму I, спадкаемцу славы Фрыдрыха II у змаганні з Папам, на гары Кіфгойзер убудавана фігура... Барбаросы ў позе задуменнага

воіна-пілігрыма. Мы ведаем яшчэ спробу аднаго нямецкага лідэра мінулага стагоддзя праславіць імя гэтага легендарнага германца, назваўшы ягонай мянушкай ваенны паход на Ўсход. Паход той, праўда, быў не вельмі паспяховы.

Немцы не нішчаць сёння гэтых легенд і помнікаў, не мадэрнізуюць сваіх колішніх святынь пад аб'яднаную Еўропу.

ЭПІЗОДЫ «ШТОДЗЁННАЙ» КУЛЬТУРНАЙ ГІСТОРЫІ ВКЛ

Цяпер колькі слоў пра нашу беларускую культурнасць і ВКЛ. Паспрабую, карыстаючыся метадам «штодзённай гісторыі», праілюстраваць еўрапейскасць і культурнасць нашых землякоў эпохі ВКЛ простым прыкладам з культурнай гісторыі нашага краю.

Уявіце сабе сённяшняе Іўе на Гарадзеншчыне. Звычайны гарадскі пасёлак з сельпоўскім універмагам, поштай, брацкімі могілкамі часоў ВАВ, Домам культуры і вуліцамі К. Маркса, 1 Мая, Леніна. Ёсць тут уцаркоўленыя каталікі, хрышчаныя праваслаўныя, праваслаўныя толькі паводле сямейнай легенды, мусульмане. У асноўным усе карыстаюцца расійска-беларускай трасянкай. Некаторыя валодаюць касцельнай польскай, адзінкі ведаюць зачыны модлаў на арабскай. Тут захаваўся мячэт будовы XIX стагоддзя.

Паглядзім на Іўе часоў ВКЛ, задоўга да ўваходжання ў склад Расійскай імперыі (1795 год). У пісьмовых крыніцах Іўе ўзгадваецца з XV стагоддзя. З XVI стагоддзя — мястэчка Ашмянскага павету Віленскага ваяводства ВКЛ. У цэнтры мястэчка — гандлёвая плошча паміж вуліцамі Віленскай, Наваградскай і Крывой. Абапал — дамы гандляроў, рамеснікаў, корчмы, мураваны дом цырульніка. Больш за 170 сядзібаў, кальвінскі збор разам са школай, мураваны касцёл, кляштар бернардзінцаў, драўляны парафіяльны касцёл, шпіталь... (Звесткі з энцыклапедыі.) Заглянем у 1586 год... (Звесткі паводле Я. Парэцкага.) У гэтым годзе рэктар івейскай школы, што існавала пры кальвінскім зборы, Ян Ліцыні Намыслоўскі

напісаў падручнік логікі з прыкладамі, узятымі з багаслоўскіх тэкстаў, але супярэчнымі догмам хрысціянскага веравучэння. Германскі багаслоў Іюніюс напісаў трактат-філіпіку супраць Яна Ліцынія, абвінаваціў яго ў блюзнерстве і напісаў скаргу-данос князю Радзівілу. Трактат Іюніюса быў надрукаваны ў Базелі (сёння Швейцарыя).

Падручнік логікі івейскага рэктара быў надрукаваны ў Лоску. Тады Лоск быў адным з еўрапейскіх цэнтраў арыянства, меў статус гораду, гандлёвую плошчу з адпаведнымі забудовамі, замак, славутыя друкарні, дзе друкаваліся кнігі на лацінскай, польскай і беларускай мовах. Тут працаваў асветнік Сымон Будны, які ў 1574 годзе пераклаў «Новы Запавет» і напісаў трактат «Пра дзве сутнасці Хрыста» ды яшчэ шмат чаго іншага.

Сёння Лоск — вёска ў Гародзькаўскім сельсавеце Валожынскага раёну па дарозе з Менску на Вільню. Кажуць, што там захавалася замчышча. Дзе стаялі славутыя друкарні, ніхто не ведае. Здаецца, Кастусь Тарасаў у кнізе «Памяць пра легенды» пісаў, што там пасвяцца гусі і свінні.

Чаму я ўсё гэта згадваю? Каб актуалізаваць гісторыю і задумацца пра беларускую культуру часоў ВКЛ. Глядзіце: у Іўі пішуць трактат. Друкуюць у Лоску. Нямецкі (ужо не «германскі»!) багаслоў чытае, палемізуе, звяртаецца да суверэна на тутэйшых абшарах, скардзіцца, друкуецца ў еўрапейскім Базелі. Ці не ёсць гэта дыялог еўрапейскіх культураў, дзе эліта нашага этнасу з еўрапейскай дасведчанасцю — няхай сабе і пад уплывам заходніх павеваў — на роўных палемізуе з Захадам? Сапраўды, Еўропа прысутнічае тут. І тагачасныя «беларусы» — яны так яшчэ не называюцца — твораць культуру на абшарах ВКЛ. Не трэба забывацца, што мы гаворым пра *хрысціянскую культуру,* а не пра народную. Народную шматбожную паганскую культуру розныя народы тварылі, так бы мовіць, паралельна. Італьянцы спраўлялі карнавал, славяне — масленку. Адны па-гарганцюгоўску развітваліся з ялавічынай (carne vale!), другія — на згон зімы (а як ахрысціяніліся — перад вялікім постам) у запас аб'ядаліся блінцоў з маслам.

Паспрабуйце ўявіць сённяшняга дырэктара івейскай школы і

інтэлектуала з швейцарскага Базелю, якія вядуць навуковы дыспут. Нешта цяжка гэта ўяўляецца. Дык дзе больш еўрапейскай культуры — у сённяшнім Іўі і Лоску ці ў гэтых местах у XVI стагоддзі? Добра разумеючы гістарычныя варункі, нельга так крута, як гэта робіць спадар Екадумаў, ставіць сёння рытарычнае пытанне пра тое, хто лепшы: Сарбона ці БДУ?

Прычына заняпаду Лоску ды Іўя зразумелая: папалі ў плынь «расійскага гістарычнага праекту», як дзесяткі іншых беларускіх мястэчкаў і местаў. Калі чыста гіпатэтычна ўявіць сабе, адкінуўшы ўсе нюансы гістарычных інтрыгаў Паўночнай вайны, што гістарычнай Літве-Беларусі было б наканавана застацца, напрыклад, у плыні *этнічна далёкага* шведскага «гістарычнага праекту», па-за межамі «Рэспублікі двух народаў» і Расіі, думаецца, што лёс Іўя ды Лоску мог бы быць іншым. Магло б адбыцца нешта накшталт эстонскага развіцця пад *неблізкароднасным* нямецкім цывілізацыйным уплывам: паступовае ўтварэнне сярэдняга класу нацыянальнай буржуазіі, фармаванне нацыянальна арыентаванага мясцовага самакіравання, нацыянальнай адукацыі і г. д. (У гэтай сувязі прыгадваецца цікавы прыклад з кнігі А. Катлярчука «Шведы ў гісторыі й культуры беларусаў», дзе шведскі жаўнер, знаходзячыся на тэрыторыі ВКЛ, піша маёмасны тастамант для шведскага натарыяту на старабеларускай мове.)

Мы прыгадвалі 1586 год. Гэты год цікавы для Беларусі акрамя ўсяго іншага яшчэ тым, што ў гэтым годзе ці не першы наш зямляк, Саламон Рысінскі (нарадзіўся ў в. Рысін на Полаччыне), назваў сябе беларусам, будучы ў заходняй Еўропе. Калі яго заносілі 2 снежня 1586 году, у матрыкуляцыйную ведамасць Альтбургскага ўніверсітэту (Саксонія), ён запісаўся як Solomo Pantherus Leucorussus (Саламон Рысінскі, беларус; leucos па-грэцку «белы», пантэра — рысь, Салямо — Саламон). Сёння мы не можам дакладна сцвярджаць, як ён фармуляваў для сябе сваю «ідэнтычнасць-краёвасць», з кім ён суадносіў сваё «Wir-Gefühl». Тут можна думаць пра геаграфічны арыенцір (але ўжо не тапанімічны гарадскі, а шырэйшы), зразумелы для тагачасных еўрапейцаў. Рысінскі, так бы мовіць, упісваў сябе ў «семіятычную знакавую сістэму» еўрапейскага, ужо часткова этнічна-дзяржаўнага мыслення. Хаця Рысінскаму тады было

гадоў 20 з невялікім, але паводле ягонай перапіскі можна меркаваць, што гэта ўжо была дастаткова сталая асоба. Можна думаць і пра пазнейшы «ідэалагічны» пачатак — пра Крыштапа II Радзівіла, пра аднадумцаў Рысінскага з віленскага гуманістычнага асяродку: Скаргу, Волана, Сматрыцкага, Руцкага, Карповіча. Але тады ўжо, магчыма, прыйдзецца шмат што з вядомых стэрэатыпаў пераглядаць і ўдакладняць, бо веды нашы пра гэты час фрагментарныя.

Еўропы ў сучасным разуменні тады яшчэ не было. Не было тады яшчэ і Германіі. Былі Баварыя, Турынгія, Пфальц, Гесэн, Шлезвіг-Гольштэйн і г. д. Яшчэ ў 1841-м прускі настаўнік і паэт Гофман фон Фалерслебен, высланы за ліберальныя погляды і сваю «адзінагерманскасць» за межы роднай Прусіі, усё яшчэ заклікаў немцаў да яднання: «Deutschland über alles» («Германія перадусім»). Пазней «Deutschlandlied» стала нацыянальным гімнам. Праз стагоддзе яна была, на жаль, пераасэнсаваная і абылганая пасіянарнымі мадэрнізатарамі.

ПРА АДНУ ЛЕГЕНДУ «РУСКАГА ПРАЕКТУ» І АЙЧЫННУЮ ДЭГЕРАІЗАЦЫЮ

Адзін і той жа факт старой гісторыі можна лёгка падаць і так і гэтак. Прывяду прыклад, як казацкі атаман Ярмак стаў Ярмаком Цімафеевічам і нацыянальным героем Расіі. Гісторыкі сацыялагічнага складу тыпу В. Таціщава абмяжоўваліся сухой канстатацыяй пра ўдзел казацкага атамана Ярмака ў асваенні «камских изобильных мест» і абшараў за Ўралам у адпаведнасці з царскай «жалованной грамотой» прадпрымальнікам братам Строганавым. Пры гэтым яшчэ паведамлялі, што сярод дружыны Ярмака было нямала беглых катаржнікаў, крамешнікаў, забраных гвалтам сялянаў і гарадзкога люду і г. д. Пісалася пра поспехі і няўдачы кампаніі, пра тое, што атаман 6 жніўня 1585 году загінуў: патануў у цяжкай кальчузе, калі спрабаваў пераплыць прыток Іртыша Вагай, ратуючыся ад нечаканага нападу хана Кучума. Не замоўчвалася, што потым пераможаны хан быў аблашчаны і прызначаны «па-руску» кіраваць сваёй вотчынай... Здавалася —

як бы няма вялікай нагоды для слаўных успамінаў.

Магчыма, Ярмака ніхто так і не ўзгадаў бы, як тысячы палеглых ваяводаў, вялікіх і малых, за «рускую ідэю», калі б не гісторык-мастак Карамзін. Вось карамзінскі тэкст:

Ермак знал о близости врага и, как бы утомленный жизнью, погрузился в глубокий сон со своими удалыми витязями, без наблюдения, без стражи. Лил сильный дождь; река и ветер шумели, тем более усыпляя казаков...

Трагічная постаць першапраходца «расійскай ідэі» натхніла паэта Рылеева, і з'явіліся магутныя радкі «Ревела буря, дождь шумел...». Тэкст вершаў узяты акурат з гістарычнага «дыскурсу».

Прывяду зараз зусім супрацьлеглы прыклад нашага сучаснага «дзяржаўнага падыходу» да беларускай мінуўшчыны, сярод падзей якой, магчыма, можна было б знайсці колькі гераічных старонак кшталту легенды пра Ярмака. Хаця б тая самая Грунвальдская бітва, якую прысабечылі палякі з літоўцамі (а харугваў з нашага краю было ў той бойцы амаль з 20 гарадоў!), ці бітва пад Оршай.

Так, сучаснае расійскае выдавецтва «Аванта» выпусціла шматтомную энцыклапедыю для дзяцей, дзе ў 5-м томе *«История России и ее соседей»* (1996) пра войны Масковіі і ВКЛ без эўфемізмаў напісана: *«Московско-литовские войны были невероятно ожесточенными. По масштабу и упорству, с которыми они велись, войны эти были одними из самых крупных противостояний в Европе XVI — XVII вв.».*

Вось як ацэньваюць гэты ж гістарычны факт афіцыйныя беларускія гісторыкі (у хаўрусе з адным расійскім суаўтарам!) у навукова-метадычным штоквартальніку «Чалавек. Грамадства. Свет» (№ 3 , 1999), што выходзіць пад патранажам Міністэрства адукацыі РБ і рэкамендаваны як абавязковы метадычны дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства. Цытуючы вышэйпрыведзеную вытрымку з

расійскай дзіцячай энцыклапедыі, інжынеры беларускіх дзіцячых душ у скрусе бядуюць у тры дыдактычныя галасы: «Глубоко трагично, что это солидное издание, цитируемое нами, адресовано молодежи и школьникам...» Як станоўчы прыклад яны згадваюць тыя беларускія падручнікі, у якіх «о войнах упоминается, но они разнесены умело по ряду разделов и параграфов, что дает школьникам определенные знания проблемы, но не вызывает у них сильных психологических и нравственных аффектов, не провоцирует их на недружественные действия в адрес союзного государства».

Вось так: сяброўства з Расеяй — мера ўсіх рэчаў. Атрымліваецца нестыкоўка з ідэяй нацыянальнага суверэнітэту. Хаця як канцэпцыя «гістарычна перспектыўнага развіцця» індывіда ў межах мацнейшай плыні такі падыход мае права на існаванне. Але гэта — ясная пазіцыя чыноўніка, які абавязаны падпарадкоўвацца «единому взгляду на историю», сфармуляванаму аўтарытарным кіраўніком дзяржавы.

Вяртаючыся да «Анталогіі» ў рэцэнзіі «Разбор палётаў», хацеў бы сказаць толькі адно: выходзіць, што вольная мадэрнізаваная думка некаторых публіцыстаў з філасофскім ухілам, што нібыта працуюць у межах беларускага нацыянальнага дыскурсу, аб'ектыўна ў сваіх фрагментах вельмі добра ўпісваецца ў «рускі праект», які працягваецца і па сёння. Для беларускіх дзяцей на пачатку XXI ст. творацца «рускія» міфы ў педагогіцы, мастацтве, гісторыі, палітыцы, культуры, і расце гэты праект «рускага гістарычна перспектыўнага развіцця» не самапасам, не як лес...

АНТЫДЫЯЛОГ МАДЭРНІСТА З ТРАДЫЦЫЯНАЛІСТАМ

Ці прадуктыўна палемізаваць у (пост)мадэрнісцкім дыскурсе пра «беларускасць» ВКЛ, своечасовасць «Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце» і г. д., адрынаючы «старых багоў» ды «ірацыянальнае шаманства»? (Філасофію я тут пакідаю ўбаку.) У падзагалоўку я ўжо акрэсліў свой пункт погляду.

Калі гаварыць вельмі папулярна, я б параўнаў аб'ектывісцкі мадэрны наратыў і традыцыйную мазаічную апісальнасць з рэпам і добрым класічным блюзам. Ружовы мадэрны рэпіст усё ведае, трымае рытм, моцныя долі адпавядаюць працягласцям гукаў, тэкст як бы абсалютна ясны, але без семантычна-пачуццёвых нюансаў... Блюз — нешта іншае. Кажуць, што блюз — гэта калі добраму чалавеку дрэнна, таму — і меланхолія, і мажорна-мінорны лад, і бясконцыя сінкопы.

Аўтар «Разбору палётаў», як сапраўдны рэпіст, канстатуе пустыннасць філасофскай думкі на беларускіх тэрэнах і не бачыць перспектываў для тутэйшых «арыстакратаў з памыйніцы» («Добра, таму што беларускае»), якім не свеціць нічога іншага, як «сваімі сціплымі высілкамі ўрабляць мясцовы грунт ці эміграваць да Дэрыдоў з Ліятарамі».

Дзеля смеху можна было б праілюстраваць «пустату крытычнай дэструкцыі» аглядальніка «Анталогіі», набліжаючыся да метамовы постмадэрнізму і карыстаючыся сафізмам таго ж Жака Дэрыда. Возьмем, напрыклад, вядомы дэрыдоўскі пасаж з энцыклапедыі постмадэрнізму: *«Калі Левінас гаворыць супраць Гегеля, ён толькі пацвярджае Гегеля, ужо яго пацвердзіў».* Другі вядомы прыклад зноў вазьму з лексікону постмадэрністаў, дзе сцвярджаецца, што «стратэгія дэканструкцыі немагчымая без замоўчвання задумы суб'екта-размоўцы»: *«Пры размове з кітайцам адзіным магчымым спосабам зрабіць выгляд, што ты валодаеш кітайскай моваю, з'яўляецца спроба звярнуцца да кітайца на ягонай мове».*

З традыцыйнага інтэлігенцкага пункту погляду аўтар «Разбору палётаў» мае права пагаджацца з тым, хто ўшчэнт разносіць «міф пра беларускую культуру ВКЛ», як і той самы пагромшчык мае права таптаць гэты міф. Пытанне ў другім: хто хоць трохі знаёмы з метамоваю постмадэрнізму, заўважыць, што рэцэнзент спыняецца на паўдарозе. Ён агучыў постмадэрнісцкія імёны, але нават не спрабаваў перад сваімі апанентамі «зрабіць выгляд, што ён валодае кітайскай мовай» (гл. цытату вышэй). Аўтар абсалютна ігнаруе нават матэрыю Розуму таго, каго хваліць. Такіх рэцэнзій можна напісаць за дзень штук дваццаць. А дзе культуралагічныя ды гістарычныя «кантрапункты»? Не

пераняўшы коду свайго апанента паводле Розуму, немагчыма нарадзіць спелы прадукт спрэчкі. На выхадзе атрымаецца прадукт разумовай недастраўнасці.

Пры такой екадумаўскай «адаптацыі» постмадэрнізму застанецца абсалютна зацемненая тая ж славутая дэрыдоўская *«Differance»* (з літарай «а» замест «е») як «агульны корань усіх апазіцыйных сэнсаў, што з'яўляюцца маркерамі нашай мовы». У «нічога» бінарнай апазіцыяй з'яўляецца «ўсё» або хаця б «нешта». Чытаючы «Разбор палётаў», мы чакаем узамен прадакларованага «нічога» ад міфу пра беларускасць ВКЛ таксама мінімальна хаця б «нешта» ад аўтара — але не знаходзім гэтага «нешта».

На заключэнне даволі вядомы анекдот-показка пра Жака Дэрыда. Расказваюць, што пасля таго як дэрыдоўская неаграфема *«Differance»* была ўнесена ў французскі нарматыўны слоўнік як філасофскі тэрмін, ён з гэтай нагоды запрасіў да сябе на вячэру сваю блізкую сяброўку. На вячэры прысутнічала і ягоная маці, якой было на той час больш за 80 гадоў і якая мела не надта добры слых. Сяброўка нешта гаварыла, а потым прапанавала тост за навуковыя поспехі Жака і за *«Differance»* з літарай «а». Маці ўважліва прыслухоўвалася, а потым сярдзіта запытала: «Жакі, ты што, дагэтуль не навучыўся пісаць слушна слова *«difference»* і пішаш яго з літарай «а»?»

Гэты анекдот у постмадэрнісцкім дыскурсе добра прачытваецца наадварот: Жак павінен быў бы перайсці ў знакавую сістэму глухаватай маці, каб быць пачутым, а значыць, хаця б часова прыняць яе папярэднія моўныя «міфы» ды «ірацыянальнасць», каб растлумачыць прадуктыўнасць сваёй неаграфемы.

Мы павінны чуць адно аднаго. Такі вось не вельмі інтэлігенцкі дыскурс атрымліваецца.

[image]
[image]

№ 2 (31) - 2004

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

[image]
ARCHE Пачатак № 2 (31) - 2004
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image]
[image]2004
Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

жменьцы амерыканскіх і кубінскіх (так, кубінскіх!) шпіталяў і лабараторыяў. Яна мае назву «brain imaging» (атрыманне выяваў мозгу), і кожны, хто хоча абудзіцца раненька ды не прапусціць па-сапраўднаму асляпляльнага світанку XXI стагоддзя, павінен не выпускаць яе з поля зроку.

Назва *«brain imaging»* ужываецца ў адносінах да тэхналогій, якія дазваляюць назіраць за тым, як функцыянуе чалавечы мозг, у рэжыме рэальнага часу. Найбольш перадавымі іх формамі на цяперашні момант з'яўляюцца трохмерная электраэнцэфалаграфія, дзе ўжываюцца матэматычныя мадэлі, з астатніх больш вядомае PET-сканаванне (пазітронна-эмісійная тамаграфія), нядаўна паўсталае функцыянальнае магнітна-рэзанансное выяўленне (fMRI), што паказвае ўзоры мазгавога крыватоку, і магнітна-рэзанансная спектраскапія, што вымярае біяхімічныя змены ў мозгу, а таксама яшчэ навейшы від пазітроннай тамаграфіі *PET reporter gene / PET reporter probe* (пазітронна-эмісійная тамаграфія з выкарыстаннем генаў-маркераў), настолькі сучасны, што дасюль мае гэткую даўжэзную грувасткую назву. Апошні від пазітроннай тамаграфіі, што выкарыстоўваўся пакуль толькі на жывёлах і ў некалькіх выпадках з безнадзейна хворымі дзецьмі, дакладна вызначае месцазнаходжанне пэўных генаў і сочыць за іх дзейнасцю. На маніторы сканера насамрэч можна ўбачыць, як яны пачынаюць свяціцца ўнутры мозгу.

Паводле стандартаў 1996 году, гэта звышскладаныя прыстасаванні. Аднак магчыма, што праз дзесяць гадоў яны пададуцца прымітыўнымі ў параўнанні з новымі дзівоснымі акенцамі ў мозг, якія будуць распрацаваныя да таго часу.

Сканаванне мозгу было вынайдзена для мэтаў медыцынскай дыягностыкі. Але нашмат большая яго значнасць у тым, што яно можа практычна пацвердзіць - спосабамі надзвычай дакладнымі, каб іх аспрэчыць, - пэўныя тэорыі пра «дух», «розум», «душу», «асобу» і «свабоду волі», тэорыі, у якія ўжо цяпер цвёрда вераць даследчыкі нейранавукі - сферы, што на цяперашні момант выклікае самую гарачую цікавасць у акадэмічным свеце. Беручы вышэйсказанае да ведама, ужо гэтых скептычных двукоссяў дастаткова, каб насцярожыць каго

заўгодна, але Крайні Скептыцызм - частка святла абяцанага мной світанку.

Нейранавука, навука аб мозгу і цэнтральнай нервовай сістэме, стаіць на парозе выпрацоўкі адзінай тэорыі, якая будзе мець такі ж моцны ўплыў, які меў дарвінізм сотню гадоў таму. Ужо ёсць новы Дарвін, ці, мабыць, варта было б сказаць - абноўлены Дарвін, бо ніхто і ніколі не верыў у Дарвіна больш пераканана, чым ён. Ягонае імя Эдвард О. Уілсан. Ён выкладае заалогію ў Гарвардзе і з'яўляецца аўтарам дзвюх незвычайна ўплывовых кніжак - «Супольнасці насякомых» і «Сацыябіялогія: новы сінтэз»[1]. З улікам ягонай вагі ў нейранавуцы гэта не пустое самахвальства.

Уілсан стварыў новую галіну сацыябіялогіі, даў ёй назву і выказаў яе фундаментальную пасылку ў адным сказе: «Мой кожнага чалавека, кажа ён, пры нараджэнні з'яўляецца чыстай дошкай (tabula rasa), якая чакае таго, каб запоўніцца досведам, а «адзнятым негатывам, які чакае, каб яго праявіць, праяўляльную вадкасць». Можна праявіць негатыў добра або кепска, але ў любым выпадку вы атрымаеце вельмі мала ад таго, што дагэтуль не мела адбітку на стужцы. Гэты адбітак - генетычная гісторыя асобнага індывіда, што ўвабрала ў сябе гадоў эвалюцыі, і з гэтым, бадай, нічога не зробіш. Больш за тое, паводле Ўілсана, генетыка вызначае не толькі рысы кшталту тэмпераменту, ролевых схільнасцяў, эмацыйных рэакцый і ўзроўню агрэсіі, але і шмат што са сферы глыбокашаноўнага маральнага права выбару, якое, як і ў высвятляецца, зусім і не права выбару з гледзішча волі, а тэндэнцыі, што захоўваюцца ў гіпаталамусе і частках галаўнога мозгу, - пра гэта гаворыцца ў кнізе больш шырока раскрытай у кнізе 1993 году, пра якую гаварылі, - «Маральнае пачуццё» Джэймса К. Уілсана (*Заўважым, што гэта* сваякі з Эдвардам О.).

[1] Гэта кніга выйшла ў Мінску ў перакладзе Ігара Цыбульскага.

НЕЙРАНАВУКОВЫ ПОГЛЯД НА ЖЫЦЦЁ

Гэты самы нейранавуковы погляд на жыццё ўжо стаўся стратэгічнай вышынёй у акадэмічным свеце, і змаганне за яго даўно вылілася далёка за межы навуковых дысцыплінаў і,

адпаведна, на шырокую публіку. Як ліберaлы, так і кансерватары без усялякіх навуковых схільнасцяў спрабуюць захапіць тэрыторыю. Напрыклад, рух за правы гомасексуалістаў ухапіўся за даследаванне, што было апублікаванае ў ліпені 1993 году шматпаважаным Дынам Хамэрам з Нацыянальнага інстытуту аховы здароўя і абвяшчала пра адкрыццё «гену гомасексуалізму». Відавочна, калі гомасексуальнасць з'яўляецца генетычна абгрунтаванай рысай, кшталту леварукасці або карых вачэй, любыя законы і санкцыі супраць яе - гэта спробы забараніць Прыроду.

Кансерватары тым часам трымаюцца за даследаванні, якія пацвярджаюць, што мужчынскі і жаночы мозг змайстраваныя, дзякуючы даўжэзнаму пакручастаму шляху эвалюцыі, нагэтулькі па-рознаму, што фемінісцкія спробы адкрыць для жанчын традыцыйна мужчынскія ролі - гэта тое самае: загадзя асуджанае парушэнне законаў Прыроды.

Сам Уілсан у выніку апынуўся ў праблемах па самыя вушы... ён папаў пад добры халодны душ. У прыватным жыцці Ўілсан - звычайны ліберал, паліткарэктны, як кажуць, - заклапочаны рознымі экалагічнымі праблемамі і ўсякімі такімі рэчамі. Аднак ён сказаў, што *«навязванне падобных ролевых рысаў»* мужчынам і жанчынам

кідае выклік тысячагоддзям, на працягу якіх сысуны выказвалі моцную тэндэнцыю да падзелу працы згодна з полавай прыналежнасцю. Паколькі такі падзел працы стала прасочваецца ад паляўніча-збіральніцкіх да сельскагаспадарчых і індустрыяльных грамадстваў, гэта гаворыць пра генетычнае паходжанне. Мы не ведаем, калі гэтая рыса развілася ў працэсе чалавечай эвалюцыі або наколькі ўстойлівай выявіцца яна перад працяглым і справядлівым націскам патрабаванняў забяспечыць правы чалавека.

Пра «ўстойлівасць» казаў Дарвін II, нейрадаследчык. «Справядлівым» націск называў паліткарэктны гарвардскі ліберал. Тым не менш, яму бракавала і ліберальнасці, і паліткарэктнасці. Абураныя феміністкі запаланілі канферэнц-

залу, дзе выступаў Уілсан, шухнулі яму на галаву збан ледзяной вады, з кубікамі лёду і ўсім, чым трэба, і пачалі скандаваць: «Сеў у лужыну! Сеў у лужыну!» Найбольш уплывовая феміністка Амерыкі, Глорыя Стэйнэм, пайшла на тэлебачанне і ў інтэрв'ю Джону Стосэлу з Эй-Бі-Сі настойліва запатрабавала, каб даследаванні па вывучэнні генетычных адрозненняў у будове мужчынскай і жаночай нервовых сістэм былі зараз жа спыненыя.

Аднак, як выявілася, гэта ўсё былі кветачкі ў параўнанні з палітычнай панікай, што ўсчалася з нагоды нейранавукі. У лютым 1992 году Фрэдэрык К. Гудвін, вядомы псіхіятр, старшыня федэральнае Ўправы па праблемах алкагалізму, злоўжывання наркотыкамі ды псіхічнага здароўя і спраўджаны мужлан у сферы public relations, зрабіў пагібельную памылку падчас публічнага выступу ў Вашынгтоне. Ён распавёў пра «Ініцыятыву па барацьбе з гвалтам», праграму Нацыянальнага інстытуту псіхічнага здароўя, якой на той час было дзесяць год. Гэта была эксперыментальная праграма, што мела на мэце пацвердзіць наступную гіпотэзу: як і сярод малпаў у джунглях (Гудвін адзначыўся сваімі даследаваннямі малпаў), здзяйсняльнікамі шмат якіх злачынстваў з нанясеннем цялесных пашкоджанняў у Злучаных Штатах была адносна невялікая колькасць маладых асобін мужчынскага полу, генетычна да гэтага схільных; карацей, запраграмаваных на злачынствы з ужываннем сілы. Тамака ў джунглях, сярод найбліжэйшых сваякоў чалавека ў жывёльным свеце - шымпанзэ, выглядала на тое, што практычна ўсе жорсткія забойствы і фізічныя здзекі з самак здзяйсняліся жменькай генетычна сапсаваных маладых самцоў. А што, калі б тое самае было справядліва ў дачыненні да людзей? Што, калі б высветлілася, што ў кожнай асобна ўзятай групе насельніцтва статыстыку крыміналу з ужываннем гвалту падымае на такі высокі ўзровень тая самая жменька маладых самцоў з атручанай ДНК? «Ініцыятыва па барацьбе з гвалтам» прадбачыла магчымасць, па-першае, выяўлення гэтых асобаў - калі-небудзь, як-небудзь, якім-небудзь чынам - яшчэ ў дзяцінстве і, па-другое, тэрапеўтычнага ўздзеяння на іх лекамі. Магчыма, зазначыў Гудвін, выраз «джунглі Амерыкі» ў дачыненні да краіны, што пакутуе ад злачыннасці, - больш чым

зацёртая метафара.

Гэта было ўсё. Верагодна, гэта было найвялікшае глупства, што зляцела з вуснаў амерыканскай афіцыйнай асобы ў 1992 годзе. Крык абурэння не прымусіў сябе чакаць. Эдвард Кенэдзі, сенатар ад штату Масачусэтс, і Джон Дынгел, кангрэсмен ад штату Мічыган (яго, як выявілася пазней, ахоплівала шаленства, калі справа датычыла навуковых праектаў), не толькі асудзілі выказванні Гудвіна, назваўшы іх расісцкімі, але таксама вынеслі свой навуковы вердыкт: вынікі даследавання прыматаў - «недарэчныя падставы» для аналізу чагосьці нагэтулькі складанага, як «злачыннасць і гвалт, што не даюць сёння спакою нашай краіне». (Гэта з'явілася нечаканай навіной для навукоўцаў NASA, якія першымі падрыхтавалі і адправілі ў субарбітальны касмічны палёт шымпанзэ па мянушцы Хэм на ракеце «Рэдстоўн», а потым падрыхтавалі і адправілі яшчэ аднаго, па мянушцы Энас («чалавек» у перакладзе з грэцкай), у арбітальны віток вакол Зямлі на ракеце «Атлас» і такім чынам дакладна і поўна прадказалі фізічныя, псіхалагічныя і праблемна-маторныя рэакцыі людзей-астранаўтаў - Алана Шэпарда і Джона Глена, якія паўтарылі палёты і заданні шымпанзэ некалькімі месяцаўмі пазней.) «Ініцыятыву па барацьбе з гвалтам» параўноўвалі з нацысцкімі еўгенічнымі[2] праектамі па вынішчэнні непажаданых. Калега Дынгела па штаце Мічыган, кангрэсмен Джон Кон'ерз, на той час старшыня Камітэту па ўрадавай дзейнасці і заслужаны сябар фракцыі Кангрэсу, якая аб'ядноўвае афраамерыканцаў, запатрабаваў адстаўкі Гудвіна і праз два дні яе атрымаў, тым часам як урад у асобе Міністэрства аховы здароўя сцвердзіў, што «Ініцыятывы» ніколі нават не існавала. Карыстаючыся тэрмінам Оруэла, яна знікла ў дзірцы памяці.

На май 1993 году ў Мэрылендскім універсітэце была запланаваная канферэнцыя крымінолагаў і навукоўцаў іншых сфераў, зацікаўленых у нейралагічных даследаваннях, якія былі на той момант праведзеныя «Ініцыятывай па барацьбе з гвалтам», - канферэнцыя, што часткова мусіла пакрыцца грантам Нацыянальнага інстытуту аховы здароўя (НІАЗ). Канферэнцыя таксама пайшла на дно, Інстытут утаймаваў тое кацянё. Летась Дэвід Васэрман, навуковец-юрыст Мэрылендскага ўніверсітэту, паспрабаваў зноўку скінуцца

[2] Еўгеніка - навука, якая ставіць сабе за мэту паляпшэнне генетычнага складу чалавецтва шляхам селекцыі.

рушэнне, хай сабе і ў амаль схаванай ад чалавечага вока, толькі тым, пасялушцы пад назвай Квінстаўн, у смужна-балоцістай хаці здольны глухмені акругі Квін-Энз на ўсходнім узбярэжжы штату выхаваць Мэрыленд. НІАЗ, пацвярджаючы, што ўрокі ён засвоіў ядаровых і цяжкасцю, маўкліва выдаткаваў 133 тысячы даляраў на гэтыя ў залу мерапрыемства, аднак толькі пасля таго, як Васэрман пацвярджаў дзяцей, засцерагчыся ад магчымых нечаканасцяў, запрасіўшы і тых навукоўцаў, якія адмаўлялі магчымасць генетычнага паходжання злачыннасці, і паставіўшы ў расклад своеасаблівы сеанс халоднага душу - пасяджэнне, прысвечанае размове пра грахі, учыненыя еўгенічным рухам на пачатку XX стагоддзя. Усё дарма, хлопцы! Войска пратэстных адшукала перапалоханых бедакоў нават тут і ўварвалася ў залу, скандуючы: «Мэрылендская канферэнцыя, вам не схавацца - мы ведаем, вы дамагаецеся генацыду!» Прайшло дзве гадзіны, пакуль яны дастаткова знудзіліся, каб пакінуць залу, і канферэнцыя скончылася татальнай блытанінай, тым часам як вышэйзгаданая адмыслова мабілізаваная для падстрахоўкі фракцыя выдала заяву, дзе было сказана: «Даследчыкі з галінаў дакладных навук, гэтаксама як і гісторыкі ці сацыёлагі, не павінны дазваляць сабе надаваць акадэмічную рэспектабельнасць расысцкай псеўданавуцы». Сёння ў НІАЗ выраз «Ініцыятыва па барацьбе з гвалтам» - табу. Цяперашні момант нагадвае той час у Сярэднявеччы, калі каталіцкі касцёл забараніў анатаміраванне чалавечых целаў з боязі, што знойдзенае ўнутры можа выклікаць сумнеў у хрысціянскай дактрыне, што Бог стварыў чалавека на ўласны вобраз і падабенства.

Яшчэ больш радыеактыўна небяспечным з'яўляецца пытанне інтэлекту, што вымяраецца тэстамі IQ. Прыватна - мала хто хоча казаць пра гэта ўголас - пераважная большасць нейранавукоўцаў вераць, што генетычны складнік інтэлекту асобы надзвычайна высокі. Вашыя разумовыя здольнасці можна палепшыць з дапамогай дасведчаных і адданых сваёй справе настаўнікаў або затрымаць у развіцці праз кепскае выхаванне, то бок негатыў можна праявіць добра або кепска, але насамрэч найбольшае значэнне маюць гены. Нядаўні скандал з нагоды кнігі Чарлза Мюрэя і Рычарда Хернштэйна «Звонападобная крывая» - мабыць, толькі пачатак крыўдаў, якія яшчэ прынясе

гэтае пытанне.

Паводле нейранавукоўцаў, з якімі я размаўляў, не так даўно фірма «Neurometrics» знайшла інвестараў і паспрабавала правесці на рынак дзівосную і ў той самы час простую вынаходку, вядомую як «шапачка IQ». Задума была ў тым, каб стварыць такі спосаб праверкі інтэлекту, які быў бы вольны ад «культурнай прадузятасці», спосаб, які б не прымушаў нікога мець справу са словамі або паняццямі, якія могуць быць знаёмыя прадстаўнікам адной культуры, але незнаёмыя прадстаўнікам іншай. «Шапачка IQ» запісвала толькі хвалі галаўнога мозгу, тым часам як камп'ютэр (а не чалавек - арганізатар тэсту, магчыма, небесстаронні) аналізаваў вынікі. Падставай паслужыла праца нейранавукоўцаў, такіх, як Э. Роя Джона I, аднаго з галоўных піянераў электраэнцэфалаграфічных даследаванняў мозгу, Дуільё Джанітрапані, аўтара «Электрафізіялогіі інтэлектуальных функцый», і Дэвіда Робінсана, аўтара працы «Шкала інтэлекту Ўэкслера для дарослых: Да біялагічна абумоўленай тэорыі інтэлекту і пазнання», і шмат якія іншыя манаграфіі, вядомыя сярод нейранавукоўцаў. Я размаўляў з адным даследчыкам, які сам распрацаваў «шапачку IQ», паўтарыўшы эксперымент, апісаны Джанітрапані ў «Электрафізіялогіі інтэлектуальных функцый». Гэта быў нескладаны працэс. Вы прымацоўвалі шаснаццаць электродаў да скуры галавы таго, каго збіраліся тэставаць. Валасы пры гэтым даводзілася трохі ўскудлаціць, аднак іх не трэба было стрыгчы, ужо не кажучы пра тое, каб галіць. Потым чалавека прасілі некаторы час пільна ўглядацца ў метку на пустой сцяне. Канкрэтна гэты даследчык карыстаўся ў якасці меткі ярка-малінавай кнопкай. Потым вы паварочвалі тумблер. Праз шаснаццаць секунд камп'ютэр выдаваў дакладнае прадказанне (у межах 0,5 стандартнага адхілення) выніку, які дадзены суб'ект паказаў бы паводле шкалы інтэлекту Ўэкслера ці, у выпадку з дзецьмі, паводле шкалы інтэлекту Ўэкслера для дзяцей - усё коштам шаснаццацісекуднага вымярэння мазгавых імпульсаў. У тэсце не было аніякай культурнай прадузятасці. Што можа быць культурнага ў тым, каб пасядзець, утаропіўшыся ў кнопку? Эканомія ў грошах і часе была ашаламляльная. Выкананне традыцыйнага тэсту IQ займала дзве гадзіны, а накладныя

выдаткі (аплата тых, хто рыхтаваў тэсты, праводзіў і падлічваў вынікі, ды арэнда памяшканняў) складалі найменш 100 даляраў за гадзіну. Для «шапачкі IQ» патрабавалася недзе пятнаццаць хвілін шаснаццаць секунд (пятнаццаць хвілін займала падлучэнне электродаў да галавы) і каля адной дзесятай пенса для аплаты электрычнасці. Інвестары «Neurometrics» паціралі рукі і аблізваліся. Яны вось-вось мусілі зарабіць процьму грошай.

Аднак - ніхто не схацеў іхняй гнюснай шапачкі!

Не тое каб ніхто не паверыў, што можна атрымаць вынік IQ з мазгавых імпульсаў, - ніхто *не хацеў* верыць, што гэта магчыма. Ніхто не хацеў верыць, што чалавечыя разумовыя здольнасці ажно нагэтулькі... запраграмаваныя. Ніхто не хацеў у вокамгненне даведацца, што... вынік гульні вядомы загадзя, што ўсё вырашае генетыка. Ніхто не хацеў даведацца, што ён... генетычна запраграмаваная пасрэднасць... і што найлепшае, на што ён можа спадзявацца ў гэтай Прорве Памылкі Прыроды, - гэта без стрэсу пражыць сваё пасрэднае жыццё ў якасці цьмянай лямпачкі. Бары Стэрман з Каліфарнійскага ўніверсітэту ў Лос-Анджэлесе, галоўны навуковы супрацоўнік фірмы пад назвай «Cognitive Neurometrics», які распрацаваў на падставе мазгавых імпульсаў уласную тэхналогію для даследавання рынку і фокус-групаў, лічыць тэставанне IQ праз мазгавыя імпульсы магчымым, аднак у святле цяперашняй сітуацыі «няма нават мізэрных шанцаў атрымаць грант» пад яго развіццё.

НАВУКА - СУД БЕЗ ПРАВА НА АБСКАРДЖАННЕ

Тут пачынае адчувацца мароз, што ідзе па скуры ад рэзанансу вакол галіны, якая выклікае такую гарачую цікавасць у навуковым свеце. Нявыказаная і шмат у чым несвядомая падстава для жорсткіх сутычак вакол стратэгічных тэмаў нейралогіі наступная: мы жывём у эру, калі навука - гэта суд без права на абскарджанне. І праблема гэтым разам, пры канцы XX стагоддзя, - не эвалюцыя відаў, што падаецца справай далёкай, а прырода нашага дарагога ўнутранага «я».

Старэйшыны галіны, такія, як Уілсан, добра гэта ўсведамляюць

і паводзяць сябе асцярожна, прынамсі ў параўнанні з новым пакаленнем. Уілсан дагэтуль пакідае ў запасе магчымасць - як я мяркую, ён у гэтым сумняваецца, аднак усё ж пакідае ў запасе магчымасць, - што на нейкім этапе ў гісторыі эвалюцыі культура пачала ўплываць на развіццё чалавечага мозгу спосабам, які нельга патлумачыць, строга трымаючыся тэорыі Дарвіна. Але новае пакаленне нейранавукоўцаў не мае асцярожнасці ні на каліва. У прыватных размовах, шчырых гутарках «як мужчына з мужчынам», што ствараюць духоўную атмасферу любой папулярнай новай галіны навукі, - а я люблю гутарыць з такімі людзьмі - яны выказваюць бескампрамісны дэтэрмінізм.

Яны пачынаюць з найбольш вядомага выказвання ў новай філасофіі, Дэкартавага «Cogito ergo sum» - «Я думаю, значыць, я існую», у якім бачаць сутнасць дуалізму, старамоднага ўяўлення аб тым, што сам дух (розум) з'яўляецца чымсьці адрозным ад яго апарату - мозгу і цела. (Да другога вельмі слыннага выказвання я дабяруся праз хвілінку.) Таксама гэта вядома ў якасці сафізму «прывід у машыне», своеасаблівага пераканання ў тым, што недзе ў мозгу знаходзіцца нейкая духоўная «ўнутраная сутнасць», якая тлумачыць яго аперацыі і імі кіруе. Нейролагі, што маюць справу з трохмернай электраэнцэфалаграфіяй, скажуць вам, што ў мозгу няма ніводнага месца, дзе размешчана свядомасць ці самасвядомасць («Cogito ergo sum»). Гэта ўсяго толькі ілюзія, створаная дапасаванымі міжсобку дзеяннямі мяшанкі неўралагічных сістэм. Аднак маладое пакаленне пасоўваецца яшчэ на крок далей. Паколькі свядомасць і мысленне - гэта ўсяго толькі прадукты вашага мозгу і нервовай сістэмы - і паколькі мозг з'яўляецца гатовым адбіткам пры нараджэнні, - з чаго гэта вы ўзялі, што існуе такая рэч, як свабода волі? Які «дух», які «розум», якая «асоба», якое «ўласнае «я», якая «душа», якое - што заўгодна, што не будзе адразу ж схопленае ў гэтае пагардлівае двукоссе, - раптам вынырне са ствала галаўнога мозгу, каб вам тую свабоду волі даць? Я чуў разважанні нейранавукоўцаў адносна таго, што пры наяўнасці камп'ютэраў адпаведнай моцы і складанасці было б магчыма прадказаць усё жыццё любой чалавечай істоты, момант за момантам, уключна з тым фактам, што бядак недаверліва пакруціць галавой пры

адной думцы пра такое. Сумняваюся, што які-небудзь кальвініст XVI стагоддзя калі-небудзь верыў у наканаванне нагэтулькі моцна, як гэтыя гарачыя і глыбока рацыянальныя маладыя навукоўцы са Злучаных Штатаў канца XX-га.

Пачынаючы з канца 70-х, у эру Ўілсана, студэнты гуртам кіруюцца ў нейранавуку. У 1970 годзе, калі было заснаванае Таварыства нейранавукі, яно налічвала 1 100 сяброў. Сёння, адным пакаленнем пазней, колькасць сяброў перавышае 26 000. Апошні з'езд таварыства ў Сан-Дыега сабраў 23 052 чалавекі, стаўшы адным з найвялікшых прафесійных з'ездаў у краіне. У паважанай і старажытнай галіне акадэмічнай філасофіі малады выкладчыцка-прафесарскі склад пакідае карабель у непрыстойнай колькасці і пераключаецца на нейранавуку. Яны скіроўваюцца ў лабараторыі. Навошта біцца з кантаўскім Богам, Свабодай і Несмяротнасцю, калі нейралогія вось-вось - гэта толькі справа часу, - магчыма, праз тэхналогіі атрымання выяваў мозгу, раскрые сапраўдны фізічны механізм, што дасылае гэтыя ментальныя канструкты, гэтыя ілюзіі, па нэйронных ланцужках у зоны Брока і Верніке?

Гэта і прыводзіць нас да другога найбольш вядомага ў новай філасофіі выказвання: «Бог памёр» (Ніцшэ, 1882 год, з кнігі «Die Frohliche Wissenschaft» - «Вясёлая навука»). Ніцшэ казаў, што ягонае выказванне - не дэкларацыя атэізму - хоць ён-такі быў атэістам, - а проста навіна аб здарэнні. Ён назваў гэтую смерць Бога «надзвычайнай падзеяй», найвялікшай падзеяй новай гісторыі. Навіной было тое, што адукаваныя людзі болей не верылі ў Бога ў выніку пашырэння за папярэднія 250 год рацыяналізму і навуковага мыслення, з дарвінізмам уключна. Аднак вы, атэісты, сказаў ён, перш чым уздымаць трыумфальныя сцягі, падумайце пра наступствы. «Гісторыя, якую я збіраюся распавесці, - пісаў Ніцшэ, - гэта гісторыя наступных двух стагоддзяў». Ён прадказаў (у «Ecce Homo»), што XX стагоддзе будзе эпохай «такіх войнаў, якіх яшчэ не здаралася на зямлі», катастрафічнасць якіх не паддаецца ўяўленню. Але чаму? Таму што людзі больш не мецьмуць Бога, які б дараваў ім правіны, але будуць пакутаваць ад пачуцця віны, бо пачуццё віны выхоўваецца ў дзецях, калі яны яшчэ вельмі малыя, дасвядомага веку. У выніку людзі ўзненавідзяць

не толькі адно аднаго, але і саміх сябе. Сляпая і суцяшальная вера, якую яны раней аддавалі Богу, сказаў Ніцшэ, цяпер будзе аддадзеная варварскім нацыяналістычным брацтвам. «Калі дактрыны... пра адсутнасць нейкіх кардынальных адрозненняў паміж чалавекам і жывёлай, дактрыны, якія я лічу праўдзівымі, але смяротна небяспечнымі, - кажа ён з алюзіяй на дарвінізм у «Нясвоечасовых разважаннях», - будуць шпурляць у людзей цягам яшчэ аднаго пакалення... то нікога не павінна дзівіць, калі ... на арэне будучыні з'явяцца ... брацтвы, што маюць сваёй мэтай рабаванне і эксплуатацыю тых, хто да іх не належыць».

Ніцшэанскае разуменне віны, дарэчы, таксама супадае з нейралагічным разуменнем, што склалася стагоддзем пазней. Нейранавукоўцы разглядаюць пачуццё віны як адну з тэндэнцый, што маюць адбітак у мозгу ўжо пры нараджэнні. У выпадку з некаторымі людзьмі генетычная праца прарабленая не да канца, і яны робяцца злачынцамі без ценю раскаяння - а потым імі цікавяцца крымінолагі, ствараюцца розныя «Ініцыятывы па барацьбе з гвалтам» ды ладзяцца канферэнцыі на гэтыя тэмы.

Ніцшэ сказаў, што чалавецтва пракульгае праз XX стагоддзе «дзякуючы ўбогім рэшткам» старых і спарахнелых маральных прынцыпаў, што грунтаваліся на веры ў Бога. Аднак пасля, у XXI, настане час, страшнейшы за ўсе вялікія войны, час «поўнага зацьмення каштоўнасцяў» (у «Волі да ўлады»). Разам з тым той час мае зрабіцца шалёнай эпохай «пераацэнкі», калі людзі спрабаваць муць адшукаць новыя сістэмы каштоўнасцяў, каб замяніць імі сатлелыя шкілеты старых. Аднак ім гэта не ўдасца, папярэдзіў ён, бо нельга верыць у маральныя законы, не верачы адначасова ў Бога, што скіроўвае на цябе свой пагрозлівы перст і кажа: «Рабі так» або «Не рабі гэтага».

Нашто нам трывожыцца дзеля прыцягнутага за вушы жахлівага папярэджання пра «поўнае зацьменне ўсіх каштоўнасцяў»? Мяркую, дзеля паслужнога спісу чалавецтва. Урэшце, у Еўропе, у мірнае дзесяцігоддзе 1880-х, прадказанне аб сусветных войнах XX стагоддзя і варварскіх брацтвах нацызму і камунізму мусіла здавацца яшчэ больш ненатуральным. Ecce vates! Ecce vates! Вось яно, прадказанне! Колькі яшчэ доказаў праройцкай

моцы чалавека вам патрэбна?

Стагоддзе таму тыя, хто перажываў з-за смерці Бога, маглі суцяшаць адно аднаго тым, што яны па-ранейшаму маюць уласныя бліскучыя ўнутраныя «я» ды ўласныя недатыкальныя душы, дзякуючы якім захоўваецца маральная раўнавага, а цуды сучаснай ім навукі акрэсліваюць іхні шлях. Аднак як быць, калі высветліцца - а гэта выглядае цалкам праўдападобным, - што найвялікшым цудам сучаснай навукі з'яўляецца тэхналогія атрымання выяваў мозгу? І што калі праз дзесяць год гэтая тэхналогія давядзе, не пакідаючы ніякай магчымасці сумневу, што не толькі Эдвард Уілсан, але і маладое пакаленне мела рацыю?

Старэйшыны кшталту самога Ўілсана і Дэніэла Дэнэта, аўтара кнігі «Небяспечная ідэя Дарвіна: эвалюцыя і значэнне жыцця», а таксама Рычарда Докінса, што напісаў «Эгаістычны ген», сцвярджаюць, што няма чаго баяцца праўды, няма чаго баяцца максімальнага пашырэння небяспечнай ідэі Дарвіна. Яны прыводзяць элегантныя аргументы адносна таго, што нейранавука ніякім чынам не зможа прынізіць багацця жыцця, чароўнасці мастацтва ці высакароднасці дзяржаўных інтарэсаў, уключна з паліткарэктнасцю ў Гарвардзе, Тафтсе, дзе Дэнэт з'яўляецца дырэктарам Цэнтру кагнітыўных даследаванняў, або Оксфардзе, дзе Докінс мае нейкую пасаду пад назвай «прафесар грамадскага разумення навукі». (Дэнэт і Докінс, не менш за Ўілсана, з'яўляюцца з галавы да ног, шчыра і аддана, паліткарэктнымі.) Тым не менш, нягледзячы на ўсе іхнія намаганні, нейранавука выплюхваецца ў народ не на хвалі навуковага падбадзёрвання. Выплюхваецца з вялікай хуткасцю. Выснова, якую робяць людзі па-за сценамі лабараторый: «Вынік вядомы загадзя! Мы ўсе запраграмаваныя!» Гэтая, і яшчэ адна: «Не вінаватая я! Мяне запраграмавалі з памылкай!»

АД ВЫХАВАННЯ ДА ПРЫРОДЫ[3]

Раптоўнае пераключэнне з веры ў Выхаванне ў выглядзе сацыяльнай абумоўленасці на веру ў Прыроду ў выглядзе

генетыкі і фізіялогіі мозгу ёсць, карыстаючыся выразам Нуйкі, зрымаўцы велізарнай інтэлектуальнай падзеяй XX стагоддзя. Да цяперашняга моманту найбольш уплывовымі ідэямі стагоддзя былі тэорыі марксізму і фрайдызму. Абедзве грунтавалі сярод пасылцы, якая сцвярджала, што чалавечыя істоты і іхнія «ідэалы» - Маркс і Фройд таксама ўмелі карыстацца цалкам фармуюцца асяроддзем. Для Маркса ключавым асяроддзем быў сацыяльны клас асобы; «ідэалы» і «вераванні» былі паняткамі, якія вышэйшыя станы навязалі ніжэйшым у якасці інструментаў сацыяльнага кантролю. Для Фройда ключавым асяроддзем была Эдыпава драма, несвядомы сексуальны сюжэт, што разыгрываўся ў сям'і на раннім этапе жыцця дзіцяці. «Ідэалы» і «вераванні», што вы гэтак высока цэніце, - усяго толькі мэбля ў зале, якую ставяць, каб прымаць гасцей, сказаў Фройд; а я пакажу вам сутарэнні, печ, трубы, тое сексуальнае паліва, што насамрэч агравае гэты дом. У сярэдзіне 1950-х нават антымарксісты і антыфрайдысты прызналі цэнтральную ролю класавага дамінавання і абумоўленых эдыпавым комплексам сэксуальных жаданняў. Да гэтага ўсяго дадаваўся Паўлаў з ягонай сувяззю «стымул-рэакцыя» і Б. Ф. Скінэр з ягонай «аперантнай абумоўленасцю», што ператварыў прымат абумоўленасці ў нешта блізкае да дакладнага машынабудавання. Дык якім жа чынам гэтая бліскучая інтэлектуальная мода гэтак раптоўна і бясслаўна скончылася?

Прычына заняпаду фрайдызму хаваецца ў адным-адзіным слове: літый. У 1949 годзе аўстралійскі псіхіятр Джон Кейд прызначыў пяцідзённую тэрапію прэпаратамі літыю - з зусім іншых прычынаў - 50-гадоваму псіхічна хвораму, які быў нагэтулькі маніякальна-дэпрэсіўна настроены, гіперактыўны, незразумелы і непадкантрольны, што папярэднія дваццаць гадоў мусіў правесці ў вар'ятнях. На шосты дзень, дзякуючы назапашаным у ягонай крыві солям літыю, ён зрабіўся нармальным чалавекам. Яшчэ праз тры месяцы яго выпусцілі, і з таго часу ён жыў доўга і шчасліва ва ўласным доме. Гэта быў чалавек, якога два дзесяткі гадоў трымалі пад замком і дзяўблі фрайдысцкай балбатнёй без усялякай карысці. На працягу наступных дваццаці год антыдэпрэсанты і транквілізатары цалкам замянілі фрайдысцкую гаварыльню як сродак лячэння

Зніўвага прыкладзіцы.

сур'ёзных разумовых расстройстваў. К сярэдзіне 1980-х нейролагі лічылі фройдаўскую псіхіятрыю нейкім дзіўным рэліктам, заснаваным збольшага на забабонах (гэткіх, як аналіз сноў - аналіз сноў!), кшталту фрэналогіі або месмерызму. Праўду кажучы, сярод нейранавукоўцаў фрэналогія цяперака мае вышэйшую рэпутацыю, чым фройдаўская псіхіятрыя, бо фрэналогія, у пэўным сэнсе, выявілася папярэдніцай электраэнцэфалаграфіі. Псіхіятры-фрайдысты ўспрымаюцца цяпер як старыя ашуканцы з шарлатанскімі дыпломамі, якіх людзі, што маюць больш грошай, чым здаровага сэнсу, наймаюць, каб апавядаць ім пра свае праблемы.

Марксізм быў дабіты яшчэ больш раптоўна - за адзін год, у 1973-м, калі быў патаемна вывезены з Савецкага Саюзу і апублікаваны ў Францыі першы з трох тамоў «Архіпелагу ГУЛАГ» Аляксандра Салжаніцына. Іншыя пісьменнікі, асабліва брытанскі гісторык Робэрт Конквэст, ужо апавядалі пра вялізную сетку канцэнтрацыйных лагераў Савецкага Саюзу, аднак іхнія працы збольшага былі заснаваныя на сведчаннях палітычных уцекачоў, а ўцекачы традыцыйна не браліся пад увагу, бо лічыліся прадузятымі і ўзлаванымі сведкамі. Салжаніцын, з іншага боку, быў савецкім грамадзянінам, дагэтуль пражываў на савецкай тэрыторыі, сам адзінаццаць гадоў быў зэкам. За дакладнасць ягоных сведчанняў паручыўся не хто іншы, як Мікіта Хрушчоў, які ў 1962 годзе дазволіў публікацыю «Аднаго дня Івана Дзянісавіча», навелы пра ГУЛАГ, з мэтай зменшыць застрашальны цень свайго папярэдніка Сталіна. «Так, - напраўду сказаў Хрушчоў, - тое, што распавёў гэты дзядзька Салжаніцын, праўдзіва. Такія былі злачынствы Сталіна». Салжаніцынскае кароткае літаратурна-мастацкае апісанне савецкай сістэмы рабства рабіла ўражанне. Але «Архіпелаг ГУЛАГ», дакументальны аповед на дзве тысячы старонак пра сістэматычнае вынішчэнне савецкай камуністычнай партыяй сваіх ворагаў, сапраўдных і ўяўных, уласных грамадзянаў, дзесяткаў тысяч людзей, якіх спусцілі ў вялізную, адладжаную, бюракратычна кантраляваную «чалавечую каналізацыю», як яе назваў Салжаніцын, - «Архіпелаг ГУЛАГ» меў знішчальны эфект. Урэшце, гэта было стагоддзе, у якім болей не было месца для акружных ідэалагічных шляхоў, што праходзілі б праз канцлагеры. У

еўрапейскім інтэлектуальным асяроддзі, нават у асяроддзі французскіх інтэлектуалаў, марксізм як духоўная сіла паў адразу. Іроніяй лёсу, ён праіснаваў даўжэй у Злучаных Штатах, пакуль не атрымаў апошняга, завяршальнага ўдару 9 лістапада 1989 году, калі пралом у Берлінскай сцяне беспамылкова сцвердзіў, якім разгромам абярнуўся савецкі пазалабараторны сацыялістычны эксперымент працягласцю ў 72 гады. (Марксізм, дэманструючы цуды акрабатыкі, дагэтуль ледзь-ледзь ліпее ў амерыканскіх універсітэтах у маньерыстычнай форме, вядомай пад назвай дэканструктывізму - літаратурнай дактрыны, якая паказвае мову як падступны сродак, што ўжываецца моцнымі гэтага свету, каб падманваць пралетарыят ды сялянства.)

Фрайдызм і марксізм - а з імі і ўсялякі давер да сацыяльнай абумоўленасці - былі знішчаныя нагэтулькі імгненна, нагэтулькі раптоўна, што нейранавука хлынула на іх месца, нібыта ў інтэлектуальны вакуум. Не абавязкова быць навукоўцам, каб гэта адчуць.

Кожны, хто мае дзяцей школьнага веку, цудоўна ведае ўсе прыкметы такога наплыву. Мае дзеці ходзяць у школу, дзе ім кожнай здзіўляе вера, якой сённяшнія бацькі - гэтае вар'яцтва пачалося недзе ў 1990 годзе - адорваюць псіхолагаў, што ставяць іх дзецям дыягназ ADD або AD/HD - сіндром гіперактыўнасці і дэфіцыту ўвагі[4]. Не аспрэчваю: я зусім не ведаю, ці сапраўды гэты «сіндром» - аб'ектыўная, фізічная, неўралагічна абумоўленая характарыстыка стану здароўя, аднак на сённяшнім этапе развіцця нейранавукі гэтага не ведае ніхто. Сіндром ці не, гэтай уяўнай хваробы заўжды аднолькавыя. Дзіця - звычайны, хлопчык: у сарака дзевяці выпадках з пяцідзесяці гэта хлопчык - не можа засяродзіцца на занятках, ёрзае на сваім месцы, не слухае тлумачэнняў настаўніка, замінае аднакласнікам падчас урокаў і кепска вучыцца. Трохі раней яго прымушалі слухаць тлумачэнні настаўніка, старанней працаваць, праяўляць самадысцыпліну. Бацькам, ахопленым інтэлектуальным кліматам 1990-х, такі падыход падаецца занадта жорсткім: праблема майго хлопчыка ў тым, што... яго кепска запраграмавалі! Няшчасненькае малое - вынік гульні быў вядомы ад нараджэння! Бацькі нязменна скардзяцца: «Усё, што ён хоча рабіць, - гэта сядзець перад тэлевізарам і глядзець

[4] У нейкай ІМТ, мабыць, ці ў нейкай *Зауага* *прыкмеце*.

мульцікі ды гуляць у камп'ютэрныя гульні!» Колькі часу? «Колькі часу? Ды гадзінамі запар!» Гадзінамі запар... як вам скажа нават малады нейранавуковец, так, хлопчык, магчыма, і мае праблему, аднак гэта яўна не дэфіцыт увагі.

Тым не менш, па ўсёй Амерыцы мы назіраем, як цэлае пакаленне маленькіх хлопчыкаў, дзесяткі тысяч, шпігуюць чароўнай зброяй супраць ADD - рыталінам (Ritalin - фірмовая назва кампаніі CIBA-Geneva для стымулятару метылфенідату). Упершыню я сутыкнуўся з рыталінам у 1966 годзе ў Сан-Францыска, робячы даследаванне для кніжкі пра псіхадэлічны рух, або рух хіпі. Пэўны падвід хіпі быў вядомы пад назвай «Speed Freak», «спідачудзікаў» (наркаманаў, што сядзелі на «спідзе», наркотыку з групы стымулятараў. - **Заўвага перакладчыцы.**), і пэўная варыяцыя спідачудзікаў была вядомая як «Ritalin Heads» - рыталінагаловыя. Рыталінагаловым вельмі падабаўся рыталін. Іх можна было пабачыць у спазмах абсалютнага рыталінавага экстазу. Ні ёрзання, ні піску... Яны сядзелі, засяроджаныя ні на чым... гледзячы на каналізацыйны люк, на лініі ўласнай далоні... прапускаючы сняданак, абед і вячэру... невыносна доўгая ноч без сну... поўная метылфенідатная нірвана... З 1990 да 1995 году продаж рыталіну вырас на 600 працэнтаў, і зусім не дзякуючы апетытам спідачудзікаў з Сан-Францыска, не. Гэта здарылася дзякуючы таму, што цэлае пакаленне амерыканскіх хлопчыкаў, ад найлепшых прыватных школ паўночнага ўсходу Амерыкі да найгоршых дзяржаўных школ-адстойнікаў Лос-Анджэлеса і Сан-Дыега, цяпер дурэла ад метылфенідату, які ім штодня старанна і дабрачынна выдавала прыватная наркадылерка - школьная медсястра. Цудоўная краіна Амерыка! Ніводны сумленны пісьменнік не стане гэтага аспрэчваць! Чалавечай камедыі ніколі не забракуе тут матэрыялу! Яна ніколі вас не падвядзе!

Тым часам паняцце асобы як унутранай сутнасці - асобы, якая праяўляе самадысцыпліну, утаймоўвае полавыя жаданні, стрымлівае сябе ад агрэсіі і злачынства, - асобы, якая можа стаць разумнейшай і з лёгкасцю дайсці да вяршыняў жыцця, выцягнуць сябе за ўласныя шнуркі да вяршыняў жыцця праз навучанне, працу, настойлівасць, не адступаючы перад

цяжкасцямі, - гэта старамоднае паняцце (божачкі, а што ж такое «шнуркі»?) ужо выслізгвае... выслізгвае... сыходзіць усё далей і далей... Тыпова амерыканская вера ў здольнасць індывіда перарабіць сябе з бездапаможнага нуля ў гіганта сярод чалавекаў, вера, што ідзе ад Эмэрсана («Давер да сябе»), ад раманаў Гарацыо Алджэра пра «амерыканскую мару», ад Дэйла Карнэгі («Як заваёўваць сяброў і ўплываць на людзей»), ад Нормана Вінсэнта Піла («Моц пазітыўнага мыслення»), ад Ога Мандзіна («Найвялікшы ў свеце гандляр»), - гэтая вера ўжо таксама аджывае свой век, як той бог, якому Ніцшэ склаў некралог у 1882 годзе. Яна яшчэ працягвае жыць толькі ў лядачай форме «матывацыйных выступаў», як іх называюць агенты па арганізацыі лекцый, што праводзяць зоркі амерыканскага футболу на пенсіі, кшталту Фрэна Таркентона, перад аўдыторыямі, што складаюцца з бізнесменаў, з большасці якіх атлетаў не выйшла (як і з аўтара гэтага артыкулу), размоваў пра тое, як жыццё падобна да гульні ў амерыканскі футбол. «Ужо канец чацвёртага перыяду, і вы адстаяце на трынаццаць ачкоў; «Каўбоі» прыціснулі вас да вашай аднаярдавай лініі, і пасля трэцяга перыяду мінула ўжо дваццаць тры хвіліны. Што вы будзеце рабіць?»

Даруй, Фрэн, але цяпер мінула дваццаць тры хвіліны пасля трэцяга перыяду, і вынік вядомы загадзя, усё абумоўлена генетыкай. Новая ідэя нагнятаецца ў папулярнай прэсе і на тэлебачанні шалёнымі тэмпамі. Кім нагнятаецца? Гэткай новай пародай, што кліча сябе «эвалюцыйнымі псіхолагамі». Можна быць пэўнымі, што дваццаць гадоў таму гэтыя самыя людзі называлі б сябе фрайдыстамі; аднак цяпер яны - генетычныя дэтэрміністы, і прэса з воўчым апетытам накідваецца на ўсё, што толькі прыйдзе ім у галаву.

Сёння найбольш папулярнае даследаванне - пра яго дагэтуль апавядаюць у навінах, праз месяцы пасля яго заканчэння, - гэта даследаванне Дэвіда Лікена і Оке Тэлеген з Мінэсоцкага ўніверсітэту дзвюх тысяч блізнят, якое, паводле гэтых двух псіхолагаў-эвалюцыяністаў, даводзіць, што шчасце асобы шмат у чым абумоўлена генетычна. Некаторыя людзі запраграмаваныя, каб быць шчаслівымі, а некаторыя - не. Удача (або няўдача) у справах кахання, грошай, рэпутацыі або

ўлады - усё гэта мінае, вы ўсё адно хутка вернецеся да таго генетычнага ўзроўню шчасця, з якім нарадзіліся. Тры месяцы таму часопіс «Fortune» прысвяціў вялікі і старанна ілюстраваны аповед даследаванню псіхолагаў-эвалюцыяністаў з брытанскага ўніверсітэту Сэнт-Эндруз, якое паказвала, што прыгажосць твару ацэньваецца не паводле сацыяльных стандартаў эпохі, у якой вы жывяце, а паводле крытэраў, запраграмаваных у вашым мозгу на момант нараджэння. Ці, інакш кажучы, прыгажосць не ў вачох таго, хто глядзіць[5], а ў ягоных генах. Папраўдзе, цяпер, у 1996 годзе, усяго за тры гады да канца міленіуму, калі вы дастаткова часу бавіце за праглядам газет, часопісаў і тэлебачання, то неўзабаве ў вас створыцца ўражанне, што ў вашым жыцці няма нічога, уключна з колькасцю тлушчу ў вашым арганізме, што не было б абумоўлена генетычна. Дазвольце мне прыгадаць усяго некалькі рэчаў, на якія пралілі для мяне святло эвалюцыйныя псіхолагі за апошнія пару месяцаў.

Самцы чалавечага віду генетычна запраграмаваныя на палігамію, г. зн. нявернасць юрыдычнай жонцы. Любы з тых, які чытае часопісы, даволі хутка прасякае сітуацыю (Тры мільёны гадоў эвалюцыі штурхнулі мяне на гэта!) Жанчына - фізічна цягне да мужчын-славутасцяў, бо яны - генетычна запраграмаваныя адчуваць, што першыя сярод лепшых змогуць лепш паклапаціцца пра нашчадкаў (Я буду толькі ратаўнічка ў генетычным моры, любы.) Дзяўчынкі падлеткі генетычна запраграмаваныя спаць абы з кім, каб гэтаксама не ў стане супрацьстаяць самім сабе, як сабакі ў парку. (Школа забяспечвае прэзерватывамі.) Большасць забойстваў таксама з'яўляецца вынікам генетычна запраграмаванай неадольнай цягі. (Вязні таксама ўдзеяннасць чытаць і потым паведамляюць турэмнаму псіхіятру: «Нешта мяне агарнула... і нож уторкнуўся».)

Якое ж месца тады адводзіцца самакантролю? Сапраўды, якое, калі людзі лічаць, што гэтае прывіднае «я», гэтая прывідная ўнутраная сутнасць увогуле не існуе, што і пацвярджаецца тэхналогіяй атрымання выяваў мозгу?

Пакуль што нейранавука грунтуецца на ўскосных доказах,

даследаваннях жывёлаў або таго, як змяняецца нармальны мозг, калі на яго нешта ўздзейнічае (няшчасныя выпадкі, хвароба, хірургічная аперацыя або іголка эксперыментатара). Сам Дарвін II, Эдвард Уілсан, мае абмежаваныя непасрэдныя веды чалавечага мозгу. Ён заолаг, а не нейролаг, і ягоныя тэорыі - гэта экстрапаляцыя велізарнай працы, праробленай ім у сваёй асноўнай спецыялізацыі - даследаванні насякомых. Французскі хірург, Поль Брака, адкрыў зону Брока, адзін з двух моўных цэнтраў у левым мазгавым паўшар'і, толькі пасля таго, як адзін з ягоных пацыентаў перанёс інсульт. Нават PET-сканаванне і PET reporter gene/PET reporter probe па сутнасці з'яўляюцца медычнымі даследаваннямі, паколькі патрабуюць увядзення ў арганізм хімічных прэпаратаў або вірусаў. Аднак яны даюць магчымасць уявіць сабе, на што могуць быць падобныя неінвазіўныя тэхналогіі атрымання выяваў мозгу ў будучыні. Нейрарэнтгенолаг можа ўголас чытаць чалавеку, якому робіцца PET-сканаванне, спіс тэм са сфераў спорту, музыкі, бізнесу, гісторыі, чаго хочаце, і, калі ён закранае тэму, якой чалавек цікавіцца, на экране манітора сапраўды пачынае свяціцца пэўная зона кары галаўнога мозгу. У меру ўдасканалення тэхналогіі атрымання выяваў мозгу карцінка можа стаць нагэтулькі ж выразнай і поўнай, як тыя празрыстыя дэманстрацыі на аўташоў, дзе можна пабачыць знутры, як працуе рухавік унутранага згарання. І на гэтым этапе ўсім можа зрабіцца ясна, што ўсё, што мы бачым перад сабой, - усяго толькі машынка, апарат, функцыянальны аналаг хімічнага камп'ютэра, што пераўтварае звесткі навакольнага свету. «Усё» - бо можна глядзець і глядзець, і ўсё адно вы не знойдзеце там унутры ніякай прывіднай унутранай сутнасці, ніякай душы ці духу.

Потым, у 2006 ці 2026 годзе, які-небудзь новы Ніцшэ выйдзе і абвесціць: «Унутраная сутнасць памерла», - толькі хіба што, будучы схільным да паэтычнасці, як і першы Ніцшэ, ён хутчэй скажа: «Душа сканала». Ён скажа, што ўсяго толькі паведаміў навіну, навіну пра найвялікшую падзею міленіуму: «Душа, гэты апошні прыстанак каштоўнасцяў, сканала, бо адукаваныя людзі больш не вераць у яе існаванне». І калі ў адказ не пасыплюцца запэўненні Ўілсанаў, Дэнэтаў і Докінсаў, пасля жудаснага карнавалу, у які гэта выльецца, фраза «поўнае зацьменне ўсіх

каштоўнасцяў» можа падацца вельмі лагоднай.

ДЗВЕ САМЫЯ ЧАРОЎНЫЯ ЗАГАДКІ XXI СТАГОДДЗЯ

Калі б я сёння вучыўся ў каледжы, я б наўрад ці змог устрымацца, каб не пайсці ў нейранавуку. Тут мы маем дзве самыя чароўныя загадкі XXI стагоддзя: галаваломка чалавечага духу і галаваломка таго, што здараецца з гэтым духам, калі ён дасягае абсалютнага самапазнання. У любым выпадку, мы жывём у час, калі не глядзець праўдзе ў вочы - немагчыма і бескарысна.

Іроніяй лёсу, адзначыў Ніцшэ, гэты цвёрды позірк праўдзе ў вочы, гэтая схільнасць да скептыцызму - спадчына хрысціянства (з даволі складаных прычын, на якіх тут не варта затрымлівацца). Потым ён дадаў яшчэ адзін апошні і, магчыма, канчатковы іранізм - яго мы знаходзім у бязладным урыўку з нататніка, напісаным незадоўга перад тым, як Ніцшэ страціў розум (прайграўшы яго страшэннаму бічу юрлівасці канца XIX стагоддзя - сіфілісу). Ён прадказаў, што ўрэшце новая навука паверне сваю найбольш разбуральную зброю - каляснiцу скептыцызму - супраць сябе самой, паставіць пад пытанне абгрунтаванасць уласных асноваў, разбурыць іх і самазнішчыцца. Я прыгадаў гэта ўлетку 1994 году, калі група матэматыкаў і інфарматыкаў ладзіла канферэнцыю ў Інстытуце Санта-Фэ на тэму «Межы навуковага пазнання». Яны сышліся на тым, што паколькі чалавечы розум з'яўляецца цалкам матэрыяльным апаратам, чымсьці накшталт камп'ютэра, прадуктам генетычнай гісторыі, то ён абмежаваны ў сваіх магчымасцях. Паколькі ён абмежаваны і запраграмаваны, то ён, хутчэй за ўсё, ніколі не здолее асэнсаваць чалавечае існаванне больш-менш поўна. Гэта было падобна да таго, калі б група сабак склікала канферэнцыю на тэму разумення Сабакі. Тыя маглі б шчыраваць колькі хочаце, але далёка б яны не зайшлі. Сабакі ў стане перадаваць толькі сорак паняццяў - усе прымітыўныя - і не могуць нічога запісаць. Праект быў бы загадзя асуджаны на няўдачу. Чалавечы мозг вышэйшы за сабачы, аднак і ён абмежаваны.Так што любая надзея на тое, што чалавечыя істоты калі-небудзь прыйдуць да нейкай канчатковай, поўнай і самадастатковай тэорыі аб чалавечым

існаванні, таксама асуджаная з самага пачатку.

З таго часу Крайні Скептыцызм у навуцы ўсё больш пашыраецца. Апошнія два гады дарвінізм, што заставаўся святым догматам амерыканскіх навукоўцаў на працягу апошніх сямідзесяці гадоў, знаходзіцца ў аблозе… сумневаў. Навукоўцы - а не святары, - у прыватнасці, матэматык Дэвід Берлінскі («Спрэчны Дарвін» // «Commentary» за ліпень 1996 году) і біяхімік Майкл Бэхе («Чорная скрынка Дарвіна», 1996), пачалі атаку на дарвінізм як на тэорыю - не як на навуковае адкрыццё, а менавіта як на жахліва неабгрунтаваную тэорыю, што абапіраецца на дапатопныя доказы і ў сутнасці сваёй логікі ўяўляе сабой поўную лухту. (Дэнэт і Докінс, для якіх Дарвін - Адзіны Ад Айца Народжаны, адзіны Месія, ужо крычаць ад абурэння. Яны ў бяспамяцтве і блізкія да інсульту. Уілсан, гігант думкі, захоўвае спакой і трымаецца вышэй за гэтую бойку.) Да 1990 году фізік Пэтр Бэкман з Каларадскага ўніверсітэту ўжо дачапіўся да Айнштайна. Ён глыбока захапляўся Айнштайнам за ягонае славутае раўнанне рэчыва і энергіі, E = mc2, аднак ягоную тэорыю адноснасці назваў збольшага абсурднай, бязглуздай і неправяральнай. Бэкман памёр у 1993-м. Ягоную Дубінку Забойцы Дурняў падабраў Говард Гейдэн з Канектыкуцкага ўніверсітэту, які мае шмат прыхільнікаў сярод шматабяцальнага новага пакалення Крайне Скептычных юных фізікаў. Здзекі, якімі новыя выхаванцы асыпаюць квантавую механіку («не мае ўжытку ў рэальным свеце»... «трымаецца адно на феях, што сыплюць вам у вочы дурноту раўнанняў»), тэорыю адзінага поля («Нобелеўская прынада на кручку») і тэорыю Вялікага Выбуху («крэацыянізм для крэтынаў»), усё проста спапяляюць. Шкада, што Ніцшэ няма ў жывых! Ён бы атрымаў асалоду ад кожнага моманту!

Нядаўна я гутарыў з адной вядомай каліфарнійскай даследчыцай-геолагам, і яна мне сказала:

Калі я толькі прыйшла ў геалогію, мы ўсе меркавалі, што ў навуцы ты ствараеш моцны слой знаходак - шляхам эксперыментаў і асцярожных доследаў, потым дадаеш другі слой, нібыта другую кладку цэглы - увесь час вельмі асцярожна, і гэтак далей. Час ад часу які-небудзь безразважна адчайны

навуковец састаўляе цаглінкі адну на адну, у вежы, але потым выяўляецца, што гэтыя вежы няўстойлівыя, і ўрэшце яны абрынаюцца, а ты працягваеш далей рабіць акуратную кладку. Аднак цяпер мы разумеем, што нават самая першая кладка не трымаецца на цвёрдай глебе. Яны ўсе балансуюць на бурбалках, на паняццях, поўных паветра, і гэтыя бурбалкі сёння лопаюцца адна за адной.

Раптоўна мне ўявілася, як цэлы аграмадны будынак абрынаецца і сучасны чалавек ляціць галавой уніз у першабытны змрок, у першапачатковае балота. Ён цялёпкаецца ў ім, хлюпае, спрабуе выбрацца, захлынаючыся без паветра, шалёна топчучы твань, і раптам адчувае, як нешта велізарнае і гладкае падплывае пад яго і выштурхоўвае на паверхню, нібыта нейкі ўсёмагутны дэльфін. Ён не можа гэтага пабачыць, аднак ён уражаны. Ён называе яго Богам.

Пераклала з ангельскай Мілана Міхалевіч

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

ЮРЫ АНДРУХОВІЧ украінскі пісьменьнік і эсэіст. Апошняя публікацыя ў ARCHE - эсэ «Андрэй Хадановіч і перавагі акупацыйнага рэжыму». Гэты пераклад публікуецца з ласкавай згоды аўтара.

Юры Андруховіч
...но странною любовью

Упершыню я пакончыў з Расеяй адзінаццаць гадоў таму. Усю зіму і першую палову вясны 1992 году я правёў за пісаньнем «Маскавіяды» - безумоўна, не найлепшага, але ўсё-ткі найбольш страснага з маіх раманаў. Дзеялася гэта ў старамодна-фэшэнэбэльнай і па-буржуйску зацішнай сядзібе «Вальдбэрта», паблізу ад Штанбэрскага возера, у ваколіцах Мюнхену зь яго мэханічнымі лялькамі і шматлікімі іншымі прынадамі.

Геапалітычны выбар, такім чынам, быў зроблены без асаблівых ваганьняў: Захад, Захад і яшчэ раз ён. Паколькі пісаны мною раман я сам вызначаў як *раман жахаў*, Расея і перадусім Масква мусіла паўставаць у ім жахліваю. Усё напружаньне раманных страхаў, як мне здаецца цяпер, вынікала з сутыкненьня рэальнага (заходняга, баварскага) і ўяўнага (усходняга, маскоўскага) сьветаў. Апошні, хоць і быў зусім яшчэ сьвежы ў маёй памяці, ужо зазнаваў непазьбежных аўтарскіх скрыўленьняў. Можна дапусьціць, што я энэргетычна сілкаваўся гэтым кантрастам.

Драматызму дадавалі перадачы расейскае службы радыё «Свабода», якое тады яшчэ базавалася ў Мюнхене. Я слухаў іх пераважна вечарамі, спустошаны бясконцымі блуканьнямі мяне

і майго героя па ўяўнай і напаўразваленай Маскве. Весткі з былога СССР былі наагул трывожныя. Шалёныя скачкі інфляцыі, дэфіцыт паперы, электрычнасьці, запалак і мукі - для Ўкраіны гэта магло скончыцца прыблізна тым самым, як у 1918-1920 гадох. 23 лютага нейкая *група афіцэраў Савецкае Армії* абвясьціла аднаўленьне Саюзу. Імпэрыя прагнула зрасьціся зноў, што зусім не вымагала нейкіх надзвычайных пасіянарных высілкаў. Часам здавалася, што гэта справа некалькіх тыдняў ці нават дзён. У такой сытуацыі трэба было штосьці рабіць - я рабіў што мог.

Вось тады я і пакончыў з Расеяй першы раз.

Другі раз я гэта зрабіў падчас першае чачэнскае вайны, трэці раз - падчас другой.

З часоў першай запомніўся выступ нейкага найвышэйшага дзяржаўнага сілавіка ў праграме «Час» (у нас тады яшчэ паказвалі праграму «Час»). Ён казаў, што пасьля ўзяцьця Грознага вайна пераходзіць у наступную стадыю - партызанскую. Але мы гатовыя да такога павароту падзеяў, запэўніваў ён, будзем застасоўваць заходнеўкраінскі досьвед канца саракавых, там ёсьць шмат назапашаных нашымі бацькамі мэтадаў.

Пры слове *мэтады* я ўзгадваю аповеды аднаго старэнькага маскоўскага прафэсара-пушкініста. Напрыканцы саракавых, калі ён яшчэ ня быў прафэсарам (але, з усяго відаць, ужо быў пушкіністам), ён патрапіў на тэрміновую службу ў вынішчальны аддзел дзесьці ў Карпатах. Сярод іншых там хадзіла гісторыя пра *банду*, што засела ў пячоры й люта адтуль адстрэльвалася, папросту плявалася агнём, аж пакуль у бакавых сьценах пячоры не прасьвідравалі шурфы, празь якія пусьцілі газ. Усе без выключэньня *бандыты* пазасыналі навекі ў страшэнных сутаргах. Ідэя была ў тым, што прынамсі частка зь іх складзе зброю і дасьць сябе выкурыць вонкі. Але сярод іх не знайшлося ніводнага такога, пра што старэнькі прафэсар адгукаўся з павагаю. Пазбаўленыя якое-кольвек вайсковае легітымнасьці, *бандыты* на вачох ператвараліся ў цалкам рэспэктабэльных *ваяроў*. Праўда, у мёртвых.

Ня ведаю, навошта мне спатрэбілася гэтае адступленьне. Магчыма, перадусім мне хочацца зразумець самога сябе. Я хачу любіць Расею - вось у чым рэч, і мяне вельмі непакояць праявы маёй зласьлівасьці што да братняе краіны, якая - што ўжо тут адмаўляць? - даўно ўжо сталася істотнаю часткай нас саміх. На жаль, Расейская дзяржава не пакідае мне шанцаў, час ад часу зьдзяйсьняючы чарговую газавую атаку і паралізуючы ў зародку сябе інакшую - тую, якой я прагну захапляцца. Каб мой ідэал Расеі зрабіўся ясьнейшым, акрэсьлю яго дакладней, але ўсё ж не пазьбягаючы пэўнае прыблізнасьці: мяне цікавіць яе, Расеі, іншая, неімпэрская магчымасьць. Няўжо з гэтага так ніколі нічога й ня выйдзе?

Сёньня, пасьля няўдалае спробы постімпэрскае трансфармацыі ў першай палове 1990-х гадоў (калі такая спроба наагул мела месца), застаецца толькі паставіць пытаньне больш жорстка й адкрыта: ці існуе, у прынцыпе, такая - неімпэрская - магчымасьць для Расеі? Ці можа Расея быць неімпэрыяй?

На добры лад, я ня ведаю, чаму ў маёй сыстэме вартасьцяў «імпэрыя» - гэта блага. Тым больш «імпэрыя» цалкам канкрэтная - Расейская, бо, паклаўшы руку на сэрца, я не магу сьцьвярджаць, што Брытанская, Асманская ці Сьвятая Рымская выклікаюць у мяне такую ж адрэналінавую рэакцыю. Пра Габсбурскую я тут наагул лепей прамаўчу, беручы пад увагу тое, што шматлікім маім чытачам ува Ўкраіне я й дагэтуль здаюся такім сабе агентам палкоўніка Рэдля.

Найпрасьцей патлумачыць маю ідыясынкразію традыцыйным балястам галіцка-заходніцкіх упярэджаньняў. Дзе-нідзе, вядома, ён прысутнічае (хаця б на ўзроўні вызначэньня расейцаў як *яны*), але наўрад ці ўсё вырашае. Нешматлікія ў наш час і ўсё больш рэдкія праявы галіцкае русафобскае абмежаванасьці раздражняюць мяне ня менш за найагрэсіўнейшыя антыўкраінскія эскапады прафэсійных змагароў за расейскае адзінства.

У цэлым жа ўяўленьне пра *ўнутраную* русафобію галічанаў ці - трохі шырэй - заходніх украінцаў зьяўляецца адным з хранічна запушчаных расейскіх мітаў, роспачнай спробай неяк давесьці сабе праблемнасьць, ці, мякка кажучы, небясхмарнасьць

стасункаў з малодшымі братамі, загадзя прымаючы тэзу пра дзьве Ўкраіны, зь якіх адна - большая - цалкам прарасейская і пераважна расейскамоўная, а другая - меншая - Расею ненавідзіць і пасьлядоўна каламуціць найчысьцейшую ваду братэрска-славянскіх узаемадачыненьняў. Генэтычна гэтая тэза паходзіць з тых саміх кабінэтаў, дзе стагодзьдзем раней ужо было сфармулявана разуменьне Ўкраіны як *палітычнае інтрыжкі некалькіх нямецкіх і аўстрыйскіх міністраў*. Як усялякая ісьціна кабінэтнага паходжаньня, яна ад пачатку наіўная. Па сутнасьці, гэта спроба самаабароны ад самой рэчаіснасьці: лякалізаваць антырасейскае зло ўва Ўкраіне, разьмясьціць яго дзесь далей, на заходніх змрочных ускраінах, у сфэры згубных і падступных аўстра-вугорскіх, польскіх, нямецкіх, а цяпер ужо й амэрыканскіх уплываў. З амэрыканцамі, дарэчы, на сёньняшні момант узьнікла яўная блытаніна - яны ці то патэнцыйныя супернікі і нават ворагі ў наступным падзеле тых самых *сфэраў*, ці то найбліжэйшыя хаўрусьнікі ў барацьбе з тэрарызмам.

На самай справе Ўкраінаў значна больш, чым дзьве (пагадзіцеся, іх прынамсі дзьвесьце дваццаць дзьве), і дзе менавіта праходзяць украінскія лініі падзелу, не зусім вядома. То бок вядома толькі тое, што яны праходзяць паўсюль, але ў найменшай ступені - на рэгіянальным узроўні.

І ўсё ж такі адкуль яно бярэцца, гэтае маё непрыманьне Расейскае імпэрыі? Чым яна так правінілася перада мною, дазволю сябе запытацца.

У маёй прыватнай міталёгіі чамусьці вылучаецца лета 1968 году, а менавіта - сярэдзіна лета, мне восем гадоў, я скончыў першую клясу сярэдняе школы і падчас вакацыяў патрапіў у Прагу. З таго часу гэты горад шмат для мяне значыць: адчуваньне ліпеньскага «раю на зямлі» назаўсёды засталося ў маіх успамінах. У ліпені 68-га я яшчэ ня мог гэтага разумець, але, вядома, мог гэта адчуць: апагей «праскае вясны», пульсаваньне свабоды, безьліч вольнае моладзі на вуліцах і плошчах. Мне хацелася мець такія ж даўгія валасы і паводзіць сябе гэтак жа незалежна. Празь некалькі тыдняў - на той час я ўжо вярнуўся дадому - усё гэта будзе брутальна спынена

вайсковым уварваньнем. Штосьці ў гэтай рэчаіснасьці акажацца ня так.

Зразумела, у тым узросьце я не намагаўся заглыбляцца ў палітычныя прычыны таго, што здарылася. Гэтае ўварваньне хутчэй здавалася мне праяваю пэўнага выключна эстэтычнага канфлікту. Неймаверна прыгожы горад, запоўнены вольнымі маладымі людзьмі, аказаўся горадам, эстэтычна несумяшчальным з той сыстэмай, да якой я належаў. Трэба было выбіраць, з кім я цяпер. З боку сыстэмы ў дзеяньне пайшлі танкі - эстэтычны аргумэнт, магчыма, нават значна больш прывабны для васьмігадовага хлопчыка, чымся нейкая сярэднявечная архітэктура на тле гіпоўскага карнавалу. Ня ведаю чаму, але ў тым канфлікце я ўсё ж абраў ня танкі.

Застаецца ў каторы раз канстатаваць, што нашы густы непрадказальныя і ў той жа час акурат яны вызначаюць усё. Але ў такім выпадку навошта я пішу гэтыя радкі? Цалкам было б дастаткова маладушна прызнацца, што Расея і ўсё расейскае мне не падабаецца, бо такія ўжо мае густы. І гэта было б жахлівай няпраўдай. Або, што яшчэ горш, - жахлівай праўдай.

Я па-дзіцячаму падзяляю аркуш паперы на дзьве вэртыкальныя паловы і намагаюся ўпісаць у адну зь іх «пазытыў», а ў другую «нэгатыў». Гэта стасуецца Расеі, таго, што я пра яе думаю. Некалі ў школе мы такім самым чынам аналізавалі вобраз Гамэравага Адысэя - разумны, але хітры; кемлівы, але падступны; мэтаскіраваны, але бязьлітасны; герой, але навалач. Гэтым разам у пазытыўнай частцы аркуша ў мяне «інтэлектуальна-душэўная шырыня, глыбіня і адвага» (якая, дарэчы, нам, украінцам, збольшага нават і ня сьнілася), «цудоўная не-ад-гэтага-сьветнасьць», «адмысловая анархічная здатнасьць узвышацца над побытам і дробязямі», «бясспрэчная культурная самадастатковасьць ды інтэнсіўнасьць». У нэгатыўнай частцы - «паліцэйскі/спэцслужбісцкі характар улады», «маніпуляцыйна-дэзінфармацыйныя СМІ», «цынічна-тэхналягічная палітыка», «ксэнафобская - расавая, рэлігійная, нацыянальная - нецярпімасьць грамадзтва». Няцяжка заўважыць, што ўсё *дадатнае* карэлюе з індывідуальным, з асобна ўзятымі людзьмі, у той час як усё *адмоўнае* - з

грамадзкім, з сыстэмай у цэлым. Іншымі словамі, застаецца прызнаць праўду ці то Кюстына, ці то кагосьці яшчэ - цяпер ужо ня памятаю дакладна чыю - пра тое, што «яны [расейцы] выклікаюць захапленьне як паасобна ўзятыя людзі й агіду - як грамадзкі, аб'яднаны ў адну дзяржаву арганізм». Вось вам - ня больш і ня менш - захапленьне й агіда, або - або, скрайнасьці па-расейску.

Для Ўкраіны перабываньне ў *расейскай зоне сьвету* абарочваецца капіяваньнем перадусім расейскага «нэгатыву». Генэтычная блізіня сёньняшняй дзяржаўна-ўладнае верхавіны да *расейскага эстэтычнага ідэалу* прадугледжвае ня толькі шчырае захапленьне фільмам «Брат-2» ці салённа-блатняковай папсой, але й - што непазьбежна вынікае з спэцыфікі густаў - упартае намаганьне *стабілізаваць* сваю ўласную дзяржаву на расейскі капыл, дасягнуць пуцінскае непахіснасьці і безальтэрнатыўнасьці. Для ажыцьцяўленьня гэтага праекту не хапае ўсяго толькі такой дробязі, як наяўнасьць гэтага самага *ўкраінскага Пуціна*. Такім чынам, застаецца цалкам рэальнай пэрспэктыва канчатковае здачы свайго месцачковага сувэрэнітэту - рэч ясная, у абмен на пэўныя маёмасныя і, так бы мовіць, юрыдычныя гарантыі - у рукі Пуціна сапраўднага і адзінага. Часам здаецца, што такі праект ужо надзвычай блізкі да ажыцьцяўленьня і назаўтра мы папросту прачнёмся ў іншай краіне. Часам такога не здаецца - гэта азначае, што ківач зноўку гайданула ў процілеглы бок. І ўсё-ткі, назіраючы адносную пасьпяховасьць менавіта гэтага *стабілізацыйнага* геапалітычнага праекту, я лаўлю сябе на падсьвядомым жаданьні як мага гучней цытаваць Хвылявога: «Прэч ад Масквы!» Мне прыкра, што я вымушаны карыстацца такім пячорным заклікам. Хвылявы, праўда, потым быў вымушаны тлумачыць, што ён ня меў на ўвазе Маскву як такую, а казаў пра Маскву - *сталіцу ўсесаюзнага мяшчанства*, Маскву буржуазна-нэпманскую, тую, што здрадзіла пралетарскаму Марксаваму вучэньню й ганебна перарадзілася. Працэджваючы скрозь зубы яго хрэстаматыйны заклік, мне б таксама давялося ўдакладняць, якую менавіта Маскву я маю на ўвазе. Не, вядома, не пра тую Маскву неафіцыйную, Маскву без маскоўскае прапіскі, дзе на мізэрна малую кватэрную плошчу часам набіваецца так шмат вольных і шчодрых людзей, што

ходзіш сярод іх увесь папросту зачараваны і шчасьлівы. Яшчэ крок - і пачнецца... Гітары, цыганы, мядзьведзі, невытлумачальны душэўны сьверб з прыстаўленым да скроні пісталетам - вялікая загадка бязьмежна складанае псыхічнае структуры зь яе пераможным «А гэта табе за Севастопаль» у фінале.

Мой досьвед асабістага сталага памаўленьня зь сьветам лацінкі, то бок Акцыдэнтам, налічвае адзінаццаць год. Пачынаючы з таго ж 1992-га, калі я, засеўшы сярод альпійскіх адгор'яў на бідэрмаер-югендштыльнай віле «Вальдбэрта», пісаў сваю палітычна некарэктную «Маскавіяду». Пачынаючы з тых зімова-веснавых мітусьлівых дзён і ночаў, я намагаюся пазыцыянаваць сябе ў разуменьні заходніх калег як нерасейца. Па найвялікшым рахунку, гэта - намаганьне як мага больш актыўна адстойваць свой культурны сувэрэнітэт. Хаця - куды мяне панесла - насамрэч ідзецца пра вельмі й вельмі прыватнае, унутранае й асабістае. «Гэта так, як бы ты быў Іван, а цябе ўсе называлі Паўлам», - тлумачу сваю нецярпімасьць. «А, праўда? - недаверліва пасьміхаюцца яны. - Ну добра, калі для цябе гэта так важна - будзь Іванам. Хаця ў той жа час ты ўсё-ткі Павал!» Штосьці прыблізна так.

Шчыра кажучы, на дванаццатым годзе маіх паломніцтваў на Захад я ўжо трохі стаміўся, але ўпарта не перастаю:

- запярэчваць таму, што Дастаеўскі мне павінен быць бліжэй за Гесэ;

- адмаўляцца ад камплімэнтаў расейскаму балету як ад такіх, што даюцца не па адрасе;

- пераконваць, што мова, на якой я пішу свае раманы і эсэ, не была прыдуманая прэзыдэнтам Краўчуком у сьнежні 1991 году;

- дэманстраваць, што мэлёдыя «Калінкі-малінкі» пакідае мяне абсалютна абыякавым;

- крыва пасьміхацца на кожнае іхнае «дабром пошалюйста!».

Я не перастаю рабіць яшчэ дзясяткі іншых спазматычных

жэстаў, мяне цікавіць, як ужо заўважыў, перадусім маё індывідуальна-індывідуалістычнае *я*; ува мне, хрэн ім у вочы, бачаць кагосьці іншага, адпаведна мяне, трасца ім у бок, на самай справе ня бачаць. Таму гэта такая сабе самаабарона - маё роспачнае нежаданьне прыняць рэчаіснасьць і раз і назаўсёды пагадзіцца з тым, што слова *vodka* зь іхнае спажывецка-геданістычнае сьвядомасьці ўжо ніколі ня ўдасца выцясьніць словам *horilka*, а гады мінаюць, і яны ўсё такім жа чынам вітаюць мяне сваім «дабром пошалюйста», на што я скрыгачу зубамі і мару пра ўвядзеньне ўва Ўкраіне лацінкі...

Але - слушна запытваецца мой прыяцель Андрэй Бондар, цытуючы нават не сябе, а клясыка, - як тады быць з таненькаю сьвечачкаю літары «ї» ды месяцовым серпікам літары «є»?

Як быць зь «ї», як быць зь «є», як быць зь Я?

У сваіх геа(культурных? палітычных? паэтычных?) канструкцыях я найчасьцей абапіраюся на некалькі эфэмэрыдаў. Адна зь іх - Цэнтральна-Ўсходняя Эўропа. Апошнім часам я толькі і раблю, што адбіваюся ад падступнага пытаньня «а што гэта такое?». Я сьвядома размываю яе межы, містыфікую й затуманьваю. «Гэта Нью-Ёрк, - кажу я. - Гэта слуп у ваколіцах карпацкага Рахава. Гэта тэрыторыя постмадэрнізму, надзеленага памяццю і надзеяй. Гэта тэрыторыя, дзе багата руінаў. Гэта рухомая тэрыторыя, якая дрэйфуе на ўсход. Гэта мая апошняя тэрыторыя».

Нядаўна я прыйшоў да высновы, што для мяне гэта ніяк не аскепкі Габсбурска-Дунайскай ідыліі (пра што можна было зрабіць недальнабачную выснову, зважаючы на мае даўнейшыя творы). Вось жа, гэта не тэрыторыя старой Аўстра-Вугоршчыны, не карычныя кавярні, ня венскія паштоўкі, не старыя галіцкія показкі, ня Захер, не Мазох, ня Кафка, не Музіль, ня Шульц, ня Рот, ня ўсе іншыя.

Не, вядома, усё гэта там прысутнічае, яно ёсьць, але дзесьці далёка на дне - *тое, што на сподзе*.

У той жа час тое, што не на сподзе, - значна бліжэйшая прастора камуністычнага панаваньня, іншымі словамі, усё-ткі

аскепкі і ўсё-ткі імпэрыі, але іншыя іншай - заходнія аскепкі Расейска-Савецкае імпэрыі ў яе найшырэйшым разуменьні (ня толькі ў межах колішняга СССР, але ўва ўсіх - і вонкавых таксама - межах, з усімі ня толькі калёніямі, а і дамініёнамі, пратэктаратамі й нават сатэлітамі). На гэтых абшарах фактычна адсутнічае Аўстрыя (такім чынам, *габсбурскае* разуменьне Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы канчаткова адпадае), затое прысутнічае былая ГДР - і ня толькі ў зьвязку з антысавецкім паўстаньнем працоўных у 1953 годзе.

Вызначэньне межаў *гэтае* Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы часам дадзявае мяне паважнымі гістарычнымі праблемамі. Ня ведаю, як быць з наравістымі тытаўскай Югаславіяй, чаўшэскаўскай Румыніяй ці Альбаніяй Энвэра Ходжы. Аднак мяркую, што й яны нікуды не падзенуцца: вырваўшыся палітычна па-за межы Расеі і непасрэднага расейскага палітычнага дыктату, усе гэтыя рэжымы тым ня менш заставаліся пад моцным уплывам расейскае парадыгмы кіраваньня. Цела ад цела, кроў ад крыві.

З усяго вынікае, што мая Цэнтральна-Ўсходняя Эўропа - гэта колішні сацлягер, *Ostblock*. Пра гэтыя абшары, дзе пераважная большасьць насельніцтва заставалася адчувальна незадаволенай і абражанай вынікамі папярэдняга падзелу сьвету пасьля другое ўсясьветнае вайны, у выніку чаго іхнія найбліжэйшыя нашчадкі ахвоча падтрымалі наступны, справядлівы на іхнюю думку, падзел 1989-1991 гадоў. Іншымі словамі, гэта тыя абшары, дзе на працягу прыблізна паловы стагодзьдзя назапашваліся прэтэнзіі й, тым самым, нелюбоў да Расеі. Тарас Прахаська вельмі трапна акрэсьліў *гэтую* Цэнтральна-Ўсходнюю Эўропу як «тэрыторыю, максымальна прыдатную для вядзеньня партызанскае вайны». І сапраўды - яна там, дзе «лясныя браты», Армія Краёва, УПА, яна - гэта Будапэшт 1956-га, Прага 1968-га і Гданьск 1980-га.

Так, гэта тыя абшары, дзе людзі ў веку каля сарака і старэйшыя ў свой час вывучалі па школьнай праграме біяграфію Леніна, езьдзілі на экскурсіі ў Маскву, Ленінград і Валгаград, вазілі туды на продаж джынсы й жавальную гумку, а *адтуль* - алькаголь, тэлевізары й ювэлірныя вырабы. Нядзіўна, што ўсе яны яшчэ могуць гаварыць па-расейску і здолеюць прачытаць

кірыліцай.

Але не заўсёды хочуць у гэтым прызнавацца.

Наўрад ці я маю права так усё гэта й пакінуць, ня даць нам ніводнага шанцу. Іншымі словамі, зьвесьці азначэньне Цэнтральна-Ўсходняе Эўропы да «тэрыторыі, дзе ня надта любяць Расею», да антырасейскасьці і такім чынам паўтарыць той самы грэх «лякалізацыі зла», за які я толькі што крытыкаваў расейскіх жа ідэолягаў.

А што калі ад безвыходнасьці павярнуць на 180 градусаў і падумаць пра любоў?

Я ў ёй не сумняюся, яна ёсьць.

Мая любоў да Расеі цэнтральнаэўрапейская. Яна месьціць у сабе памяць пра крыўды, пра кожную газавую атаку мінулага. Але яна не адмаўляецца ад надзеі. Цэнтральнаэўрапейская любоў да Расеі - ні ў якім разе не хімэра, яна рэчаіснасьць, яна паўсюль там, дзе людзі яшчэ могуць (хоць і не заўжды хочуць) гаварыць па-расейску і чытаць кірылічнымі літарамі. У гэтым, пэўна, крыецца надзвычай цікавы патэнцыял. Назавём гэтую рэальнасьць амніпатэнтнай.

Гэтая любоў дзіўная і таму вылучае свае перадумовы. Сапраўдная любоў заўсёды ўльтыматыўная. Сапраўдная любоў - гэта найчасьцей пісталет, прыстаўлены да скроні.

«Чаго я хачу ад Эўропы? - пытаўся беларускі стратэг Андрэй Дынько ў сярэдзіне 90-х. - Вядома, каб гэты міраж накарміў мяне, спатоліў смагу і надрукаваў мае эсэ і раманы. Але ж не накорміць, не спатоліць, не надрукуе. Чаго я яшчэ хачу ад Эўропы? Я хачу, каб там не было Расеі».

Вось і я ў насьледаваньне Андрэю Дыньку запытаю, паўтараючы яго апошняе слова:

Чаго я хачу ад Расеі?

Напачатку некалькі падставовых рэчаў.

Каб яна прыпыніла генацыд і прызнала незалежнасьць Чачэніі.

Каб яна перастала ціснуць на Ўкраіну (*и прочих разных шведов*) у пытаньні - каго ёй, Украіне, выбіраць/не выбіраць і з кім па жыцьці яднацца, а з кім - ні ў якім разе.

Каб яна адмовілася ад ідэі трымаць усіх нас на прывязі.

Каб яна - зноўку паводле Андрэя Дынька - нарэшце страціла якую-колечы пэрспэктыву экстэнсіўнага разьвіцьця, экспансіі на Захад і засяродзілася на сабе, такой прыгожай і глыбокай.

Каб яна прачытала мае раманы на мове арыгіналу.

Каб яна адвучылася ўспрымаць маю краіну выключна як радзіму сала.

Каб яна больш ніколі ня кідала за краты сваіх найлепшых пісьменьнікаў.

Каб яна сталася лібэральна-індывідуалістычнай, каб расейскае індывідуальнае («пазытыў») заўжды пераважала ў ёй над расейскім грамадзкім («нэгатыў»).

Іншымі словамі, каб у гэтай надзвычай выбуховай сумесі дэспатыі з анархіяй, што завецца Расеяй, расейская анархія перамагла расейскую дэспатыю.

Мае патрабаваньні да Расеі абсурдныя і нязбытныя, мая любоў да яе дзіўная.

Пераклаў з украінскай Андрусь Клікуноў

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (31) - 2004
[image]да Зьместу

Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ
нар. у 1983 г. у Менску. Навучаецца журналістыцы ў БДУ.

Кастусь Лашкевіч
Паміж спортам і палітыкай

ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАРАЛЕЛІ

«Спорт фармуе культуру аптымізму, культуру бадзёрасьці», - сьцьвярджаў пралетарскі ідэоляг Анатоль Луначарскі. Мажліва, таму ў эпіцэнтры таталітарызму XX стагодзьдзя - Савецкім Саюзе - была створана шырока разгалінаваная сыстэма спартовых таварыстваў і клюбаў. Спаборніцтвы па розных відах спорту ладзілі дваровыя каманды і прафэсійныя майстры. Калі краіну-монстра ліхаманіла ад страшэнных рэпрэсіяў, «бацька ўсіх народаў» атрымліваў ні з чым не параўнальную асалоду, назіраючы за пампэзна-масавымі парадамі найлепшых у сьвеце савецкіх спартоўцаў. Пышнагрудыя маладзіцы-фізкультурніцы з букетамі папяровых кветак, шыракаплечыя атлеты з партрэтамі правадыроў, дасканалай роўнасьці шэрагі гвардзейцаў дывізіі імя Дзяржынскага, пераапранутых у бела-блакітныя кашулі зь фірмовай дынамаўскай літарай (усё гэта вам нічога не нагадвае?!)... Чорны 1937-ы адзначыўся ў гісторыі ці ня самай паказной дзеяй. Спартовы парад на Чырвонай плошчы ў Маскве, прымеркаваны да Дня фізкультурніка, увянчаўся футбольным матчам двух складоў «Спартака». Адмыслова для гэтага быў пашыты лямцавы дыван плошчай у 10 тысячаў квадратных мэтраў, які пасьля

пафарбавалі ў зялёны колер і ў лічаныя хвіліны разгарнулі перад трыбунай Маўзалею. «Найлепшы сябра ўсіх фізкультурнікаў» зь вялікай цікавасьцю назіраў за спэктаклем - падарункам першага сакратара ЦК Камсамолу Аляксандра Косарава.

Гэта па-свойму перагукаецца з жыцьцём сучаснай Беларусі.

СПАРТОЎЦЫ-ДЫПЛЯМАТЫ

Мы даўно прызвычаіліся да ролі дзяржаўных СМІ як самага апэратыўнага рупару ідэяў Аляксандра Лукашэнкі. Прэзыдэнцкія выказваньні трывала ўвайшлі ў лексыкон «чэсных» журналістаў. Сёньня пасьля чарговае прыкметнае перамогі беларускіх атлетаў на міжнароднай арэне яны зноў і зноў паўтараюць: «Нашыя спартоўцы - найлепшыя дыпляматы!».

Доўгі шлях да сусьветных вяршыняў для большасьці спартоўцаў пачынаецца зь першых клясаў школы. Загубленае дзяцінства, дзесяцігодзьдзі штодзённых трэніровак, тоны пралітага поту - усё гэта кладзецца на алтар будучых перамогаў. Апранаючыся ў форму нацыянальнай зборнай, чалавек перш за ўсё бярэ на сябе вялікую адказнасьць, бо ён мусіць бараніць гонар сваёй Радзімы й выступаць пад дзяржаўным сьцягам. У сваю чаргу кожная перамога атлета - несумненная заслуга яго краіны, што здолела ўзгадаваць і падрыхтаваць чэмпіёна.

Шмат хто зь легендарных чэмпіёнаў стаўся сымбалем свайго пакаленьня і пасьля завяршэньня спартовай кар'еры плённа папрацаваў дзеля дабра і міру ў якасьці прадстаўнікоў дабрачынных і міратворчых арганізацыяў. Пэле, Джоні Вэйсьмюлер, Мухамад Алі, Джэсі Оўэнс - усе яны сталі нацыянальнымі героямі і сапраўднымі кумірамі мільёнаў жыхароў плянэты і ўвасабляюць пэўны пэрыяд сусьветнае гісторыі. У беларусаў гэта Аляксандар Мядзьведзь, Рамуальд Клім, Віктар Сідзяк, Віталь Шчэрба, Сьвятлана Багінская... Але ніхто ня кажа, што ЗША, Нямеччына, Бразылія, Францыя ды іншыя краіны, што ўзгадавалі вялікіх чэмпіёнаў, толькі тым і

вядомыя ў сьвеце. Толькі ж менавіта ў гэтым імкнуцца нас пераканаць прыдворныя лёкаі. Ёсьць і іншы прыклад - Лібэрыя, якая ўжо не адно дзесяцігодзьдзе пакутуе ад грамадзянскіх войнаў. Нацыянальны герой краіны - футбаліст Джордж Вэа - ці не адзінае, што лучыць лібэрыйцаў з цывілізаваным сьветам. Але ці варта шукаць сабе гэткія арыенціры? Калі палітычны лідэр маладой сувэрэннай дзяржавы носіць званьне апошняга дыктатара Эўропы, калі айчынная гісторыя перапісваецца нанава ці ня кожныя два гады, а нацыянальная мова і культура народу сьвядома вынішчаюцца ўладай, калі ў людзей адсутнічае пачуцьцё нацыянальнага гонару і годнасьці - спартовая карта застаецца адзіным козырам у калодзе тых, хто трымае ўладу.

КАРАЛЕЎСКІ АПЭТЫТ - ЖАБРАЦКІЯ МАГЧЫМАСЬЦІ

Згодна з дадзенымі Міністэрства спорту і турызму, на падрыхтоўку беларускай каманды да ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях у аўстралійскім Сыднэі было выдаткавана зь дзяржаўнага бюджэту каля 10 мільёнаў даляраў. Да сёлетніх Гульняў у Атэнах нашым спартоўцам вылучаная большая сума. І гэта толькі афіцыйная статыстыка, якая можа ў значнай ступені адрозьнівацца ад рэальных лічбаў. Далучыце яшчэ дзьве зімовыя Алімпіяды, а таксама процьму самых розных неалімпійскіх відаў спорту, што культывуюцца ў краіне на дзяржаўныя грошы, і вы атрымаеце надзвычайна вялікую лічбу. У столькі нам штогод абыходзяцца перамогі спартоўцаў.

На найбуйнейшых сусьветных і кантынэнтальных спаборніцтвах нікога не зьдзіўляюць традыцыйна лідэрскія пазыцыі багатых дзяржаваў - ЗША, Нямеччыны, Францыі і г. д. У той жа час нярэдка ў выніковай табэлі Беларусь займае месцы побач ці нават вышэйшыя за такія высакаразьвітыя эўрапейскія краіны, як Вялікабрытанія, Галяндыя, Швайцарыя. Ну і што, ім ад гэтай роўнасьці тамака, «за мяжой», горш жывецца?! Ці, мажліва, мы такія магутныя і багатыя, што здольныя дазволіць сабе цягнуць на ўласных плячах мноства летніх алімпійскіх відаў, паўтузіна зімніх і яшчэ торбу тых, што не ўваходзяць у алімпійскую праграму? У рэйтынгу «The Global Competitiveness Report 2002-2003», усебаковай міжнароднай

крыніцы дадзеных, заснаванай на параўнальным дасьледаваньні эканамічнага росту 80 вядучых краінаў сьвету, Швайцарыя займае 6-ы радок, Вялікабрытанія - 11-ы, Нідэрлянды - 15-ы. Беларусі ў ім няма зусім.

Галоўныя аргумэнты дзяржаўных дзеячоў - падтрыманьне рэнамэ перадавой спартовай краіны і здаровага ладу жыцьця - ня маюць пад сабой падставаў. Сучасная Беларусь не валодае эканамічнымі магчымасьцямі для разьвіцьця ўсіх алімпійскіх відаў. А для прапагандаваньня здаровага ладу жыцьця дастаткова і некалькіх нацыянальных відаў спорту. Прыкладам, 3,5-мільённая Літва толькі ў апошнія некалькі гадоў стала пераможцай эўрапейскага першынства ды прызэрам Алімпійскіх гульняў у такой папулярнай гульні, як баскетбол. Латышы (іх 2,4 мільёна) летась трапілі ў фінальную частку чэмпіянату Эўропы па футболе, гульні № 1 у сьвеце. А іх хакейную зборную на сусьветным першынстве ў Фінляндыі прыляцела падтрымліваць 7-тысячнае (!) войска фанатаў.

Расьцярушваньне дзяржаўных грошай на велізарную колькасьць «беларускіх» і «небеларускіх» (ненатуральных для нас) відаў спорту тлумачыцца толькі прапагандысцкімі мэтамі. Таму перамогі беларускіх атлетаў нярэдка аказваюцца піравымі. Спартовая верхавіна (сябры нацыянальных камандаў, іх трэнэры, чынавенства) атрымлівае ўсё, на разьвіцьцё ж дзіцяча-юнацкага спорту не застаецца амаль нічога.

Пакуль спорт ня станецца хаця б напалову камэрцыйным і будзе існаваць на дзяржаўныя датацыі, трыюмфы беларускіх спартоўцаў на міжнародных спаборніцтвах будуць успрымацца не як нацыянальнае дасягненьне, а прапагандысцкія штучкі. Дарэчы, ужо цяпер ёсьць прапановы, накіраваныя на камэрцыялізацыю нацыянальнага спорту, напрыклад прапануецца ўвесьці яго льготнае падаткаабкладаньне. Летась былі падпісаныя два дэкрэты, згодна зь якімі наймацнейшыя хакейныя і футбольныя клюбы былі замацаваныя за буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі.

ВАРАГІ-«ПАТРЫЁТЫ»

У апошні час спартоўцы масава зьмяняюць сваё грамадзянства. Бразыльскія футбалісты, на радзіме якіх існуе фантастычная канкурэнцыя за ўдзел у нацыянальнай зборнай, гуляюць за іншыя краіны. У адрозьненьне ад іх, афрыканцы мяняюць дзяржаўную прыналежнасьць пераважна з мэркантыльных прычынаў. Гляньце на зборную чэмпіёнаў плянэты-2002 - Францыі. У ёй зь цяжкасьцямі можна адшукаць 3-4 прозьвішчы карэнных французаў. Калі інтэрнацыянальная міграцыя ў футбольным супольніцтве набыла масавы характар, Міжнародная фэдэрацыя футболу ўхваліла выратавальны праект. Цяперака гулец мае права бараніць колеры іншае краіны толькі ў выпадку, калі не правёў аніводнага матчу ў складзе сваёй зборнай.

Міграцыя спартовых кадраў, якая мае месца ў сёньняшняй Беларусі, таксама перасягнула ўсе прымальныя памеры. Калі гэтая тэндэнцыя будзе мець свой працяг, мы рызыкуем страціць нацыянальны спорт і ўласную школу падрыхтоўкі будучых чэмпіёнаў. Як ні круці, але беларусы маюць свае слынныя спартовыя традыцыі і мусяць берагчы іх. Аднак міністэрскія чыноўнікі вынайшлі новы спосаб для набыцьця мэдалёў, такіх неабходных для справаздачаў перад прэзыдэнтам. Кіраўнік дзяржавы патрабуе на Алімпіядзе ў Атэнах 25 мэдалёў. Будзь ласкаў, спадар Чынадрал, выканаць гэта, інакш зьляціш з сваёй пасады.

У гэткіх экстрэмальных умовах і нараджаюцца згубныя для беларускага спорту ідэі. Разумеючы, што за два-тры гады майстра экстраклясы не ўзгадаваць, спартовыя начальнікі вырашаюць іх набыць па суседзтве - у Расеі ці ўва Ўкраіне. Біятлён, бокс, барацьба, дзюдо, мастацкая гімнастыка, ірты, скачкі ў ваду, фігурнае коўзаньне - ува ўсіх гэтых відах зімовае і летняе алімпійскае праграмы гонар сувэрэннае Беларусі бароніць вялікая колькасьць гасьцей з суседніх краінаў. Часам іх у нацыянальных камандах амаль 100 адсоткаў.

Найлепш ілюструе сучасныя тэндэнцыі ў айчынным спорце біятлён. Беларуская школа стральцоў-ірцяроў стала вядомай у сьвеце шмат у чым дзякуючы расейскім спартоўцам, якіх у маладосьці доля закінула ў Беларусь ці якія зьмянілі спартовае

грамадзянства з прычыны высокай канкурэнцыі на радзіме. Пад беларускімі сьцягамі не адзін год выступалі і выступаюць сусьветна вядомыя расейскія атлеты Яўген Рэдзькін і Віктар Майгураў, Аляксандар Папоў і Вадзім Сашурын, Уладзімер Драчоў і Аляксей Айдараў...

Але адна справа, калі ў краіну едуць 16-18-гадовыя пэрспэктыўныя юніёры, зь якіх пасьля беларускія трэнэры «лепяць» (на роўных умовах з нашай моладзьдзю) чэмпіёнаў. І зусім іншая, калі месцы ў нацыянальнай зборнай займаюць дасьведчаныя 25- 35-гадовыя варагі, чыя кар'ера ідзе на спад. Як правіла, яны адразу атрымліваюць кватэры, ім ствараюць «цяплічныя» для жыцьця і трэніровак умовы, якія яны мусяць адпрацоўваць мэдалямі, заваяванымі на найбуйнейшых спаборніцтвах.

У выніку беларускія хлопцы і дзяўчаты апынаюцца ў сытуацыі няроўнай канкурэнцыі зь легіянэрамі і вымушаныя гадамі гібець за іх плячыма. Большасьць зь іх пакідае вялікі спорт, так і не праявіўшы сябе.

Што ж зь сябе ўяўляе сёньня беларускі біятлён, які кіраўніцтвам краіны быў ахрышчаны народным відам спорту? У асноўным складзе мужчынскай зборнай на апошніх чэмпіянатах сьвету і Эўропы толькі два выхаванцы айчыннай школы - Алег Рыжанкоў і Аляксандар Сыман. У жаночай камандзе толькі адна нашая - Людміла Ананька. Вось такі народны спорт! Хварэйце за сваіх!

Гледзячы на ўсю гэтую «братнюю» беларуска-расейска-ўкраінскую міграцыю спартоўцаў, падмацаваную пазыцыяй Лукашэнкі («Добра, што ёсьць ператок спартоўцаў… Галоўнае, каб ён меў цывілізаваны характар, каб мы дамовіліся»), міжволі задумваешся, а ці маюць і чыноўнікі, і спартоўцы-варагі якое-колечы ўяўленьне пра нацыянальную годнасьць і беларускі патрыятызм.

ЦІ СПАРТОВЕЦ НАШ ПРЭЗЫДЭНТ?!
Аляксандар Лукашэнка - самы спартовы прэзыдэнт у сьвеце.

Нідзе на плянэце ня знойдзеш палітычнага лідэра краіны, які гуляе ў хакей, футбол, тэніс, ездзіць на іртаролерах, на іртах і каўзачах. Акрамя таго, наш прэзыдэнт узначальвае Нацыянальны алімпійскі камітэт, выступае галоўным спартовым ідэолягам. Безь яго ўдзелу не абыходзіцца аніводнае буйное спартовае спаборніцтва. Пры ім спорт стварае «імідж дзяржавы», спартоўцы выконваюць функцыю «амбасадараў» Беларусі. Праўда, што і ўва ўсіх далёкіх ад дэмакратыі рэжымах спартовы сэктар займае асобнае месца ў дзяржаўнай палітыцы. Вызначым найбольш характэрныя рысы спартовай «хваробы» Лукашэнкі.

1. Яе карані бяруць свой пачатак з часоў ягонага юнацтва. Вядома, што ён пэўны час займаўся ў футбольнай сэкцыі і сёньня падчас нячастых футбольных сустрэчаў паміж палітыкамі Беларусі і Расеі дэманструе добрую тэхніку абыходжаньня зь мячом.

2. Некалькі разоў на тыдзень практыкаваньне Лукашэнкі на лёдзе малой зімовай арэны, прыбудаванай да менскага Палацу спорту, нязьменна зьбірае высокіх дзяржаўных чыноў і вядомых экс-спартоўцаў. Асабістым трэнэрам Лукашэнкі стаўся неблагі ў мінулым хакеіст, а цяпер - галоўны трэнэр нацыянальнай і моладзевай камандаў Беларусі Міхаіл Захараў, вядомы як адзін з найбольш адданых прыхільнікаў прэзыдэнта ў спартовай галіне. Любоў да хакею беларускага кіраўніцтва сталася ўжо байкай усіх языкоў. А ў ранейшых вэрсіях папулярнай кампутарнай гульні EA SPORTS «NHL» замест сапраўдных прозьвішчаў хакеістаў нацыянальная зборная Беларусі была ўкамплектаваная найлепшымі з найлепшых: Lunkashenko (менавіта такое напісаньне), Sheiman, Pastuhov...

Акрамя хакею, у нашай «верхавіны» ёсьць яшчэ адзін «абавязковы» від спорту - іртавыя гонкі. Напярэдадні апошняй «Менскай іртавіцы» тэлебачаньне амаль штодня апавядала пра тое, як, прыкладам, каманда прафсаюзаў Козіка рыхтуецца да спаборніцтваў у Раўбічах. Але найцікавейшае адбываецца на самой «іртавіцы». Там немалады ўжо прэзыдэнт (хай і ў цудоўнай фізычнай форме) зь лёгкасьцю абыходзіць на трасе маладых ірцяроў-прафэсіяналаў, а ягоная каманда раз за разам

перамагае.

Яшчэ адзін сымбалічны факт: у Беларусі Лукашэнка нязьменна выходзіць на лёд пад першым нумарам. Праўда, на міжурадавай гульні ў Маскве беларускі прэзыдэнт, каб не зьняважыць прэзыдэнта расейскага, надзеў 99-ы нумар легендарнага канадзкага хакеіста Ўэйна Грэцкі. Выйшла ня надта дыпляматычна.

3. Вызначыўшы спорту асаблівае месца ў дзяржаўнай палітыцы і адзначыўшы рынак спартовых паслугаў як «адну з тых індустрыяў эканомікі, што разьвіваецца найбольш дынамічна», Лукашэнка перадаў кіраўніцтва мэдалёваздабывальнай галіной у рукі сілавікоў. Цяпер міністэрства спорту і турызму Беларусі ачольвае сумна вядомы ў сувязі з «эскадронамі сьмерці» і зьнікненьнем апазыцыйных палітыкаў экс-міністар унутраных справаў Юры Сівакоў. Кіраўнік Беларускай фэдэрацыі футболу - дзяржсакратар Савету Бясьпекі Генадзь Нявыглас, баскетболу - палкоўнік КДБ Леў Піменаў, акадэмічнага веславаньня - міліцэйскі генэрал Юры Тарабрын. Старшыня біятлённай фэдэрацыі - галоўны «кадэбіст» краіны Леанід Ерын, а хакейнай - міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў. Міністар абароны Леанід Мальцаў - кіраўнік фэдэрацыі кулявой стральбы. Пераканаўча, ці ня праўда?!

4. Аніводнае больш-менш важнае рашэньне што да спартовай палітыкі не прымаецца без удзелу Лукашэнкі. Ён вылучае стратэгічныя мэты, ставіць мэдалёвыя задачы напярэдадні Алімпіяды, узнагароджвае за посьпехі (прыкладам, беларускіх тэнісістаў пасьля перамогі над расейцамі ў спаборніцтвах на Кубак Дэвіса), ладзіць «разборкі» пасьля правалаў. Нават прызначэньне галоўных трэнэраў нацыянальных футбольнай і хакейнай зборных, Малафеева і Захарава, адбывалася пры ягоным непасрэдным удзеле, а будаўніцтва буйных спартовых комплексаў (хакейныя пляцоўкі, рэканструкцыя Палацаў спорту і воднага спорту, футбольнага манежу, гарнаіртавых трасаў) ажыцьцяўляецца пад яго нястомным кантролем.

5. Прэзыдэнт не прапускае зручнага моманту, каб выступіць перад народам на любых значных міжнародных спаборніцтвах, што ладзяцца ў Беларусі, і зарабіць дадатковыя палітычныя

пункты ў сваёй несупыннай выбарчай кампаніі. Нядаўна Лукашэнка адкрываў у пераабсталяваным менскім футбольным манэжы матч сусьветнай групы Кубку Дэвіса Беларусь-Расея і скарыстаў на сваю палымяную прамову больш за рэкамэндаваныя Міжнароднай тэніснай асацыяцыяй 10 хвілінаў. У заключны дзень спатканьня, калі траўмаваны Ўладзімер Ваўчкоў па-геройску давёў гульню да перамогі, Лукашэнка «сарваўся» зь міжнароднага хакейнага турніру «Эўрапейскі выклік» і зьявіўся ў манэжы зноўку (на гэты раз у спартовай форме), каб празь якія дваццаць хвілінаў апынуцца на корце побач з тэнісістамі ў эпіцэнтры сьвяткаваньня нашае перамогі. Роўна празь дзесяць дзён на Кастрычніцкай плошчы сталіцы ён разам з прэзыдэнтам Міжнароднага зьвязу біятляністаў вітаў удзельнікаў і гледачоў 9-га першынства Эўропы па біятлёне, якое мелася адбыцца ў Раўбічах. Сапраўды, дзе яшчэ, як не на спаборніцтвах, можна выступіць перад сваімі ідэйнымі прыхільнікамі і апанэнтамі ды «сарваць» буру авацыяў. Мажліва, толькі на БТ.

6. Нельга не пазайдросьціць таму, як Лукашэнка ўсё пасьпявае. У сувязі з гэтым прыгадваецца рэзананснае інтэрвію былога кіраўніка спраў прэзыдэнта Лукашэнкі Івана Ціцянкова, якое ён даў газэце «День» у часе перадвыбарнай кампаніі 2001 году: «Амаль усе тыя пяць гадоў і пяць месяцаў, якія я быў побач зь ім, ён працаваў у суткі ня больш за тры-чатыры гадзіны. Ён прыяжджае - перш-наперш выслухоўвае службу бясьпекі, пасьля сустракаецца з прэсай. Выклікае кагосьці з справаздачай дзеля ацэнкі - і ўсё, на гэтым ягоная праца заканчваецца, прыкладна ў дзьве гадзіны дня. Пасьля ў Дразды... А там тэніс, хакей...»

КРАЙ ЛЯДОВЫХ ПАЛАЦАЎ

З пачаткам масавага будаўніцтва ўва ўсіх абласных цэнтрах краіны лядовых палацаў па тэлевізіі абвясьцілі хакейны бум і параўналі Беларусь з высокаразьвітымі скандынаўскімі краінамі: маўляў, мы наблізіліся да Швэцыі й Фінляндыі на шэсьць палацаў. Прыдворныя прапагандысты пры тым забыліся нагадаць, што ў пяцімільённым краі Суомі крытых хакейных пляцовак каля 300, а валавы нацыянальны прадукт на душу насельніцтва перавышае наш больш чым у 10 разоў. Чаму

забыліся? Вядома чаму. Прэзыдэнт любіць гуляць у хакей. Прэзыдэнт любіць глядзець хакей. Пасьля аднаго з розыгрышаў юнацкага хакейнага турніру «Залатая шайба» на прызы прэзыдэнта Аляксандар Лукашэнка ўзгадваў, што ў маленстве шмат гуляў на зьледзянелым ставе, бо лепшых умоваў у вясковай дзятвы не было. Свае дзіцячыя захапленьні дзівоснай заакіянскай гульнёй ён пранёс праз усё жыцьцё. Калі ён прыйшоў да ўлады, яны сталі вызначаць дзяржаўную палітыку.

На канец XX - пачатак XXI стагодзьдзяў прыпалі найлепшыя дасягненьні нацыянальнай хакейнай зборнай: дасьведчаныя беларускія хакеісты, узгадаваныя яшчэ савецкай школай, апынуліся сярод наймацнейшых камандаў сьвету і сталі чацьвертымі на Белай Алімпіядзе-2002 у амэрыканскім Солт-Лэйк-Сыты. Гэты ўзьлёт стаўся для ўладаў цудоўнай падставай для апраўданьня затрачаных сродкаў (пабудова кожнага лядовага монстра каштавала дзясяткі мільёнаў даляраў, плюс трэба ўлічыць выдаткі на гадавое забесьпячэньне кожнага будынку). Колькасьць удзельнікаў нацыянальнага чэмпіянату павялічылі да 10. У Віцебск, Гомель, Берасьце дзясяткамі завозілі расейскіх хакеістаў. На лядовых пляцоўках распачалі трэніравацца фігурысты (зноўку масавы завоз з Расеі), шорт-трэкавікі і ўсе ахвотнікі, што маюць для гэтага грошы. Галоўная мэта будаўніцтва - разьвіцьцё і падтрымка ў Беларусі дзіцяча-юнацкага хакею - апынулася пад пагрозай.

Завяршаючы апісаньне хакейнай ліхаманкі, дадамо, што самы вялікі менскі палац спорту, які быў адрамантаваны адмыслова да красавіцкага моладзевага першынства сьвету па хакеі, мае ўсяго 3500 глядацкіх месцаў. Гэта, у сваю чаргу, не дазваляе праводзіць у краіне спаборніцтвы найвышэйшага міжнароднага ўзроўню і, як вынік, зарабляць грошы і аўтарытэт. Яшчэ раз вернемся да сямі тысячаў латыскіх фанатаў на хакейных пляцоўках Фінляндыі. У нас большасьць палацаў ня здольны зьмясьціць і паловы гэткай колькасьці гасьцей.

Здароўе нацыі - справа сьвятая. Але стаўка на разьвіцьцё ў краіне такога спэцыфічнага спорту, мякка кажучы, вельмі спрэчная, бо хакей - ня ірты і нават не футбол, ён вымагае куды больш высокіх інфраструктурных і матэрыяльных унёскаў. Каб

экіпіраваць 10-гадовага хакеіста, патрэбная не адна сотня даляраў. Ці ў кожнай беларускай сям'і знойдуцца такія грошы?

Басэйнаў, тэнісных кортаў, спартовых заляў, якасных стадыёнаў - усяго таго, што так неабходна масаваму спорту, - у краіне па-ранейшаму не стае. Дагэтуль няма аніводнага ўнівэрсальнага комплексу для гульнявых відаў спорту (баскетбол, гандбол, валейбол), які б умяшчаў хаця б пяць тысячаў гледачоў. Для правядзеньня матчу Сусьветнай групы Кубку Дэвіса толькі што збудаваны крыты футбольны манэж давялося тэрмінова пераабсталёўваць у тэнісны корт, што, паводле падлікаў адмыслоўцаў, каштавала ня менш за тры мільёны даляраў.

ЦІ НЕ АДЗІНАЯ РАДАСЬЦЬ?

Хоць дзяржаўныя СМІ рапартуюць аб чарговым павелічэньні сярэдняга заробку грамадзян на 10 адсоткаў і надзвычай пасьпяховыя вынікі пасяўной кампані (па-нашаму - сяўбы), жыць так, як нашы заходнія суседзі, мы ня сталі. Да Эўропы мы не наблізіліся, рэканструяваць уласную гісторыю таксама ня здолелі. У лукашэнкаўцаў няма нацыянальнай ідэі, якая б зьяднала беларускі народ. Таму спартовыя посьпехі нашых суайчыньнікаў застаюцца ці не адзінай у Беларусі падзеяй, якую рэгулярна сьвяткуе ўся нацыя. Дзе яшчэ адчуваецца гэткая еднасьць беларусаў - правых і левых, бізнэсоўцаў і прыбіральнікаў, урадоўцаў і апазыцыянэраў, праваслаўных і каталікоў, - як пасьля гістарычных перамог футбольнай зборнай над легендарнымі галяндцамі, ці хакеістаў над швэдамі ў чвэрцьфінале Алімпійскіх гульняў, ці нашых тэнісістаў над расейцамі ў розыгрышы Кубку Дэвіса! Прэзыдэнт гэта цудоўна разумее, імкнучыся адыграць на гэтым сваю партыю. А правядзеньне ў краіне сякіх-такіх міжнародных спаборніцтваў толькі дадае ў яго калоду чарговую партыю козыраў.

Возьмем, напрыклад, апошні чэмпіянат Эўропы па біятлёне, што ў сярэдзіне лютага адбыўся ў Раўбічах. Насамрэч гэтае спаборніцтва другараднае ў міжнародным календары Міжнароднага зьвязу біятляністаў, якое да таго ж праходзіць

адразу пасьля заканчэньня сусьветнага першынства. Нягледзячы на гэта, Беларусь актыўна ўзялася за падрыхтоўку і правядзеньне малапрэстыжнага турніру, выдаткаваўшы на яго вялізныя сумы і прымусіўшы выступаць перад Лукашэнкам сваіх наймацнейшых біятляністаў.

Ці патрэбны нам такі падыход? Наўрад ці. Ці патрэбныя нам спартовыя перамогі наагул? Безумоўна. Але яшчэ болей мы прагнем нармальнага чалавечага жыцьця ў цывілізаванай эўрапейскай краіне. Пакуль жа спартоўцы будуць нашымі найлепшымі дыпляматамі, да такога жыцьця будзе далёка.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/11/1**
[image]

АЛЯКСАНДР ФРЫДМАН гісторык, выпускнік гістфаку БДУ. У дадзены момант павышае сваю кваліфікацыю ўва унівэрсытэце Сааробрукена (Нямеччына).

Аляксандар Фрыдман Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941-1944

Pořajmos (Вынішчэнне)… Гэтым жахлівым словам рома называюць генацыд ня-мецкага нацыянал-сацыялізму супраць цыганскага народу ў Еўропе.

Знішчэнне цыганскага насельніцтва падчас нямецкай акупацыі Беларусі ў 1941-1944 гадах застаецца чорнай плямай у гісторыі другой сусветнай вайны. Пра гэты генацыд маўчаць беларускія падручнікі гісторыі[1], у беларускіх гарадах і мястэчках мы не пабачым помнікаў цыганскім ахвярам нацызму… Савецкая ўлада замоўчвала злачынствы як супраць яўрэяў, так і супраць цыганоў. Сёння беларускае грамадства мае магчымасць даведацца пра яўрэйскую Катастрофу.

СКЛАДАНАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ЦЫГАНСКАГА ГЕНАЦЫДУ

Рэканструяваць генацыд цыганскага насельніцтва Беларусі цяжка. Па-першае, нашы веды пра ўнутраны лад жыцця беларускіх рома як да акупацыі, так і падчас яе маюць выразна

1 Калі пра вынішчэнне яўрэйскага насельніцтва беларускія

фарміраванні нямецкіх акупацыйных органаў. Па дадзеных, якія ўтрымліваюцца ў архіве Цэнтральнага штаба партызанскага руху, толькі ў 1941 г. на тэрыторыі Беларусі было створана 213 партызанскіх атрадаў, у якіх налічвалася 12 тысяч чалавек. Да канца 1941 г. у Беларусі дзейнічалі 1255 партызанскіх атрадаў, у якіх налічвалася 70 тысяч чалавек. Гэтыя лічбы, на жаль, не адлюстроўваюць рэальнай колькасці партызанскіх атрадаў і іх удзельнікаў. Многія партызанскія атрады ўтваралі ў ходзе баявых дзеянняў, а таксама пры выхадзе з акружэння

Такі падыход быў характэрны і для ўпраўленняў СС і паліцыі (Befehle und Befehlsgebung der Kommandeure der Einsatzgruppen der Sicherheitspolizei und des SD in der Sowjetunion. Dokumentation zum Verbrechenskomplex. Zusammengestellt von Klaus-Michael Mallmann, Jürgen Matthäus, Andrej Angrick und Gerhard Paul. Darmstadt, 2011. S. 135–136; Ralf Ogorreck. Die Einsatzgruppen und die «Genesung der Volksgemeinschaft». Frankfurt am Main, 1996. S. 75–108; Henry Friedländer. Der Weg zum NS-Genozid. Von der Euthanasie zur Endlösung. Darmstadt, 1997. S. 235.

У ліпені 1941 году падраздзяленні айнзацгрупы В распачалі вынішчэнне мужчынскага яўрэйскага насельніцтва Беларусі (Michael Zimmermann. Rassenutopie und Genozid. Die nationalsozialistische «Lösung der Zigeunerfrage». Hamburg, 1996. S. 260 (далей пасля цытуецца як «Zimmermann a.»).

Гэтае меркаванне досыць спрэчнае. Падрабязней гл.: Gerlach. S. 1063.

Zimmermann a. S. 261.

У гістарычнай навуцы пануе меркаванне, што ў першыя тыдні сваёй дзейнасці на тэрыторыі СССР айнзацгрупы не мелі загаду на ліквідацыю цыганскага насельніцтва[8].

У ліпені-жніўні 1941 году, калі, згодна з нямецкімі планамі маланкавай вайны, канчатковая перамога над СССР павінна была быць дасягнута ў найбліжэйшыя тыдні, Гітлер, магчыма, аддаў загад на вынішчэнне ўсяго яўрэйскага насельніцтва Савецкага Саюзу - незалежна ад полу і веку (адпаведны пісьмовы загад, дарэчы, да сённяшняга дня не знойдзены), які, мабыць, быў абвешчаны рэйхсфюрэрам СС Генрыхам Гімлерам падчас інспекцыйнага наведвання Менску 14-15 жніўня 1941 году[9]. Паводле меркавання Міхаэля Цымермана, адначасова айнзацгрупам было загадана распачаць забойства савецкіх цыганоў, першыя масавыя акцыі супраць якіх датуюцца другой паловай жніўня - вераснем 1941 году[10].

Ота Алендорф, кіраўнік III упраўлення RSHA, а таксама айнзацгрупы D, якая нясе адказнасць за забойства найбольшай колькасці савецкіх цыганоў на тэрыторыі Крыму, абгрунтаваў на Нюрнбергскім працэсе знішчэнне яўрэяў і цыганоў аднолькава[11]: айнзацгрупы мелі загад гарантаваць бяспеку ў тылу нямецкага войска. І яўрэі, і цыганы ўяўлялі сабою небяспечны элемент і такім чынам падлягалі ліквідацыі. Алендорф падкрэсліў, што доўгатэрміновая бяспека магла быць

7 Ralf Ogorreck. Die Einsatzgruppen und die «Genesung der Volksgemeinschaft». Frankfurt am Main, 1996. S. 75–108; Henry Friedländer. Der Weg zum NS-Genozid. Von der Euthanasie zur Endlösung. Darmstadt, 1997. S. 235.

8 Michael Zimmermann. Rassenutopie und Genozid. Die nationalsozialistische «Lösung der Zigeunerfrage». Hamburg, 1996. S. 260 (далей пасля цытуецца як «Zimmermann a.»).

9 Ebd. Гэтае меркаванне досыць спрэчнае. Падрабязней гл.: Gerlach. S. 1063.

10 Zimmermann a. S. 261.

11 Ebd. S. 263.

12 Ebd. S. 262.

дасягнута шляхам вынішчэння не толькі яўрэйскіх і цыганскіх мужчын, але таксама жанчын і дзяцей.

Айнзацгрупы канцэнтравалі сваю ўвагу на адмысловым вышуку і вынішчэнні яўрэяў і камуністаў - галоўных удзельнікаў міфічнай «жыда-бальшавіцкай сусветнай змовы», а таксама інтэлігенцыі. «Расава непаўнавартасным» рома ў гэтай канцэпцыі была адведзена роля памагатых «сусветнага ворага»[12].

Асаблівасці цыганскага ладу жыцця (значная колькасць рома складалася з вандроўнікаў) не дазволілі айнзацгрупам выкарыстаць у дачыненні да іх той жа адладжаны механізм «вышук - улік і збор у вызначаным месцы - фізічнае знішчэнне», які дзейнічаў супраць яўрэяў. Стварэнне адасобленых цыганскіх кварталаў практыкавалася рэдка[13].

Айнзацгрупы не праводзілі сістэматычнага палявання на цыганоў. Аселыя і вандроўныя рома затрымліваліся, накіроўваліся на прымусовую працу ці знішчаліся (лёс затрыманых у кожным выпадку вырашаў канкрэтны нямецкі афіцэр) галоўным чынам тады, калі траплялі ў поле зроку айнзацкамандаў - выпадкова з'яўляліся на шляху карнікаў, падчас пераправеркі турмаў ці ўвогуле ўсяго грамадзянскага насельніцтва, выдаваліся мясцовымі жыхарамі альбо затрымліваліся і перадаваліся Вермахтам[14].

Традыцыйныя антыцыганскія стэрэатыпы і клішэ неаднаразова былі выкарыстаны айнзацгрупамі і Вермахтам дзеля абгрунтавання карных дзеянняў супраць рома. Сярод такіх стэрэатыпаў былі: антыграмадскія паводзіны, схільнасць да крадзяжу і іншых злачынстваў, гультайства, распаўсюджванне хваробаў, шпіянаж на карысць савецкай улады і партызанаў, іншыя формы супрацоўніцтва з антынямецкім супрацівам (напрыклад, распаўсюджванне варожых звестак) і г. д. Цыганы разглядаліся ў якасці цяжару для краю, эканамічнае становішча якога і без таго было вельмі цяжкім, цяжару, ад якога пажадана было пазбавіцца[15].

Антыцыганская палітыка нацысцкага кіраўніцтва[16], як адзначаюць Дональд Кенрык і Грэтан Паксан[17], яшчэ да

[12] Ebd.

[13] Ebd. S. 263; Gerlach. S.1067.

[14] Трэба падкрэсліць, што, прыйшоўшы да ўлады, Гітлер не распачаў перасьледу цыганскага насельніцтва, але вывеў яго на «якасна» новы ўзровень. Антыцыганскае заканадаўства існавала ў Германіі і раней. Падрабязней: Friedlander. S. 393-397.

[15] Donald Kenrick und Grattan Puxon. Sinti und Roma - die Vernichtung eines Volkes im NS-Staat. Göttingen. 1981. S. 103.

[16] Нямецкая паліцыя і жандармерыя галоўным чынам арыштоўвалі рома і перадавалі іх паліцыі бяспекі і СД. Тым не менш, яны таксама прымалі ўдзел у расстрэлах. Zimmermann a. S. 268.

[17] Ахоўныя каманды таксама забівалі цыганоў, часцей, аднак, перадавалі затрыманых жандармерыі ці паліцыі парадку, якія ў сваю чаргу, накіроўвалі іх у паліцыю бяспекі і СД. Zimmermann a. S. 269.

пачатку вайны легітымізавала ў вачах адпаведным чынам ідэалагічна падрыхтаваных членаў айнзацгрупаў і іх памочнікаў з ліку нямецкай паліцыі, жандармерыі[18], складзеных з мясцовых, літоўскіх, украінскіх і іншых калабарантаў ахоўных камандаў[19], а таксама салдатаў Вермахту пераслед і вынішчэнне цыганскага насельніцтва на акупаваных савецкіх тэрыторыях.

МАСАВЫЯ ЗАБОЙСТВЫ ЦЫГАНОЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯЙ РАСІІ Ў 1941-1944 ГАДАХ

Паводле ўведзенага акупантамі адміністрацыйнага падзелу Віцебская, Магілёўская, значная частка Гомельскай і ўсход Менскай абласцей, а таксама некалькі раёнаў Палескай вобласці былі далучаны да «вобласці армейскага тылу» (групоўка «Цэнтр»). Паўночныя раёны Берасцейскай, частка раёнаў Баранавіцкай абласцей, а таксама Беластоцкая вобласць сталі часткай Усходняй Прусіі («Генеральная акруга Беласток»). У склад генеральнай акругі «Літва» ўвайшлі паўночна-заходнія раёны Вялейскай вобласці, Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай і Берасцейскай абласцей былі аднесены да імперскага камісарыяту «Украіна», у якім, таксама як і ў генеральнай акрузе «Беларусь» (Баранавіцкая, Барысаўская, Вялейская, Ганцавіцкая, Глыбоцкая, Лідская, Навагрудская, Слонімская, Слуцкая, Менская акругі і горад Менск), кіраўніцтва ажыццяўлялі нямецкія цывільныя ўлады. Генеральныя акругі «Літва» і «Беларусь» склалі частку імперскага камісарыяту «Остланд» (Рыга), які ўзначальваў Гінрых Лёзэ.

Беластоцкі раён, Волкавыскі, Свіслацкі, Шчучынскі і Ваўкавыскі раёны былі перададзены ў адміністрацыйнае падпарадкаванне ўрада генерал-губернатарства. Такім чынам, Беласточчына падзялілі лес сваіх нямецкіх супляменнікаў.

Выпрацоўкі рашэнняў аб генацыдзе цыганоў у акупаваных Заходніх раёнах СССР, у тым ліку і ў Беларусі, займаліся ўсе ўзроўні нямецкіх улад. У гэтай сувязі трэба ўзгадаць перш за ўсё RSHA, а дакладней кажучы, яго ўпраўленне V (імперская крымінальная паліцыя), на чале якога стаяў ужо

[20] Romani Rose (Hrsg.). Der nationalsozialistische Volkermord an den Sinti und Roma. Stuttgart, 1995. S. 82; Friedlander. S. 397-404.

[21] Michael Zimmermann. Zigeunerpolitik im Stalinismus, im realen Sozialismus und unter dem Nationalsozialismus. Eine Untersuchung in vergleichender Absicht. Mannheim, 1996. S. 30 (далей «Zimmermann b»).

[22] Donald Kenrick. Das Schicksal der Zigeuner im NS-Staat / Donald Kenrick, Grattan Puxon, Tilman Zulch. Die Zigeuner. Verkannt, Verachtet, Verfolgt. Hannover, 1980. S. 43.

[23] Hans-Joachim Döring. Die Zigeuner im Nationalsozialistischen Staat. Hamburg, 1964. S. 143ff; Henry R. Huttenbach. The Romani Holocaust: The Nazi Genocide of Gypsies in Germany and Eastern Europe / The Gypsies of Eastern Europe: / Ed. by David Crowe and John Kolsti. London [u.a.], 1991. P. 40-41.

[24] Zimmermann b. S. 25.

[25] Kenrick. S. 43f; Wolfgang Benz. Der Holocaust. 7. Aufl. Munchen, 1999. S. 73.

[26] Russa. S. 128.

[27] Ebd.

[18] Romani Rose (Hrsg.). Der nationalsozialistische Volkermord an den Sinti und Roma. Stuttgart, 1995. S. 82; Friedlander. S. 397-404.

[19] Michael Zimmermann. Zigeunerpolitik im Stalinismus, im realen Sozialismus und unter dem Nationalsozialismus. Eine Untersuchung in vergleichender Absicht. Mannheim, 1996. S. 30 (далей «Zimmermann b»).

знаёмы з Артур Нэбэ; даследчыцкую ўстанову ў пытаннях расавае гігіены, якую ўзначальваў галоўны нямецкі спецыяліст у гэтым вывучэння цыганоў доктар Роберт Рытэр; адказны за дэпартацыі і знішчэнне перш за ўсё яўрэяў, але таксама і цыганоў Рэферат IV B 4 («Referat Auswanderung und Räumung»), якім загадваў оберштурмбанфюрэр СС Адольф Эйхман, і іншыя[20]. Пачынаючы з 1942 году асаблівую ўвагу цыганскай тэме надаў і рэйхсфюрэр СС Гімлер[21]. Пэўны час яго, напрыклад, захапляла ідэя захаваць групу «чыстых» цыганоў і ператварыць іх у нешта накшталт жывых музейных экспанатаў[22].

Увосень 1942 году лёс цыганоў стаў прадметам спрэчак і дыскусіяў, у якіх, акрамя ведамстваў СС, прынялі ўдзел таксама партыйная канцылярыя (Марцін Борман), міністэрства юстыціі (Герыг Тырак), міністэрства прапаганды (Ёзэф Гебельс) і іншыя ўстановы[23].

Пры канцы восені таго ж году Гімлер імкнуўся навязаць Гітлеру свае прапановы наконт вырашэння «цыганскага пытання». Выказванні фюрэра па гэтай тэме невядомыя. Ёсць, аднак, усе падставы лічыць, што супраць прапаноў Гімлера ён нічога не меў[24].

У студзені 1942 году дыскусія прыпынілася. 16 студзеня Гімлер загадаў вылучыць цыганскіх «мішлінгаў» (ням. «Mischling» - метыс), рома, а таксама «ненямецкакроўных членаў цыганскіх родаў балканскага паходжання» і тэрмінова накіраваць іх у канцлагер Асвенцым. Загад не ахопліваў цыганоў лалеры; «чыстых» цыганоў - сінці; «сінці-мішлінгаў, якія маглі быць аднесены да качэўных народаў»; «сацыяльна асіміляваных цыганоў і мішлінгаў»; цыганоў і «мішлінгаў», якія раней служылі ў нямецкім войску, - тых, хто быў звольнены з узнагародамі або быў паранены; тых, хто мог быць выкарыстаны для працы ў прамысловасці; мужоў ці жонак вышэйзгаданых асобаў альбо залежных ад іх; цыганоў з іншаземным грамадзянствам[25].

26 і 28 снежня 1943 году загад быў пашыраны на Альпійскія і Дунайскія гаўляйтэрствы Рэйху, 29 сакавіка - на Беласточчыну, Эльзас, Латарынгію, Люксембург, Бельгію і Нідэрланды.

[28] Ebd. S. 136.
[29] Ebd.
[30] Ebd.
[31] Ebd. S. 83, 136.
[32] Ebd. S. 136; Gerlach. S. 1066.
[33] Rose. S. 136.
[34] Ebd.; Gerlach. S. 1066.

Цыганы Германіі і Чэхіі былі вывезены ў 1942 годзе.

Цыганы Германіі і Чэхіі былі вывезены ў 1942 годзе.

Цыганы Германіі і Чэхіі былі вывезены ў 1942 годзе.

Цыганы Германіі і Чэхіі былі яшчэ ў жніўні 1941 года змешчаны ў зборных лагерах Леты і Гадонін, а праз год адтуль накіраваны ў Асвенцым[26].

У Асвенцыме быў створаны адмысловы цыганскі лагер (сэктар B.II.b, Біркенаў). На плошчы памерам 600 метраў удоўжкі і 120 метраў ушыркі месцілася 20 баракаў (да 800 чалавек у кожным), блок для хворых, кухня, канцылярыя і лазні. У ліпені 1943 году лагер акружылі агароджай, па якой быў пушчаны электраток[27].

Першыя цыганы трапілі ў Асвенцым 26 лютага 1943 году, пры канцы сакавіка іх было ўжо каля 11 000. Вязні цыганскага лагеру пазначаліся літарай «Z» і адпаведным нумарам (татуіроўка на руцэ)[28]. Згодна з лагернай статыстыкай, наймаладзейшаму вязню было 2 месяцы, а найстарэйшаму - 110 гадоў. У лагеры нараджаліся дзеці, якім на сцягне таксама выпальваўся нумар вязня[29]. Усе працаздольныя (у тым ліку і дзеці) мусілі выконваць цяжкую фізічную працу: перанос рэек да крэматорыяў, ліквідацыя дрэнажных равоў і г. д.[30]

Як і яўрэі, цыганы сталі аб'ектам злачынных медыцынскіх эксперыментаў Ёзэфа Менгеле і іншых сумнавядомых нямецкіх дактароў. Выкарыстанне цыганоў у гэтай галіне ініцыяваў Нэбэ. Прапанова знайшла падтрымку Гімлера, які выдаў адпаведны загад[31].

З Беласточчыны ў Асвенцым нацысты накіравалі прыкладна 2800 цыганоў (яшчэ раней у раёне Беластоку значная колькасць цыганоў загінула ад рук жандараў). Першую групу (1700 чалавек) лагерная адміністрацыя адразу ж па прыбыцці (23 сакавіка 1943 году) змясціла ў блоках 20 і 22 і ў тую ж ноч накіравала ў газавыя камеры. Цыганоў нават не зарэгістравалі, бо Менгеле западозрыў сярод прыбылых хворых на сыпны тыф[32].

У траўні 1943 году, з прычыны ўмоваў утрымання, у вязняў катастрафічна пагоршыўся стан здароўя. Значная колькасць цыганоў загінула ад голаду, ад сыпнога і брушнога тыфу, ад номы і ад гвалту лагернай аховы[33].

35 Kenrick, Puxon, S. 103.

36 Czech, Kalendarium, S. 1066.

37 Ebd.

38 Ebd.; Kenrick, S. 48.

Два тыдні наканавана было прабыць у цыганскім лагеры другой групе беластоцкіх цыганоў. Менгеле таксама западозрыў сярод іх вялікую колькасць (S. 25) і 1 жніўня 1943 году дэпартаваў 120 чалавек (сярод іх Сасіці Кулінеравай, Бобіці Гучнаўскай, Янкі Кемпскай і Ганны Сасіцкай) у Асвенцым. Там яны ўтрымліваліся ў былым лагеры для савецкіх ваеннапалонных (Берасце). Мужчыны і некаторыя жанчыны былі вымушаны працаваць на бетонным фабрыцы і на цэглавым заводзе. Яны ўтрымліваліся ў былым лагеры для савецкіх ваеннапалонных (Берасце). Мужчыны і некаторыя жанчыны былі вымушаны працаваць на бетонным фабрыцы і на цэглавым заводзе.

Лёс гэтых цыганоў, а таксама пытанне, ці ўваходзілі яны ў склад згаданых Герлахам 1000 усходнепрускіх сінці (S. 1066), няясны.

Трагічная адысея тысячы ўсходнепрускіх сінці распачалася ў траўні 1942 году, калі ўлады Усходняй Прусіі накіравалі транзітам праз Беласточчыну ў імперскі камісарыят «Украіна» дзве групы цыганоў. Улады камісарыяту пра дэпартацыю паінфармаваныя не былі. У выніку сінці былі змешчаны мясцовым кіраўніком СС і паліцыі ў берасцейскую турму (Берасце) уваходзіла ў склад камісарыяту «Украіна»). Пасля нейкі час цыганоў выпусцілі на волю, а нямецкія ўлады аказаліся ў парадаксальным становішчы: у Берліне працягваліся спрэчкі наконт вырашэння «цыганскай праблемы» (загад Гімлера вышаў толькі ў сярэдзіне студзеня), а сінці (жыхары Германіі) запатрабавалі забеспячэння харчамі на тым жа узроўні, як і для немцаў з Рэйху, а таксама выплаты пенсій[37].

Увосень 1942 году цыганоў змясцілі ў лагер для прымусовай працоўнай сілы, а ў студзені сярод іх пачалася эпідэмія сыпнога тыфу. Не выключана, што невядомая колькасць вязняў была расстраляна. У лютым 1943 году сінці былі перамешчаны на тэрыторыю берасцейскага гета (яўрэяў нацысты знішчылі яшчэ у 1942 годзе). Пад пагрозай смяротнага пакарання цыганам было забаронена пакідаць гета. Дакладна вядома, што за парушэнне гэтага загаду быў расстраляны сінта Герман К. (Hermann K.)[38].

Большая частка дэпартаваных усходнепрускіх сінці скончыла сваё жыццё ў Асвенцыме. Частку мужчын стэрылізавалі і накіравалі ў працоўны лагер Шэрбур (Францыя), дзе яны займаліся абясшкоджваннем бомбаў, якія не разарваліся[39].

[39] Kenrick, Puxon. S. 48; Kenrick, Puxon. S. 25; Zimmermann b. S. 25.

[40] Rose. S. 136.

[41] Zimmermann b. S. 26.

[42] Цымэрман узгадвае толькі забойства ва «украінскім Мазуры» і не пазначае даты падзеі (Zimmermann a. S. 269).

[43] Gerlach. S. 1065.

[44] Приказ № 24 коменданта Белоруссии Бехтольсхейма об уничтожении евреев и цыган (24 ноября 1941 г.). Цыт. паводле: Черноглазова Р., Лейзеров А. Трагедия евреев Белоруссии в 1941-1944 гг. Сборник материалов и документов. Минск, 1995. С. 71; Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Jürgen Matthaus (Hrsg.). Einsatz im «Reichskomissariat Ostland». Dokumente zum Volkermord im Baltikum und in Weißrußland. Berlin, 1998. S. 78.

[45] Huttenbach. P. 38-39; Zimmermann b. S. 25; Арад. С. 34, 36.

[46] Zimmermann a. S. 269.

[47] У шэрагу даследаванняў (Kenrick, Puxon. S. 104; David M. Crowe. A history of the gypsies of Eastern Europe and Russia. London [u.a.], 1995. P. 185; Gerlach. S. 1065) ліст Лёзэ да Екельна пазначаны 24 снежня 1941 году (пярэдаднем свята Нараджэння Хрыстовага). Паводле Цымэрмана (Zimmermann a. S. 269), ён датуецца 4 снежня.

[48] Kenrick, Puxon. S. 104f; Zimmermann a. S. 269f; Crowe. S. 185.

[49] Kenrick, Puxon. S. 105.

[50] Ebd.

Пасля таго як працаздольныя цыганы былі накіраваны ў лагеры Бухенвальд, Мітэльбаў-Дора, Флосенбург і Равенсбрук, у ноч з 2 на 3 жніўня 1944 году цыганскі лагер Асвенцыму спыніў сваё існаванне. 2897 вязняў (галоўным чынам старыя, жанчыны і дзеці) загінулі ў газавых камерах.

Ліквідацыя лагеру, аднак, не спыніла дэпартацый. Так, у прыватнасці, 26 верасня 1944 году ў Асвенцым прыбылі 200 цыганскіх дзяцей з Бухенвальду, якіх адразу ж накіравалі ў газавыя камеры[40]. Амаль 22 600 цыганоў з розных куткоў Еўропы змясцілі нацысцкія забойцы ў Асвенцыме. Больш за 19 300 з іх засталіся ў лагеры назаўсёды[41]…

Пра лёс цыганоў Берасцейшчыны, Піншчыны і іншых тэрыторыяў, аднесеных да імперскага камісарыяту «Ўкраіна», невядома амаль нічога. У літаратуры ўзгадваецца толькі выпадак у Мазыры, дзе цыганоў забіла з уласнай ініцыятывы ахоўная каманда[42].

[51] Ebd.

ГЕНЕРАЛЬНАЯ АКРУГА «БЕЛАРУСЬ»

У кастрычніку 1941 году камандзір 707 пяхотнай дывізіі генерал Густаў фон Бехтальсгайм загадаў пры выяўленні забіваць цыганоў адразу на месцы. Якія практычныя вынікі меў гэты загад, не высветлена[43]. Адзначым, што Бехтальсгайм застаўся верны сваім радыкальным поглядам. 25 лістапада ён, будучы ўжо камендантам Беларусі, падкрэсліў у сваім загадзе № 24 неабходнасць знішчэння яўрэяў і цыганоў[44].

[52] Ebd.

У верасні 1941 году нацысты працягвалі «ачышчаць» тэрыторыю Рэйху, Люксембургу і Пратэктарату Багемія і Маравія ад цыганскага насельніцтва. У Лодзь, а пазней у Рыгу, Менск і Коўна накіраваліся эшалоны з яўрэямі. Паміж 16 кастрычніка і 4 лістапада ў Лодзь былі дэпартаваны 5000 цыганоў з аўстрыйскага Бургенланду. Трохі пазней (канец 1941 - пачатак 1942 году) аўстрыйскіх цыганоў патруцілі ў газавых камерах лагеру Хелмна[45].

[53] Kenrick, Puxon, S. 105; Zimmermann, S. 186.

Пры канцы 1941 - у пачатку 1942 году дапаможная казацкая каманда на загад гаўптштурмфюрэра СС (Менскае ведамства

камандзіра паліцыі бяспекі і СД) знішчыла некалькі дзесяткаў рома[46].

3 Zimmermann b. S. 24.

34 ініцыятывы камандуючага паліцыяй парадку «Остланду» Георга Едыке імперскі камісар Лёзэ накіраваў 24 снежня 1941 году[47] сакрэтны ліст на імя вышэйшага кіраўніка СС і паліцыі «Остланду» Фрыдрыха Екельна, у якім патлумачыў сваё разуменне «цыганскага пытання»[48].

У вандроўных цыганах Лёзэ бачыў падвойную небяспеку. Па-першае, яны, паводле слоў імперскага камісара, з'яўляліся пераносчыкамі заразных хваробаў; па-другое - «ненадзейным элементам», які немагчыма было прымусіць да карыснай працы. Акрамя таго, яны шкодзілі «нямецкай справе», бо распаўсюджвалі варожыя звесткі. Да вандроўных цыганоў Лёзэ прапанаваў ставіцца так, як і да яўрэяў (інакш кажучы - знішчаць. - **Аўт.**). Аселыя цыганы ў лісце не ўзгадваліся.

Прапановы Лёзэ не сталі канчатковым варыянтам вырашэння «цыганскага пытання» ў камісарыяце «Остланд». У чэрвені 1942 году кіраўнік міністэрства акупаваных усходніх тэрыторый Альфрэд Розенберг запатрабаваў ад свайго падначаленага Лёзэ дакладнай інфармацыі пра становішча цыганоў на тэрыторыі камісарыяту[49].

У сакавіку 1943 году Розенберг накіраваў Гімлеру, партыйнаму і вайсковаму кіраўніцтву, а таксама імперскім камісарам «Остланду» і «Ўкраіны» праект, у якім выявіў уласнае бачанне будучыні цыганскага насельніцтва ў падначаленых яму рэгіёнах[50].

У сваім праекце Розенберг не рабіў аніякай розніцы паміж аселымі і вандроўнымі цыганамі. Усіх цыганоў без выключэння належала накіраваць у спецыяльныя лагеры альбо пасяленні. Той жа лёс чакаў і цыганскіх «мішлінгаў», якія ўвогуле павінны былі разглядацца ў якасці цыганоў.

Гімлер знайшоў некаторыя погляды Розенберга непрымальнымі. Справа ў тым, што ў нетрах RSHA панавала іншае меркаванне наконт лёсу цыганоў «Остланду» і «Ўкраіны». Рэйхсфюрэр СС палічыў патрэбным падкрэсліць

розніцу паміж аселымі і вандроўнымі цыганамі. Калі да першых (таксама як і да аселых «мішлінгаў») трэба было ставіцца як і да іншага насельніцтва краю (зразумела, што пра яўрэяў гаворка ў гэтым выпадку не ішла), то ў адносінах да другіх (як і да вандроўных «мішлінгаў») Гімлер збольшага пагадкаўся з прапановамі міністра акупаваных усходніх тэрыторыяў[51].

Адрозненне паміж аселымі і вандроўнымі цыганамі і прывілеяванае становішча першых адносна другіх - асаблівасць нацысцкай «цыганскай» палітыкі ў камісарыятах «Остланд» і «Ўкраіна». «Остланд» і «Ўкраіна» - адзіныя рэгіёны акупаванай Еўропы, дзе было ўведзена гэтае адрозненне[52].

Паведамленне жандарскага посту Ляхавны раённаму кіраўніку жандармерыі (Баранавічы) пра расстрэл цыганоў (26 жніўня 1942 году). Цыт. паводле: Benz, Kwiet, Matthäus. S. 253f.

Из акта Городищенской районной комиссии об истреблении и угоне в рабство немецко-фашистскими захватчиками советских граждан на территории Городищенского района Барановичской области в 1941-1944 гг. Цыт. паводле: Черноглазова, Лейзеров. С. 117; Gerlach. S. 1065.

Да аселых цыганоў і «мішлінгаў» было загадана ставіцца як і да жыхароў краю. Вандроўныя цыганы і «мішлінгі» апынуліся на адной прыступцы з яўрэямі і накіроўваліся ў канцлагеры. У спрэчных выпадках пытанне аб прыналежнасці да цыганскага народу належала вырашаць кіраўніку паліцэйскага ведамства.

Цымерман тлумачыць розніцу ў разуменні «цыганскага пытання» датычна Рэйху і акупаваных усходніх тэрыторый наступным чынам[54].

Калі ў нямецкіх т. зв. аселых «асацыяльных цыганскіх мішлінгах», якія страцілі характэрныя для цыганоў рысы і актыўна кантактавалі з немцамі, нацысты бачылі пагрозу разлажэння нямецкага народу, дык нямецкія цыганы-вандроўнікі з іхнім традыцыйным ладам жыцця падаваліся ў гэтым сэнсе адносна «бяскрыўднымі».

Асістэнтка Р. Рытэра Эва Юстын дакладна пазначыла ў сваёй дысертацыі «Lebensschicksale artfremd erzogener Zigeunerkinder und ihrer Nachkommen» (Берлін, 1944), што «цыганскае

55 Gerlach. S. 1065.
56 Ebd.
57 Паралаксальным чынам пэўная частка беларускіх цыганоў абавязана сваім выратаваннем асаблівому меркаванню рэйхсфюрэра СС.
58 15 лістапада 1943 году пабачыў свет канчатковы варыянт пастановы, у якім у поўнай меры былі ўлічаны заўвагі Гімлера[53].
59 Gerlach. S. 1065.

пытанне» нельга параўнаць з яўрэйскім, бо цыганы, у адрозненне ад яўрэяў, не маюць магчымасці падарваць нямецкі народ як цэлае».

На акупаваных усходніх тэрыторыях становішча было дыяметральна процілеглым. Менавіта ў вандроўных цыганах нацысты бачылі пагрозу для нямецкага войска і таму бязлітасна вынішчалі іх.

Пакуль у Берліне працягвалася спрэчка наконт лёсу цыганоў «Остланду» і «Ўкраіны», на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь» поўным ходам ішла ліквідацыя рома.

Забойствы звычайна выконвала нямецкая жандармерыя, якой дапамагалі беларускія і іншыя ахоўныя каманды. Загады паступалі з боку грамадзянскіх уладаў. Так, лідскія цыганы былі знішчаны ў 1942 годзе на загад кіраўніка штабу пры раённым камісару Віндыша[55]. У Вялейцы й Клецку рома былі забіты ў 1942 годзе і пахаваныя ў той жа магіле, што і мясцовыя яўрэі[56].

26 жніўня 1942 году жандарскі пост Ляхавічаў далажыў раённаму кіраўніку жандармерыі (Баранавічы) пра расстрэл цыганскай сям'і з шасці чалавек. Паводле паведамлення бургамістра Сарытава (Ляхавіцкі раён), цыганы былі выяўлены, забіты і 25 жніўня пахаваны ў зручным месцы[57].

Цыганы Гарадзішча былі змешчаны ў гета разам з мясцовымі яўрэямі, а ў лістападзе 1942 году расстраляны каля праваслаўных могілак (100 чалавек)[58]. У 1941-1942 гадах у раёне Глыбокага загінулі каля 1000 рома[59].

Яшчэ напрыканцы лета 1942 году Гімлер прызначыў высокага кіраўніка паліцыі і СС на тэрыторыі Цэнтральнай Расіі Эрыха фон Бах-Цэлеўскі (Erich von Bach-Zelewski) шэфам т. зв. «аддзелаў па барацьбе з бандамі» («Bandenbekampfungsverbände», пад бандамі на ўвазе меліся партызаны. - **Аўт.**), складзеных з ліку нямецкіх паліцэйскіх, беларускіх, літоўскіх, украінскіх і іншых добраахвотнікаў, салдат Вермахту і г. д. Значную частку ахвяраў аддзелаў Бах-Цэлеўскі, якія дзейнічалі ў тым ліку і на ўсёй тэрыторыі

Беларусі, склалі яўрэі, у якіх нацысты бачылі галоўных натхняльнікаў, удзельнікаў і памочнікаў партызанскага руху. Да партызанаў і іхніх памочнікаў былі аднесены і цыганы, якія таксама сталі ахвярамі карных антыпартызанскіх аперацыяў «Bamberg», «Nürnberg», «Hamburg«, «Altona» і іншых. Так, у прыватнасці, падчас аперацыі «Hamburg» (10-21 студзеня 1942 году) у раёне Слоніму былі затрыманы 30 цыганоў з вялікай колькасцю прыпасаў[60].

Пытанне, у якой ступені загад ад 16 лістапада 1943 году адбіўся на лёсе цыганоў генеральнай акругі «Беларусь», застаецца нявысветленым. Тым не менш пазначым, што звестак пра дэпартацыі рома з гэтай тэрыторыі ў Асвенцым у 1943-1944 гадах няма.

[60] Crowe. P. 88; Gerlach. S. 902.

«ВОБЛАСЦЬ АРМЕЙСКАГА ТЫЛУ»

У «вобласці армейскага тылу» адбылася першая з шэрагу рэканструяваных антыцыганскіх акцыяў на тэрыторыі Беларусі: у другой палове верасня 1941 году палявая камендатура 181 (Лепель) перадала айнзацкамандзе-9 23 цыганы (13 мужчын і 10 жанчын), якія нібыта тэрарызавалі сельскае насельніцтва і здзяйснялі крадзяжы[61].

У кастрычніку-лістападзе 1941 году вайсковыя ўлады выдалі адпаведныя загады (напрыклад, загад № 25 палявой камендатуры 528 (Рагачоў) ад 8 кастрычніка 1941 году), паводле якіх усе рома падлягалі арышту і перадачы паліцыі бяспекі і СД[62]. У тылавых раёнах армейскіх груповак «Цэнтр» і «Поўнач» дзейнічалі наступныя інструкцыі: цыганоў, што на працягу мінімум двух год вялі аседы лад жыцця, было загадана не чапаць, але тым не менш наглядаць за імі; цыганы-вандроўнікі перадаваліся айнзацкамандам[63].

[61] Zimmermann a. S. 260; Gerlach. S. 1063.
[62] Gerlach. S. 1063.

У гарадах і мястэчках усходняй і паўднёва-ўсходняй Беларусі, а таксама заходняй Расіі аддзелы айнзацкаманды 8, на чале якой стаяў штурмбанфюрэр СС доктар Ота Брадфіш, знішчылі каля 20 000 савецкіх грамадзянаў (у пераважнай большасці яўрэяў)[64]. 10 кастрычніка карнікі Брадфіша пры дапамозе паліцыі забілі 50 магілёўскіх цыганоў[65].

У студзені 1941 году ў Мар'інай Горцы на працягу некалькіх тыдняў у жахлівых умовах утрымліваліся 200 рома. Значная колькасць іх тыдняў (галоўным чынам - жанчыны і дзеці) загінула, астатнія былі расстраляны пры канцы 1941 і ў пачатку 1942 году[66].

На рубяжы 1941-1942 гадоў айнзацгрупы ўсё часцей пачалі выкарыстоўваць так званыя «душагубкі» (машыны, у якіх ахвяраў атручвалі выхлапнымі газамі) у якасці сродку для знішчэння мірнага насельніцтва[67]. Для знішчэння цыганоў і далей ужываліся масавыя расстрэлы.

У 1942 годзе пераслед рома ў «вобласці армейскага тылу» ўзмацніўся[68].

У пачатку году група з 20 цыганоў патрапіла каля Віцебску ў рукі айнзацкаманды 9. Карнікі расстралялі іх усіх, у тым ліку і старую цыганку, якая дарэмна прасіла літасці. Нямецкі камандзір застаўся непахісны: цыганка магла расказаць пра забойства і таму павінна была памерці[69].

Таксама ў пачатку 1942 году зондэркаманда 7а затрымала і забіла 10-15 рома, якія рухаліся на конях і вазах у бок Клінцоў (Бранская вобласць)[70].

Новая хваля забойстваў у «вобласці армейскага тылу» прыпадае на сакавік 1942 году: 33 цыганы ў Магілёве (айнзацкаманда 8 з дапамогай паліцыі), спачатку 45 цыганоў, а пазней яшчэ каля 30 цыганоў і 270 яўрэяў - у Клінцах (зондэркаманда 7а). У апошнім выпадку забойцы прывезлі ахвяраў да ямы, канфіскавалі грошы і частку вопраткі, а потым расстралялі. За акцыяй назіралі нямецкія вайскоўцы[71].

У канцы сакавіка - пачатку красавіка 1942 году айнзацкаманда 9 павезла і хутка знішчыла мінімум 20 цыганоў[72]. Праз другі тыдзень красавіка 1942 году зондэркаманда 7а працягнула сваю карную дзейнасць у Клінцах: 50 рома былі знішчаны[73]. Каля 1000 цыганоў былі знішчаны ў раёне Смаленску (расстраляныя і часткова пахаваныя яшчэ жывымі)[74].

У красавіку 1942 году айнзацкаманды канчаткова

63 Ebd. S. 1064.

64 Ebd. S. 385ff, 595-602.

65 Ebd. S.1064.

66 Ebd.

67 Eugen Kogon, Hermann Langbein, Adalbert Rückerl u.a., Nationalsozialistische Massentötungen durch Giftgas. Frankfurt am Main, 1983. S. 87.

68 Kenrick, Puxon, S. 104.

69 Zimmermann a. S. 263.

70 Kenrick, Puxon, S. 104; Justiz und NS-Verbrechen Bd. IV, S. 620, Lfd. Nr. 120, Urteil vom 27.11.1964.

ператварыліся ў стацыянарныя ўстановы паліцыі бяспекі і СД (некаторыя з іх былі стацыянарнымі ўстановамі яшчэ з канца 1941 году). Такім чынам карныя акцыі айнзацкамандаў набылі больш «сістэматычны» характар, яны пераставаліся быць толькі ўзброенымі нападамі на мірных жыхароў, а

79 Вытрымка са справаздачы айнзацгрупы В аб сваёй дзейнасці і становішчы за перыяд ад 15 лістапада да 15 снежня 1942 году. Цыт. паводле: Benz, Kwiet, Matthäus. S. 229.

80 Вытрымка са справаздачы айнзацгрупы В аб сваёй дзейнасці і становішчы за перыяд ад 15 лістапада да 15 снежня 1942 году. Цыт. паводле: Benz, Kwiet, Matthäus. S. 230.

81 Zimmermann a. S. 262.

82 Ebd.

83 Rose. S. 110.

84 Kenrick, Puxon. S. 104.

85 Дарма што забойства адбылося ў раёне Барысава, які

развіты рух супраціву, партызанскі атрад імя Чапаева, які дзейнічаў у раёне Барысава, а таксама ў згаданыя ў іншых справаздачах «у сваёй большасці… расава і духова непаўнавартыя элементы», «сабатажнікі», «рабаўнікі», «партызаны», «непажаданыя элементы» ці ўвогуле «іншыя» патрапіла значная колькасць рома[81].

З іншага боку, нельга выключаць, што сярод ахвяраў т. зв. «Zigeuneraktionen» маглі быць і іншыя мясцовыя жыхары, якія дачынення да рома не мелі, але былі абвінавачаны, напрыклад, у рабаўніцтве, якое лічылася традыцыйным заняткам цыганскага насельніцтва[82].

Малапраўдападобным падаецца, аднак, меркаванне гісторыка Рамані Розэ, які сцвярджае, што частку ахвяраў т. зв. «Judenaktionen» (антыяўрэйскіх акцыяў) склалі цыганы[83].

Пра забойства цыганоў у 1943-1944 гадах маюцца толькі некалькі адрывачных паведамленняў. Кенрык і Паксан назначаюць, што ў 1943 годзе ў «вобласці вайсковага тылу» ў нейкай ступені аслабіўся пераслед аселых цыганоў (у 1941-1942 гадах тут аднолькава вынішчаліся і аселыя, і вандроўныя цыганы)[84].

Увосень 1943 году 100 рома былі расстраляны ў раёне Барысава[85].

17 чэрвеня 1944 году, за 9 дзён да вызвалення гораду войскамі I Прыбалтыйскага і III Беларускага франтоў, 18 віцебскіх рома былі накіраваны ў Асвенцым[86]. Гэтая дэпартацыя стала, відаць, апошняй падзеяй у гісторыі нацысцкага генацыду супраць беларускіх цыганоў.

КОЛЬКАСЦЬ ЗНІШЧАНЫХ ЦЫГАНОЎ

Памеры нацысцкіх злачынстваў супраць цыганскага народу і да сённяшняга дня застаюцца прадметам спрэчак навукоўцаў і палітыкаў. Паводле розных падлікаў, падчас Pořajmos загінула ад 250 000 да 1 000 000 - 4 000 000 еўрапейскіх цыганоў.

Большасць дапенсіўнай зваргі ібеларусы, Герлах (S. 1065) 70-80% цыганскага насельніцтва еўрапейскага рэгіёну, якая кантралявалася вайсковымі ўладамі.

Ахвярамі генацыду сталі каля 30 000 - 35 000 савецкіх цыганоў[88]. Паводле падлікаў Хрыстыяна Герлаха, Беларусь страціла падчас вайны каля 3000 цыганскіх жыхароў[89]. Ёсць, аднак, усе падставы меркаваць, што на самай справе гэтая лічба з'яўляецца куды большай. Трагедыя беларускіх цыганоў усё яшчэ чакае сваіх даследчыкаў.

[87] Huttenbach. P. 45.
[88] Kenrick, Puxon. S. 105; Crowe. P. 186.
[89] Gerlach. S. 1063.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (31) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне [mk], Абнаўленьне [czyk]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ
пісьменьнік, эсэіст. Выкладае гісторыю і грамадазнаўства ў адной з гомельскіх школаў.

Сяргей Балахонаў
Пятнаццаць лішніх хвілін

Дзяўчына трымалася годна. Не палохаючыся прысутных, дэклямавала завучаны верш:

Як радасьць для сябе, вайну я прывітаў
Радкоў маіх лірычнейшым салютам...

Маладзенькія грудзі рытмічна ўздымаліся пры кожным слове, прамоўленым з большым надрывам, зь вялікшаю імпэтнасьцю. З усяго здавалася, што Надзейка на самай гары ўзрушэньня і што ў тую хвілю яе немагчыма было запыніць. «Агнявая б каханка выйшла», - ужо ў каторы раз памысьліў Барыс Макаравіч і мала не аблізнуўся, пільнуючы, як ружавела яго найлепшая вучаніца.

Урок доўжыўся далей, і настаўнік, адагнаўшы юрлівыя подумы, па-майстэрску зводзіў у адно навучальныя, выхаваўчыя і разьвіцьцёвыя мэты. Не забываўся ён і на моманты ідэалягічныя. «І сягоньня, калі магутнае нямецкае войска пад павадырствам вялікага Адольфа Гітлера аслабаніла Беларусь ад бальшавіцка-жыдоўскага паняволеньня, перад намі расчыніліся новыя далягляды ў працы і барацьбе», - акурат

перад самым званком падвёў ён пад урокам рысу ды адпусьціў дзятву на перапынак.

Госьці, а апрача дырэктара гэта быў сам акруговы камісар з загадчыкам школьнага аддзелу, былі ўсьцешаныя. Акруговы камісар, не зважаючы на падкрэсьленую стродкасьць, дазволіў сабе ўсьміхнуцца. Па-беларуску, хоць і зь пятае на дзясятае, ён разумеў, бо добра абазнаўся ў мове славацкай, тры гады меўшы аналягічную па функцыях пасаду ў «самастойнай» Славаччыне. Яму дапраўды было прыемна, што сярод тубыльцаў ёсьць такія экзэмпляры, як гэны настаўнік. Шчырасьць Барыса Макаравіча замераць было немажліва, але ж ён, прынамсі, агучваў належныя пастуляты ды не зрываў зь сьцяны партрэту фюрэра, як гэта неаднакроць здаралася ў іншых акругах Беларусі. Таму камісар даваў настаўніку адно дадатныя характарыстыкі, што сунімалі страх, каторы ад'ядаю душы сядзеў у Барысавых каменных начальніках. Сам Барыс Аляксючыц страху за сабой не прыкмячаў і ад заняткаў чакаў толькі гэткіх выкшталцоных вынікаў, бо па-іншаму, як лічыў, і быць не магло. Празь якіх пятнаццаць хвілін гутарка ў клясе закончылася ўсеагульным «Heil Hitler!». Настаўнік найвыразна вымавіў гэтыя два словы і зграбна ўскінуў руку ў гару. І толькі тады, калі госьці сышлі, ён сеў за стол, цяжка ўздыхнуў і, цярэбячы даланёю лоб, зусім ціхенька прашаптаў: «Сукі .баныя». Фраза прагучэла настолькі ціха, што сяму-таму звонку падалася б абыклай тарабаршчынай, каторай настаўнік да і пасьля ўроку разьмінаў вусны. Толькі суворая міна Гітлера на партрэце нібыта выказвала моманты занепакоенасьці і неўразуменьня. Насамрэч нават так ціха Барыс Макаравіч ня меў права выслаўляцца, бо кожнае неасьцярожна народжанае слаўцо патэнцыйна валакло да правалу. Становішча і так было ня дужа трывалым, не зважаючы на дачасныя пахвальбы адміністрацыі.

З новым званком кляса напоўнілася дзецьмі. Настаўнік ізноў ледзь прыкметна, але бясслоўна ўздыхнуў і пачаў наступны паводле раскладу ўрок. Вывучалі Максіма Багдановіча. Сам Аляксючыц любіў гэтую тэму і самазабыцьцёва перарываў сваё апавяданьне цытаваньнем урыўкаў, а то і цэлых вершаў, не зазіраючы ў паабтрапаны зборнік трыццацігадовае даўніны. Ды як заўсёды мала было сказаць пра беларускі патрыятызм паэта.

Трэ было паказаць у ягонай паэзіі нямецкія матывы, уплывы вялікіх нямецкіх Dichter'аў, адным словам - усё, што лучыць Багдановіча зь Нямеччынай. І хоць завіхаўся ў гэтай частцы ўроку, як поп у талацэ, але ж ніхто ня змог бы сказаць, што ён ігнаруе інтарэсы Reich'у ў культурным выхаваньні беларусаў. Цудоўна ведаў, чыіх дзетак вучыў і хто зь іх усё чыста даносіў бацькам пра зьместавае напаўненьне ўрокаў. Старосты, паліцыянты, гандляры... Тыя, што супрацоўнічаюць.

Звонку ўсё выглядала на тое, што і спадар Аляксючыц таксама з тых, хто супрацоўнічае. Прынамсі, вакольныя верылі ў гэта. Нездарма невядомыя зламысьнікі аднойчы ўначы пакінулі на варотах яго дому надпіс «Фашыстоўскі лёкай». Добра, што лясныя госьці, баючыся прысутнасьці ў мястэчку ладнага кантынгенту войск SS, не прыходзілі сюды. Барыс Макаравіч ня здолеў бы апраўдацца, бо пра яго заданьне ўкурсаваныя былі тры-чатыры чалавекі. Спадар настаўнік быў удзельнікам камуністычнага падпольля. Падпольная мянушка Істрабіцель гаварыла пра істу ягонага заданьня, а дакладней - цэлага бестэрміновага ланцуга заданьняў.

Барыс Макаравіч спэцыялізаваўся на вынішчэньні тых, хто супрацоўнічаў зь немцамі. «Штаб» даваў яму поўны карт-блянш у дзеяньнях, але найважнейшаю ўмоваю было патрабаваньне прастрэліць сабе галаву ці ў іншы спосаб паквітацца з жыцьцём пры рэальнай пагрозе трапіць у палон. Мабыць, з гэтай прычыны Істрабіцель дзеяў вельмі асьцярожна і рафінавана. Стараўся па мажлівасьці мець не абы-якое алібі, быць непрыкметным (пераапранаўся), забіваць ціха, бяззбройна. «Штаб» сам вызначаў квоту сьмяротнікаў. Ніякіх сувязных не прадугледжвалася. Аляксючыц мусіў уважліва сачыць за тутэйшай газэтай «Нюськавіцкі ходаньнік» і шукаць матэрыялы за подпісам Зося Шчодрая. Зазвычай то былі вершы. Менавіта ў іх і зашыфроўваліся чарговыя імёны й прозьвішчы асуджаных на сьмерць фашыстоўскіх халуёў. Ключом жа для дэшыфраваньня заўсёды быў адзін і той жа верш Максіма Багдановіча на старонцы 62 у першым выданьні зборніку «Вянок». За паўгадзінкі Істрабіцель дабіраўся да праўды. А цягам найбліжэйшага тыдня хоцькі-няхоцькі выконваў пастаўленую задачу. Прамаруда ўважалася «Штабам» за здраду

і падлягала найсуворшаму пакараньню.

У чарговым нумары «Нюськавіцкага ходаньніка», акром ілжывых паведамленьняў аб «станаўкіх пасьпехах» нямецкіх войскаў на Волзе, артыкулаў пра беларускае школьніцтва, неабходнасьць адпраўкі моладзі «на стажаваньне ў самае сэрца Нямеччыны» ды іншага ідэалягічнага хлуду, Барыс Макаравіч так і ня здолеў агледзець умоўленага подпісу. Новая апэрацыя адтэрміноўвалася. Істрабіцель адклаў газэту й задуменна асеў на канапу. Сэрца няўцямна шчымела. Узьніклае пры тым пачуцьцё вельмі нагадвала зьлючную няпэўнасьць, з каторай у сярэдзіне 30-х даводзілася штовечар спрабаваць заснуць.

У акно ціхутка пастукалі. Аляксючыц наструніўся - пісталет быў прыхаваны ў трысьцене пад масьнічынай. Але на палёгку за акном мільгатнула постаць Надзейкі Шуло. Настаўнік упусьціў яе ў хату і ветліва папытаўся на прычыну раптоўных адгостак. Тая загадкава маўчала, з-пад лоба пазіраючы на Барыса Макаравіча. Плечы яе дрыжэлі, рукі ўлегцы калаціліся.

- Дык што такое? - паспрабаваў яшчэ разок высьветліць ён.

- Мяне ніхто ня бачыў, - неўпрыцям прамовіла вучаніца й надзіва хуткім, бліскавічным рухам скінула зь сябе спадніцу. - Я ваша. Цалуйце. Усю без астачы...

На раніцу спадара настаўніка адолелі згрызоты. Ноч увачавідкі выдалася незвычайнай. Але ці варта было патураць хоцькам сьпеленькай юначкі? Ці ня лепш было й самому паўстрымацца ад быдлячых поцягаў? Барыс Макаравіч задуменна трымаў у руцэ конаўку з гарачым мятавым узварам. Надзейка пахла мятай. І рамонкамі. І зьверабоем. З кожным глытком у нутрыне ўзрастала трывога. Трывога невытлумачальна колкая і пранізьлівая. А раптам дзяўчыну заўважылі па дарозе да ці ад яго? Любое гучнае разьбіральніцтва, кожны няціхі скандал для Аляксючыца рабіліся роўнымі правалу. Нясьведама ён пацёр правую скронь. У галаве жудасна зазьвінела. Успомнілася першая гадавіна сталінскае канстытуцыі.

У засьнежаным Менску аб тую пару было холадна. Людзі маўчалі, міжволі мераючы тэмпэратуру не па Цэльсію, а

паводле НКВД. Барыса Макаравіча арыштавалі тады а дзясятай вечару. Надзвычайная тройка адразу ж навешала гурму абвінавачаньняў, пачынаючы нацдэмаўшчынай і сканчаючы шпіянажам на карысьць Антарктыды. Хлапца нават і слухаць ня сталі. «Прыгавор прывясьці в іспалненіе безатлагацельна», - мовіў хтосьці бяз твару. Засуджаны спрабаваў апраўдвацца: крычаў, спасылаўся на саюзную і беларускую канстытуцыі. У адказ даставаў мацюкоў і высьпяткаў, ад якіх сінела ўваччу. Ён амаль разьвітаўся із спадзевамі выжыць. Але нечакана на выхадзе з турмы ягоных канваіраў зарыштавалі таямнічыя людзі ў цывільным. Канкурэнтны аддзел НКВД вырашыў падняць паказьнікі за кошт арышту сваіх калег. Барыс адно лыпаў вачыма, назіраючы спэктакль, які перад ім адбываўся, і нічога ў ім не разумеў. «Давай валі на ху. адсюда», - ласкава параіў яму адзін з прыбышоў. Гэтая гісторыя з Антарктыдай неаднакроць сьнілася Аляксючыцу пасьля за чаканьнем працягу.

Працяг няўцейкам праявіўся на дзявятым месяцы нямецка-савецкай вайны - той самы ласкавы вызвольнік аб'явіўся перад Барысам Макаравічам із словамі: «Ты мусіш нам памагаць. Як камуніст, як верны сталінец, ты вінен бароцца супраць той сволачы, што шалудзіла нашай дзяржаве да вайны і што зараз прадаўжае свой паскудны чын. Гэта яны прычынныя ў сьмерцях бязьвінных: сваімі подлымі паклёпамі яны накінулі кляймо ворагаў народу на чэсных савецкіх грамадзян, такіх вось, як ты. Цяпер у іх сатрудніцтва з фашыстамі. Не дамо ім пачувацца вальготна». Гаварыў прысланец складна і амаль па-беларуску, а як толькі Аляксючыц заікнуўся пра «трэба падумаць», адцяў: «Можаш не пасьпець». Намінку было дужа проста зразумець. Пагатоў па Менску распаўзлося тады цімала чутак пра загадкавыя забойствы гараджан. Ад тых забойстваў нават немцы іншым разам жахаліся. Давялося пагадзіцца і пасьля трохгадзіннага інструктажу выправіцца ў Нюськавічы, дзе пільна патрабаваўся настаўнік...

Галава балела ўвесь дзень. Надзейка паводзілася стрымана і ніяк не выдавала тое, што іх дачыненьні з настаўнікам надоечы рэзка зьмянілі свой характар. Барыс Макаравіч, ходаючыся з брыдкім самапачуваньнем, не забыўся, аднак, паглянуць у

сьвежы «Нюськавіцкі ходаньнік». Чыста парнаграфічная рыфмаванка Зосі Шчодрай красавала на чацьвертай старонцы.

Вясна заве мяне кахаць.
Ёсьць недзе прынц - адзіны, любы.
Не супынюсь яго чакаць,
Агнём палаць, гарэць да згубы.
Найлепшы дбайца пра мяне,
Шаноўны рыцар, носьбіт цуду.
Любоў да йго не праміне,
Ён бо такі, такі, як Кубэ.

Настаўнік уздыхнуў і сплюнуў. Вершы пра каханьне, хай сабе й такія брыдкія, азначалі, што зьніштажаць трэба ўсю сям'ю зашыфраванага дзеяча. У ягонай практыцы быў толькі адзін такі выпадак, і паўтарэньня гэнага Аляксючыц не хацеў. Адганяючы прэч сваё нежаданьне, Істрабіцель дастаў Багдановічаў «Вянок» і ўзяўся за расшыфроўку. Пачатковыя літары кожнага Зосінага радка неабходна было перавесьці ў лічбы паводле парадку іх разьмяшчэньня ў альфабэце. Зрабіўшы гэта, Барыс Макаравіч разгарнуў «Краю мой родны! Як выкляты Богам...» і пачаў зводзіць рахубы: супастаўляць атрыманыя лічбы зь літарамі клясычных радкоў.

В	Ё	Н	А	Н	Ш	Л	Ё
3	7	15	1	15	27	13	3
А	Д	А	М	Ш	У	Л	О

Вынік скалануў. Вынік выцяў па твары. Вынік надарваў дыханьне. Загадчык нюськавіцкай вадакачкі Адам Шуло быў бацькам Надзейкі - найлепшай вучаніцы і палюбоўніцы Аляксючыца. Загад выракаў зрабіць сьмерць і ёй. «Да якой халеры ім гэтая вадакачка? - высьвятляў сам сабе Істрабіцель. - Завошта зьніштажаць загадчыка? Нягож ён такі вялікі вораг? Мацёры здраднік? І дзеркачу ясна, што ён вымушана супрацоўнічае зь немцамі. Што яму закідваюць? Нацыяналізм? Удзел у карных апэрацыях? Частаваньне былых савецкіх грамадзян бруднаю вадою? Брэдні. Біліндрасы на трыногу!

Завошта? Ці то яны мяне выпрабоўваюць? Так ня можа быць. Калі і шлындаюць дзесь тутака іхныя агенты, якія ўпільнавалі маю з Надзейкай (Надзейка!) ночку, то ў кожным разе яны б ня здолелі так хутка разьмясьціць у газэце гэтае курвенства. Супадзеньне? Супадзеньне, але прыкрае, але страшнае. Хоць біся галавою аб сьцяну. Як? Што рабіць далей? Дзе ўзяць адказ? Я не хачу іх забіваць... Заб'юць мяне. Даб'юць. Тады пашанцавала. Цяпер - солі ў вочы, а не шанцаваньня. Накрыюць. Не пабачыць залацістага й яснага. Ні халеры не агледзець. Нават самай наймаленечкай. Што рабіць? Як рэагаваць? Як?».

Нібыта чорная хмара павісла над ім. Нічога не выходзіла надумаць. Адпраўка Надзейкі ў Нямеччыну падавалася шчэ больш небясьпечнай, чым далейшае перабываньне тут. Зрэшты, і перамяшчэньне ў іншую частку Беларусі нічога не вырашала - паўсюдна партызаны ды іх людзі. Між партызанскімі атрадамі былі добрыя сувязі: хто-небудзь ды знойдзе. Знойдзе ды прыгвозьдзіць. Самім жа ўцякаць у лес было зусімнаю бязглузьдзіцай. Тупік. Аляксючыц наліў у конаўку самагонкі і, быццам халодную ананасную ваду, выпіў адным цугам. Іначай было б не заснуць. Пераначуем - болей пачуем.

Расплюшчыўшы вочы, Барыс Макаравіч ужо дакладна ведаў, што будзе рабіць далей. Ён узяў сабе набіты пісталет, у кішэні напхаў колькі жменяў патронаў, у газэціну заматаў пару пачкаў грошай. Падаўся да Адама Шуло. Той з усьмешкаю павітаў нечаканага госьця:

- Пан настаўнік, рады паздароўкацца. Дачушка ўсе вушы пра вас адзваніла. Любіць вашы заняткі - няма спасу! А хіба ё якіясьці турботы зь ёю?

- Турботы, спадару Адаме, у нас усіх першага верасьня трыццаць дзявятага пачаліся, - безь віхляньняў нацянькі прамовіў чыстую крамолу Аляксючыц.

- Чаго? - спужаўся Шуло. - Што за сьмешкі?! Хіба вы мяне правяраеце? Дык я сёньня ж данясу пра інцыдэнт у паліцыю.

- Не каляхуйце, шаноўны. Праблема больш спаважная, ніжлі

ваш цяперашні страшок. Страшнейшая.

- Я вас зараз выжаню з хаты, калі ня скончыце гэтай гнюснай правакацыі! - разышоўся Надзейчын татусь і неяк няўклюдна махнуў рукою. Настаўнік адразу ж схапіўся за яе ды скруціў за сьпіну.

- Ты, дзядзьку, будзеш мяне слухаць? - мала ня вызьверваўся ён. - Цябе пасьвяць бальшавікі. Цябе й тваю радзіну. Разумееш? Надзейку таксама хочуць забіць.

Загадчык вадакачкі абмяк і сьцішана працягваў слухаць. Істрабіцель аслабаніў яго руку, паклаў на стол пакунак з райхсмаркамі і няголасна, але безапэляцыйна загаварыў:

- Сягоньня ж любым магчымым спосабам пакіньце з дачкою Нюськавічы, а затым і Беларусь. Эстонія, Чэхія, Францыя. Куды хочаце. Хоць за чатыры моры. Толькі не Беларусь. Яна гэтым часам як пекла. Тут ёсьць колькі тысячаў. Сапраўдныя... Ня будзьце дурнем і проста па маім сыходзе ўцякайце. Забірайце Надзейку із школы і бяжэце.

Шуло ўсёй сваёй істою быў прыгаломшаны, але згодна хітнуў галавою. Настаўнік шморгнуў носам і выйшаў вон.

Ён не зьбіраўся сёньня йсьці на працу, а мерна крочыў да павятовае ўправы. На вуліцы Гітлера яго нагнаў дырэктар школы.

- Спадар Аляксючыц, хіба вас ужо папярэдзілі? - без прывітаньня запытаўся ён.

- Гледзячы пра што, - ухіліста адказаў Істрабіцель, неўпрыкмет варушачы ў кішэні рукою.

- Ува ўправе сэмінарыя па праблемах ідэалёгіі Трэцяга Райху на высвабаджаных ад бальшавізму абшарах. Будзе нехта высокі зь Менску. Мы ж зможам з вамі станоўча адрапарціраваць?

Настаўнік, быццам на згоду, хітнуў галавою.

Ува ўправе было шматлюдна. З усёй акругі сюды панапрыехала

настаўнікаў. Неўзабаве ўсіх запрасілі ў вялікую залю. На сцэне стаяў доўгі шэраг сталоў і трыбуна. Да сініх кулісаў белымі ніткамі былі прышытыя сьцягі Нямеччыны і Беларусі. Паўзьверх вісеў транспарант: «Табе, вызваліцель, падзяка і шчырая праца!». Сабралася чалавек семдзясят улучна з Hilfspolizei'ямі і арыйцамі з SS, што ахоўвалі сваіх шышак. Зь Менску прыехаў дарадчык гаўляйтэра па ідэалягічным забесьпячэньні беларуска-нямецкай еднасьці гер Шульц Мартэнваль у суправодзе собскага даручэнца спадара Генрыка Галінкоўскага. «Някепска ты лучыў, дзядзя», - зласьліва ўсьміхнуўся Аляксючыц. Пыса Галінкоўскага надта ж яму кагосьці нагадвала. Гэны спадар ад імя свайго шэфа ўзяўся чытаць спавешчаньне, перапоўненае звыклымі фразамі: «Гітлер-асвабадзіцель», «нашы супольныя ідэалы, выяўленьнем каторых ёсьць Новая Эўропа пад нямецкім кіраваньнем і шчасная Беларусь у ёй», «выразаць ракавую пухліну камунізму», «рушыць у будучыню Новай Эўропы ў зьзяньні пабеднай нямецкай свастыкі». Выступоўцу, як і належала, усе адаравалі воплескамі, сакратарка папрасіла прысутных задаваць пытаньні, бальшыня апатычна сапела й тупіла вочы, хто ў падлогу, хто на сакратарчыну блюзку. Барыс Макаравіч узьняў руку:

- Скажэце, а як стасуецца нашая супольная будучыня зь перадаванымі брытанскім радыё зьвесткамі, што Нямеччына мае сакрэтныя пляны, згодна зь якімі да 90 % беларусаў мусяць быць вынішчаныя?

Па залі прабегся шумок. Галінкоўскі - той самы вярбоўшчык Аляксючыца - вылупіў вочы. Мартэнваль, якому пераклалі пытаньне, зьніякавеў і не патрапіў адразу зрэагаваць. Затое Істрабіцель рэагаваў адэкватна, шасьцю стрэламі асадзіўшы на той сьвет паліцаяў ды эсэсаўцаў. Руля адразу ж перакіравалася на Мартэнваля:

- Auf Wiedersehen, mein lieber Herr!

Стрэл. Пырснулі кроў і мазгі. Ільга было агледзець, што ў крывянку перапэцкаўся твар нядаўнага прамоўцы. Ён зьбіраўся ацерціся, але Істрабіцель не дазволіў:

- Стой спакойна, Нкус, а то бабэхну і трыбухі павылятаюць.

Прысутныя, ачмурэлыя яшчэ ад першых стрэлаў, адхінуліся, як маглі, ад узбраенца.

Узбраенец папрасіў сакратарку сабраць зброю забітых і перадаць яму.

- Шаноўныя настаўнікі, усе вы, як я падазраю, на кагосьці працуеце. Сёньня ў вашым жыцьці сьветлы дзень, бо памраце. І я з вамі. Гэта будзе наша вызваленьне. Ад Гітлера. Ад Сталіна. Ад усёй вакольнай бярэдлівасьці, што завецца вайной. Не вайна, а пабіваньне маладзенцаў. Ня бітва гэта, але мясакамбінат. Мы - беларусы? Хто мы на гэтым камбінаце? Нашыя кішкі крыпаюць нашым мясам. Кілбаса «Беларуская», чужынскім пальцам пханая. Адкуль тут быць жыцьцю, радасьці, каханьню? Мы ўсе вінаватыя. Ад таго ўсе і памром. Сьмерць - гэта люстэрка, якое ўбірае ў сябе кожнага з нас.

Ён зрабіў рэзкі рух і стрэліў у кучаравага вусача, які ўвачавідкі хацеў дастаць з кішэні свой важкі аргумэнт. Аляксючыц наўмысьля гучна пракашляўся і працягнуў маналёг:

- Сьцеражэцеся ўласных бязглузьдзіц. Ня будзьце быдлам хоць тут - перад вечным парогам. Найвышэйшая моц асягне хутка нас. Што скажаце там? Мяркуеце і ў пекле прыцярпецца? А ці дазволяць нам гэта зрабіць душы жыўцом спаленых дзетак і мацярок з Хомску і Княжаводцаў? Ці дадуць нам спакою душы застрэленых і зарэзаных людцаў з прыпартызанскіх вёсак? Гэта мы іх забілі. Сваімі рукамі і сваёю бязрукасьцю. Мы не навучылі сябе ўнікаць рабскіх думак і паставаў. Мы ходаемся за чужыя прывіды й здані, а сваё жывое ператвараем у попел.

- Але, - наважыўся бялявы румяны дзяцюк з касаватым правым вокам, - нашай віны тут мала. Ня мы - дваццацігадовыя хлапцы - прасралі Беларусь каншахтамі зь немцамі ў 1918-м, вычэклівымі пераміргваньнямі з палякамі ў 1919-м, садомскімі муськамі-буськамі з бальшавікамі да і пасьля... Нам давялося адно ўзяць гатовае й казаць, што йдзе барацьба за ідэалы. Як глыбей схавацца.

- Ты сьмелы, дзядзька, - усьміхнуўся Барыс, - бо ня кожны здатны так годна прызнаць свой страх. Праўда, Нкус?

Ён зірнуў на свайго настаўбурчанага вэрбоўшчыка. Той, нібы кіслай капусты пад'еўшы, крывіў морды ды дзьмуў раз-пораз сабе ў нос.

- Праўда, Нкус? - настойліва перапытаў Аляксючыц.

- Да чаго ты хочаш вабшчэ? - знэрвавана аскіразнуўся Галінкоўскі. - Зачэм быць такімі дуракамі? Пайміця, пустагаловыя (я ня ймею ў віду прысутствуюшчых тут савецкіх падпольшчыкаў і парцізан), сюда вярнёцца наша страна Расія. Абязацельна. І ваздаст усем па заслугам. Бойся ня бойся, а атвячаць за ізьмену усё раўно прыдзёцца. Пятлёй на шэі. Таварышчы парцізаны, ну застрэліця жэ ў канцэ канцоў этага ў.бка.

- Цішэй, - уладна грымнуў голас Аляксючыца. - Сьцеражэцеся бязглузьдзіц. У мяне пад сьпінжаком два паясы выбухоўкі й гранатаў. Хто ня хоча пражыць яшчэ пятнаццаць лішніх хвілін, хай страляе.

Усе маўчалі. Усе па-ранейшаму маўчалі. За вокнамі гулі машыны й матацыклеты. Дзьве роты войскаў SS вярталіся з супрацьпартызанскай апэрацыі. За апошняй машынай, прывязанае вяроўкай, валаклося ў дарожным пыле мёртвае дзявочае цела.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

Мілан Кундэра Эдуард і Бог

МІЛАН КУНДЭРА (нар. у 1929) - сусьветна вядомы раманіст, паэт і драматург чэскага паходжаньня. Яго апошні раман («La Ignorancia», «Няведаньне», 2000) напісаны на францускай мове.

1
Эдуардаву гісторыю зручна будзе распачаць у вясковай хаце яго старэйшага брата.

Брат ляжаў на канапе і казаў Эдуарду: «Ты зьвярніся да гэтай цёткі. Хоць яна й сьвіньня, але я ўсё ж такі веру, што нават такія маюць нейкае сумленьне. Якраз таму, што яна мне некалі напаскудзіла, цяпер яна, можа, будзе радая, калі ты дасі ёй магчымасьць выкупіць сваю віну».

Эдуардаў брат быў такі самы, што і раней: дабрак і гультай. Пэўна, гэтаксама ён валяўся на канапе ў сваім студэнцкім пакоі, калі шмат гадоў таму (Эдуард тады яшчэ быў маленькім хлопчыкам) пралайдачыў і прахроп дзень сьмерці Сталіна. На наступны дзень брат, нічога не падазраючы, прыйшоў на заняткі і сустрэў сваю аднагрупніцу Чэхачкаву, якая ў паказушнай здранцьвеласьці тырчала пасярод вэстыбюлю, як статуя жалобы. Ён тройчы абышоў вакол яе і дзіка разрагатаўся. Пакрыўджаная дзяўчына ўспрыняла сьмех аднагрупніка як палітычную правакацыю, і ў выніку брат мусіў сысьці з інстытуту і зьехаць працаваць у вёску, дзе зь цягам часу прыдбаў сабе хату, сабаку, жонку, дваіх дзяцей і, нарэшце,

лецішча.

Менавіта ў той вясковай хаце ён цяпер і ляжаў на канапе, прамаўляючы да Эдуарда: «Мы яе называлі карным бізуном працоўнай клясы. Але цябе гэта, урэшце, хваляваць не павінна. Сёньня гэта ўжо баба ня першай сьвежасьці, але на маладых хлапцоў яна заўжды была ласая, так што табе пойдзе насустрач».

Эдуард тады быў яшчэ вельмі малады. Ён толькі што скончыў пэдагагічны факультэт (той, на якім недавучыўся брат) і шукаў працу. Паслухаўшыся братавых парадаў, на наступны дзень ён пагрукаў у дзьверы дырэктарскага кабінэту. Унутры ён убачыў цыбатую кашчавую жанчыну з па-цыганску бліскучымі чорнымі валасамі, чорнымі вачыма і чорным пушком пад носам. Яе агідны выгляд пазбавіў Эдуарда хваляваньня, якое ён у сваім маладым узросьце яшчэ адчуваў пры сустрэчы з жаночаю прыгажосьцю. Таму ён здолеў размаўляць свабодна, з усёй сваёй абаяльнасьцю і нават галянтнасьцю. Дырэктарка ўспрыняла ягоны тон зь відавочным задавальненьнем і некалькі разоў паўтарыла, прыкметна ўзрушаная: «Нам моладзь патрэбная». Ягонае пытаньне яна паабяцала вырашыць.

2

Так Эдуард зрабіўся настаўнікам у невялікім чэскім мястэчку. З гэтага ён ня меў ані радасьці, ані жалю. Ён заўжды намагаўся адрозьніваць сур'ёзнае ад несур'ёзнага, і свой настаўніцкі шлях Эдуард аднёс да катэгорыі *несур'ёзнага*. Ня тое каб ён лічыў несур'ёзнай справай настаўніцтва само па сабе (наадварот, ён вельмі трымаўся за сваё месца, бо ведаў, што інакш на жыцьцё не заробіць), але ён лічыў настаўніцтва несур'ёзным, беручы пад увагу сутнасьць сваёй асобы. Ён не выбіраў працы. Яе яму абралі грамадзкі попыт, кадравыя характарыстыкі, школьны атэстат, уступныя іспыты. Мэханізм, які спалучыў дзеяньне ўсіх гэтых сілаў, урэшце пераклнуў яго (як элеватар перакідвае збожжа на грузавікі) зь сярэдняй школы на пэдагагічны факультэт. Ён ішоў туды без ахвоты (братава няўдача наклала тут сваю пячатку), але ўрэшце скарыўся. Эдуард зразумеў, што

праца ў ягоным жыцьці зойме месца сярод выпадковых рэчаў, што яна будзе прылепленая да яго, як фальшывая барада, проста для сьмеху.

Калі, аднак, *абавязак* - гэта нешта несур'ёзнае (для сьмеху), то верагодна, што сур'ёзным, наадварот, зробіцца *неабавязковае*. На новым месцы Эдуард хутка знайшоў сабе маладую дзяўчыну, якая яму падалася прыгожай, і амаль сур'ёзна пачаў да яе заляцацца. Дзяўчыну звалі Аліцыя, і - як ён, на свой жаль, высьветліў на першых спатканьнях - была яна даволі стрыманая і цнатлівая.

Шмат разоў на вечаровых шпацырах, ідучы побач, ён спрабаваў абняць Аліцыю за талію так, каб кончыкамі пальцаў дакрануцца да ейных грудзей, а яна шторaз хапала яго за руку і адпіхвала яе. Неяк, калі ён зноў паўтарыў гэтую спробу, яна (зноў) адпіхнула яго руку, спынілася і спытала:

- Ты верыш у Бога?

Сваім далікатным слыхам Эдуард пачуў у гэтым пытаньні прыхаваны націск і вокамгненна забыўся пра грудзі.

- Верыш? - паўтарыла Аліцыя пытаньне, але Эдуард не адважваўся адказаць. Ня будзем яго вінаваціць за гэтую боязь шчырасьці. На новым месцы ён адчуваў сябе вельмі самотна, а Аліцыя яму занадта падабалася, каб адштурхнуць яе ад сябе адным-адзінюткім адказам.

- А ты? - спытаў ён, каб выйграць крыху часу.

- Я веру, - сказала Аліцыя і зноў запатрабавала адказу.

Да таго часу яму ніколі не прыходзіла да галавы верыць у Бога. Аднак ён зразумеў, што ў гэтым прызнавацца нельга, нават наадварот, менавіта цяпер варта было б скарыстацца з магчымасьці ды змайстраваць зь веры ў Бога прыгожага драўлянага каня, унутры якога, паводле антычнага прыкладу, ён мог бы незаўважна прабрацца ў душу дзяўчыны. Аднак жа Эдуард ня мог вось так проста сказаць Аліцыі: «Так, я веру ў Бога»; ён зусім ня быў цынічны і саромеўся хлусіць; нахабная

адкрытасьць хлусьні яго бянтэжыла; калі ўжо хлусьня была непазьбежная, то і ў ёй ён хацеў застацца як мага бліжэйшым да праўды. Таму ён прамовіў надзвычай задуменным тонам:

- Нават ня ведаю, што табе на гэта сказаць. Натуральна, я веру ў Бога. Але… - тут ён зрабіў паўзу, і Аліцыя паглядзела на яго зь зьдзіўленьнем, - …але я хачу быць з табой цалкам шчыры. Магу я быць з табой шчыры?

- Ты мусіш быць шчыры, - сказала Аліцыя. - Бо інакш які нам сэнс быць разам.

- Праўда?

- Праўда, - сказала Аліцыя.

- Часам да мяне прыходзяць сумневы, - сказаў Эдуард ціхім голасам. - Часам я сумняюся, што ён сапраўды існуе.

- Але як можна ў гэтым сумнявацца? - амаль выкрыкнула Аліцыя.

Эдуард маўчаў, але па нядоўгім роздуме яму на розум прыйшла вядомая думка:

- Калі я бачу вакол столькі зла, я часта пытаю ў сябе: няўжо магчыма, каб быў Бог, які ўсё гэта дапусьціў?

Гэта прагучала так сумна, што Аліцыя схапіла яго за руку:

- Так, сьвет сапраўды поўны зла. Я гэта ведаю нават вельмі добра. Але менавіта таму ты мусіш верыць у Бога. Безь яго ўсе гэтыя пакуты былі б дарэмныя. Нішто ня мела б сэнсу. Тады я зусім не магла б жыць.

- Можа, ты й маеш рацыю, - сказаў Эдуард задуменна і ў нядзелю пайшоў разам зь ёй у касьцёл. Ён памачыў пальцы ў крапільніцы й перахрысьціўся. Потым была імша і сьпевы, і ён сьпяваў разам з усімі рэлігійны гімн, мэлёдыя якога была яму знаёмая, але словы невядомыя. Замест патрэбных словаў ён цягнуў толькі галосныя гукі і пачынаў праз долю сэкунды пасьля астатніх, бо й мэлёдыю ведаў цьмяна. Затое ў момант,

калі ён упэўніваўся ў правільнасьці ноты, ён даваў свайму голасу загучаць на поўную моц і гэтак упершыню ў жыцьці зразумеў, што мае прыгожы бас. Потым усе пачалі чытаць «Войча наш», а некаторыя старыя жанчыны ўкленчылі. Ён ня здолеў запярэчыць нейкаму поклічу і таксама ўкленчыў на каменнай падлозе. Ён жагнаўся, шырока махаючы рукой, і перажываў пры гэтым цудоўнае пачуцьцё, што можа рабіць нешта, чаго не рабіў ніколі ў жыцьці, чаго ня можа рабіць ані ў клясе, ані на вуліцы, нідзе. Ён адчуваў сябе фантастычна свабодным.

Калі ўсё скончылася, Аліцыя паглядзела на яго; ейныя вочы зіхацелі:

- Ці ты можаш яшчэ казаць, што сумняешся ў Ім?

- Не, - адказаў Эдуард.

А Аліцыя сказала:

- Я хацела б навучыць цябе любіць Яго так, як люблю Яго я.

Яны стаялі на шырокіх сходах на выхадзе з касьцёлу, і Эдуардава душа поўнілася сьмехам. На бяду, якраз у гэты момант міма ішла дырэктарка школы і ўбачыла іх.

3

Гэта было кепска. Мы мусім тут нагадаць (для тых, хто, магчыма, не зьвярнуў увагі на гістарычны фон гэтай гісторыі), што хаця ў той час людзям і не забаранялася хадзіць у касьцёл, але ўсё ж рабіць гэта было небясьпечна.

Гэта ня так цяжка зразумець. Тыя, хто ажыцьцявіў так званую рэвалюцыю, выпесьцілі ў сабе вялікую пыху, якая называецца *«стаяць на правільным баку фронту»* . Калі з тых часоў прайшло гадоў дзесяць-дванаццаць (а прыкладна столькі й мінула на час нашай гісторыі), лінія фронту пачала зацірацца, а зь ёй - і той правільны бок. Ня дзіва, што колішнія змагары рэвалюцыі пачалі пачувацца падманутымі, а таму неўзабаве кінуліся шукаць *запасныя* франты; менавіта дзякуючы рэлігіі яны (у

іпастасі атэістаў, што змагаюцца супраць вернікаў) ізноў змаглі паўстаць ува ўсёй славе на правільным баку і захаваць такі звыклы й значэнны патас сваёй вышэйшасьці.

Але, напраўду, і для тых другіх запасны фронт прыйшоўся дарэчы; і, напэўна, ужо ня будзе заўчасна, калі мы скажам, што менавіта да тых другіх належала Аліцыя. Так, як дырэктарка хацела стаяць на *правільным* баку, Аліцыя хацела стаяць на супрацьлеглым. Рэч у тым, што ў дні рэвалюцыі была нацыяналізаваная крама ейнага бацькі, і Аліцыя ненавідзела тых, хто гэта зрабіў. Але як яна магла праявіць сваю нянавісьць? Узяць нож ды пайсьці помсьціць за бацьку? Гэта ня ў звычаях чэхаў. Аліцыя мела лепшую магчымасьць прадэманстраваць сваю супрацьлегласьць: яна пачала верыць у Бога.

Так Госпад Бог прыйшоў на дапамогу адразу абодвум бакам, і Эдуард праз гэта апынуўся між двух агнёў.

Калі ў панядзелак ранкам у настаўніцкім пакоі да яго падышла дырэктарка, ён адчуў сябе вельмі няўпэўнена. Ён ніяк ня мог узнавіць сяброўскай атмасфэры іх першай гутаркі, бо з таго часу (ці то праз сваю наіўнасьць, ці то праз сваю нядбайнасьць) ніколі не заводзіў зь ёй галянтных размоваў. Таму дырэктарка магла з поўным правам зьвярнуцца да яго з дэманстратыўна халоднай усьмешкай:

- Мы ўчора бачыліся, праўда?

- Так, бачыліся, - адказаў Эдуард.

Дырэктарка працягвала:

- Не разумею, як можа малады чалавек хадзіць у касьцёл.

Эдуард разгублена паціснуў плячыма, а дырэктарка заківала галавой:

- Малады чалавек.

- Я хацеў паглядзець барочны інтэр'ер храму, - сказаў Эдуард, нібы просячы прабачэньня.

- Вось як! - іранічна сказала дырэктарка. - Я й ня ведала, што Вас так цікавіць мастацтва.

Гэтая размова была Эдуарду зусім непрыемная. Ён успомніў, як ягоны брат некалі тройчы абышоў вакол сваёй аднагрупніцы, а потым дзіка разрагатаўся. Яму здалося, што сямейныя гісторыі паўтараюцца, і ён спалохаўся. У суботу ён патэлефанаваў Аліцыі і папрасіў прабачэньня за тое, што ня пойдзе ў касьцёл, бо прастудзіўся.

- Нейкі ты дужа кволы, - папракнула яго за гэта Аліцыя на наступным тыдні, і Эдуарду здалося, што яе словы гучаць абыякава. Таму ён пачаў распавядаць (загадкава і цьмяна, бо саромеўся прызнацца ў сваім страху і ў ягоных сапраўдных прычынах) пра крыўды, якія яму даводзіцца цярпець у школе, і пра страшную дырэктарку, якая яго беспрычынна ўціскае. Ён хацеў выклікаць у ёй спачуваньне, чульлівую спагаду, але Аліцыя сказала:

- А ў мяне начальніца нішто сабе, - і з усьмешкамі пачала апавядаць нейкія байкі з сваёй працы. Эдуард слухаў яе вясёлы голас і ўсё больш і больш пахмурнеў.

4

Шаноўнае спадарства, гэта былі тыдні пакутаў! Эдуард проста пякельна прагнуў Аліцыі. Яе цела распальвала ў ім жарсьці, але менавіта гэтае цела было для яго зусім недаступным. Пакутлівым быў і фон, на якім праходзілі іх спатканьні; яны альбо блукалі гадзіну-другую па сьцямнелых вуліцах, альбо йшлі ў кіно; аднастайнасьць і нязначныя эратычныя мажлівасьці абодвух гэтых варыянтаў (іншых не было) падказалі Эдуарду, што, магчыма, ён меў бы з Аліцыяй большы посьпех, калі б яны маглі спаткацца ў іншым асяродзьдзі. Неяк, прыняўшы прастадушны выраз, ён сказаў ёй, што яны маглі б на выходныя зьезьдзіць да ягонага брата, які мае лецішча ў лясістай даліне каля ракі. Зь нявінным захапленьнем ён апавядаў ёй пра хараство тамтэйшай прыроды, аднак Аліцыя (ува ўсім іншым наіўная і даверлівая) адразу яго раскусіла й рашуча адмовілася. І адмова гэтая зыходзіла ня толькі ад

Аліцыі. Яму адмаўляў (вечна пільны і асьцярожны) сам Аліцыін Бог.

Гэты Бог быў створаны з адной-адзінюткай ідэі (іншых жаданьняў і думак у яго не было): ён забараняў пазашлюбнае каханьне. Такім чынам, гэта быў даволі забаўны Бог, але ня сьмеймася з Аліцыі. Зь дзесяці запаведзяў, якія перадаў чалавецтву Майсей, дзевяці ў яе душы нічога не пагражала, бо ёй не хацелася ані забіваць, ані пазбаўляць шанаваньня бацькі свайго, ані прагнуць жонкі блізкага свайго; толькі адну-адзінюткую запаведзь яна адчувала не як *само сабой зразумелую*, а як сапраўдны цяжар і выпрабаваньне, гэта была знакамітая сёмая *не чыні пералюбу*. Каб давесьці, паказаць і ўсапраўдніць сваю рэлігійную веру, Аліцыя мусіла засяродзіцца менавіта на гэтай адзінай запаведзі, і такім чынам зь цьмянага, расплывістага, абстрактнага Бога яна зрабіла для сябе Бога цалкам выразнага, зразумелага і канкрэтнага: *Бога Непералюбу*.

Прабачце, а дзе, уласна, пачынаецца пералюб? Кожная жанчына вызначае для сябе гэтыя межы паводле сваіх таямнічых крытэраў. Аліцыя з ахвотай дазваляла Эдуарду цалаваць яе, а пасьля ягоных шматлікіх спробаў урэшце зьмірылася і з тым, што ён лашчыў ёй грудзі. Аднак пасярэдзіне свайго цела, недзе на роўні пупка, яна правяла выразную і цалкам бескампрамісную рысу, пад якой распасьціралася тэрыторыя сьвятых заказаў, тэрыторыя Майсеевай забароны і гневу Гасподняга.

Эдуард пачаў чытаць Біблію і вывучаць базавую тэалягічную літаратуру; ён вырашыў змагацца з Аліцыяй яе ўласнай зброяй.

- Аліцыянка, - сказаў ён ёй, - калі мы любім Бога, дык для нас няма нічога забароненага. Калі мы нечага прагнем, гэта адбываецца зь Ягонага дазволу. Хрыстос жадаў толькі таго, каб усе мы кіраваліся любоўю.

- Так, - адказала Аліцыя, - але ня той, пра якую думаеш ты.

- Любоў ёсьць толькі адна, - сказаў Эдуард.

- Табе б хацелася, каб так было, - адказала Аліцыя. - Але Бог

даў нам дакладныя запаведзі, якімі мы мусім кіравацца.

- Так, Бог Старога Запавету, - сказаў Эдуард, - але ж зусім ня Бог хрысьціянаў.

- Як гэта? Бог толькі адзін, - запярэчыла Аліцыя.

- Так, - сказаў Эдуард, - але ж старазапаветныя жыды ўспрымалі яго крыху інакш, чым мы. Да прыходу Хрыста чалавек найперш мусіў прытрымлівацца дакладнай сыстэмы Божых загадаў і законаў. Які ён у душы - было ня так важна. Калі чалавек будзе кіравацца сваім палкім, поўным веры ўнутраным сьветам, усё, што ён зробіць, будзе добра і даспадобы Госпаду. Менавіта таму сьвяты Павал сказаў: для чыстага ўсё чыстае.

- Вось толькі ці сапраўды ты - той чысты, - сказала Аліцыя.

- А сьвяты Аўгустын, - працягваў Эдуард, - сказаў так: «Любі Бога і рабі тое, што табе даспадобы». Разумееш, Аліцыя? Любі Бога і рабі тое, што табе даспадобы.

- Толькі вось тое, што даспадобы табе, ніколі ня будзе даспадобы мне, - адказала Аліцыя, і Эдуард зразумеў, што ягоная тэалягічная атака гэтым разам з трэскам правалілася; таму ён сказаў:

- Ты проста мяне ня кахаеш.

- Кахаю, - адказала Аліцыя з жахлівай нэўтральнасьцю ў голасе. - А таму не хачу, каб мы рабілі нешта, чаго рабіць нельга.

Як мы ўжо казалі, гэта былі тыдні пакутаў. І пакуты былі яшчэ мацнейшыя ад таго, што Эдуардава прага Аліцыі зусім не была выключна цягай аднаго цела да другога. Наадварот, чым даўжэй ён ня мог дамагчыся цела, тым больш яго ахоплівала туга і боль і тым больш ён жадаў і ейнага сэрца; аднак ані ейнае цела, ані сэрца нічога не хацелі ведаць пра гэта; і адно і другое былі халодныя, аднолькава заглыбленыя ў сябе і дзёрзка самадастатковыя.

Больш за ўсё Эдуарда ў Аліцыі раздражняла менавіта гэтая непарушная стрыманасьць у эмоцыях. Хоць у астатнім Эдуард

быў даволі цьвярозы малады чалавек, ён пачаў прагнуць нейкага экстрэмальнага ўчынку, які б парушыў гэтую Аліцыіну непарушнасьць. А паколькі было занадта рызыкоўна правакаваць яе крайнасьцямі цынічнымі ці блюзьнерскімі (да якіх ён быў схільны паводле натуры), ён мусіў выбраць крайнасьці якраз супрацьлеглыя (а таму шмат цяжэйшыя) - вывесьці іх з Аліцыіных поглядаў і гіпэрбалізаваць так, каб яна адчула сорам. Калі папросту, Эдуард пачаў перабольшваць сваю рэлігійнасьць. Ён не прапускаў аніводнай імшы (цяга да Аліцыі была большая за страх непрыемнасьцяў) і паводзіў сябе там з эксцэнтрычнай пакорай: кленчыў пры кожнай магчымасьці, між тым як Аліцыя малілася і хрысьцілася стоячы, бо баялася за панчохі.

Неяк ён папракнуў яе за рэлігійную стрыманасьць. Ён нагадаў ёй Ісусавы словы: «Ня кожны, хто кажа мне: «Госпадзе! Госпадзе!», - увойдзе ў Царства Нябеснае». Ён сказаў, што яе вера фармальная, вонкавая, плыткая. Папракнуў яе за бестурботнасьць. Папракнуў яе за залішнюю самазадаволенасьць. Папракнуў яе за тое, што яна, акрамя сябе, нікога навокал ня бачыць.

І якраз у той момант, калі ён ёй гэтак вымаўляў (Аліцыя не была гатовая да такога нападу і баранілася слаба), ён раптам убачыў перад сабой на рагу вуліцы крыж - стары занядбаны мэталёвы крыж з заржавелым бляшаным Хрыстом. Эдуард дэманстрацыйна адпусьціў Аліцыяніну руку, спыніўся і (пратэстуючы супраць яе абыякавага сэрца ды на знак сваёй новай атакі) з паказной рашучасьцю перахрысьціўся. Аднак даведацца, якое ўражаньне гэта зрабіла на Аліцыю, ён ужо ня змог, бо ў тое імгненьне заўважыў на другім баку вуліцы загадчыцу школьнай гаспадаркі. Тая глядзела на яго, і Эдуард зразумеў, што яму гамон.

5

Ягонае прадчуваньне пацьвердзілася, калі праз два дні загадчыца спыніла яго на калідоры і гучна паведаміла, што на наступны дзень а дванаццатай гадзіне ён мусіць быць у дырэктарскім кабінэце: «Нам трэба з табой пагаварыць,

таварыш».

Эдуарда ахапіла трывога. Увечары ён сустрэўся з Аліцыяй, і яны разам, як заўжды, праблукалі пару гадзінаў па вуліцы. Гаворкі пра рэлігійную заўзятасьць Эдуард больш не заводзіў. Ён быў прыгнечаны, і яму карцела расказаць Аліцыі, што зь ім здарылася, аднак ён не адважваўся, бо ведаў, што, каб захаваць нялюбую (але непазьбежную) працу, ён быў гатовы назаўтра без ваганьняў здрадзіць Госпаду Богу. Таму ён палічыў за лепшае не казаць ані слова пра выклік на непрыемную размову і не атрымаў ніякага суцяшэньня. На наступны дзень ён увайшоў у дырэктарскі кабінэт, адчуваючы ў душы абсалютную пустэчу.

Там яго чакалі чацьвёра судзьдзяў: дырэктарка, загадчыца, адзін з Эдуардавых калегаў (дробненькі акулярык) і незнаёмы мужчына (сівавалосы), якога астатнія называлі «таварыш інспэктар». Дырэктарка запрасіла Эдуарда сесьці і сказала, што яго выклікалі на цалкам сяброўскую неафіцыйную размову, бо іх усіх вельмі турбуе, як Эдуард паводзіць сябе па-за школай. Пры гэтых словах яна паглядзела на інспэктара, і той згодна паківаў галавой; потым яна перавяла позірк на настаўніка ў акулярах, які ўвесь гэты час уважліва глядзеў на яе і цяпер, злавіўшы ейны погляд, адразу ж пачаў складна гаварыць пра тое, што мы хочам выхаваць моладзь здаровай і непрымхлівай, што нясём за яе поўную адказнасьць, бо служым ёй (мы, настаўнікі) прыкладам і менавіта таму ня можам цярпець у нашых шэрагах цемрашалаў; ён доўга разьвіваў гэтую думку і ўрэшце заявіў, што Эдуардавы паводзіны ганьбяць увесь калектыў.

Яшчэ колькі хвілінаў таму Эдуард быў упэўнены, што вырачацца свайго нядаўна знойдзенага Бога і прызнаецца, што наведваньне касьцёлу й публічнае жагнаньне былі звычайным камэдыянцтвам. Аднак цяпер, сам-насам з рэальнай сытуацыяй, ён адчуў, што ня можа гэтага зрабіць; ня можа вось гэтым чатыром людзям, сур'ёзным і перадузятым, сказаць, што іх разуменьне сытуацыі - проста нейкая недарэчнасьць, нейкае глупства. Эдуард зразумеў, што такім чынам ён бы хіба міжволі пасьмяяўся зь іхнай сур'ёзнасьці; і таксама ён усьвядоміў, што

ўсе прысутныя толькі й чакаюць ад яго хітрыкаў ды адгаворак і загадзя гатовыя іх адкінуць. Ён зразумеў (вокамгненна, бо на доўгі роздум не было часу), што ў гэты момант найбольш важна захаваць праўдападобнасьць, а дакладней кажучы, падобнасьць да меркаваньняў, якія ў іх склаліся пра яго. Калі ж ён хоча гэтыя меркаваньні хоць трохі зьмяніць, яму трэба ў нейкай ступені пайсьці ім насустрач. Таму ён сказаў:

- Таварышы, я магу быць з вамі шчыры?

- Безумоўна, - сказала дырэктарка. - Вас для таго сюды й запрасілі.

- А вы ня будзеце злавацца?

- Гаварыце, ня бойцеся, - сказала дырэктарка.

- Добра, я вам прызнаюся, - сказаў Эдуард. - Я сапраўды веру ў Бога.

Ён паглядзеў на сваіх судзьдзяў, і яму здалося, што ўсе яны ўздыхнулі супакоена; толькі загадчыца ўзьелася на яго:

- У наш час, таварыш? У наш час?

Эдуард працягваў:

- Я ведаў, што вы будзеце злавацца, калі я скажу праўду. Але я ня ўмею хлусіць. Вы ж ня хочаце, каб я вас падманваў?

Дырэктарка сказала (памяркоўна):

- Ніхто ня хоча, каб вы хлусілі. Добра, што вы гаворыце праўду. Толькі скажыце мне, калі ласка, як можаце вы - малады чалавек - верыць у Бога?

- Сёньня, калі чалавецтва лятае на Месяц! - усхвалявана прамовіў настаўнік у акулярах.

- Я нічога не магу з сабой зрабіць, - сказаў Эдуард. - Я не хачу ў Яго верыць. Праўда. Не хачу.

- Як так ня хочаце, калі верыце? - далучыўся да размовы (надзвычай ласкавым тонам) сівавалосы мужчына.

- Не хачу верыць, але веру, - ціха паўтарыў сваё прызнаньне Эдуард.

Настаўнік засьмяяўся:

- Але гэта адно другому супярэчыць.

- Таварышы, усё менавіта так, як я кажу, - сказаў Эдуард. - Я цудоўна разумею, што вера ў Бога адцягвае нашую ўвагу ад рэчаіснасьці. Куды б зайшоў сацыялізм, калі б усе верылі, што сьвет у Божых руках? Тады б ніхто нічога не рабіў, і кожны толькі б спадзяваўся на Бога.

- Вось-вось, - пагадзілася дырэктарка.

- Яшчэ ніхто не давёў, што Бог існуе, - заявіў настаўнік у акулярах.

Эдуард працягваў:

- Гісторыя чалавецтва адрозьніваецца ад яго перадгісторыі тым, што людзі самі ўзялі свой лёс ува ўласныя рукі і Бог ім не патрэбны.

- Вера ў Бога вядзе да фаталізму, - сказала дырэктарка.

- Вера ў Бога - адзнака сярэднявечча, - сказаў Эдуард, потым ізноў нешта сказала дырэктарка, нешта - настаўнік, нешта - Эдуард, нешта - інспэктар, і ўсе дапаўнялі адно аднаго ў гарманічнай згодзе, пакуль нарэшце настаўнік у акулярах ня выбухнуў, перарваўшы Эдуарда:

- Дык чаго ж ты хрысьцішся на вуліцы, калі ўсё гэта ведаеш?

Эдуард паглядзеў на яго зь бязьмежным смуткам і сказаў:

- Таму што веру ў Бога.

- Але гэта адно аднаму супярэчыць, - паўтарыў настаўнік

радасна.

- Так, - прызнаў Эдуард, - супярэчыць. І гэтая супярэчнасьць - паміж ведамі і верай. Веды - гэта адно, а вера - іншае. Я ведаю, што вера ў Бога вядзе нас да цемрашальства. Я ведаю, што было б лепш, калі б Яго не было. Але ж тут, унутры... - ён паказаў пальцам на сэрца, - я адчуваю, што Ён існуе. Прабачце мне, таварышы, але я вам кажу так, як яно ёсьць; лепш, калі я вам прызнаюся, бо не хачу крывадушнічаць; я хачу, каб вы ведалі, які я ёсьць насамрэч, - тут ён схіліў галаву.

Настаўнік у акулярах меў небагата розуму; праз сваю абмежаванасьць ён ня мог зразумець, што нават самы зацяты рэвалюцыянэр лічыць гвалт толькі неабходным злом, тым часам як сапраўднае *дабро* рэвалюцыі для яго - перавыхаваньне. Сам ён ператварыўся ў пераканання рэвалюцыянэра за адну ноч і за гэта не карыстаўся вялікай павагай у дырэктаркі. І вось цяпер ён нават не здагадваўся, што ў гэты момант Эдуард, які паказаў сябе сваім судзьдзям як складаны, але падатлівы аб'ект для перавыхаваньня, мае ў тысячу разоў большую вартасьць, чым ён. Гэты прафан жорстка абрынуўся на Эдуарда і заявіў, што такім людзям, якія ня ў стане разьвітацца зь сярэднявечнай верай, месца ў сярэднявеччы, а з сучаснай школы іх трэба гнаць.

Дырэктарка дала яму дагаварыць, а потым зрабіла заўвагу:

- Нядобра вось так адразу сячы з-за пляча галовы. Таварыш быў з намі шчыры і сказаў нам усё, як яно ёсьць. І гэта варта павагі.

Потым яна зьвярнулася да Эдуарда:

- Таварышы, вядома, маюць рацыю, калі кажуць, што цемрашалы ня могуць выхоўваць нашую моладзь. Дык скажыце самі, што б вы прапанавалі зрабіць?

- Я ня ведаю, таварышы, - сказаў Эдуард зь няшчасным выглядам.

- Я думаю так, - сказаў інспэктар. - Змаганьне паміж старым і новым адбываецца ня толькі паміж клясамі, але і ў кожным

асобным чалавеку. Такое змаганьне адбываецца і ўнутры таварыша. Розумам ён ведае, але пачуцьцё цягне яго назад. Вы павінны дапамагчы таварышу ў ягоным змаганьні, каб у ім перамог розум.

Дырэктарка ківала галавой. Урэшце яна сказала:

- Я сама вазьму над ім шэфства.

6

Такім чынам Эдуард адвёў самую непасрэдную небясьпеку; лёс яго настаўніцкага існаваньня апынуўся выключна ў дырэктарчыных руках. Ён успрыняў гэта цалкам спакойна: узгадаў колішнюю братаву заўвагу, што дырэктарка заўжды была ласая на маладых хлопцаў, і з усёй неўраўнаважанасьцю сваёй маладой веры ў сябе (тая вера ў ім то згасала, то шугала зноў) вырашыў перамагчы ў сваёй барацьбе, заваяваўшы прыхільнасьць сваёй уладаркі як мужчына.

Калі Эдуард, паводле дамоўленасьці, у адзін з наступных дзён прыйшоў да яе ў кабінэт, ён паспрабаваў завязаць легкаважную размову і карыстаўся кожнай магчымасьцю, каб зрабіць інтымны намёк, далікатны камплімэнт ці каб зь някідкай двухсэнсоўнасьцю падкрэсьліць сваё ўласнае становішча мужчыны ў жаночых руках. Аднак дырэктарка не дала яму вызначыць тон размовы. Яна гаварыла зь ім ветліва, але абсалютна стрымана; распытвала яго, што ён чытае, потым сама назвала некалькі кніг і парэкамэндавала яму іх прачытаць - яна відавочна хацела распачаць доўгатэрміновую працу над ягонымі думкамі. Іх кароткая сустрэча скончылася тым, што яна запрасіла яго да сябе ў госьці.

Дырэктарчына стрыманасьць зноўку прыгасіла Эдуардаву самаўпэўненасьць, таму ён увайшоў у яе кватэрку пакорліва і без намеру перамагаць яе сваёй мужчынскай прывабнасьцю. Яна запрасіла Эдуарда прысесьці ў фатэль і задала вельмі сяброўскі тон: запыталася, чаго б ён выпіў, мо кавы? Ён адказаў, што не. Тады мо чаго мацнейшага? Ён крыху зьбянтэжыўся: «Калі ў Вас ёсьць каньяк...» - і адразу ж

спалохаўся, ці не зашмат ён сабе дазваляе. Але дырэктарка сказала ласкава: «Не, каньяку няма, але ёсьць трохі віна», - і прынесла паўпустую бутэльку, зь якой атрымалася напоўніць толькі два келіхі.

Потым яна сказала, каб Эдуард ня думаў пра яе, як пра нейкую інквізытарку: усё ж кожны мае поўнае права верыць у сваім жыцьці ў тое, што лічыць правільным. Натуральна, іншае пытаньне (дадала яна адразу ж) - што дазволена ці не дазволена настаўніку; таму яны, маўляў, мусілі (хоць і без ахвоты) выклікаць Эдуарда і пагутарыць зь ім і былі вельмі (прынамсі яна ды інспэктар) задаволеныя тым, як шчыра ён зь імі гаварыў і нічога не адмаўляў. Потым яна, маўляў, яшчэ доўга гутарыла з інспэктарам пра Эдуарда і яны вырашылі, што праз паўгоду зноў выклічуць яго на размову; а да таго часу дырэктарка мусіць на яго паўплываць, каб скіраваць ягонае разьвіцьцё правільным шляхам. Тут яна зноўку падкрэсьліла, што толькі хоча па-сяброўску дапамагчы і што яна зусім не інквізытар і не паліцыянт. Яна прыгадала настаўніка, які так жорстка абрынуўся на Эдуарда, і сказала: «У самога сьмятанка на вусах, а бач ты, на іншых кідаецца. Загадчыца таксама паўсюль гаворыць, што вы, маўляў, паводзілі сябе нахабна і ўпарта стаялі на сваім. Яна па-ранейшаму лічыць, што вас варта выгнаць з школы. Я зь ёй, вядома, нязгодная, але і яе можна зразумець. Мне б таксама не спадабалася, калі б маіх дзяцей вучыў нехта, хто адкрыта хрысьціцца на вуліцы».

Такім чынам дырэктарка ў некалькіх сказах прадэманстравала Эдуарду як прывабныя магчымасьці сваёй міласэрнасьці, так і пагрозьлівыя магчымасьці сваёй суворасьці, а потым, каб паказаць, што іх спатканьне ў сутнасьці сяброўскае, перайшла на іншыя тэмы: загаварыла пра кнігі, падвяла Эдуарда да кніжнай шафы і дробным макам рассыпалася наконт Ралянавай «Зачараванай душы», а даведаўшыся, што гэтай кнігі ён не чытаў, нават яго паўшчувала. Потым яна спытала, як яму наагул працуецца ў школе, а пасьля ягонага няўцямнага адказу сама пусьцілася ў доўгі аповед: сказала, што ўдзячная лёсу за сваю прафэсію, што любіць працу ў школе, бо дзякуючы дзецям, якіх выхоўвае, яна мае ў сутнасьці сталы і канкрэтны кантакт з будучыняй, і што толькі будучыня можа ўрэшце

апраўдаць усе тыя пакуты, якіх, маўляў («так, мы мусім гэта прызнаць»), поўна навокал.

- Калі б я ня верыла, што жыву дзеля нечага большага, чым сваё ўласнае жыццё, я, пэўна, зусім не змагла б жыць.

Гэтыя словы раптам прагучалі вельмі сур'ёзна, і было няясна, ці то дырэктарка хоча паспавядацца, ці то распачаць чаканую ідэалягічную палеміку пра сэнс жыцця. Эдуарду захацелася зразумець іх у інтымным сьвятле, і таму ён спытаўся ціхім, далікатным голасам:

- А вашае жыццё само па сабе?

- Маё жыццё?

- Так, проста жыццё само па сабе вас бы не задаволіла?

На яе твары зьявілася горкая ўсьмешка, і ў гэты момант Эдуард амаль шкадаваў дырэктарку. Яна выглядала брыдка: чорныя валасы адцянялі прадаўгаваты кашчавы твар, а чорны пушок пад носам набываў выразнасьць вусоў. Ён ураз уявіў сабе ўвесь смутак яе жыцця; убачыў яе цыганскія рысы, якія выдавалі гарачую пачуццёвасьць, і ўбачыў яе агіднасьць, якая казала пра немагчымасьць зьдзяйсьненьня гэтае пачуццёвасьці; ён уявіў сабе, зь якой адданасьцю яна некалі, па сьмерці Сталіна, ператварылася ў жывую статую жалобы, зь якой адданасьцю адседзела на ста тысячах сходаў, зь якой адданасьцю змагалася супраць беднага Ісуса, і зразумеў, што ўсё гэта было проста сумнае запасное рэчышча яе жаданьня, якое не магло цячы туды, куды ёй хацелася. Эдуард быў малады, і яго спагадлівасьць яшчэ не знасілася. Ён глядзеў на дырэктарку з разуменьнем. Яна, аднак, нібыта засаромеўшыся за імгненьні свайго міжвольнага маўчаньня, цяпер надала свайму голасу нязмушаную інтанацыю і працягвала:

- А гэта, Эдуардзе, ня мае ніякага значэньня. Бо чалавек не жыве ў гэтым сьвеце толькі дзеля сябе. Ён заўжды жыве дзеля нечага. - Яна ўважліва паглядзела яму ў вочы. - Тут, аднак, галоўнае - дзеля чаго. Дзеля нечага сапраўднага ці дзеля нечага выдуманага? Бог - гэта прыгожая выдумка. Але

будучыня людзей, Эдуардзе, гэта рэальнасьць. І дзеля яе я жыла, дзеля яе я ўсім ахвяравала.

І гэтыя сказы яна прамаўляла з такім унутраным перакананьнем, што Эдуард па-ранейшаму адчуваў да яе толькі раптоўнае чалавечае разуменьне, якое ў ім перад тым прачнулася. Яму падалося недарэчным, што ён тут хлусіць іншаму чалавеку (блізкі блізкаму) у вочы. Яму здалося, што момант даверу ў іх размове дае яму магчымасьць нарэшце адкінуць ганебную (зрэшты, яшчэ й цяжкую) гульню ў верніка:

- Але ж я з Вамі цалкам згодны, - хутка запэўніў ён яе, - я таксама стаўлю рэальнасьць на першае месца. Ня стаўцеся так сур'ёзна да гэтай маёй рэлігійнасьці.

Ён адразу ж пабачыў, што чалавек ніколі не павінен кіравацца неразважлівым рухам пачуцьцяў. Дырэктарка зьдзіўлена паглядзела на яго і сказала з заўважным холадам:

- Не прыкідвайцеся. Вы мне падабаліся, калі былі шчыры. А цяпер вы робіце зь сябе нешта, чым вы ня ёсьць.

Не, Эдуарду не было дазволена зьняць зь сябе рэлігійную вопратку, якую ён аднойчы на сябе нацягнуў; ён адразу з гэтым зьмірыўся і паспрабаваў выправіць кепскае ўражаньне:

- Але ж не, я тут не зьбіраўся круціць. Натуральна, я веру ў Бога, гэтага я б ніколі не адмаўляў. Я проста хацеў сказаць, што таксама веру ў будучыню чалавецтва, у прагрэс і ўсё такое. Бо калі б я ў гэта ня верыў, навошта была б мая праца настаўніка, навошта б нараджаліся дзеці і навошта б мы ўвогуле жылі? Я якраз думаў, што гэта воля Божая, каб грамадзтва йшло ўсё далей і далей да лепшага. Я думаў, што чалавек можа верыць і ў Бога, і ў камунізм, што гэта можна спалучыць.

- Не, - усьміхнулася дырэктарка з мацярынскай аўтарытэтнасьцю, - гэтыя дзьве рэчы неспалучальныя.

- Я ведаю, - сказаў Эдуард сумна. - Ня злуйцеся на мяне.

- Я не злуюся. Вы яшчэ малады чалавек і ўпарта трымаецеся за тое, у што верыце. Ніхто вас не разумее гэтак, як я. Бо я ж таксама была такой маладой, як вы. І вашая маладосьць мне падабаецца. Вы мне сымпатычны.

Вось яно нарэшце прыйшло! Не раней і не пазьней, а менавіта цяпер, рыхтык у патрэбны момант (якога, як бачым, Эдуард не выбіраў, хутчэй наадварот - гэты момант выбраў Эдуарда дзеля сваіх мэтаў). Калі дырэктарка сказала, што ён ёй сымпатычны, Эдуард прамовіў ня дужа ўпэўнена:

- Вы мне таксама.

- Праўда?

- Праўда.

- Ня трэба так, калі ласка. Я старая жанчына... - запярэчыла дырэктарка.

- Гэта няпраўда, - мусіў сказаць Эдуард.

- Але ж гэта так, - сказала дырэктарка.

- Вы зусім не старая, гэта глупства, - ізноў мусіў сказаць Эдуард, гэтым разам вельмі рашуча.

- Вы так лічыце?

- Дарэчы, Вы мне вельмі падабаецеся.

- Не хлусіце. Вы ж ведаеце, што Вам нельга хлусіць.

- Я не хлушу. Вы прыгожая.

- Прыгожая? - дырэктарка зрабіла выгляд, што не паверыла.

- Так, прыгожая, - сказаў Эдуард і, спалохаўшыся неверагоднасьці свайго сьцьверджаньня, адразу ж паспрабаваў яго нечым падмацаваць. - Такая брунэтка. Мне гэта жудасна падабаецца.

- Вам падабаюцца брунэткі? - спытала дырэктарка.

- Жудасна, - адказаў Эдуард.

- А чаму вы за ўвесь гэты час у школе ніводнага разу да мяне не зайшлі? Мне здавалася, што вы мяне ўнікаеце.

- Я саромеўся, - сказаў Эдуард. - Усе б пачалі казаць, што я да вас падлізваюся. Ніхто б не паверыў, што я да вас хаджу проста таму, што вы мне падабаецеся.

- Але цяпер вы можаце не саромецца, - сказала дырэктарка. - Бо цяпер ёсьць афіцыйная *пастанова*, што вы са мной абавязаны час ад часу сустракацца.

Яна паглядзела на Эдуарда сваімі вялікімі карымі вачыма (прызнаймася, што самі па сабе яны былі гожыя), а калі госьць сыходзіў, лёгенька пагладзіла яго па руцэ, так што ў ім забуяла радаснае пачуцьцё пераможцы.

7

Эдуард быў упэўнены, што непрыемная афера разьвязалася на ягоную карысьць, і з нахабнаю бестурботнасьцю пайшоў на наступным тыдні ў касьцёл; пагатоў ён зноўку йшоў туды з поўнай упэўненасьцю ў сабе, бо (якой бы спагадлівай усьмешкі гэта ў нас ні выклікала) тое, як прайшлі адведзіны дырэктаркі, ён прыгадваў як бліскучы доказ сваёй мужчынскай прывабнасьці.

Зрэшты, якраз у тую нядзелю ў касьцёле ён заўважыў, што Аліцыя неяк зьмянілася: адразу ж, як яны сустрэліся, яна ўзяла яго пад руку і не адпусьціла яго нават у касьцёле; калі раней яна паводзіла сябе сьціпла й някідка, дык гэтым разам усё аглядалася вакол і павіталася, усьмешліва ківаючы, прынамсі зь дзесяцьцю знаёмымі.

Гэта было незвычайна, і Эдуард нічога не разумеў.

Калі праз два дні яны прагульваліся па сьцямнелых вулках, Эдуард зь зьдзіўленьнем зазначыў, што яе пацалункі, некалі

так непрыемна абыякавыя, павільгатнелі, пацяплелі ды набылі жарсьці. А калі яны ненадоўга спыніліся пад ліхтаром, ён заўважыў, што на яго глядзіць пара закаханых вачэй.

- Каб ты толькі ведаў, як я цябе кахаю, - сказала яму Аліцыя бяз дай прычыны і адразу ж прыкрыла яму рукой вусны. - Не, не, нічога не кажы, я саромеюся, я не хачу нічога чуць.

Яны зноў трохі прайшлі, ізноў спыніліся, і Аліцыя сказала:

- Цяпер я ўжо ўсё разумею. Я ўжо разумею, чаму ты мяне папікаў, што я ў сваёй веры надта бестурботная.

Эдуард, аднак, не разумеў нічога, а таму нічога й не казаў; калі яны прайшлі яшчэ трохі, Аліцыя прамовіла:

- А ты мне нічога не гаварыў. Чаму ты мне нічога не сказаў?

- А што мне было табе казаць? - спытаў Эдуард.

- Так, ты такі, - сказала яна ў ціхім захапленьні. - Іншыя б выхваляліся, а ты маўчыш. Але якраз за гэта я й кахаю цябе.

Эдуард пачаў падазраваць, аб чым ідзе гаворка, але ўсё ж такі спытаўся:

- Пра што ты гаворыш?

- Пра тое, што з табой здарылася.

- Але ад каго ты даведалася?

- Не сьмяшы! Усе пра гэта ведаюць. Цябе выклікалі, табе пагражалі, а ты іх высьмеяў проста ў вочы. Ні ад чога не адмаўляўся. Усе зь цябе дзівяцца.

- Але ж я пра гэта нікому не казаў.

- Ня будзь наіўны. Такія навіны разьлятаюцца хутка. Гэта ж ня жартачкі. Дзе цяпер знойдзеш кагосьці, хто б меў крыху мужнасьці?

Эдуард ведаў, што ў маленькім мястэчку кожная падзея ператвараецца ў легенду, але ж ён не падазраваў, што і яго малаважныя прыгоды, значэньня якіх ён ніколі не пераацэньваў, маюць у сабе такую легендатворную моц; ён недастаткова разумеў, наколькі дарэчы прыйшоўся сваім землякам, якія, як вядома, захапляюцца не *драматычнымі* героямі (тымі, хто змагаецца й перамагае), а менавіта *пакутнікамі*, бо апошнія іх усьцешліва зацьвярджаюць у іхнай ляяльнай бязьдзейнасьці, запэўніваючы, што жыцьцё прапануе толькі два варыянты: быць зьнішчаным ці быць паслухмяным. Ніхто ня меў сумневу, што Эдуард будзе зьнішчаны, і ўсе з захапленьнем пераказвалі гэта іншым, пакуль цяпер Эдуард - дзякуючы Аліцыі - не спаткаўся з цудоўным вобразам уласнага ўкрыжаваньня. Ён прыняў гэта спакойна і сказаў:

- Але тое, што я ні ад чога не адмаўляўся, - гэта ж натуральна. Так бы кожны зрабіў.

- Кожны? - выпаліла Аліцыя. - Паглядзі навокал, паглядзі, што ўсе робяць! Якія ўсе баязьліўцы! Выракліся б уласнае маці!

Эдуард маўчаў, маўчала і Аліцыя. Яны йшлі і трымаліся за рукі. Потым Аліцыя прашаптала:

- Я б усё для цябе зрабіла.

Такога Эдуарду яшчэ ніхто не казаў; гэтыя словы былі нечаканым дарункам. Эдуард, натуральна, ведаў, што гэты дарунак незаслужаны, але ён сказаў сабе, што, калі лёс адмаўляе яму ў заслужаных дарунках, ён мае поўнае права прымаць незаслужаныя, таму ён сказаў:

- Для мяне ўжо ніхто нічога зрабіць ня можа.

- Як гэта? - прашаптала Аліцыя.

- Са школы мяне выкінуць, а тыя, хто цяпер гаворыць пра мяне, як пра героя, дзеля мяне палец на палец не пакладуць. Я ўпэўнены толькі ў тым, што зноў застануся адзін.

- Не застанешся, - пакруціла галавой Аліцыя.

- Застануся, - сказаў Эдуард.

- Не застанешся! - амаль крычала Аліцыя.

- Усе мяне выракліся.

- Я цябе ніколі ня выракуся, - сказала Аліцыя.

- Вырачашся, - сказаў Эдуард сумна.

- Ня выракуся, - паўтарыла Аліцыя.

- Не, Аліцыя, - сказаў Эдуард, - ты мяне не кахаеш. Ты мяне ніколі не кахала.

- Гэта няпраўда, - шаптала Аліцыя, і Эдуард з задавальненьнем заўважыў, што вочы ў яе змакрэлі.

- Не кахаеш, Аліцыя, гэта ж відаць. Ты заўжды была са мной халодная. Закаханая жанчына так сябе не паводзіць. Я гэта вельмі добра ведаю. А цяпер ты мне спачуваеш, бо мяне хочуць зьнішчыць. Але ж ты мяне не кахаеш, і я не хачу, каб ты прыкідвалася.

Яны ўсё йшлі, трымаючыся за рукі. Аліцыя ціхенька паплаквала, а потым раптам спынілася і, усхліпваючы, загаварыла:

- Не, гэта няпраўда, ты не павінен так думаць, гэта няпраўда.

- Гэта так, - сказаў Эдуард і, пакуль Аліцыя безупынку плакала, прапанаваў ёй зьезьдзіць у суботу ў вёску. У прыгожай даліне каля ракі стаіць братава лецішча, дзе яны змогуць пабыць адны.

Аліцыін твар быў мокры ад сьлёз, і яна моўчкі ківала.

8

Тое было ў аўторак, а ў чацьвер, калі Эдуард ізноў быў запрошаны да дырэктаркі ў госьці, ён пайшоў да яе зь вясёлаю

зухаватасьцю, бо зусім не сумняваўся, што ягоная абаяльнасьць разьвеяла касьцельны скандал проста ў воблачка дыму, у нішто. Але так у жыцьці бывае: чалавек думае, што грае ролю ў нейкай п'есе, і нават не здагадваецца, што на сцэне тым часам незаўважна зьмяніліся дэкарацыі і ён, ні пра што не падазраючы, апынуўся пасярод іншага спэктаклю.

Ён зноўку сядзеў у фатэлі насупраць дырэктаркі; паміж імі стаяў столік, а на ім - бутэлька каньяку ў атачэньні двух кілішкаў. Менавіта гэтая бутэлька каньяку і была той самай новай дэкарацыяй, паводле якой кемлівы мужчына ў цьвярозым розуме вокамгненна вызначыў бы, што ход ужо зусім не пра касьцельную аферу.

Але нявінны Эдуард быў настолькі захоплены сабой, што спачатку гэтага нават не ўсьведамляў. Ён уключыўся ў даволі вясёлую ўступную размову (зьмест якой быў няпэўны й агульны), выпіў прапанаваны кілішак і неяк зусім прастадушна засумаваў. Праз паўгадзіны або гадзіну дырэктарка незаўважна перайшла да больш асабістых тэмаў і загаварыла пра сябе; зь яе словаў перад Эдуардам мелася паўстаць тая, якой яна хацела здавацца: разумная жанчына сярэдняга веку, ня надта шчасьлівая, якая, аднак, з годнасьцю прымае сваю долю, жанчына, якая ні пра што не шкадуе і нават радуецца, што яна незамужняя, бо толькі гэтак можна напоўніцу адчуць сьпелы смак сваёй самастойнасьці і радасьць прыватнага жыцьця, маючы прыгожую кватэру, дзе добра сябе адчуваеш і дзе, пэўна, Эдуарду таксама не непрыемна.

«Не, мне тут файна», - сказаў Эдуард, сказаў сьцішана, бо якраз у гэты момант перастаў адчуваць сябе файна. Бутэлька каньяку (якога ён так неабачліва пажадаў у час мінулых адведзінаў і які дырэктарка цяпер з такой пагрозьлівай гатовасьцю пасьпяшалася паставіць на стол), чатыры сьцяны пакою (якія стваралі прастору нібыта ўсё больш зачыненую і цесную), дырэктарчын маналёг (які засяроджваўся на ўсё больш асабістых тэмах), яе погляд (небясьпечна пільны) - усё гэта паспрыяла таму, што зьмена спэктаклю нарэшце пачала да яго даходзіць; ён зразумеў, што патрапіў у сытуацыю, разгортваньне якой канчаткова перадвызначана; ён усьвядоміў,

што яго існаваньню ў школе пагражае не непрыязнасьць дырэктаркі да яго, а якраз наадварот - яго фізычнае нежаданьне худой жанчыны з пушком пад носам, якая заахвочвае яго піць. Трывога сьцяла яму горла.

Ён паслухаўся дырэктаркі й выпіў, але ягоная трывога была настолькі моцная, што алькаголь на яго зусім не падзейнічаў. Затое дырэктарка пасьля пары кілішкаў абсалютна пазбылася звычайнай цьвярозасьці, і яе словы набылі амаль пагрозьлівую экзальтаванасьць.

- У адным я вам зайздрошчу, - казала яна. - Што вы такі малады. Вы яшчэ ня можаце ведаць, што такое расчараваньне, што такое страта ілюзіяў. Вы яшчэ бачыце сьвет, поўны надзеі і прыгажосьці.

Яна цераз столік нахілілася да Эдуарда і ў тужлівым маўчаньні (з застылай сутаргавай усьмешкай) утаропіла ў яго жахліва вялікія вочы. Ён зразумеў, што калі ня здолее трохі набрацца, дык гэты вечар скончыцца для яго вялікай ганьбай; таму ён наліў сабе яшчэ чарачку каньяку і хуценька выпіў.

А дырэктарка працягвала:

- Але ж і я хачу яго бачыць такім! Так, як вы! - Яна ўстала з фатэля і выпнула грудзі. - Я ж ня нейкая там нудная баба! Праўда ж, не? - Яна абышла столік і схапіла Эдуарда за руку. - Не?

- Не, - сказаў Эдуард.

- Хадземце, будзем танчыць, - сказала яна, пусьціла Эдуардаву руку і падбегла да радыё. Яна доўга круціла ручку наладкі, пакуль не знайшла нейкай танцавальнай музыкі. Потым з усьмешкай стала над Эдуардам.

Эдуард падняўся, схапіў дырэктарку і пачаў вадзіць яе па пакоі ў рытм музыцы. Дырэктарка раз-пораз пяшчотна клала сваю галаву яму на плячо, але праз імгненьне рэзка адводзіла яе назад, каб зазірнуць яму ў вочы, а потым пачынала напаўголасу напяваць мэлёдыю, што гучала з радыё.

Эдуард пачуваўся ніякавата і колькі разоў перапыняў танец, каб выпіць. Цяпер ён прагнуў толькі аднаго - скончыць няёмкасьць гэтага бясконцага хаджэньня, але ў той самы час яго гэта вельмі палохала, бо няёмкасьць таго, што мелася адбыцца пасьля танцу, здавалася яму яшчэ больш невыноснай. Зьбянтэжаны, ён надалей кружыў зь пяюхай па цесным пакоі і пры гэтым няспынна (і прыгнечана) прыслухоўваўся, ці робіць на яго алькаголь жаданае ўзьдзеяньне. Калі яму ўрэшце здалося, што ягоны розум ужо досыць затуманены каньяком, правай рукой ён моцна прыціснуў дырэктарку да сябе, а левую далонь паклаў ёй на грудзі.

Так, ён зрабіў менавіта тое, што ўвесь вечар наганяла на яго жах; ён бы аддаў што заўгодна, каб гэтага не рабіць, і калі ён гэта зрабіў, то - паверце - толькі таму, што зрабіць сапраўды *мусіў*: сытуацыя, у якой ён апынуўся ўжо на пачатку вечару, была настолькі аўтарытарная, што яе разгортваньне можна было запаволіць, але ніяк немагчыма было спыніць. Таму, паклаўшы далонь на дырэктарчыны грудзі, Эдуард проста падпарадкаваўся загаду цалкам непазьбежнае неабходнасьці.

Наступствы ягонага ўчынку, аднак, перасягнулі ўсялякія чаканьні. Як на чарадзейны загад, дырэктарка ў ягоных абдымках пачала выгінацца, а праз імгненьне яе валасатая верхняя губа дакранулася да ягоных вуснаў. Яна паваліла яго на канапу і, дзіка выгінаючыся ды гучна стогнучы, пачала кусаць яго за вусны, а ўрэшце й за кончык языка, ад чаго Эдуарда працяў востры боль. Потым яна вызвалілася зь ягоных абдымкаў, сказала: «Пачакай!» - і пабегла ў ванны пакой.

Эдуард лізнуў палец і пераканаўся, што язык трохі крывавіць. Укус гэтак балеў, што цяжка здабытае ап'яненьне сышло і ягонае горла зноўку сьцяла трывога, калі ён падумаў пра тое, што яго чакае. З ваннай было чуваць магутнае цурчаньне і плёскат вады. Ён узяў пляшку каньяку, прыклаўся і добра каўтануў.

Але тут ужо ў празрыстай нэйлёнавай начнушцы (на грудзях густа аздобленай карункамі) у дзьвярох зьявілася дырэктарка і павольна падышла да Эдуарда. Яна абняла яго, потым крыху адступіла назад і сказала з дакорам: «Чаму ты адзеты?»

Эдуард зьняў пінжак і, гледзячы на дырэктарку (тая ўтаропілася ў яго сваімі вялікімі вачыма), ня мог думаць ні пра што іншае, як толькі пра тое, што ягонае цела, хутчэй за ўсё, будзе сабатаваць яго старанную волю. Жадаючы неяк узбудзіць сваё цела, ён сказаў няўпэўненым голасам: «Здымеце зь сябе ўсё».

Хуткім, заўзята паслухмяным рухам яна скінула зь сябе начнушку і агаліла тонкую белую паставу, пасярэдзіне якой з маркотнай сіратлівасьцю вылучалася густая чарната. Яна павольна набліжалася да яго, і Эдуард з жахам пераканаўся ў тым, што ўжо ведаў і раней: ягонае цела было дарэшты скаванае страхам.

Я ведаю, спадарства, што з гадамі вы звыкліся з пэрыядычнай непаслухмянасьцю ўласнага цела і вас гэта ўжо ня можа вывесьці з раўнавагі. Але зразумейце: Эдуард быў тады яшчэ малады! Сабатаж з боку ягонага цела штораз наганяў на яго надзвычайную паніку і здаваўся яму нязмыўнай ганьбай, незалежна ад таго, быў гэтаму сьведкам твар прыгожы або такі брыдкі й камічны, як твар дырэктаркі. А тая была ўжо за крок ад яго, і спалоханы Эдуард, ня ведаючы, што рабіць, сказаў раптам, сам не разумеючы як (гэта быў хутчэй плён натхненьня, чым сьвядомага роздуму):

- Не, не, Богам прашу, не! Не, гэта грэх, гэта быў бы грэх! - і адскочыў.

Дырэктарка надалей набліжалася да яго і мармытала глухім голасам:

- Які грэх! Ніякага граху няма!

Эдуард адступіў за круглы столік, абапал якога яны нядаўна сядзелі:

- Не, я так не магу! Я не магу!

Дырэктарка адпіхнула фатэль, што стаяў у яе на шляху, і працягвала свой наступ на Эдуарда, не спускаючы зь яго вялікіх чорных вачэй:

- Ніякага граху няма! Ніякага граху няма!

Эдуард абышоў столік, за ім стаяла ўжо толькі канапа; дырэктарка была ўсяго за крок ад яго. Далей адступаць не было куды, і, пэўна, сама роспач у гэты безвыходны момант раптам падказала яму, каб ён загадаў:

- Укленчы!

Яна паглядзела на яго зь неразуменьнем, але калі ён зноўку паўтарыў цьвёрдым (хоць і роспачным) голасам: «Укленчы!», яна экзальтавана ўпала перад ім на калені і абняла яго за ногі.

- Прыбяры рукі, - крыкнуў ён. - Самкні далоні!

Яна зноў паглядзела на яго зь неразуменьнем.

- Самкні іх! Ты чула?

Яна самкнула рукі.

- Маліся, - загадаў ён.

З самкнутымі далонямі яна аддана глядзела на яго зьнізу ўверх.

- Маліся, каб Бог нам дараваў, - сыкнуў ён.

Трымаючы рукі самкнутымі, яна глядзела на яго вялікімі вачыма. Дзякуючы ўдалай ідэі, Эдуард ня толькі выйграў такі патрэбны час, але і - гледзячы на дырэктарку зьверху - пачаў пазбаўляцца гнятлівага пачуцьця, што ён чужая здабыча, і набыў упэўненасьці ў сабе. Ён крыху адступіў, каб бачыць яе цалкам, і зноў загадаў:

- Маліся!

Яна па-ранейшаму маўчала, і ён крыкнуў:

- Уголас!

І сапраўды: худая голая жанчына на каленях пачала чытаць:

- Войча наш нябесны! Хай сьвяціцца імя Тваё, хай прыйдзе валадарства Тваё...

Прамаўляючы словы малітвы, яна глядзела на яго так, нібыта ён быў сам Бог. А ён пазіраў на яе з усё большай уцехай: перад ім на каленях стаяла дырэктарка, зьняважаная падначаленым, перад ім была голая камуністка, зьняважаная малітвай, перад ім была жанчына за малітвай, зьняважаная галізной.

Гэты патройны вобраз зьнявагі яго ап'яніў, і раптам адбылося нешта нечаканае: ягонае цела адмовілася ад свайго пасіўнага супраціву; Эдуард быў узрушаны!

У момант, калі дырэктарка казала: «...І ня ўводзь нас у спакусу», ён хуценька скінуў зь сябе ўсё адзеньне, а як толькі яна прамовіла «Амін», ён рэзка падняў яе з падлогі і пацягнуў на канапу.

9

Такім чынам, гэта было ў чацьвер, а ў суботу Эдуард з Аліцыяй паехалі ў вёску да ягонага брата. Брат сустрэў іх гасьцінна і даў ім ключ ад лецішча, якое было непадалёк. Каханкі пайшлі і цэлы дзень блукалі па лясох і лугох. Яны цалаваліся, і Эдуард усьцешанымі рукамі пераканаўся, што праведзеная на роўні пупка ўяўная рыса, якая аддзяляла сфэру нявіннасьці ад сфэры пералюбу, страціла сваю сілу. У першы момант яму закарцела пракамэнтаваць гэтую доўгачаканую падзею, але потым ён зразумеў, што лепей маўчаць.

Ён цалкам слушна меркаваў, што нечаканы паварот у Аліцыіных паводзінах адбыўся незалежна ад яго шматтыднёвага ўгаворваньня, незалежна ад ягонай аргумэнтацыі, незалежна ад нейкай *лягічнай* высновы; наадварот, паварот гэты грунтаваўся выключна на зьвестках пра Эдуардава пакутніцтва, то бок на памылцы, але і з гэтай памылкі ён вынікаў цалкам *нелягічна*; бо разважма: з чаго б гэта Эдуардава пакутніцкая вернасьць веры мусіла мець наступствам тое, што Аліцыя сама цяпер ня будзе верная Боскаму закону? Калі Эдуард ня здрадзіў Богу перад сьледчай

камісіяй, то чаму яна мелася б здрадзіць Богу перад Эдуардам?

У такой сытуацыі кожнае выказанае ўголас меркаваньне магло б міжвольна адкрыць Аліцыі нелягічнасьць яе пазыцыі. Таму Эдуард разумна маўчаў, што, аднак, ніяк ня кідалася ў вочы, бо Аліцыя сама размаўляла досыць, была вясёлая, і нішто ня сьведчыла пра тое, што паварот, які адбыўся ў яе душы, быў драматычны або балючы.

Калі сьцямнела, яны пайшлі на лецішча, запалілі сьвятло, паслалі ложак, пачалі цалавацца, а потым Аліцыя папрасіла Эдуарда, каб той выключыў лямпу. Праз акно, аднак, надалей тачылася сьвятло зорак, таму Эдуард на Аліцыіну просьбу мусіў яшчэ й зачыніць аканіцы. Потым у поўнай цемры Аліцыя разьдзелася і аддалася яму.

Столькі тыдняў Эдуард прагнуў гэтых хвілінаў, але цяпер, калі яны прыйшлі, ён, на дзіва, папросту не адчуваў той іх значнасьці, пра якую мелася б сьведчыць працягласьць ягонага чаканьня; яны здаліся яму настолькі простымі й банальнымі, што, кахаючыся, ён быў амаль няўважлівы і марна адганяў думкі, якія лезьлі яму ў галаву: яму прыгадваліся тыя даўгія змарнаваныя тыдні, калі Аліцыя катавала яго сваёй халоднасьцю, яму прыгадваліся ўсе тыя пакуты ў школе, да якіх яна спрычынілася, таму замест удзячнасьці за тое, што яна яму аддалася, Эдуард пачаў адчуваць нейкую помсьлівасьць і разьюшанасьць. Яго злавала, як лёгка і без згрызотаў сумленьня яна здраджвае свайму Богу Непералюбу, якому некалі гэтак фанатычна пакланялася; яго злавала, што яе нішто ня можа вывесьці з ураўнаважанасьці, ніякае жаданьне, ніякая падзея, ніякі паварот; яго злавала, як яна пражывае ўсё без унутранага разладу, упэўнена і лёгка. І калі гэтая злосьць моцна ім авалодала, ён паспрабаваў любіцца зь ёй дзіка й шалёна, каб выцягнуць зь яе нейкі гук, стогн, слова, просьбу, але ў яго не атрымалася. Дзяўчына ляжала бязгучна, і, нягледзячы на ўсе яго намаганьні, іхныя любошчы скончыліся таксама даволі ціха і недраматычна.

Яна прытулілся да ягоных грудзей і хутка заснула, тым часам як Эдуард доўга ня спаў і ўсьвядоміў, што зусім не адчувае ніякай радасьці. Ён паспрабаваў уявіць сабе Аліцыю (не яе

фізычнае аблічча, а па магчымасьці ўсю яе істоту напоўніцу), і адразу ж яму прыйшло да галавы, што ён бачыць яе *расплывіста*.

Прыпынімся на гэтым слове: Аліцыя, якой яе бачыў дагэтуль Эдуард, была, пры ўсёй сваёй наіўнасьці, істота пэўная і ясная, - прыгожая прастата яе выгляду, здавалася, адпавядала гранічнай прастаце яе веры, а яе просты лёс здаваўся абгрунтаваньнем яе пазыцыі. Эдуард яе дагэтуль бачыў цэльнай і зладжанай; ён мог зь яе сьмяяцца, мог яе праклінаць, мог строіць супраць яе хітрыкі, але мусіў яе (міжволі) паважаць.

Цяпер, аднак, ненаўмысная пастка фальшывых зьвестак разбурыла цэльнасьць яе істоты, і Эдуарду здалося, што ейныя погляды былі, уласна кажучы, нечым *прыклееным* да ейнага лёсу, а яе лёс - толькі нечым прыклееным да ейнага цела. Ён пабачыў яе як выпадковае спалучэньне цела, думак і жыцьцёвага шляху, спалучэньне неарганічнае, адвольнае і няўстойлівае. Ён уяўляў Аліцыю (якая глыбока дыхала ў яго на плячы) і бачыў яе цела асобна, а думкі асобна. Ейнае цела яму падабалася, ейныя думкі здаваліся яму сьмешнымі, а ўсё разам не ўтварала ніякай істоты; ён бачыў яе як рысу, што расплылася на прамакатцы: без абрысаў, бяз твару.

Гэтае цела яму сапраўды падабалася. Калі Аліцыя ранкам паднялася, ён прымусіў яе застацца голай, і яна, хоць яшчэ ўчора ўпарта настойвала на зачыненых аканіцах, бо ёй замінала нават бляклае зорнае сьвятло, цяпер зусім забылася пра сваю сарамлівасьць. Эдуард разглядаў яе (яна весела скакала, шукаючы пачак гарбаты і печыва на сьняданак), а калі Аліцыя праз імгненьне таксама падняла на яго вочы, то заўважыла, што ў яго задуменны выгляд. Яна запыталася, што зь ім. Эдуард адказаў, што пасьля сьняданку мусіць зайсьці да брата.

Брат распытваў Эдуарда, як той маецца ў школе. Эдуард адказаў, што цалкам добра, а брат сказаў:

- Тая Чэхачкава - сьвіньня, але я ёй даўно ўжо дараваў. Дараваў, бо яна ня ведала, што робіць. Яна хацела мне

нашкодзіць, але замест таго паспрыяла майму дабрабыту. Як земляроб я зарабляю болей, а сувязь з прыродай ратуе мяне ад скепсысу, які ахоплівае гарадзкіх жыхароў.

- Ведаеш, у нейкім сэнсе і мне гэтая баба прынесла шчасьце, - задуменна сказаў Эдуард і расказаў брату, як закахаўся ў Аліцыю, як сымуляваў веру ў Бога, як яго судзілі, як Чэхачкава хацела яго перавыхаваць, а Аліцыя ўрэшце аддалася яму, як пакутніку. Толькі пра тое, як ён прымусіў дырэктарку чытаць «Ойча наш», Эдуард не сказаў, бо ўбачыў у братавых вачох нязгоду. Эдуард змоўк, а брат сказаў:

- Я, пэўна, маю пару-тройку заганаў, але толькі ня гэтую. Ніколі не прыкідваўся і кожнаму гаварыў проста ў вочы, што думаю.

Эдуард любіў брата, і братава нязгода яго балюча кранула; ён паспрабаваў апраўдацца, і яны пачалі спрачацца. Нарэшце Эдуард сказаў:

- Я ведаю, браце, што ты шчыры чалавек і гэтым ганарышся. Але задай сабе адно пытаньне: « *Навошта*, уласна, гаварыць праўду?» Што нас да яе абавязвае? І чаму мы ўвогуле лічым праўдзівасьць цнотай? Уяві сабе, што ты сустрэнешся з вар'ятам, які будзе цьвердзіць, што ён - рыба і ўвогуле ўсе мы - рыбы. Ты будзеш зь ім спрачацца? Будзеш перад ім распранацца і паказваць, што ў цябе няма плаўнікоў? Будзеш яму казаць у вочы, што думаеш? Ну скажы!

Брат маўчаў, а Эдуард працягваў:

- Калі б ты яму гаварыў толькі чыстую праўду, толькі тое, што ты пра яго сапраўды думаеш, ты б пайшоў на сур'ёзную размову з вар'ятам і сам зрабіўся б вар'ятам. Гэтаксама зь сьветам вакол нас. Калі б я яму ўпарта гаварыў праўду ў вочы, гэта б значыла, што я стаўлюся да яго сур'ёзна. А ставіцца сур'ёзна да нечага настолькі несур'ёзнага - значыць самому стаць несур'ёзным. Я, браце, мушу маніць, калі не хачу сур'ёзна ставіцца да вар'ятаў і зрабіцца адным зь іх.

10

У нядзелю па абедзе каханкі паехалі назад у горад; яны былі адны ў купэ (дзяўчына ўжо зноўку весела шчабятала), і Эдуард прыгадаў, як ён некалі спадзяваўся, што знойдзе ў неабавязковай Аліцыі тую жыццёвую сур'ёзнасьць, якой яму не даюць ягоныя працоўныя абавязкі; цяпер ён з шкадаваньнем усьвядоміў (цягнік ідылічна грукатаў на стыках рэек), што любоўная гісторыя, якую ён з Аліцыяй перажыў, цалкам пазбаўленая якой-колечы сур'ёзнасьці й сэнсу, што яна абсалютна нікчэмная, склееная з выпадковасьцяў і памылак; ён чуў Аліцыіны словы, бачыў ейныя жэсты (яна сьціскала яму руку), і яму прыйшло да галавы, што гэта знакі, пазбаўленыя сэнсу, манэткі без грашовай вартасьці, папяровыя гіры, на якія ён можа зьвяртаць увагі ня болей, чым Бог на малітву голай дырэктаркі; і яму раптам здалося, што ў прынцыпе ўсе людзі, якіх ён спаткаў на новым месцы, былі толькі рысамі, якія распаўзьліся па прамакатцы, істотамі зь лёгка зьмяняльнай пазыцыяй, істотамі бяз пэўнай сутнасьці; але што яшчэ горш, нашмат горш (здалося яму тады), ён сам быў толькі ценем гэтых ценепадобных людзей, заўжды выдаткоўваў увесь свой розум на тое, каб да іх прыстасавацца і прыпадобніцца, і няважна, што ён прыпадабняўся да іх з унутраным сьмехам, несур'ёзна, з жаданьнем употай зь іх пасьмяяцца (і гэтак апраўдаць сваё прыстасаванства), - гэта нічога не зьмяняла, бо і зламысная імітацыя застаецца імітацыяй, а цень, які зьдзекуецца, застаецца ценем, падпарадкаваным і другасным, мізэрным і пустым.

Гэта была ганьба, гэта была страшэнная ганьба. Цягнік ідылічна грукатаў на стыках рэек (дзяўчына шчабятала), і Эдуард спытаў:

- Аліцыя, ты шчасьлівая?

- Так, - адказала Аліцыя.

- А я ў роспачы, - сказаў Эдуард.

- Што ты вярзеш? - сказала Аліцыя.

- Мы ня мелі права гэтага рабіць. Гэтага не павінна было

здарыцца.

- Што табе дало ў галаву? Ты ж сам гэтага хацеў!

- Так, хацеў, - сказаў Эдуард. - Але гэта была мая найвялікшая памылка, якой мне Бог ніколі не даруе. Гэта быў грэх, Аліцыя.

- Слухай, што з табой? - сказала дзяўчына спакойна. - Ты ж сам увесь час казаў, што Бог хоча ад нас найперш любові.

Калі Эдуард пачуў, як Аліцыя спакойна прыўлашчыла ягоны тэалягічны сафізм, які ён некалі гэтак беспасьпяхова выкарыстаў у змаганьні, яго ахапіла шаленства:

- Я гэта казаў, каб цябе выпрабаваць! Цяпер я даведаўся, як ты можаш быць верная Богу! Але той, хто можа здрадзіць Богу, можа здрадзіць чалавеку ў сто разоў лягчэй!

Аліцыя ўсё яшчэ знаходзіла трапныя пярэчаньні, аднак лепей бы яна іх не знаходзіла, бо яны толькі разьдзімалі ў Эдуардзе помсьлівае шаленства. Эдуард гаварыў так бясконца доўга (ён нават ужыў словы *брыдота* і *фізычная агіда*), што нарэшце выціснуў з гэтага спакойнага й пяшчотнага твару ўсхліпы, сьлёзы і лямант.

- Бывай, з Богам, - сказаў ён Аліцыі на вакзале і пакінуў яе ў сьлязах. Толькі дома, праз колькі гадзінаў, калі ў ім суцішыўся гэты дзіўны гнеў, да яго напоўніцу дайшло, што ён нарабіў; ён уявіў сабе ейнае цела, якое ў галізьне паскоквала перад ім ранкам таго самага дня, і калі ён асэнсаваў, што гэтае прыгожае цела пакідае яго, бо ён сам добраахвотна яго адштурхнуў, Эдуард злосна аблаяў сябе ідыётам і ў яго зьявілася жаданьне адвесіць сабе поўху.

Але што адбылося, тое адбылося, і нічога ўжо нельга было выправіць.

Зрэшты, трэба сказаць напраўду, што хоць вобраз згубленага прыгожага цела і прынёс Эдуарду бясспрэчны боль, аднак зьмірыўся ён з гэтай стратай адносна хутка. Калі раней ён пакутаваў і прыходзіў у адчай ад нястачы фізычнага каханьня,

дык гэта была часовая нястача прыбыша. Ад гэтага Эдуард ужо не цярпеў. Раз на тыдзень ён наведваў дырэктарку (звычка пазбавіла яго пачатковых страхаў) - ён вырашыў хадзіць да яе, пакуль ягонае становішча ў школе цалкам ня высьветліцца. Да таго ж ён спрабаваў, з усё большым посьпехам, паляваць на шмат якіх іншых жанчын і дзяўчат. У выніку ён пачаў нашмат больш цаніць моманты, калі заставаўся адзін, і палюбіў самотныя шпацыры, якія часам спалучаў (калі ласка, зьвярніце сваю ўвагу на гэтую апошнюю дэталь) з наведваньнем касьцёлу.

Не, не палохайцеся, Эдуард не пачаў верыць у Бога. Мой расповед ня меў намеру ўвянчацца эфэктам гэткага паказнога парадоксу. Але Эдуард, хоць ён амаль і ўпэўнены, што Бога няма, усё ж такі любіць з настальгіяй паразважаць над ідэяй Бога.

Бог - гэта сама сутнасьць, між тым як Эдуард так і не знайшоў (а з часу гісторыі з дырэктаркай і Аліцыяй сплыла ўжо чарада гадоў) нічога сутнаснага ані ў сваіх каханьнях, ані ў сваім настаўніцтве, ані ў сваіх думках. Ён занадта кемлівы, каб мог дапусьціць, нібыта бачыць сутнасьць у нечым, што яе ня мае, але занадта слабы, каб употай да сутнаснасьці не імкнуцца.

Эх, спадарства, сумна жывецца чалавеку, калі ён ня можа ні да чога і ні да кога ставіцца сур'ёзна!

І таму Эдуард прагне спазнаць Бога, бо адзін толькі Бог пазбаўлены гэтага пацешнага абавязку *зьяўляцца*, а можа проста *быць*; бо адзін толькі ён стварае (ён сам, адзіны й няісны) сутнасны бок гэтага нясутнаснага, неістотнага (затое тым больш існага) сьвету.

І вось Эдуард часам сядае ў касьцёле і задумліва пазірае на столь. Давайце зь ім разьвітаемся менавіта ў такое імгненьне: час па абедзе, касьцёл ціхі й пусты, Эдуард сядзіць на драўлянай лаўцы і пакутуе ад шкадаваньня, што Бога няма. І якраз у гэты момант ягонае шкадаваньне настолькі моцнае, што раптам з глыбіні гэтага пачуцьця перад ім вынырвае сапраўднае, *жывое* Божае аблічча. Глядзеце! Так! Эдуард усьміхаецца! Ён усьміхаецца, і ягоная ўсьмешка шчасьлівая...

Калі ласка, захавайце яго ў сваёй памяці з гэтай усьмешкай.

Пераклаў з чэскай Аляксей Знаткевіч паводле:
Milan Kundera. Směšné lásky. Brno: Atlantis, 1991

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

Павал Гюле
Смаўжы, калюжыны, дождж

Франку Расэту

Спачатку быў дождж. Ён ішоў некалькі дзён, і наўпоблізь касьцёлу Ўваскрашэнцаў вада выдзеўбла глыбокія канавы, па якіх зь лесу плыло вецьце, сьцябліны травы й маленькія шышкі. Я любіў стаяць у гэтым месцы. Вада булькатала па камянёх, вымытых з дарогі, струменьчыкі зьліваліся ў адну хуткую плынь, якая сьцякала ўніз па вуліцы Гамулкі, далей перасякала вуліцу Хшаноўскага й нарэшце разьлівалася ў агромністыя калюжыны паабапал праезнай часткі. Пагорак за касьцёлам ахутвала імжа, з хваёвых і яловых галінаў спадалі цяжкія кроплі, і ўсё, нават дахі дамоў і верх драўлянай званіцы, патанала ў аднастайным шуме.

Штогод пах лета прыходзіў з боку мора. Брыз прыносіў з сабою пах разьвешаных сетак і смак солі, які адчуваўся на вуснах, а цяпер лета паказвала сваё адваротнае, можа быць, прыхаванае аблічча. Над зямлёй віравала нябачная заслона, у якой панавала стыхія плоднасьці. Водар цьвілі, грыбоў, жывіцы й незнаёмых зёлак падымаўся над калюжынамі, як густы ўзвар, вяртаўся з кожнай хваляй дажджу, запаўняў агароды й вуліцы, а набрынялая зеляніна, здавалася, вось-вось раструшчыць зьвільгатнелыя муры дамоў, зь якіх здаўна ўжо паціху ападаў

ПАВАЛ ГЮЛЕ (нар. у 1957 у Гданьску) - польскі пісьменьнік, калюмніст «Газэты выборчай». Аўтар двух зборнікаў апавяданьняў і двух раманаў, адзін зь якіх быў экранізаваны. Зьмешчаныя тут апавяданьні друкуюцца з ласкавай згоды Паўла Гюле.

тынк, сям-там агаляючы ўрыўкі незразумелых надпісаў.

Я даставаў з кішэні прыгатаваныя трэсачкі. Спачатку на ваду апускалася «Санта-Марыя», потым «Магелян», «Капітан Грант», «Наўтылюс», сярод іх прашмыгваў эсьмінец «Бура» часоў апошняй вайны, і нарэшце, завяршаючы спуск на ваду, я выпускаў у ручай флягман «Трынідад», назва якога не паходзіла ані з кніжак, ані з марскіх аповедаў. «Трынідад» выражаў неакрэсьленую тугу па цеплыні трапічнага мора, па бляску гішпанскага золата, а таксама па водары мандарынаў, якія ў апошнія некалькі год зьяўляліся ў нашым горадзе наконадні Раства, калі ў порт заходзіў карабель з Грэцыі альбо Партугаліі.

Недзе ў гушчэчы зяленіва мітусілася пляма сутаны. Гэта пробашч з агромністым парасонам спускаўся да касьцёлу з дому на пагорку. Ён атрасаў кроплі дажджу, размахваючы, як птах, чорнымі крыламі, затрымліваўся на сходах, глядзеў у неба й на дарогу, але нашыя погляды не перакрыжоўваліся.

Караблі плылі ўсё хутчэй, вада несла іх цераз віры, вадаспады і ўсьпененыя парогі, я бег за імі ўніз аж да месца, дзе ручай разьліваўся шырока і ўжо не сіпеў і не булькатаў, а мая армада выплывала на шырокія й спакойныя воды. Калюжыны мелі тут цёмна-зялёны колер, і толькі часам, калі неба зацягвалася мацней, чым звычайна, гэтае зяленіва пераходзіла ў бронзу, і тады сьветлыя карпусы «Санта-Марыі» ці «Наўтылюса» люстраваліся ў вадзе гарызантальнымі, бачнымі здалёк рыскамі.

Я хадзіў па калюгах як Бог, нахілены над сусьветам. Выспы, затокі, мысы й сакрэтныя перашыйкі мянялі свае абрысы няспынна. Да драбніцаў знаёмая з атлясу лінія нарвэскага ф'ёрду ці абрысы швэдзкага ўзьбярэжжа зьяўляліся тут, быццам сьпісаныя з памяці, каб праз пару хвілінаў паддацца таемным зьменам. Кавалкі сушы распадаліся вокамгненна, шхеры й мелі вызначалі новыя шляхі для караблёў, а на месцы колішніх архіпэлягаў паўставалі новыя, з такімі фантастычна рванымі лініямі, што іх вытанчанай прыгажосьці не перадала б аніводная мапа. Сярод іх я цяпер і адшукваў свае караблі. Некаторыя гайдаліся на вадзе, іншыя сядалі на мель, і адно

«Трынідад», быццам у яго назьве хаваўся заклік да самага далёкага падарожжа, ішоў пасярэдзіне разьліву, там, дзе нябачная плынь зносіла карабель на край сьвету. Гэта было небясьпечнае месца. Вада гула на цэмэнтавым парозе, і ўсё, нават маленькія каменьчыкі й грудкі жоўтай гліны, засмоктваў магутны вір каналізацыйнага калодзежу. Яго чыгунны люк, схаваны пад вадою, вёў у падземны сьвет. Туды, куды не сягае дзённае сьвятло й дзе лябірынт пячораў і асьлізлых сьценаў, напоўнены шумам і сіпеньнем, нагадвае пекла. Вада хлюпала ў галёшах, а я ў апошнюю хвіліну вылоўліваў «Трынідад», ратуючы выпадковых падарожнікаў ад катастрофы. Часам гэта быў залацісты жук, што ўчапіўся ў корпус, часам павук ці мураш; я выносіў былых кандыдатаў у пацярпелыя караблекрушэньне на сушу і ішоў угару, да самага касьцёлу, дзе з разгорнутым над галавою парасонам праходзіў між дрэваў пробашч, чытаючы трэбнік.

Я быў самотны й шчасьлівы. Мой бацька таксама быў самотны, але напэўна ня быў тады дужа шчасьлівы. Ён храбрыўся, сьпяваў падчас галеньня, крочыў бадзёра, з усьмешкаю раскланьваўся з суседзямі, аднак, калі ён выходзіў раніцою з палатнянаю торбай, у якой быў сьняданак і аранжавая камізэлька, калі ён выходзіў на працу на вакзале, дзе доўгаю мятлой падмятаў сходы й пэроны, я заўсёды бачыў у ягоных вачах быццам бы цень мэлянхоліі ці задуменьня, зьмяшанага з смуткам, што вось ужо некалькі тыдняў не сядзіць ён над велічэзнаю дошкай з плянамі караблёў, ня крэсьліць на кальцы складаных ліній, не запісвае там сваіх заўвагаў, лічбаў, радыкалаў і квадратных дужак, адно махае чорнаю мятлой, зьбірае на бляшаны шуфлік недапалкі й недагрызкі, а вецер надзімае яго аранжавую камізэльку, быццам ветразь ахвяры караблекрушэньня.

- Ты ж мог падпісаць, - казала мама шторанку, і тады бацька махаў рукамі, крэм для галеньня пырскаў у гляк з малаком, але ягоныя словы пра тое, што лічбы й разьлікі ня ведаюць розных моваў, бо мова матэматыкі толькі адна, простая й сьветлая, як думка Дэкарта, ягоныя гнеўныя словы пра людзей, што ведаюць адно тэрміны спуску на ваду, ня ведаючы законаў фізыкі, - гэтыя словы майго бацькі неяк не даходзілі да маці,

праплывалі паўзь яе, як вада, адбіваліся быццам мячыкі, робячы яго яшчэ самотнейшым і сіратлівейшым.

- Гэты каленчаты вал трэсьне празь дзьвесьце міляў, - намагаўся ён яшчэ тлумачыць, ды гэта было безнадзейна; маму ўжо не цікавіў ніякі вал, а толькі тая зацятая дэманстратыўнасьць, зь якою бацька падмятаў вакзал. Навошта ён гэта рабіў? Навошта спакушаў лёс? Гэта ж быў яўны выклік людзям, якія выкінулі яго «з воўчым білетам», - так казала маці, кладучы ў кухонную печ хваёвыя шчэпы, - і яны яму гэтага ніколі не забудуцца, яны не забываюцца такіх рэчаў! І тады бацька апавядаў, як на вакзале добра, калі начальнік станцыі махае чырвоным жазлом, калі абвяшчаюць прыбыцьцё цягнікоў, што прыходзяць з прыморскіх краёў, калі ён размаўляе з працаўнікамі таварнай плятформы, што дакладна ведаюць, якія тавары празь дзень альбо два зьявяцца ў крамах, бо ўсё - лядоўні, мясарэзкі, чэскія пыласосы, югаслаўская мэбля, пэрсыдзкія кілімы з ГДР - усё гэта праходзіць празь іхныя рукі, і яны могуць натхнёна гаманіць пра гэта гадзінамі, чакаючы чарговага цягніка.

- Я ніколі яшчэ ня бачыла чэскага пыласоса, - крычала мама, - і ня бачыла інжынэра, які хваліцца такой працай! - і да таго, як бацька пасьпяваў выйсьці з хаты, казала яшчэ, што дарма мы прыехалі ў гэты горад, дарма вывозілі друз з руінаў, дарма адбудоўваліся, як тысячы іншых людзей, зь сьпевамі і энтузіязмам, калі цяпер бацька ня можа ў гэтым горадзе знайсьці нармальнае працы, і паўсюль, дзе ён зьяўляецца, разводзяць рукамі й кажуць: «Просім прабачэньня, але з вашымі поглядамі…», - быццам каленчаты вал меў нешта супольнае зь нейкімі там поглядамі.

Бацька, ужо выходзячы, казаў, што праца на вакзале - гэта вельмі добра і што наагул ня варта нічым пераймацца, бо калі скончыцца пабудова гэтага карабля і ён паплыве на выпрабаваньне, тады й выявіцца, хто меў рацыю, тады праўда выйдзе вонкі, бо праўда заўсёды выплывае на паверхню, як алей.

- Якая праўда? - пыталася мама, але ён ужо гэтага ня чуў; ён ішоў, нахіліўшы галаву, праз падворак, палатняная торба

зьвісала зь ягонага пляча, а я адчуваў, што ён яшчэ самотнейшы, чым учора, і што толькі храбрыцца, бо пэрон вакзалу - гэта ня плян корпусу ці машыннага аддзяленьня, а мятла - зусім ня чорны графіт, якім ён запісваў тыя свае лічбы й разьлікі.

Так, мы былі самотныя, але кожны па-свойму. Ён, у аранжавай камізэльцы, падобнай да тых, што насілі сьмецяры, крэсьліў мятлою па пэроне схемы поршняў і каленчатых валоў, а я над дажджавымі струменьчыкамі падарожнічаў на край сьвету, аж да месца, дзе чорная дзірка ўсмоктвала з плыньню вады ўсялякую матэрыю.

Можа, так выглядаў уваход у Гадэс? Я ведаў, што сьвет ценяў, схаваны ад вачэй простых сьмяротных, мае сакрэтныя ўваходы, гэткія пралазы, вядомыя адно нешматлікім сьмельчакам, але ці не праходзіла акурат там дарога ў каралеўства Пэрсэфоны? Калі б я быў Адысэем альбо песьняром з Фракіі, ці мог бы я, адсунуўшы люк каналізацыйнага калодзежу, сысьці проста на бераг Стыксу? На такое пытаньне магла б адказаць толькі бабця Марыя, якая падчас сваіх зімовых візытаў чытала мне міталягічныя гісторыі; толькі яна далася б правесьці сябе празь вялікія калюжыны і, напэўна, зацікавілася б вірам, у якім зьнікалі стварэньні, якіх несла вада. Але яе не было са мною, яе не было нават у нашым горадзе, яна жыла ад нас далёка, таму, калі я адзін бадзяўся па разьліве, я мусіў задавальняцца выключна домысламі, няўпэўненасьцю й маўклівымі поглядамі пробашча.

Калі б Ісус правёў тры дні пасьля свайго пахаваньня ў Гадэсе, калі б адзіным жэстам утаймаваў Цэрбэра, а пасьля спаткаў там… няшчаснага Сызыфа - так, тады я мог бы спытаць пробашча пра сакрэтны ўваход у тагабочны сьвет. Але сказ з *«Credo»* , які я прыгадаў, стоячы над каналізацыйным калодзежам, гэты ляканічны й таямнічы сказ, што прамаўляецца падчас кожнай імшы: «І сышоў у пекла, а на трэці дзень уваскрос», - нічога больш пра гэтае пекла не паведамляў, і немагчыма было зразумець, ці мела яно што-небудзь супольнае з Гадэсам і ракою забыцьця. Але, нягледзячы на гэта, я ўбачыў Ісуса ў воднай плыні: у белым адзеньні, з

узьнесенаю далоньню й аголеным бокам, на якім можна было заўважыць сьляды цьвіка й рымскай дзіды, ён плыў у ладзьдзі Харона на другі бераг сярод імглы й вірлівых зданяў. Вобраз гэты падаўся мне выключна прыгожым і ўзрушальным. Але яшчэ больш мне спадабалася сцэна з Сызыфам: Ісус падыходзіў да яго бясшумна й дапамагаў каціць валун угору, а калі нарэшце Сызыф зьдзіўлена ўскрыкваў «Удалося!», Ісус выходзіў з імглы-воблака й казаў зычным голасам, так, каб яго чулі ўсе: «Сызыфе! Твае грахі табе адпушчаныя!» Потым Ісус ішоў далей, да самага Геспэрыдзкага саду, дзе пасярод нахіленых галінак, залатых яблыкаў і лёгкага ветрыка праходжваліся паэты, а сярод іх мой дзед Караль, які насамрэч не пісаў вершаў, але меў душу паэта і, напэўна, вандраваў зь іншымі ценямі сярод высокіх траваў, спакойны й шчасьлівы.

Вада плыла далей, няспынна, люструючы цяжкія ад дажджу аблокі, а я бадзяўся па зялёных калюжынах, кружляючы вакол каналізацыйнага калодзежу; бадзяўся так доўгія гадзіны, гледзячы, як на паверхні вады адбіваюцца, акрамя дрэваў і неба, мае ўласныя думкі, тыя, якіх я ніколі не раскрыў бы ксяндзу-пробашчу і якія я захоўваў для бабці Марыі як найвялікшы сакрэт. Голас пробашча гучаў сувора, калі на лекцыях рэлігіі ён апавядаў пра лжэпрарокаў, выдуманых багоў і няісныя каралеўствы, а бабульчын голас быў мяккі й цёплы, калі яна расказвала аб прыгодах Адысэя ці аб падарожжы арганаўтаў, і пры гэтым апавядала так, быццам здарылася тое нядаўна і быццам іх хуткія караблі неаднойчы праплывалі па нашым заліве, расьсякаючы вёсламі ваду і ўздымаючы пурпуровыя ветразі. Рака забыцьця магла б мець пачатак менавіта тут, побач з касьцёлам Уваскрашэнцаў, і таму я, схіліўшыся над разьлівам, зацягнутым парай, пускаў караблі ўсё бліжэй да небясьпечнага месца, пакуль усьпенены вір ня ўцягваў нарэшце «Наўтылюса» й «Буру», ня ўсмоктваў «Санта-Марыю» ды «Магеляна», не праглынаў «Капітана Гранта», і толькі «Трынідад», мой флягман, які некалі мусіў даплыць да Антыльскіх астравоў у пошуках гішпанскага золата й водару мандарынаў, толькі «Трынідад», назва якога гучала экзатычна, як надпіс на замежнай паштовай марцы, толькі «Трынідад» выходзіў з гэтых выпрабаваньняў пераможцам.

Я вяртаўся дадому натхнёны. Пах вільготнай зямлі, пах гразі й глею ўзносіўся над водамі і кружыў, як няўгледны птах, усё вышэй і вышэй, абдымаючы ўрэшце нябачнымі крыламі порт, заліў, вэрфі й вежы касьцёлаў, а я затрымліваўся каля некаторых дамоў, там, дзе з-пад тынку праглядаў надпіс «Butter-Milch-Brot» альбо «Tabakenhandlung», і глядзеў на заржавелыя маркізы, на кручаныя чыгунныя балясы з наканечнікамі-шыпамі ў выглядзе агеньчыкаў, я спыняўся ля зарослых садоў, дзе ў гушчэчы пустазельля й агромністых лістоў дзядоўніку хаваліся драўляныя фігуркі гномікаў, лебедзяў і доўгавалосых каралеўнаў, глядзеў на зьзелянелыя ад моху альтанкі, парослыя гліцыніяй альбо дзікім вінаградам; я лёгка пераскокваў калюжыны, мінаў слупкі пажарных кранаў і думаў пра дзеда Караля, які не любіў прыяжджаць у наш горад, думаў пра свайго бацьку, які, у сваю чаргу, закахаўся ў гэты горад, і думаў пра сябе, што я між імі - як на скрыжаваньні дзьвюх дарог перад каменным паказальнікам, зь якога вада, пясок і вецер даўно сьцерлі ўсе літары.

- Божачка ж мой, што ты рабіў? - казала мама. - Дзе ты швэндаешся гадзінамі? - але гэта былі рытарычныя пытаньні.

Я сушыў ногі ля кухоннай печы, пераглядаў падшыўкі «Мора» з мадэлямі караблёў, бацька вяртаўся з вакзалу змучаны й негаваркі, мы елі бульбяны суп, на другое елі бульбу з квяцістаю капустай, часам елі й дэсэрт, а пасьля бацька йшоў у пакой, уключаў «Бэтховэна» ці «Піянера», засынаў пад гукі музыкі альбо дзённага выпуску навінаў; я ведаў, што, калі ён абудзіцца, мама зноў будзе ў яго выпытваць пра той няшчасны каленчаты вал і пра ягоны подпіс ці, хутчэй, яго адсутнасьць на праекце, і тады ён будзе злавацца, будзе вялікімі крокамі хадзіць па пакоі, махаючы рукою, нібы казаньнік, будзе падвышаць голас і сьцішваць яго аж да шэпту, бо ён ужо ўсё даўно растлумачыў: пасьпешлівасьць дырэктараў, тэрмін спуску на ваду, увесь той шум вакол пабудовы «Маршала Жукава» няварты й зламанага шэлега, бо карабель нельга збудаваць хутчэй, чым гэта магчыма, тое ж самае з праектамі, якія стракацяць памылкамі, пра што, аднак, ніхто не хацеў чуць, затое шмат гаварылася пра сяброўства й пра падазроных элемэнтаў, якія відавочна не жадалі гэтага сяброўства й

затрымлівалі імклівы паход у цудоўнае XXI стагодзьдзе.

- Безь мяне, - казаў бацька пад канец прамовы і часта, каб палепшыць свой настрой, выцягваў скрынку з фатаздымкамі; гэта былі асаблівыя хвіліны, бо на стале зьяўляўся дзед Караль у мундзіры паручніка каралеўскай артылерыі, побач зь ім стаяў барон фон Моль у крагах і з шабляю, убітаю ў зямлю; абодва трымалі куфлі зь пеністым півам, за іх плячамі было відаць жарало агромністай гарматы, а яны ўсьміхаліся, як два паны на водалячэньні, якія пачулі марш Радэцкага, аж да наступнага фатаздымку, дзе дзед Караль стаяў ужо адзін на фоне спаленых дамоў з пагонамі старшага паручніка й глядзеў на нас ужо ня так весела, як папярэднім разам, мабыць таму, што ад барона фон Моля застаўся камяк бясформеннага мяса, а можа й таму, што ён ужо не трымаў у далоні куфля піва, а за ягонымі плячамі палаў горад.

- Гэта Горліцы, - казаў бацька, - 1915-ы, год аўстрыйскага наступу ўва Ўсходніх Карпатах. А гэта твой дзед з прэзыдэнтам Масьціцкім, - падаваў ён наступны здымак, - ужо ў вольнай Польшчы, калі адкрывалі фабрыку каля Тарнава.

Я глядзеў на дзеда Караля, які ў фраку й цыліндры стаяў побач з прэзыдэнтам, і, дарма што не трымаў у далоні куфля зь півам, ягоныя вочы ўсьміхаліся гэтаксама, як на здымку з бабцяй Марыяй, калі яны выходзілі зь львоўскай катэдры - ён у фраку, але без цыліндра, яна ў белай сукенцы і ў белым капелюшы, з букетам канваліяў у правай руцэ. Яе твар, пазбаўлены зморшчынак, пад зыркім сонцам львоўскага поўдня ня быў тым самым тварам, які я ведаю па зімовых вечарох у нашым пакоі, калі яна чытала мне аб вандроўках Адысэя ці аб прыўкраснай Алене з кніжкі Парандоўскага. Але пах канваліяў спадарожнічаў ёй заўсёды, нязьменна, быццам бы ўсё жыцьцё яна хавала гэты букет у сваёй сумачцы.

Бацька задумваўся над здымкамі. Іх жоўта-карычневыя колеры наганялі на яго мэлянхолію. Ён ніколі не даглядаў іх да канца - толькі ўздыхаў і хаваў іх назад у скрынку.

- Наступным разам, - казаў ён ціха й выходзіў на кухню, дзе паліў цыгарэты й цэлы вечар піў гарбату.

Мама слала ложак, дождж барабаніў па шыбах, а я думаў пра твары з фатаграфій, асабліва пра тыя, незнаёмыя, не падпісаныя каліграфічнымі літарамі з адваротнага боку пажоўклых здымкаў. Мужчына ў белым фартуху, які падаваў піва дзеду Каралю й барону фон Молю, усьміхаўся мне з разуменьнем, быццам бы чуў іх размову, быццам бы ведаў, пра што яны гаварылі перад карчмою ў Верхняй Маравіі. Жанчына ў чорным капялюшыку й вэлюме, што стаяла за прэзыдэнтам Масьціцкім, глядзела на мяне запытальна, нібыта я мусіў адгадаць яе далейшы ці мінулы лёс. Мужчына з сходаў львоўскай катэдры быў размыты й далёкі, мабыць, трапіў туды выпадкова й назіраў за шлюбам бабці Марыі й дзеда Караля, як назіраюць у касьцёле прынагодныя шлюбы, хаця таксама мог быць запозьненым госьцем, адным з тых, што спазьняюцца заўсёды й паўсюль, нават на сваё пахаваньне.

Я засынаў і бачыў тыя незнаёмыя твары, якія паволі зьнікалі ў цямрэчы, як караблі ў бездані каналізацыйнага калодзежу. Вакол таго месца я кружляў нават у сьне; я хадзіў па цёмна-зялёнай вадзе, прыкладаў вуха да нябачнага каскаду, услухоўваючыся ў няспынны шум, булькатаньне й плёскат, і шторазу мяне спыняў погляд пробашча, уважлівы й пільны, быццам там, з другога боку, хавалася сіла, якую ня варта было варушыць.

Ні бацька, ні тым больш я, схілены над чыгунным люкам, якога я не наважваўся падняць, нічога ня ведалі пра тое, што да нас вялікімі крокамі набліжаецца сэзон смаўжоў.

Аднойчы я ўбачыў бацьку ў канцы вуліцы. Ішоў ён павольна, з апушчанаю галавою, торба зьвісала зь ягонага пляча, як пусты мяшок, і калі я падбег да яго, каб запытаць, пра што ён размаўляў сёньня з рабочымі на таварнай плятформе й чаму вяртаецца так рана з вакзалу, ён сказаў:

- Я больш ня буду месьці пэронаў, - але гэта не было гнеўнае ці геройскае прызнаньне. Не, бацька казаў хутчэй голасам бясколерным і сумным. І калі мы праходзілі пад каштанамі, якія ў сьпёку давалі прыемны холад і перадых, а таго дня шумелі кроплямі дажджу ў лістоце, дык вось, калі мы праходзілі пад тымі каштанамі, бацька апавёў мне пра двух

мужчын, якія раніцой зьявіліся на вакзале й расказалі начальніку станцыі, кім ёсьць мой бацька насамрэч, пасьля чаго катэгарычна сьцьвердзілі, што, паколькі ён інжынэр, ён ня можа там працаваць, бо гэта відавочная правакацыя, «правакацыя, накіраваная супраць нашых дасягненьняў і прагрэсу, правакацыя, скіраваная ў пэўным напрамку»; начальнік паклікаў тады бацьку да сябе й весела сьмяяўся: «Але ж вы мяне надурылі! - падскокваў ён на сваім крэсьле. - Але ж вы й жартаўнік! - рагатаў ён. - Ну што ж, мне вельмі непрыемна, але вы ня можаце тут болей працаваць, вы ж самі разумееце, пане інжынэр…»; і бацька мне растлумачыў - мы ўжо ўваходзілі ў браму нашага дому, - што ў пэрсанальнай анкеце Дзяржаўнай чыгункі ён напісаў: «Без адукацыі», што было падманам, але падманам апраўданым, бо як інжынэр ён не знайшоў бы працы нідзе.

- Калі так, - сказала мама прадпрымальніцкім тонам, - мы эмігруем у Амэрыку! Там таксама робяць караблі, і ня толькі такія, як «Маршал Жукаў»!

І пакуль мамін голас кружляў вакол пашпартоў, візаў і грошай, пакуль яна вырашала, як здабыць тое, што не здабывалася без адпаведных знаёмстваў і пратэкцыяў, ня кажучы ўжо пра білеты на трансатлянтычны рэйс, якім мы маглі заехаць проста ў Нью-Ёрк пад статую Свабоды, бацька здаваўся яшчэ больш пакінутым і самотным, чым на вакзале.

Гэтаксама, як ён, я ня меў ахвоты ехаць у Амэрыку, я не хацеў зьмяняць сваю вуліцу, усаджаную каштанамі, ані на статую Свабоды, ані на хмарачос; я не жадаў жаваць гумку, граць у бэйсбол і глядзець фільмы пра Мікі-Маўса, якіх увогуле ня вельмі любіў. Таму я ўсё больш хінуўся да бацькі, шукаў зь ім кантакту, і мы доўгія гадзіны праседжвалі над прасьцінамі паперы, на якіх упэўненаю рукою ён маляваў мне корпус крэйсэра «Спалата», сылюэт браняносца «Кайзэр Макс» ці фрэгата «Радэцкі» - найчасьцей менавіта гэтыя караблі, бо на іх служыў бацька бабці Марыі, Тадэвуш, мэханік Каралеўскага ваеннага флёту Аўстра-Вугоршчыны на Адрыятыцы.

- «Спалата», - казаў бацька, - пяцьдзясят пяць мэтраў даўжыні, восем мэтраў шырыні, водазьмяшчэньне - тры й сем дзясятых,

да таго ж тарпэдныя апараты й гарматы Крупа, ты толькі паглядзі якія! - І ён выцягваў з скрыні фатаздымак прадзеда Тадэвуша, які стаяў у мундзіры курсанта-інжынэра на караблі «Спалата», найхутчэй недзе ў Трыесьце ці Пуле, і абдымаў з аднаго боку пана Фэрдынанда Карольку, таксама курсанта, а з другога - мэханіка Юліюса фон Петравіча, што гучала асабліва дзіўна, таму што «фон» не пасавала да «Петравіча», прозьвішча відавочна харвацкага.

- На гэтым караблі, - занураўся ўва ўспаміны й мары бацька, - яны некалі паплылі ў Індыю з контрадміралам Манфроні, годзе ў 1889-м ці 1890-м. Гэта трэба будзе спраўдзіць, - дадаваў ён і выцягваў з скрыні наступны фатаздымак: прадзед Тадэвуш быў ужо не ў мундзіры Ваеннага флёту, а ў выхадным сурдуце, і глядзеў на нас уважлівым, глыбокім позіркам. На ніжнім полі быў відаць выціснуты надпіс, абведзены серабранкай: *«Atelier Artistique Photographique - Stella»*. Я быў захоплены формамі гэтых літараў, а яшчэ - дзьвюхгаловым арлом Манархіі, таксама выціснутым і срэбным. «Львоў, 3-га траўня 1911-га», - паволі чытаў я, а бацька тады паказваў паштоўку зь відам політэхнічнага інстытуту, дзе былы курсант выкладаў мэханіку й фізыку, дзе стаў прафэсарам, а з часам і таемным дарадцам двара. І я пачынаў уяўляць, як ён у тым сваім сурдуце абыходзіць Гетманскія Валы, як прамінае помнік Сабескаму, а на сівыя, каротка стрыжаныя валасы й штрыфэлі сурдута павольна спадаюць кветкі акацыі; і я бачыў яго шораз выразьней у гэтым незнаёмым мне горадзе, які называўся Львоў, Лембэрг ці Львіў, горадзе, які меў палітэхніку, тэатар, чыгуначны вакзал, але ня меў порту ці вэрфі, і раптам я зразумеў, чаму бацька адразу пасьля другой сусьветнай вайны прыехаў у Гданьск, чаму паступіў у палітэхніку на аддзяленьне будаваньня караблёў.

Мама пасылала лісты ў Варшаву, у бюро, ведамствы й консульствы, але адказу ніадкуль не было. Тым часам бацька кожнага ранку праглядаў прагнозы надвор'я й дробныя аб'явы, і менавіта там, у рубрыцы кароткіх анонсаў, сярод прапановаў продажу ўжыванай пральнай машыны, зімовага паліто з каракулем і расады бягоніі, трапіў на сьлед вінаградных смаўжоў, што чакалі нас з пачатку таго лета.

- Высокія цэны куплі, - прамовіў ён аднойчы з таямнічаю ўсьмешкай, пасьля чаго апрануў пінжак і выйшаў з хаты. А калі празь дзьве гадзіны вярнуўся, ягоная ўсьмешка асьвятліла пакой - так, нібы раптоўна перастаў ліць дождж, нібы вецер прагнаў усе хмары ад нашага гораду й заліву. - Заўтра зьбіраемся на працу, - прамовіў ён. - І, калі ты мне дапаможаш, заробім трохі грошай.

- Гэта гідка, - коратка адрэзала мама. Рэч была ня ў грошах, а ў сьлімаках, якія хаваліся ў траве й лісьці і якіх мы мусілі зьбіраць. - Як можна браць гэта ў рот!

- Мусіць, немагчыма, - падтакнуў бацька, - калі ты не француз. - І з запалам пачаў тлумачыць, што вінаградныя смаўжы, за якіх мы атрымаем грошы, паедуць наўпрост у Парыж, а там, адпаведна прыгатаваныя, патрапяць на стол як прысмакі, як вытанчаная закуска, бо французы - народ пераборлівы й абы што ў рот браць ня будуць, ня тое што мы ці - пагатоў - расейцы.

Так ён сказаў, а наступнага дня, у галёшах, у дажджавіках і з кошыкамі ў руках, мы пайшлі ў лес, абмінаючы касьцёл Уваскрашэнцаў. А калі пробашч памахаў нам рукой і крыкнуў: «У грыбы? Багатага збору!», - бацька яму адказаў: «Дзякуй!», - а праз хвіліну нахіліўся над пер'ем папараці, каб дастаць з мокрай травы першага смоўжыка. Ён пакруціў яго асьцярожна ў руках, агледзеў форму чарупіны й рожкаў, пасьля чаго паклаў смаўжа ў кошык, высланы лісьцем, і рушыў далей як чалавек, што ўсё сваё жыцьцё нічым іншым не займаўся. Ідучы за ім, я адчуваў, што ўваходжу ў іншы сьвет. Я бяз жалю пакідаў ручаі й калюжыны, а таксама месца, дзе вада хавала сакрэтны ўваход у падземны сьвет, бяз жалю пакідаў караблі й Каралеўскі ваенны флёт Аўстра-Вугоршчыны на Адрыятыцы, бо з таго моманту, як бацька паклаў у кошык першага вінаграднага смаўжа, знойдзенага пад кустом папараці адразу за касьцёлам Уваскрашэнцаў, я не сумняваўся - тое, што мы робім, гэта ня проста зарабляньне грошай.

З таго часу штовечару бацька раскладваў на стале агромністую мапу з надпісам *«Freistadt Danzig»* і адзначаў на ёй пальцам месцы, кажучы: «Тут мы яшчэ не былі». І я няўмела чытаў па

складох: *«Stolzenberg, Luftkurort Oliva, Nawitzweg, Glettkau, Langfuhr»*, - і зь зьдзіўленьнем адкрываў, што гэтыя незвычайныя назвы азначаюць папросту Пагулянку, Аліву, Дольныя Млыны ў Брантове, Еліткова альбо Ўжэшч, а пасьля спасьцігаў, зь яшчэ большым зьдзіўленьнем, што некаторыя з гэтых назваў былі мацнейшыя за вайну, перасяленьні й пажары, зьмяніўшы сваё гучаньне толькі нязначна і як бы павярхоўна, як *Ohra* - на Орунь, *Brosen* - на Бжэзна, *Schidlitz* - на Седльцэ. Але ж найбольшае зьдзіўленьне ў гэтай смаўжовай геаграфіі выклікалі ў мяне месцы, назвы якіх наагул не зьмяніліся, якія засталіся пры сваіх імёнах, як старыя людзі пры пратаптаных сьцежках. І калі мы з бацькам ішлі праз парэзаны расколінамі ўзгорак Эмаўс, адкуль былі відаць затока і караблі, што стаялі на рэйдзе, ці калі мы вылоўлівалі смаўжоў з зарасьніку парку абацтва ў Аліве, я думаў пра тое гісторыю, у якой замест заліву - люстра Тыбэрыядзкага возера, а замест парку абацтва - сад, поўны аліўкавых дрэваў.

- Як думаеш, мог ён тут праходзіць? - запытаў я бацьку. І тады ён, глыбока задумаўшыся, адарваў погляд ад лісьця, травы й смаўжоў і сказаў спакойным голасам, што ўсё магчыма; нашыя пачуцьці ўводзяць нас у зман і неаднаразова зьдзекуюцца з здаровага розуму, таму ня трэба занадта ім давярацца, аднолькава добра можна бачыць нешта, чаго не існуе, і ня бачыць нечага, што існуе.

- А таму, - падымаючы ўгору палец, рабіў ён выснову, - ёсьць рэчы, якія нам нават ня сьніліся, якія пераўзыходзяць нашую фантазію, але, безумоўна, існуюць вакол нас, толькі бяз нашага ведама.

Я ня быў задаволены гэткім адказам. Я хацеў, каб бацька адказаў «так» ці «не», гэта было б значна прасьцей. Я не разумеў, навошта нашыя вочы, а таксама наш слых і дотык павінны былі нас заблытваць, і таму, калі мы сыходзілі з узгорку Эмаўс пясчанаю дарогай паўз высокія ліпы, я запытаўся, поўны сумневу, а ці тое, што мы бачым і чуем і да чаго датыкаемся рукамі, існуе насамрэч: чырвоныя дахі дамоў, старыя дрэвы, шум дажджу ці лілёвы плашч затокі, які расьцягнуўся далёка пад нашымі нагамі за лініяй партовых

лябёдак?

Бацька нахіліўся над сьцежкаю, падняў смоўжыка й сказаў, прыглядаючыся да чарупіны:

- Давесьці гэтага нельга. Гэта не матэматычнае раўнаньне. Але разумееш, - сьлімак адправіўся ў кошык, і я адчуў бацькавую далонь на плячы, - існуе той, хто дбае, каб мы не памыляліся. Хто паказвае дарогу.

- Бог? - запытаў я яго.

- Але, - адказаў ён ціха, і ў гэтым яго сьцьверджаньні было столькі ўпэўненасьці, гэтае яго кароткае «але» было да такой ступені простае, яснае й відавочнае, што я больш ужо не пытаўся нічога, быццам над узгоркам Эмаўс і над цэлым нашым горадам раптам адкрылася нябачнае вока, якое не дазваляла нам памыляцца, а рабіла, каб усё вакол нас было надзіва сапраўдным - смаўжы, лісьце, калюжыны й кропля вады, што сплывала па дажджавіку майго бацькі.

Папоўдні мы заходзілі ў зялёную будку, дзе пан Кастэрке, кандыбаючы на драўлянай назе, узважваў сьлімакоў, запісваў нешта хімічным алоўкам на зашмальцаваных аркушах, паказваў бацьку, дзе паставіць подпіс, і выплачваў нам грошы. Пяцізлотавыя манэты з рыбаком, які цягне сетку, манэты з тварам Тадэвуша Касьцюшкі, а часам нават чырвоная банкнота з тварам рабочага пераходзілі ў кішэню бацькі, а я прыглядаўся да пана Кастэрке, нос якога быў такі самы кірпаты, як і ў Касьцюшкі, пана Кастэрке, які гаварыў зь цьвёрдым нямецкім акцэнтам і пах махоркай і сьпіртам. Пасьля зьдзелкі, калі смаўжы знаходзіліся ўжо ў спэцыяльнай скрыні, перакладзеныя травой і лісьцем, бацька прысядаў на вілаватую лаву, частаваў пана Кастэрке цыгаркай і яны пачыналі размаўляць пра надвор'е й смаўжоў, пасьля разганяліся, пераскоквалі дзяржаўныя й мытныя межы, засноўвалі філіял найбольшай у Сярэдняй Эўропе фірмы па куплі вінаградных смаўжоў, пералічвалі вялізарныя сумы, здабывалі ўсё новыя рынкі й нарэшце адкрывалі фабрыку сьлімачых кансэрваў з паэтычнай назвай «Ляўра», бо гэта было імя жонкі пана Кастэрке, зь якой ён трымаў перад вайною краму на рагу *Hubertusburgerallee*.

- Дзе была гэтая вуліца? - пытаўся бацька, - здаецца, я ня бачыў яе на маім пляне. - І тады пан Кастэрке апавядаў пра скрыжаваньне на выезьдзе з гораду й пра краму, у якой прадаваў бакалейныя тавары з усяго сьвету. Расказваў пра жонку й дачок, пра тое, што цяпер застаўся адзін з сваёю драўлянаю нагой - сапраўдную страціў у сорак шостым годзе, калі натрапіў на нямецкую міну й таму ня выехаў у Нямеччыну, бо не пасьпеў на апошні цягнік, а пасьля ўжо ехаць не хацеў, каб выпадкам ня страціць другой, здаровай нагі, і было вельмі цяжка, калі казалі, што ён, Кастэрке, - немец, тады як напраўду ён - ня немец, ён - гданьчанін, проста гданьчанін, і па-польску гаворыць ня горай, чым па-нямецку.

- *Hubertusburgerallee*, - задумваўся бацька, - гэта прыгожая назва, так, трэба будзе пашукаць гэтую вуліцу. - І тады пан Кастэрке, кандыбаючы, прыносіў з глыбіні будкі пляшку сьпірту й два кілішкі, і яны пілі за сваё здароўе, як два даўнія сябрукі, а я глядзеў на іх скрыўленыя ў характэрнай грымасе твары, глядзеў, як яны закусваюць кіслымі агуркамі, выцягнутымі з слоіка, у якім плавалі кроп, лісты вішні й зубчыкі часныку, і я ўжо ведаў, што ніколі мы не паедзем у Амэрыку па грошы й свабоду, бо, дзякуючы смаўжом, мы мелі што есьці, а праходзячы ўзгоркам Эмаўс, палюючы ў даліне Стрыжы ці мераючы крокамі пагоркі аліўскага лесу, мы з бацькам былі насампраўдзе вольнымі людзьмі.

- Сэзон смаўжоў хутка скончыцца, - сказаў аднойчы пан Кастэрке, - і я вярнуся да пляшак і макулятуры, а вы, пане інжынэр?

Бацька паціснуў плячамі.

- Можа, пачну будаваць лодку зь ветразем, - сказаў ён, круцячы ў руках кілішак, - і мы паплывём у далёкае падарожжа. Для майго сына гэта было б лепей за школу. Кільскі канал, Ля-Манш, пасьля Біскайскі заліў, Гібралтар, - выдаваў ён на адным подыху, - Міжземнае мора, Эгейскае і, нарэшце, Ітака! Абагнём Ітаку й тады вернемся дадому, а вам, пане Кастэрке, прышлём паштоўкі з Гамбургу й Марсэлю. Што вы на гэта скажаце?

Былы бакалейнік з *Hubertusburgerallee* моўчкі глядзеў на нас. І

раптам, быццам пасьля дотыку нябачнай далоні, пасмы часу ў разрэджаным паветры драўлянай будкі пачалі перакрыжоўвацца між сабою й цёмныя нетры крамы запоўніліся водарам кавы, цынамону, імберцу, мускату, пахам гвазьдзікі й мозэльскага віна, а пан Кастэрке зноў меў сваю сапраўдную нагу й стаяў за льсьнянаю дубоваю канторкай, стаяў, палячы цыгарэту маркі *«Vineta* з *Danziger Tabak Monopol Aktiongesselschaft»*, а мой бацька, стоячы з другога боку канторкі, паліў цыгарэтку *«Okassa Zarotto»*, набытую на складзе Кумэра ў Зялёнай Браме, паліў цыгарэтку з уроцлаўскай фабрыкі *«Halpaus»* і пытаўся ў пана Кастэрке: «Як вашыя справы?», - а бакалейнік адказваў, што ня так добра, як раней, бо з таго часу, як карычневыя апанавалі вуліцы нашага вольнага гораду, з таго часу, як карычневыя апанавалі Сэнат і замежную палітыку, з таго часу, як карычневыя праводзяць мытную вайну з Польшчаю, справы не палепшыліся. Гульдэн падае на злом галавы, і, напэўна, ён, Кастэрке, адкрые сабе рахунак у якім-небудзь польскім банку ў Гдыні, што будзе не зусім легальна, затое выгадна, бо польскі злоты трымаецца моцна й непахісна, рыхтык швайцарскі франк. У пальцах бацька круціў пясочнага колеру пачак *«Okassa Zarotto»* з партрэтам гожай кабеты, што глядзела на яго; яе голыя плечы, яе клясычны профіль ды выгіны броваў, а таксама чорныя валасы, увянчаныя кветкай архідэі, былі як таямнічы й спакусьлівы подых Лібану, і калі пан Кастэрке, зьнізіўшы голас, расказваў пра нацыянал-сацыялісцкіх бонзаў, якія, як і прэзыдэнт Сэнату Вольнага гораду, забралі свае грошы з гданьскіх банкаў і зьмясьцілі ў польскія, з таго боку мяжы, калі абураны пан Кастэрке апавядаў пра сацыял-дэмакратаў, зьбітых на мітынгу карычневакашульнікамі, і пра хрысьціянскіх дэмакратаў, якія трапілі ў вязьніцу, калі казаў, ужо зусім шэптам, што настае цяжкі час для жыдоў, і палякаў, і для ўсіх сумленных людзей, бацька лашчыў вачыма грэцкі профіль кабеты, тонкую шыю й гладкія шчокі так, быццам мэдальён зь яе тварам быў не друкаваным малюнкам на пясочнага колеру пачку *«Okassa Zarotto»*, а мініятураю, што выйшла з-пад пэндзля Мэхофэра, той самай мініятураю, якая вісела ў львоўскай кватэры на вуліцы Ўейскага над пісьмовым сталом прадзеда Тадэвуша і выяўляла ягоную жонку-нябожчыцу з вугорскай сям'і Шэгіві.

- Так, так, - азываўся бацька, - надыходзяць цяжкія часы, але ці ж былі калі лепшыя?

Пах імберцу, мускату й гвазьдзікі, пах турэцкага тытуню зьнячэўку зьнік, гэтаксама як і блакітна-жоўты пачак папіросаў *«Vineta»* й пясочны пачак *«Okassa Zarotto»*, а пан Кастэрке, ізноў з драўлянаю нагой, схіліўся над бацькавым вухам і шаптаў яму пад сакрэтам:

- Найбольш іх на могілках, на тых зачыненых і зарослых; гэта магільныя стварэньні, я вам кажу! І нават ведаю чаму. Там кусты й лісьце маюць асаблівы смак, бо цягнуць зь зямлі трохі лепшыя сокі, смаўжы гэта чуюць, і таму, пакуль ня скончыўся сэзон, найбольш вы іх наберацё там.

Кроплі дажджу сьцякалі па даху будкі, пан Кастэрке адставіў пляшку за лаву, а мой бацька слухаў аповед пра могілкі й смаўжоў быццам бы зь недаверам, але нарэшце ветліва падтакнуў і сказаў, што мы ўжо мусім ісьці, бо позна. У ягоных вачох задуменнасьць мяшалася з раздражнёнасьцю.

- Якую лухту вярзе гэты стары! - сказаў ён, калі мы вярталіся дадому. - Смаўжы жывуць там, дзе ёсьць зеляніна, і ўсё тут!

Але наступныя дні кінулі нас у суцэльнае шаленства. Вяртаючыся з Дольных Млыноў праз Брантова, мы зачапілі ўскраек старых могілак, дзе сярод парослых надмагільляў зь нямецкімі надпісамі, сярод патрэсканых анёлаў і замшэлых крыжоў, аплеценых драсёнам, мы натрапілі на сапраўднае каралеўства сьлімакоў. Трэба было ступаць асьцярожна, каб не раструшчыць шкарлупіны, што хаваліся ў высокай траве, і досыць было адхіліць галінку дзікага бэзу ці бружмелю, каб знайсьці цэлыя іх сем'і, цэлыя кланы вінаградных смаўжоў, склееных паміжсобку па тры альбо чатыры, быццам яны баяліся адзіноты ці спраўлялі нейкую мілосную містэрыю.

Мы ня толькі запоўнілі імі да самых краёў нашыя кошыкі, але й набілі запасную торбу з старога палатна. Бацька маўчаў, а калі пан Кастэрке выдаваў нам чырвоныя банкноты з тварам рабочага, я сказаў, што смаўжы, напэўна, пасланцы падземнага

сьвету.

- Што ты балбочаш! - сказаў бацька крыху раздражнёна. - І скуль гэта толькі табе да галавы прыйшло.

Але калі наступнага дня, праходзячы паўз політэхнічны інстытут, мы зайшлі, спачатку быццам бы неахвотна, на зарослыя цьвінтарныя прысады, дзе колісь хавалі немцаў, а цяпер там хаваліся адно апівуды ды валацугі, і адразу сярод ніцых вербаў, грабаў, ялінаў і чырваналістых букаў мы знайшлі яшчэ больш смаўжоў, чым у Брантове, тады бацька ня вытрымаў:

- Відавочна, у гэтым ёсьць нешта дзіўнае. Але ці зьвязана гэта неяк зь сьмерцю?

Я ня быў здольны адказаць на гэтае пытаньне. Сьвет сьлімакоў быў маўклівы й недаступны, а іх дарогі, адзначаныя срэбнаю ніткай, здаваліся асабліва таямнічымі. Ці насамрэч тое, што яны жылі менавіта тут, на могілках, было неяк зьвязана, напрыклад, з Гуга Толерам, памерлым у 1938 годзе, сямнаццатага кастрычніка, ува Ўжэшчы? Альбо зь нейкім доктарам Мэрцам, музыкам і дырыжорам, што адыйшоў у вечнасьць пад самы канец вайны, але перад тым, як згарэў Стары Горад, а дамы, сьвірны й касьцёлы ператварыліся ў друз? Не, я ня быў здольны на гэта адказаць, і таму спытаў бацьку, што, уласна, значыць «адысьці ў вечнасьць». Ці ёсьць гэта паяднаньне з Богам? І дзе тое месца, якое мы называем вечнасьцю? Над намі, там, угары? Ці, хутчэй унізе? А можа, папросту недзе вакол нас ёсьць тая вечнасьць, толькі мы яе ня бачым, гэтаксама, як ня бачым паветра, якое нас атачае і якім, нават ня думаючы пра гэта, мы дыхаем?

Бацька складаў смаўжоў у кошыкі.

- Я ведаю толькі, што Бог існуе і што ўсе мы баімося сьмерці, - сказаў ён па хвіліне роздуму. - А ўсё астатняе, усе астатняе толькі здагадкі.

- А ты таксама баішся сьмерці? - запытаў я.

- Я таксама, - адказаў ён.

- А як гэта, калі паміраюць?

Бацька адказаў не адразу. Ён яўна хацеў нешта патлумачыць, толькі доўга вагаўся, разважаў, быццам працаваў над раўнаньнем зь некалькімі невядомымі.

- Таямніцаю ёсьць рух, разумееш? Рух частак, целаў. Там, дзе яго няма, няма й жыцьця. Таму сьмерць кладзе крэс усякай зьмене, гэта суцэльнае адмаўленьне руху ў любым выглядзе. Разумееш?

Я кіўнуў галавой, а бацька, брыдучы ў высокай, па калена, траве, казаў далей, што сьмерць - гэта стан, у якім няма ніякага болю, ніякай пакуты, і таму з пэўнага гледзішча для некаторых людзей гэта жаданая рэч. Як стан абсалютнага спакою й цішыні, якога мы ня здольныя сабе нават уявіць.

Але я ўяўляў сабе гэтую цішыню. Я бачыў яе. Як вялікае радно, расьцягнутае над нашым горадам, над залівам і пагоркамі, радно, пад якім сьпіць дзед Караль, прадзед Тадэвуш і яго маладая жонка, курсант Каролька, барон фон Моль ці мэханік фон Петравіч, жанчына ў чорным капялюшыку й вэлюме, якая стаяла за прэзыдэнтам Масьціцкім, мужчына з сходаў львоўскай катэдры, тыя, якіх я ня ведаў і ня мог ведаць, усе, што зьніклі ў вялізарнай цішыні, сярод якой паволі поўзалі смаўжы зь цёмнымі й сьветлымі чарупінамі, выцягваючы перад сабою рожкі, каб лавіць імі галасы памерлых.

З дня ў дзень бацька рабіўся ўсё больш маўклівым. Можа, таму, што сэзон куплі смаўжоў сканчаўся, а можа, праз суседзяў, якія ўжо даведаліся пра наш занятак і абменьваліся міжсобку ня надта разумнымі заўвагамі. Так ці іначай, у апошні дзень, а гэта быў дзень Сьвятога Яна, бацька выявіў адзнакі задавальненьня.

- Канчаем зь сьлімакамі, - сказаў ён. - Хай цяпер пра іх французы клапоцяцца.

А калі мы хадзілі ў ваколіцах Біскупскай Горкі, ператрасаючы кустоўе й зьдзічэлыя паркавыя прысады, калі апошняга разу шукалі смаўжоў сярод лісьця й травы, бацька сказаў, што за ўсе гэтыя дні мы зарабілі шмат грошай і ня мусім клапаціцца пра наступны месяц.

- Я мог бы рабіць гэта цэлы год, - адказаў я, - я мог бы так хадзіць з табою заўсёды, а калі б не было смаўжоў, мы маглі б зьбіраць зёлкі й сушыць іх, а пасьля прадаваць хворым людзям.

- Ага, - шырока ўсьміхнуўся ён, - гэта добрая думка. Калі ў нас ізноў скончацца грошы, напэўна так і зробім.

І каб зарабіць на апошняй порцыі смаўжоў, каб прынесьці ў гэты вечар некалькі чырвоных банкнотаў і пакласьці іх перад мамаю на стале, мы кружлялі сярод кустоўя, як сапраўдныя паляўнічыя, занураючыся ў густыя тунэлі зяленіва, мокрыя й вільготныя з самага пачатку гэтага лета, і не заўважылі нават, як надышоў змрок, а разам зь ім - гадзіна закрыцьця крамы.

- Гэта нічога, - сказаў бацька, - выпусьцім іх на волю.

Але перад тым, як паставіць кошык на зямлю, мы заўважылі надзвычайную рэч. Дзясяткі смаўжоў выпаўзалі з-пад кустоў, на нашых вачох пакідалі свае схованкі і накіроўваліся ў адным і тым самым напрамку - на вяршыню пагорка. Іх усё большала, былі іх ужо не дзясяткі, а сотні.

- Ты толькі паглядзі, - крыкнуў бацька. - І тут, і вось тут, - хваляваўся ён усё больш, - ідуць, як на парадзе!

І сапраўды, смаўжы, адзін за другім, старанна ўздымаючы рожкі, паўзьлі па дарозе на вяршыню, быццам там было прызначанае месца спатканьня.

- Ніколі нічога такога ня бачыў. Хадзем, - сказаў бацька, - мы павінны ўбачыць, куды яны кіруюцца.

Мы пайшлі ўздоўж паўзучай лініі смаўжоў. Яна выглядала надзвычайна. Чым бліжэй была вяршыня, тым больш смаўжоў з бакавых сьцежак далучаліся да пульсуючай дарогі, якая ў

канцы паляны была ўжо цалкам пакрытая чарупінамі.

- Як вугры ў Саргасавым моры, - пачуў я бацькаў шэпт, - у гэтым крыецца нейкая таямніца.

Але тое, што мы ўбачылі на вяршыні, уразіла нас яшчэ больш. Пасярэдзіне паляны вырастаў зь зямлі вялізарны камень, гэткі самы, якіх шмат пакінуў тут, на пагорках, ледавік. Ён узносіўся крутымі бакамі на вышыню чалавечага росту й нагадваў формаю нейкую сьлязу, якую мог пусьціць адно нейкі мітычны волат. Асьцярожна, амаль на дыбачках, каб не затаптаць ніводнага смаўжа, мы падышлі да валуна і сталі як аслупянелыя, нібы самі ператварыліся ў камяні.

- Божа, што яны робяць? - ціха сказаў бацька.

Смаўжы спрабавалі, адзін праз другога, узьлезьці на камень, спрабавалі прычапіцца тулавамі да шэрай стромы і запаўзьці на вяршыню; але дарэмна: яны сутыкаліся з гладкаю паверхняй амаль вэртыкальнай сьцяны і сілаю гравітацыі, якая сьцягвала іх долу. Яны падалі ў траву, у клубок пераплеценых між сабою тулаваў і чарупінаў, які нагадваў хвалю, што - з скрыгатам і шапаценьнем - то ўздымалася, то ападала. Ніводны з смаўжоў не залез вышэй за палову валуна, а сьляды іхных спробаў у выглядзе срэбных нітак сьлізі здаваліся тонкім і празрыстым панцырам, што пакрывае паверхню базальту.

Загіпнатызаваныя гэтым сьлімачым клубком, мы нават не заўважалі, што дождж перастаў і што з чорных плямаў хмызоў і зарасьніку пачалі паблісквацъ сьветлякі.

Яны ляталі над усёю палянай, а калі нарэшце мы адарвалі позіркі ад каменя, перад нашымі вачыма разгарнуўся карагод зь вірлівых агенчыкаў, якія кружылі ў цемрадзі ўсё хутчэй, у рытме невядомай мэлёдыі.

- Яны ніколі не падымуцца на гэты камень, - сказаў бацька, паказваючы на смаўжоў. - А мы не даведаемся, навошта ім туды ўзьбірацца. Калі б некаму зь іх гэта ўдалося, нешта павінна было б зьмяніцца.

- Што? - запытаўся я ціха.

- Ня ведаю. Але нешта мусіла б адбыцца.

- З чым? - запытаўся я яшчэ цішэй.

- Можа быць, зь сьветам. Гэтага я ня ведаю, - сказаў бацька, апаражняючы кошыкі. - Лепш хадзем адсюль, ня трэба ім перашкаджаць.

І калі мы з пустымі кошыкамі сыходзілі з пагорка, і пазьней, калі над горадам зьявіўся месяц, а мы, едучы начным трамваем, праміналі помнік Сабескаму й палітэхніку, я заўважыў у бацькавым поглядзе цень мэлянхоліі, той самы, які зьяўляўся ў ягоных вачох, калі ён аглядаў старыя фатаздымкі ці рысаваў на аркушах паперы сылюэты каралеўскіх баявых караблёў. І тады я зразумеў, што больш ніколі мы ня будзем зьбіраць смаўжоў і ніколі ня вернемся на паляну, да высокага валуна, бо на тым, што мы ўбачылі, моўчкі была пакладзеная пячатка таямніцы.

Аднак гэта не азначала, што наступныя дні прайшлі адно толькі пад знакам калюжынаў і дажджу. Бацька бадзяўся па хаце і зноў праглядаў газэтныя абвесткі, мама далей пісала лісты, на якія не было адказу, а я, як толькі знайшоў у нашым садзе смоўжыка, зрабіў яму спэцыяльную вальеру, агароджаную чатырма цаглінамі, і пад кустом парэчак спрабаваў разгадаць яго сьлімачыя сакрэты. Штодзённа зранку я вітаў яго сьвежым лісьцем, штодзённа гарбеў у садзе, доўга назіраючы за яго паводзінамі і рухамі, а ня ведаючы ягонай мовы, ягонай сыстэмы сыгналаў, што перадаюцца па нябачных хвалях, якія ён успрымае сваімі рожкамі, я штодзённа зьвяртаўся да яго на сваёй уласнай мове ў надзеі, што нарэшце ён зразумее хоць пару словаў. І сапраўды, праз пэўны час смоўж рэагаваў на мой голас і ўжо не хаваўся ў чарупіну, калі я клаў яго сабе на далонь, але гэта было ўсё, чаго мне ўдалося дасягнуць. Ён быў цалкам абыякавы да маіх намаганьняў, і сьвет смаўжовых пачуцьцяў застаўся нявывучаны.

Першыя дні школы няшмат зьмянілі ў нашых кантактах. Я

гэтак сама прыносіў яму лісты салаты й спрабаваў завесьці зь ім размову. Але нарэшце ў адну ноч пайшла зьліва, і перад самаю раніцай пачаўся раптоўны замаразак. Я зьбег па сходах як шалёны й накіраваўся праз ахутаны шэраньню сад. Але было ўжо позна. Пад кустом парэчак белае люстра замерзлай калюжыны замкнулася над сьлімаком, як шкляное века дамавіны. Я сьцёр шэрань з празрыстай паверхні. Там, унізе, як у крыштальным шары, спачываў мой вязень. Ён быў нерухомы. Мёртвы. Па ягонай чарупіне сьлізгаў сонечны промень: ён сыходзіў у глыбіню круглага лябірынту ўсё ніжэй, віраваў усё хутчэй па лініі сьпіралі, пакуль нарэшце не зьнікаў у кропцы, якой ужо не дасягнуць вокам.

Я нікому не сказаў пра гэтую страту. Зрэшты, у дарослых былі цяпер іншыя справы. «Маршал Жукаў» паплыў па затоцы, і падчас выпрабаваньняў зламаўся каленчаты вал. Бацька вярнуўся на працу пры сваёй рысавальнай дошцы, а мама наводзіла парадкі ў шафе й шуфлядах, як заўсёды, калі бабця Марыя папярэджвала пра свой прыезд.

Сонца растапіла лёд, а моцны вецер ад мора, які нёс прадвесьце восеньскіх штормаў, высушыў усе калюжыны ў навакольлі. Я зноў кружыў каля каналізацыйнага калодзежу, які нарэшце быў бачны ў сьвятле верасьнёвага сонца. Я глядзеў на касьцёл Уваскрашэнцаў, на драўляную званіцу, на чырвоныя дахі дамоў, а потым пачаў сьціраць з каналізацыйнага люка крохкі пясок. Паступова пад ім зьяўляліся літары, якія ўтваралі надпіс: *«Kanalisation von Danzig»*. Нарэшце я мог падняць гэты люк і паглядзець туды, у глыбіню, але мне гэта ўжо было непатрэбна.

In Dublin's fair sity*

---

* Назва

- Сьвяты Міхаіл Арханёл, барані нас у час нягоды! - [illegible] й некалі чуў гэтыя словы, але ці гэта было ў касьцёле [illegible] прыкрасьцяў духа злога, - цягнуў высокі, малады [illegible]

будзь нам абаронаю, князю нябеснага войска.

Людзі падыходзілі да невялічкага стала ў правым нефе. Там, у шкляной скрыні, стаялі тонкія й доўгія сьвечкі цаной ў некалькі пэнсаў. Я бачыў, як людзі далікатна бяруць іх пальцамі, кідаюць у бронзавы кубак манэты, а пасьля адыю за другім падыходзяць да акруглага падсьвечніка з мноствам адтулінаў. Сьвечкі нагадвалі мне царкву на вуліцы Трайгута, што была абсталяваная ў былым нямецкім гарадзкім крэматорыі; там былі такія самыя, толькі праваслаўныя, а гэтыя цяпер палалі рымска-каталіцкім агнём.

Не, я не зьбіраўся ані думаць пра Бога, ані аддавацца малітве, бо трапіў сюды выпадкова, зьвярнуўшы зь Пірс-Стэйшн налева, замест каб павярнуць направа. І хаця я імкнуўся дабрацца да Эдэн-Куэй на другім беразе ракі, у змроку я прайшоў трыста, а можа, і пяцьсот крокаў у супрацьлеглы бок, па Ўэстлэнд-Роў.

Плян гораду, які я згубіў у вагоне электрычкі, ехаў сабе немавед куды, а я, гледзячы на пустыя й неасьветленыя хоры, думаў, як вярнуцца ў гатэль, а дакладней - як трапіць на Ліфі, дзе быў прыпынак патрэбнага мне аўтобуса.

Ксёндз ужо скончыў малітву, укленчыў перад алтаром і праз хвіліну зьнік у рызьніцы, але людзей у касьцёле ня меншала. Некаторыя выходзілі, але на іх месца прыбывалі новыя. Яны гэтаксама куплялі сьвечку і, запаліўшы яе, устаўлялі ў падсьвечнік, гэтаксама ўкленчвалі на лаўцы й занураліся ў малітву. Іх шчокі, іх ілбы й скроні, аблітыя жоўта-залатым сьвятлом, нагадвалі твары васковых фігур. Калі б яны ня рухаліся перада мной, я мог бы падумаць, што трапіў у кабінэт мадам Цюсо, які прыкінуўся касьцёлам. Рэчаіснасьць мела, аднак, праўдзівы характар. Сапраўднымі былі бразгат манэтаў, што падалі ў бронзавы кубак, полымя сьвечак, шэпт малітваў, а перадусім - пах кадзіла. Пах, які заўсёды, ужо шмат гадоў, хваляваў мяне, ледзь толькі я ўцягваў яго ў грудзі. Бо заўсёды, замест таго каб думаць пра сьвятога Войцеха, забітага паганцамі ў Прусіі, ці пра сьвятога Станіслава, засечанага каралём Баляславам у Кракаве, замест таго каб думаць пра нейкага сьвятога ці пра ўсіх сьвятых разам, замест таго каб прасіць іх пра заступніцтва, я зьмежваў павекі й перад вачыма

папулярнай ірляндзкай балядзы: In Dublin's fair city where girls are so pretty I was there that I first met sweet Molly Malone As she wheelbarrow Throughs street broad and narrow Crying, «Cockles and mussles, alive, alive oh» etc. - *Зацем перакладніка.*

зьяўлялася спачатку сьляпучая беліня пяшчаных выдмаў, далей - зялёнае вока мора, а паміж імі - мядова-залатыя, бурштынавыя на сонцы камлыгі. Цяпер я таксама выканаў гэты рытуальны прыём, але спадзяванага эфэкту не дачакаў. Ці я зрабіў нейкую памылку? А можа, яны тут ужываюць у кадзіле нешта іншае замест бурштыну? «Гэта немагчыма, - падумаў я. - Пах такі ж самы, відавочна рымска-балцка-каталіцкі». Хіба што мне здрадзіла памяць, і тады я вырашыў яе праверыць. Тэлефон? - 68-04-83. Адрас? - Пэмбрук-парк, 17. Уладальнікі? - Містэр і місіс Брукс. Аўтобус? - 10, 46A і 64A. Прашаптаўшы гэтыя словы й лічбы, я сунуў руку ў кішэню па візытоўку пансіянату і, канечне, пад яго назваю, надрукаванаю шэрымі літарамі, *«St. Jude's Guest House»*, знайшоў такую ж самую інфармацыю. Але другой спробы я не рабіў. Ня зьмежыў другім разам павекаў, каб пад уплывам пахаў яшчэ раз убачыць бурштынавае зьзяньне. Калі я хаваў візытоўку, дык убачыў за столікам зь сьвечкамі мужчыну, які зрабіў дакладна тое ж самае: паклаў у кішэню (у той самы момант, што і я) кавалак паперы. Як быццам ён насьледаваў мне або я яму.

Я ўважліва сачыў за ім. Ён запаліў сьвечку, паставіў яе ў сьвечнік, пасьля сеў на лаўку, але не пражагнаўся і не пачаў маліцца. Затое дастаў з кішэні белую паперку, тую самую, якую схаваў хвіліну таму, нейкі час мэдытаваў над ёй, пасьля ўзяў асадку й напісаў на ёй нешта, а потым хутка паклаў паперку ў канвэрт з чорным крыжам і вярнуўся да століка.

Толькі ў гэты момант я заўважыў у цені бронзавага кубка невялічкую скрынку. Мужчына кінуў туды канвэрт, як звычайны ліст, і адышоў, а я ўбачыў яшчэ сёе-тое. Паміж слоікам і скрынкай ляжаў стосік такіх самых канвэртаў і паперак. Паколькі цікаўнасьць не давала мне спакою, я пайшоў у бакавы нэф, узяў з стала канвэрт з паперкай і вярнуўся на лаўку. *«Dead List»* - прачытаў я не безь зьдзіўленьня на канвэрце з чорным крыжам - *«St. Andrew's Westland Row»*, а ніжэй, меншым шрыфтам: *«Names and Offerings»*. Шматок паперы растлумачыў мне, у чым рэч. Пад надпісам «Сьпіс памерлых алтара» ішоў дэвіз, узяты ў двукосьсе: «Божа, помні пра нашых блізкіх і сяброў, якія адышлі ў Тваю вечнасьць з надзеяй на другое прышэсьце». Ніжэй, пад словам «Бацькі», знаходзіліся два

пустыя радкі. Крэўным і блізкім сваякам было прысьвечана пяць наступных радкоў, а сябрам - дзевяць, такіх жа чыстых і цнатлівых. У нізе паперы, пад чорнай рыскай, трэ было напісаць сваё прозьвішча й адрас. А яшчэ ніжэй было запэўненьне, што ксяндзы гэтай парафіі штодня цягам цэлага месяца ахвяруюць адну імшу за ўсіх памерлых, згаданых у паперыне.

Чаму ў той момант я падумаў пра дзеда Караля? Можа, тыя, хто адышоў, у такія хвіліны самі тактоўна нагадваюць пра сябе? Можа, у іх ёсьць нейкі спосаб, пра які мы ня ведаем? Так ці іначай, я падумаў пра яго. Вось ён, невысокі, у шэрым плашчы, з кійком у руцэ, вымярае кілямэтры пляжу спакойным раўнамерным крокам; ён заглыблены ў думкі, над яго галавой прабягаюць кучаравыя аблокі, пад яго нагамі скрыгочуць чарупінкі, і ціхі шолах краба й кашаль крука тонуць у шуме хваляў - цёмна-зялёных, белагрывых.

Так я ўявіў сабе яго праз шмат гадоў, седзячы на лаўцы касьцёлу на Ўэстланд-Роў зь сьпісам памерлых у руцэ. Я адчуў на вуснах салёны смак, перамяшаны з горкім пахам водарасьцяў, і згадаў, як тады, падчас сэзону мэдузаў і восеньскіх вятроў, бачыў яго ў апошні раз. Я нават не падазраваў, што яго точыць вар'яцтва, гэтая падступная грозная хвароба, пра якую пасьля ад'езду дзеда Караля пры мне ніколі не размаўлялі. Так, цяпер я згадаў сьцішаны голас бацькі, калі вечарам, на кухні, ён размаўляў з мамаю, а я выцягваў вушы, каб пачуць асобныя сказы, авеяныя таямнічаю аўрай. Напрыклад: «Пастарская ўдава». Ці: «Наўмысна хаваецца». Ці яшчэ: «Туды цяжка трапіць». Я пытаўся: «Дзе ён?», «Ён у небясьпецы?», «Чаму ён ня вернецца ў Кракаў, дзе яго чакае бабуля Марыя?». Пасьля такіх пытаньняў бацька выходзіў з пакою бледны й нэрвовы, а мама тлумачыла: «Ты яшчэ малы, каб гэта зразумець. Некалі прыйдзе час». Той час ніяк не прыходзіў, а я цягам тыдняў і месяцаў, што міналі паўзь мяне, прыгадваў усё, што сказаў, усё, што зрабіў дзед Караль тады, у кастрычніку.

Калі мы крочылі па пляжы з Сопату да Еліткова ці назад, ён любіў спыняцца над мэдузамі, выкінутымі на бераг,

пераварочваў іх далікатна канцом кійка і, гледзячы на сетку лілёвых жылак, казаў: «Усё скончылася, усё» ці: «Няма больш разбураных дамоў». Я не разумеў, пра што гаворка, але баяўся перапытваць. Гэта былі сказы, прамоўленыя, відавочна, не на мой адрас, хутчэй мэдузам або ў паветра - хвалям, ветру і чайкам. Часам дзед Караль застываў у нерухомасьці й глядзеў на затоку, на сінюю лінію гарызонту, быццам адтуль павінен быў прыйсьці нейкі знак, быццам ён хацеў бачыць, што там далей, за даляглядам. Пасьля шпацыраў, калі яны канчаліся ў Сопаце, мы пару разоў заходзілі ў майстэрню пана Ліпшыца, які жыў амаль пад самым чыгуначным мостам. Там я ў захапленьні аглядаў музычныя шкатулкі й гадзіньнікі зь зязюлямі, а дзед ішоў у падсобку і там, у паўзмроку слабой лямпы, нахіляўся разам з гадзіньнікавым майстрам над мапамі, якія пан Ліпшыц даставаў спэцыяльна для яго. Гэта былі марскія навігацыйныя мапы, найчасьцей швэдзкія й нямецкія. «Дзякую, - казаў дзед, - бяз вашае дапамогі я ня даў бы сабе рады», - і тады пан Ліпшыц адказваў, што калі б у яго было болей такіх кліентаў, якія пішуць кніжкі пра марскія маякі, калі б у яго было больш такіх вучоных гасьцей, дык ён адкрыў бы букіністычную краму, хаця, напэўна, нават тады з гэтага б нічога ня выйшла, бо на такую дзейнасьць, на такую краму трэба мець дазвол аж ад сямі важных установаў. Дзед хаваў мапу ў кішэню паліто, старанна яе склаўшы, што было няцяжка, бо пан Ліпшыц падклейваў паперу палатном. І калі мы вярталіся чыгункай дахаты, прамінаючы пэроны Высьцігаў, Алівы, Палянак і Лётнішча, дзед, углядаючыся ў акно, казаў, нібы супраць волі: «Няхай гэта будзе неспадзяванкай. Пакуль не напішу кніжкі, я цябе вельмі прашу, не кажы нікому».

Я верыў яму, верыў шчыра. Насамрэч дзед быў хімікам, запатэнтаваў нават пару вынаходак, толькі пасьля вайны нідзе ня мог знайсьці сталай працы й зарабляў прыхапкам, як лябарант у фатографа альбо як вандроўны прадавач бэнгальскіх агнёў і фаервэркаў на кірмашох; дык чаму б яму не здабыць славы й грошай новаю, добраю кніжкай пра марскія маякі? Не, я не лічыў гэта дзівацтвам. Дзіўнымі былі візыты да пана Гамэрлінга, на другім канцы гораду, там, дзе паміж каналамі, адразу побач з галяндзкім шлюзам, стаяў дом прускай кладкі, аднапавярховы, з двухсхільным дахам.

Пад нашымі туфлямі на дамбе шаргатала засохлае лісьце, пасьля нашыя крокі грукалі па драўляным мастку, нарэшце, рыпелі крутыя старыя сходы, якія вялі на паддашак, проста да дзьвярэй кватэры пана Густава Гамэрлінга. Тут усё пахла мятаю - кніжкі, якія пан Гамэрлінг выцягваў зь незьлічоных скрыняў і куфраў, тытунь, якім ён набіваў сваю люльку, гарбата, якой ён нас частаваў, і нават шалік, агорнуты вакол яго шыі, нават гэты шалік пах мятаю, бо ўсюды - пад бэлькамі крокваў і на драўляных сьценах - літаральна ўсюды віселі мяшэчкі зь лісьцем гэтага зельля. «Гэта само здароўе», - казаў гаспадар, наліваючы нам у кубкі мятнай гарбаты. «Выдатна ўплывае на страваваньне й нэрвы», - дадаваў ён пасьля, пыхкаючы зь люлькі мятным дымам. А калі мы пілі той напар, ён частаваў мяне й дзеда цукеркамі, таксама - натуральна ж - мятнымі.

Пасьля абодва яны гаварылі па-нямецку, хаця кожны зь іх па-свойму: дзед Караль неяк мякка й спакойна, пан Гамэрлінг гартанна й выразна. «Гэта - каб ня страціць навыку», - тлумачыў дзед пазьней, але я адчуваў, што яны хочуць ад мяне нешта схаваць, нешта, што іх выразна падзяляла, хоць адначасова й моцна яднала. Калі яны гаварылі, часта зьвяртаючыся да кніжак з тэхнічнымі малюнкамі, я бадзяўся па пакоі ці падыходзіў да акна, адкуль быў відаць канал Матлавы й даўно нядзейны шлюз. *«Warum?»* - пытаўся мой дзед. *«Darum»*, - адказваў яму пан Гамэрлінг. *«Möglich»*, - казаў дзед. *«Unmöglich!»* - як рэха азываўся голас пана Гамэрлінга. І так цягам усёй размовы, якой - за выняткам пары выразаў - я не разумеў. Яны спрачаліся пра нешта, што іх вельмі цікавіла і на што кніжкі пана Гамэрлінга, так ліхаманкава гартаныя, не давалі адказу. Крадком я бачыў там калёнкі лічбаў, схемы прывадаў і злучэньняў. *«Muss es sein?»* - запытаўся аднойчы дзед. «Es muss sein! - адказаў пан Гамэрлінг. - *Es muss sein, mein liebe doktor Karol! Es muss sein!»* Гэта была іх апошняя размова, а калі мы разьвітваліся ўнізе, ужо гаворачы па-польску, пан Гамэрлінг сказаў: «Толькі сачыце за ціскам!» - «Буду сачыць, - адказаў дзед, - буду піць мяту зранку, удзень і ўвечары».

- Штосьці здарылася? Вы нядобра сябе адчуваеце? - гэты голас не належаў ані дзеду Каралю, ані пану Гамэрлінгу. Сьвечкі ў

круглым сьвечніку ўжо дагаралі, воск капаў на паркетную падлогу, а перада мной стаяў ксёндз, той, што правіў імшу. Мы былі ў касьцёле адны, электрычнае сьвятло паціху гасла.

- Не, дзякуй, - ціха адказаў я, - усё добра.

- О, ты, напэўна, іншаземец, - яўна ўзрадаваўся ён. - Можа, ты хочаш выспаведацца?

Пытаньне было такім раптоўным і неспадзяваным, а ягоны твар - поўным добрай волі, што зусім забыўшыся, я хутка адказаў па-польску:

- Не, дзякуй вялікі ксёндзу.

- О! - ён падняў рукі ўгору. - Ты - расеец?

Ён не заўважыў ліста з канвэртам: я пасьпеў схаваць іх у кішэню. Потым я ўстаў з лаўкі й рушыў да выхаду, адказваючы яму, што не, я - не расеец. Яго гэта крыху расчаравала. Ён ішоў за мной аж да дзьвярэй і пытаў, ці можа ён мне чымсьці дапамагчы, адкуль я, а таксама турыст я ці эмігрант.

- Дзякую, - паўтарыў я ўжо каля дзьвярэй. - Усё добра. Я знаёміўся з горадам і згубіў недзе плян. Можа, вы мне падкажаце, як дайсьці да Эдэн-Куэй?

Калі ён гаварыў, я прыглядаўся да ягонага твару. Ён быў інтэлігентны, некрануты яшчэ грахом адчаю ці роспачы. Ён мог бы працаваць з наркаманамі, навяртаць да Госпада п'янчужкаў, абвяшчаць Добрую Вестку прастытуткам і зладзеям, ён мог бы размаўляць са мной усю ноч да самага ранку, такі ён быў моцны, энэргічны, малады.

- Так, дзякую, - адказаў я, калі ён падаваў мне руку, - цяпер я патраплю куды трэба.

- І ўсё ж такі адкуль ты? - не хацеў прызнаваць ён сваёй паразы. - Я думаў, тое, што ты сказаў, гэтыя словы, думаў, што гэта па-расейску.

Калі прагучала назва, ён, азадачаны, выразна зьбянтэжыўся й

запытаў:

- А дзе гэта? Недзе на Ўсходзе?

- У пэўным сэнсе так, - праз хвіліну ваганьня адказаў я. - Але гэта цалкам нерэальны горад… А зараз я мушу ісьці. Прашу прабачэньня. Бывайце.

- Бывай. Бог з табою, Бог з табою, - пачуў я над сабой ягоны голас, ужо аддалены на вышыню некалькіх каменных прыступак. Кутком вока я ўбачыў, што ён рашуча блаславіў мяне знакам крыжа. Зрэшты, хто ведае, можа, ён бласлаўляў не мяне, а мой нерэальны горад?

Я вырашыў ісьці да Пірс-Стэйшн, а там узяць таксоўку. Не ад таго, што зноў баяўся заблудзіць (я быў ужо на патрэбнай дарозе), але адчуваўся холад, у паветры вісела непрыемная імжа, якая не заахвочвала да далейшага блуканьня. Пры гэтым мяне турбавала думка, а хутчэй пытаньне, ці не павінен я вярнуцца ў касьцёл, каб замовіць імшу за душу дзеда Караля. Ці не павінен памаліцца за яго? Ягоная душа, дзе б яна ні была, калі была ўвогуле - у Шэоле, на Елісэйскіх палях, над водамі Стыксу ці ў гарыстай Вальгале, - напэўна пакутавала гэтак сама, як тады, калі была ў ягоным целе. Я адчуваў сябе бездапаможным і цалкам разгубленым у тых здагадках і домыслах, бо якім словам, якім заклёнам, якой малітвай ці песьняй мог бы супакоіць ягоную душу? Якой малітвай я мог бы выпрасіць для яе ў Бога спакой і вечнае збаўленьне? А што, калі меў рацыю Марцін Лютэр, калі меў рацыю гэты палкі доктар зь Вітэнбэргу, кажучы, што ўчынкі ні на што не ўплываюць і што малітвы непатрэбныя мёртвым, паколькі існуе толькі наканаваньне?

Гэта былі думкі, што не пасавалі для шпацыру па чужым горадзе, пагатоў пасьля зьмярканьня. Я вырашыў перайсьці на другі бок вуліцы, ужо побач зь Пірс-Стэйшн, і там шукаць таксоўку, як раптам, яшчэ на гэтым баку Ўэстланд-Роў, мяне зачапіў жабрак:

- Гэй, ты, - крыкнуў ён. - Што ты думаеш пра сьвятога Колума?

- Нічога, - азваўся я. - Нічога ня думаю.

Кляшар ня надта заклапаціўся маім адказам. Ён зайграў на скрыпцы два такты мэлёдыі, пасьля чаго ахрыплым голасам засьпяваў:

O, won't we have a merry time

Drinking whisky, beer and wine

On Samhain

Samhain day?

Паміж ягонымі нагамі стаяла бляшанка, падобная да касьцельнай, толькі з шырэйшай адтулінай для манэтаў. Граючы, ён рытмічна трос яе нагой, і гэты пэркусійны інструмэнт быццам заахвочваў узмацніць голас. Я дастаў шасьцікутную манэту з гербам гораду з аднаго боку й стылізаванаю лірай з другога. Манетка самавіта забрынькала, спачатку весела, пасьля смутна, а сьпявак паўтарыў апошнія радкі:

On Samhain

Samhain day? -

і сказаў:

- Бо, браце, у сраку сьвятога Колума. І ўсіх іншых сьвятых таксама. Толькі Патрыка не. Але Патрык - гэта іншае, Патрык - гэта ты і я, гэта мы ўсе, браты й сёстры нашай прагнілай зялёнай матулькі.

Я адышоў, не шкадуючы манэты з гербам гэтага востраваў й гербам гэтага гораду, а ён пачаў нейкую іншую песеньку, якое я ўжо не пачуў. Зрэшты, мая галава была занятая іншым. Да мяне зноў вярнулася ўпадніцкая думка, што я павінен пайсьці ў касьцёл і напісаць імя дзеда ў сьпісе памерлых ды замовіць імшу; гэтая думка зноў дагнала мяне й не давала спакою, як бы я ні намагаўся адсунуць яе далей.

Кароткія лісты, якія бабця Марыя прысылала бацьку, напэўна, былі надзвычай драматычныя, і аднойчы ўвесну ён узяў два дні адгулу ды паехаў цягніком кудысьці за Ольштын, ува Ўсходнюю Прусію. Вярнуўся ён з сур'ёзным тварам, надломлены, быццам цягнуў на сваіх плячох нечалавечы цяжар лёсу. «Я не магу гэтага зразумець! Я не магу гэтага ўсьвядоміць!» - паўтараў ён шматкроць. А калі ён зачыняўся з мамаю на кухні, я чуў, як ён кажа ёй, што рэч ні ў якай не ў кабеце, пагатоў - ня ў пастарскай удаве, як меркавала бабця Марыя, рэч у нечым іншым, у нейкім вар'яцтве, у якім дзед замкнуўся, як у вежы, якую абараняюць духі, і сядзеў там, маўклівы й абыякавы да галашэньня родных. «Але ў гэтым ёсьць нейкая пасьлядоўнасьць, - казаў бацька, - ты ведаеш, што ён цяпер бясконца чытае?» Тут прагучала нейкая лацінская назва, якой я не зразумеў. Так, калі б я ў пару апавёў бацьку пра нашыя візыты да пана Ліпшыца, а тым больш - да пана Гамэрлінга, ці магло б гэта ўратаваць дзеда? Я думаў пра гэта, гледзячы, як звычайна, налева і пераходзячы Ўэстланд-Роў наўскос. Я разважаў, што, мабыць, усё-ткі не, і толькі тады пачуў віскат шын, жудасны рык кляксону й адчуў дзіўны мяккі ўдар з правага боку. На шчасьце, фургончык (а гэта быў зялёны старэнькі форд) ужо здолеў спыніцца, і, падымаючыся з праезнай часткі, я адчуваў толькі вельмі моцны боль у калене. З машыны выскачыла дзяўчына ў тоўстым швэдры. Ёй было гадоў дваццаць пяць ці, можа, дваццаць восем.

- Хлопча! - крычала яна, - Хлопча, ты што, п'яны? - Яна была больш знэрваваная, чым я, не магла спыніць трымценьня рук. Яна штохвіліны трэсла галавою, адкідваючы назад каштанавыя валасы, што спадалі ёй на лоб хвалістаю грыўкай. - Вы ўсе аднолькавыя, - сказала яна ўжо нашмат спакайнейшым тонам, - пару кілішкаў у пабе, а пасьля проста пад колы. Ну што, паехалі ў больніцу? - У апошнім сказе выразна хавалася надзея, што гэтага ня трэба будзе рабіць.

Я атрасаў штаны й паліто, гледзячы ў цёмна-зялёныя вочы, якія чакалі адказу.

- Ну? Чаму нічога ня кажаш? Язык адкусіў?

- Ну канечне, - адказаў я, - адбіла мне азадак, а цяпер яшчэ на

мяне ж і крычыш.

- Вой, як ён сьмешна кажа, - крыкнула яна. - Адбіла яму азадак і на яго ж крычу, - забаўна перадражніла яна мой акцэнт.

Мы - я і яна - адначасова расьсьмяяліся. Некалькі разявакаў расчаравана адышлі: выпадак аказаўся нецікавым. Я сказаў, што ўсё добра і ў больніцу ехаць ня трэба.

- Ты турыст? - запытала яна.

Я ёй не пярэчыў і сказаў яшчэ, што заўтра выяжджаю адсюль аўтобусам у Голуэй.

Яна падала мне руку. Яе пальцы былі доўгія й ледзяныя.

- Калі пераходзіш вуліцу, глядзі спачатку направа, - сказала яна, сядаючы ў машыну. Гэта такі дзіўны край, дзе машыны ездзяць па левым баку.

- Так, гэта дзіўны край, - адказаў я.

Але яна гэтага ўжо ня чула. Фургончык з надпісам *«Live Cockles and Mussels»*, скрыгочучы каробкай перадач, паехаў далей, а я рушыў у бок Пірс-Стэйшн, да якой усё ніяк ня мог дайсьці.

- Чаму ты мяне перасьледуеш? - сказаў я ціха. - Ці мала малітваў вышапталі мае вусны ў касьцёле Ўваскрашэнцаў? Ці ты ня памятаеш, як кожнага ранку я на досьвітку зрываўся й бязь сьнеданьня, адно выпіўшы шклянку чыстай вады, бег на першую імшу й горача, палка, жарсна маліўся аб тваім выздараўленьні, аб тваім вяртаньні, аб тваім шчасьці, а пасьля прымаў з далоні пробашча Ягонае цела, зьядаў яго, праглынаў з думкай толькі пра цябе, толькі дзеля цябе аднаго ў цэлым сьвеце? А пасьля йшоў дадому па ранец і бег у школу, і не пераставаў думаць пра цябе, таксама як і цяпер, ні на хвіліну, нават тады, калі грукаталі сялянскія вазы, едучы на аліўскі кірмаш; пырханьне коней й стук капытоў не заміналі маёй нястомнай малітве, якую я ўзносіў дзеля цябе й за цябе. Цяпер я ўжо не магу табе дапамагчы, ніякім чынам, прабач, нават калі гэта ня выпадак прывёў мяне ў гэты касьцёл, нават калі гэта

зрабіў ты, я прашу цябе: ня йдзі больш за мною, гэта ня твой горад, не, - твой застаўся адно ў снох, даўно здраджаны й прададзены, можа, засталіся дрэвы, муры, могілкі, можа, тая самая лаўка ў парку, на якой ты сядзеў, той самы жнівеньскі вулічны пыл, але што я магу табе сказаць, што зрабіць для цябе? Голасна агучваць тыя назвы, якія для мяне ня значылі нічога, акрамя пустых гукаў? Купалы Бэрнардынаў пад першым сьнегам, бразганьне вупражы на Лычакове, лагодны подых Карпат за плячыма, украінскія сьпевы?.. Забудзь пра гэта, забудзь! Гэтыя вірлівыя абломкі ня скласьці ў ранейшы кшталт, і ўсякія абяцаньні дарэмныя… Ты разумееш мяне? Ты чуеш мяне? Я ня буду больш дарма клікаць цябе.

Ня ведаю, куды б завяла мяне гэтая плынь сноў і крокаў, якая ўсё хутчэй, усё магутней ірвалася наперад, ня ведаю куды, калі б не нага, якая пачала балець усё мацней. «Дзе тут гэты Пірс-Стэйшн?» - падумаў я. Стоячы на незвычайна добра асьветленым Лінкальн-Плэйс, бяз пляну гораду, я ня ведаў, што рабіць далей, у які бок ісьці. У мяне не было клубка нітак, каб вярнуцца ў ранейшае месца. Я зноў заблудзіў, гэта было відавочна. Ці я прамінуў вакзал, ня ўбачыўшы яго, ці - што хутчэй - пасьля здарэньня з фургончыкам зблытаў кірунак.

На дапамогу мне прыйшоў выпадак. Я зрабіў яшчэ пару крокаў і праз хвіліну ўбачыў шматабяцальную шыльду пабу. Я бяз роздуму ўвайшоў туды і, не марудзячы, замовіў малы віскі, пасьля сеў за цяжкую дубовую стальніцу, якая трымалася на латуннай трубцы.

Заданьне, якое я даў сабе, не было такім цяжкім, як мне падалося спачатку. Я накрэсьліў на сурвэтцы чатырохкутнік Пірс-Стэйшн, пасьля Ўэстланд-Роў, пасьля месца, дзе я спаткаў жабрака-пеюна, і, нарэшце, пункт, дзе зялёны форд затармазіў зь віскатам шын. Не было сумневу: я мусіў прамінуць вакзал, далей зьвярнуць на Пірс-Стрыт, якая вядзе ад яго, і далей ужо, як па трэцім баку трохкутніка, дабрацца сюды, да «Кені'с Паб», як называлася гэтае месца.

Супакоены, я замовіў чарговы кілішак і, чытаючы - літара за літарай - надпіс *«Guinness is good for you»*, натрапіў позіркам на партрэт гаспадара. Гэта была выява *a la belle epoque*; яна

сьведчыла пра гэта кожнай сваёй рысай: камізэлька, цьвёрды каўнер, вусы й гальштук, і ўсё гэта зьнятае ў сэпіі ды ў авальнай форме дагератыпу. Мужчына меў выразнае падбародзьдзе, выцягнуты твар і ўзьнесеныя дугі броваў, што сьведчыла пра лёгкае зьдзіўленьне, якое ў яго выклікаў гэты сьвет недзе каля 1905 году. Партрэт у цёмна-карычневых тонах вісеў на арэхавай панэлі, над шыхтамі пляшак і электрычнаю касай. Я адразу прыдумаў сабе заданьне: падлічыць, колькі пляшак стаяла на гэтай палічцы з часоў Порт-Артуру, з улікам таго, што кожны тыдзень у тутэйшыя горлы ўліваюцца дваццаць пляшак. На маё шчасьце, каса паказвала толькі 3.26, і я ўжо зьбіраўся плаціць ды йсьці далей. Але не заплаціў, бо, калі я кіўнуў бармэну, ад дзьвярэй «Кені'с Паб» да маіх вушэй даляцеў знаёмы голас:

- Хлопча! І тут я цябе спаткала!

А пасьля другі голас, ужо неяк меней знаёмы, адказаў першаму:

- Гэта той паляк, што атрымаў пад зад?

Яны без цырымоніяў селі побач са мною.

Ён, вечны студэнт, сяды-тады падпрацоўвае ў левай прэсе, а ў астатні час - пісьменьнік: у рэдакцыях ляжаць два рукапісы, але цяжка прабіцца празь мясцовую мафію. Яна, *frutti di mare*, дастаўка мідыяў ды малюскаў проста з порту на пададзены адрас: гатэлі, бары, рэстараны; фірма ёсьць у падатковым рэестры.

Плынь сакавітых сказаў цякла зьлева направа ды справа налева, а я сядзеў між імі, задаволены, што яшчэ ня мушу ехаць у гатэль.

- А ці ў вас каталіцкая імпэрыя таксама ў заняпадзе? - спытаў ён, дапіваючы віскі й адразу замаўляючы чарговую порцыю. - Папская тыяра над народамі, пладзецеся, пладзецеся, нібы трусы! *A propos*, праблема прэзэрватываў у вас, на Ўсходзе, ужо вырашана палітычна?

- Гэта хутчэй праблема гігіенічная, - спрабаваў я нешта адказаць, - асабліва для маракоў.

Але ён, штохвіліны апэлюючы да яе («ці ня так, скажы, Молі?»), пырхаў словамі, як гейзэр параю.

- Скажам, праблема бацькаў, што гвалцяць уласных дочак. Толькі прэса, нашая прэса, узварушаная прызнаньнямі маленькай Кетлін (помніш, Молі, што я табе тады сказаў?), толькі прэса тады біла ў званы! Вясковая цемната, чалавека, тут бляваць хочацца, найлепшыя выяжджаюць за акіян - ты абавязкова напішы там у сябе, што такое капіталізм у бедным, дзікім каталіцкім краі!

Ён не хацеў чуць, што я не пішу пра капіталізм. А калі Молі нагадала мне, што я сказаў пару хвілін таму (куды зьбіраюся), дык ён не схаваў свайго раздражненьня:

- Гэта толькі купа друзу, уся гэтая Тор Бэйлілі! Друзу з словаў паэта, які заўсёды быў руінай. Бо кім жа, уласна, быў спадар Ейтс? Вось жа, ён наўрад ці быў пісьменьнікам XX стагодзьдзя! *«Before that ruin came…»*, - патэтычна прадэклямаваў ён, - гэта для старых цётак, для бяззубых англікаў - што тая аўсянка, хіба пад мясцовым рамантычным соўсам.

- Аўсянка пад соўсам? - перапытаў я, ня будучы пэўным, што добра яго зразумеў. - Але гэта, відаць, ня вельмі натуральнае параўнаньне.

- Супакойся, Г'ю, - адказалі зялёныя вочы, - ён жа не такі дурны, каб ставіцца да гэтага ўсур'ёз.

Пэўны час яны спрачаліся між сабою. Ён гаварыў усё хутчэй, а яна штохвіліны скарыстоўвала нейкія гэльскія словы, якіх я не разумеў. Яны не выглядалі параю закаханых; калі што і яднала вечнага студэнта зь дзяўчынай, якая прадае малюскаў, то напэўна ня доўгія шпацыры па пляжы Сэндыкоў, ня чулыя шэпты на лаўцы ў Фэнікс-Парк альбо хвіліны экстазу ў зьнятым на гадзіну нумары гатэлю.

- Я мушу пасцаць, - сказаў раптам Г'ю. - Трымайце вахту,

маракі, а я патрымаю нешта іншае!

Паважным, упэўненым крокам ён рушыў да туалету, цягнучы сабе пад нос *«God save the king»*, і ягоны сьпеў перамешваўся зь іншай мэлёдыяй, бо за суседнім столікам сядзела грамада, якая музыкавала на гітары й скрыпцы.

- Чаму ты едзеш туды? - запыталася Молі. - Ты цікавішся паэзіяй?

Побач з хлопцамі, што гралі на інструмэнтах, прыселі дзьве пацанкі - стрыжаныя пад вожыка, абедзьве ў вайсковых ботах, клятчастых кашулях ды скураных куртках. На адной з куртак, як і на баваўнянай кашульцы, вакол намаляванай запаленай сьвечкі, аточанай калючым дротам, быў надпіс *«Amnesty International»*.

- Мяне цікавіць рака, - адказаў я.

- Якая рака?

- Яна называецца Клун. Яна зьнікае наўпоблізь Тор Бэйлілі.

- Зьнікае?

- Так, пад зямлю. А пасьля плыве далей, сярод цемрадзі й падземных скал, ажно да Атлянтыкі.

- Нябачная рака… Я ніколі гэтага ня чула. Але я мала чытала кніжак.

- Я прачытаў пра гэта шмат год таму, у газэце «Цуды прыроды» ці нешта накшталт таго. Ведаеш: мэтэарыты, магнітныя скалы, ну й гэтая рака побач з нарманскаю вежай.

- І пра што стракочуць сарокі? - Г'ю ўсеўся на сваё месца. - Ведаеце, што прыйшло мне да галавы над залатым струмянём? Гоўгі сёньня ладзіць імпрэзу. Паедзем у ягоную стайню, паглядзім, што нам там сьвеціць. Бо тут, - і ён паказаў на пацанак, - тут хутка вада выйдзе зь берагоў і абудзімся мы на высьпе Лесбас, такое яе старажытнае імя. Да таго ж, о шляхетны чужынча, ня ведаю, як табе, а мне гэтая музыка

Aiobhell, гэты гук барановых кішак надзвычай кепска ўплывае на стрававальны працэс. Вы разумееце, пра што я. О, Гоўгі любіць такія рэчы! - Г'ю стукнуў мне па плячы. - Нечаканы госьць з Усходу! Золата, ладан і сьмірна! А можа, ты пазашлюбны сын каралеўскага роду? Гэта было б зусім незвычайна!

- Наш апошні кароль памёр у расейскай вязьніцы, - адказаў я. - Без нашчадкаў. А калі й здолеў нарадзіць дзяцей, дык адно з імпэратрыцаю Кацярынай, нашмат гадоў раней. У Маскве пра гэта нічога невядома.

- Га, га, га! - закрычаў у захапленьні Г'ю. - Грэбаная імпэратрыца! Грэбаны Крэмль! Грэбаная Эўропа! У гэтым сьвеце ўжо няма каралеўстваў!

- Не зьвяртай на яго ўвагі, - сказала Молі. - Гэта толькі стыль такі, забава.

- Стыль - гэта чалавек, некалі стварэньне чатырохногае й значна больш валасатае. - Г'ю дапіў і адставіў шклянку. - А таму, о атожылку апошняга караля й распусьніцы-імпэратрыцы, цябе запрашаюць на бяседу Бальтазараву!

Молі аплаціла рахунак. Г'ю, аплёўшы нас рукамі, правёў да выхаду. Безумоўна, яны былі дзіўнаю парай. Але я быў ім удзячны. Цень белага ліста паперы ня йшоў за мною, прынамсі цяпер.

На зялёным фургончыку, у якім грукаталі пустыя скрынкі, мы праехалі па Ўэстланд-Роў, Пірс-Стрыт і каля будынку Грын-Коледж зьвярнулі на Крафтан-Стрыт, на якой у пяціпавярховым доме жыла Молі. Яна хацела пераапрануцца й на нейкі час пакінула нас адных. Г'ю дастаў з кішэні біклажку, салідна сербануў зь яе й перадаў мне, кажучы:

- Бедная дзеўка. Ведаеш, яе цётка Хелена, багатая, як шэйх, не адпісала ёй амаль нічога. Халерная старая панна, сьвятоша, ведзьма. Мы былі там разам, у дзень пахаваньня. Яе лёкай, лысая доўбня, трахаў на стале пакаёўку, улюбёную служэбку гэтай старой каргі, тую, што загрэбла някепскія грошы. А

маёнтак? Маёнтак - у лапішчах езуітаў! О Ісусе, я табе кажу, чалавеча, той прыгожы дом з садам, банкаўскія рахункі, нават сталовае срэбра, гэта ўсё, усё! - афрыканскім місіянэрам! І цяпер чорныя душачкі атрымліваюць збавеньне за грошы гэтай старой, сквапнай каталіцкай распусьніцы. А Молі? Молі не хапіла грошай нават на тое, каб заплаціць гатоўкаю за гэтую жалезку. Яна мусіла браць крэдыт у Элайд-Банк. І што б ты зрабіў з такою цёткай?

- Ня ведаю, - адказаў я. - Ня ведаю. А можа, яна не любіла Молі?

- Любоў! - радасна прасьпяваў Г'ю. - Любоў! Звонкая медзь альбо гулкі кімвал? Ты гэта маеш наўвеце? Не, гэта д'ябальскія справункі, о чужынча, з таго часу як у садзе зьявіўся вужака. Ну, *sursum corda*! - дадаў ён, нахіляючы пляшку. - Грэкі падыходзілі да гэтага рацыянальна. Напрыклад, суд Парыса: архетып нашай цнатлівасьці.

Ён глынуў. Пасьля схаваў біклажку й змоўк.

Праз хвіліну вярнулася Молі. У чорнай сукенцы, чорных панчохах, гэткага ж колеру паўбоціках і з карычневаю торбачкай у руках. Мы яшчэ раз прамінулі Грын-Коледж, а пасьля, едучы ўздоўж ракі, перасеклі канал і праз раёны Айрыштаўн і Сэндымаўнт, па Мэрнан-Роўд рушылі на захад. Г'ю хроп з адкінутай назад галавою, Молі, якая кіравала, была засяроджанай і маўклівай, я ўглядаўся ў горад, які цяпер, у сьвятле ліхтароў, у сьвятле нешматлікіх рэклямаў і асьветленых вокнаў дамоў, выглядаў зусім іначай, чым удзень.

У кішэні паліто я адчуваў пальцамі белы ліст паперы й круціў яго, быццам ён быў білетам. Зь левага боку, у змрочна-сіняй цемрадзі затокі, міргалі далёкія агні, мабыць караблёў, з правага боку шчыльная забудова саступіла месца паркам і вілам, а я, у імклівай машыне з надпісам *«Live Cockles and Mussels»*, седзячы трэцім паміж двума, згадваў сабе той вечар, калі мы з бацькам выйшлі зь цягніка на старой драўлянай станцыі і ў сьвятле жоўтых ліхтароў шукалі таксоўку і не маглі яе знайсьці, а калі нарэшце знайшлі, кіроўца ні за якія грошы, ні за якія скарбы сьвету не хацеў ехаць уначы ў мясцовасьць,

што называлася Выдрвіты. «Ты павінен пацярпець, - казаў бацька, - зараз нешта прыдумаем». Аднак мы нічога не маглі прыдумаць; час ішоў, а мы, бездапаможныя, бадзяліся пустымі вулкамі ў ваколіцах вакзалу й, напэўна, уладкаваліся б нарэшце ў нейкім гатэлі, калі б ня фурманка, у якую былі запрэжаныя два цяжкія пэршэроны. «Гэй, гаспадару, а можа, вы едзеце ў той бок?» - гэта было роспачнае й зусім пазбаўленае надзеі пытаньне, але мужык стрымаў коні працяглым «тпррру!» і запытаўся, пра які бок кажа бацька. «На Выдрвіты», - адказаў той. І тады фурман паказаў пугаю, каб мы сядалі, бо, хаця ён ехаў да Савінага Рогу, Выдрвіты былі адтуль недалёка, з другога боку ракі й возера.

Я хутка заснуў, прыкрыты бацькавым пінжаком, а пакуль не прыйшоў сон, углядаўся ў сьвятло газьніцы. Падвешаная на жэрдцы й калыханая раўнамерным рытмам, быццам зіхоткі ківач, яна акрэсьлівала кола, што аддзяляла нас ад цемры, у якую мы ўсё глыбей зануралiся. Пасьля, калі мяне абудзілі, я ўбачыў на небе зоркі, сотні зорак. А калі бацька сьпіхнуў у ваду пазычаны човен, кажучы: «Ня бойся, не патонем», - я ўсё глядзеў на іх у захапленьні. Я глядзеў, як яны, маўклівыя й зыркія, адбіваюцца ў абсалютна чорным люстры возера сярод аеру й трысьнягу, і я абсалютна забыўся, куды мы едзем і навошта, забыўся пра бацьку й пра таго, хто чакаў нас там, схаваны ў доме пастарскай удавы, недзе на краі сьвету, якім быў тады гэты закуточак Княскай Усходняй Прусіі.

Але цяпер, калі машына ехала так блізка ад мора й скалаў, а ў цемрадзі затокі пабліскvалі агні маяка, цяпер я бачыў ня толькі човен і зоры, але й тое, што чакала нас на другім баку возера. Я бачыў дзеда Караля, які ляжаў дагары тварам, ужо мёртвы, у белай кашулі з падкасанымі рукавамі, у чорных штанах і без шкарпэтак, якіх пастарава ўдава не змагла знайсьці. Я бачыў твар бацькі, калі ён нахіліўся над дзедам і апусьціў тыя рукавы; бачыў, як белае палатно закрывае вытатуяваную лічбу на перадплеччы дзеда (тры знакі, нумар, які ставіўся першым, хто трапіў у Аўшвіц), і таксама бачыў шнар на падбародзьдзі, які пакінуў яму польскі камуніст, сьледчы, будаўнік цудоўнага новага сьвету. Не было сьлёз, плачу, галашэньня. Удава апавядала, як гэта адбылося, што ён лёг у ложак, наракаючы на

боль у сэрцы. Яе сказы, кароткія, сухія й інфарматыўныя, апавядалі таксама пра зробленую працу: пасьведчаньне аб сьмерці ляжала на камодзе, дазвол на перавоз парэштак быў узяты, а адзін чалавек, ейны знаёмец зь мястэчка, у якога была машына, згадзіўся за памяркоўную плату перавезьці цела. «Будзе патрэбная труна, - сказаў бацька, - заўтра паеду ў горад». Але яна ўжо й гэта зрабіла. «Труна будзе, - адказала яна, - заўтра, на досьвітку, яе прывязуць з Савінага Рогу». - «Чаму вы так нам дапамагаеце? - спытаў бацька. - Можа…» - «Не, - перарвала бацьку пастарава ўдава, - але зьвяртаю вашу ўвагу на тое, што ў нас мала часу». Менавіта так і сказала: «зьвяртаю вашу ўвагу», - і, паведаміўшы, што ў пакоі, дзе жыў ён, нам прыгатаваная пасьцель, выйшла.

Мы пад'яжджалі. Г'ю адкрыў вочы і зноў пачаў досыць бессэнсоўна й невыразна мармытаць пад нос свой маналёг пра архетып цнатлівасьці.

- Гэта тут, - сказала Молі. - Выходзім.

Мы йшлі па каменных прыступках, якія дугой уздымаліся ўгору. Аднекуль зьнізу даносіўся рокат хваляў, а з вуснаў Г'ю, які ў золкім вільготным паветры ўмомант працьверазеў, ізноў палілася славесная плынь, гэтым разам пра букмэкераў на скачках. Я слухаў яго няўважліва; падыходзячы да акруглага будынку, які, пэўна, быў некалі часткай нейкай фартыфікацыі, я глядзеў на каменныя блёкі, на шэрыя, абчасаныя валуны, уяўляючы сабе, якою арыгінальнаю мусіць быць гэтая імпрэза. Тым болей што знутры не даходзіла ніякага гуку, і нават калі мы сталі перад драўлянымі дзьвярыма з жалезнымі завесамі, нават тады здавалася, што вежа пустая, нежылая й што мы зблыталі адрас. Аднак усярэдзіне аж раілася ад гасьцей. Вузкая вітая лесьвіца, што вяла на верхні ярус, і круглы пакой былі запоўненыя рухавым і гаваркім натоўпам.

Мае знаёмыя з «Кені'с Паб» на нейкі час забыліся пра мяне.

- Гэй, Джоржу!

- Гэй, Шэймасе!

- Як справы, Артуру! - крыкліва віталіся яны з прыяцелямі.

Я тут нікога ня ведаў і пачуваўся трохі зьбянтэжана. На шчасьце, ніхто не зьвяртаў на мяне ўвагі - і я мог агледзець памяшканьне. Досыць аскетычнае, яно нагадвала нешта сярэдняе між майстэрняю мастака й тэатральнаю крамай, зь якой вынесеная большая частка рэквізыту й пакінутая непатрэбная старызна. Напрыклад, стол, на якім стаялі біклажкі, бутэлькі, шклянкі, кілішкі, нагадваў пашарпаную мэблю другой паловы мінулага стагодзьдзя. А таксама фатэль і шэзьлёнг віктарыянскай эпохі. Але тут было шмат і звычайных скрынак, простых лавак, клееных з дошак, і нават старая бочка, якая служыла дадатковым столікам. Тоўстыя цьвікі, убітыя ў каменную сьцяну, падтрымлівалі карціны ці выконвалі ролю вешалак для адзеньня, часткова таксама тэатральнага: сярод палітонаў гасьцей я заўважыў некалькі кацялкоў, цыліндар, а таксама дарожны пыльнік, якога не пасаромеўся б ніводны прыдворны дарадца часоў позьняга Франца-Ёзафа. Я не заўважыў, ці была нейкая ежа; на стале стаялі адно рознага кшталту бутэлькі, госьці падыходзілі туды й самі налівалі сабе выбраныя напоі ў шклянкі. Я зрабіў тое ж самае й па вітай лесьвіцы падняўся на другі паверх.

Тут таксама быў адзін пакой, калі гэтае памяшканьне можна было так акрэсьліць, але тут панаваў іншы клімат. Некалькі дам, апранутых у элінскія строі, з шклянкамі ў руках, жвава гутарылі, здаецца, пра нейкага Скота, які мусіў неўзабаве прыехаць альбо ўжо прыехаў і быў да непрыстойнасьці салідным і багатым. Яны выглядалі так, быццам хвіліну таму сышлі з сцэны ці трапілі сюды з касьцюмаванага балю. Іх павязкі, іх шляхетныя пэплюмы, іх фрызуры, іх каралі й бранзалеткі - усё гэта імітавала строі жанчынаў з Дэльфаў: зграбных, бестурботных ды вясёлых.

Я пайшоў яшчэ вышэй, на трэці паверх. Тут інтэр'ер быў значна горш асьветлены, а таварыства дыскутавала пра нейкую кніжку з галіны сэксу й псыхіятрыі. Нехта з дыскутантаў хвіліну таму, мабыць, паліў траўку, я выразна чуў яе характэрны пах. Можа, той хударлявы чалавек у драцяных акулярах з прымятым капялюшам у руцэ, нэрвовы, з хуткай жэстыкуляцыяй? Можа,

паджылы спадар з выглядам даваеннага прафэсара? А можа, жанчына-вамп паміж імі, тая, у бліскучай сукенцы з парчовай апярэзкай і вычварным пяром у валасах, пра якую я адразу, немаведама чаму, падумаў, што яна прыехала з Парыжу?

Ад гары да нізу вежа была напоўненая дзіўным таварыствам. Гэта нагадвала нейкую сэкту ці тайнае брацтва. Пэўны час я нават шкадаваў, што я не адзін зь іх, але толькі пэўны час, бо калі ўявіў, як бы я выглядаў у свабоднай тозе ці - прыкладам - у кацялку, мне адразу ж захацелася ісьці далей, на апошні паверх.

Я піхнуў драўляныя дзьверы, трохі меншыя за тыя ўнізе, і апынуўся на акруглай тэрасе, аточанай парэнчамі. Від быў захапляльны. Я анямеў, гледзячы на цёмна-сінюю мантыю затокі, якая раскінулася ад скалістага падножжа будынку далёка туды, аж за няўлоўную лінію далягляду. Штохвіліны ў гэтай цемрадзі сям-там загараўся на сэкунду-другую агонь, пасьля чаго гас і загараўся зноў, як мігатлівая зорка. Маякі гаварылі міжсобку на сваёй уласнай мове. Я ня мог ані распазнаць, ані назваць іх, спробы згадаць па памяці мапу не дапамаглі. Сьвятло з Пулбэг я мог аднолькава прыняць як за маяк Бэйлі, што знаходзіўся на скалістым мысе, так і за маяк тэрміналу Дун-Логайрэ, да якога я прыплыў два дні таму з Гоўлігэд. Магчыма, мне было лягчэй, калі б я вызначыў уласнае месцазнаходжаньне, але гэта было немагчыма. Я ведаў толькі, што знаходжуся на ўскрайку гораду, за некалькі міляў ад вусьця Ліфі, паміж агнямі марскіх маякоў.

Там, у доме пастаравай удавы, на першым паверсе, я шукаў дзедаву працу аб маякох, але нідзе не было нават нататкаў. Рэчы дзеда, вельмі старанна складзеныя ўдавой, абмяжоўваліся вопраткай, брытвай, дакумэнтамі й адной толькі кніжкай - старой, пацёртай, апраўленай у скуру. Бацька ўзяў том у руку і напаўголасу прачытаў: *«Titus Lucretius Carus. De Rerum Natura»*, а пасьля адклаў яго, замаўчаў і схаваў твар у далонях. Чаму ён чытаў лацінскую кніжку? Чаму не пісаў нам лістоў? Чаму ён жыў тут, на адлюдзьдзі, здымаючы ў пані Нэмолер пакой на першым паверсе? Гэта ўсё было жахліва заблытана, як лацінская кніжка ў нямецкім выданьні Бракгаўза. Мы абодва не

маглі спаць, абодва маўчалі цэлую ноч, варочаліся з боку на бок, абодва пакутавалі ад аднаго пытаньня - чаму? Ці была такою сур'ёзнаю хвароба, якая атручвала ягоны розум? А можа, гэта была хвароба душы, якая ня мела нічога супольнага з банальным вар'яцтвам? Праз адчыненае акно даносілася сакатаньне цвыркуноў, а зь лесу час ад часу азываўся тужлівы голас абуджанай птушкі.

Ранкам удава запрасіла нас на сьняданак, а пасьля, калі мы ўсталі з-за стала, яна, выразна ўзважваючы кожнае слова, сказала: «Я мушу вам гэта паказаць. Ён прасіў, каб я гэтага не рабіла, але я мушу. З гэтым трэба нешта зрабіць, гэта не павінна тут заставацца. А ў мяне самой сілаў няма».

Мы трое - пастарава ўдава, мой бацька ды я - ідзём сьцежкаю праз падворак, пасьля за адрыну, праз гушчэчу пустазельля. Мы ідзём гужам праз алешнік, па падмоклай глебе, сярод стрэлак і камароў, сярод залатакрылых мухаў, якія ўздымаюцца зь лісьця папараці й высокіх сьцяблінаў травы; ідзём усё ніжэй, сярод струменьчыкаў вады, туды, дзе на самым беразе возера стаіць рыбацкая хаціна з тоўстых гарбылёў, укрытая ў цені дрэваў і трысьнягу. «Гэта тут, - кажа ўдава. - Я туды не пайду, не. Пайду дадому». Яна хутка паварочваецца, бяжыць і зьнікае, пераскокваючы з купіны на купіну.

Я пачуў музыку. Не, яна плыла не зь сярэдзіны хацінкі. Я стаяў на даху вежы, а мэлёдыя выплывала з-пад маіх ступакоў, недзе зь ніжэйшага паверху. Флейта? Бубен? Гітара? Тамбурын?

Зацікаўлены, я сышоў долу, прамінуўшы два паверхі, ужо пустыя. Унізе шчыльны натоўп атачаў танцорак - тых, якіх я ўжо бачыў. Аднак сярод іх я заўважыў і новую постаць. Гэта быў маладзён, убраны ў строй з Кноса: дзявочага выгляду, з фантастычнай фрызурай, у пурпуровай кароткай туніцы, з-пад якой выглядалі яго гладкія, бліскучыя й загарэлыя ногі.

- Гэта Гоўгі, - пачуў я шэпт Молі. - А ты дзе згубіўся?

- А дзе Г'ю? - спытаў я гэтак жа ціха.

- Ох, ён ізноў напіўся й ванітуе недзе на пляжы. Хутка ня

вернецца. - У шэрым ад тытунёвага дыму й густым ад выпарэньняў віскі паветры сылюэты танцораў, здавалася, дасягнулі надзвычайнай лёгкасьці. - Табе падабаецца? - ізноў ціха спытала яна.

- Зразумела, - адказаў я. - Гэта нейкі сымбаль?

- Не, гэта толькі забава, звычайная забава. Калі яны скончаць, мы ўсе, як штогоду, паедзем на выспу Мэльд. Паплывеш з намі?

- Выспу Мэльд?

- Так, мы там назіраем з скалаў усход сонца. Гэта фантастычна! Фантастычна! А пасьля сьнедаем у доме Скота.

- А хто такі Скот?

- Мільянэр і сябра Гоўгі. Ён за ўсё гэта плаціць.

- Гэта й сапраўды фантастычна, - сказаў я.

Пальцы Молі лёгка дакрануліся да маёй далоні. Але ў мяне не было жаданьня плыць на Мэльд ці на якую іншую выспу. Я адчуваў, як стома й санлівасьць агортваюць усё маё цела. Ад самой думкі пра марское падарожжа я адчуў млявасьць. Таму, калі ўся грамада пацягнулася ў кірунку пляжу да невялікага молу, я спытаў у яе, як дабрацца адсюль да гораду.

- Паехалі з намі, - сказала яна. - Гэта ўнікальная магчымасьць.

- Як дайсьці адсюль да цягніка? - паўтарыў я.

Але Молі мне не адказала. Сьмеючыся, яна пераскочыла трап і адной з апошніх трапіла на палубу маторнай лодкі «Манан». Я не заўважыў нават, ці быў сярод іх Г'ю, ейны шматслоўны сябра. Аддалі швартовы, і ахутаная радаснымі вокрыкамі лодка адплыла ад берагу.

Я пайшоў па пляжы, не азіраючыся.

- Г'ю! - закрычаў я. - Г'ю! Дзе ты, хлопча?

Але на мой голас ніхто не азваўся. Я прамінуў пляжную кабіну з надпісам *«Men only»* і дапісаным ніжэй *«Women Welcome!»*. Я прайшоў паўзь некалькі велічэзных валуноў і пачуў лагодны плёскат хваляў вакол іх. Пачынаўся адліў.

Я йшоў далей, а горкі пах мора няспынна йшоў за мною, і хаця вакол не было ні пяшчаных выдмаў, ні бурштыну, адно камяні, жвір і скалы, хаця гэта было не Балтыйскае мора, якое часам называюць Усходнім, я падумаў, што менавіта тут калі-небудзь мог бы паставіць сваю хацінку дзед Караль, прадавач фаервэркаў, памочнік фатографа, хімік і пераможца.

Так, гэта магло здарыцца пры драбочку шчасьця, але нам ніколі ня шчасьціла, нам усім, усе гэтыя гады, і я зразумеў гэта ўжо тады, калі рыпнулі дзьверы рыбацкай хаціны, а нашыя вочы пабачылі гэты надзвычайны від: сярод пілаў, напільнікаў і сьвярдзёлкаў, сярод выгнутых бляхаў і куткоў, на жалезных падпорках спачываў ільсьняны корпус, падобны да старых ангельскіх субмарынаў - менавіта такі самы, толькі меншы, яўна разьлічаны на адну асобу. «Гэта немагчыма… - шаптаў бацька. - Гэта немагчыма. Як гэта ён?.. Адкуль?.. Калі?..» Ягоная далонь асьцярожна лашчыла заклёпкі, пяшчотна гладзіла корпус і шрубу, з асьцярогай дакраналася да кіля й прасьлізгвала па зварных швох. «Гэта немагчыма… - шаптаў бацька, зачараваны гэтым адкрыцьцём. - Ён сам мусіў зрабіць праект, вылічэньні! Сам - здабыць столькі частак! Скуль у яго такарны станок, скуль?»

Але дзед Караль ляжаў у доме пастарскай удавы й ня мог адказаць, ня мог выступіць на прэс-канфэрэнцыі, а мы далей вывучалі яго карабель, ужо зь сярэдзіны, усё больш захапляючыся. Ён ні пра што не забыўся! Усё было дасканала прадумана й зроблена: падвойныя рады баляставых камэраў, уваход у рубку, паліўныя бакі, мэханізм нажнога раскручваньня шрубы - падобны да роварных понажаў, кішэні для харчу, лямпачка над пляншэтам, раскладны фатэль, разьмеркавальная дошка, запасныя акумулятары, - усё, нават пэрыскоп з воданепранікальным рукавом. Пад слоем пяску й пілавіньня ў хацінцы знайшліся рэйкі, што вялі да самай вады, глыбокай у тым месцы адразу ля берагу. «Паглядзі, - сказаў

бацька, - гэтыя падпоркі маюць шрубы для колаў». І насамрэч, празь некаторы час знайшліся колы, а таксама сьліп, схаваны ў кустах, і жалезная ліна. «А калі б хто-небудзь данёс… - шапнуў бацька. - Мы мусім зрабіць гэта хутка, разумееш?»

Я разумеў. Спачатку трэ было адчыніць затворы баляставых камэраў, пасьля заблякаваць стырно, вызваліць лодку з стапэляў, сьпіхнуць корпус у ваду, запусьціць рухавік і выскачыць. Гэта заняло ня больш за пятнаццаць хвілін. Ільсьняная цыгара, пырхаючы на павольных абаротах рухавіка, аддалілася ад берагу на трыццаць мэтраў, занураючыся ўсё глыбей, пакуль нарэшце цудоўны твор дзеда Караля, плод ягонага генія, у булькаце й цурчэньні ня зьнік пад гладка-зялёнай паверхняй. Мы яе зьнішчылі, дакладней - паслалі на дно возера. «Ты лічыш…» - запытаўся я ў бацькі, калі мы вярталіся ў дом пастаравай удавы. «Ня ведаю, - адказаў ён. - Гэтая рака ўпадае ў Віслу, і яна досыць глыбокая». Гэта ўсё, што ён сказаў на гэтую тэму. Ён больш ніколі не казаў ні пра Выдрвіты, ні пра падводную лодку. Але ж калі часам па радыё мы чулі паведамленьне пра нарвэскі ф'ёрд, у якім была заўважана савецкая падводная лодка, ён нэрвова выключаў прыймач і выходзіў на кухню паліць.

Я павярнуў з узьбярэжжа на нейкую невялічкую вулачку й, крочачы наўздагад, дайшоў нарэшце да станцыі ля Самэргіл-Роўд. Я быў змучаны амаль да непрытомнасьці. Купіў у аўтамаце білет і сеў на першы цягнік, які ехаў да гораду. Адразу, як толькі цягнік рушыў, я заснуў, і толькі лёгкі дотык да рукава (ня ведаю, колькі прайшло часу) вярнуў мяне да рэчаіснасьці. Перада мною стаяў кандуктар альбо нехта з чыгуначнай абслугі, так ці іначай ува ўніформе, і гаварыў нешта, чаго я ня мог зразумець.

- Гэта вашае? - ён патрасаў блакітным прастакутнікам. - Гэта вы згубілі? Гэта ляжала на падлозе, вось тут. Гэта вы згубілі?

Зь зьдзіўленьнем я пазнаў плян гораду. Няма сумневу, што гэта быў мой экзэмпляр, з трошкі падрапаным краем, з глыбокай расколінай у лякавым пакрыцьці, якая рыскаю бегла па вокладцы.

- Так, - адказаў я, - гэта мой плян. Але я згубіў яго ўчора папоўдні. Ці магчыма гэта?

Чалавек ува ўніформе прыўзьняў шапку, пачухаў за вухам і сказаў:

- Такое здараецца. Але не на гэтай лініі, - і ўсьцешана адышоў.

- Гэта якая станцыя? - крыкнуў я ўслед. - Якая наступная?

- Пірс-Стэйшн, - адказаў ён. - Ужо хутка.

Канечне. Цягнік тармазіў, і за акном я ўбачыў надпіс «Пірс-Стэйшн». Я выйшаў і сходамі пайшоў уніз, на выхад.

Сьвітала. Я сьціскаў у руцэ плян гораду. Без сумневу, гэта быў мой экзэмпляр, але я не глядзеў у яго. Я ўжо ведаў, што калі пайду ў правы бок, цераз мост траплю на Эдэн-Куэй, адкуль ад'ежджае патрэбны мне аўтобус. А калі пайду ўлева, дайду да касьцёлу Сьвятога Андрэя, што на Ўэстланд-Роўд, зайду ў сярэдзіну і ўбачу сьвечкі, людзей, што моляцца, і мужчыну зь сьпісам памерлых у руцэ і зноў - абавязкова - згадаю дзеда Караля. Пасьля вазьму аркуш, паразмаўляю з ксяндзом, дам кляшару пяцьдзясят пэнсаў і ледзь ня траплю пад зялёны фургончык з надпісам *«Live Cockles and Mussels»*. Ці павінна было паўтарыцца ўсё гэта?

Але я ня збочыў ні ўправа, ні ўлева, я пайшоў проста да будкі з надпісам «тэлефон», ля якой пачынаўся шэраг таксовак.

У пансіянаце я праспаў тры гадзіны. Прыняў душ, зьеў сьняданак і паехаў на аўтобусны вакзал. Там я набыў білет да Голуэй. Да ад'езду было шчэ трохі часу, я выпіў кавы й, жадаючы запаліць цыгарэту, пацягнуўся ў кішэню, але замест пачку «Сілк Гут» выцягнуў паперку й канвэрт. Я ўжо не чытаў зьместу. Спакойна, не задумваючыся, наўскос усіх пустых лінеек напісаў: «Мой дзед Караль, капітан затопленай лодкі». Я паклаў у канвэрт банкноту, пацалаваў ліст, старанна склаў яго й таксама паклаў у канвэрт; заклеіў і кінуў у паштовую скрынку. А калі аўтобус, паўзучы ўверх па Ліфі, прамінаў прадмесьці, калі праз шыбу я бачыў ужо глыбокае, цёмнае

зяленіва лугоў, я прамовіў:

- Цяпер я пакідаю цябе ў гэтым горадзе, цяпер ад'яжджаю спакойны, бо ведаю, што ты ня пойдзеш за мною.

Пераклала з польскай Марына Шода паводле: Paweł Huelle. Opowiadania na czas przeprowadzki. Gdańsk: słowo/obraz terytoria, 1999.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]

Ані Жаліф
Беларуская прыгода

ЦУДОЎНАЕ ЛЕТА

1
[…]

У сьпякотны дзень 22 чэрвеня 1992 году за рулём службовага «Рэно-21», запоўненага разнамасным грузам - акрамя жонкі, сабакі й некаторых асабістых рэчаў, неабходных для спакойнага пераезду на сталае месца жыхарства, у машыне вандруе «джэнтэльмэнскі набор для выжываньня», якім майго мужа забясьпечыла роднае міністэрства, а менавіта: друкавальная машынка, два пачкі паперы і канвэртаў (непрыдатных для ўжываньня, бо на іх красуецца штамп «Ambassade de France en Bielorussie» - міністэрства яшчэ не прыстасавалася да новае назвы краіны - Belarus), факс (не аўтаматычны), сэйф, караткахвалевы прыймач (каб можна было праз шумы лавіць Міжнароднае францускае радыё), штандар Францускай Рэспублікі і торба з 10 000 даляраў дробнымі купюрамі, на якія пасольства мусіць пражыць да моманту пераходу на больш цывілізаваныя формы разьлікаў, што арганізуюцца па меры паўставаньня мясцовых банкаў (цяпер яны акурат ствараюцца), - Клёд трыюмфальна едзе ў Менск, дзе

АНІ ЖАЛІФ жонка першага пасла Францыі ў Рэспубліцы Беларусі Клёда Жаліфа. Яе жывыя і шчырыя ўспаміны пераносяць нас у нядаўнія, але ўжо добра падзабытыя гады, калі Беларусь яшчэ толькі-толькі паўставала ў якасьці незалежнай дзяржавы, а ў сталіцы краіны толькі пачыналі

ён ужо пабываў для ўручэньня даверчых лістоў (30 студзеня) і пражыў тры тыдні ў кампаніі партатыўнага кампутара, які падтрымцы гандлёвага дарадцы, які атабарыўся ў гатэлі Беларусі першы. (Дарэчы, Упраўленьне замежнага гандлю, якое зацікавілася Беларусяй першым, першае ж і спыніла сваю прысутнасьць у гэтай краіне пяцю гадамі пазьней.)

Мы радасна перасякаем Буг, потым Нёман, і марым і летуценім, і мроім. Шаша Берасьце-Менск-Масква цягнецца за гарызонт, яшчэ не разьбітая фурамі, як гэта будзе пазьней. Вакол зелянеюць паплавы, нягледзячы на пякельную гарачыню, адхоны брыняюць дзікім лубінам, фіялетавыя разлогі якога падшываюць цёмную грамаду бароў, пранізаных сюд-тут промнямі бярозаў ці шнурамі дубочкаў або разлогімі галявінамі, на якіх раскіданыя калгасы.

Трэба сказаць, што пасьля перасячэньня польскай мяжы ўвесь пэйзаж раптам рэзка мяняе прапорцыі. Без сумневу, - вынік калектывізацыі. Але можна цешыць сябе думкамі, што Гісторыя, якой бы трагічнай яна ні была, - гэта толькі эпіфэномэн геалёгіі, што стварыла гэтыя бяскрайнія раўніны далёкага эўрапейскага Ўсходу.

Урэшце мы выходзім з мэдытацыі, якой спрыяюць гэтыя шырокія абсягі, бо набліжаемся да Менску, сталіцы Беларусі і Садружнасьці незалежных дзяржаваў.

Першая прыкмета часу: пасты ДАІ, перад якімі мы паводле звычкі, якая засталася ў нас з часу Клёдавай працы ў Савецкім Саюзе, зьніжаем хуткасьць, амаль усе стаяць пазачыняныя; некаторыя нават ужо ператвораны ў гандлёвыя кропкі - гэтая тэндэнцыя ўзмоцніцца ў наступныя гады, а пасьля саступіць месца зваротнай з прычыны росту злачыннасьці на магістралях.

Нарэшце - Менск. Мы збочваем з Маскоўскае шашы, якая калісьці разразала горад на дзьве паловы вялізнай траншэяй Ленінскага праспэкту, а цяпер яго мінае.

Іншы знак часу: галоўная артэрыя гораду зьмяніла сваё імя на імя Францішка Скарыны, але бронзавы Ленін (як знак зь мінулага ці прароцтва на будучыню) па-ранейшаму вітае народ

трэцяй
перашкаджаюць
замежныя
дыпляматычныя
місіі. Згадкі
таксама
цікавыя
ракурсам,
пад якім
аўтарка
разглядае
Беларусь.
Анна Халіф
была
прыватна
знаёмая з
палітычным
і
культурным
бамондам
тых гадоў.
Урывак з
кнігі
«Беларуская
прыгода» і
друкуецца
са скаротамі
з ласкавае
згоды
аўтаркі і
выдавецтва.

перад Домам Ураду. Мы ўяжджаем у Менск: пушча раптоўна пераходзіць у «горад Сонца» - савецкія панэльныя мікрараёны.

Прадмесьцяў няма. Прынамсі, тады іх не было. Празь некалькі месяцаў вырастуць першыя «катэджы»: готыка-маўрытанскія «паляўнічыя хаткі», баварскія замкі, уціснутыя на мікраскапічныя «дачныя ўчасткі», адзін на адным, абы-як, зь недабудаванымі пад'язнымі шляхамі й каналізацыяй, - і будуць тануць у брудзе дзевяць месяцаў у год. Для гаспадароў многіх зь іх такі будынак - мара жыцьця, а на мару не шкадуюць мармуру і пліткі. Потым, калі справы пойдуць горш, гэтыя людзі вымушаныя будуць, хоць сэрца рвецца, здаваць свае тварэньні ў арэнду Крэзам з іншаземных абласьцей, спрабуючы не спускаць з сваіх сядзібаў вачэй на падставе дапамогі новым жыхарам.

Дарожны рух не інтэнсіўны. Сям-там грузавікі, яшчэ менш прыватных аўтамабіляў - старых «Волгаў» ды «Жыгулятаў». Пакуль што. Бо неўзабаве пакоцяцца па Менску прыгожыя заходнія машыны, скрадзеныя на вуліцах нашых гарадоў і перапрададзеныя як патрыманыя, а потым ужо зьявяцца й навюткія «Мэрсэдэсы» апошняй мадэлі ды розныя іншыя «Фэрары». Праз тры ці чатыры гады праспэкт Скарыны ўжо будзе славіцца сваімі заторамі! Як і патынкаванымі ды падфарбаванымі ў шэрбэтавы колер фасадамі сваіх сталінскіх і пасьляталінскіх будынкаў, не пазбаўленых архітэктурнай цікавасьці (што пацьвердзіць мне праежджы французскі архітэктар) для таго, хто здольны абстрагавацца ад іх пампэзнай манатоннасьці. Пакуль што фасады выглядаюць блякла і лупяцца. Ходнікі, абсаджаныя дрэвамі, лопаюцца пад ціскам каранёў; праезная частка - у выбоінах, што засталіся зь зімы.

Мала «цыбулінаў». Па-першае, таму, што Менск быў разбураны на 80 працэнтаў падчас вайны, - пра гэта нагадваюць усе даведнікі, - а Сталін выкарыстаў гэта, каб высадзіць у паветра ўсю рэшту. Па-другое, некалькі цэркваў, якім пашчасьціла захавацца, блізкія стылем да польскага барока (як амаль усе беларускія цэрквы ўвогуле).

Вось, дарэчы, адна зь іх - на схіле ўзгорка, у сэрцы старога

Менску, што ўзвышаецца над велізарным зялёным масівам Парку Горкага, разьбітага пасьля вайны на месцы руінаў абапал рэчкі. Гэта праваслаўны Сьвятадухаў сабор, ён акурат рэстаўруецца. Празь пяць год мы пабачым, што гэтыя рэстаўраваныя, а хутчэй, старанна адбудаваныя з нуля цэрквы будуць расьці як грыбы пасьля дажджу…

Іншая спроба аднавіць мінуўшчыну - Траецкае прадмесьце ў падножжы катэдры, уздоўж якога мы цяпер крочым. Яго псэўдалітоўскія шчыпцы адбіваюцца ў луцэ Сьвіслачы, якую хітрамудрая запруда ператварыла ў возера.

І вось насупраць - на іншай гары - высіцца мэта нашага падарожжа: трохкрылая вежа гатэлю «Беларусь». На дванаццатым паверсе гэтага гмаху ёсьць пакой, дзе вусень амбасады будзе плесьці слой за слоем свой кокан і адкуль праз два гады трохкаляровы матылёк вылеціць на Пляц Волі.

2
[…]

[У гатэлі] Клёд цягне мяне да батарэі ліфтоў. Яму ня церпіцца прадэманстраваць мне нашае новае жытло. Часы мо і зьмяніліся, але няўхільная «дзяжурная», разьмеркавальніца бялізны, туалетнай паперы ды іншых жыцьцёвых выгодаў, па-ранейшаму стаіць на варце ключоў і маральнага аблічча кліентаў…

Рэзыдэнцыя пасла Французскай Рэспублікі аказваецца даволі прасторным нумарам-люкс з вокнамі на поўдзень, зь відам на Сьвіслач і з гарантаваным сонцам.

Вітальня зь сьценнай шафай і гардэробам, дзе я часова магу скласьці бялізну, пераходзіць у падвойны пакой, сталовая частка якога служыць кабінэтам. Спальні ў глыбіні апартамэнтаў наканавана стацца маім бярлогам, дзе я буду спрабаваць хавацца, пакуль я нікому не патрэбная. У нашай рэзыдэнцыі ёсьць таксама калхозная іржавая лазенка, а таксама каморка (якая спачатку будзе выкарыстоўвацца як істопка, а

потым як шыфравальня!) і супэрлюксус - балькон.

Нахіляюся зь яго: пад мною лунае турэцкі сьцяг. Гатэль «Беларусь» стаўся дыпляматычным анклявам, дзе ўжо атабарыліся нашыя турэцкія і кітайскія калегі і, разам зь імі, эмбрыён дыпмісіі ЗША. У найбліжэйшым часе да нас далучацца італьянцы, у той час як немцы аддадуць перавагу «Кастрычніцкай». Трэба сказаць, што «Беларусь» - гэта таксама прыстанішча шматлікіх чорнавалосых, шумных і крыклівых «бізнэсоўцаў», хутка ахрышчаных намі як «каўказкая мафія». Мне часта будзе ніякавата, калі, выконваючы амаль штодзённую місію абмену пэўнай сумы нашых даляраў на расейскія рублі, што па-ранейшаму знаходзяцца ў абароце, альбо на «зайчыкі», я буду вымушаная езьдзіць у ліфце разам з гэтымі бамбізамі і прыціскаць да сэрца ёмісты поліэтыленавы пакет з купюрамі.

Але пакуль я шчэ й не здагадваюся аб тым, якія нялёгкія заданьні мяне чакаюць, і сьвяткую нашае прыбыцьцё разам з мужам і Бэрнарам, гандлёвым дарадцам, які з гэтай нагоды падняўся з свайго сёмага паверху з бутэлькаю мясцовага шампанскага…

[…]

4

Цымбалы, дудкі, віёлы, дуды ды іншыя сьвірэлі «Харошак» будуць гучаць пры канцы нашага побыту ў Беларусі, а пяцьцю гадамі раней яны суправаджалі нашае першае афіцыйнае мерапрыемства. 27 ліпеня [1992] Беларусь склікае зародкі дыпляматычнага корпусу на сваё першае нацыянальнае сьвята, якое ў найлепшых мясцовых традыцыях распачынаецца канцэртам. Сцэна тэатру, дзе мы сабраліся, упрыгожаная новымі бел-чырвона-белымі сьцягамі ды новым гербам краіны - «Пагоняй». Гэтую спадчыну Вялікага Княства Беларусь дзеліць зь Літвою. Шмат прамоваў. Яны прамаўляюцца па-беларуску, а я пакуль яшчэ слаба разумею гэтую мову, але іх нацыяналістычная скіраванасьць відавочная. Яна яшчэ больш падмацоўваецца пэрыядычнымі воклічамі «Жыве Беларусь!», што нясуцца з залі, у прыватнасьці ад групкі моладзі на

галёрцы.

[…]

Толькі калі на сцэну вылецеў ансамбль «Харошкі», я трохі адчула сябе ў рытме сьвята. Адзін з шматлікіх фальклёрных гуртоў, кормленых і прапагандаваных савецкім рэжымам? Не, бо розьняцца ад гэтых апошніх сваёй маладосьцю, запалам, добрым кантактам з публікай, арыгінальнасьцю строяў - белыя кашулі зь лёну, па-сялянску вышытыя чырвоным, камзолы і футры, стылізаваныя пад эпоху Адраджэньня, - а таксама арыгінальнасьцю танцаў, старадаўніх інструмэнтаў і навукова рэканструяванага музычнага рэпэртуару. Іх песьні надзіва падобныя да нашых старафранцускіх - ці не прыйшлі яны з Захаду праз Польшчу?

Лепш за ўсе сьцягі й прамовы яны сьведчаць мне пра беларускую спэцыфіку, да разуменьня якой я яшчэ толькі набліжаюся.

Прыём пасьля канцэрту адбываецца на тэрасе вялікага салёну, сьцены якога ўпрыгожаныя выявамі блакітна-залатога Фэнікса (іншая эмблема Беларусі? Не бяз мудрасьці…). Гаспадароў хвалюе, ці падабаецца нам. «Вы ведаеце, Менск не сапраўдная сталіца, гэта ўсяго толькі правінцыйны горад», - паўтараюць нам раз-пораз зь нейкай двухсэнсоўнай настальгіяй. Цяжка зразумець, ці такім чынам выказваецца жаль па згубленай мэтраполіі, ці жаданьне атрымаць запэўніваньні ў сталічным статусе Менску. А можа, і адно, і другое адначасова?

Клёд знаёміць мяне з Станіславам Шушкевічам, старшынём Вярхоўнага Савету. Ён зьяўляецца кіраўніком дзяржавы згодна з Канстытуцыяй, атрыманай у спадчыну ад савецкіх часоў і толькі трохі перароблена пад патрабаваньні моманту. Разам з Краўчуком і Ельцыным Шушкевіч - адзін зь «белавескіх зуброў», як іх называюць іхныя праціўнікі, якія ў пушчы пад назваю Белавеская паставілі крыж на Савецкім Саюзе.

Крыху зьбянтэжана набліжаюся я да яго. Але «зубр» аказваецца вельмі жывым, сардэчным і зычлівым чалавекам, у чым мы яшчэ часта будзем мець магчымасьць пераканацца,

сустракаючыся зь ім і ягонай цудоўнай жонкай, і кожная сустрэча будзе вялізнай асалодай. Ён адразу разьвеяў маю няўпэўненасьць заўвагаю, што яму здаецца, быццам я, як і ён сам, аддаю перавагу гарэлцы перад мясцовым шампанскім. Пасьля высокадыпляматычных размоваў Шушкевіч аддаўся ўспамінам пра свой афіцыйны візыт у Парыж у красавіку гэтага году (Клёд тады яго суправаджаў) і пра чароўны начны шпацыр уздоўж Сэны…

[…]

[Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музэю Юры Карачун] быў настолькі ласкавы, што ў хуткім часе пасьля майго прыбыцьця зладзіў мне экскурсію па «надземнай» частцы ягоных калекцыяў. Гэта было й нагодаю паскардзіцца на цеснасьць музэйнага будынку, якая асуджае дзевяць дзясятых збораў на марнаваньне ў сутарэньнях. Музэй выходзіць фасадам на вуліцу, якая дасюль называецца вуліцай Леніна. Яго залі разьмяшчаюцца вакол атрыюму з калёнамі, які, дзякуючы сваёй акустыцы, акажацца прыдатным для канцэртаў камэрнай музыкі. Малая заля на першым паверсе прызначаецца для часовых экспазыцыяў, таксама як і галерэя на другім паверсе, над атрыюмам. Сёньня там выстаўленыя беларускія пэйзажы. Так я знаёмлюся з тутэйшымі восеньскімі лясамі, засьнежанымі бярозамі, балотамі і палеткамі лёну… Месца ў залях сталай экспазыцыі, якія выходзяць на галерэю, пароўну падзеленае паміж творамі мясцовых і расейскіх мастакоў. Карцінаў замежных аўтараў няшмат. Сярод іх - пэйзаж Юбэра Рабэра, аўтапартрэт мадам Віжэ-Лёбрун і чароўны жаночы партрэт пэндзля Жэрара. Ёсьць тут таксама некалькі французскіх скульптураў, арыгінальных альбо ў копіях: фаўн Клядыёна, бюст Кановы, бакханка Карпо ды Ўдонаў Вальтэр.

Я буду часта вяртацца ў гэты музэй, дырэктар якога аплаквае яго «правінцыйнасьць» і наракае на маскоўскі цэнтралізм: расейская сталіца рэгулярна пазбаўляла яго найбольш цікавых экспанатаў. Я буду туды вяртацца, каб прайсьціся па беларускай сэкцыі. Яна чаруе мяне характэрным суседствам іконаў у руска-бізантыйскім стылі з абразамі, у якіх прасочваецца польскі ўплыў, больш рэалістычнымі й больш

наіўнымі, падобнымі да абразоў з брэтонскіх касьцёлаў. Яна прыцягвае сьвежасьцю сармацкіх партрэтаў XVII стагодзьдзя, настальгічнай пяшчотнасьцю пэйзажаў XIX стагодзьдзя, пошукамі сучасных мастакоў, якія толькі дасьледуюць шляхі, ужо пройдзеныя ў нас. Асабліва мяне падкупляе Жукоўскі й ягоны «Інтэр'ер», дзе на сьветлай мэблі ў стылі Карла X іграюць залатыя блікі сьвятла і адбіваюцца цені дрэваў з навакольнага саду. Ну й потым, чагосьці вартая й расейская сэкцыя. Сярод іншага тут можна знайсьці творы Брулова, Заранкі, Верашчагіна, Куінджы (у тым ліку й ягоныя бярозы), Сярова (лілеі), Левітана, Урубеля ды Рэпіна, які жыў пэўны час у Беларусі, каля Віцебску.

І вось у канцы жніўня, у апошні дзень гэтага цудоўнага вакацыйнага лета, мы выбіраемся ў Віцебск, дзе нас чакае малады мясцовы дэпутат Сяргей Навумчык, адзін з галоўных памочнікаў Зянона Пазьняка, лідэра Народнага фронту […].

Фігура Пазьняка, у якім ёсьць штосьці ад Саванаролы, не выклікае зь першага погляду інтэнцыяў да фамільярнасьці (праўда, потым акажацца, што ён нашмат больш чалавечны, нават прыемны, у асабістых адносінах). Затое мы вельмі хутка сышліся з Навумчыкам і ягонай чароўнай жонкай Галінай, таксама, як ён, журналісткай і актывісткай тае самае партыі.

[…]

Вечар у Віцебску мы канчаем у бацькоў Навумчыка фаршаваным гусаком і смажанай бульбай са шкваркамі. Нароўні з сардэчнасьцю і гасьціннасьцю беларусаў, нас уражвае вольнасьць іх размоваў. З нашага побыту ў СССР мы захавалі стары рэфлекс імкнуцца не дазволіць нашым суразмоўцам сябе скампрамэтаваць, і таму менавіта Клёд, напрыклад, абараняе былую сыстэму адукацыі, што, здаецца, не падабаецца маці Сяргея, старой настаўніцы. Мы таксама крыху зьдзіўленыя цікавасьцю, якую Сяргей праяўляе да асобы Напалеона. Але ён тлумачыць нам, што Пазьняк лічыць паразу кампаніі 1812 году няшчасьцем, якое больш чым на стагодзьдзе спазьніла незалежнасьць ягонай краіны.

Гаворка зь Бярэзінскага разгрому пераходзіць да Чарнобылю.

Галіна апавядае мне, што шмат маладых жанчынаў пабойваюцца мець дзяцей, бо баяцца прыроджаных калецтваў… Гэта мой першы кантакт з жорсткімі наступствамі гэтае трагедыі й псыхозам, які яна выклікала ў грамадзтве.

[…]

5

Гляджу тэлевізар. Мясцовы канал трансьлюе свае перадачы ў асноўным і прынцыпова па-беларуску (што зусім не палягчае мне яго прагляд). Пустоты паміж перадачамі ён запаўняе з дапамогай фальклёрных пастановак і тэленарысаў зь вясковымі краявідамі. Танна ж гэта яму абыходзіцца, трэба думаць. Праграмы навінаў вельмі правінцыйныя і яшчэ савецкія па стылістыцы: весткі з палёў чаргуюцца з справаздачамі аб парлямэнцкіх дэбатах, да гэтага дадаецца жменька замежнай інфармацыі, праілюстраванай стоп-кадрамі, сьцягнутымі, верагодна, з CNN праз Маскву. Нясьмела пачынае пашырацца рэкляма, яна ўсхваляе «заходнюю мару»: вітамінізаваныя напоі, жавальныя гумкі, машынкі для лічэньня даляраў, кампутары і г. д. Фірма «OLMI», якая станецца адной з наймагутнейшых, пакуль толькі распачынае сваю дзейнасьць. У хуткім часе яна абсталюе большасьць прадпрыемстваў сваёй тэхнікай, і я хутка пабачу ў крамах электронныя касавыя апараты, але магазыншчыцы, нягледзячы на гэта, будуць спраўджваць рахункі на надзейных драўляных «счётах». Ідуць таксама расейскія каналы, навіны на іх нашмат больш інфарматыўныя, дый расейскую мову я разумею лепш. На вялікую радасьць, паказваюць сэрыю перадачаў пра Бальшой тэатар часоў яго росквіту. Акурат для мяне: вечары Плісецкай, Васільева і Максімавай!

[…]

Я люблю гатэльнае жыцьцё: ня трэба ні хадзіць па закупы, ні гатаваць, ні прыбіраць. «Дзяжурная» мяняе бялізну. Перакусваць можна ў «буфэце», вячэраем у «рэстарацыі».

Праўда, буфэт адчыняецца толькі а 9-й раніцы, дый «кілбаса»

(тыпу сардэлек), вэнджаная рыба і нават ікра (асабліва на сьняданак) хутка надакучваюць.

Рэстарацыю, адносна спакойную ўдзень, немагчыма наведваць увечары, бо яна робіцца нязноснай праз аркестар і музыку, ад якой увушшу зьвініць. Дый мэню ўражвае толькі на першы погляд. У рэальнасьці прапануецца толькі дзьве-тры варыяцыі на тэму «філе» (зь ялавічыны ці сьвініны) і «птушкі» (з замарожанай курыцы), а таксама «бэф-строганаў» ды «катлеты па-кіеўску», слава пра якія нашмат пераўзыходзіць іх рэальную вартасьць. Пазьней я з расчараваньнем буду вымушаная сьцьвердзіць, што прыблізна тое самае мэню вам прапануюць усе менскія рэстараны - магчыма, з прычыны дэфіцыту інгрэдыентаў, але хутчэй - ініцыятывы.

Таму я купіла электрачайнік і ўранку гатую гарбату сама. Хлеб набыць не праблема, а вось на масла ў мяне ўжо няма патрэбнага талёну. Да таго ж, слоік памаранчавага сочыва й скрынка гарбаты, прывезеныя з сабою, хутка апусьцелі. І, натуральна, у горадзе нічога падобнага здабыць немагчыма. Я з шкадаваньнем мару пра моцную чорную краснадарскую гарбату, якой не бракавала ў добрыя старыя часы (і, бадай, не адна я па іх настальгую…). На шчасьце, ёсьць калегі. Я спускаюся на паверх ніжэй і знаёмлюся зь Леміс, чароўнай жонкай пасла Турцыі, ды яе белым ангорскім катом. Мы спадабаліся адна адной, і яна падказвае мне краму, дзе толькі што зьявілася ў продажы сёе-тое з італьянскіх прадуктаў. Пратакольны візыт да «дуаенкі» дыпляматычнага корпусу прыносіць мне скрынку кітайскай гарбаты - кітайцы былі першымі дыпляматамі, якія атабарыліся ў Менску.

Застаецца вырашыць праблему вячэраў. Прычым любой цаной! Бутэрбродам з ікрою знаходзіцца альтэрнатыва. Мы празь вечар будзем вымушаныя варыць у чайніку спагеці. Зрабеце экспэрымэнт! Шумоўкі ў мяне няма, таму працэдура патрабуе віртуознасьці. Дапаўняем рацыён бананамі, што купляюцца на вагу золата на вачах ашалелага Генадзя [кіроўцы амбасады] у першых капіталістаў, якія выставілі свае першыя драўляныя кіёскі на ходніках праспэкту Скарыны.

Мне падабаецца. Але Клёд, які ў прынцыпе ня любіць гатэляў, стаміўся ад гатэльнага жыцьця і марыць як найхутчэй разьмясьціцца ў цяністым халадку дачы. Што ж нам у гэтым перашкаджае? Дастаткова набыць трохі неабходнай мэблі, калі Ке д'Арсэ згодзіцца панесьці выдаткі на яе. О цуд: яны згадзіліся. Вельмі добра. Засталося знайсьці мэблю.

Што да прадуктаў харчаваньня, то, як мы ўжо пабачылі, знайсьці іх ня так проста. А Беларусь жа краіна традыцыйна самадастатковая. Жаданьне кантраляваць узровень цэнаў прывяло да паўстаньня разьмеркавальнай сыстэмы і, як непазьбежны вынік, да дэфіцыту прадуктаў. Куды йдзе калгасная прадукцыя? Бо ж няможна сказаць, каб калгасы развалiліся, як у Польшчы ці краінах Балтыі: ім тут не пагражае ніякая прыватызацыя. Магчыма, у іх праблемы з пастаўкамі, але я таксама падазраю, што яны ня маюць дастатковай матывацыі і папросту складуюць прадукцыю ў чаканьні лепшых часоў.

Вось жа, крамы стаяць пустыя. На прылаўках ГУМу і ЦУМу бясконца паўтараюцца тыя самыя састарэлыя ці нікому не патрэбныя тавары. Нічога больш не прывозіцца з былога СССР і нічога яшчэ не прывозіцца з-за мяжы.

Я накіроўваюся ў «Дом мэблі» на Камароўцы, побач з Цэнтральным рынкам. Гэты рынак - растрывожаны вулей, дзе снуюць калгасьніцы і вулічныя гандляры, дзе прадаюцца горы як мясцовых прадуктаў, так і дароў Каўказу, дзе пах кіслай капусты і сьмятаны мяшаецца з водарам цэнтральнаазіяцкіх спэцыяў… Так было і так будзе. Але ў дзень, калі мы наведваем «Дом мэблі», Камароўка - толькі бляклы цень таго, што тут было раней, і таго, што я пабачу пазьней. Толькі радочак «баб» прадае вёдрамі вішні ды ягады, дзеці збываюць шчанюкоў і кацянятаў, а хмуры натоўп чакае на пачатак гандлю, гатовы ўкладаць грошы ўва ўсё і немаведама ў што. Тым ня менш, мне яны ўсьміхаюцца: у мяне на твары напісана, што я замежніца. Адкуль? З Францыі! Дык што ж я тут раблю?!

Побач «Дом мэблі» прэзэнтуе бліскучыя, яркіх адценьняў гарнітуры. Я спачатку пераборліва іх разглядаю, потым

спыняюся перад некалькімі больш сьціплымі мадэлямі. Гэты ложак мне добра падыдзе, гэты стол - таксама. Так, але яны не прадаюцца! Іх можна замовіць? А калі будуць дастаўленыя? Бог ведае… Гэта, сапраўды, сьвет падману і міражоў. Я праходжу паўз гэтыя дэкарацыі і заўважаю наборы крэслаў. А гэтае? Гэтыя чатыры крэслы - так. Генадзь выбірае іх, сядаючы для праверкі на кожнае па чарзе. А гэты невялікі сэрвант з хвоі? Невядома. Трэба запытацца ў дырэктара. Даводзіцца выцягваць дырэктара зь ягонага берлагу. Аказваецца, што за свае нават даволі сьціплыя пакупкі я не магу заплаціць наяўнымі; такая рэч, як чэкі, тут абсалютна невядомая; трэба рабіць пераказ з рахунку ў ашчаднай касе (якога я, натуральна, ня маю). Падупалая духам, я вяртаюся ў гатэль і распавядаю пра свае праблемы. На шчасьце, у нас ёсьць нашы Наташы [сакратаркі-перакладніцы]! Адна зь іх прапаноўвае мне свае паслугі ў якасьці «падстаўной асобы». Я згаджаюся. Доўгае чаканьне ў ашчаднай касе, каб атрымаць неабходныя паперы. Я сьціпла нуджуся ў аўтамабілі. Ізноў чаканьне, цяпер ужо ў краме. І вось нарэшце - перамога!

Той самы сцэнар пры пакупцы ўсіх іншых элемэнтаў абстаноўкі. Я лётаю па ўсім Менску, уздоўж і ўпоперак, у пошуках надзвычайных адрасоў, трасуся па разьбітых маставых і трамвайных рэйках разам з Генадзем, які лічыць сваім абавязкам прабачацца перад мною пасьля кожнай нашай няўдачы, а мне прыходзіцца яго суцяшаць, абяцаючы (лёгка ж мне абяцаць) надыход лепшых дзён. Здаецца, што ня я, а ён больш радуецца, калі нам удаецца знайсьці хоць што-небудзь: рондаль, настольную лямпу (нават з адпаведнымі лямпачкамі!) … І ягоная радасьць дасягае апагею, калі я прыходжу ў захапленьне ад кухоннай мэблі з хвоі (у вольным продажы!), якая не сапсавала б і каталёгу «IKEA».

Дарэчы, я даведваюся ад Бэрнара, што «IKEA» пачала пранікненьне на мясцовы рынак, дзе ёй ужо належаць некалькі невялікіх прадпрыемстваў. У адной з такіх сталярных майстэрняў, дзе, стаміўшыся ад непрыемнасьцяў зь дзяржаўнымі крамамі, я вырашаю замовіць ложкі, шафы і кніжныя паліцы для пакою, які будзе выкарыстоўвацца пад офіс, у мяне просяць прыслаць ім нейкі мэблевы каталёг, каб

ажывіць іхную фантазію.

Я адчуваю сябе як маладуха, якая рыхтуе пасаг…

Чаго нам яшчэ бракуе з абстаноўкі? Хатняй бялізны. Я па-добраму зьдзіўленая, што яе якраз-такі ўдаецца знайсьці бязь цяжкасьцяў. Ваўняныя коўдры, прасьціны, вышытыя наўлечкі - не «дэфіцыт», таксама як і падклады, сурвэткі й абрусы зь лёну - мясцовы гонар. Каштуюць яны сьмешныя грошы, і я думаю, зь якім посьпехам гэты тавар мог бы прадавацца ў нас. Але пра гэта падумаем пазьней.

Чаго нам не стае яшчэ? Посуду й сталовых прыладаў. А гэта ўжо зусім іншая справа. Што да посуду, тут праблемаў няма. Шкляная вытворчасьць, як і льняное ткацтва, - аздоба традыцыйнага промыслу, і крамы, за нястачай лепшага, запаўняюць свае прылаўкі яе вырабамі. Я набываю прыгожы графін і некалькі шклянак у «Бярозцы» (крама з продажам за валюту для іншаземцаў, спадчына савецкай сыстэмы) і па вяртаньні дадому заўважаю, што адна шклянка надтрэснутая. Вяртаюся ў краму: нуль шанцаў, гэтую мадэль даўно спродалі. Але нічога страшнага: прадавачка мае ў сябе дома такі самы сэрвіз. «Прыходзьце заўтра, - кажа яна мне, - я Вам падарую адну з маіх шклянак». Ці ж магу я адмовіцца?! Потым я буду часта сустракацца з гэтай мілай жанчынкай, якая бярэ недасьведчаную французанку пад сваю апеку і горда выконвае місію гіда па прылаўках, на якіх сувэніры для турыстаў паступова саступаюць месца імпартным таварам. Менавіта такім чынам я нарэшце здабываю шэсьць набораў сталовых прыбораў (італьянскіх), абабегаўшы ўвесь Менск і ўжо амаль прыгатаваўшыся есьці рукамі. Калі, натуральна, дапусьціць, што знойдуцца талеркі. Але тут я ўжо патрабую занадта: такія рэчы тут адшукаць абсалютна немагчыма. Закрануты за жывое Генадзь прапануе скарыстацца зь ягоных сувязяў: ён нібыта ведае некага на фабрыцы… Час ляціць, на календары ўжо пачатак жніўня, набліжаецца прадугледжаны дзень нашага пераезду на дачу, а мы па-ранейшаму ня маем ані званьня талерак. Ну нарэшце! За некалькі гадзінаў да першага «хатняга» абеду зьяўляецца пачырванелы ад гонару Генадзь з раскошным фарфоравым сэрвізам бэзавага з золатам колеру,

ад якога я прыходжу ў належнае захапленьне, нягледзячы на яго безгустоўнасьць.

У той самай «Бярозцы» я знайду пралку, імпартаваную таксама з Італіі. (Асабліва дынамічныя італьянцы будуць першымі заходнікамі, якія рызыкнуць зьявіцца на тутэйшым рынку і адчыняць у наступныя гады свае крамы, кавярні і рэстарацыі.)

[…]

Усё ці амаль усё гатова да нашага засяленьня. З дапамогаю швейнай машынкі й адрэзаў тканіны, якія я, з прычыны свайго качавога досьведу, далучыла да пярэстага зьмесьціва нашага самаходу перад ад'ездам, пасьпешна ствараю падвойныя шторы, каб засланяць тры агромністыя аконныя праёмы нашае будучае спальні.

Нарэшце, яшчэ адна важная справа: я набіраю абслугу. Дакладней, яна набіраецца сама шляхам кааптацыі. Генадзь прапануе мне паслугі сваёй жонкі. Жанна, чароўная бляндыначка з завітымі валасамі, ружавашчокая, зь вялікімі блакітнымі лялечнымі вачыма, працуе настаўніцай і, як шмат хто іншы наўкола, пакутуе ад інфляцыі, што зводзіць яе зарплату на нішто. Сарамлівая, старанная і сьмяшлівая, яна станецца цудоўнай пакаёўкай, але таксама й найлепшай сяброўкай.

Да таго ж, у Генадзя ёсьць прыяцель, напаўбеспрацоўны-напаўмастак, якога ён добра ўяўляе ў якасьці садоўніка. Чаму б не? Хаця спачатку Ваня зусім не разьбіраецца ў сваім новым рамястве, ён усім сэрцам аддаецца працы. Выпытваючы дзе толькі магчыма парады, ён хутка дасягае найінтымнейшага веданьня расьлін і рассаджвае іх з фантазіяй паэта. Ён прыходзіць першы і сыходзіць апошні, незалежна ад надвор'я. Узімку ён не баіцца самага лютага марозу. Адагрэўшыся каля вогнішча, на якім ён паліць хмыз, ён шуфлюе сьнег ды прыводзіць мяне ў жах, караскаючыся на стромыя дахі, каб вызваліць іх ад лядовай шапкі. Увесну яго грызуць камары, улетку ён смажыцца на сонцы, прыкрыўшы галаву шапкай з газэты. Увосень Ваня цягае вялізны мех з апалым лісьцем (такая рэч, як тачка, яшчэ невядомая ў гэтых краёх, але ня

пройдзе й трох гадоў, як ён дзесьці здабудзе-такі вазок - праўда, на чатырох колах…). Час ад часу ён, аднак, зьнікае да пары ў маленькай лазьні, зь якой ён зрабіў сабе бярлог, каб пагрузіцца ў мары… або маляваць (гэтага я ніколі не даведаюся). Але свайго працоўнага паста ён не пакідае ніколі, нават у выходныя і ў час вакацыяў ён часта выходзіць на працу, настолькі яму палюбіўся гэты сад.

Што датычыцца кухара, то мне яго рэкамэндавала асыстэнтка Бэрнара. Гэта сапраўдны прафэсіянал. Па сканчэньні гатэльнай школы ў Маскве Віктар дэманстраваў свае таленты амбасадару Савецкага Саюзу ў Банглядэшы, каб потым «пайсьці на спачынак» у рэстарацыю гатэлю «Плянэта». Такім чынам, ён мае пэўны досьвед «дыпляматычнай» кухні. Ён зусім нічога ня ведае пра французскую кухню, затое нашмат лепш за мяне арыентуецца ў нашых футбольных камандах, нашых фільмах і нашых акторах. А потым - хоць я цяпер замаўляю большасьць падставовых прадуктаў (якія ў звычайных крамах прадаюцца з абмежаваньнямі) у адмысловых магазынах для «намэнклятуры», - у шчасьліўца-Віктара ёсьць уласны аўтамабіль і ён можа займацца закупамі. Прыняты.

Ну вось і ўсе хатнія ў зборы - за выключэньнем дваіх кацянят, якіх мы прытулім некалькімі тыднямі пазьней, - і «Рэзыдэнцыя» гатовая да функцыянаваньня.

Цяпер - да працы!

ПІЯНЕРЫ

2
[…]

[Менскія] опэрныя пастаноўкі тояць для нас шмат сюрпрызаў: ад кепскіх - статычныя позы артыстаў, пыльныя касьцюмы й дэкарацыі - да прыемных - як, напрыклад, экспрэсіўная «Лэдзі Макбэт Мцэнскага павету» або сьціплая ў дэкарацыях і паэтычная «Травіята», дзе адзінае ўпрыгожаньне сцэны

заключаецца ў вялікім непаліраваным куфры, у вечку якога адбіваецца ўся драма. Альбо як раскошны «Князь Ігар» у пастаноўцы пецярбуржца Юр'я Аляксандрава - спэктакль, які ілюструе зьяўленьне мясцовых мэцэнатаў і аднаўленьне абменаў зь вялікім расейскім братам. (Абменаў, на адсутнасьць якіх увесь час наракае менская публіка.)

Што да галасоў, то яны таксама няроўныя. Мала прыгожых сапрана, за выключэньнем хіба Натальлі Кастэнкі. Мала добрых тэнараў, але кантральта і барытоны ў расейскіх опэрах проста бліскучыя (што праўда, у італьянскіх опэрах яны гучаць менш пераканаўча). Ну, і натуральна - некалькі выдатных басоў.

Аднаго зь іх уладальнікаў, Пятрова, мы прымаем сёньня вечарам, і на заканчэньне нашых вельмі братэрскіх вячорак ён скаланае тонкія пярэгарадкі нашае дачы, сьпяваючы нам на разьвітаньне.

Але я, як і большасьць беларусаў, аддаю перавагу балету, якім тут шчыра ганарацца.

Менскім балетам кіруе Валянцін Елізар'еў (як кажуць - жалезнай рукой). Елізар'еў атрымаў адукацыю ў Санкт-Пецярбургу, дзе быў вучнем, а потым супернікам Грыгаровіча, былога гаспадара маскоўскага Бальшога, ад якога ён хоча дыстанцыявацца за кошт большай сучаснасьці падыходаў. Аднак калі наш дарадца па культуры прывязе ў Менск трупу «Плезір д'офрір» («Задавальненьне прапанаваць») Мішэля Келеменіса, накіраваную МЗС у краіны Ўсходняй Эўропы, Елізар'еў вельмі крытычна, амаль шакавана, будзе скардзіцца мне на «непрымальны» бок іхных пошукаў і на адсутнасьць у іх «душы» - тут гэта канчатковы прысуд, які абскарджаньню не падлягае. Рэакцыя Елізар'ева ня будзе ні на кроплю спрыяльнейшай ні для Карыны Сапатра, ні для цудоўных Шмід-Пэрнэт, якія, нягледзячы на думку мэтра, прывядуць публіку ў захапленьне. Тую самую публіку, якая спачатку палохалася ўсяго, што здавалася ёй «авангардам».

У Елізар'ева бліскучая балетная трупа для вялікіх масовак, якія ён гэтак любіць. Ягоныя па-дэ-дэ і варыяцыі, часта лірычныя, калі-нікалі акрабатычныя, выконваюцца добрымі салістамі, на

жаль, вельмі нешматлікімі. Слабы бок менскага балету (і гэта прызнае сам кіраўнік) - адсутнасьць вялікіх танцоўшчыкаў. Ягоная зорка Захараў, на жаль, на маю думку, малавыразны, а таму яму цяжкавата дэманстраваць свой талент увесь час. Але на другі дзень па сваім прыбыцьці ў Менск я адкрыла для сябе ўва «Ўндзіне» «абсалютную прыма-балерыну» - Інэсу Душкевіч. Потым я буду адорваць яе аплядысмэнтамі ў ва ўсіх яе галоўных ролях - Адэты-Адылі зь «Лебядзінага возера», Джульеты й Жызэлі (увогуле, Душкевіч - найлепшая Жызэль з усіх, якія я калі-кольвек бачыла, такая пачуцьцёвая й крохка-грацыёзная).

Я мяркую, што свае найлепшыя пастаноўкі Елізар'еў ажыцьцявіў у 1980-х гадах у супрацоўніцтве з украінскім мастаком Лысікам, аўтарам арыгінальных і раскошных касьцюмаў і дэкарацыяў. Гэтымі пастаноўкамі былі «Стварэньне сьвету», «Тыль Уленшпігель», «Спартак» (які меўся пераўзысьці «Спартак» Грыгаровіча) і асабліва казачна чароўны «Шчаўкунок», у 1996 годзе паказаны ў Парыжы ў Палацы Кангрэсаў.

Аднак самымі амбітнымі елізар'еўскімі праектамі зьяўляюцца хіба «Карміна Бурана» (з удзелам опэрнага хору) і пастаўленая ў жніўні 1995 году «Рагнеда», дзеля экспартных патрэбаў пераназваная ў «Жарсьці». Апошняя прынесла свайму стваральніку атрыманы ў Парыжы прыз найлепшаму харэографу году - «Бэнуа дэ данс». Пад музыку Мдзівані, мясцовага кампазытара грузінскага паходжаньня, у спэктаклі апяваецца гераіня аднаго залежнага ад Кіева княства, якое стаяла ля вытокаў таго, што цяпер называецца Беларусьсю. Гэта надзвычай моцны й жорсткі твор, глядач якога бязьлітасна асуджаны на сцэны пажару, гвалту, разьні сярод бізантыйскага золата. Яму таксама прапануецца вобраз Хрыста з крыжам, здольнага абудзіць усіх старых няскораных дэманаў «славянскай душы» ды прапаведаваць прымірэньне паміж Кіевам і Масквою пад эгідай Менску. Паказальна, што прэзыдэнт Лукашэнка, чыёй запаветнай марай, як мы ўбачым пазьней, ёсьць усеславянскі саюз, уганаруе сваёй прысутнасьцю прэм'еру гэтай высакаякаснай дэманстрацыі беларускага нэамэсіянізму.

[…]

НАДВОР'Е ПСУЕЦЦА

4

[…]

Мы прымаем у сябе французскіх бізнэсоўцаў, якія прыяжджаюць вывучаць мясцовы рынак. Удаецца ім гэта калі лепш, калі горш. Вельмі частыя госьці - прадстаўнікі адной вялікай кампаніі, якая цікавіцца мясцовымі тэлекамунікацыямі («Алькатэль». - **Заўв. рэд.**). Але вынікам іхнай працы стаецца ўсяго толькі атрыманьне невялічкага «суцяшальнага» кантракту. А вось вядомы дом моды («Тэд Ляпідус». - **Заўв. рэд.**) прэзэнтуе ў Менску сваю калекцыю ды проста «фантануе» праектамі. Ён хоча займець тут фабрыку па перапрацоўцы лёну, адчыніць бутык «прэт-а-партэ», стварыць школу моды. Яго калекцыя, натхнёная садамі Парыжу, выглядае чароўна. Яе паказ праходзіць тым больш пасьпяхова, што мадэлі з заразьлівым энтузіязмам прэзэнтуюць манэкеншчыцы-аматаркі - юныя й прыгожыя беларускі. А што да рэшты, то з прычыны адсутнасьці кампэтэнтных мясцовых партнэраў працягу мы ня ўбачым.

Больш пашанцуе дэлегацыі, якая прыбудзе весьці перамовы пра супрацоўніцтва ў галіне аўтамабільнага транспарту. Яна пакіне беларускую сталіцу з падпісаным пагадненьнем. У якасьці карыстальніцы гэтага віду транспарту я правяла цэлы вечар, падбадзёрваючы то адзін, то другі бок. Цяпер я магу цешыцца думкаю, што менавіта мой удзел у перамовах «зрушыў зь месца гэты воз» (выраз, які першы прыходзіць да галавы ў гэтых абставінах).

5

Красавік [1994].

[…]

Клёд разам з усёй Беларусяй уваходзіць у выбарчую кампанію. Ён прымае і наведвае адзін за адным галоўных кандыдатаў і іхныя выбарчыя штабы.

Кожнай гародніне - свой час: у першую чаргу мы запрашаем на «інтымны» абед Шушкевіча, ягоную жонку і аднаго зь ягоных дарадцаў.

Пачатак аказваецца не найлепшы. Нашыя госьці прыбылі з добрым паўгадзінным спазьненьнем, бо былі спыненыя на дарозе міліцыяй, якая расчышчала шлях для афіцыйнага картэжу Бутраса Галі. У былога старшыні ВС кіслы твар. Але атмасфэра хутка распружваецца, і пасьля абеду, падчас якога ўсхваляваная Наташа падала нам дэсэрт… перш чым выставіць талеркі, дэгустацыя сьпіртных напояў - вытанчанага «Напалеону» і старога «Арманьяку» - яшчэ больш палягчае абмен думкамі й адчуваньнямі. Урэшце, наш сябра выказваецца ясна: ён разумее, што мае мала шанцаў на перамогу і шкадуе аб разьяднанасьці дэмакратаў, у выніку чаго яны няўзгоднена выставілі некалькі малапраходных кандыдатаў.

На наступным тыдні мы вячэраем у кампаніі лідэра Народнага фронту Зянона Пазьняка, які прыбыў да нас разам са сваёй падначаленай - спадарыняй Трыгубовіч, журналісткай і мастацкім крытыкам. Я была прыемна зьдзіўленая, пабачыўшы, як «ачалавечылася» за нашым сталом харызматычная постаць гэтага лідэра - асобы высокага росту з худым тварам і з ваяўнічым агнём у вачах. Раптам перад намі паўстаў зусім не палітычны лідэр, а палымяны гісторык - ветлівы, красамоўны, - які адчыніў нам вочы на спэцыфіку стылю беларускага барока, прымусіў адчуць шарм старых гарадоў і прапанаваў быць нашым гідам у будучым падарожжы ў Нясьвіж і Наваградак.

Як ён ацэньвае свае перадвыбарныя шанцы? Мяркуе, што за ім верны электарат на захадзе краіны, значная большасьць галасоў у Менску і падтрымка многіх інтэлектуалаў.

На пачатку чэрвеня, падчас нацыянальнага сьвята Італіі, ён нагадаў мне аб прапанаванай экскурсіі. Я разгубілася, бо мне не здавалася дарэчным для нас публічна зьяўляцца ў кампаніі аднаго з кандыдатаў у прэзыдэнты. Я сьціпла яму заўважыла,

што час на такое падарожжа мне здаецца выбраным не найлепшым чынам, што ён мусіць быць перагружаны цяпер і што было б лепш перанесьці гэтую выправу на пасьля выбараў. Пазьняк бязь ценю ўсьмешкі адказвае мне, што тады ён будзе занадта заняты выбарам сваёй рэзыдэнцыі, падрыхтоўкаю законапраектаў і шматлікімі клопатамі, якія будуць вынікаць зь ягоных абавязкаў…

Ці жартаваў ён тады, ці ўсё яшчэ сам хацеў у гэта верыць? […]

Двухсэнсоўная цырымонія ў гонар 200-й гадавіны паўстаньня Касьцюшкі здалася мне тады досыць паказальнай для характарыстыкі настрояў, якія панавалі ў Менску за два месяцы да выбараў.

Падрыхтаваная Народным фронтам, імпрэза фінансавалася ўрадам. Перапоўненая заля, шмат моладзі. Перад канцэртам, у якім фігуравалі ўсюдыісныя «Харошкі», адзін аднаго зьмяняюць аратары (сярод іх і Клёд). Выбухам аплядысмэнтаў сустракаецца арганізатар імпрэзы, які падкрэсьлівае, што сёньня, як і ў 1794 годзе, Беларусь знаходзіцца на мяжы страты незалежнасьці. Нейкі паэт узбуджае залю пракляцьцямі на адрас тых, хто прадае краіну за пару рублёў. Прадстаўнікі ўлады, здаецца, пачуваюцца ніякавата. Краўчанка пляскае ў ладкі разам з заляй, але даволі млява.

Клёд працягвае свой агляд і запрашае на вячэру Антановіча. Гэты былы высокі чыноўнік ЮНЭСКА, які цудоўна гаворыць па-французску, на той момант працуе дарадцам Кебіча і кіраўніком ягонай выбарчай кампаніі. Я не дарэмна падкрэсьліваю - «на той момант», бо румяны, усьмешлівы, субтыльны чалавек з муркатлівым голасам, які мне неадольна нагадвае вялікага ката, ішоў і працягвае йсьці сваім уласным пакручастым шляхам.

[…]

На той момант ён сумняваецца ў посьпеху Лукашэнкі, які яму выразна «не да душы». Гэта, аднак, не перашкодзіць Антановічу пазьней далучыцца да прэзыдэнта і прабыць ягоным міністрам замежных справаў са студзеня 1997-га да студзеня 1999-га.

Але хто ж такі, нарэшце, гэты Лукашэнка, які гэтак непакоіць некаторых, але якога большасьць адмаўляецца прымаць усур'ёз?

Каб гэта высьвятліць, Клёд наносіць яму візыт 28 красавіка і вяртаецца… з вышываным абрусам (традыцыйны вясковы падарунак). Гаспадар прэзэнтаваў гэты абрус у знак падзякі, як ён сам сказаў, «першаму паслу, які выбраўся яго наведаць». Зь візыту муж вынес цьвёрдае перакананьне, што з гэтым чалавекам хутка трэ будзе лічыцца.

Якія ягоныя козыры? Пагалоскі зьмяняюцца вельмі хутка. Кажуць, што ён мае падтрымку найбольш кансэрватыўных колаў арміі. Альбо КДБ. Некаторыя сьцьвярджаюць, што яго фінансуе Жырыноўскі.

Лукашэнка лётае па краіне й спакушае натоўпы шырынёю сваіх плячэй, простасьцю мовы й шчырасьцю. Найлепей яго прымаюць сяляне, бо прызнаюць яго «сваім».

Затое яго рэдка пабачыш у тэлевізіі. БТ манапалізаванае Кебічам, прычым урэшце гэтая масіўная «апрацоўка» тэлегледачоў павернецца супраць самога прэм'ера. З дапамогаю Антановіча ён займае сваёй пэрсонай старонкі ўсіх штодзённых газэт. І гэтага яму яшчэ мала, бо тэлегледачы таксама маюць права на адмысловую перадачу (у прайм-тайм!), дзе яны могуць пабачыць Кебіча ў кароткіх штоніках побач з матуляй альбо на пляжы ў плаўках з сынам (хаця ў ім няма нічога ад Аданіса). Бедныя выбарцы! Як зрабіць выбар паміж галёнкамі Кебіча і, калі скарыстацца з азначэньняў, ужываных у прэсе, «сэмінарыстам-недавукам» Пазьняком ці «псыхапатам» Лукашэнкам?

А між тым 23 чэрвеня выбарцы прыходзяць да скрыняў і выбіраюць зь вялікім энтузіязмам (удзельнічаюць 78 % выбарцаў), з энтузіязмам… Лукашэнку. Папярэднія вынікі стаюцца вядомымі раніцай наступнага дня (з розьніцай у некалькі дзясятых пазьней яны пацьвярджаюцца). […]

Ніводзін з кандыдатаў не атрымаў абсалютнай большасьці, і трэба чакаць на другі тур, які меўся адбыцца 10 ліпеня, каб

Лукашэнка мог пацьвердзіць сваю нечаканую перамогу.

[…З вынікаў першага туру выбараў] сталася ясным, што дзьве крайнія прапазыцыі былі адкінутыя [выбарцамі]:

- адкрытыя камуністы пацярпелі поўнае фіяска;

- нацыяналісты дасягнулі пачэснага выніку, але чаканага прарыву ў іх ня выйшла.

Таксама сталася ясным, што больш няма месца і для сярэдзіннага шляху. Шушкевіч сувора паплаціўся за сваю палітыку кампрамісаў і няўпэўненасьці.

Праз чатыры дні мы запрашаем Шушкевіча на сяброўскі абед. Натуральна, ён расчараваны сваім вынікам, які прыпісвае маніпуляцыям Кебіча: згодна з назіральнікамі, менавіта ён альбо Пазьняк мусіў прайсьці ў другі тур…

Але асабліва Шушкевіч агаломшаны посьпехам Лукашэнкі. Ён ясна прадказвае, што кіраваньне апошняга, з прычыны адсутнасьці эканамічных рэформаў, рана ці позна скончыцца рэфэрэндумам аб саюзе з Расеяй. Перад абліччам гэткай пэрспэктывы Шушкевіч імкнецца згуртаваць вакол сябе пэўную колькасьць бізнэсоўцаў і як мага хутчэй навязаць кантакты з эўрапейскімі прадпрыемствамі, каб вага сувязяў з Захадам стрымлівала поўную інтэграцыю [з Расеяй]. Такім чынам, ён прызнае, што Расея ўжо больш, чым ягоная краіна, уключаная ў сусьветны рынак, і было б добра, каб Беларусь узяла зь яе прыклад.

Усе нашыя сябры больш-менш падзяляюць пэсымізм Шушкевіча - Навумчык, якога я сустрэла на амэрыканскім нацыянальным сьвяце, Грыб, што таксама ходзіць чорны як здань… Краўчанка прамаўляе як на пахаваньні, ён кажа мне, што паміж двух зол трэ было б ізноў выбіраць Кебіча: старая «намэнклятура» прынамсі мае пэўны досьвед у кіраваньні і некаторыя каштоўнасьці, пазасталыя з часоў вайны, тады як Лукашэнка, якога ён лічыць «паталягічным выпадкам», і ягоная каманда маладых кар'ерыстаў ня маюць «ні культуры, ні маралі». Тым ня менш Народны фронт заклікае сваіх выбарцаў праігнараваць

другі тур у няпэўнай надзеі, што такім чынам неабходны кворум ня будзе дасягнуты.

Усе нашыя сябры… апрача Антановіча.

Гэты пачынае на мяккіх лапах паварочвацца ў бок пераможцы. Падчас тэлевізійных дэбатаў, на якіх Антановіч супрацьстаіць Лукашэнку, ён, праўда, пацьвярджае, што будзе верна падтрымліваць Кебіча ў другім туры, але адразу дадае, што ў краіне мусіць быць запатрабаваным маладое пакаленьне, прадстаўленае Лукашэнкам і ягонай камандай.

На наступны дзень Антановіч вячэрае ў нас і тут тлумачыцца адкрыта. «Як бы там ні было, - кажа ён, - мы абодва людзі левых поглядаў, і Лукашэнку будзе цяжка праводзіць палітыку, адрозную ад палітыкі Кебіча, нават калі саюз з Расеяй (галоўная тэма выбарчай кампаніі) - гэта толькі «цацка для электарату», бо самі расейцы ў нас ня надта зацікаўленыя». І дадае: «Калі не лічыць геаграфічнага становішча нашае краіны і нашых вайсковых базаў» (што, аднак, ужо само па сабе немалаважна).

8 ліпеня іншыя тэлевізійныя дэбаты ўпершыню зводзяць твар у твар двух канкурэнтаў.

У той час як ня надта абазнаны ў сваёй справе вядучы ня можа даць рады хронамэтражу, Лукашэнка, узброены стосам дакумэнтаў (што сьведчыць пра ягоны доступ да канфідэнцыйнай інфармацыі й добрую працу выбарчага штабу), прагна ўгрызаецца ў бакі свайму супраціўніку. Ён абвінавачвае яго ў некампэтэнтнасьці і раздае абяцанкі выправіць - без тлумачэньня, якім чынам, - тыя ці іншыя памылкі. Кебіч не дае рады адбіцца і мусіць задаволіцца жалю вартай абаронай, асабліва нікчэмнай у заключны момант, калі ён просіць прабачэньня ў народу за тыя памылкі, якія ён мог зрабіць.

З Кебічам пакончана.

[…]

ЛУКАШЭНКА ЗА ШТУРВАЛАМ

1

20 ліпеня Вярхоўны Савет абвяшчае Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку першым прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі.

[…]

У той жа вечар у рэзыдэнцыі ў Заслаўі Лукашэнка дае прыём для парлямэнтароў і прадстаўнікоў дыпляматычнага корпусу, што дазваляе мне ўпершыню пабачыць яго на свае вочы.

«Малады», як ён любіць падкрэсьліваць, прэзыдэнт - высокі і масіўны, хоць трохі каратканогі. Апошні недахоп маскуецца бездакорным двухбортным гарнітурам, але будзе відавочны падчас шматлікіх тэлесюжэтаў, прысьвечаных ягоным спартовым практыкаваньням. […] Ён какетліва хавае раньнюю лысіну, зачэсваючы набок доўгую пасму (гэты макіяж, аднак, не трымаецца, калі ён у дэсантнай уніформе высаджваецца з свайго гелікоптэра). Шырокія скулы, драпежныя вочы і воўчыя зубы пад чорнымі вусамі, якія цалкам хаваюць верхнюю губу, - злыя языкі прыпісваюць яму цыганскае паходжаньне. Праўдай ёсьць тое, што Лукашэнка быў народжаны сялянкай з Магілёўшчыны ад невядомага бацькі. Сам ён жанаты, мае дваіх дзяцей, але мы ніколі ня ўбачым ягонай жонкі і толькі зрэдзьчасу - ягоных сыноў. […] Лукашэнка дакладна не належыць да інтэлігенцыі й ня цешыцца яе прыхільнасьцю: ён практычна не гаворыць па-беларуску (аднак на наступным тыдні зробіць выключную спробу зрабіць прамову на беларускай мове з нагоды Нацыянальнага сьвята) і кепска, паводле слоў ягоных крытыкаў, - затое шмат - гаворыць па-расейску. Але ён зважае на гэтую крытыку: незадоўга да нашага ад'езду зь Менску ён пахваліць мой прагрэс у расейскай мове і пасьля майго адказу «Я шмат чаму навучылася, слухаючы Вашыя доўгія прамовы па тэлебачаньні» абмяняецца хітрай усьмешкай з сваім тагачасным міністрам замежных справаў Антановічам - нечаканае сьведчаньне таго, што ён усё ж мае пачуцьце гумару.

Шматлікія грані й парадоксы ягонага характару будуць праяўляцца пакрысе: дабрадушнасьць і падазронасьць, нязграбнасьць і хітрамудрасьць, задзірлівасьць і зьменлівасьць, красамоўнасьць, якая заганяе яго ў пастку некантраляванай рэзкасьці, што выдае сталую супярэчнасьць паміж ягонай прагай улады і глыбокім пачуцьцём небясьпекі.

Прынамсі, гэткія ўражаньні я вынесу зь некалькіх спаткаьняў з Лукашэнкам і зь ягоных незьлічоных публічных выступаў.

Але пакуль што ён увесь цукрова-мядовы. Ён хоча падабацца, і, верагодна, яму гэта ўдаецца, калі меркаваць з плеяды маладых пасьлядоўнікаў, якія яго атачаюць. А мы гуляем у адгадваньне, хто зь іх зойме міністэрскія пасады.

Чакаць ня прыйдзецца доўга. Сьпіс абвешчаны на наступны дзень, а праз тыдзень мы зноў спаткаем іх у тым самым месцы, з нагоды Нацыянальнага сьвята, і яны будуць стаяць гуртам вакол свайго патрона.

Прызначэньне Чыгіра прэм'ер-міністрам - неспадзяванка, прычым нядрэнна ўспрынятая: былы дырэктар Аграрнага банку не падобны да экстрэміста. І на самай справе ён будзе праяўляць сябе як цярплівы выканаўца, аж пакуль ня ўзбрыкне адстаўкай праз два з паловай гады. Старыя ваўкі Лінг і Мясьніковіч займаюць пасады віцэ-прэм'ераў, першы - па эканоміцы, другі - па прамысловасьці. Віцэ-прэм'еру па культуры і інфармацыі маладому дэмакрату Ганчару прадказваюць найлепшую будучыню, але мы ўбачым, што надоўга ён ува ўрадзе не забавіцца. Дыпляматы ў найвялікшай ступені задаволеныя прызначэньнем на пасаду міністра замежных справаў Уладзімера Сянька, кар'ернага дыплямата й амбасадара ў Лёндане. Уніклівы і чулы, ён будзе ўважлівым суразмоўцам і, наколькі гэта будзе магчымым, будзе змазваць алеем зубчасты мэханізм адносінаў паміж нашымі краінамі, аж пакуль яго не пазбавяць пасады. Ён і ягоная жонка, выхаваная ў тым самым сэралі (дачка савецкага пасла і сама выпускніца Маскоўскага інстытуту міжнародных адносінаў), стануцца для шмат каго з нас каштоўнымі сябрамі.

У гэты вечар Лукашэнка яшчэ выпрамяняе ўсьмешкі. Ён

паставіў сабе за мэту прыручыць дыпляматычны корпус і лічыць сваім абавязкам супакойваць яго варыяцыямі на тэму: Беларусь - мірная краіна ў цэнтры Эўропы, якая хоча жыць у міры з усімі сваімі суседзямі; нягледзячы на асаблівыя стасункі з Расеяй, ён адкрыты на ўсе прапановы, як з Захаду, так і з Усходу, абы толькі яны адпавядалі інтарэсам ягонага народу. Ён уніклівa паўтарае: «Ня трэба баяцца Беларусі», - і быццам на выпадак, калі мы яго не зразумелі: «Скажыце сваім урадам, што нас няма чаго баяцца»… Клёд і ягоныя калегі трохі сумеліся.

«Супакоіўшы» такім чынам дыпляматаў (выраз Лукашэнкаў), ён перайшоў да чараваньня МВФ, потым - Масквы. Пакуль няма дамовы аб эканамічным саюзе («Трэба спачатку здагнаць расейскую эканоміку, але пазьбегнуць пры гэтым памылак старэйшага брата», - дадае ён і па-сяброўску ляпае па сьпіне Чарнамырдзіна, які трохі моршчыцца), але пасьля кароткага перапынку Масква прапанавала новыя крэдыты і дала гарантыі захаваньня льготных цэнаў на энэрганосьбіты. Гэта ўжо ня так кепска. Як ён увесь час падкрэсьлівае, спадзяваньні ягоных супраціўнікаў на тое, што Масква яго не падтрымае, «рассыпаліся, як картачны дамок». Ён дае сабе восем месяцаў (да наступных парлямэнцкіх выбараў?), каб пакончыць з інфляцыяй. Народны фронт пагадзіўся на шэсьць месяцаў (што пацьвердзіла нам мілая пара Навумчыкаў, прыйшоўшы на вячэру), падчас якіх БНФ спыніць усе атакі на Лукашэнку і будзе займаць становішча канструктыўнай апазыцыі.

Адным словам - боская ласка.

3

У што верыць Лукашэнка? Хоць аднойчы ў парыве шчырасьці ён назаве сябе атэістам, ён усё ж дастаткова лоўкі палітык, каб не прапусьціць магчымасьці выкарыстаньня грамадзкіх настрояў і пошуку падтрымкі ў Праваслаўнай царквы. Яго ўсё часьцей і часьцей будуць бачыць у кампаніі мітрапаліта (якому толькі гэтага й трэба) на нацыянальных сьвятах. Гэтая ж пара будзе стала прысутнічаць на вялікіх рэлігійных мерапрыемствах. Дойдзе да таго, што Лукашэнка замест сьвятара будзе з амбону зьвяртацца да вернікаў у царкве…

Нават заяўляючы пра сваю бесстароннасьць, ён ніяк гэтым не палегчыць місіі каталіцкага Касьцёлу, які, дарэчы, выяўляе нашмат менш вернападданасьці да ягонай асобы. […]

А што Пазьняк? Я не выключаю, што лідэр БНФ дасюль ушаноўвае «сьвятыя камяні». Прынамсі, так ён эмацыйна апавядае нам пра свае блуканьні ў месяцавым сьвятле ў парку [камянёў] Інстытуту геалёгіі!

Ён абедае ў нас разам з Навумчыкам і пры нагодзе пацьвярджае, што дамова з уладаю пачынае яго абцяжарваць. Меры, якія прымаюцца новым кіраўніцтвам, здаюцца Пазьняку хаатычнымі, недастатковымі й «малажыцьцёвымі», а прэзыдэнцкая каманда - бязладнай і некампэтэнтнай.

Мы гэта таксама добра бачым.

[…]

Францыя так і не адчыніць у Беларусі сваёй «крэдытнай лініі» дзеля забесьпячэньня інвэстыцыяў, таму наш прагрэс у галіне эканамічных стасункаў з гэтай краінай застанецца сапраўды вельмі нязначным у параўнаньні з дасягненьнямі нашых канкурэнтаў, такіх, як немцы ці нават палякі.

Тым ня менш Бэртран [гандлёвы прадстаўнік] бесьперапынна нарошчвае сваю актыўнасьць. Ён імкнецца зрабіць усё магчымае для палягчэньня кантактаў і ў гэтым сэнсе ўскладае вялікія надзеі на Франка-беларускі бізнэс-клюб, сяброў якога мы прымаем 8 лістапада [1994 году].

Апрача сымпатычнага буфэту, мы прапануем прадстаўнікам каля сарака французскіх фірмаў, што працуюць у Менску, прысутнасьць Марыніча. Гэты пранырлівы й непатапляльны пры кожным рэжыме міністар замежных эканамічных сувязяў знайшоў добрую нагоду, каб абвясьціць пра некаторыя новыя меры па заахвочваньні замежных інвэстыцыяў.

Я, натуральна, карыстаюся з нагоды, каб пабалакаць з прадстаўнікамі дамоў моды й парфумэрных кампаніяў. Але таксама знаходжу час для размовы зь беларусам -

прадстаўніком фірмы «Матра» і ягоным французскім памочнікам. Гэтая фірма выкарыстоўвае мясцовых праграмістаў для стварэньня складаных кампутарных праграмаў. Наступны мой суразмоўца - прадстаўнік фармацэўтычнай кампаніі «Белфранс», які хваліцца неймавернымі аб'ёмамі выпрабленай прадукцыі (але куды ж, у такім выпадку, дзяюцца ўсе гэтыя мэдыкамэнты?). І я ажно ўздрыгваю, калі адзін зь беларускіх гасьцей мне кажа: «Мы толькі што купілі 2 % акцыяў «Рэно». Наводжу даведкі: аказваецца, я размаўляла зь мясцовым прадстаўніком «Эльф-Санафі».

Бясспрэчна, усе гэтыя кампаніі вартыя павагі, адно толькі не адчуваецца прысмаку рызыкі прыватнай ініцыятывы. Гэты прысмак дае сябе адчуць празь некалькі дзён, калі мы прымаем уладальніка фабрыкі катлоў з Клермон-Фэрану. Спрабуючы пашырыць вытворчасьць, ён стаўся ахвярай поклічу славянскіх лясоў. Цяпер ён спрабуе стварыць у Гомелі сумеснае прадпрыемства з выкарыстаньнем у якасьці паліва шматлікіх адкідаў мясцовай лясной прамысловасьці. Увасабленьнем прыватнай ініцыятывы ёсьць і адстаўны афіцэр французскіх ВПС, які фрахтуе грузавы самалёт беларускай арміі для транспартаваньня розных тавараў ды ўдзелу ў гуманітарных акцыях. Празь некалькі месяцаў гэты самалёт вытрымае аварыйную пасадку ў Сараеве, што дазволіць яго арэндатару выйсьці непашкоджаным з гэтай непрыемнай прыгоды.

4
[…]

Пасьля колькітыднёвага побыту на беразе Чорнага мора, даўшы адпачынак змучанай спортам і палітыкай сьпіне, у сярэдзіне лістапада Лукашэнка вяртаецца ў Менск. Ён настолькі «прыйшоў у форму», што ў той самы вечар акупуе тэлевізійны канал, каб выкрыць:

- парлямэнт, які стрымлівае рэформы тым, што ставіць пад пытаньне стварэньне прэзыдэнцкай адміністрацыі, гэтае «вэртыкалі», якая, ад райвыканкаму да ўраду, дублюе ланцуг

кіраваньня паводле колішняга партыйнага прыкладу;

- міністраў і старшыню Нацыянальнага банку, якія не жадаюць выконваць ягоныя дырэктывы і, у прыватнасьці, дапусьцілі рост цэнаў падчас ягонай адсутнасьці;

- журналістаў, якія распаўсюджваюць усялякія плёткі, і тэлебачаньне, што трансьлюе парлямэнцкія дэбаты цалкам у той час, як мусіла б перадаваць толькі «канструктыўныя» спрэчкі;

- апазыцыю, як правую, так і левую, якая аб'ядналася ў змове супраць яго;

- Расею, занадта нестабільную, каб ён мог на яе разьлічваць;

- Захад і МВФ, якія не даюць абяцанай дапамогі.

Ніхто яшчэ не прызвычаіўся да гэткіх сцэнаў, якія потым будуць паўтарацца пасьля кожнага Лукашэнкавага вяртаньня да працы. […] Усе чакаюць, калі «палятуць галовы».

І сапраўды, празь некалькі тыдняў адстаўка Ганчара ў знак пратэсту супраць стварэньня «прэзыдэнцкай вертыкалі» для многіх, а ў першую чаргу для заходніх дыпляматаў, прагучала як сыгнал трывогі.

У пачатку студзеня, запрошаны на абед разам з бляндынкаю-жонкаю, Ганчар растлумачыць нам, што ён прыняў пасаду віцэ-прэм'ера толькі на ўмовах захаваньня поўнай самастойнасьці і ў надзеі на стварэньне ўраду «прагматыкаў», якіх бы ён сам і рэкамэндаваў. Ён прызнаецца, што цяпер найбольш заклапочаны аб'яднаньнем цэнтрысцкіх партыяў напярэдадні вясновых парлямэнцкіх выбараў. Калі Лукашэнка будзе працягваць дзейнічаць, быццам наўмысна імкнучыся адпіхнуць ад сябе ўсіх, гэтая кааліцыя будзе мець шанцы вылучыць і правесьці зьмены ў Канстытуцыі. Гэтыя зьмены ня будуць азначаць вяртаньня да катастрафічнага калектыўнага кіраваньня, але павінны прынамсі абмежаваць паўнамоцтвы прэзыдэнта. (Хутка мы ўбачым, як Ганчар памыляўся, загадзя выключаючы зь сьпісу патэнцыйных хаўрусьнікаў Шушкевіча і

БНФ, што пазбавіла ягоную кааліцыю значнай колькасьці галасоў.)

Клёд без прамаруджаньня спрабуе расшыфраваць намеры Лукашэнкі ў сфэры замежнай палітыкі й запрашае да нас маладога намесьніка міністра замежных справаў Цапкалу. Чыноўнік выказваецца гранічна ясна: распад СССР - працэс зусім не незваротны, хоць аднаўленьне Саюзу і азначала б «палітычнае харакіры» для кіраўнікоў маладых дзяржаваў. Беларусь у гэтым сэнсе - самае ўразьлівае зьвяно ў ланцугу. Калі абыякавасьць Захаду да справаў Беларусі выкліча абвастрэньне эканамічнага крызысу, беларускі народ не пасаромеецца аддацца ў рукі вялікага расейскага брата. Апошні ж прыме гэтую ахвяру тым больш ахвотна, што ўжо вымалёўваецца пагроза з боку NATO, да якога імкнуцца далучыцца краіны Ўсходняй Эўропы аж да Берасьця.

Ну, вось мы ўжо й сталіся абвінавачанымі.

Дарэчы, 12 сьнежня мы запрошаны на сьвяткаваньне гадавіны ўтварэньня СНД у раскошную блакітную з золатам ратонду, пабудаваную калісьці для Менскага абкаму партыі. Перад намі прамаўляе Лукашэнка, які скардзіцца на нізкую выніковасьць працы Садружнасьці ды жадае павысіць яе шляхам двухбаковых пагадненьняў, у прыватнасьці з Узбэкістанам і Расеяй. Тут ён упершыню прамаўляе слова «інтэграцыя».

На наступным тыдні адбываецца цырымонія прыняцьця калядных зычэньняў ад дыпляматычнага корпусу, які мусіць праходзіць перад Лукашэнкам у пратакольным парадку (дзе ты, мілы беспарадак папярэдніх гадоў!). Ён тым часам імкнецца супакоіць жарсьці й запэўнівае, што арганізуе «круглы стол» з удзелам прадстаўнікоў асноўных партыяў, каб выпрацаваць узгодненую палітыку. Лукашэнка жадае ад дыпляматаў разуменьня тых цяжкасьцяў, якім мусіць супрацьстаяць ягоная маладая дзяржава. Ён просіць забясьпечыць ёй падтрымку з боку адпаведных урадаў, ня робячы гэтым разам падзелу на Ўсход і Захад.

[…]

5

[…]

[Пачатак 1995 году] Мы запрашаем да сябе Антановіча, які зьнік на некаторы час пасьля выбараў, але нядаўна зноў вярнуўся на арбіту вышэйшай улады.

Гэты хітры ліс ізноў выцягнуў на сьвет свой партбілет. Ён трымае нос па ветры й ставіць на посьпех камуністаў на наступных парлямэнцкіх выбарах.

Назаўтра я пераконваюся ў тым, што Антановіч добра інфармаваны: шматлікія чырвоныя сьцягі лунаюць над натоўпамі, якія на заклік прафсаюзаў маніфэстуюць па ўсёй краіне супраць уздаражаньня жыцьця ды супраць «рэформаў».

[…] Пасьля Антановіча Клёд запрашае да нас у дом таго, хто зьменіць яго пазьней на пасадзе міністра замежных справаў, - Урала Латыпава, новага дарадцу прэзыдэнта па міжнародных пытаньнях, на шчасьце - франкамоўнага. Чалавек з «красамоўным» імем (прынамсі для тых, хто ведае геаграфію) - татарын з Башкартастану. Ягоная высокая маладжавая постаць, шырокія скулы, блакітныя вочы, сьціплы й сарамлівы выгляд выклікаюць у мяне сымпатыю да таго часу, пакуль я не даведваюся, што гэты чароўны хлопец прайшоў школу КДБ і выкладаў у гэтай установе спосабы абыходжаньня з замежнікамі…

Пакуль што здаецца, што наш новы прыяцель ня надта ведае, якія ён мае функцыі, апрача забесьпячэньня прэзыдэнта замежнымі візытамі. Латыпаў верыць - альбо робіць выгляд, што верыць, - у афіцыйнае запрашэньне з Францыі. Клёд вымушаны яго расчараваць. Тым ня менш, абодва згодна прытрымліваюцца думкі, што было б някепска, каб пасьля былых «братніх краінаў», Кітаю ды Індыі, «малады прэзыдэнт» атрымаў магчымасьць папоўніць свой багаж ведаў на Захадзе.

Латыпаў бярэ на сябе клопат запэўніваць нас, што ў адносінах з

Расеяй гаворка ідзе ўсяго толькі пра эканамічны хаўрус. Прынамсі, на сёньняшні момант. І што гэты хаўрус сутыкаецца з шматлікімі цяжкасьцямі… тэхнічнага характару.

[…Між тым] з Масквы адзін за адным прыбываюць міністар замежных справаў, прэм'ер-міністар, старшыня Думы.

Апазыцыя бушуе. У парлямэнце ідзе змаганьне. Грыб лявіруе. Ён часта зьяўляецца на экране тэлевізара і спрабуе апраўдаць фронду сваіх калег, пазьбягаючы пры гэтым нават згадваць імя прэзыдэнта. Ідзе дыскусія пра новыя дзяржаўныя сымбалі Беларусі. Натуральна, гэта - найважнейшае пытаньне, асабліва калі ўлічыць, што, нягледзячы на штучную стабілізацыю курсу «зайчыка», працягваецца інфляцыя, а з рынку цалкам зьніклі добрыя мясцовыя малочныя прадукты, на якія аказаўся занадта ласы старэйшы брат. Нягледзячы на ўсе пагадненьні аб мытным хаўрусе, даводзіцца аднавіць кантроль грузаў на мяжы.

Нарэшце 21 лютага чароўны прынц Ельцын уласнай пэрсонай прызямляецца ў аэрапорце «Менск-2», затрымліваючы на тры гадзіны вылет майго самалёта ў Францыю.

Два «мядовыя дні», трохі падпсаваныя маніфэстантамі з БНФ, - і два галубкі падпісваюць Дамову аб дружбе й супрацоўніцтве, дапоўненую новымі мытнымі й вайсковымі пагадненьнямі.

Па вяртаньні з вакацыяў у сярэдзіне сакавіка я знаходжу сытуацыю такой самай напружанай і даволі заблытанай.

Ад Лукашэнкі, як звычайна, вее то гарачынёй, то холадам. У вечар майго вяртаньня ў тэлевізійнай прамове ён абвяшчае, што, адчыніўшы сваю краіну на Ўсход, ён павернецца зараз тварам да Захаду.

Клёд ды ягоныя калегі вельмі хацелі б злавіць яго на слове. Дарэчы, беларускі прэзыдэнт запрошаны ў Францыю на сьвяткаваньне юбілейнай гадавіны 8 траўня 1945 году. Прыедзе ён ці не прыедзе?

Сянько, які наведаў Парыж для ўдзелу ў міжнароднай

канфэрэнцыі, вяртаецца адтуль не ў найлепшым настроі. Ён мусіў там парафаваць нашую Дамову аб згодзе й супрацоўніцтве, што знаходзіцца ў працы ўжо больш за два гады, але ня здолеў спаткацца з Жупэ. Міністар замежных справаў Францыі спаслаўся на «тэхнічныя цяжкасьці» ды адклаў спатканьне зь беларускім калегам «да лепшых часоў».

[…]

З прычыны адсутнасьці ў Лукашэнкі партыі, якая б яго падтрымлівала, прэзыдэнт сумняваецца ў выніках галасаваньня і таму, разьлічваючы на сваю асабістую папулярнасьць, жадае ператварыць гэтыя выбары ў плебісцыт.

Такім адчуваньнем дзеліцца наш сёньняшні госьць. Лябедзька - высокі чуб, маленькія вусікі над прыемнай усьмешкай - старшыня Аб'яднаньня маладых палітыкаў. Пасьля таго як падтрымаў Лукашэнку, каб «насаліць» Кебічу, ён пачынае патроху дыстанцыявацца ад прэзыдэнта, аднак, паводле ўласнага прызнаньня, застаецца ўва ўладзе пэўнага захапленьня гэтым чалавекам. Для Лябедзькі незалежнасьць ягонай краіны - гэта справа яшчэ аднаго пакаленьня. Пакуль ён параўноўвае Беларусь зь вязьнем, які ў дзень свайго вызваленьня звар'яцеў ад думкі пра страту сваіх нараў і гарантаванай пайкі.

[…]

6
[…]

Навумчыкі, якія прыйшлі пакаштаваць разам з намі рагу зь белага мяса пад белым соўсам праз тыдзень пасьля гвалтоўна спыненай галадоўкі дэпутатаў, зьвярнулі нашую ўвагу на відавочную абсурднасьць распарадчых актаў, згодна зь якімі праводзіцца гэтая выбарчая кампанія і якія практычна забараняюць кандыдатам абапірацца на падтрымку партый, атрымліваць грошы на правядзеньне кампаніі і мець доступ да СМІ.

Сяргей спадзяецца, што БНФ атрымае 20 % месцаў у новым парлямэнце, хаця й згаджаецца, што апошнія падзеі пашкодзілі фронтаўскаму іміджу. Ён, аднак, баіцца, каб усе карты ня зблытаў рэфэрэндум і каб зьзяньне чырвоных сьцягоў, якія хутка будуць паўсюдна лунаць у гонар 50-годзьдзя Перамогі, не адбілася на зьмесьціве скрыняў для галасаваньня.

А Галіна першая ўслых выказвае мае ўласныя думкі: «А раптам Лукашэнку маніцца прымерыць «шапку Манамаха»? Злыя языкі ўжо пачынаюць аб гэтым шаптаць. Калі ён прынясе ў пасаг «Паўночна-Заходні край», то чаму б яму ня быць з энтузіязмам прынятым у Крамлі? У некаторых расейскіх колах у ім бачаць «моцную руку, якая выратуе Расею». Ягоная асабістая ахова ды Рада Бясьпекі ўжо запоўненыя старымі гэбістамі… Як мы пазьней убачым, гэтыя чуткі будуць патроху ўзмацняцца і, спачатку абвергнутыя атачэньнем прэзыдэнта, а потым моўчкі прызнаныя некаторымі зь ягоных найбліжэйшых супрацоўнікаў, стануцца ўрэшце рабочай гіпотэзай.

[…]

Сьвяткаваньні 50-годзьдзя Перамогі - дзеля якіх прэзыдэнт, рэч ясная, адмовіўся прыняць запрашэньне наведаць Францыю, накіраванае ўсім кіраўнікам краінаў - пераможцаў 1945 году (Беларусь на гэтых сьвяткаваньнях у Парыжы будзе прадстаўляць прэм'ер-міністар Чыгір), - маюць цягнуцца тры дні й мабілізаваць усю краіну.

Ёсьць нагода нашкадавацца, што гэтае сьвяткаваньне ня можа адбыцца ў Савецкім Саюзе, у чым вінаватыя палітычныя гульцы, якія штучна разьдзялілі савецкія рэспублікі.

На трэці дзень, падчас параду, увесь Менск выходзіць на вуліцы. Ад плошчы Незалежнасьці да плошчы Перамогі натоўп крочыць за сваім прэзыдэнтам. Тут і маладыя, і вэтэраны. Дзеці на плячах у дарослых размахваюць сьцягамі СССР і БССР. Паўсюль - партрэты Леніна і нават Сталіна.

Пазьняк, які вырашыў сьвяткаваць асобна, яшчэ крыху маргіналізаваў такім чынам свой рух.

А Лукашэнка можа сабе дазволіць адляцець зь Менску ў Маскву, каб прыгожа скончыць гэты дзень, прысягнуўшы на вернасьць Крамлю ад імя народу… больш царскага, чым сам цар.

[…]

7
[…]

Урал Латыпаў, якога я сустракаю ўбаку ад натоўпу ў садзе Дому дружбы на прыёме з нагоды нацыянальнага сьвята Італіі, відавочна кепска пераносіць эскапады свайго патрона - асабліва цяжка яму тлумачыць іх перад нашымі эўрапейскімі калегамі.

На ягоную прапанову мы гуртуемся вакол качкі з памаранчамі, каб «чыстасардэчна» абмяняцца поглядамі. Латыпаў прызнаецца, што прыбыў на гэтую вечарыну з згоды прэзыдэнта, фактычна - у якасьці ягонага прэс-сакратара. Сапраўды па-майстэрску ён пераконвае нас у тым, што трэба прыстасоўвацца да рэаліяў: Лукашэнка прыйшоў на пяць гадоў, можа, і на болей; ён вельмі папулярны - ня толькі ў сваёй краіне, але таксама і ў Расеі, і ўва Ўкраіне (іншымі словамі, рыхтуйцеся!). І ўрэшце, гэта ж ня ён расстрэльваў з гарматаў парлямэнт і ня ён увёў войскі ў Чачэнію!

Але яму трэба палепшыць свой імідж, які не ўспрымаецца на Захадзе, і навязаць кантакты з заходнімі палітыкамі ўсіх напрамкаў, а таксама зь бізнэсоўцамі й прамыслоўцамі. Апошнім ён гатовы прапанаваць нават зямлю, хаця ў прынцыпе ён супраць яе прыватызацыі.

З боку іншых чакаюцца сыгналы прыхільнасьці, як, напрыклад, падпісаньне ўмовы з МВФ, якое ўсё чакаецца і ўсё адтэрміноўваецца (дарэчы, гэта праўда, што МВФ заўжды дэманстраваў больш «разуменьня» ў адносінах да Ельцына, чым у адносінах да Лукашэнкі).

[…]

ПЕРШЫЯ ЗАНОСЫ

1

[…]

Але ж Лукашэнка вучыцца на ўласных памылках. Паступова ён усё больш ідзе на меры, якія супярэчліва і без асаблівага энтузіязму ўспрымаюцца краінай, што ўпарта трымаецца за старыя савецкія звычкі. Гэтак, прынамсі, нам 10 кастрычніка [1995] тлумачыць сытуацыю Аляксандар Фядута, якога мы ўпершыню прымаем у сваім доме.

[…]

На ягоную думку, у сытуацыі паглыбленьня эканамічнага крызысу прэзыдэнт спрабуе ажыццявіць «уцёкі наперад». Размахваючы сьцягам саюзу з Расеяй, ён зандуе глебу для канфэдэрацыі з чаргаваньнем прэзыдэнтаў. Але расейцы прымушаюць сябе ўгаворваць, у прыватнасьці «Газпром» ня надта схільны пастаўляць беларусам паліва па ўнутраных цэнах. Згодна зь Фядутам, Лукашэнка менш баіцца абраньня [у парлямэнт] некалькіх «бээнэфаўцаў», чым паўстаньня там большасьці ўпартых «цьвёрдакаменных» камуністаў. Але найбольш яго страшыць тое, каб Канстытуцыйны суд, які да яго кепска ставіцца і абсалютна яму не падкантрольны, не распачаў працэдуры імпічмэнту.

[…]

Наш наступны госьць, Лябедзька, прайшоў той самы шлях [што й Фядута] і толькі што далучыўся да апазыцыі, прынамсі той яе часткі, што групуецца вакол Багданкевіча, былога старшыні Нацыянальнага банку. Ён думае, што, пакуль стаўка расейскіх прэзыдэнцкіх выбараў ня будзе выкупленая, Лукашэнка застанецца паралізаваны сваёй вар'яцкай надзеяй стацца некалі богаабраным правадыром панславянскіх нацыяналістаў. Тым ня менш, Лябедзька спадзяецца на рэформы, бо ў новым

парлямэнце, а менавіта сярод аграрнікаў, ёсьць маладыя прагматыкі, якія, калі авалодаюць сваім новым рамяством, могуць стацца добрымі заканадаўцамі.

Вымалёўваецца новы цэнтрысцкі саюз, а БНФ па-ранейшаму застаецца сам па сабе. Пазьняк, якога мне цяжка было ўявіць бацькам сям'і, сёлета ажаніўся, і ягоная цыбатая постаць маячыць на ўсіх кактэйлях, але, такое ўражаньне, выклікае толькі спачуваньні. Навумчык адмаўляецца ісьці на давыбары (трэба разумець, лічыць гэта беспэрспэктыўным). Ён хоча засяродзіцца на палітычнай агітацыі і паспрабаваць згуртаваць маладых прадпрымальнікаў, у той час як уплывовыя бізнэсоўцы павярнуліся да Лукашэнкі, які да таго ж, на спакусу дзелавым людзям, паклікаў кіраўніком сваёй адміністрацыі Мясьніковіча. Навумчык таксама задумляецца над аграрнікамі і марыць, што яны некалі далучацца да шырокае апазыцыі.

Хто ж яны, гэтыя новаабраныя [аграрнікі]? Каб пазнаёміцца зь імі бліжэй, Клёд запрашае на 17 лістапада іхнага старшыню ды двух іншых кіраўнікоў партыі… і затрымліваецца ў амбасадзе. Я на паўгадзіны пакінутая сам-насам зь імі. На шчасьце, пад белай шавялюрай старшыні Шарэцкага хаваецца просты й непасрэднны погляд на жыцьцё, характэрны для людзей ягонай камплекцыі. Але таксама яго характарызуе няўмольная дыялектычнасьць і манера размовы, якая не пакідае ягоным сябрам шанцу ўставіць хоць слова, няшмат такіх шанцаў зьяўляецца і ў Клёда. Усё гэта разам зробіць зь яго пазьней праціўніка Лукашэнкі, больш упартага, чым Грыб.

Ён кажа нам, што сёньня аграрнікі гатовыя падтрымаць прэзыдэнта ды ягоныя «рэформы». Яны падзяляюць прэзыдэнцкія інтэнцыі, але канчаткова будуць судзіць толькі паводле ягоных справаў. Але пра якія рэформы гаворка? Калектывізацыя й стварэньне вялікіх агракомплексаў былі неабходнымі мерамі ў тым стане, у якім апынулася Расея напярэдадні рэвалюцыі. Яны дазволілі ёй зрабіць вялікі скачок наперад, але адначасова закансэрвавалі сыстэму эксплюатацыі земляў й не дазволілі скарыстацца з прагрэсіўных тэхналёгіяў, распрацаваных за мяжою. Тое самае адбывалася і ў прамысловасьці. Такім чынам, аграрнікі добразычліва

паставіліся б да больш гнуткай сыстэмы, якая можа базавацца на суіснаваньні калгасаў, каапэратываў і дробных фэрмэрскіх гаспадарак. Але пры гэтым ня мусіць закранацца галоўная догма: ня можа быць гаворкі пра перадачу ў прыватныя рукі сродкаў вытворчасьці. Тое, што можа й павінна быць прыватызавана, - гэта сыстэма кіраваньня імі.

Што датычыць адносінаў з Расеяй, то, натуральна, трэба аднавіць Саюз, які ніколі й не спыняў свайго існаваньня ў сьвядомасьці людзей. У той ці іншай форме, ён абавязкова патрэбны для вырашэньня якіх-кольвек праблемаў: ад ратаваньня трактарнага заводу да супрацьстаяньня пагрозе НАТО.

[…]

[Тым часам] Лукашэнка лаўчыцца палепшыць свае адносіны з Захадам.

Аднак спачатку гісторыя зь зьбіцьцём амэрыканскага паветранага шара, а потым вымушаная адстаўка Багданкевіча (у той самы момант, калі ўжо здавалася, што пагадненьне з МВФ нарэшце гатовае да падпісаньня) не спрыяюць паляпшэньню сытуацыі. Між тым у канцы кастрычніка прэзыдэнт запрошаны на ўрачыстасьці з нагоды 50-годзьдзя ААН і выпраўляецца ў ЗША. Адтуль ён вяртаецца як ніколі заклапочаны сваім іміджам. «Мы можам колькі хочам спрачацца ў гэтых сьценах, - канфідэнцыйна распавядае ён па вяртаньні свайму коснаму парлямэнту, - але перад замежнікамі трэба рабіць выгляд, што ўсё ў нас ідзе да лепшага». Тое ж, відаць, датычыць і народу. Кожны вечар мясцовае тэлебачаньне частуе нас Лукашэнкавымі размовамі з амэрыканскай «інтэлектуальнай элітай» ды ягонымі трыюмфальнымі выступамі перад «міжнароднымі» інвэстарамі. Мы бачым яго ў Чыкага, дзе з самахвальскім выглядам ён прымае паднесеныя яму ключы ад гораду!

Вецер пачынае зьмяняцца? Бо з нашага боку сытуацыя таксама разблякоўваецца. Нарэшце адбылася сустрэча паміж Сяньком й нашым новым міністрам замежных спраўаў Эрвэ дэ Шарэтам. Яны парафавалі стандартную Дамову аб дружбе й

супрацоўніцтве ды адзначылі гэтую падзею шампанскім.

Сапраўды, наш урад знаходзіцца ў даволі казытлівай сытуацыі пасьля аднаўленьня выпрабаваньняў ядравай зброі ў Ціхім акіяне ды мусіць лічыцца з кожным патэнцыйным сябрам. Адсюль - гэтае ажыўленьне цікавасьці да Беларусі. Ці дойдзе яно да запрашэньня яе прэзыдэнта ў Парыж з афіцыйным візытам, пра які ён марыць? Над гэтым працуе Мясьніковіч, які прываблівае нашых бізнэсоўцаў магчымасьцямі, якія адкрые такі візыт. Над візытам таксама працуе Латыпаў. Ён прыходзіць да нас напярэдадні выбараў і тлумачыць думкі свайго гаспадара. Ён пацьвярджае, што гэты апошні вельмі жадае спадабацца заходнім сталіцам. Мімаходзь Латыпаў устаўляе з абяззбройвальнай непасрэднасьцю, што Францыя ня можа спадзявацца на разгортваньне тут масштабных праектаў, пакуль не накіруе ў Менск такога чаканага запрашэньня.

[…]

2
Сьнежань 1995 году пакуль што распачынаецца цудоўна.

Беларусь мае легітымна абраных прэзыдэнта й парлямэнт. Дзяржава можа нарэшце распачаць нармальнае функцыянаваньне згодна з Канстытуцыяй, прынятай паўтара году таму. Яна сталася рэспэктабэльнай і можа на роўных падтрымліваць сардэчныя адносіны як з Захадам, так і з Усходам. Дарэчы, усё часьцей гаворыцца пра афіцыйны дзяржаўны візыт у Францыю. Парыж плянуе яго на першы квартал наступнага году.

І менавіта гэты момант Лукашэнка абірае, каб ізноў пасьлізнуцца. Не, натуральна, ён робіць гэта незнарок. Але з прычыны празьмернай заклапочанасьці сваім іміджам прагне падабацца ўсім сваім суразмоўцам. У гарачлівым імкненьні да гэтае мэты ён заяўляе ў інтэрвію адной нямецкай газэце, што ня ўсё толькі кепскае зьвязанае зь імем Гітлера, бо яму Нямеччына абавязаная сваім эканамічным уздымам.

Страшэнная памылка. Спрытна падхопленая апазыцыяй і шматкроць падкрэсьленая заходняю прэсай, яна назаўжды заплямiць ейнага аўтара.

Я лепш зразумею яе значэньне празь некалькі месяцаў, прымаючы чатыры дзясяткі французскіх журналістаў. Яны прыяжджаюць да нас у самую завею. Перад імі рухаецца бульдозэр, які пракладвае шлях да нашых дзьвярэй. Пасьля добрай гульні ў сьнежкі яны гуртам накідваюцца на наш адзіны тэлефон. Задаволіўшы гэткім чынам свае натуральныя патрэбы, журналісты могуць нарэшце перайсьці да менш сур'ёзных справаў і пацікавіцца мясцовай сытуацыяй. Іхныя ўяўленьні грашаць недакладнасьцю да такой ступені, што адзін зь іх (ня буду казаць хто) дзівіцца з самога факту існаваньня нашай амбасады, а амаль усе астатнія, падобна, чакалі, нібыта мы тут рыхтуемся да ўцёкаў.

Антураж будучага афіцыйнага візыту ўжо цяпер выглядае вельмі кепска!

Ну й дзе падзеўся той цудоўны аптымізм, зь якім я вітала прыход зімы?

[…]

Шушкевіч, які прыйшоў да нас на вячэру празь некалькі тыдняў, сувора судзіць новаабраных дэпутатаў. На ягоную думку, ім трэба яшчэ ўсяму вучыцца. Сытуацыя яшчэ больш ускладняецца тым, што:

- камуністы, як бы там ні было, усё адно застаюцца камуністамі;

- аграрнікі больш гнуткія, але Шарэцкі ня можа быць альтэрнатываю Лукашэнку;

- «балота» заўсёды падтрымае Лукашэнку, незалежна ад курсу, якім ён пойдзе;

- зьвяз цэнтрыстаў (да якога належыць наш суразмоўца) паралізаваны ўнутранымі спрэчкамі й абвінавачаньнямі на

адрас Багданкевіча;

- адсутнасьць БНФ у парлямэнце вартая жалю, хоць дзякуючы гэтаму факту спрэчкі праходзяць спакайней.

[…]

5

[…Падзеі вясны 1996]. У гэтым кантэксьце пазыцыя Клёда нялёгкая. Ён запрашае на абед Латыпава, які выглядае вельмі ўстрывожаным і выказвае спадзяваньні, што нічога не перашкодзіць прэзыдэнцкаму візыту й не зацямніць яго бляску. «Якія дзеяньні ўладаў спрыялі б гэтаму?» - пытаецца ён у Клёда. Той раіць яму пачаць з вызваленьня двух арыштаваных БНФаўцаў [Хадыкі й Сіўчыка].

Клёд таксама запрашае віцэ-міністра замежных спраў Саньнікава* (вылучаецца юначай бародкай і красамоўнасьцю) на вячэру з Гі Сарманам [вядомы французскі публіцыст, сяброўскія] мы госьцім у гэты дзень. Язык у Саньнікава «добра мадэстраны», і здаецца, што кантакт паміж двума суразмоўцамі ўзнікне добры. Гэтага акурат бракавала напярэдадні, на спатканьні з пісьменьнікам Васілём Быкавым, чыя рыторыка была чужой для Сармана. Навошта Сарман прыехаў у Мінск, ці іншым, каб прапанаваць нам бліскучы выклад палітычнай эканоміі падчас сьняданку. Галоўным чынам - каб пашукаць гэтай памежнай краіне матэрыялы для сваёй кнігі пра «ўскраіны» (яна выйдзе пад назвай «Цэлы сьвет - мой горад», пра Беларусь там будзе сказана няшмат). Але таксама, каб пасьля ягоных словаў, ён тут дзеля таго, каб сабраць інфармацыю для свайго сябра Алена Жупэ, тагачаснага прэм'ер-міністра, напярэдадні візыту Лукашэнкі.

На наступным тыдні Клёд зьбіраецца з духам, каб паведаміць пра будучы візыт кіраўніцтва БНФ. Для гэтага запрашаецца адзін з намесьнікаў старшыні Фронту ды чароўная, з вачамі коткі, спадарыня Трыгубовіч. Абое выказваюць крайнюю заклапочанасьць сытуацыяй як тут, так і ў Расеі. Не сказаць, каб яны былі зусім зьдзіўленыя паведамленьнем Клёда:

* Андрэй Саньнікаў, міністр замежных спраў Беларусі (у 1996 г.), з 1997 г. — намесьнік міністра замежных спраў Беларусі, з 2000 г. — пасол Беларусі ў Расеі, з 2003 г. — пасол Беларусі ў Францыі і Манакаскай Рэспубліцы, з 2008 г. — пасол Беларусі ў Германіі, з 2012 г. — пасол Беларусі ў Аўстрыі. У 1990-х гадах — дырэктар Дэпартамэнту стратэгічных пытаньняў у МЗС, дзе вельмі востра

прымаецца гэтая навіна вельмі стрымана.

Што да нашых сяброў з парлямэнцкай апазыцыі, то яны ня могуць утрымацца ад таго, каб не прадэманстраваць нездавальненьне.

[…]

Мы зноў прымаем Лябедзьку, які, у якасьці прадстаўніка Камісіі Вярхоўнага Савету па міжнародных справах, цяпер прадстаўляе свой парлямэнт у Радзе Эўропы ды ў Парлямэнцкай асамблеі ў Страсбургу. Ад ягоных высноваў патыхае чорным пэсымізмам. З словаў Лябедзькі, асабісты склад Міністэрства ўнутраных справаў ужо пераўзышоў склад арміі, з усімі небясьпекамі, якія з гэтага вынікаюць. Пра гэта сьведчыць нядаўняе здарэньне, калі менавіта МУСаўцы стралялі на золку па машыне Ганчара, які ледзь ня страціў у выніку жыцьцё. Перад абліччам гэтай пагрозы апазыцыя згуртавалася (нарэшце!) вакол парлямэнту.

Насамрэч з студзеня [1996] большасьць Вярхоўнага Савету незаўважна дрэйфуе ў бок апазыцыі.

Я заўважаю гэта ў пачатку чэрвеня, слухаючы Шарэйкана. З парлямэнцкай трыбуны ён заклікае да гуртаваньня людзей, усхваляе былую ўладу саветаў і, у чаканьні на яе аднаўленьне, прапануе калегам узяць у свае рукі ініцыятыву правядзеньня неабходных рэформаў.

Праўда, Лукашэнкі ў гэты момант у Менску няма: ён адпачывае ў Сочы. Але часу на чаканьне не губляе. Па вяртаньні прэзыдэнт дэманструе цудоўную форму (хаця хадзіць пачаў чуткі пра стан ягонага здароўя) і, пазнаёміўшы публіку з разьвядзеньня стронгі ў маёнтку, які выдзялілі для яго ў беразе Чорнага мора расейцы, ён адразу пераходзіць у контратаку на Шарэцкага, абвясьціўшы, што на ягоным працоўным стале знаходзяцца «важныя праекты», якія датычаць магчымай рэвізіі Канстытуцыі. У найбліжэйшай будучыні будуць мець магчымасьць зь імі пазнаёміцца. Да ягонага ад'езду ў Францыю ці пасьля? У абодвух выпадках я не чакаю ад гэтай «прэзэнтацыі» нічога добрага.

адчувалася нястача кваліфікаваных кадраў, ён быў несумненна адным з рэдкіх прыкладаў кіраўніка, які меў адначасова аўтарытэт і добры паслужны сьпіс. Як асоба Саньнікаў стрыманы, трохі нават суворы, ветлівы, але ў дыялёгу ахвотна прымае, цьвёрды тон, ён перакананы прадпачытае адкрыцьця. Заяўляе ідэяй ягоны ў цудольны нуляць у **кіраўніцтвах** да галоўнай

[…]

Але фатальная дата набліжаецца. Клёд вылятае ў Францыю 9 ліпеня. У той самы дзень Лукашэнка праводзіць псеўда-прэс-канфэрэнцыю. Ён ганьбіць на ёй паводзіны апазыцыі, якая імкнецца падкапацца пад падваліны дзяржавы, дыскрэдытуе яе перад замежжам, спрабуе ўбіць клін паміж ім і Ельцыным і ўвогуле хацела б зашкодзіць ягонаму візыту ў Парыж. Затым Лукашэнка падводзіць вынікі двух год свайго кіравання й віншуе сябе з посьпехам у выкананьні сваёй галоўнай місіі — «захаваньня краіны».

І раніцаю 11 ліпеня ў арэоле гэтай перакананасьці ён нарэшце адлятае ў Францыю.

Клёд вяртаецца ўвечары 13 ліпеня на прэзыдэнцкім самалеце з выглядам задавальненьня ад выкананага абавязку.

Гэты візыт быў ужо здавён настойліва патрабаваны беларускім бокам. Рашэньне аб яго правядзеньні было без энтузіязму прынятае ў выніку шматлікіх кансультацыяў у Парыжы. Ён некалькі разоў пераносіўся з розных прычынаў, і нарэшце яго тэрмін быў прызначаны на час, вельмі блізкі да Сьвята 14 ліпеня (з 11 па 13). Візыт не выглядаў найлепшым чынам, тым больш што апазыцыйныя колы (галоўным чынам, БНФ) здолелі мабілізаваць парыскіх карэспандэнтаў дзеля таго, каб суправадзіць яго прэсавай кампаніяй у выключна палемічным тоне («Прыхільнік Гітлера ў Парыжы» [загаловак артыкулу ў «Монд»]). Тым ня менш, ён прайшоў даволі прыстойна, у тым ліку й на вышэйшым узроўні, дарма што там адбываліся хутчэй абмены маналёгамі (асабліва зь беларускага боку), чым сапраўдны дыялёг. Кантакты, якія маглі мець працяг, былі навязаныя на ніве гаспадаркі. Лукашэнка, відаць, малаадатны на чары сталіцы, быў відавочна ў захапленьні ад кароткага візыту ў Па-дэ-Кале ды ад прынагодных сустрэчаў з тамтэйшай адміністрацыяй і аграрнымі коламі. Таксама было спадзяваньне на тое, што візыт зможа адыграць пазытыўную, няхай і абмежаваную, ролю ў эвалюцыі беларускай палітыкі. Але папраўдзе ён адбыўся запозна для гэтага - у той час, калі ўсе рашэньні, якія ў хуткім часе прывядуць да зацьвярдзеньня рэжыму, былі ўжо прынятыя.

дзейнай асобай у арганізацыі й падрыхтоўцы візыту свайго прэзыдэнта ў Францыю. Замежныя назіральнікі ахвотна залічалі яго да таго тыпу чыноўнікаў, зрэшты шматлікіх у адміністрацыйнай эліце, якія пайшлі на службу рэжыму, унутрана да яго не далучаючыся. Такім чынам, не была вялікім сюрпрызам ягоная публічная заява аб адстаўцы на другі дзень па няшчасным рэфэрэндуме канца 1996 году. Потым Саньнікаў

Але ўрэшце ўсё прайшло ня так ужо й кепска, калі ўлічыць халоднасьць афіцыйных колаў, варожы настрой прэсы і тэмпэрамэнт Лукашэнкі. Пасьля таго як беларускі прэзыдэнт весела пазабаўляўся на пікардыйскай фэрме, ён выкліча задаволеным сваім падарожжам і даверліва паведаміць тое, што французская Канстытуцыя натхніла яго на рэфармаваньне сваёй…

Але ж ня гэта, ня гэта было мэтай візыту!

На жаль, 19 ліпеня нашыя найгоршыя прадчуваньні спраўджваюцца: Лукашэнка абвяшчае будучы канстытуцыйны рэфэрэндум.

прэзыдэнт міністра замежных справаў» апазыцыі, што каштавала яму нямала асабістых непрыемнасьцяў.

УЦЁКІ НАПЕРАД

3
[…]

[Пачатак 1997] Сініцын, які быў «шэрым кардыналам» Лукашэнкі, пакуль палюбоўна зь ім не разышоўся, не аспрэчвае факту, што мара ягонага былога гаспадара - вяршыць лёсы нарэшце зьяднаных «славянаў». Што да рэфэрэндуму [аб аб'яднаньні Расеі й Беларусі], прапанаванага Ельцыным, то наш госьць не сумняваецца, што вынік яго будзе пазытыўным, прынамсі ў Расеі.

Такой самай думкі прытрымліваецца і Ганчар, якога мы прымаем празь некалькі дзён і які, як і Сініцын, зарабляе цяпер на жыцьцё працаю на расейскую фірму (а Лукашэнка вінаваціць амэрыканцаў, што яны фінансуюць апазыцыю!). Насамрэч, заўважае Ганчар, прэзыдэнт трапіў у пастку: нягледзячы на асьцярожнасьць маскоўскіх фінансавых колаў, як Ельцын, так і ягоныя праціўнікі, левыя і правыя, падхапілі лёзунг інтэграцыі з мэтаю выбарчай прапаганды. Але і адны, і другія ня маюць чаго прапанаваць чалавеку, які недарэчна ўшчаміўся ў натоўп прэтэндэнтаў на трон і які выклікае падазрэньні сваёй харызмай і схільнасьцю да дэмагогіі.

[…]

4
[…]

Клёду нарэшце застаецца разьвітацца з Лукашэнкам. «Цёплая» размова, калі верыць афіцыйным СМІ, якія абыходзяць маўчаньнем Клёдавы зусім хіба дарэмныя пажаданьні. Праўду кажучы, прэзыдэнт не абцяжарвае разьвітаньне фармальнасьцямі й вельмі па-сяброўску запрашае мужа вяртацца ў Беларусь.

Ці мы калі-небудзь вернемся?

За пасажырамі ўжо зачыніліся краты мытні. За імі апошнім цьмяна відаць той самы твар, які першы мяне сустрэў пяць год таму, - твар Генадзя [кіроўцы] з нацягнутай усьмешкай.

Пад крыламі нашага самалёта ўжо множацца й зьмяншаюцца ў памерах стракатыя хаткі ды недабудаваныя катэджы. Застаецца ў доле грамада пушчаў, перасыпаных зіхоткімі лужынамі азярын.

У мяне на вачах сьлёзы. Бывайце, бывайце! Так, мая прыгода скончаная.

Але для тых, хто застаўся ўнізе, для тых, ад каго мы цяпер аддаляемся, тутэйшыя нягоды ня скончыліся. Ці вечна ім, забытым ахвярам свайго становішча ў цэнтры ўсё яшчэ падзеленай Эўропы, прыйдзецца заставацца закладнікамі яе супярэчнасьцяў?

Пераклаў з французскай Ігар Лялькоў паводле: Annie Jolif. L'equipee bielorussienne. Paris: L'Harmattan, 2001.

[image]
[image]

№ 2 (31) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/11/1**
[image]

[illegible] ізм

[image]
ARCHE Пачатак № 2 (31) - 2004
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[illegible] [illegible] 2004
[illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [illegible] [illegible]
[illegible] [

Як таго патрабуе жанр рэцэнзіі, мы паспрабуем крытэрыяў ацаніць артыкулы кнігі, напісаныя вялікім і разнародным калектывам аўтараў[1] пра вельмі шырокія аспэкты беларускага жыцьця. Прадмову да яе напісаў Станіслаў Шушкевіч, які сьцісла апавёў пра ўнутраныя ды вонкавыя прычыны аўтарытарызму ў Беларусі. На яго думку, сёньняшняе маладое пакаленьне беларусаў мае чым ганарыцца ў гісторыі сваёй краіны, а пабудове эўрапейскай Беларусі «спрыяюць у тым ліку і такія працы», як гэтая кніга.

Яе ўкладальнікі Франсуа Дэпэльто й Арэлі Лякасань ува ўводзінах аналізуюць працэсы ў постсавецкіх краінах у катэгорыях глябалізацыі ды трансфармацыі. З гэтага пункту гледжаньня Беларусь можна разглядаць як вынятак празь яе савецкасьць ды недаразьвітасьць нацыянальнай сьвядомасьці, а навуковы інтарэс да яе можа быць абумоўлены, згодна з фукальдыянскай лёгікай, неабходнасьцю дасьледаваньня анамальных выпадкаў, пазьбягаючы абагульняльных законаў ды ідэалягічных клішэ. Пасьля агульнай крытыкі сацыяльных наступстваў працэсаў глябалізацыі (ці макданалізацыі) у краінах СНД, вельмі далёкіх ад ідэалаў палітычнага лібэралізму ды вольнага рынку, аўтары ставяць пад сумнеў «эвалюцыянісцкую» канцэпцыю дэмакратычнай трансфармацыі. Яны адзначаюць, што заходнія дэмакратыі часьцяком праяўляюць абыякавасьць да праблемаў беднасьці ды карупцыі ў такіх краінах, калі тыя забясьпечваюць ім вольны доступ на свой унутраны рынак.

Артыкул Сяргея Панькоўскага ды Жана Марку прысьвечаны акрэсьленьню так званага «беларускага фэномэну». На іх думку, «Беларусь сутыкаецца з праблемай, уласьцівай усім постсавецкім краінам: як прызвычаіць насельніцтва да новай сытуацыі зь іншымі каштоўнасьцямі ды сацыяльна-эканамічнымі мэханізмамі, калі яно прызвычаілася жыць без свабоды і пад патранажам дзяржавы». Прычыны таго, што Беларусь стала выняткам у цэнтральнаэўрапейскім рэгіёне, ахопленым працэсамі дэмакратызацыі, яны бачаць у гісторыі, своеасаблівасьці хады трансфармацыйных працэсаў на пачатку 1990-х гадоў і ў асабовым складзе актораў беларускае палітычнае сцэны. На жаль, іх кароткі выклад беларускае

[1] Натуральна, што я ня буду спыняцца на ўласным артыкуле «Захад ці Усход: хістаньні ды няпэўнасьці беларускае замежнае палітыкі».

гісторыі не пазбаўлены некаторых хібаў: тут паўтараецца тэза аб заваёве беларускіх земляў літоўскімі князямі і нават ня згадваецца БНР (маўляў, да стварэньня БССР, паміж 1917 і 1919-м, сытуацыя ў Беларусі была «заблытанай»). Блытаюцца і самі аўтары, калі кажуць, што беларускі парлямэнт «абвясьціў незалежнасьць Беларусі» 28 жніўня 1991 году (інакш кажучы, Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце набыла статус канстытуцыйнага закону) і зацьвердзіў бел-чырвона-белы сьцяг. Насамрэч першае адбылося 25 жніўня, а другое - 19 верасьня.

Асноўная ўвага ў артыкуле надаецца апісаньню зьменаў пачатку 1990-х, прыходу да ўлады Лукашэнкі, складнікам яго папулісцкага курсу, нарастаньню аўтарытарных тэндэнцыяў у функцыянаваньні палітычнае ўлады. Аналіз гэтых працэсаў улучае й даволі спрэчныя моманты. Напрыклад, сьцьвярджаецца, што, «даволі парадаксальным чынам, нацыяналістычны рух за мову хутка атрымаў падтрымку з боку намэнклятуры». Гэная «намэнклятурная» падтрымка палітыкі беларусізацыі 1992-93 гадоў - прымусовай ды нават брутальнай, на думку аўтараў, - падкрэсьліваецца ажно тройчы. Натуральна, ім бракуе канкрэтных прыкладаў таго, што тады выкладчыкі набіраліся на працу паводле моўных, а не прафэсійных крытэраў або што гучалі «пагрозы выключыць з працы дзяржаўных службоўцаў, якія не гавораць па-беларуску». Занадта пасьпешлівай падаецца заўвага, што лідэры апазыцыйнае кампартыі пасьля 1996 году «пачалі зацята гаварыць па-беларуску падчас дыскусіяў ды афіцыйных выступаў». У артыкуле таксама замоўчваецца кампанія 1992 году па зборы подпісаў за рэфэрэндум аб датэрміновых выбарах і прычыны яе няўдачы.

З аналізам Віталя Сіліцкага чытачы «ARCHE» знаёмыя ў яго беларускамоўным і больш поўным перакладзе. Аўтар дае бліскучы (варты ўлучэньня ў хрэстаматыю з паліталёгіі для беларускіх студэнтаў!) аналіз палітычнага разьвіцьця Беларусі ў 1990-я гады. Адно трэба аспрэчыць цьверджаньне, якое аўтар робіць усьлед за Алегам Манаевым, што сярод беларускамоўных беларусаў больш прыхільнікаў Лукашэнкі, чымся сярод расейскамоўных, і што, маўляў, «беларуская мова і беларускі нацыяналізм суіснуюць паралельна ўнутры дзьвюх

адрозных групаў». Аўтар не захацеў заўважыць паўсюдна, а не, як ён кажа, каньюнктурна («каб падацца дэмакратам альбо апазыцыянэрам») беларускамоўнай гарадзкой інтэлігенцыі, якая была ды застаецца ў нашым грамадстве галоўным носьбітам дэмакратычных пераканаьняў і асноўным рэсурсам структураў грамадзянскае супольнасьці.

Прафэсар паліталёгіі Манрэальскага ўнівэрсытэту Люк Дзюамэль засяродзіўся на дасьледаваньні асобы прэзыдэнта Беларусі з гледзішча мэтадалягічнага рацыяналізму, паводле якога мэта дзеяньняў палітыка - гэта атрыманьне доступу да грошай, прэстыжу ды панаваньня, што забясьпечваюцца ўладай.

Згодна зь Дзюамэлем, «рашэньні, якія прымаюцца Лукашэнкам, рацыянальныя, гэта значыць прадыктаваныя неабходнасьцю кансалідацыі ягонай асабістай улады, хоць і ідуць уразрэз з інтарэсамі Беларусі», а сама палітычная дзейнасьць беларускага прэзыдэнта абумоўленая жаданьнем перадусім заваяваць і захаваць уладу, выкарыстоўваючы пры гэтым усе наяўныя рэсурсы. Як «непераўзыдзены дэмагог» і «палітычны апартуніст» Лукашэнка грунтуе свой палітычны дыскурс на савецкім кансэрватызьме, прарасейскім панславізьме ды папулісцкім патэрналізьме і вылучаецца сярод усіх іншых кіраўнікоў краінаў СНД, якім таксама ўласьціва аўтарытарнасьць, сваімі глыбока прарасейскімі пераканаьнямі. Параўноўваючы аўтарытарызм Лукашэнкі з аўтарытарызмам Ельцына, Люк Дзюамэль задавольваецца павярхоўнай высновай: маўляў, прычыны большай аўтарытарнасьці Лукашэнкі - неплюралістычная палітычная культура Беларусі і супрацьстаяньне, якое існуе паміж сталіцай і рэштай краіны.

Асобна трэба сказаць пра дапушчаныя ў гэтым аналізе фактычныя памылкі: аўтар тлумачыць нізкую культуру Лукашэнкі адсутнасьцю ў яго вышэйшай адукацыі, сьцьвярджае, што за выняткам афіцыйнай праваслаўнай усе іншыя канфэсіі ў Беларусі забароненыя, гаворыць пра Янку Купалу ды Якуба Коласа (у тэксьце Yan Kupaloits et Yakub Kolos) як пра вялікіх паэтаў, якія складаюць вершы ў гонар

Лукашэнкі, блытаецца ў назвах міжнародных арганізацыяў АБСЭ/АЭСР (OSCE/OCDE), называе 1999-ы, а не 2000 год годам збайкатаваных апазыцыяй выбараў у «палатку», заяўляе пра падтрымку расейскімі СМІ кампаніі Ганчарыка падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, а іх вынікі разглядае як адлюстраваньне стану грамадзкае думкі, нарэшце, даводзіць, што Пуцін, паводле прыкладу Лукашэнкі, вырашыў вярнуцца да савецкіх дзяржаўных эмблемаў. Але нягледзячы на гэтыя хібы, аналіз Люка Дзюамэля - даволі цікавая спроба напісаць палітычны партрэт ды акрэсьліць матывацыі паводзінаў асноўнага актора беларускай палітычнай сцэны.

Два наступныя аналізы, напісаныя Арэлі Лякасань і Віржыні Піранон, закранаюць адпаведна праблемы абароны правоў чалавека ў Беларусі і рэалізацыі свабоды слова. У іх Беларусь паўстае краінай з доўгай традыцыяй павагі да падставовых правоў чалавека, якая сягае ў сярэднія вякі. «Судзебнік Казімера» на два стагодзьдзі апярэдзіў брытанскі «Habeas Corpus»! Беларусь была вядомая сваёй талерантнасьцю і прыязнасьцю да прадстаўнікоў розных канфэсіяў, што перасьледаваліся ў іншых краінах, а ўніяцтва трэба лічыць сымбалем рэлігійнай цярпімасьці. Такая гістарычная традыцыя, пры адпаведным асэнсаваньні, можа паспрыяць усьведамленьню беларусамі неабходнасьці абароны правоў чалавека.

Аналізуючы тэкст Канстытуцыі ў рэдакцыі 1996 году, Арэлі Лякасань паказвае, што, нягледзячы на фармальнае замацаваньне асноўных правоў ды свабодаў асобы, мэханізмы іх абароны вельмі далёкія ад дэмакратычных нормаў, перадусім дзеля залежнасьці судовай улады ад прэзыдэнта. Спасылаючыся на справаздачы беларускіх і міжнародных праваабарончых арганізацыяў, а таксама на ўласны досьвед, яна апісвае абмежаваньні, якія існуюць у нашай краіне ў галіне асабістай бясьпекі, свабоды слова, сумленьня, перамяшчэньня, павагі да прыватнага жыцьця, а таксама права атрымліваць адукацыю і інфармацыю на роднай мове.

Парадокс беларускай сытуацыі ў тым, што пры вялікай колькасьці незадаволеных рэжымам апазыцыя застаецца

малалікай. Адна з прычынаў гэтага палягае ў нізкай палітычнай культуры беларусаў, якія не давяраюць прадстаўнічым органам улады і такім пасярэднікам паміж уладай і грамадзянскай супольнасьцю, як палітычныя партыі ды грамадзкія арганізацыі. Міжнародная ж рэакцыя на парушэньні правоў чалавека ў Беларусі або недастаткова актыўная, або непасьлядоўная, асабліва з боку эўрапейскіх структураў. Прызнаючы пазытыўнае значэньне сталага ціску ЗША на беларускі рэжым, нават калі ён чыніцца з чыста «геастратэгічных» прычын, аўтарка падкрэсьлівае, што ізаляцыя наагул ня йдзе на карысьць беларусам.

У гэтым артыкуле не адпавядае праўдзе пасьпешлівае сьцьверджаньне, што трансьляцыя расейскіх тэлеканалаў ОРТ і НТВ, «адзіных крыніцаў праўдзівай інфармацыі», спынена беларускімі ўладамі і што траціну «сэнату», верхняе палаты парлямэнту, прызначае прэзыдэнт (насамрэч ён прызначае «ўсяго» адну восьмую яго чальцоў). Выклікае таксама зьдзіўленьне празьмернае захапленьне аўтаркай роляй «Хартыі'97» у абароне правоў чалавека. Зрэшты, яно ўласьцівае шмат якім замежнікам.

Віржыні Піранон у сваім артыкуле засяродзілася на незалежнай прэсе Беларусі, перасьлед якой сьведчыць пра парушэньне канстытуцыйнага права на свабоду слова. Улады, каб пазьбегчы абвінавачаньняў у таталітарызьме, дапускаюць існаваньне незалежных друкаваных СМІ, але ставяць іх у такія ўмовы, што яны ўвесь час знаходзяцца на мяжы закрыцьця. На матэрыяле інтэрвію з журналістамі незалежных выданьняў (Паўлюком Быкоўскім і Ірынай Халіп) даюцца канкрэтныя прыклады ўціску ўлады на прэсу, пачаткам якога можна лічыць скандал з публікацыяй дакладу дэпутата С. Антончыка, калі газэты выйшлі зь «белымі плямамі» замест яго. Пасьля выкарыстоўваліся самыя розныя мэханізмы наступу на свабоднае слова: перавод Беларускага Дому друку пад апеку Адміністрацыі прэзыдэнта, замена галоўных рэдактараў дзяржаўных выданьняў прэзыдэнцкімі стаўленікамі, забарона бюджэтным установам падпісвацца на незалежную прэсу, маральны ціск на беларускіх і замежных журналістаў, арышты і судовыя працэсы супраць іх, ускладненьне рэгістрацыі новых

выданьняў і закрыцьцё старых, кампаніі перарэгістрацыі, надуманыя папярэджаньні з боку Дзяржкамдруку, дыскрымінацыйныя расцэнкі на друк і экспэдыцыю для незалежнай прэсы, забарона дзяржаўным службоўцам даваць ёй камэнтары, канфіскацыя накладаў ды абсталяваньня прыватных друкарняў.

Сярод хібаў артыкулу назавём няправільны пераклад на французскую назвы газэты «Наша Ніва» (як «Наша неба») і няправільнае напісаньне прозьвішча былога генпракурора Бажэлкі (як Bodelko)[2].

Прыкладна роўныя памерам артыкулы Мальвіны Бакуньжо ды Ранана Эрвуэта займаюць разам прыкладна трацінку першым зь іх («Культура і пошук саматоеснасьці ў Беларусі») - стан культуры ў нашай краіне называецца вынятковым адасобленай як ад Захаду, так і ад Расеі, яна стала інструмэнтам змаганьня за сьцьвярджэньне альбо адраджэньне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Мастацкія твораў адыгрываюць у ёй другасную ролю, пагатоў што творцы ў цяжкіх матэрыяльных варунках.

Далей даецца агульны агляд беларускага фатаграфічнага мастацтва, кіно, тэлевізіі, жывапісу, танцаў, музыкі, моды, тэатру ды літаратуры. Асаблівасьць беларускае фатаграфіі, а таксама літаратуры ды жывапісу - у дамінаваньні букалічных ды рамантычных матываў і малой ступені аўтарскай суб'ектывізацыі, што выклікана неабходнасьцю пазытыўнае прэзэнтацыі краіны (гэтую тэзу можна аспрэчыць хаця б на прыкладзе «Глёрыі Патрыя» Зянона Пазьняка).

Культурнае супрацьстаяньне ўлады ды грамадзянскай супольнасьці ілюструецца на прыкладзе фільмаў «Нянавісьць: дзеці ілжы» Азаронка ды «Звычайны прэзыдэнт» Хашчавацкага. Артыкул пісаўся да зьяўленьня беларускіх «блякбастэраў» «У жніўні 44-га» ды «Настасьсі Слуцкай», таму ў ім даецца вельмі пэсымістычная ацэнка беларускага кінэматографу. Тэатар называецца сфэрай, дзе культура і палітыка асабліва зьнітаваныя, бо мадэрная тэатральная актыўнасьць разьвілася задоўга да набыцьця імі палітычнай незалежнасьці.

[2] Дарэчы, ...ыць ...ыць ...ыць

а значыць, можна гаварыць аб гістарычнай легітымацыі вышэйшчаў незалежнасьці дзякуючы творчасьці «Каганца, Купалы, Коласа, Буйло і Родзевіча». Мовай тэатру і музыкі вельмі часта застаецца беларуская, што можа таксама разглядацца як форма пратэсту.

Канчаецца аналіз высновай, што беларуская культура балянсуе паміж элітарнасьцю ды народнасьцю і адзначаецца моцнай адсутнасьцю снабізму. Паўнавартаснае культурнае развіцьцё будзе зарукаю лепшай будучыні нацыі, бо дазволіць пабудаваць нацыянальную сьвядомасьць на базе «супольнай культуры, а ня згадак пра супольныя пакуты ды войны».

Ранан Эрвуэт у артыкуле «Быць на дачы: аналітычныя заўвагі на падставе палявога дасьледаваньня» спыняецца на шырока распаўсюджаным фэномэне постсавецкага жыцьця – дачы (лецішчы): «Прадмет бясконцых размоваў у штодзённым жыцьці, тэма шматлікіх тэлевізійных перадачаў і асобных рубрык у газэтах і часопісах, фэномэн дачаў улічваецца нават уладамі, калі яны прызначаюць дату выбараў». Лецішча - гэта «дом гараджанаў, разьмешчаны за межамі гораду, дзе адпачываюць, але дзе найперш працуюць на агародзе». Дачная дзейнасьць ня зводзіцца толькі да догляду дачнага дому і працы на агародзе, але пашыраецца на сымбалічна зьвязаную з дачай прастору (збор ягадаў і грыбоў, рыбалка паблізу дачы, выраб у гарадзкой кватэры прыладаў, неабходных для дачы, спажываньне і абмен садавіны ды гародніны, вырашчаных на дачы, і г. д.).

У аналізе фармулююцца тры рабочыя гіпотэзы: 1) дача служыць сродкам выжываньня ў варунках эканамічнай крызы; 2) дача служыць месцам, дзе суб'ект можа канструяваць сябе праз «адбудову» сваёй тэрыторыі і свайго атачэньня (суседзяў, сяброў); 3) «дачная» гаспадарчая сыстэма стварае сетку кліенталісцкіх дачыненьняў, бо трымаецца на аказаньні паслугаў за неграшовыя формы падзякі (напрыклад, самагон). Яны спраўджваюцца пры дапамозе «палявога дасьледаваньня», якое палягала ў праведзеных на працягу двух гадоў інтэрвію зь людзьмі рознага ўзросту, розных сацыяльных групаў ў розных мясьцінах Беларусі.

дзе Коласа, Купалы, Буйло і Родзевіча. Мовай тэатру і музыкі вельмі часта застаецца беларуская, што можа таксама разглядацца як форма пратэсту.

Канчаецца аналіз высновай, што беларуская культура балянсуе паміж элітарнасьцю ды народнасьцю і адзначаецца моцнай адсутнасьцю снабізму. Паўнавартаснае культурнае развіцьцё будзе зарукаю лепшай будучыні нацыі, бо дазволіць пабудаваць нацыянальную сьвядомасьць на базе «супольнай культуры, а ня згадак пра супольныя пакуты ды войны».

Ранан Эрвуэт у артыкуле «Быць на дачы: аналітычныя заўвагі на падставе палявога дасьледаваньня» спыняецца на шырока распаўсюджаным фэномэне постсавецкага жыцьця – дачы (лецішчы): «Прадмет бясконцых размоваў у штодзённым жыцьці, тэма шматлікіх тэлевізійных перадачаў і асобных рубрык у газэтах і часопісах, фэномэн дачаў улічваецца нават уладамі, калі яны прызначаюць дату выбараў». Лецішча - гэта «дом гараджанаў, разьмешчаны за межамі гораду, дзе адпачываюць, але дзе найперш працуюць на агародзе». Дачная дзейнасьць ня зводзіцца толькі да догляду дачнага дому і працы на агародзе, але пашыраецца на сымбалічна зьвязаную з дачай прастору (збор ягадаў і грыбоў, рыбалка паблізу дачы, выраб у гарадзкой кватэры прыладаў, неабходных для дачы, спажываньне і абмен садавіны ды гародніны, вырашчаных на дачы, і г. д.).

У аналізе фармулююцца тры рабочыя гіпотэзы: 1) дача служыць сродкам выжываньня ў варунках эканамічнай крызы; 2) дача служыць месцам, дзе суб'ект можа канструяваць сябе праз «адбудову» сваёй тэрыторыі і свайго атачэньня (суседзяў, сяброў); 3) «дачная» гаспадарчая сыстэма стварае сетку кліенталісцкіх дачыненьняў, бо трымаецца на аказаньні паслугаў за неграшовыя формы падзякі (напрыклад, самагон). Яны спраўджваюцца пры дапамозе «палявога дасьледаваньня», якое палягала ў праведзеных на працягу двух гадоў інтэрвію зь людзьмі рознага ўзросту, розных сацыяльных групаў ў розных мясьцінах Беларусі.

Loukachenko i nava1 Zlation Pozniak, хаця на адной старонцы са спадарамі Viktor Gonchar i Dmitry Bulakhov сустракаецца Anatol Labiedzka. На адной і той жа старонцы чытаем Vassil Bykov i Ales Razanau, праз пару старонак - Gennady Buravkin i Ryhor Baradulin. У аднаго і таго ж аўтара можна знайсьці Olga Ipatava i Olga Ipatova, V. P.

Аднак чыста эканамічнае вытлумачэньне дачнай актыўнасьці
недастатковае, бо шматлікія рэспандэнты прызнавалі
эканамічную нерэнтабэльнасьць працы на дачы і гаварылі пра
іншыя стымулы, якія штурхаюць у яе абдымкі. Таму аўтар
аддаў перавагу культуралісцкаму падыходу. Для пасьпешліва
ўрбанізаванага позьнесавецкага і постсавецкага грамадзтва
дача была і ёсьць уцёкамі ад шэрасьці ды чэрствасьці
прамысловага гораду, які не дазваляе пачуваць сябе вольна.
Толькі быцьцё за горадам, на дачы, дазваляе асобе падагнаць
навакольную рэчаіснасьць пад сябе.

Дзеля гэтага дача адыгрывае дваістую ролю: вызваляючы ад
гораду, яна адначасова і «заганяе» ў іншую залежнасьць,
стварае новы сацыяльны прымус. Жыцьцё на дачы не пакідае
часу і свабоды на палітычную дзейнасьць. Дачнікі ў масе сваёй
падтрымліваюць уладу, калі яна гарантуе забесьпячэньне
мінімальных матэрыяльных патрэбаў узамен за ўразаньне
палітычных правоў.

Два наступныя артыкулы кнігі напісаныя Рышарам Русо -
канадзкім сацыёлягам, які спэцыялізуецца на
посткамуністычных грамадзтвах. Першы, больш кароткі,
тычыцца вельмі актуальнага сёньня пытаньня - забесьпячэньня
Беларусі энэрганосьбітамі («Беларускі энэргетычны сэктар:
сталы расейскі ўплыў»). Наша краіна залежыць ад расейскіх
энэрганосьбітаў, а энэргетычная палітыка беларускага ўраду
пры нерэфармаванай структуры прамысловасьці зводзіцца да
выбіваньня з Расеі нізкіх тарыфаў на газ, разьлік за пастаўкі
якога яшчэ нядаўна ажыцьцяўляўся ў неграшовай форме. У
доўгатэрміновай пэрспэктыве гэтая палітыка неэфэктыўная,
паколькі спрыяе захаваньню нярынкавых мэханізмаў у
эканоміцы і вядзе да марнаваньня рэсурсаў. Хоць Расея
застаецца асноўным энэргетычным партнэрам Беларусі,
беларускаму кіраўніцтву варта больш актыўна адстойваць
нацыянальныя інтарэсы ў галіне энэргетычнай бясьпекі.

У другім артыкуле Рышар Русо аналізуе наступствы
Чарнобыльскай катастрофы для Беларусі, а таксама палітыку
беларускай дзяржавы што да насельніцтва, якое жыве на
забруджаных тэрыторыях. Пасьля агульнага аповеду пра

аварыю ды злачынную палітыку яе замоўчваньня камуністычным кіраўніцтвам у цэнтры ды на месцах, што яшчэ раз падкрэсьліла неэфэктыўнасьць савецкае сыстэмы[3], аўтар засяроджваецца на характары радыеактыўных выкідаў ды іх узьдзеяньні на здароўе людзей. Аўтар падкрэсьлівае тэндэнцыю як савецкіх уладаў, так і чыноўнікаў МАГАТЭ заніжаць нэгатыўнае ўзьдзеяньне радыяцыі на здароўе людзей. Але якімі б ні былі ацэнкі наступстваў аварыі, відавочна, што Беларусь сутыкаецца з істотным павелічэньнем колькасьці такіх захворваньняў, як рак шчытападобнай залозы, лейкемія, сардэчныя паталёгіі, якое будзе доўжыцца, на думку спэцыялістаў, да 2010 году.

Дзяржава ж усё больш і больш «забываецца» пра Чарнобыль.

Дзяржаўная праграма аб ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай аварыі, прынятая ў 1989 годзе, не была выканана, а дзеяньне абодвух законаў 1991 году пра абарону ды кампэнсацыі для пацярпелых наступова зьмяртвалася пасьля 1994 году. Аўтар падрабязна распавядае пра зьмену чарнобыльскай дзяржаўнай палітыкі Беларусі за Лукашэнкам: зьмяншэньне кантролю за забруджанымі рэгіёнамі, неспрыяльны клімат супрацоўніцтва зь міжнароднымі гуманітарнымі ды мэдычнымі арганізацыямі, паўторнае засяленьне тэрыторыяў, жыхары якіх раней былі адселеныя, перасьлед навукоўцаў, якія вывучаюць наступствы аварыі (напрыклад, Ю. Бандажэўскага).

У артыкуле выклікаюць зьдзіўленьне сьцьверджаньні, што на пераадольваньне наступстваў Чарнобыльскай катастрофы выдаткоўваецца 25 % ад гадавога бюджэту Беларусі[4] і што прыярытэтамі абранага ў 1994 годзе прэзыдэнта Беларусі была «пабудова нацыі» (*nation building*) ды аднаўленьне сацыялістычнай палітыкі ў эканамічнай ды сацыяльнай галіне.

Канчаецца зборнік артыкулам «Сьведчаньні пра Чарнобыль:

[3] Дарэчы, тут жа маем арыгінальнае сьцьверджаньне, што быццам у 1990-м поруч з інтэлігенцыяй палітычнае кіраўніцтва БССР таксама выступала за поўны сувэрэнітэт Беларусі і што адзіным стрымліваючым чыньнікам быў народ, які нібыта баяўся застацца сам-насам з чарнобыльскай бядой, чым і тлумачыцца яго падтрымка гарбачоўскага варыянту новае саюзнае дамовы.

[4] У бюджэце на 2004 год на «Пераадольваньне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» адводзіцца 431.468.804,1 рублёў з 13.913.542.964 рублёў, або 3,1 %.

[5] Нядаўна яны ўкладзі кнігу «Маўчаньне і замоўчваньне Чарнобылю. Забруджаная будучыня» (*Les silences de Tchernobyl. L'avenir contaminé*), якая мае пабачыць сьвет у траўні 2004 году ў выдавецтве ўнівэрсытэту францускага гораду Кану (*Caen*).

[6] Аўтары цытуюць Вальтэра Бэнь яміна, для якога мадэрная гісторыя – гэта «аповед тых, хто атрымаўшы перамогу, далучаецца да трыюмфальнага шэсьця, у якім сёньняшнія гаспадары крочаць па целах тых, хто сёньня быў скароны».

адлюстраваньне аварыі ў гуманітарных навуках і мастацтве», напісаным Гіёмам Грандазі і Фрэдэрыкам Лемаршанам[5] з удзелам Віржыні Шыманец. Абапіраючыся на вынікі двухгадовага сацыяантрапалягічнага дасьледаваньня наступстваў аварыі ў Беларусі, аўтары паказваюць, якім чынам гэтая гісторыя «без герояў» («ліквідатары» моўчкі канаюць у шпіталях) падзейнічала на ўяўленьні і паводзіны беларусаў, а таксама як навука й мастацтва спрабуюць адлюстраваць гэтыя працэсы. Гісторыя «чарнобыльцаў» - гэта гісторыя пераможаных, а значыць, постмадэрновая гісторыя (мадэрновая гісторыя пішацца пераможцамі[6]), а таму перад намі паўстае радыкальна новае вымярэньне гісторыі чалавецтва/ чалавечнасьці (*l'humanité*), для якога сьведчаньні «анямелых» насельнікаў забруджанай зоны маюць большую вартасьць, чымся зьвесткі навукоўцаў і палітыкаў.

Існуюць дзьве парадыгмы асэнсаваньня Чарнобылю: «рацыяналістычна-матэрыялістычная», паводле якой аварыя нічым не адрозьніваецца ад іншых і трэба шукаць практычныя шляхі ліквідацыі яе наступстваў (як гэта робяць В. Несьцярэнка або Ю. Бандажэўскі, які памылкова названы былым рэктарам гомельскай «Акадэміі навук»), і «мэтафізычная», якая вызначаецца адчуваньнем надыходу радыкальна новага сьвету, у якім руйнуюцца нашы ўяўленьні пра прастору і час (прадстаўлена, у прыватнасьці, творчасьцю С. Алексіевіч).

На думку аўтараў, тэхнакраты-навукоўцы спрыяюць «баналізацыі аварыі», а як толькі нехта зь іх выводзіць праблему на палітычны ўзровень, пачынаецца яго палітычны перасьлед. Каб пазьбегчы маштабных трагедыяў і ператварэньня грамадзтва ў сьвет суцэльных ахвяраў, такія падзеі варта «палітызаваць да скрайнасьці».

Пры канцы кнігі прыведзены сьпіс найноўшых выданьняў на ангельскай, французскай ды нямецкай мовах, так ці інакш прысьвечаных Беларусі.

Варта пагадзіцца з укладальнікамі кнігі, што іх выданьне зьмяшчае «сапраўдны заклік да эмпірычнага ды крытычнага дасьледаваньня Беларусі». А тое, што Беларусь усё часьцей робіцца самастойным аб'ектам навуковага дасьледаваньня, ня

можа ня радаваць, да вялікае скрухі «державников-северозападников».

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/11/1**
[image]

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК - гісторык, сталы аўтар «ARCHE». Жыве й працуе ў Стакгольме.

Андрэй Катлярчук Нямецкая вучонасьць і беларуская мінуўшчына

Райнэр Лінднэр. Гісторыкі і ўлада. Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX - XX ст. - Менск: Бібліятэка часопісу «Беларускі Гістарычны Агляд», 2003.

Кніга, чый пераклад на беларускую мову аглядаецца тут, упершыню ўбачыла сьвет у 1999 годзе ў Мюнхене. Яе аўтар доктар Райнэр Лінднэр працуе ў дэпартамэнце ўсходнеэўрапейскіх дасьледаваньняў унівэрсытэту Канстанцы (Universität Konstanz) і належыць да невялікага кола заходніх гісторыкаў, якія прафэсійна вывучаюць Беларусь. За апошнія пяць гадоў ён апублікаваў шэраг артыкулаў на ангельскай і нямецкай мовах аб праблемах гістарыяграфіі сучаснай Беларусі[1]. «Гісторыкі і ўлада» - гэта першае пасьля манаграфіі Аляксандра Цьвікевіча дасьледаваньне праблемы дачыненьняў гістарычнай навукі Беларусі і ўлады/ўладаў, напісанае да таго ж у клясычных традыцыях нямецкай гістарыяграфіі. Па ім заходні чытач можа знаёміцца з гісторыяй Беларусі. Праўда, дзеля гэтага для падрыхтаванага беларускага чытача пэўныя фрагмэнты кнігі не нясуць нічога новага, паколькі яе аўтар вымушаны спыняцца на добра вядомых у Беларусі момантах і

падаваць багата «тэхнічнай» інфармацыі. І ўсё ж, улічваючы

У Беларусі ёсьць свая ўласная гісторыя. Яе можна падзяліць на старажытны і найноўшы пэрыяд. Старажытная, уласная гісторыя Беларусі амаль невядомая... Дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу Беларусь зрабілася полем бітвы, на якім ... сілай зброі вырашаліся мала што ня ўсе пытаньні.

Гэтыя словы, пад якімі мог падпісацца кожны адраджэнец пачатку XX стагодзьдзя, напісаў у 1857 годзе «заходнярус» Алег Турчыновіч у царскім падручніку гісторыі для школаў і гімназій Беларусі.

На жаль, некаторыя працы «заходнярусаў», якія неабходна было разгледзець, засталіся па-за разглядам. Гэта гісторыя праваслаўнай царквы ВКЛ «Беларуская іерархія», напісаная Міхаілам Грыгаровічам ў 1824 годзе і апублікаваная толькі ў 1992-м. Гэта манаграфія Юльяна Крачкоўскага, прысьвечаныя гісторыі Вільні, і ягоны артыкул да гісторыі праваслаўных цэркваў Вільні, невядомы нават аўтарам «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі»[2]. Гэта першая манаграфія да гісторыі гарадоў Беларусі, напісаная Ўладзімерам Стукалічам з пазыцыяў, блізкіх да нацыянальных, якая зноў-такі ня згадваецца ў «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі»[3]. Гэта зьмястоўная манаграфія Генрыка Татура, пра якую нічога ня ведае «Археалёгія Беларусі»[4].

Але галоўны недагляд аўтара - ігнараваньне працаў беларускіх гісторыкаў XIX стагодзьдзя, якія пісалі на польскай мове. Між тым менавіта культурнае змаганьне Польшчы і Расеі дало магчымасьць прарасьці насеньню беларушчыны, якое на той час мела дзьве культурныя дзялянкі. Прыгадаем прафэсараў Віленскага ўнівэрсытэту Ігната Даніловіча, Міхаіла Баброўскага, Язэпа Ярашэвіча, якія далі адрозную ад польскай «ліцьвінскую» трактоўку гісторыі ВКЛ, або нецярбурскі гурток Яна Баршчэўскага, сябры якога стваралі тэксты з гісторыі Беларусі (Полацкай зямлі). Папулярны выклад некаторых пытаньняў гісторыі Беларусі ў сваіх творах далі Ян Чачот і Вінцэнт Дуніі-Марцінкевіч. Уплывы на погляды Кастуся Каліноўскага ягонага брата, прафэсійнага гісторыка Віктара Каліноўскага, выявіў Мікола Нікалаеў[5]. Нельга абысьці ўвагай працы Аляксандра Ельскага да гісторыі Менскага каталіцкага

[2] Крачковский Ю. Ф. Старое Вильно до конца XVIII века. Варшава, 1893; Православные святыни города Вильны в 14-18 вв. // Труды IX археологического съезда 1893 года. Т. 2. Москва, 1897. С. 223-250.

[3] Стукалич В. К. Белоруссия и Литва. Очерки по истории городов Белоруссии. Витебск, 1894.

[4] Татур Г. Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение. Минск, 1892.

[5] Нікалаеў Мікола. Браты Каліноўскія і Публічная бібліятэка. Шляхам гадоў. Вып. 1. Менск, 1990. С. 206-210.

біскупства, Слуцкай мануфактуры. У забытай сучаснымі адмыслоўцамі 2-томнай манаграфіі «Лісты аб Швэцыі» Яўстах Тышкевіч падрабязна разгледзеў дачыненьні паміж сваёй Бацькаўшчынай і Швэцыяй, выкарыстаў шмат новых крыніцаў, выказаў цікавыя думкі адносна старажытнай гісторыі Беларусі. Адным словам, без аналізу польскамоўных гістарычных публікацый беларускіх аўтараў XIX стагодзьдзя зьмест першай часткі застаецца няпоўны.

Другі разьдзел прысьвечаны беларускай гістарычнай навуцы ў сталінскім СССР. Аўтар паказвае, як вывучэньнем гісторыі Беларусі пачалі займацца прафэсіяналы, як у 1920-я гады ў Менску пры БДУ склалася гістарычная школа, якая зрабіла сапраўдны прарыў у вывучэньні нацыянальнай гісторыі. Узьнікла вельмі моцная школа гісторыкаў ВКЛ, згодна зь якой эўрапейскае права, палітычны лад, дзяржаўны статус мовы, рэфармацыя, рэлігійная талеранцыя, рэформа сялянскай гаспадаркі стварылі такі кшталт беларускай культуры, які адрозьніваў яе ад расейскай. Гэтая школа, ачоленая выхаванцамі Дэрпцкага і Кіеўскага ўнівэрсытэтаў, спалучала нацыянальны пункт гледжаньня з высокім прафэсіяналізмам, веданьнем заходняй гістарыяграфіі і замежных моваў. У 1928 годзе, будучы пад уражаньнем выступу Ўладзімера Пічэты на канфэрэнцыі гісторыкаў у Нямеччыне, прафэсар Ота Гёцш зазначыў, што працы найлепшых беларускіх адмыслоўцаў «знаходзяцца ў навуковых каардынатах, што адпавядаюць нашым». (Цікава, што сучасныя нямецкія гісторыкі, якія ўдзельнічалі разам зь беларускімі калегамі ў падрыхтоўцы першага нямецкага падручніка з гісторыі Беларусі, скардзіліся на адсутнасьць узаемнага паразуменьня.) БССР-аўскі краязнаўчы часопіс «Наш Край» меў эўрапейскі ўзровень. Імкліва разьвівалася археалёгія. Аднак сталінскі генацыд дашчэнту зьнішчыў гістарычную навуку. Пад забаронай і забыцьцём аказалася перадусім гісторыя ВКЛ, якая падкрэсьлівала «эўрапейскія», не-расейскія гістарычныя карані беларусаў, а таксама гісторыя мадэрнага нацыянальнага руху, які быў скіраваны на дасягненьне краінай палітычнай незалежнасьці.

Аўтар слушна прысьвяціў шмат увагі першаму рэктару БДУ

Пічэту. Акурат гэты навуковец сэрбска-ўкраінскага паходжаньня, выхаванец Кіеўскага ўнівэрсытэту, прэзэнтаваў Беларусь на міжнародных кангрэсах Бэрліна й Осла, меў шматлікія замежныя кантакты, друкаваўся на Захадзе. Зусім нядаўна мне стала вядома, што ў 1945 годзе ў Стакгольме на швэдзкай мове выйшаў першы ў Скандынавіі і адзіны да 1997 году нарыс гісторыі Беларусі яго аўтарства[6]. Застаецца толькі пашкадаваць, што аўтар кнігі не прасачыў, чаму адбылася перамена думкі Сталіна, дзякуючы якой Пічэта вярнуўся ў 1935 годзе з ссылкі і, нягледзячы на публічныя абвінавачаньні Панамарэнкі ў нацыяналізьме, заняў у 1939 годзе пасаду акадэміка і спакойна памёр у новай маскоўскай кватэры, уступіўшы перад сьмерцю ў шэрагі кампартыі.

У другой частцы Лінднэр ухіліўся ад разгляду напісаных у міжваенны перыяд працаў заходнебеларускіх гісторыкаў. Вядома, іх здабыткі выглядаюць меншымі за дасягненьні іх менскіх калегаў, але менавіта віленчукі пасьля зьнішчэньня менскай школы працягвалі нацыянальныя традыцыі ў беларускай гістарыяграфіі. Аднаго аналізу творчасьці Ігната Абдзіраловіча тут недастаткова. Па-за ўвагай засталіся публікацыі віленскага «Беларускага Навуковага Таварыства», даробак Адама Станкевіча, Хведара Ільляшэвіча, Міколы Шкялёнка, Янкі Станкевіча, Антона Луцкевіча і, нарэшце, Вацлава Ластоўскага, аўтара таўшчэзнай «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» (Коўна, 1926), адзінай працы на беларускай мове, на якую стала спасылаюцца літоўскія гісторыкі.

6 Pitieta, Uladzimir. Om Västukraina och Västvitryssland / Översättning av Carl Johansson. Albert Bonniers Förlag, Stockholm, 1945. 226 s.

Незразумела таксама, чаму Лінднэр адмовіўся ад аналізу беларускай гістарыяграфіі часоў нацысцкай акупацыі. У гэты час у прэсе зьявілася шмат публікацый на гістарычныя тэмы, а таксама выйшлі друкам нарысы гісторыі Беларусі Язэпа Найдзюка і Янкі Станкевіча. Зь іншага боку, без уласьцівых сваім беларускім калегам недагаворак аўтар разглядае партызанскую тэму, якую ілюструе малавядомым прыкладам, калі каталіцкія сьвятары на просьбу партызанаў адлучалі калябарантаў ад Сьвятога касьцёлу.

Трэцяя і чацьвертая часткі прысьвечаныя гістарычнай палітыцы ў пасьляваеннай Беларусі. Лінднэр паказвае, як адбываўся

працэс «правінцыялізацыі» беларускай гістарычнай навукі, што «стабільна» адпрацоўвала спушчаную з цэнтру гістарычную канцэпцыю. Усе яе сілы былі скіраваныя на тое, каб вульгарнымі штампамі накшталт «нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту» ці «прагрэсіўнай місіі Расеі» рэабілітаваць імпэрскую палітыку царызму ды падкрэсьліць адсутнасьць у нашай краіны эўрапейскіх традыцыяў.

Занадта шмат матэрыялу і сацыялягічных табліцаў тут прысьвечана афіцыйнай гістарыяграфіі. Насамрэч з 1944 па 1991 год гістарычнай навукі ў БССР у строгім сэнсе гэтага слова не было. Побач з агромністай арміяй партыйных прапагандыстаў і правінцыйных схалястаў існавала жменька сапраўдных прафэсіяналаў, якія, аднак, ува ўмовах савецкага дыктату не маглі стварыць сваёй школы. БССР была хіба адзінай савецкай рэспублікай, дзе не было ўласнага гістарычнага часопісу і дзе гісторыя Бацькаўшчыны не была абавязковым прадметам у школе. У лепшым становішчы былі нават польскія беларусы, якія, нягледзячы на дзяржаўную палітыку асыміляцыі, мелі газэту на роднай мове, кантактавалі з дыяспарай ды здолелі ўзгадаваць у 1980-я гады шэраг прафэсійных гісторыкаў.

Замест разгляду афіцыёзу лягічней было б сканцэнтравацца на акадэмічных кар'ерах нацыянальных гісторыкаў. Так, аўтар кажа пра дысыдэнцкія ноткі ў зборніку «450 год беларускага кнігадрукаваньня» (1967), пра забарону канфэрэнцыі па этнагенэзе беларусаў (1973), але гэтая інфармацыя губляецца сярод мора зьвестак пра афіцыёз. Аднак менавіта малавядомыя старонкі дзейнасьці нацыянальных гісторыкаў патрабуюць асобнага разгляду. Іх сапраўдным лідэрам быў прафэсар Мікола Ўлашчык (1906-1986), адзіны зь менскіх гісторыкаў 1920-х гадоў, хто выжыў у сталінскай катавальні і здолеў зноўку вярнуцца да прафэсійнай навукі. Улады БССР цкавалі Ўлашчыка, не дазвалялі яму вярнуцца ў родны Менск, выгадаваць вучняў. Але сваімі клясычнымі працамі па археаграфіі і гістарыяграфіі Беларусі, выданьнем хронік ВКЛ ён такі ўплываў на разьвіцьцё беларускай гістарычнай навукі. На жаль, у кнізе яму прысьвечана адно кароткая заўвага.

Варта было разгледзець і творчасьць Уладзімера Караткевіча, дзякуючы якой савецкія беларусы захапіліся нацыянальнай мінуўшчынай, пагатоў што ён быў аўтарам аднаго зь нешматлікіх да часоў перабудовы папулярных нарысаў з гісторыі Беларусі «Зямля пад белымі крыламі». Важную ролю ў захаваньні традыцый нацыянальнай гістарыяграфіі адыгралі «менскі акадэмічны гурток», дзейнасьць Міколы Ермаловіча і Зянона Пазьняка. Такім чынам можна было стварыць цікавейшую і правакацыйную карціну позьнесавецкай беларускай гістарыяграфіі.

У апошняй частцы кнігі разглядаюцца шляхі гістарычнай навукі і палітыкі ў часы перабудовы, развалу СССР і прэзыдэнтуры Аляксандра Лукашэнкі. Аўтар не без іроніі разглядае створаны часткай гісторыкаў на хвалях адраджэньня канца 1980 - пачатку 1990-х гадоў міт «найлепшасьці беларусаў і найстарадаўнасьці іх гісторыі». На яго думку, гэта быў непазьбежны крок на шляху ад правінцыйнай да нацыянальнай школы, бо праз тое самае праходзіла нямецкая гістарыяграфія XVIII і XIX стагодзьдзяў. Па-за ўвагай у гэтым разьдзеле застаўся ўплыў на сучасную гістарычную навуку эміграцыйных гісторыкаў (Янкі Запрудніка, Вітаўта Кіпеля, Вітаўта Тумаша, Аляксандра Надсана, Юркі Віцьбіча, Янкі Станкевіча, Паўла Урбана), а таксама беларускіх гісторыкаў Польшчы (Лены Глагоўскай, Алега Латышонка, Яўгена і Антона Мірановічаў) і Расеі (Валянціна Грыцкевіча, Аляксея Каўкі, Міколы Нікалаева).

На заканчэньне троху палемікі. Крытыкуючы Ластоўскага за тое, што той стварыў міт аб прызнаньні Рыгора Цамблака ў 1415 годзе кананічным мітрапалітам ВКЛ, Ліндэр сьцьвярджае, што «беларускага» мітрапаліта, які мог бы стаць на чале «нацыянальнае царквы», ніколі не было. Але прынятая беларускімі гісторыкамі мадэрнізацыя шляхам замены этноніму часоў ВКЛ «русін» на «беларус» выглядае цалкам натуральнай, бо так сёньня робяць ўсе. Напрыклад, мы лічым Моцарта аўстрыйскім кампазытарам, хаця сам ён лічыў сябе «зальцбуржцам». Таму праваслаўныя беларускія (з 1596 году грэка-каталіцкія) мітрапаліты ВКЛ усё ж такі былі. З часу канчатковага падзелу дзьвюх усходнеславянскіх мітраполій

(сярэдзіна XV стагодзьдзя) і да 1772 году літоўская і маскоўская праваслаўныя цэрквы разьвіваліся абсалютна рознымі шляхамі і да сярэдзіны XVII стагодзьдзя нагэтулькі разышліся ў абрадах і традыцыях, што спатрэбілася кардынальная рэформа маскоўскага праваслаўя (вядомая праз так званы «раскол»), каб наблізіць яго да сусьветных стандартаў.

Кнізе Райнэра Ліндэра наканавана доўгае жыцьцё. З выхадам нямецкага выданьня яго аўтар заняў месца аднаго з найбольш аўтарытэтных знаўцаў гісторыі Беларусі на Захадзе. Беларускае выданьне кнігі засьведчыла нашаму грамадзтву інтарэс заходніх гісторыкаў да беларускай мінуўшчыны. Можа, калісь і беларуская ўлада зразумее важнасьць альтруістычнай працы заходніх беларусістаў па рэкляме малавядомай усходнеэўрапейскай краіны і падтрымае яе і словам, і капейкай.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне [**mk**], Абнаўленьне [**czyk**]
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2004/11/1**
[image]

АНДРЭЙ МЕЛЬНІКАЎ пісьменьнік і бард. Нарадзіўся ў вёсцы Доўск Рагачоўскага раёну Гомельскай вобласьці.

Андрэй Мельнікаў Разбурэнне куміра

Васіль Быкаў. Афганец // Дзеяслоў 2003. № 7

У гады майго расейскамоўнага школьніцтва ў маёй сям'і былі шанаваныя дзве рэчы на беларускай мове: кружэлкі «Песняроў» і кнігі Васіля Быкава. Быкава мы чыталі па-беларуску, бо былі ўпэўненыя, што пераклад непазбежна змяняе, скрыўляе арыгінал, зрушвае ў ім акцэнты. Быкаў жа ўспрымаўся як пісьменнік надзвычай шчыры, пісьменнік, галоўнай рысай якога была яго здольнасць казаць праўду да канца.

Стаўленне да Быкава і яго твораў не змянілася і пасля. Дзядзька Васіль заставаўся для мяне эталонам таго, да чаго трэба імкнуцца ў творчасці. Не змянілі гэтага стаўлення ні яго прыпавесці, што ўспрымаліся як погляд чалавека яго пакалення, але погляд мудры, ні блізкая да прыпавесці «Труба», якую я чытаў крыху ўсмешліва. Мне самому даводзілася займацца мантажом газаправодаў, і я адчуваў перавагу прафесіянала над дылетантам. Але ў цэлым быкаўскі погляд пільны. Быкаў цалкам заслужыў Нобелеўскую прэмію, і кожны год заставалася пачуццё прыкрасці і нязгоды з чарговым выбарам Нобелеўскага камітэта.

«Афганец» перасмыкнуў. Перасмыкнуў не галоўным героем, не

развіццём яго характару, не пастаноўкай асноўнай праблемы - тут якраз усё дабротна па-быкаўску. Перасмыкнуў штучнасцю антуражу, фону, на якім адбываюцца падзеі, разам з тым пасеяў і небяспечныя сумневы ў рэальнасці, нелітаратурнасці, невіртуальнасці свету Быкава на схіле яго гадоў. Пазней недзе ўнутры самога сябе я вырашыў, што гаворка пра падзеі, якія пісьменнік перажываў асабіста (вайна, калектывізацыя, сталінізм), заслугоўвае безумоўнага даверу, што жыццё больш аб'ектыўна бачыцца з адлегласці ў дзесяткі гадоў, чым рэальная гісторыя, якую ты сам меў магчымасць назіраць і прапускаць праз сваю свядомасць зусім нядаўна.

Пасля я пачуў кампетэнтную і абгрунтаваную думку, што нельга падыходзіць да мастацкага твору як да дакументальнай крыніцы і што нават студэнты-першакурснікі гэта разумеюць. Разумею і я, але не варта тады было Быкаву прывязваць «Афганца» да канкрэтнай гісторыі і канкрэтных персанажаў (арганізатараў масавых вулічных акцый - мяркуючы па маштабах, «Вясны-96» - ды затрыманых за пераход мяжы ўлетку 1997-га расейскіх журналістаў). Гісторыя гэтая занадта блізкая да нас і занадта свежая, каб не адчуць і не пабачыць у аповесці нейкага відазмянення рэальнасці. Часам у бок гераізацыі, а часам не. Летняя шматтысячная апазіцыйная дэманстрацыя канчаецца бязлітасным разгонам. Яе мужны арганізатар-навуковец спакойна выстаўляе на продаж уласны гараж, каб за тыя грошы заплаціць штраф. Іншы харызматычны арганізатар іншай дэманстрацыі апазіцыі, з вельмі знаёмымі рысамі твару ды вядомым імем, на час падзей у творы меў ужо сталы палітычны прытулак на Захадзе, а не паспяхова кіраваў калонай са сцягамі ды супакойваў сваіх гарачых хлопцаў. Сцяг з бамбукавым дрэўкам разам з палотнішчам «шаснуў», «мусіць, цаляючы ў амапаўца», бы «дэмакратызатар», ад удару ім галоўны герой ледзь паспявае ўхіліцца… Амапавец, улетку капітан, за месяц пасля атрымання «маёра» вырастае да падпалкоўніка… «Хвалёныя качэргі АК, што адбівалі плячо пры стральбе і нямала заміналі на маршы» (быццам АК, што імперская «трохлінейка», за дзесяцігоддзі не змяняўся)… Аб'ёмная палітапрацоўка… «Удзень і асабліва ўвечары заўжды па адным кудысь выклікалі, штось высвятлялі, з іншымі доўга гутарылі»… «Сказалі, што будзе добра, калі ён адновіцца ў

кампартыі. У якой зь дзьвюх - то яго асабістая справа» (у мяне няма адказу на пытанне, хто ж у рэальным жыцці такое мог прапанаваць сур'ёзна).

Больш за іншае ў творы ўразіла азначэнне «задушанага народу», які «напалову складаўся з камуністаў ды камсамольцаў, а другой паловай абслугоўваў КДБ». Сумнае сведчанне доўгіх перасьледаў аўтара і яго жыццёвага вопыту, на шчасце, наўрад ці можа зыходзіць ад чалавека з майго пакалення (у якога градацый болей за дзве), тым больш што мы з галоўным героем Ступаком амаль равеснікі. Таму гэта не можа быць праўдай, хіба што няўдалай гіпербалай.

«Афганец» часам набывае рысы фантасмагорыі ці прыпавесці, і такое азначэнне пад назвай прымусіла б пагадзіцца з «законам жанру». Нават адсутнасць азначэння зняла б заўвагі: разумейце як хочаце. Але аповесць - гэта іншае, гэта - не фантастыка, не алегорыя, яна патрабуе праўды жыцця. Як «Сотнікаў», як «Знак бяды». Ці не?

Усе другарадныя персанажы «Афганца» безумоўна адназначныя, іх паводзіны дэтэрмінаваныя, як хады шахматных фігур. Расейскі адстаўнік-вайсковец, канечне ж, цвердалобы камуніст і вораг беларускасці; гарадскі беларус з вясковымі каранямі і на «Запарожцы» - ціхмяны і памяркоўны нацыяналіст; дацэнт - на «сямёрцы», выхаваны, шляхетны і кампетэнтны дэмакрат; былы прапаршчык - «тылавік» Афгану - паспяховы кар'ерыст на вішнёвай іншамарцы. Жорстка кажучы, набор штампаў і клішэ - як у галівудскіх кінастужках.

Аповесцю «Афганец» беларускі пісьменнік № 1 бы прадэманстраваў, што сам у многім застаўся ў пары сваёй маладосці, тады сцвердзіўшы самому сабе, што рэчы, навакольны свет і адносіны ў ім не змяняюцца, змяняюцца толькі пакаленні выканаўцаў. «Не я участвую в войне - она участвует во мне», кажучы словамі яго равесніка, паэта Аляксандра Межырава. Звернутасць назад раптоўна выявіла недакладнасць і няўважлівасць да дробязей сучаснасці. Вынік? «Враг вступает в город, пленных не щадя, потому что в кузнице не было гвоздя» - памятаеце? Так яно ў значнай ступені атрымалася з «Афганцам».

Аповесць расчаруе тых, хто пазнаваў «белыя плямы» гісторыі Вялікай айчыннай у быкаўскай «акопнай праўдзе», а цяпер хацеў бы такім жа чынам пазнаваць і «белыя плямы» айчыннай найноўшай гісторыі. Аповесць, можа, і будзе з прыемнасцю прачытана тымі, хто далёкі ці ад Беларусі, ці ад апазіцыі, ці ад рэальнасці. Ці жадае быць чым далей. Іначай, як і ў сумнавядомым «Нашэсці», можна пабачыць не столькі Беларусь, колькі палітычную кан'юнктуру і нізкапробныя мастацкія прыёмы.

Добра, што «Афганец» не стаў апошняй кнігай Пісьменніка. Напэўна, ён засведчыў пэўную крызу ці быў напісаны з нечае просьбы, што рэальна, улічваючы «гарачыню» пэўнай тэмы ў пэўны час. Добра, што ён не атрымаў працягу.

Добра, што апошняй кнігай стала «Доўгая дарога дадому» - спроба працяглай споведзі, наколькі такая споведзь магчымая ў быкаўскіх творах.

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2004/11/1
[image]